В.М. Бялявіна, Л.В. Ракава

# МУЖЧЫНСКІ КАСЦЮМ НА БЕЛАРУСІ



МІНСК
«БЕЛАРУСЬ»
2007

Музей-сядзіба "Пружанскі палацык"
www.museum.pruzhany.com

УДК391.Ц476)
ББК63.5(4Бен)
**Б99**

Рэцэнзенты: член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,
доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры *А. І. Лакотка;*
доктар гістарычных навук /. *У. Чаквін*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу і пры фінансавай падтрымцы
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Бялявіна, В.М.**
Б 99 Мужчынскі касцюм на Беларусі/ В.М. Бялявіна, Л.В. Ракава. — Мінск: Беларусь, 2007. — 303 с.: іл. I5ВН 978-985-01 -0719-0.

У кнізе ўпершыню на аснове разнастайных гістарычных крыніц (старажытных летапісаў, хронік, актавых дакументаў XV—**XVIII** стст. і інш.), этнаграфічнай і этналінгвістычнай літаратуры XIX—XX стст. комплексна, ва ўсёй сваёй шматварыянтнасці паказан працэс развіцця мужчынскага касцюма розных сацыяльных слаёў насельніцтва Беларусі з глыбокага мінулага да сучаснасці. Багата ілюстраванае выданне разлічана на гісторыкаў, этнолагаў, мастацтвазнаўцаў і шырокае кола чытачоў, якія цікавяцца гісторыяй і культурай беларускага народа.

**УДК 391.1(476) ББК
63.5(4Бен)**

**I8В\ 978-985-01-0719-0**

© Бялявіна В.М., Ракава Л.В., 2007
© Афармленне. УП «Выдавецтва «Беларусь», 2007



# ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ**............................................................ 4
Глава 1 Касцюм прывілеяванага саслоўя і гараджан. .................................. 7
Глава 2 Сялянскі касцюм.............................................................. 66
Глава 3 Плечавое і паясное адзенне.................................................. 102
Глава 4 Верхняе адзенне .............................................................. 140
Глава 5 Галаўныя ўборы .............................................................. 189
Глава 6 Абутак.......................................................................... 215
Глава 7 Аксесуары ..................................................................... 237
Глава 8 Баявы касцюм.................................................................. 263

# УВОДЗІНЫ

Паняцце «касцюм» уключае бялізну, хатнюю і верхнюю вопратку, галаўныя ўборы, абутак і аксесуары (паясы, пальчаткі, сумкі, спражкі, гузікі, ювелірныя ўпрыгажэнні і г. д.), якія ў спалучэнні ствараюць адзіны мастацка-стылявы комплекс адзення канкрэтнага гістарычнага перыяду.

Гістарычнае развіццё касцюма вызначалася прыродна-кліматычнымі ўмовамі, старажытнымі этнічнымі традыцыямі насельніцтва, узроўнем вытворчых сіл грамадства, інтэнсіўнасцю міграцыйных працэсаў і культурных сувязей з іншымі этнасамі.

Гісторыя мужчынскага касцюма на Беларусі дае магчымасць узнавіць знешняе аблічча нашых продкаў, больш глыбока зразумець іх норавы, эстэтычныя густы, быт і характар той ці іншай гістарычнай эпохі.

Феадальнае грамадства прад'яўляла канкрэтныя патрабаванні ў адносінах да мужчынскага касцюма розных сацыяльна-саслоўных слаёў насельніцтва, абумоўленыя існаваўшымі нормамі права. Статуты Вялікага княства Літоўскага і спецыяльныя законы, прынятыя ў Рэчы Паспалітай у першай палавіне XVII ст., забаранялі непрывілеяваным саслоўям выкарыстоўваць у касцюме каштоўныя ўпрыгажэнні і каштоўныя тканіны яркіх колераў. Таму на працягу стагоддзяў касцюм разам з утылітарным прызначэннем служыў сімвалам сацыяльнага становішча ў грамадстве і маёмасных адрозненняў, вызначаў заняткі мужчыны, фарміраваў стыль яго паводзін і светапогляд.

Касцюм шляхціца з абавязковай шабляй пры баку быў касцюмам ваеннага чалавека, у любы момант гатовага абараняць як Айчыну, так і свой асабісты гонар. Касцюм гараджаніна строга адпавядаў яго месцу ў гарадской саслоўнай іерархіі, а па касцюму селяніна можна было здагадацца, жыхаром якой мясцовасці Беларусі ён з'яўляецца. Раскоша і багацце касцюмаў магнатаў, вялікіх князёў Вялікага княства Літоўскага і каралёў Рэчы Паспалітай былі важным прадстаўнічым элементам, які дэманстраваў перад суседзямі сілу і моц дзяржавы.

Адзенне на працягу многіх стагоддзяў з'яўлялася той часткай матэрыяльнай культуры беларусаў, якая візуальна найбольш ярка ўвасабляла іх нацыянальную адметнасць.

Змяненне палітычных арыентацый дзяржавы, развіццё шляхоў зносін, рост міжэтнічных кантактаў, тэхналагічнае ўдасканаленне ткацтва і пашырэнне сыравіннай базы вытворчасці адзення абумоўлівалі фарміраванне новых касцюмных комплексаў і асаблівасцей крою на аснове і пры захаванні шэрагу архаічных элементаў, узнікшых у папярэднія стагоддзі.

Уласцівасць касцюма ўстойліва захоўваць старажытныя элементы і канструктыўныя рысы робіць яго каштоўнай крыніцай для больш глыбокага і дэталёвага асвятлення некаторых праблем этнакультурнай гісторыі народа, выяўлення прыкмет агульнаэтнічнай і лакальнай прыналежнасці.

Сведчанняў аб касцюме насельнікаў тэрыторыі Беларусі да X ст. вельмі мала, і яны носяць выпадковы і фрагментарны характар. Гэта ў асноўным летапісы і змешчаныя там мініяцюры, лінгвістычныя звесткі. З найбольш ранніміі летапіснымі і лінгвістычнымі дадзенымі змыкаюцца археалагічныя матэрыялы. Каштоўныя звесткі аб касцюме раннесярэднявечнага насельніцтва розных рэгіёнаў Беларусі ўтрымліваюць працы беларускіх археолагаў П. Ф. Лысенкі, Г. В. Штыхава, Э. М. Загарульскага, В. М. Ляўко, І. А. Марзалюка і інш., гісторыкаў М. М. Улашчыка, В. І. Мялешкі і інш. Касцюму насельніцтва Беларусі X—XIII стст. прысвечана манаграфія Л. У. Дучыц (Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. (паводле археалагічных звестак). Мн., 1995). Ёю ж на падставе археалагічных знаходак разам з Г. В. Ласкавым рэканструяваны мужчынскія касцюмы гэтага перыяду.

Разам з тым адсутнасць археалагічных рэчавых матэрыялаў па ўсіх рэгіёнах Беларусі зрабіла неабходным звяртанне да выяўленчых крыніц, якія ўключаюць мініяцюры летапісаў, ілюстрацыі рэлігійных літаратурных помнікаў, мясцовы іканапіс.

Развіццё мужчынскага касцюма XVI ст. узноўлена аўтарамі на падставе пасведчанняў з рознахарактарнага кола гістарычных, пісьмовых, літаратурных і выяўленчых крыніц. Гэта перш за ўсё актавыя

дакументы (матэрыялы судоў, тастаменты, апісанні маёмасці, інвентары, мытныя кнігі гарадоў), якія носяць даставерны характар і ўтрымліваюць назвы прадметаў адзення і касцюмных комплексаў розных сацыяльных слаёў насельніцтва Беларусі, ад магнатаў да сялян, назвы тканін, якія ішлі на выраб адзення розных саслоўяў. Важным матэрыялам для даследавання касцюма гэтага перыяду паслужылі таксама старажытныя гравюры, фрэскавы і станковы жывапіс, уключаючы мясцовы іканапіс, нататкі падарожнікаў, дыпламатаў.

Пры вывучэнні касцюма XVII—XVIII стст. важнейшую ролю набываюць калекцыі партрэтнага жывапісу і графікі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, музеяў Польшчы, Украіны.

Поруч з актавымі і іншымі гістарычнымі дакументамі пашыраецца кола і ўзрастае значэнне мемуарнай, публіцыстычнай і мастацкай літаратуры, сведчанняў замежных падарожнікаў.

У некаторых выпадках для ілюстрацыі прадметаў адзення часоў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай аўтары вымушаны былі звяртацца да навуковых крыніц Польшчы і іншых краін Еўропы, калі дакладна вядома, што аналагічныя рэчы ўжываліся на тэрыторыі Беларусі, але не дайшлі да нашых дзён у мясцовым матэрыяле.

У XIX ст. друкуюцца першыя этнаграфічныя апісанні традыцыйнага беларускага касцюма ў працах М. Анімеле, П. Бабροўскага, І. Зяленскага, А. Карэва, Б. Тура, П. Шпілеўскага.

З другой палавіны XIX ст. з'яўляецца такая даставерная крыніца для даследавання і ілюстрацыі касцюмаў розных сацыяльна-саслоўных груп насельніцтва, як фатаграфія, зафіксаваўшая бытаваўшыя ў той час тыпы адзення вышэйшага саслоўя, гараджан, а з канца стагоддзя і сялян.

У канцы XIX — пачатку XX ст. выйшлі ў свет грунтоўныя працы А. С. Дэмбавецкага, А. Г. Кіркора, М. Я. Нікіфароўскага, Е. Р. Раманава, І. А. Сербава, З. Ф. Радчанкі і інш., прысвечаныя матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў з падрабязным этнаграфічным апісаннем народнага касцюма розных рэгіёнаў Беларусі.

Вялікі ўклад у вывучэнне традыцыйнага касцюма беларусаў гэтага перыяду ўнеслі польскія даследчыкі Л. Галамбёўскі, Я. Тышкевіч, А. Кольберг, Ю. Крашэўскі, Э. Яленская, К. Машынскі, Ч. Пяткевіч. Каштоўнымі крыніцамі для даследавання касцюма розных саслоўяў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, у склад якіх уваходзіла тэрыторыя Беларусі, паслужылі працы З. Глогера, М. Гуткоўскай-Рыхлеўскай, альбом Я. Матэйкі.

Значную дапамогу ў вывучэнні адзення прывілеяванага саслоўя на Беларусі розных гістарычных эпох аказалі працы беларускіх мастацтвазнаўцаў Н. Ф. Высоцкай, Т. А. Карповіч, В. В. Царашчатавай, В. Ф. Шматава, Г. А. Барвенавай.

Са стварэннем у канцы 1950-ых гг. Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў рэспубліцы пачаліся сістэматычнае вывучэнне беларускага традыцыйнага адзення і планамерная экспедыцыйна-збіральніцкая дзейнасць, накіраваная на ўдакладненне яго агульнаславянскіх рыс і нацыянальна-спецыфічных асаблівасцей, межаў пашырэння лакальных касцюмных комплексаў.

Першай пасля стварэння інстытута этнаграфічнай работай, раздзел якой быў прысвечаны традыцыйнаму касцюму XIX — пачатку XX ст., з'явілася манаграфія Л. А. Малчанавай «Матернальная культура белорусов» (Мн., 1968), а ў 1975 г. выйшла ў свет калектыўная манаграфія «Беларускае народнае адзенне», у якой Г. М. Курыловіч і Г. І. Дулеба далі характарыстыку традыцыйнаму мужчынскаму адзенню беларусаў XIX — пачатку XX ст., выявілі ў ім агульнаславянскія, нацыянальныя і рэгіянальныя рысы. Вялікую цікавасць для даследавання мужчынскага касцюма беларусаў уяўляе і альбом М.Ф. Раманюка(Мн., 1981).

Такім чынам, аснову даследавання касцюма XIX—XX стст. склалі работы беларускіх, рускіх, украінскіх этнографаў і этнолагаў, матэрыялы эт-

награфічных экспедыцый 1960— 1990-ых гг. супрацоўнікаў аддзела этналогіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, шматгадовыя асабістыя палявыя даследаванні аўтараў.

Касцюм гарадскога насельніцтва Беларусі да цяперашняга часу не з'яўляўся аб'ектам спецыяльнага этналагічнага вывучэння. Кароткая гісторыя развіцця мужчынскага касцюма вышэйшых саслоўяў Беларусі XVI—XVIII стст. дадзена ў раздзеле кнігі Л. А. Малчанавай «Очеркн матернальной культуры белорусов XVI—XVIII вв.» (Мн., 1981). Да цікавіўшай нас праблемы звярталася літоўская даследчыца М. Матушакайтэ, якая з пазі-цый мастацтвазнаўства разгледзела касцюм вышэй-шага саслоўя Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай XVI—XVIII стст. як частку літоўскай матэрыяльнай культуры. Касцюм прывілеяванага саслоўя на Беларусі больш ранняга часу і яго развіццё ў XIX — пачатку XX ст. беларускімі этнолагамі спецыяльна не даследаваліся.

У дадзенай кнізе на падставе рэчавых, ілюстрацыйных і дакументальных крыніц аўтары ўпершыню паспрабавалі прасачыць эвалюцыю мужчынскага касцюма вясковага і гарадскога насельніцтва Беларусі са старажытнасці да цяперашняга часу ва ўзаемасувязі з сацыяльнай структурай феадальнага, капіталістычнага і сучаснага грамадства.

Аўтары выказваюць вялікую падзяку рэцэнзентам члену-карэспандэнту НАН Беларусі А. І. Лакотку, доктару гістарычных навук І. У. Чаквіну, супрацоўнікам аддзела этналогіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі за саветы і заўвагі па зместу рукапісу.

За дапамогу па збору ілюстрацыйных матэрыялаў аўтары глыбока ўдзячны дырэктару Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, кандыдату мастацтвазнаўства У. І. Пракапцову, доктару мастацтвазнаўства, прафесару Н. Ф. Высоцкай, доктару біялагічных навук, прафесару А. Т. Федаруку, кандыдату мастацтвазнаўства Г. А. Барвенавай, навуковым супрацоўнікам аддзела старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі і асабіста М. П. Мельнікаву, адміністрацыі і супрацоўнікам Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Музея Беларускага Палесся (г. Пінск), Магілёўскага этнаграфічнага музея, Брэсцкага, Віцебскага, Магілёўскага абласных краязнаўчых музеяў, Дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палацава-паркавы ансамбль», Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея, Тураўскага краязнаўчага музея, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Валынскага краязнаўчага музея(г. Луцк).

За тэхнічную падрыхтоўку кнігі да друку аўтары вельмі ўдзячны мастаку-лабаранту аддзела этналогіі ІМЭФ НАН Беларусі Н. П. Малынавай, лабарантам Т. В. Бойка і Л. Ф. Тарайкоўскай.

Уводзіны, главы 1—3 і 6—8 напісаны В. М. Бялявінай, главы 4—5 — Л. В. Ракавай.

Глава 1 Касцюм прывілеяванага саслоўя і гараджан.



# Касцюм прывілеяванага саслоўя і гараджан

У паняцце «касцюм прывілеяванага саслоўя» мы ўключаем комплексы адзення неаднароднага ў матэрыяльным і сацыяльным плане слоя насельніцтва, які сфарміраваўся на аснове класавых адносін і карыстаўся пры феадалізме і капіталізме больш выгаднымі, у параўнанні з іншымі станамі грамадства, правамі і льготамі. Гэта касцюмы князей і феадальнай знаці, буйных, сярэдніх і дробных землеўладальнікаў, дзяржаўных служачых, ваенна-служылыхлюдзей (зямян, баяр), якія пазней склалі шляхецка-дваранскае саслоўе. Касцюм гараджан таксама разглядаецца па магчымасці з улікам сацыяльных адрозненняў, існуючых у розныя гістарычныя перыяды.



Навуковых даных, якія б характарызавалі мужчынскае адзенне насельнікаў Беларусі да X ст., вельмі мала, па прычыне распаўсюджанага ў VI—IX стст. абраду трупаспалення сярод славянскіх плямёнаў, якія засялялі абшары Усходняй Еўропы. На папялішчах пахавальных вогнішчаў ад вопраткі заставаліся толькі рэшткі аплаўленых металічных дэталяў. Таму для вывучэння ўсходнеславянскага адзення пачатковага перыяду славянскай гісторы найважнейшае значэнне маюць літаратурныя крыніцы. Іх аналіз дае падставу сцвярджаць, што ў беларусаў, як і ў іншых усходніх славян, якія здаўна займаліся земляробствам і развядзеннем хатняй жывёлы, асноўнай сыравінай для вырабу адзення, абутку і галаўных убораў служылі расліннае валакно, скура, футра і воўна. Так, у «Аповесці мінулых гадоў» пад 859 г. гаворыцца, што паляне, вяцічы і севяране плацілі дань хазарам па адной вавёркавай і гарнастаевай шкурцы ад кожнага двара, а ў 883 г. кіеўскі князь Алег стаў браць дань з драўлян шкуркамі куніц[1].

Выяўленая археолагамі ў старажытнаславянскіх паселішчах на тэрыторыі Беларусі вялікая колькасць праслiц з гліны і мяккіх парод камня паказвае, што прадзенне і ткацтва з'яўляліся аднымі з найбольш пашыраных гаспадарчых заняткаў жыхароў. Лён дрэнна захоўваецца ў зямлі, таму знаходкі астанкаў ільняной вопраткі пры археалагічных раскопках старажытных курганоў і паселішчаў вельмі рэдкія. Толькі ў Вышадкоўскім пахавальным комплексе ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці, які датуецца XI—XII стст., знойдзены фрагменты льняной мужчынскай сарочкі, тканай «у квадрат» (01х01 см)[2].

Лён з'яўляецца старажытнай культурнай раслінай, а каноплі, паводле меркавання В. В. Сядова, атрымалі пашырэнне ў славянскім асяроддзі не пазней першай палавіны I тысячагоддзя н. э., і назва іх праславянская[3]. Побач з ільняным і канапляным палатном старажытнае насельніцтва на тэрыторыі Беларусі для вырабу адзення шырока карысталася шарсцянымі тканінамі, пра што гавораць рэшткі



**Касцюм знаці X ст.** «Адход драўлянскіх паслоў пасля прыёму іх княгіняй Вольгай». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу



**Касцюм гараджан і знаці XI ст.** «Расправа Мсціслава Ізяславіча Полацкага з паўстаўшымі кіяўлянамі». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

шарсцяной мужчынскай вопраткі ў курганных пахаваннях X—XIII стст.[4]

Згодна з пісьмовымі крыніцамі, важнейшымі часткамі касцюма старажытных жыхароў Беларусі былі кашуля і штаны, на якія пры неабходнасці апраналася плашчападобнае адзенне або адзенне тыпу пазнейшай світкі ці каптана (жупан, карзно, сукня). З ростам вытворчых сіл грамадства і развіццём таварна-грашовых адносін мужчынскі касцюм на Беларусі ўскладняўся і набываў тыпалагічна-гістарычныя, сацыяльна-маёмасныя і сезонныя адрозненні.

Касцюм феадальнай знаці на тэрыторыі Беларусі да канца XIII ст. развіваўся пад уздзеяннем усходневізантыйскіх традыцый. Гэта звязана з высокім узроўнем развіцця ў Візантыі вытворчасці шаўковых, парчовых і шарсцяных тканін, якія служылі прадметам экспарту ў заходнія і ўсходнія краіны. Ужо ў VI—IX стст. у Старажытнарускую дзяржаву па Волжскаму і Дняпроўска-Волхаўскаму гандлёвых шляхах увозілі разнастайныя візантыйскія і ўсходнія тканіны[5]. Але з-за надзвычай высокага кошту іх маглі купляць або абменьваць на мясцовыя тавары толькі князі і багатая знаць.

Пасля прыняцця хрысціянства (988—989 гг.), гандлёвыя і культурныя зносіны Старажытнарускай дзяржавы з Візантыяй, якая даXII ст. вызначала напрамкі развіцця моды ў адзенні вышэйшага саслоўя ўсёй тагачаснай Еўропы, значна пашырыліся і ўзмацніліся. На малюнку ў «Ізборніку Святаслава» 1073 г. выразна відаць, што прывазныя візантыйскія тканіны — парча, павалокі, аксаміты, візантыйскі крой адзення з'яўляліся пануючымі ў касцюме князя Святаслава і ўсіх членаў яго сям'і[6].

Шлях «з варагаў у грэкі», які праходзіў праз тэрыторыю Беларусі, спрыяў устанаўленню рознабаковых кантактаў заходнерускіх гарадоў праз Кіеў з



**Касцюм знаці і ваеннае ўзбраенне вершнікаў XI ст.** «Заняцце Полацкага прастола Святаполкам — сынам Ізяслава Яраслававіча Кіеўскага і бегства Усяслава з Полацка». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу



**Адзенне княжацкай сям'і XI ст.** «Ізборнік Святаслава» 1073 г.

Візантыяй. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічалі і сваяцкія сувязі полацкіх князёў з Візантыйскім імператарскім дваром[7]. VIX—XI стст. галоўным напрамкам знешняга гандлю беларускіх земляў быў гандаль з краінамі Арабскага халіфата і Візантыяй[8], адкуль імпартаваліся каштоўныя шаўковыя тканіны разнастайнай афарбоўкі, атаксаматканіны, якія спалучалі шаўковыя ніткі з залатымі і сярэбранымі (алтабас, залатаўзорныя парча, аксаміт).

Фрагменты візантыйскіх узорыстых тканін былі знойдзены беларускімі археолагамі пры раскопках у Мінску і Давыд-Гарадку, шаўковы пояс — у Навагрудку, парчовыя ніткі — у Брэсце і Мсціславе. У адзенні з залататканай візантыйскай парчы быў пахаваны прадстаўнік княжацкай знаці ў саркафагу на Барысаглебскіх могілках у горадзе Тураў Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці[9].



**Княжацкі касцюм і галаўны ўбор XI ст.** «Пераправэ Усяслава Полацкага з сынамі цераз Дняпро». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

Даследчыкамі вылучаюцца два самастойныя комплексы княжацкага касцюма X—XIII стст. — парадна-цырыманіяльны і штодзённы[10]. Святочны парадна-цырыманіяльны кас-цюм прызначаўся для на-ведвання храма, выступленняў перад народам, прыёму замежных паслоў і г. д. Такое адзенне прадугледжвала плаўнасць рухаў, прыгожы сілуэт, дэманстравала багацце і боскае паходжанне княжацкай улады. З гэтай мэтай амаль ўсе элементы касцюма шылі з прывазных з Усходу і Візантыі тканін, упрыгожвалі вышыўкай залатымі ніткамі, жэмчугам і каштоўнымі камянямі, залататканай аблямоўкай.



**Княжацкі касцюм XI** ст. Выява на пячатцы Усяслава Брачыславіча

У раннім сярэдневякоўі ў Старажытнарускай дзяржаве, паводле візантыйскага ўзору, асновай парадна-цырыманіяльнага комплексу даўгаполага адзення князёў стала доўгая (да зямлі) шаўковая вопратка - нацельная туніка з тонкай візантыйскай шаўковай тканіны, упрыгожаная па гарлавіне, падоле і канцах рукавоў шлякам з залатога пазументу" ці паскамі залататканай парчы, алтабасу. На яе апраналі сакас (далматыку), кроем падобны на туніку, але больш кароткі, даўжынёй да каленяў. Яго шылі з аксаміту, атласу, аб'яру і ўпрыгожвалі вышыўкай, нашытымі каштоўнымі камянямі. Паверх тунікі і сакаса накідвалі на плечы пурпурную мантыю (карзно, коц) — сімвал каралеўскай і княжацкай улады, якую зашпільвалі фібулай на грудзях або на правым плячы.

У туніку і багаты сакас апрануты князь на пячатцы, знойдзенай у Ваўкавыску. На галаве ў князя візантыйская карона-дыядэма, у правай руцэ — дзіда, а ў левай — невялікі круглы шчыт. Уласнікам пячатак такога тыпу даследчык актавых пячатак Старажытнай Русі В. Янін лічыць кіеўскага князя Ізяслава Яраславіча[12], а сфрагіст з ЗША М. Белямук — полацкага князя Усяслава Брачыславіча (Чарадзея)[11].

Усходневізантыйскі стыль і раскошу параднага княжацкага касцюма Старажытнай Русі адлюстраваў А.П.Ласенка на сваёй славутай карціне «Уладзімір і Рагнеда», напісанай мастаком у 1770 г. Сюжэт карціны адносіцца да X ст. Дачка полацкага князя Рагвалода Рагнеда адхіліла сватанне наўгародскага князя Уладзіміра Святаславіча (які потым княжыў у Кіеве і прыняў хрысціянства). Тады Уладзімір каля 980 г. захапіў Полацк, забіў бацькоў і двух братоў Рагнеды, а яе сілай узяўу жонкі. На карціне Ласенка паказаў момант, калі, убачыўшы адчай і гора Рагнеды, збянтэжаны князь спрабуе яе суцешыць.

Касцюм Уладзіміра складаецца з доўгай ніжняй тунікі з вузкімі рукавамі да запясця, якая пашыта з залататканай візантыйскай парчы і падпяразана шэрым шаўковым поясам, ды нешырокіх аксамітных нагавіц чырвонага колеру, калашыны якіх запраўлены ў чырвоныя саф'янавыя боты. Каўнер тунікі ўпрыгожаны ажарэлкам з нашытымі каштоўнымі камянямі. Вышыўкай і каштоўнымі камянямі абшыты таксама канцы рукавоў тунікі. Зверху апрануты плашч-апашань з чырвонага аксаміту, падшыты і аблямаваны футрам гарнастая. На галаве маладога князя з такога ж аксаміту высокая шапка з гарнастаевай апухай, якая аздоблена залатымі трохкутнікамі і плюмажам пышных пёраў.

Нягледзячы на асобныя гістарычныя недакладнасці (княжацкая шапка звычайна мела паўсферычны верх і не мела плюмажа з пер'яў, а боты ў тыя



**Парадны княжацкі касцюм часоў Старажытнарускай дзяржавы.** «Уладзімір і Рагнеда». Мастак А. Ласенка. 1770 г.



**Парадна-цырыманіяльны княжацкі касцюм XI ст. «Кодэкс Гертруды». XI ст.**

часы былі па вышыні толькі да паловы галёнкі), агульны ўсходневізантыйскі характар параднага княжацкага касцюма Старажытнай Русі і яго канструкцыйныя асаблівасці заўважаны і перададзены мастаком, у той час як адзенне суправаджаючых Уладзіміра асоб і маладой служанкі Рагнеды, несумненна, больш позняга часу.

Парадна-цырыманіяльны княжацкі касцюм на Беларусі дакладна ілюструюць мініяцюры «Кодэкса Гертруды» — псалтыра, напісанага ў канцы X ст., які прывезла з сабой унучка Баляслава Храбрага, калі ў 1043 г. выйшла замуж за князя Ізяслава Яраславіча. На тэрыторыі Беларусі рукапіс быў дапісаны і дапоўнены шэрагам новыхлістоў і пяццю мініяцюрамі[14], на якіх адлюстравана княгіня Гертруда, яе сын Яраполк і сынава жонка Кунегунда.

На адной з мініяцюр «Кодэкса Гертруды» князь Яраполк стаіць перад апосталам Пятром у малінавай туніцы з шырокім залататканым аплеччам (шырокім круглым каўняром), унізаным каштоўнымі камянямі. Па падоле тунікі ідзе шляк з такой жа тканіны, з нашытымі каштоўнымі камянямі. Рукавы тунікі вузкія, на запясцях упрыгожаныя залатымі наручамі. Малінавая аднатонная туніка расшыта залатымі кветкамі-крынамі і падпяразана шырокім поясам. На нагах Яраполка чырвоныя боты, галяні-шчы якіх па баках аздоблены вышыўкай, на галаве — шапка-карона[15].

На другой мініяцюры Яраполк апрануты ў цёмна-малінавую туніку, вышытую золатам, з залатым аплеччам і такім жа шлякам на падоле, падпяразаную шырокім залатым поясам. Зверху тунікі апранута пунсовая мантыя-карзно, падбой якой зроблены з футра гарнастая, што і зараз застаецца галоўным элементам еўрапейскага каралеўскага касцюма[16]. Акрамя мантыі-карзна сімваламі ўлады ў княжацкім парадна-цырыманіяльным касцюме былі аплечча, карона або шапка з паўсферычным верхам і футравым абводам, лорум (доўгі пас з залаталітай тканіны з нашытымі каштоўнымі камянямі), залатыя і сярэбраныя ўпрыгожанні.

Парадны княжацкі касцюм на Беларусі ў раннім сярэдневякоўі дзякуючы сваяцкім і іншым сувязям з балгарскім, нямецкім, венгерскім, польскім дварамі меў агульнапрыняты еўрапейскі характар, склад, манеру апранацца і знаходзіўся на сумежжы заходніх і ўсходніхтрадыцый у адзенні[17]. Колер, узоры і адценні розных частак княжацкага касцюма падбіраліся вельмі ўважліва. Самым шыкоўным лічылася спалучэнне ў касцюме двух асноўных яркіх колераў: калі туніка чырвоная — мантыя сіняя, блакітная і наадварот[18].

Штодзённае адзенне князёў і знаці было больш простым і адпавядала патрабаванням зручнасці. Вядома, што князь Уладзімір, які знаходзіўся на кіеўскім прастоле з 980 па 1015 г., насіў простую льняную вопратку і лёгкія казловыя боты[19]. Звычайна ў будні дні касцюм знаці ў Старажытнарускай дзяржаве складаўся з кашулі, нагавіц, верхняй расхіннай вопраткі тыпу каптана, шапкі з футравай апушкай і безрукаўнага плашча-карзна[20]. Характэрнай асаблівасцю старажытнарускага адзення было тое, што касцюм розных сацыяльных груп насельніцтва хаця і адрозніваўся якасцю і колькасцю складаючых яго элементаў, але крой асобных частак касцюма ва ўсіх слаях насельніцтва быў аднолькавым. Напрыклад, селянін і феадал насілі аднолькавыя паводле крою, але розныя па якасці кашулі[21]. Круглы або квадратны выраз каўняра шаўковай кашулі ў князёў і знаці абшывалі золатам і каштоўнымі камянямі. У касцюме знаці былі распаўсюджаны накладныя каўняры (ажарэлкі), расшытыя золатам, перламі. У такой кашулі з ажарэлкам адлюстраваны Усяслаў Брачыславіч Полацкі на мініяцюры Радзівілаўскага летапісу[22]. Каштоўныя ажарэлкі да мужчынскіх сарочак знойдзены беларускімі археолагамі ў шэрагу курганных пахаванняў[23].

Касцюм гараджан XI ст. таксама адлюстраваны на мініяцюрах Радзівілаўскага летапісу. Так, на алегарычнай выяве моравага паветрыя ў Полацку намаляваны д'яблы на конях, якія нападаюць на гараджан, апранутых у тунікі, падпяразаныя поясам.



**Мужчынскія касцюмы XI—XII стст.** Рэканструкцыя Л. Дучыц



**Касцюм жыхароў Полацка канца** XI ст. Алегарычная выява моравага паветрыя ў Полацку 1092 г. Нячыюцікі на конях нападаюць на жыхароў горада. Мініяцюра Радзівілаўскага летапюу

Рукавы тунік вельмі доўгія, даўжэй за рук[24]. Паяс-ным адзеннем у мужчынскім касцюме ўсіх са-слоўяў у раннім сярэдневякоўі былі даволі вузкія доўгія нагавіцы, калашыны якіх у князёў, знаці і маёмных гараджан засоўваліся ў боты.

Ужо ў XI ст. у Заходняй Еўропе стварыліся спры-яльныя ўмовы для развіцця рамёстваў, гандлю і ўма-цавання эканамічных сувязей паміж дзяржавамі. Асабліва вялікую ролю ў росце рамеснай вытвор-часці ў гарадах і фарміраванні спецыфічнай гарад-ской кулыуры адыграла ўзнікненне рамесных цэхаў.

З XII ст. у Еўропу з Усходу разам з шоўкам пачалі завозіць баваўняную тканіну, а развядзенне ў паўд-нёваеўрапейскіх краінах шаўкавічнага чарвяка зра-біла магчымым выраб мясцовых шаўковых тканін разнастайных гатункаў і афарбоўкі. Хуткі рост аб'ё-му і асартыменту вытворчасці льняных, баваўня-ных, шаўковых і шарсцяных тканін дазволіў не толькі феадальнай знаці, але і багатым гараджанам шырока выкарыстоўваць гэтыя тканіны для пашы-ву адзення.

Найбольш высокага ўзроўню ткацкае майстэр-ства дасягнула ў Італіі, Галандыі, а з XIV ст. — у Францыі. Паміж гэтымі краінамі склалася свое-асаблівая спецыялізацыя па вырабу розных відаў тканін. Вытворчасцю асабліва тонкага палатна вы-значалася Галандыя. У Італіі найвышэйшага ўзроўню дасягнула вытворчасць шчыльных шаўковых і парчовых тканін, а таксама аксамітных, затканых золатам і серабром[25]. Англія, Германія, Чэхія сталі славіцца вырабам шматлікіх відаў і сартоў сукна, якое вызначалася высокай пругкасцю, эластычнас-цю, шырокай колеравай гамай.

У XIII ст. у Заходняй Еўропе доўгая парчовая і шаўковая, візантыйскага крою вопратка вышэйшай феадальнай знаці, што падкрэслівала выбранасцьяе паходжання і непрыстасаваны да фізічнай працы лад жыцця, змяняецца прынцыпова новым тыпам муж-чынскага касцюма. Кардынальныя змены ў модзе былі звязаны з прамысловым і гандлёвым развіццём гарадоў, паглыбленнем падзелу працы паміж га-радскім і вясковым насельніцтвам.



**Касцюм знаці 1-ай палавіны** XII ст. «Вьюылка полацкіх князёў з жонкамі ў Царград у 1129 г.». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

Багатыя гараджане і рыцарства пачалі апранацца ў сукно, бо пашытае з яго адзенне вызначалася практычнасцю і было падыходзячым да дзейнасці па-за межамі дома, ваенных заняткаў і падарожжа. Гэта быў «гарадскі» касцюм як паводле матэрыялу (сукно з'яўлялася прадуктам гарадской вытворчасці), так і па функцыі[26]. Для гэтага тыпу касцюма характэрна шырокае выкарыстанне акрамя сукна шаўковых і баваўняных тканін, якія да XIII ст. у Еўропе каштавалі вельмі дорага. Для аздобы верхняга адзення пачалі выкарыстоўваць футра. Калі да гэтага часу прадметы адзення замацоўваліся фібуламі, аграфамі, засцежкамі і завязкамі, то ў XIII ст. сталі зашпільваць адзенне на гузы з каштоўных камянёў і металаў, а таксама на самыя разнастайныя гузікі («кнафлі») з косці, металаў, скуры, абцягнутыя тканінай.

У XIII — першай палавіне XIV ст. беларускія землі ўвайшлі ў склад Вялікага княства Літоўскага. Асноўная маса феадалаў, якая фарміравала вайскова-служылае саслоўе дзяржавы, называлася баярамі. Тэрмін «баяры» паходзіць ад слова «бой» і характарызуе саслоўе па яго асноўнаму занятку. Вялікія князі літоўскія, вымушаныя апірацца ў сваёй знешняй і ўнутранай палітыцы на баяр, пастаянна пашыралі іх правы і прывілеі, якія юрыдычна замацоўвалі ў граматах і прывілеях. Да канца XIV ст. баярамі называлі амаль усіх прадстаўнікоў мілітарызаванага саслоўя, ад дробных землеўладальнікаў, абавязаных служыць за зямлю, да князёў. Гэта было саслоўе, аналагічнае той сацыяльна-саслоўнай групе, якую ў Заходняй Еўропе называлі рыцарствам.

З канца XIV ст. тэрмін «баяры» паступова замяняецца тэрмінам «шляхта». Упершыню тэрмін «шляхта» паяўляецца ў акце Крэўскай уніі 1385 г.[27], а затым баяры Вялікага княства Літоўскага, прыняўшыя каталіцкае веравызнанне, афіцыйна называюцца шляхтай у Гарадзельскім прывілеі 1413 г. Слова «шляхта» паходзіць ад нямецкага «зіаше» («род, паходжанне, парода»)[28]. Як прывілеяванае вайсковае саслоўе шляхта фарміравалася пераважна з воінаў-прафесіяналаў. Галоўным яе абавязкам была служба вялікаму князю і ўдзел у вайсковых паходах супраць знешняга ворага. Тэрмін «шляхта» існаваў на працягу XV—XVI стст. паралельна з тэрмінамі «баяры» і «зямяне»[29]. Вялікае значэнне для становішча асобы ў межах саслоўя мела наяўнасць зямлі і іншай нерухомай маёмасці. Па колькасці належачай ёй зямлі шляхту сталі падзяляць на буйную і дробную[30].

Калі на чале Вялікага княства Літоўскага і Польшчы стаў вялікі князь літоўскі Ягайла (які ўзяў шлюб з польскай каралевай Ядвігай і ў 1386 г. быў абвешчаны каралём Польшчы), натэрыторыю княства сталі пранікаць і распаўсюджвацца элементы заходнееўрапейскай духоўнай і матэрыяльнай культуры. Гэтаму спрыяў і бурны рост гарадоў, дзе фарміраваўся феномен новай гарадской культуры. Менавіта ў гэты час касцюм князёў і знаці Вялікага княства Літоўскага пачаў набываць выразныя рысы заходнееўрапейскага прыдворнага гатычнага касцюма. Яго характэрнымі элементамі былі кароткі, накшталт ваеннай кірасы жакет, які шчыльна абцягваў торс і падкрэсліваў талію; вузкія штаны-панчохі з эластычнага сукна; скураны абутак з кароткімі халявамі і доўгімі вострымі насамі; капялюш з высокай тульяй, якая звужвалася да верху, з маленькімі палямі або без іх. Верхнім адзеннем служыў доўгі плашчападобны ўпелянд з вельмі шырокімі бочкападобнымі рукавамі і вялікімі проразямі для рук, якія часта абшываліся футрам[31].

Побач з доўгім, шырокім, плашчападобным верхнім адзеннем сталі пашырацца заходнееўрапейскія кароткія плашчы, а таксама верхняе адзенне на футравым падбоі, якое стала выкарыстоўвацца не столькі для абароны ад холаду, колькі для дэманстрацыі багацця касцюма. Спалучэнне вузкага асноўнага адзення з шырокім верхнім падкрэслівала стройнасць і статнасць сілуэта, візуальна падаўжала фігуру.

У гісторыі заходнееўрапейскага касцюма перыяд XIV—XX'стст. з'яўляўся часам найбольшых празмернасцей і эксцэнтрычнасцей у мужчынскім касцюме знаці і вярхушкі гараджан. Гэта была пара росквіту ў Заходняй Еўропе геральдычных прыхільнасцей, дэманстрацыі сваёй вернасці сюзерэну, рыцарскаму кодэксу і г. д. Якраз у гэты час па велікакняжацкаму прывілею 1457 г. шляхце Вялікага княства Літоўскага даруецца права атрымліваць польскія гербы і шляхецкія дыпломы, што ператварала яе ў закрытае саслоўе, адасобленае ад іншых саслоўяў феадальнага грамадства, і спрыяла пранікненню заходнееўрапейскіх элементаў у яе культуру.

У большасці дзяржаў Заходняй Еўропы ў XIV ст. склаўся адзіны тып мужчынскага касцюма, вядомага пад назвай «гатычны еўрапейскі касцюм». Гэты касцюм уключаў некалькі адзежын, якія насіліся ў комплексе. Ролю бялізны і ніжняга адзення ў гэтым комплексе адыгрывала кароткая, да паловы бядра кашуля (шэміз) і вузкая, кароткая куртка без рукавоў (жыпон), да якой тасёмкамі прывязваліся штаны-панчохі (шосы) — вузкія і доўгія, абцягвалі ногі ад канцоў пальцаў да бёдраў.

Калашыны такіх штаноў спачатку не сшываліся, а нацягваліся на кожную нагу асобна і прымацоўваліся да ніжняга пояса або жыпона спецыяльнымі засцежкамі або матузкамі. Спераду паміж калашынамі прымацоўвалі ўпрыгожаны стужкамі гульфік. Зверху апраналася кароткая куртка з тоўстага шоўку ці сукна і плашчападобная вопратка.

Жыццё прадстаўнікоў арыстакратыі і дваранства ў сярэднія вякі было цесна звязана з ваеннымі па-

ходамі і бітвамі. Таму асобныя элементы рыцарскага касцюма пераходзілі і ў цывільнае ўбранне. Так, кароткі і вузкі жакет без рукавоў ці з рукавамі, які спярша паддзявалі пад латы, таму ён паўтараў іх форму, у сярэдзіне XIV ст. стаў у Еўропе цывільным адзеннем[32].

Вялікі князь літоўскі Вітаўт і яго двор у канцы **XIV** — пачатку XV ст. насілі як мясцовыя, так і заходнееўрапейскія касцюмы. З гістарычных крыніц вядома, што для Вітаўта заказвалі адзенне, пашытае па бургундскай модзе, якая ў той час панавала ў палацавай модзе ўсёй Заходняй Еўропы. Але звычайна вялікі князь хадзіў у сукні з беленага палатна, паверх якой апранаў верхнюю сукню з каўняром або жупан, пашыты «па-ліцьвінску, толькі коратка падрэзаны», падпяразваўся багатым поясам, вышытым золатам з каштоўнай спражкай. Паясным адзеннем служылі суконныя нагавіцы, а верхняй вопраткай — суконны плашч, кажух або падбітае футрам доўгае адзенне. Абуваўся найчасцей у чырвоныя скураныя боты з залатымі шпорамі («астрогамі»)[33].

Згодна з выявамі Радзівілаўскага летапісу ў другой палавіне XV ст. князі, знаць і гараджане насілі доўгія і вузкія ў абцяжку штаны-панчохі (шосы). Яны прывязваліся матузкамі да нацельнага кароткага плечавога адзення. На шосы, якія шылі з сукна яркіх колераў, абувалі пулэны — мяккія скураныя чаравікі з доўгімі вузкімі насамі. Даследчыкі лічаць, што яны мелі польскае паходжанне (роціаіп на старажытнай французкай мове «польскі»).

Пасля Грунвальдскай бітвы зменшылася крыжацкая пагроза, гарады адзін за адным пачалі атрымліваць прывілеі на магдэбургскае права і гарадская матэрыяльная культура Вялікага княства Літоўскага стала фарміравацца як састаўная частка заходнееўрапейскай цывілізацыі[34].

У гэты час у Заходняй Еўропе сярод знаці ўвайшло ў моду яркае гербавае шматколернае адзенне мі-парці (адфранц. ті-рагіі — падзелены папалам), левая і правая палавіны якога былі рознага колеру. Спалучэнне колераў і каштоўнасць тканін касцюма мі-парці сведчылі аб ступені знатнасці яго ўладальніка, прыналежнасці да таго ці іншага роду і герба, вернасці феадалу ці даме сэрца і г. д. Такое адзенне, хаця і знайшло адлюстраванне на мініяцюрах Радзівілаўскага летапісу, усё ж не дае падставы меркаваць, наколькі такая мода была пашырана сярод знаці княства і вярхушкі гараджан Беларусі ў XIУ-XУстст.

Масавае пашырэнне натэрыторыі Вялікага княства Літоўскагасярод каралеўскагадвара і знаці розных форм заходнееўрапейскага касцюма звязваюць з часам праўлення Жыгімонта I Старога і прыездам з Італіі ў Польшчу другой яго жонкі — Боны Сфорцад'Аргона. Напартрэце 1524 г. ЖыгімонтI паказаны апранутым па італьянскай модзе ў саян і футра, пацягнутае ўзорыстай шаўковай тканінай. На галаве надзеты неглыбокі круглы чапец з залацістай сеткі на шаўковым падшыцці[35]. Саян (ад італ. ваіа — тонкая шаўковая тканіна) — кароткі да паловы бядра каптан з шоўку, тафты, аксаміту.

Сын Жыгімонта I, кароль Польшчы і вялікі князь літоўскі Жыгімонт II Аўгуст, будучы напалавіну італьянцам, таксама арыентаваўся на італьянскую культуру. Аднак у кнігах рахункаў яго двара ў Вільні за 1544—1567 гг., дзе Жыгімонт II пасяліўся пасля шлюбу з аўстрыйскай княжной Лізаветай, занатаваны тры групы стылістычна розных касцюмных комплексаў, якія шылі для караля і яго прыдворных. Да першай групы адносіліся касцюмы мясцовай польска-літоўскай моды, паякой шыліадзенне прадстаўнікі мясцовых магнацкіх родаў: Кіжгайлы, Гаштольды, Радзівілы. Другую групу складалі італьянскія ці іспанска-нямецкія ўборы, трэцюю — касцюмы па венгерскай модзе[36].

Касцюм мясцовага зямяніна ў 1557 г. складала «шубка пурпіяну снного зь нскрой, зь осьма кнафлямн серебрянымн... однорядокь блокмтный лунскнй... знпунь белый полотна коленского зь баволною, жупнца парпняну зеленаго, шаловары ческого сукна, убранье (нагавіцы. — *Аўт.)* замшу торонского, боты сафьяновые жолтые, полуботкн сафьяну черленого, кошуль коленскнхь трн, шолкомь чорнымьшнтыхь, кошульпростыхьшесть...»(1557г.)[37]. Гэты касцюм, карыстаючысятрапным выказваннем В.Р.Бялінскага ў адносінах да рускага мяшчанскага касцюма, класічная «сумесь рускага і басурманскага», з выкарыстаннем тканін заходнееўрапейскага і ўсходняга вырабу.

У 1569 г. Вялікае княства Літоўскае разам з Польшчай стварылі адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую. Якфеадальная федэратыўнаядзяржава Рэч Паспалітая ўяўляла сабой кангламерат шматлікіх нацыянальныхгруп іасобныхэтнічныхадзінак, займаючы велізарнуютэрыторыю. У яескладуваходзілі польскія, украінскія, беларускія, літоўскія і прускія землі. Польскімі падданымі былі акрамя карэннага насельніцтва вялікія групы армян, яўрэяў, літоўскіх татараў, якія жылі на гэтых землях і з рознай ступенню паўнаты захоўвалі свой традыцыйны касцюм.

Пад уплывам захаплення старажытнасцю, што прынесла ў Еўропу культура Рэнесансу, у Польшчы і Вялікім княстве Літоўскім у XV — першай палавіне XVI ст. склаўся масавы міф, нібыта шляхта генетычна паходзіць ад сарматкіх плямён, якія насялялі ў першыя стагоддзі нашай эры стэпы Паўночнага Прычарнамор'я і частку тэрыторыі сучаснай Украіны. Простых гарадскіх і вясковыхжыхароўяна лічыла патомкамі карэннага мясцовага насельніцтва, падначаленага ваяўнічымі сарматамі.

Назва «сарматы» («сармацкі народ») была запазычана ў антычных аўтараў і ўвайшла ў шырокі абіход у XV—XVI стст., калі рабіліся першыя спробы пабудаваць паслядоўную канцэпцыю гісторыі Полынчы[38]. Гэты генетычны міф насіў тыповыя рысы «міфа заваёўнікаў», падкрэсліваў элітарнасць, этнічную адасобленасць шляхецкага «рыцарскага саслоўя» і абаснаваў яго спрадвечныя правы насіць зброю, абараняць краіну і кіраваць ёю.

Пад уздзеяннем гэтага міфа ў другой палавіне XVI ст. у шляхты сфарміраваўся спецыфічны культурна-светапоглядны комплекс, атрымаўшы назву «сарматызм», які да канца XVIII ст. вызначаў яе этычна-саслоўны кодэкс, бытавую культуру і касцюм.

У XVI ст. 80% феадалаў Беларусі былі этнічна беларускага паходжання, 19% — літоўскага, 1% — іншага, але непаразуменняў і сутычак на этнічнай глебе сярод шляхты не ўзнікала. Шляхта выступала як адзінае саслоўе, зыходзячы не толькі з карпаратыўных, але і з дзяржаўных інтарэсаў[39].

Заканадаўства Вялікага княства Літоўскага XVI ст. на практыцы прызнавала свабоду толькі за адным саслоўем — шляхтай. Адзінства шляхты перад законам, агульнасць для ўсіх яе слаёў правоў і прывілеяў гарантаваліся Статутамі Вялікага княстваЛітоўскага 1529, 1566 і 1588 гг. Усетры Статуты патрабавалі ні ў якім разе не ўзвышаць простых людзей над шляхтай і не даваць ім ніякіх пасад: ні земскіх, ні ўрадавых, ні прыдворных[40]. Нават такія нязначныя адміністрацыйныя пасады, як пісар, падсудак, возны і іншыя, замяшчаліся шляхціцамі[41].

Паняцце «шляхта» аб'ядноўвала магнатаў, якія валодалі вялікімі зямельнымі маёнткамі і займалі самыя важныя дзяржаўныя пасады; сярэднюю шляхту, якая мела ад адной да некалькіх вёсак; ваколічную шляхту, што вяла сваю гаспадарку, але не мела прыгонных сялян (да яе належала і значная частка ардынацкай шляхты, што на васальных умовах за зямлю служыла магнату ў яго войсках); шляхту-беднату, якая не мела сваёй зямлі і жыла ў панскіх дварах уякасці слуг. Паміж першымі і апошнімі існавалі сацыяльна-маёмасныя адрозненні неверагодных памераў[42].

Аднак абвешчаная Статутамі шляхецкая роўнасць, калі фармальна самы збяднелы шляхціц быў роўны прадстаўніку найбагацейшага магнацкага роду, выпрацавала звычку ўспрымаць сваё саслоўе (ад магната да шарачковага шляхціца) як вольнае брацтва роўных між сабою прывілеяваных асоб, у межах якога існаваў своеасаблівы дэмакратызм, дзе нават багаты пан, звяртаючыся да ўбогага ўладальніка шаблі, абавязкова называў яго «пане-браце».

Па сваёй колькасці прывілеяванае саслоўе Рэчы Паспалітайдалёкапераўзыходзіладваранстваіншых краін, акрамя што іспанскай ідальгіі. Дакладных звестак аб яе колькасці ў XVI—XVII стст. няма, але ў другой палавіне XVIII ст. шляхта складала 9—10% насельніцтвадзяржавы,асяродэтнічныхпалякаў — 25%[43].

Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай быў вельмі своеасаблівым. Сярод тагачасных еўрапейскіх дзяржаў, якімі кіравалі абсалютныя манархі, ён вызначаўся выбарнасцю, абмежаванасцю каралеўскай улады і вядучай роллю шляхты ва ўнутранай і знешняй палітыцы дзяржавы.

Уладу караля (ён жа — вялікі князь літоўскі) абмяжоўваў агульны для ўсёй дзяржавы магнацка-шляхецкі сейм, які складаўся з дзвюх палат: вышэйшай — сената і ніжэйшай — пасольскай ізбы. У сенаце засядалі прадстаўнікі цэнтральнай і правінцыяльнай адміністрацыі, магнацкіх родаў, вярхоў каталіцкай царквы, а ў пасольскую ізбу выбіраліся па два паслы-шляхціцы ад кожнага ваяводства і павета.

Саслоўна-прадстаўнічымі органамі шляхты ў паветах і ваяводствах былі сеймікі, якія збіраліся для папярэдняга абмеркавання пытанняў, што выносіліся на агульны (вольны сейм). На сейміках выбіралі паслоў на сейм і выпрацоўвалі для іх інструкцыі, якіх тыя павінны былі няўхільна прытрымлівацца на сейме, вырашалі бягучыя справы свайго ваяводства ці павета.

Акрамя ўсіх станаў шляхты, у дзейнасці павятовых сеймікаў прымалі ўдзел мясцовыя службовыя асобы: ваяводы, старасты, маршалкі, харунжыя, дзяржаўцы, цівуны і г. д.; прадстаўнікі царкоўнай улады: праваслаўныя святары і каталіцкія біскупы[44].

За 6 тыдняў да вольнага сейма пералік і змест разглядаемых на ім пытанняў дастаўляўся ў паветы і паведамляўся службовым асобам. Пасля чаго збіраўся сеймік, пасяджэнні якога працягваліся чатыры дні. Выбраныя ад павятовай шляхты дэпутаты выступалі на сейме перад каралём і каралеўскім саветам як прадстаўнікі сваёй тэрыторыі і яе насельніцтва.

Праз 4 тыдні пасля заканчэння пасяджэнняў агульнага сейма павятовыя і ваяводскія сеймікі збіраліся яшчэ раз, дзе прыехаўшыя з сейма паслы паведамлялі павятовай шляхце яго пастановы. Такая саслоўна-прадстаўнічая сістэма фармальна дапускала дробную шарачковую шляхту да ўдзелу ў палітычным жыцці дзяржавы і давала ёй магчымасць уплываць на дзяржаўныя справы.

Як пісаў адзін з мемуарыстаў, правінцыяльная шляхта строга аберагала права з'езда на сейміках. Ні адзін шляхціц не прапускаў гэтых з'ездаў, нягледзячы на тое, што ваявода (ці які-небудзь уплывовы ў павеце пан) ужо даўно з дружбакамі згаварыўся аб змесце інструкцый і хто заменіць мінулага пасла. Сабраўшымся на сеймік панкам здавалася, што яны самі ў спрэчках выбралі, каго хацелі[45].

Удзел у сейміках і сеймах, як і абарона Айчыны, лічыўся пачэснай і ганаровай прывілеяй усёй аселай шляхты. На іх збіраліся нават самыя збяднелыя шляхціцы ў лапцях і сярмягах (капотах), але абавязкова з шаблямі. На працягу дзейнасці сейміка багатая шляхта карміла ўсіх удзельнікаў за свой кошт[46].

Выхаваная на адроджаных Рэнесансам антычных ідэалах, шляхта адкрыта і свядома супрацьпастаўляла свой дзяржаўны лад усім «дэспатычным» дзяржавам Еўропы, успрымаючы сябе носьбітам і захавальніцай ідэі грамадзянскай свабоды — «залатой вольнасці»[47], якую аберагала ад любых замахаў, ад каго б яны ні паходзілі: ад турак, татар, рускіх або ўласных каралёў.

Калі магнаты і каралеўскі двор папераменна, у залежнасці ад абставін, апраналіся то ў мясцовае, то ў заходнееўрапейскае адзенне, касцюм пераважнай большасці шляхты беларускіх зямель Вялікага княства Літоўскага ў сярэдзіне XVI ст. насіў ужо «сармацкі» склад і характар. Ён складаўся з абавязковага, падпяразанага поясам жупана, пад які часам паддзявалі кароткі кафтанік, і апранутай зверху дэліі. Так, у Слонімскім павеце ў 1565 г. са служэбніка пана Войцеха Чыжа «знялн дылею лунскую блакнтную, кахфьтаннкь замшованый, убранье замшованое, черевнкн, шапка» (1565 г.)[48], а ўцёкшы ад баярына Слонімскага павета зяць прыхапіў у цесця «жупань чнрвоный влосклй, дылею снню лазоревую» (1565 г.)[49]. На раздзетым рабаўнікамі сыне зямяніна Тыніны найбольш каштоўнымі былі: «дылня бурнатная влоская, лнсамн подшнтая, рукавнцы тогожь сукна бурнатного, лнсамн жь подшнтые, шапка, кунамн подшнтая, пась велнкнй венгерскнй бнлый»(1565г.)[50].

У вопісе адзення магнатаў Хадкевічаў сярод прадметаў доўгай верхняй вопраткі згадваюцца дзве аксамітныя газукі чорнага колеру. Адна з іх летняя, упрыгожаная жэмчугам, а другая — падшытая сабалямі, сярод караткаполага адзення — лёгкія каптанікі (янгеры, фальшуркі, жупанікі) і кароткі, італьянскага крою плашчык: «Газука оксамнту чорного рытого, перлы сажона около рукава... Газука оксамнту чорного, собольмн подшнта;... янкгерь аксамяту чорного кнтайкою чорною подшнть; янкгерь атласу чорного, брамы вколо резаные чорного аксаміту; ...Фальшурокь чпрвоныхь 2, кнтайкою подшшыхь, жупаннкн 2 зь кгзузамн тогожь сукна, плашнкь Влоскій, кнтайкою чорною подшнтый» (1569 г.)[51].

Узмацненне ўсходняга прымата ў мясцовым касцюме Вялікага княства Літоўскага адбылося ў часы праўлення Стафана Баторыя — трансільванскага князя, абранага каралём Рэчы Паспалітай у 1575 г. Разам са сваім дваром ён прывёз з Венгрыі, якая з'ўлялася тады часткай Асманскай імперыі, новыя



Касцюм шпяхты XVI—XVII стст. Воіны Рэчы Паспалітай у жупанах і дэліях. Мастак С. Дэла Белі

формы ўсходняга адзення і галаўных убораў. Іх шпаркаму распаўсюджанню спрыяў і асабісты аўтарытэт Баторыя сярод усіх слаёў шляхты. За сваё кароткае дзесяцігадовае праўленне Баторый шмат часу правёў у ваенных паходах, далучыў да Рэчы Паспалітай Лівонію, дараваўдробнапамеснай шляхце шмат новых прывілей, распачаў шырокія ваенныя рэформы, стварыўшы новыя, больш баяздольныя раздзелы войска і экіпіраваў іх па венгерскаму абразцу.

Да адзення венгерскага крою належаць армякі і бекешы. 3 часоў Баторыя армяк набывае статус рэпрэзентацыйнай верхняй вопраткі, багата ўпрыгожанай шаўковымі пятліцамі, шнурамі, каштоўнымі гузікамі, галуном або рознакаляровай тасьмой.

Пры наездзе суседа на памесце пані Копцевай у Берасцейскім павеце ў 1577 г. у яе служэбніка забралі: «ермякь утерфнну чорного, зьшнурамн шолку чорного... жупань утерфнну чорного, зь кгузнкамн серебренымн, на которомь дей сукна коштовало зо полтретн копы грошей, а серебро дей важнло таляровь двохь; камнзеля аксамнту чорного... футро лнсье, ношоное, которое дей было подь ярмякомь... колпакь фойлюндышу чорного, куннцою подшнтый...; шапка скураная, чорная курьдваннмецкая... (г. зн. нямецкая шапка з «курдыбана» — цялячай ці казловай скуры. — *Аўт.);* боты сафьяновые, жолтые... черевнковь чворы... капцн сафьяновые...»(1577г.)[52].



**Магнацкі касцюм па французскай модэе.** Партрэт Себасцьяна Любамірскага. Невядомы мастак. 1569 г.

Ва ўрадніка Копцевай былі забраны: «ярмякь файлюндышовый чорный, зь шнурамн н зь строкою едвабнымн, лнсамн новымн подшнтый..; делія турецкая, файлюндышовая, телнстая, зь серебренымн пасамн, шнуромьоколо лямованая, волкамн подшнтая... жупаньлосій, чорный, подшнтый каразіею зеленою кнтайкою, у колнера дей н за рукавовь чорнымь шнуромь едвабнымь лямована, около зь серебранымн кнеблнкамн... убранье двое каразеевое, одно белое, а другое зеленое... колпакь чорного аксамнту, кунамн подшнтый... колпакь другій оксамнту чнрвоного, рытого, подшнтый рнсемь... макгерка чорная, сь запонкою золотою... футро лмсее... кошуль коленскнхь, чорным шолком шнтыхь пять... кошульколенскнхьневышнваныхьтрн... бачмага сафьяновые, с каптямн н зь ботамн... острога (шпоры. — *Аўт.)* гусарскіе мосяжовы... острога побеляные козацкне...» (1577 г.)[53].

Касцюм шляхціца канца 1570-ых гг. прадстаўлены ў вопісе адзення, якое знялі магілёўскія мяшчане з прыехаўшага ў 1579 г. у Магілёў зямяніна Яна Салецкага: «шапька макгерка... у нее запонка золотая н з шмальцом... кгермакь чорны фалюндншовы с петлнцамн... жупань фалнндяшовы бурнатьны с кнеблнкамн позлотнстымн... снгнеть (пярсцёнак-пячатку. — *Аўт.)* золоты с пальца зорвалн... кафтаннк кнтайчаны... портькі каражнн мененое... боты сафяновые н капьцн, калнтас поясом» (1579 г.)[54].

Як вынікае з вопіса, акрамя абавязковых кашулі і падштанікаў, у якіх, відаць, быў адпушчаны рабаўнікамі Ян Салецкі, ён быў апрануты, па звычаю тых часоў, у некалькі верхніх плечавых адзежын: кароткі кафтанік з шаўковай кітайскай тканіны, суконны бардовы жупан з пазалочанымі прадаўгаватымі гузікамі, суконныя каразеевыя порткі такога ж колеру. Зверху быў надзеты чорны армяк з сукна фалендышу, падпяразаны поясам з калітою (невялікай скураной сумачкай для грошай і дробязей). Убор дапаўняўся невысокай круглай шапкай-магеркай, упрыгожанай залатой з фініфцю запінкай. На нагах у Салецкага былі саф'янавыя боты са скуранымі мяккімі туфлямі-галошамі (каптн), а на руцэ залаты пярсцёнак-пячатка (сыгнет).

На жаль, у шляхецкіх і мяшчанскіх вопісах адзення і інвентарах прадметы адзення называюцца толькі з азначэннем колеру, роду тканіны і футра ў падшыцці без удакладняючых каментарыяў, што ў многіх выпадках не дае магчымасці вызначыць іх у іканаграфічных матэрыялах.

У канцы XVI ст. ва ўжытак уваходзіць дарожны плашч-капеняк з разразнымі рукавамі, які зашпільваўся на адзін гуз[55] і яго кароткі варыянт — паўкапенне: «кобенякь фалендышовый чырвоный, кнтайкою жолтою подшнтый...» (1590 г.)[56]; «полкопеньеческоетогожьсукначеского...»(1583)[57];«полкобенючье блекнтное новое каразеевое (сь) петлнцамн дробнымн...» (1593 г.)[58]. Новым варыянтам доўгага адзення на футравым падбоі стала чуга: «чуга фалюндышовая бурнатная, лнсы подшнтая...» (1590 г.)[59], «чуга шара сукна муравского сь завойкамн лнсьнмн подшнта...» (1599 г.)[60].

Па іншаземнай модзе ў асяроддзі магнатаў і найбольш багатай шляхты Рэчы Паспалітай апраналася найчасцей моладзь, якая шмат падарожнічала, вучылася ў еўрапейскіх універсітэтах і, як і падабае моладзі, захаплялася ўсім новым, што бачыла ў Еўропе. Вярнуўшыся на Радзіму, пад уздзеяннем сармацкай ідэалогіі паступова пераходзіла на больш звыклы і прыстасаваны да мясцовага ладу жыцця арыенталізаваны касцюм. Гэта бачна на партрэтах СебасцьянаЛюбамірскага, віднагадзяржаўнагадзеяча Рэчы Паспалітай канца XVI — пачатку XVII ст.

На партрэце невядомага мастака 1569 г. прадстаўлены малады прыгожы юнак, апрануты па тагачаснай еўрапейскай модзе ў цесна аблягаючы стан пурпуэн і кароткія аксамітныя нагавіцы, панчохі і туфлі, а на партрэце, напісаным невядомым мастаком каля 1600 г., гэта ўжо сталы чалавек у літоўска-польскім касцюме, прадстаўлены ў кананічнай позе героя-сармата з рукой, якая ляжыць на дзяржанні шаблі. На ім шаўковы жупан з чорным узорам па цёмна-шэрым фоне з вузкімі рукавамі, падпяразаны вузкім мастацкай работы поясам, да якога прывешана шабля. На жупан накінуты безрукаўны сіні плашч, падбіты бліскучым чорным футрам з вялікім футраным каўняром, зашпілены пад горлам каштоўнай брошкай-чапрагай. На галаве Любамірскага невялікая шапка-батораўка з прымацаванай злева кітай чорных пёраў. Вузкія калашыны доўгіх нагавіц запраўлены ў светлыя з адваротамі паўботкі на сярэбраных абцасах.

Палацавая і шляхецкая мода хутка падхоплівалася і пашыралася сярод багатых гараджан. Ужо ў сярэдзіне — другой палавіне XVI ст. саяны час-та фігуруюць у актах Мінскага і Гродзенскага гродскіх судоў як лёгкае летняе адзенне мяшчан з кшталтам (нагруднікам) з больш дарагой тканіны. Пры гэтым упамінаюцца мужчынскія і жаночыя саяны. Так, у скарзе Яна Мілашкевіча (1582 г.) гаворыцца, што мінскія мяшчане напалі на яго і ўкралі «сь возка сь тлумкомь соянь чорный утерфнновый зь оксамнтнымь кшталтомь, другой соянь зеленый люнскнй зь кшталтомь оксамнтнымь», а ў заяве аб нападзе падданых Віленскай капітулы на дачку Матыса Сасноўскага ўказваецца ўжо «женннй саянь фурсатовый чорный, кшталть оксамнтный»[61].

У гэты час у еўрапейскай і шляхецкай модзе прадаўжае пашырацца выкарыстанне футра для аздобы верхняга адзення. Каштоўным футрам поўнасцю падшывалі або абшывалі криссе, ніз шуб, сукняў,

плашчоў, куртак, а таксама канцы рукавоў, з футра рабілі каўняры. Асабліва цанілася футра собаля, чарнабурай лісы (мармурок), бабра, рысі. На падбой выкарыстоўвалі таксама футра ваўка, куніцы, вавёркі. У зімовую дарогу апраналі аўчынныя кажухі і падбітыя мядзведжым футрам дэліі ці воўчым футрам шубы (вілчуру).

Беларускі феадальны горад прад'яўляў пэўныя патрабаванні да касцюма розных сацыяльных катэгорый гарадскіх жыхароў, што абгрунтоўваліся як існаваўшымі нормамі права, так і фактарамі сацыяльна-эканамічнага парадку. Асноўныя групы насельніцтва ў гарадах складалі рамеснікі, гандляры, сяляне, духавенства, тутжылі магнаты, княжацкія і магістрацкія служачыя, чэлядзь.

Разам з нормамі магдэбургскага права жыхары гарадоў Вялікага княства Літоўскага ўспрымалі і элементы касцюма цэхавых аб'яднанняў заходнееўрапейскіх гарадоў. Аднак недахоп гістарычных крыніц недазваляе прааналізавацькасцюмныя комплексы рамесных слаёў сярэдневяковага гарадскога насельніцтва Беларусі. Улічваючы, што магдэбургскае права спачатку прыйшло з Германіі ў гарады Польшчы, а затым пашырылася на тэрыторыі княства, можна меркаваць, што касцюм гарадскіх рамеснікаў на Беларусі быў у значнай меры падобным да касцюма цэхавых рамеснікаў Польшчы.

Паводле альбома-каталога Яна Матэйкі, касцюм гарадскіх рамеснікаў складаўся з кароткага аблягаючага суконнага каптана з прышыўным каптуром з доўгім завужаным канцом, звісаў ззаду амаль да паясніцы, вузкіх у абцяжку нагавіц, чаравікаў з доўгімі вузкімі насамі[62]. Касцюм дапаўняўся кароткім шырокім плашчом-накідкай.

Касцюм бяднейшай часткі гараджан (няцэхавых рамеснікаў, сялян, дробных гандляроў, слуг) фарміраваўся ў асноўным на мясцовых народных традыцыях, якія сваімі каранямі ўзыходзілі да ранніх гістарычных перыядаў, і, відаць, мала адрозніваўся ад сялянскага. Хатняе адзенне гэтай групы гарадскога насельніцтва складалі кашулі «кужэльныя» або «нзгребные»", палатняныя штаны летам, а ўзімку «штаны простого сукна»[64] ці «штоны сермяжные»[65]. Традыцыйным верхнім наплечным адзеннем таго часу былі світа і сукман. Зусім непрэстыжным адзеннем гараджан лічыліся кажухі і сярмягі[66].

З XVI ст. у гарады Беларусі актыўна пранікаюць і пашыраюцца ідэі рэлігійнай рэфармацыі і гуманізму. Мяшчане пачынаюць захапляцца пераважна лютэранствам, а сярод магнатаў становіцца модным кальвінізм, найбольшымі прыхільнікамі якога былі Радзівілы[67]. Сярод гэтых груп гарадскога насельніцтва пашыраецца гарадскі касцюм пратэстанцкіх краін, характэрнымі рысамі якога былі аблягаючы



**Касцюмы вучоных. 1548—1572 гг.**



**Касцюм э каўняром-фрэзай прадстаўніка вышэйшага саслоўя Рэчы Паспалітай.** Партрэт Анджэя Збароўскага — маршалка надворнага кароннага. Невядомы мастак. 1582 г.



**Касцюм з каўняром-фрэзай гараджаніна Рэчы Паспалітай.** Партрэт Генрыха Стробанда Старэйшага, райцы торуньскага. Невядомы мастак. 1582 г.

кароткі каптан з буфястымі каля плячэй рукавамі і глыбокім У-падобным выразам на грудзях, які адкрываў кашулю з каўняром-стойкай, вузкія штаны, кароткі шырокі плашч-накідка і плоскі берэт. Так апрануты на гравюры пратэстанцкі дзеяч Вялікага княства Літоўскага другой палавіны XVI ст. Васіль Цяпінскі. Паводле каталога адзення Яна Матэйкі, такі тып касцюма быў характэрны ў другой палавіне XVI ст. для сацыяльнай групы гараджан, якуюЯ. Матэйка называе «вучоныя»[68]. Адзенне духавенства, што пражывала ў гарадах Беларусі, як і паўсюдна, не мела этнічнай спецыфікі.

Сярод іспанскай знаці ў пачатку XVI ст. увайшоў у моду круглы каўнер з моцна накрухмаленай тонкай ільняной тканіны або карункаў, сабраных у мноства 8-падобных складак. Часам яго рабілі на драцяным каркасе і ён туга ахопліваў шыю. Па падабенстве яго называлі жорнамі, або фрэзай (ад франц. Гraізе). Мода на фрэзу ахапіла ўсю Заходнюю Еўропу і пратрымалася да 1630-ых гг. Як сведчаць партрэты надворнага кароннага маршалка Анджэя Збароўскага (1582 г.) і торуньскага райцы Генрыха Стробанда Старэйшага (1582 г.), напісаныя невядомымі мастакамі, не засталіся ў баку ад гэтай




**Касцюм гараджаніна.** Партрэт Васіля Цяпінскага са старажытнай гравюры. 1576 г.



**Касцюм шляхты XVI—XVII стст.** Шляхціц і ротмістр у жупанах і дэліях. Паводле гравюры А. Бруна




**Шляхецкі касцюм канца XVI ст.** Партрэт Пятра Краеўскага. Невядомы мастак з кола Марціна Кобера. 1583 г.

моды гараджане і вышэйшае саслоўе Рэчы Паспалітай.

У той час, калі каралеўскі двор і магнатэрыя Вялікага княства Літоўскага і Польшчы стараліся апранацца на ўзор палацавай моды Заходняй Еўропы, а заможныя групы гараджан ўспрымалі заходнееўрапейскае гарадское адзенне, касцюм шырокіх слаёў шляхты, жыццё якой праходзіла ў акружэнні і цесных узаемных кантактах і сувязях з вясковым насельніцтвам, не страціў і ў XVI—XVII стст. сваіх усходневізантыйскіх рыс, а з цягам часу яшчэ больш узбагаціўся запазычаннямі з турэцкага і татарскага касцюмаў. Для гэтага касцюма заставаліся характэрнымі доўгі, пашыраны ўніз сілуэт, выкарыстанне ў доўгім верхнім расхінным адзенні рознакаляровых усходніх узорыстых тканін.

Такі шляхецкі касцюм кантраставаў з заходнееўрапейскім касцюмам, што складаўся з кароткага аблягаючага каптана, штаноў у абцяжку і кароткага плашча, які насілі некаторыя пабываўшыя за мяжой шляхціцы і частка гараджан.

Сяляне, касцюм якіх развіваўся на ўсходнеславянскіх традыцыях, успрымалі складаны замежны касцюм паноў і гараджан як нешта смешнае і недарэчнае. Калі ў 1572 г. хатні настаўнік шляхціца з Падляшша Генрых Вольф з Цюрыха аднойчы заблудзіўся і заехаў у бліжэйшую вёску спытаць дарогу, сяляне збегліся і, пасміхаючыся глядзелі на яго замежнае адзенне, як на дзіва[69].

Шляхта была рыцарскім саслоўем і амаль пастаянна ўдзельнічала ў ваенных паходах і войнах з татарамі і туркамі, дзе ўсходняе адзенне і зброя праціўніка выклікалі захапленне сваёй раскошай і багаццем. Здабытыя ў баях адзенне і зброю з гонарам насілі як адзнаку сваёй храбрасці і адвагі[70], на ўзор гэтага адзення шылі мясцовае.

У асяроддзі сям'і мужчыны насілі няпоўны камплект адзення. Верхнія нагавіцы і кашуля звычайна дапаўняліся толькі безрукаўкай («камізэляй») або якім-небудзь кароткім каптанчыкам (жупіцай, саянікам, кабатам, казыякай, сукенкай). Другую разнавіднасць хатняга і вулічнага адзення складалі апранутыя на кашулю і нагавіцы лёгкія зіпун, сукня або жупан. У дажджлівае або халаднаватае надвор'е пры выхадзе на вуліцу зверху хатняга касцюма апраналі капеняк, суконны плашч.

Верхняй прадстаўнічай вопраткай у касцюме шляхты і гарадской вярхушкі ў канцы XVI ст. служылі армякі, дэліі, газукі, чугі і шубы, зімовыя варыянты якіх падшывалі сабалямі, кунамі, рысямі,

лісамі. Зверху іх пакрывалі аксамітнымі, узорыстымі шаўковымі тканінамі або сукном і ўпрыгожвалі шаўковымі шнурамі, пятліцамі, каштоўнымі гузамі, галуном, тасьмой.

Касцюм дапаўняўся багатым поясам, шапкай, падшытай каштоўным футрам, жоўтымі або чырвонымі саф'янавымі ботамі або паўботкамі. Усе прадметы плечавога і паяснога адзення шылі з імпартных тканін яркіх насычаных колераў, якія надавалі касцюму ўсходнюю каларыстыку і маляўнічасць.

На мяжы XVI—XVII стст. у касцюме шляхты пачынаюць узгадвацца новыя віды верхняга адзення ўсходняга паходжання: доўгая ферязь («феразыя», «фаразыя») і куртка-даламан. Упершыню ферязь («фаразыя») на тэрыторыі Беларусі ў археаграфічных крыніцах упамінаецца ў рыестры грашовых выдаткаў на пахаванне віцебскага ваяводы ў 1599 г.[71] Хутка ферязь і даламан набываюць шырокую папулярнасць і ўжо ў другім дзесяцігоддзі XVII ст. сустракаюцца амаль ва ўсіх інвентарах маёмасці і вопісах адзення шляхты Вялікага княства Літоўскага, а ў 1630-ых гадах ферязь уваходзіць у моду шляхты на польскіх землях Рэчы Паспалітай[72]. Ферязь і даламан насілі паверх падпяразанага поясам жупана.

Пад уздзеяннем ваеннага касцюма ў пачатку XVII ст. сталі шыць курткі са скуры, якія выкарыстоўвалі ў якасці штодзённага і дарожнага адзення. Аб гэтым гаворыць сціплае яго падшыццё і аздабленне. Калі рабаўнікі ў 1601 г. перанялі на дарозе зямяніна са Слонімскага павета, то знялі з яго: «курту лосюю новую бело выправленую, сукномь шарнмьнполотномьподшнтую... шапкучорную, футром рнснмь подшнтую...» (1601 г.)[73].

У інвентарах згадваюцца ферязі са стаячым каўняром, з пятліцамі: «феразыя цёмналазуровая, пятліц дзевяць, апроч гузікаў срэбныхь ліштвы атласу лазуровага» (1649 г.)[74].

Уяўленне аб гардэробе шляхціца пачатку XVII ст. дае пералік адзення Пятра Ракіцкага, якое было паграбленаў 1617 г. пры наездзе наяго памесце Ваверкі Ашмянскага павета. У яго забралі «ферезыю чырвоную полшарлатную, рысьямн шлямамн подшнтую, которая коштовала двесте золотыхь польскнхь; жупань аксамнтный чырвоный, который коштоваль трыдцать копь грошей; дылню бурнатную, фаленднішовую, кунм подшнтую, которая коштовала двадцать копь грошей Л нтовскнхь; курту адамашковую, лазуровую, которая коштовала дванадцатн копь грошей Лнтовскнхь; ферезыю зеленую,



**Шляхецкі касцюм сярэдзіны XVII — XVIII** ст. «Сакалінае паляванне». Мастак Ю. Косак 1868 г.



**Шляхецкі касцюм.** Партрэт князя Міхаіла Барысавіча.
Невядомы мастак. Канец XVI — пачатак XVII ст.



**Шляхецкі касцюм.** Партрэт Кшыштафа Весялоўскага.
Невядомы мастак. 1636 г.

фалендышовую, лнсы подшнтую, которая коштовала шестнадцать копь грошей Лнтовскнхь; даламаньзеленый, фалендышовый, который коштоваль шестн копь грошей Лмтовскнхь; колпакь морморковый аксамнтный, вышневый, который коштоваль двадцатн копь фошей Лнтовскнхь; колпачокь соболнй аксамнтный чорный, который коштоваль осмь копь грошей»[75].

У канцы XVI — пачатку XVII ст. у выяўленчым мастацтве Беларусі, як і на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай, склаўся своеасаблівы тып параднага партрэта, які атрымаў назву «сармацкага». Такія партрэты пісаліся мастакамі звычайна для фамільных галерэй Радзівілаў, Патоцкіх, Пацаў, Сапегаў, Тызенгаўзаў, Тышкевічаў і багатых шляхціцаў, якія імкнуліся пакінуць нашчадкам сведчанне сваіх заслуг, багацця, знакамітасці, падкрэсліць іх ролю ў дзяржаўных і вайсковых справах.

З гэтай мэтай мастакамі звярталася пільная ўвага на касцюм сваіх мадэляў, трактоўцы яго дэталяў, фактуру тканін, якія выкарыстоўваліся на пашыў розных яго частак, на ўзнагароды і атрыбуты ўлады.

Выявы партрэтуемых звычайна дапаўняліся вiдары-сам iх гербаў i дэвiзаў, а таксама каменцiруючым надпiсам, дзе паведамлялася пра iх дзяржаўныя па-сады, воiнскiя подзвiгi i ўзнагароды. Дзякуючы гэ-таму «сармацкi» партрэт дае падрабязнае ўяўленне аб касцюме сацыяльных вярхоў усiх рэгiёнаў Рэчы Паспалiтай XVI—XVIII стст. i з'яўляецца выключ-най крынiцай па яго вывучэннi. Касцюм гэтага пе-рыяду вызначаўся вялiкай разнастайнасцю i багац-цем.

Шляхецкi касцюм канца XVI — пачатку XVII ст. адлюстраваны на партрэце князя Мiхаiла Барыса-вiча, напiсаным невядомым мастаком. Гэта доўгi з вузкiмi рукавамi расклёшаны жупан з шаўковай шэра-зялёнай усходняй тканiны. Ад каўняра да лiнii талii ён зашпiлены на рад шчыльна пасаджаных адзiн да аднаго залатых гузiкаў. Жупан падпяразаны ску-раным мастацкай работы поясам, на якiм трыма-ецца шабля карабела. Зверху жупана апранута доў-гая з такой жа тканiны дэлiя, падшытая футрам рысi. На нагах вастраносыя жоўтага колеру боты, на па-голенай па шляхецкаму звычаю галаве невялiкая круглая шапачка. Засцежка жупаноў i iншых вiдаў верхняй мужчынскай вопраткi ўстык i толькi да талii, без заходу адной палы за другую, вельмi стара-жытная. Пры такой засцежцы полы не замiналi шляхцiцу садзiцца вярхом на каня, а гэта было вельмi важна ў час войнаў i ваенных паходаў, у якiх пра-ходзiла значная частка жыцця шляхты ў XVI— XVII стст. Да таго ж полы, якiя расхiналiся ў час хадзьбы, давалi магчымасць пахвалiцца iмпартным сукном нагавiц i каляровым сафьянавым абуткам, што таксама было немалаважным у часы, калi ба-гацце i значнасць асобы перш за ўсё падкрэслiва-лася раскошай касцюма.

З цягам часу даўжыня i крой розных прадметаў адзення змянялiся, уваходзiлi ваўжытак новыя шаў-ковыя тканiны i вiды сукнаў, набывалi папулярнасць тыя цi iншыя каляровыя спалучэннi розных частак касцюмнага комплексу.

Паводле пашыранай у шляхецкiм асяроддзi мяс-цовай моды 1630-ых гг. апрануты на партрэце 1636 г. гродзенскi стараста i маршалак ВКЛ Кшыштаф Ве-сялоўскi. На iм кароткi да каленяў жупан са стая-чым каўняром i скошанай правай палой, якая за-ходзiць на левую. Жупан падпяразаны скураным по-ясам з залатымi накладкамi. Ад каўняра да талii ён зашпiлены на шчыльны рад дробных гузiкаў, а ад талii пашыраны ўнiз за кошт бакавых клiноў. Шчыльная, залацiста-жоўтая тканiна жупана рас-шыта раслiнным узорам залатымi нiткамi. На пле-чы Весялоўскага наапашкi накiнута падшытая ры-сiным футрам чорная бескаўняровая ферезь, якая зашпiлена пад горлам круглай залатой чапрагай з каштоўнымi камянямi. Правая пала ферезi ўпры-гожана шасцю ажурнымi залатымi гузамi таксама з устаўкамi каштоўных камянёў. У правай руцэ ён трымае атрыбут сваёй пасады — маршальскi посах-жэзл з каралеўскай манаграмай «5Т» (Зiёiхггшпсiцз Тегiшз). Левая рука, па канонах «сармацкага» парт-рэта, абапiраецца на багата аздобленае дзяржанне шаблi.

Нешырокiя сiнiя нагавiцы засунуты ў жоўтыя выцяжныя (без прышыўных перадоў) боты з абца-самi i халявамi з фiгурным выразам. На стале ля-жыць мяккi чорны капялюш, упрыгожаны над iлбом залатым аграфам i кiтай з чорных пёраў.

Феразь заставалася прадстаўнiчым прадметам шляхецкага касцюма на працягу ўсяго XVII ст. Яе



**Маршальскiя жэзлы:**

1. Маршальскi жэзл. Польшча, да 1572 г.
2. Маршальскi жэзл Станiслава Геракліўша Любамiрскага. Польшча, 1683 г.
3. Маршальскi жэзл Станiслава Малахоўскага. Польшча, 1788 г.



**Магнацкі касцюм пачатку XVII** ст. Партрэт Станіслава Жалкеўскага. Невядомы мастак XIX ст.

султана»[78]. «Варварскія і скіфскія» касцюмы паслоў Рэчы Паспалітай у першай палавіне XVII ст. сваім багаццем, маляўнічасцю і раскошай здзіўлялі нават версальскі двор французскага караля ЛюдовікаXIIГ[9].

Французскі падарожнік дэ Лабурэр так апісваў прыезд польскай каралевы ў 1646 г. у Гданьск: «С велнколепнем, возбуднвшнм всеобшее нзумленне, выступплотряднздвухсотчеловекшляхты,прннадлежашей к знатнейшнм польскнм родам. Онн былн одеты н экнпнрованы как гером. Одежды нх былн большей частью персндскне златотканые с цветочным узором нлн нз бархатов разлнчнейшнх расцветок, самых редкнх нзо всех, какне только можно найтн на Леванте. Одежды былн подбнты бесценнымн мехамн: там былн собольн спннкн н пантеры, которые ценятся тем дороже соболей, чем больше кружков на лх шкуре. Под платьямн - нлн доломанамн — надеты богатые туннкн, которые называют жупанамн, почтн сплошь нз золототканого матернала нлн бархата, золота, серебра нлн шелка, вышнтые рукамн дам этой страны. Так же точно н головные уборы отделаны былн куньнм мехом, а кнты



**Шляхецкі касцюм сярэдзіны — канца XVII ст.** «Шляхціцы». Мастак Я. Косак. Паводле старажытнай гравюры

насілі прадстаўнікі магнацкіх родаў, шырокія слаі шляхты, служачыя мясцовых органаў улады і суда. Напрыклад, у 1631 г. рабаўнікі «злупнлн» з возщага Слонімскага павятовага суда «фаразыю фалендышовую блекнтную, вмлчымь хутром подшытую...» (1631 г.)[76].

Да сярэдзіны XVII ст. шляхта Вялікага княства Літоўскага і Польшчы не мела свайго этнічна акрэсленага касцюма. Касцюм шляхціца XVII ст., дэталі ваеннага ўзбраення, знакі ваенных адрозненняў мелі ўсходняе паходжанне". Так, тэрмін «армяк» у перакладзе з татарскага азначае адзенне, выробленае з поўсці вярблюда; «даламан» паходзіцьад турэцкага «долама» (чырвоны суконны плашч турэцкіх янычар); «епанча» — ад турэцкага «японджэ» (шырокі доўгі плашч з башлыком); «феразь» — ад турэцкага «фереджэ» (шырокае, без засцежкі халатападобнае верхняе адзенне). Усходняе паходжанне маюць жупан і шуба (ад араб. «джубба»), зіпун (ад араб. «забюн») і г. д. «Чым багацей шляхціц, — пісаў Я. Тазбір, — тым больш яго ўбор нагадваў убранне турэцкіх вяльмож і нават самаго турэцкага

(плюмажн) нз перьев черной цаплн нлн (заменявшне нх) одно ястребнное перо, схвачены былн в за-вненмостн от богатства аграфамн нз брнллнантов ценою в десять, двадцать, а то н трндцать тысяч та-леров ... конн былн покрыты разноцветнымн бар-хатнымн попонамн, расшнтымн золотом н сереб-ром, почтн у всех удила былн нз чнстого золота, нные же нз позолоченного серебра н сплошь украшен-ные всяческнмн драгоценностямн»[80].

Пышнасць выездаў шляхты на пасяджэнні сей-ма Рэчы Паспалітай 1677 г. уразіла і Б. Танера, які пісаў, што«ваяводымелітутарэнусваёйпыхлівасці, зайздросліва спаборнічаючы адзін з адным незвы-чайнай раскошай адзення як на сабе і на сваіх, так жа і на мностве служак, з якімі выязджалі яны што-дзённа ў палац; прычым ехаўшы ззаду і акружаўшы карэту натоўп чэлядзінцаў і салдат — альбо драгун, альбо па іх звычаю гайдукоў — уяўляў сабой такую пышную карціну, якая заставіла б маўчаць самага злоснага заіла»[81].

Чэлядзь (пахолікаў, гайд'укоў, паюкоў, казакоў, лакеяў, фурманаў і г. д.) паны апраналі ў ліберыю (барву) — ліўрэйнае адзенне сваіх гербавых коле-раў. Ліберыя была штодзённая і парадная «з галу-намі». Яшчэ ў канцы XVIII ст., калі бацька Ф. Бул-гарына, рускага пісьменніка і журналіста, які на-радзіўся і вырас у маёнтку Макавішчы Бабруйскага павета, выязджаў куды-небудзь са свайго памесця, то на запятках карэты, дзе ехала яго сям'я, стаялі двое вялізных лакеяў, апранутых па-венгерску, з вы-сокімі воўчымі шапкамі, гэтыя лакеі называліся гайдукамі. Бацька Ф. Булгарына ехаў вярхом, а за ім ездавы «у куртцы з галунамі, у шышаку з пер'ямі, з корцікам»[82].

Шыкоўныя выезды знаці і багатых дваран былі характэрны ў XVII—XVIII стст. для ўсёй Заходняй Еўропы, Рэчы Паспалітай і Расіі. Так, пры выездах віцэ-канцлера Кацярыны II графа І. А. Остэрмана на запятках яго карэты стаялі два гайдукі ў блакіт-ных епанчах (колер ліўрэі графа Остэрмана), пад якімі былі апрануты казакіны з сярэбранымі шнур-камі, падобныя на венгеркі, а на галовах высокія картузы з пер'ямі і сярэбранымі бляхамі спераду, на якіх было бачна вензелевае імя[83]. Караль Радзівіл (Пане Каханку) свой дваровы аркестр апранаў у ту-рэцкія касцюмы[84] і зваў яго «янычарняй».

Асноўнае адзенне шляхты XVI—**XVII** стст. скла-далася з нацельнай сарочкі, паверх якой надзявалі верхнюю — «кашулю», якая ў крыніцах XVI ст. час-та называецца «шатай нсподняй». Паясным адзен-нем служылі нагавіцы розных мадыфікацый (турэц-кага тыпу шырокія шаравары, кароткія, плюндры, або звычайныя, нешырокія).



Заходнееўрапейскі палацавы касцюм. Партрэт караля Рэчы Паспалітай і вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Уладзіслава IV Вазы. Невядомы гданьскі мастак. 1630-ыя гг.



Заходнееўрапейскі палацавы касцюм. Партрэт Януша Радзівіла. Мастак Барталамей Стробель. 1630-ыя гг.



Заходнееўрапейскі **палацавы касцюм.** Партрэт Уладзіслава Дамініка Астрожскага. Мастак Барталамей Стробель. 1630-ыя гг.

У склад лёгкага хатняга і вулічнага касцюма шляхты і гараджан у XVI—XVII стст. у залежнасці ад абставін уваходзілі кароткія каптаны: кабат, ка-зыяка, жупіца, саянік, янкгер, сукенка, фалыігурка або доўгія жупан ці зіпун.

На аснове аналізу актавых матэрыялаў і іншых гістарычных крыніц таго часу можна пагадзіцца з вывадам археолагаў, што касцюм заможных га-радскіх вярхоў у XVI—XVII стст. не меў прынцыпо-вага адрознення ад шляхецкага[85]. Доўгай верхняй плечавой вопраткай, якая ўваходзіла ў касцюм га-раджан і шляхты і якую апраналі паверх жупана, былі дэлія, ферэзія, газука, аднарадка, чамара, армяк, ахабень, фальшура, бекеша, сукман, чуга і інш.

Дэмісезоннай кароткай верхняй плечавой воп-раткай служылі каптан, курта, карватка, даламан, сердак, падшытыя футрам саянік, сукенка і інш.

Адзеннем, якое засцерагала ад непагоды, з'яўля-ліся бурка, дэлія, даламан, епанча, капеняк, плашч, веленс.

Узімку апраналі футра, пашытае поўнасцю на-ружу, кажух або адзенне, падбітае футрам: шубу, дэ-лію, вілчуру, збіцень, мілаць, тарлоп і інш.

Пра шырокае распаўсюджанне еўрапейскай прыдворнай моды сярод магнатэрыі ВКЛ сведчыць партрэт Януша Радзівіла, намаляваны ў 1630-ых гг. прыдворным мастаком польскага караля Бартала-меем Стробелем. Партрэт напісаны пасля атрыман-ня Радзівілам пасады падскарбія Вялікага княства Літоўскага, аб чым сведчыць ляжачы на стале вялікі залаты ключ з ланцужком. Я. Радзівіл апрануты ў касцюм з сярэбрана-чырвонай парчы, вытканай у геаметрычны ўзор, які пашыты па прыдворнай фран-цузскай модзе 1630-ых гг. караля Людовіка XIII. Ён складаўся з кароткай куртачкі-пурпуэна з завыша-най, незафіксаванай таліяй, перахопленага пасярэ-дзіне грудзей поясам-паскам, ад якога ўніз да таліі ідуць кароткія, злёгку расклёшаныя полы. Ад шыі да пояса-паска пурпуэн зашпілены на шчыльны рад дробных залатых гузікаў з каштоўнымі камянямі і аздоблены вялікім адкладным з тонкага светла-бла-кітнага палатна каўняром, упрыгожаным па краях шырокім шлякам каштоўных карункаў. Такія ж карункі ўпрыгожваюць манжэты-раструбы. Каўнер і манжэты моцна накрухмалены і падтрымліваюц-ца спецыяльным каркасам. Пышныя шырокія ру-кавы пурпуэна Я. Радзівіла маюць проразь па пярэд-няму шву ад проймы да запясця, праз якую відаць шоўк белай сарочкі. За манжэт правага рукава за-кладзена чырвоная шаўковая хустачка-насоўка, а праз левую руку перакінуты аксамітны плашч-ман-тыя пурпуровага колеру.

У 1630-ыя гг. пры французскім двары сталі насіць доўгія, завітыя знізу валасы, якія спускаліся на пле-чы, а тыя, хто не меў пышных валасоў, сталі замя-няць іх парыкамі. Лічыцца, што Людовік XIII, які

быў адхілены ад кіраўніцтва дзяржавай уладалюбі-вым кардыналам Рышэлье, займаўся ўсялякімі за-бавамі і ўвёў моду брыць бараду, пакідаючы толькі пасярэдзіне падбародка кусцік валасоў і закручаныя ўверх вусы[86]. Менавіта такая прычоска і бародка на партрэце ў Януша Радзівіла.

Прыблізна ў гэты ж час Стробелем быў напіса-ны і партрэт маладога заслаўскага князя Уладзісла-ва Даменіка Заслаўскага-Астрожскага, які, па свед-чанню сучаснікаў, быў высокаадукаваным чалаве-кам, ведаў некалькі замежных моў, любіў літарату-ру і сам спрабаваў пісаць[87].

Апрануты Уладзіслаў Дамінік у касцюм з карыч-нева-сярэбранай парчы, пашыты па той жа фран-цузскай прыдворнай модзе, што і касцюм Я. Радзі-віла, але, у адрозненне ад апошняга, мае шмат уп-рыгожваючых элементаў. Так, полы пурпуэна, про-разі шырокіх рукавоў, праз якія бачна сарочка, ба-кавыя швы нагавіц аблямованы вузкім шлякам, вы-шытым шоўкам і залатой ніткай, над пояском-пе-рахватам пасярэдзіне грудзей прымацаваны карыч-невы шаўковы бант-разетка. Яшчэ два банты пры-шыты да пояска пурпуэна. Нагавіцы-брыджы заву-жаны да кален, а ніз штанін упрыгожаны парчовай стужкай з бантам, з-пад якой на адвароты ботаў спус-каюцца карункі.

Менавіта пры Людовіку XIII у французскай пры-дворнай модзе вялікае значэнне сталі надаваць бя-лізне. Таму па тагачаснай модзе пурпуэн Уладзісла-ва Даменіка зашпілены зверху толькі да пояска-пе-рахвата, яго полачкі разышліся, і праз гэты трохву-гольнік бачна светла-блакітная шаўковая кашуля з вышыўкай на грудзях.

Касцюм дапоўнены вялікім адкладным каўня-ром з шыкоўных брабанцкіх карункаў, якія закры-ваюць плечы і спускаюцца на пышныя рукавы з шырокімі карункавымі манжэтамі-раструбамі. На нагах Астрожскага светла-бежавыя боты мушкецёр-скага тыпу з мяккім галянішчам і вялікай фігурнай чатырохпялёсткавай накладкай на пад'ёме, праз якую праходзіць раменьчык са спражкай, што пры-мацоўвае да ботаў шпоры, якія з элемента ваеннага рыштунку ператварыліся ў гэтым касцюме ў модны аксесуар абутку. Насок у ботаў усечана-тупы. За-вяршае касцюм чорны з аксаміту капялюш з шы-рокімі палямі і плюмажам са страусавых пер'яў.

Параўноўваючы гэтыя два партрэты, напісаныя адным мастаком у тыя ж гады, можна адзначыць, што за ўсімі тонкасцямі тагачаснай моды сачыла перш за ўсё моладзь. Касцюм жа Януша Радзівіла, які займаў адну з найвышэйшых пасад у Вялікім княстве Літоўскім, хаця і пашыты па апошняй еў-рапейскай модзе і ўражвае багаццем, але значна больш строгі, чым у Астрожскага. Калі пурпуэн Я. Радзівіла ўпрыгожвае толькі радок густа паса-джаных маленькіх гузікаў з устаўкамі каштоўных



**Заходнееўрапейскі палацавы касцюм.** Партрэт Альбрэхта Станіслава Радзівіла. Невядомы мастак



**Заходнееўрапейскі палацавы касцюм са штанамі-рэнгравамі.** Партрэт польскага караля і вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Яна Казіміра. 1640—1650 гг.



**Каралеўскі касцюм.** Партрэт караля Рэчы Паспалітай і вялікага князя літоўскага Яна Казіміра. Мастак Д. Шульц. Каля 1650 г.

камянёў, то ў Астрожскага ўпрыгожвае касцюм шмат бантаў і карункаў. Аднак пераважная большасць шляхты апраналася ў традыцыйны жупан, зверху якога апраналі доўгае або кароткае верхняе адзенне.

Палацавая мода Францыі часта мянялася. У 1640-ыя гг., у час ажыўлення франка-іспанскіх адносін, модным пры французскім каралеўскім двары становіцца касцюм «а ль'эспаньёль» («а Ге5ра§-поіе»), і адразу ж у такім касцюме прадстаўлен Альбрэхт Станіслаў Радзівіл на партрэце 1640 г., напісаным невядомым мастаком.

Касцюм яго складаецца з кароткага чорнага аблягаючага каптана, па засцежцы да таліі аздобленага вузкай паскай белага шоўку, і кароткіх да кален штаноў, калашыны якіх заканчваюцца фестонамі. На каптан апрануты кароткі шырокі плашч-накідка, паверх якога выпушчаны блакітны адкладны каўнер, абшыты белымі карункамі. Манжэтамі з блакітнага шоўку з карункамі аздоблены і рукавы каптана.

На нагах Радзівіла абуты чорныя тупаносыя боты з залатымі шпорамі і вялізнымі адваротамі, запоўненымі белымі карункамі. Аднак уплыў Іспаніі, дзе галоўным сродкам унутранай палітыкі была інквізіцыя і якая паступова ператваралася ўдругарадную дзяржаву, на палацавую моду Францыі і Рэчы Паспалітай хутка аслабеў, саступіўшы месца французскай модзе, пад уздзеянне якой падпадалі перш за ўсё прадстаўнікі маладога пакалення магнатэрыі Вялікага княства Літоўскага.

У сярэдзіне XVII ст. пры двары Людовіка XIV у палацавую моду ўваходзяць рэнгравы — спадніцападобныя штаны ў выглядзе кароткіх шырокіх штаноў, ніз якіх аздабляўся карункамі. Надзяваліся рэнгравы зверху вузкіх штаноў, да якіх падвязкамі мацаваліся шаўковыя панчохі. Такая мода па дзівацтву французскага караля-Сонца пратрымалася ў Еўропе каля сарака гадоў. У касцюме з рэгравамі адлюстраваны на партрэце кароль Рэчы Паспалітай Ян Казімір, хаця на парадным партрэце Даніэля Шульца (каля 1650 г.) ён паказаны ў «сармацкім» касцюме.

Нашэнне касцюма, пашытага па тагачаснай агульнаеўрапейскай палацавай модзе, якую часцей за ўсё ў гэты перыяд дыктавала Францыя, або шляхецкага, вызначалася ў каралеўскім двары Рэчы Паспалітай рознымі акалічнасцямі. На афіцыйныя прыёмы, калі трэба было прадстаўляць дзяржаву, кароль і вышэйшая знаць апраналіся ў «свой» шляхецкі касцюм, а ў час мерапрыемстваў, не маючых прадстаўнічага характару, кароль і магнатэрыя насілі адзенне згодна сваім палітычным поглядам, густу і ўзросту.

З узростам шмат хто з прадстаўнікоў сацыяльнай вярхушкі Вялікага княства Літоўскага пераходзіў з еўрапейскай моды на мясцовую шляхецкую.



**Шляхецкі касцюм.**
Партрэт Януша Радзівіла. Невядомы мастак. 1650-ыя гг.

Так, калі ў сталыя гады Януш Радзівіл займаў пасаду вялікага гетмана літоўскага, то апранаўся ўжо ў «свой», звыклы для шляхты касцюм. Аб гэтым гаворыць другі яго партрэт, напісаны невядомым мастаком праз дваццаць гадоў пасля першага. На ім Радзівіл паказаны ў доўгім аксамітным жупане карычнева-залацістага колеру, са стаячым каўняром, які зашпілены да таліі на рад шчыльна пасаджаных залатых гузікаў з устаўкамі каштоўных камянёў. Жупан падпяразаны мяккім персідскім ці кітайскім поясам у тон жупану, зверху накінута на плечы яркачырвоная, падбітая чорным футрам дэлія, сашчэпленая пад горлам круглай залатой чапрагай, якая дапаўняецца шырокім залатым з камянямі ланцу-



**Заходнееўрапейскі палацавы касцюм.** Партрэт Аляксандра Астрожскага. Невядомы мастак. 1660—1670-ыя гг.

гом з фігурнай засцежкай. На нагах жоўтага колеру саф'янавыя боты з вострым наском і невялікім (на палову пяты) слоеным скураным абцасам. Галава Я. Радзівіла па шляхецкаму звычаю высока падбрыта, толькі на макушцы пакінуты традыцыйны чуб. Збрыта і бародка, замест яе — доўгія вусы. У такім касцюме ён мала выдзяляўся з асяроддзя ваеннай рыцарскай шляхты, конніца якой пры Янушу Радзівілу лічылася лепшай у Еўропе.

Здругой чвэрці XVII ст. у палацавай модзе Францыі атрымоўваюць пашырэнне парыкі, якія надавалі мужчынскаму абліччу велічнасць, недаступнасць і сімвалізавалі знатнасць, дваранскія прывілеі. У 1660— 1670-ых гг. у Францыі сярод знаці модным становіцца алонжавы парык, які складаўся са шматлікіх радоў буйных локанаў, якія ўкладваліся гарызантальна. Над ілбом узбівалі тупей, а на грудзі і спіну амаль да паясніцы спускаліся брыды. Для вырабу парыкоў закупалі белакурыя жаночыя валасы ў многіх правінцыях Францыі. Для завіўкі іх сталі прымяняць гарачы пар, што было адкрыццём XVII ст. Паступова цяга да рэгламентацыі пашыры-лася і на парыкі. Рознага тыпу парыкі прадпісана было насіць юрыстам і суддзям, служыцелям царк-вы, знакамітым асобам і трэцяму саслоўю. Ваен-ныя павінны былі насіць «брыгадзірскі» парык, які ззаду завязвалі бантам. Лічыцца, што прускі кароль Фрыдрых 1(1657—1713) стаўвынаходнікаммужчынскага парыка з хвастом і буклямі на вісках. Мода на такія парыкі паступова стала агульнаеўрапейскай. Такі парык па прускаму абразцу ўвёў у рускай арміі Павел І.

У 1660-ых гг. у палацавай модзе Францыі з'яўляецца новы від прыдворнага мужчынскага адзення каптаннага тыпу без каўняра, завужанага ў таліі, даўжынёй да кален. Яго крой і назва «жустакор» Сішіаідсогрз) азначае «шчыльна да стану (цела)». Далейшае развіццё прыдворнага мужчынскага касцюма ў Францыі і Заходняй Еўропе на працягу апошняй чвэрці **XVII** і ўсяго **XVIII** ст. з'яўлялася эвалюцыяй гэтай формы адзення.

Паміж 1660 і 1670-і гг. жустакор меў кароткія рукавы, з-пад якіх наружу выстаўляліся пышныя рукавы кашулі. Зверху кашулі пад жустакор апраналі доўгую безрукаўку — весту («уезіе»). Сілуэт жустакора з расклёшанымі поламі падкрэсліваў талію і расшыраў фігуру ў баках. У комплексе з вестай і жустакорам насілі новай формы шырокія штаны да кален і на высокіх абцасах глыбокія туфлі, з усечаным наском, якія зашпіляліся напад'ёме церазязык туфля засцежкай у форме вострага банта.

Кардынал Мазарыні ў гэты час выдаў шэраг арданансаў супраць раскошы ў адзенні і забараніў аздабляць касцюм залатым і сярэбраным пазументам. Таму мужчынскі прыдворны касцюм пачалі ўпрыгожваць толькі стужкамі.

Менавіта ў такі прыдворны французскі касцюм апрануты князь Аляксандр Астрожскі на партрэце, напісаным невядомым мясцовым мастаком, верагодна ў канцы 1660 — пачатку 1670-ых гг. Гэта партрэт, напісаны па ўсіх канонах параднага партрэта таго часу. Малады князь намаляваны ва ўвесь рост апранутым па апошняй модзе двара Людовіка **XIV.** На ім моднага карычнева-табачнага колеру бескаўняровы жустакор са шчыльным радам дробных залатых гузікаў ад шыі да ніжняга краю правай палы, а па краю левай — такім жа радам праразных петляў, аздобленых залатой ніццю. Па парыжскай прыдворнай модзе жустакор зашпілены толькі да сярэдзіны грудзей. Вельмі нізка размешчаныя і коса прарэзаныя кішэні з клапанамі таксама аздоблены радам гузікаў.

З-пад жустакора відаць расшытая залатымі і сярэбранымі ніткамі частка доўгай весты (камзола).



**Шляхецкі касцюмны комплекс з кунтушом.**
Партрэт Юсіфа Міхайлавіча Жагеля. Невядомы мастак.
Канец XVIII — пачатак **XIX ст.**



**Ваенізаваны касцюм вышэйшага саслоўя.**
Партрэт польнага гетмана літоўскага Вінсэнта Гасеўскага.
Мастак Д. Шульц. Каля 1662 г.

Вельмі пышныя, пашыраныя ўніз рукавы тонкай белай кашулі завязаны вышэй запясця зялёнымі і чырвонымі стужкамі. Петлямі з такіх жа стужак перахвачаны рукавы кашулі вышэй локця. Канцы стужак заканчваюцца металічнымі наканечнікамі («эгійетамі»). Пучкамі такіх жа стужак упрыгожаны плечы і падвязкі панчох. З-пад кароткіх рукавоў жустакора, аздобленых па краю радам залацістых гузікаў, выпушчана палоска іспанскіх карункаў, сплеценых з залатых ніцей. Пучком стужак упрыгожаны мяккі стаячы каўнер кашулі з карункавым жабо, вылажаным зверху жустакора.

Штаніны нагавіц, якія нагадваюць падушкі, для захавання формы ў такім касцюме набівалі пяром, пакляй, конскім воласам. На нагах у Астрожскага надзеты пашытыя з такога ж карычнева-табачнага сукна панчохі, падвязаныя пад каленамі пучкамі стужак, і светла-карычневага колеру глыбокія туфлі на высокіх абцасах з усечаным наскам, якія зашпілены на пад'ёме засцежкай у выглядзе вострага банта.

На галаве ў Астрожскага пышны алонжавы парык, а злева, з проразі жустакора праглядае эфес шаблі. Справа на століку ляжыць капялюш з шырокімі загнутымі палямі, краі якога аздоблены залатым пазументам.

У 1640-ых гг. сярод шляхты на тэрыторыі Рэчы Паспалітай пашыраецца новы від верхняга наплечнага адзення — кунтуш[88], які быў пераняты ў венграў, а ў Венгрыю прыйшоў з Усходу (вянг. копібх). Гэта быў каптан з характэрнымі адкіднымі рукавамі, якія сталыя, паважаныя людзі закідвалі за плечы. У спалучэнні з жупанам і доўгімі нагавіцамі, якія запраўляліся ў боты, ён хутка стаў асноўным касцюмным комплексам усіх станаў шляхты, вярхушкі гараджан і служачых гарадскіх магістратаў амаль да канца XVIII ст. Кунтушы насілі ў Венгрыі, Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзілі беларускія і ўкраінскія землі, а таксама ў Германіі і Аўстрыі. Шылі кунтушы з самых розных тканін. Былі яны летнія (з шаўковых тканін, без падшэўкі), з розных відаў і гатункаў сукна на падшэўцы з палатна і грубага сукна — кіру[89], а часам і на футры.

Плебан рэчыцкага касцёла Я. Кітовіч у сваіх мемуарах пісаў, што ў XVIII ст. старэйшая шляхта «ў будні дзень насіла суконныя пунсовыя жупаны, да



**Шляхецкі касцюм.** Партрэт Кшыштафа Хадкевіча. Невядомы мастак. Сярэдзіна — 2-ая палавіна XVII ст.

якіх пад шыяй прышывалі маленькія сярэбраныя або пазалочаныя гузічкі з дробненькімі рубінамі, асаджонымі па баках. Насілі таксама суконныя кунтушы з шасціма вялікімі гузамі ў форме пладоў глогу — велічынёй з арэх; гэтыя гузы былі з тонкага вырабу белага срэбра або пярэста пазалочаныя з маленькімі рубінамі...»[90].

У археаграфічных крыніцах кунтуш на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага ўпамінаецца ўпершыню ў вопісе маёмасці віленскага бурмістра Сцяпана Лябедзіча ў 1649 г.: «кунтуш лазуровы, лісамі старымі падшыты» (1649 г.)[91].

Пад кунтуш, падпяразаны мяккім, усходняга тыпу поясам, паддзявалі жупан з шаўковых тканін або аксаміту. Часам спіна жупана, прыкрытая кунтушом, шылася з танных тканін або даматканага палатна[92]. Калі кунтуш знашваўся, а імпартныя тканіны каштавалі вельмі дорага, яго часта перашывалі ў жупан: «На перешыте барвы старой... зь кунтушовь на жупаны, кождому по золотому н осм. пятнадцать» (1699 г.)[93].

У сярэдзіне XVII ст. у гарадскіх і дзяржаўных установах ужо выкарыстоўвалася афіцыйнае службовае адзенне, якое называлі «барвай», або «ліберыяй».

Спецыяльны службовы касцюм колераў гарадскога герба (барву, ліберыю з вышытым ці нашытым на кунтушу гербам горада) насілі служачыя гарадскога магістрата, магістрацкага суда, конныя



**Касцюмы мяшчан.** 1633—1668-ыя гг



Гарадскі заходнееўрапейскі касцюм пачатку XVII ст. «Чытанне маршапкам папскай булы на будаўніцтва манастыроў у Магілёве ў XVII ст». Мастак П. Пятроўскі. Фрэска касцёла Св. Станіслава ў Магілёве, пабудаванага ў 1752 г.

пляцовыя вартавыя і г. д.: «Самь пань райца сторговаль сукна... на лнберыю н портькн» (1697 г.)[94]; «дворннку... барву справовать... теды далн ему на жупань н порткн... золотыхтрыдцать» (1681 г.)[95]. Сродкі на службовае адзенне выдаткоўваліся з гарадской казны. За кошт гарадскога магістрата спраўлялі касцюм і гарадскому кату, якога апраналі ва ўсё чырвонае: «Сукна чнрвоного на кунтушь н на жупань н на сподне мнстру...» (1682 г.)[96].

У 1667 г. у мястэчку Андрусава на Смаленшчыне паміж Рускай дзяржавай і Рэччу Паспалітай было заключана перамір'е, якое паклала канец спусташальнай трынаццацігадовай вайне. У дагавор быў уключаны артыкул аб арганізацыі рэгулярнай пошты. На аснове гэтага артыкула быў створаны паштовы тракт: Масква—Мажайск—Вязьма—Смаленск—Магілёў—Мінск—Вільня. Далей дзейнічалі ўжо існаваўшыя паштовыя тракты на Варшаву і Кёнігсберг. Па графіку пошта з Масквы да Вільні дастаўлялася за восем сутак, а да Кенігсберга — за дванаццаць. Усім прыватным асобам прадпісвалася, каб іх пісьмы за мяжу «не праз іншых людзей, але праз статутныя пошты пасылаліся, у паштароў запісаны былі»[97].

Першы паштар, які вёз карэспандэнцыю, адрасаваную ў Вільню і далей, выехаў з Масквы 11 сакавіка 1669 г. Ён быў апрануты ў зялёны суконны кафтан, на правым баку якога быў нашыты двухгаловы арол, а з левага — паштовы ражок. На галаве была шапка з чатырохвугольным верхам, а на нагах - боты. Да скуранога пояса прывешвалася шабля. Паштар Рэчы Паспалітай быў апрануты так жа, толькі на яго кафтане быў нашыты аднагаловы белы арол[98].

Памяшканне, дзе захоўвалася раскошнае адзенне магнатаў, называлася шатняй, ёю загадваў спецыяльны прыдворны чын — шатны.

У яго веданні знаходзіліся жупаны з залатой і сярэбранай парчы, кунтушы, упрыгожаныя цэлымі шнуркамі перлін або брыльянтавых нітак з гузікамі з каштоўных камянёў і такімі ж запінкамі, залатыя і сярэбраныя паясы з каштоўных пярсідскіх шаляў і ўсходніх тканін.

Па сваіх сацыяльна-палітычных поглядах магнаты Вялікага княства Літоўскага падзяляліся на кансерватараў-«сарматаў» і «касмапалітаў»-рэфарматараў. «Сарматы» выступалі супраць усякіх но-

ваўвядзенняў, імкнучыся захаваць нязменнымі стыль жыцця, літаратурныя і мастацкія густы, адзенне. «Касмапаліты» прыхільна адносіліся да еўрапейскай культуры, нямецкай і парыжскай моды. У сувязі з гэтым з другой паловы XVII і да канца XVIII ст. палацавая мода ў Вялікім княстве Літоўскім, як і ва ўсёй Рэчы Паспалітай, развівалася па двух не звязаных адзін з другім напрамках. Частка магнатэрыі княства (пераважна моладзь) прытрымлівалася панаваўшай у Заходняй Еўропе французскай прыдворнай моды, другая частка знаці апраналася ў «сармацкі» касцюм з жупанам і кунтушом.

Прыхільнасць таго ці іншага прадстаўніка знаці да еўрапейскага ці «сармацкага» касцюма залежала ад многіх фактараў, і перш за ўсё — ад палітычнай арыентацыі, займаемай пасады, узросту, выхавання. З узростам многія, як Януш Радзівіл, пераходзілі з еўрапейскага на больш зручны і прыстасаваны да ладу жыцця служылай шляхты «сармацкі» касцюм, другія і ў старасці строга прытрымліваліся французскай моды і еўрапейскага стылю жыцця, трэція



Ордэнскі **касцюм да ордэна** Святога Станіслава. Належаў маршалку літоўскаму Станіславу Солтану. 1780-ыя гг.



Ордэнскі **касцюм** да ордэна Белага Арла. Партрэт Канстанціна Людвіка Плятэра. Мастак Ф. Касталдзі. 1760—1762-ыя гг.

апраналі еўрапейскі касцюм толькі на ўрачыстыя мерапрыемствы і святы, чацвёртыя, выступаючы супраць усялякіх рэформ, прынцыпова апраналіся «па-сармацку». Так, напрыклад, Караль Радзівіл (Пане Каханку) нават у апошняй чвэрці XVIII ст., калі амаль уся знаць Вялікага княства Літоўскага перайшла на еўрапейскі касцюм, апранаўся толькі ў свой «альбінскі касцюм» (жупан блакітны, кунтуш саламянага колеру), які ён насіў у Альбе пад Нясвіжам, або мундзір Віленскага ваяводства (цёмна-сіні кунтуш з найлепшага галандскага фалендышу з пунсовымі адваротамі і таксама пунсовы жупан з альтамбасу ў залаты дробны ўзор з запінкай і гузікамі з рубінамі, а таксама багаты персідскі пояс,



**Парадны касцюм вышэйшага саслоўя.** Партрэт Міхала Казіміра Агінскага. Невядомы мастак. Пасля 1754 г.

які ззяў усімі колерамі вясёлкі)[99]. Летам у будні дні ён, наогул, любіў хадзіць у «сялянскім» адзенні, гаворачы, што ў ім зручней, чым у «французскім»[100].

Значны ўплыў на распаўсюджанне шляхецкага («сармацкага») касцюма ў магнацкім асяроддзі аказаўЯн III Сабескі, які заўжды хадзіўу жупане і кунтушу, зрабіўшы гэты касцюм прадстаўнічым у каралеўскім палацы. Навату бітве пад Венай у 1683 г., дзе войскі Рэчы Паспалітай разам з аўстрыйскімі вайскамі пад яго камандаваннем перамаглі туркаў, Ян III Сабескі быў апрануты ў блакітны кунтуш і белы шаўковы жупан[101].

Каб замацаваць саслоўны прэстыж шляхты, сейм Рэчы Паспалітай у 1613, 1620, 1665 гг. прыняў некалькі канстытуцый (пастаноў), рэгламентуючых адзенне нешляхецкіх саслоўяў. Па сеймавай канстытуцыі 1613 г. мяшчанам забаранялася шыць адзенне з шоўку і каштоўных футраў. Пастановай 1620 г. асобам нешляхецкага звання забаранялася насіць упрыгожанні з золата, серабра, перлін, а таксама каштоўнае футра, шаблі і шпагі, а сейм 1665 г. усталяваў штраф за нашэнне мяшчанамі адзення з каштоўных тканін і футра.

Найбольш пашыраным штодзённым адзеннем гараджан з сярэдзіны XVII ст. былі жупан, сукман, кажух і ў найбольш бедных сярмяга. Кунтуш апра-налі звычайна толькі ў святы, часам аздабляючы яго сукном іншага колеру: «кнру жолтого купнлн на лнштвы до кунтуша локтн два» (1691 г.)[102]. Аднак насілі і заходнееўрапейскі касцюм.

Адзенне прадстаўніка гарадской улады г. Магі-лёва пачатку XVII ст. і беларускай шляхты сярэдзі-ны XVIII ст. добра паказана на фрэсцы «Чытанне маршалкам папскай булы на будаўніцтва манасты-роў у Магілёве ў XVII ст.» у касцёле Святога Стані-слава ў Магілёве.



**Касцюм магната па французскай модзе.** Партрэт Станіслава Косткі Патоцкага. Мастак Ж.-Л. Давід. 1781 г.



**Шляхецкі касцюмны комплекс з кунтушом.** Партрэт Ігнація Завішы, маршалка надворнага ВКЛ, старосты Бабруйскага і Мінскага. Невядомы мастак. 1732 г.

Намаляваны на фрэсцы маршалак, які чытае папскую булу, апрануты ў заходнееўрапейскі гарадскі касцюм: капялюш з высокай, завужанай уверх тульяй, упрыгожаны стравусавымі пер'ямі; кароткі атласны каптан жоўта-залацістага колеру, з-пад якога выступаюць кароткія, пашытыя са стужак блакітнага колеру нагавіцы, якія надзеты на аблягаючыя ногі трыко. На нагах белыя туфлі без абцасаў, завязаныя на пад'ёме стужкамі, і белыя панчохі, падвязаныя пад каленкамі жоўтымі шаўковымі падвязкамі.

Справа на фрэсцы намалявана фігура шляхціца ў сучасным мастаку «сармацкім» касцюме: блакітным ордэровым кунтушы-чэхмане 1750-ых гг. зразразнымі рукавамі, якія насілі надзетымі нармальна, а не звісаючым, і вышытым злева на грудзях ордэнам. З-пад кунтуша знізу і ў разрэзы рукавоў відаць гранатавага колеру жупан. На шыі з-пад кунтуша выступае стаячы каўнер белай кашулі. Кунтуш падпяразаны залататканым слуцкім або персідскім поясам. З левага боку на залацістай тасьме замацавана багата аздобленая шабля-карабела. На высока падбрытай галаве шляхціца надзета высокая блакітная шапка з шэрым футраным аколышам, на нагах — чырвоныя боты. На парадных партрэтах гэтага часу было модным маляваць магнатаў у ваенізаваным касцюме, каб падкрэсліць іх «сармацкае» паходжанне.

Францыя ў XVIII ст. стала адзінай заканадаўцай моды ў Еўропе. Далейшую эвалюцыю прыдворнага французскага касцюма, які выкарыстоўваўся магнатэрыяй Вялікага княства Літоўскага ў гэтым стагоддзі, дае магчымасць прасачыць партрэт Міхала Казіміра Агінскага — дзядзькі кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага. Міхал Казімір Агінскі — гетман вялікі літоўскі — стварыў у Слоніме оперны тэатр і капэлу, адкрыў друкарню, пабудаваў на свае сродкі канал, які злучыў Ясельду (прыток Прыпяці) і Шчару (прыток Нёмана). На парадным партрэце, напісаным невядомым мастаком пасля 1754 г., М. К. Агінскі апрануты ў суконны, кармазінавага колеру каптан-жустакор без каўняра з шырокімі абшлагамі-раструбамі на рукавах. Краі полаў да таліі, каўнерны выраз каптана абшыты залацістакарычневым аксамітам з сярэбраным шыццём. З такога ж аксаміту шырокія абшлагі і нагавіцы, запраўленыя ў высокія чорныя боты на даволі высокім абцасе са шпорамі. Вышыўкай сярэбранай ніццю ўпрыгожаны таксама праразныя кішэні з фігурным клапанам. На рукавах з-пад абшлагаў каптана выступаюцьтонкія карункі белай кашулі. Праз плячо павязана блакітная муаравая стужка Ордэна Белага Арла.



**Шляхецкі касцюм.** Партрэт Андрэя Укольскага. Невядомы мастак. III чвэрць XVIII ст.

Пад каптаном на шэры шаўковы камзол з сярэбранай вышыўкай надзеты баявы панцыр, паверх якога апяразаны слуцкі пояс, на шыі павязаны чорны шаўковы гальштук, а на галаве белы напудраны парык з буклямі і касіцай.

Такім чынам партрэтны жывапіс XVII— XVIII стст. Беларусі паказвае, што прадстаўнікі сацыяльнай вярхушкі Вялікага княства Літоўскага шырока карысталіся ўсімі дасягненнямі еўрапейскай цывілізацыі, у тым ліку і дасягненнямі матэрыяльнай культуры, важнай часткай якой з'яўляецца касцюм.

У XVIII ст. магнаты часта забаўляліся рыцарскімі гульнямі, якія называліся каруселямі («карузэлямі»), арганізуючы конныя «рыцарскія» баі і спаборніцтвы. Удзельнікі каруселі звычайна дзяліліся на 2, а часцей на 4 конныя атрады («кадрылі», «банды»), кожная з якіх апраналася ў псеўданацыянальнае адзенне: рымскае, турэцкае, індыйскае, славянскае[103].

Нягледзячы на тое што многія з магнатаў і багатай шляхты Вялікага княства Літоўскага ў апошняй чвэрці XVIII ст. апраналіся ўжо ў еўрапейскае адзенне, шырокія слаі шляхты моцна трымаліся за свой традыцыйны шляхецкі касцюм, агульны для этнічна неаднароднай шляхты ўсіх земляў Рэчы Паспалітай, які стаў успрымацца ў Расійскай імперыі як нацыянальны польскі касцюм.



**Ваяводскія і павятовыя мундзіры беларускай шляхты.**
Канец XVIII ст.





**Касцюмы шляхты.** 1767—1795-ыя гг.

На сейме Рэчы Паспалітай у 1776 г. была прынята пастанова аб увядзенні «ваяводскіх мундзіраў», прадпісваўшая колер кунтушоў і жупаноў, у якіх павінны былі прыязджаць на пасяджэнні агульнага сейма паслы кожнага ваяводства і павета. На сейм 1778 г. паслы прыбылі ўжо ў вызначаных для іх касцюмах, колеры якіх былі наступныя:

—ваяводства Браслаўскае: кунтуш ясна-шафіравы, вылогі[104] шкарлатныя, жупан белы;

—ваяводства Віленскае: кунтуш гранатавы, вылогі і жупан кармазінавыя;

—павет Ашмянскі: кунтуш, вылогі і жупан зялёныя;

—ваяводства Полацкае: кунтуш кармазінавы, вылогі і жупан гранатавыя;

—ваяводства Навагродскае: кунтуш шкарлатны, жупан і вылогі чорныя;

—павет Слонімскі: кунтуш шафіравы, жупан і вылогі саламянага колеру; на сейме — кунтуш кармазінавы, жупан і вылогі шафіравыя;

—павет Ваўкавыскі: кунтуш гранатавы, жупан і вылогі кармазінавыя; на сейм — кунтуш кармазінавы, вылогі і жупан гранатавы;

—павет Аршанскі, ваяводства Віцебскае: кунтуш зялёны, вылогі і жупан белыя;

—ваяводства Брэст-Літоўскае: кунтуш шафіравы, вылогі кармазінавыя, жупан і пас белыя;

—ваяводства Мсціслаўскае: кунтуш гранатавы, вылогі блакітныя, жупан саламяны;

—ваяводства Мінскае: кунтуш кармазінавы, жупан і вылогі гранатавыя;

—павет Рэчыцкі Мінскага ваяводства: кунтуш кармазінавы, жупан і вылогі белыя[105].

Яшчэ ў 1780-ых гг. XVIII ст. касцюм багатай шляхецкай моладзі быў наступным: на перавязі з вышытымі словамі: «народ з каралём і кароль з народам» вісела шабля; шпоры альбо сярэбраныя падкоўкі пад чырвонымі ботамі весела брынчалі; шапачка надзявалася набакір са спушчаным да правага вуха





**Касцюмы вышэйшага саслоўя канца XVIII — пачатку XIX ст.** «Павел І вызваляе Касцюшку з Петрапаўлаўскай крэпасці». Мастак Я. Дамель. 1820 г.

**Парадны каралеўскі касцюм.** Партрэт караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Мастак Ю.К. Гескі. 1783 г.

трохколерным шнурком, які заканчваўся страуса-вым пяром ці султанам. За крыўду не прынята было зваць у суд, ніякіх суперарбітраў не выбіралі: кож-ны ахоўваў свой гонар і ніколі ні на чый суд не зга-дзіўся б аддаць гэты гонар»[106].

Ян Дуклан Ахоцкі, сын чэсніка з Мозыра, так апісвае сваё адзенне на адным з баляў: «на мне быў надзеты блакітны кунтуш, вышыты сярэбранымі зорачкамі, падшыты ліонскай тканінай дымчатага колеру. Шаравары чырвоныя атласныя, такога ж колеру боты з сярэбранымі падкоўкамі. Багаты слуцкі пояс, а на галаве сабаліная шапачка з акса-мітным верхам, упрыгожаная тоўстым залатым шнурком, які заканчваўся султанам са штучных шкляных валос... Брыльянтавая булаўка і гузікі, па-дарунак ваяводы, зрабілі мой туалет багацейшым за ўсіх прысутных... У палове баля я і малады Ліпскі зноў перамянілі туалет: апрануліся мы аднолькава ў белыя жупаны і пунсовыя кунтушы з залатымі пят-ліцамі»[107].

З 1780-ых гг. у асяроддзі магнатаў, шляхты і бага-тых гараджан хутка пашыраецца еўрапейскі касцюм з фракам. Разам з фракамі мужчыны пачалі насіць камізэлькі, капялюшы-цыліндры, кароткія штаны да кален з туфлямі або панталоны з ботамі.

Пераход прывілеяванага саслоўя на еўрапейскі касцюм з фракам многімі ўспрымаўся вельмі нега-тыўна. «Даўней, — пісаў у сваіх успамінах прад-стаўнік аднаго з магнацкіх родаў Л. Патоцкі, — кож-ны шляхціц, абы толькі радавіты, быў у кунтушы з саеты, у залацістым поясе, з шапкаю набакір, пры крывой шаблі, выглядаў, як магнат. Сёння ж кож-ны магнат у куртатым адзенні, з абцятымі поламі, у цесным капялюшыку і вузкіх штоніках»[108].

Новая эпоха мужчынскага касцюма пачалася ў XIX ст. Тэхнічныя і навуковыя дасягненні, рост прамысловай вытворчасці змянілі рытм жыцця і патрабавалі новых падыходаў да мужчынскага кас-цюма. Першыя пятнаццать гадоў XIX ст. Еўропа аказалася ўцягнутай у напалеонаўскія войны. Таму ў развіцці мужчынскага касцюма гэтага часу з адна-го боку назіралася спрашчэнне цывільнага касцю-ма, а з другога ўзрасло значэнне форменнага адзен-ня. Аляксандр I зрабіў абавязковым нашэнне фор-менных мундзіраў, дэтальна распрацаваных для ўсіх відаў адміністрацыйных устаноў. Гэтым як бы вы-дзяляліся дзве асноўныя сілы, на якія ў сваёй палі-тыцы абапіраўся ўрад, — армія і чыноўніцтва.

Асноўнымі крыніцамі даходаў у новым грамад-стве сталі прамысловасць, гандаль, банкі і біржы. Лад жыцця людзей, занятых у гэтых сферах дзей-насці, паступова становіцца несумяшчальным з пышнымі парчовымі і аксамітнымі касцюмамі і па-рыкамі. Фрак насілі як штодзённае і святочнае ад-зенне. Дзелавыя людзі і прадстаўнікі гарадской інтэ-лігенцыі звычайна насілі цёмны з сукна фрак са свет-лымі панталонамі і светлай з лёгкай тканіны камізэлькай. Фрак у пачатку стагоддзя шылі з вузкімі рукавамі, якія не-калькі пашыраліся ля пляча, з варонкападобным пашырэн-нем ля кісці рукі і з двума ра-дамі гузікаў на грудзях.



**Мундзір студэнтаў універсітэтаў.** 1834 г.



**Мундзір студэнтаў універсітэтаў.** 1885 Г.



**Мундэір Міністэрства замеж-ных спраў** (2-і разрад). 1834 г.



**Мундэір Расійскай акадэміі навук** (3-і разрад). 1834 г.



**Шыццё на каўняры I абшлагах мундзіраў** чыноўнікаў:

а) шыццё на каўняры і абшлагах мундзіра чыноўнікаў Міністэрства народнай асветы. 1834 г.;

б) шыццё на каўняры і абшлагах мундзіра Расійскай Акадэміі навук. 1834 г.



**Хатні касцюм арыстакрата.** Партрэт Адама Казіміра Чартарыйскага. Пачатак XIX ст.

Касцюмы
Мастак Я.



дробнай шляхты. «Магнат і яго кліенты».
Норблін

У канцы першага дзесяцігоддзя XIX ст. атрымаў папулярнасць новы від наплечнага мужчынскага адзення — сюртук (сурдут), які ўжо ў 1840-ых гг. выцісную фрак з паўсядзённага абіходу, пакінуўшы за ім функцыю параднага, святочнага адзення, якую фрак выконваў да пачатку XX ст.

У другім дзесяцігоддзі XIX ст. у касцюме маёмасных жыхароў гарадоў Беларусі пашырыўся рэдынгот, які ў адрозненне ад фрака меў высокую засцежку, невялікія лацканы, паларыну і невялікі стаячаадкладны каўнер. Рэдынгот насілі з цыліндрам і доўгімі панталонамі ў якасці вулічнага адзення.

Аднак у першыя дзесяцігоддзі XIX ст. мужчыны яшчэ прадаўжалі апранаць на балі і ўрачыстыя парадныя вечары кароткія да кален брыджы, і толькі ў пачатку 1840-ых гадоў яны поўнасцю выйшлі з моды і былі заменены доўгімі панталонамі, а затым сучаснага крою штанамі.

14 жніўня 1824 г. у сувязі з «беспарадкамі ў Віленскім універсітэце» ўпершыню ў Расіі было ўведзена форменнае адзенне для студэнтаў. Царскі ўрад лічыў, што такая мера зробіць больш лёгкім дагляд за студэнтамі па-за сценамі універсітэта, які тады ўскладаўся на адміністрацыю гэтай навучальнай установы.

Цёмна-сіні мундзірны фрак Віленскага універсітэта меў суконны каўнер і абшлагі з вертыкальнымі клапанцамі. Вакол каўняра і клапанцаў пала-

Касцюмы ўдзельнікаў паўстання 1863 г.



галася чырвоная выпушка. Наяўнасць нарукаўнага клапанца і чырвонай выпушкі рабіла мундзіры студэнтаў падобнымі да ваенных.

У 1861 г. форменнае адзенне студэнтаў было адменена па ўказанню міністра народнай адукацыі Кавалеўскага, так як у выпадку вулічных сутычак паліцыі са студэнтамі хутка збіраўся натоўп студэнтаў, якія баранілі таварышаў. Наогул, нашэнне мундзіра развівала карпаратыўны дух студэнтаў. Аднак, па аднадушных водзывах вучэбнай і агульнай адміністрацыі, адмена формы прывяла да неахайнасці ў адзенні, упадку дысцыпліны сярод студэнтаў і ўскладніла паліцэйскі нагляд за імі[109].

Студэнцкая форма ва універсітэтах была ўзноўлена 8 мая 1885 г., але гэта быў ужо іншы тып мундзіра. Ён складаўся з цёмна-сіняга кароткага сурдута са стаячым каўняром, сучаснага крою штаноў. Зашпільваўся сурдут на гербавыя гузікі. Дзве пары такіх жа гузікаў былі нашыты ззаду: адна пара на лініі таліі, а другая на фалдах. На каўняры, абшлагах рукавоў і на фуражцы была абшэўка тасьмой пэўнага колеру, азначаўшая прыналежнасць да таго ці іншага універсітэта. З левага боку ў сурдуце была прораз для нашэння шпагі[110].

З 1834 г. па ўказу Мікалая І у Расійскай імперыі для чыноўнікаў розных ведамстваў пачынае ўводзіцца паўсядзённае форменнае адзенне — віцмундзірны фрак з шыццём і гербавымі гузікамі.



**Касцюмы ўдзельнікаў паўстання 1863 г.**

У 1856 г. віцмундзірны фрак быў заменены сурдутам, а ў канцы XIX ст. на мундзірных сурдутах (якія не мелі шыцця) і на форменных паліто для ўказання рангаў чыноў былі зроблены каўняровыя пятліцы і пагоны для абазначэння ведамаснай і прафесійнай прыналежнасці[111].



Павага да ваеннай формы знайшла адлюстраванне і ў хатнім адзенні шляхецка-дваранскага саслоўя. На працягу першай палавіны XIX ст. вялікай папулярнасцю карысталася хатняя куртка-венгерка пераважна сіняга колеру з аздабленнем на грудзях каляровым шнурам, ужываннем замест гузікаў кастылькоў.

У 1830-ых гг. мужчынскі гардэроб прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя складаўся з сюртука, рэдынгота, фрака, камізэлек, плашча-карыка з некалькімі палярынамі (з якім звязвалася паняцце элегантнасці ў адзенні мужчыны). Да гэтых рэчаў у гэты час дабаўляецца новы від верхняга адзення — пальто. Кароткае і свабоднае, яно хутка заваявала месца асноўнага верхняга адзення, якое захоўвалася да 1980-ыхгг.

У канцы 1850-ых гг. на Беларусі было 4 губернскіх, 33 павятовых і 4 заштатных горада, у якіх пражывала звыш 10% насельніцтва. 70—80% гараджан складалі мяшчане (рамеснікі і дробныя гандляры), 6—7% дваране і духавенства, 2—2, 5% — купцы[112]. Асноўную ролю ў забеспячэнні жыхароў разнастайнымі тканінамі, гатовым адзеннем, фурнітурай і аксесуарамі ў гэты час яшчэ адыгрывалі кірмашы. На самыя вялікія з іх — Зэльвенскі, Свіслацкі, Мінскі, Бешанковіцкі — прыязджалі купцы з Масквы, Ніжняга Ноўгарада, Тулы, Смаленска, Кіева і іншых гарадоў. На кірмашы ў Мінск прывозілі тавары з Кіева, Польшчы, Адэсы, Масквы і нават з Прусіі. Значнае месца займалі і вырабы мясцовых мінскіх фабрык, напрыклад сукны фабрык графа Патоцкага, Камінскага і Скірмунта. Асабліва высокай якасцю славіліся сукны фабрык Камінскага і Слатвінскага[113].

Запатрабаванні насельніцтва Мінскай губерні ў баваўняных тканінах у асноўным задавальняла лагойская фабрыка графа Канстанціна Тышкевіча, якая вырабляла ў год баваўняных і льняных тканін на суму ад 20 да 25 тысяч рублёў серабром. Пры гэтым ільняная пража для фабрыкі закупалася ў Мінскай губерні, а баваўняная выпісвалася з Англіі, з Манчэсцера[114].

Надзвычай трывалымі фарбамі і ўзорамі славіліся тканіны фабрыкі паркалю Свентаржэцкай у Багушэвічах[115], а абутак мінскага вырабу карыстаўся вялікім попытам не толькі на мясцовым рынку, але і ў вялікай колькасці вывозіўся ў Кіеў[116].

Нягледзячы на з'яўленне адносна танных фабрычных тканін, абмежаваныя сродкі не давалі магчымасці асноўнай масе гарадскіх жыхароў і шляхты часта мяняць адзенне адпаведна новым накірункам еўрапейскай моды.

Касцюм беларускіх мяшчан Мінскай губерні ў сярэдзіне XIXст., па сведчанню П. М. Шпілеўскага, складаўся з шэрага, доўгага каптана з адкладным каўняром і фалдамі ў таліі, шапкі з казырком і змазных ботаў[117]. У Гродзенскай губерні мяшчане ў гэты час насілі капоты або сурдуты з шэрага або сіняга сукна, якія аздабляліся белай тасьмой[118].

Асаблівай стракатасцю вылучалася адзенне шляхты, якая з'язджалася на вялікія гарадскія кірмашы. Гэта былі «франты ў венгерках і шэрачковых сурдутах, у сініх, з тускла свецячыміся металічнымі гузікамі фраках даўно мінулых гадоў, эканомы, валасныя пісары, камісары і падпанкі ў рыпсавых казакінах, з аблавухімі шапкамі без казыркоў і з імі»[119]. Разам з тым багатыя гараджане нават у павятовы Кобрын выпісвалі сабе аксесуары да касцюма з Варшавы[120].

З развіццём капіталістычных адносін пачаўся эканамічны заняпад шляхецка-дваранскага саслоўя. Большасць дваран Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. не мела зямлі і наогул была немаёмнай[121]. З гэтага саслоўя паходзіла пераважная большасць беларускага чыноўніцтва, афіцэрства, мясцовай інтэлігенцыі, служачых маёнткаў. Служба для іх з'яўлялася адзінай крыніцай сродкаў існавання.

Асноўную масу шляхты, якая жыла ў сельскай мясцовасці, уXIXст. складалі жыхары «засценкаў» — ваколічная шляхта. Па свайму маёмаснаму стану і ладу жыцця яна мала адрознівалася ад сялян. Кашулі шылі з даматканага палатна, толькі з болын глыбокім разрэзам пасярэдзіне грудзей, чым у сялян, ды пад горлам зашпільвалі «запінкаю» (двайным гузікам), а не завязвалі тасёмкай. Верхнім адзеннем служылі тыя ж, што і ў сялян, сярмягі, толькі белага[122] або чорнага колеру ў адрозненне ад шэрых сялянскіх. На Віцебшчыне шляхта сцвярджала нават, што «чорная сярмяга падаравана толькі шляхце. Мужык можа наблізіцца да гэтага колеру, але не павінен насіць яе»[123].

Свае сярмягі жыхары засценкаў падпяразвалі, у адрозненне ад сялян, не плеценымі і вязанымі паясамі, а шырокімі скуранымі «рэмнямі» з бронзавай спражкай. Зімой насілі падбітыя аўчынай шапкі з доўгімі вушамі або лямцавыя капелюшы з белай воўны. Больш заможныя замест сярмяг шылі з даматканага сукна сурдуты з гузікамі, якія называлі капотамі[124]. У адрозненне ад «мужыцкіх» белых свае палатняныя нагавіцы шляхціцы фарбавалі ў чорны колер[125]. Мужчыны-шляхціцы Брэсцкага павета ў канцы XIX ст. замест сялянскіх латух (верхняе суконнае адзенне) насілі доўгія курцікі, упрыгожаныя рознымітасёмкамі, шнуркамі, гузікамі[126]. Запошніх сродкаў шляхціц стараўся набыць боты і «хутчэй хадзіў босым, каб не абуваць лапці»[127]. Звычайна шляхціцы галілі бараду, пакідаючы толькі вусы[128].

У сярэдзіне XIX ст. гарадская мода пачала пранікаць і ў асяроддзе рабочых фабрык і вотчынных мануфактур. Замест мясцовых шапак-магерак рабочыя пачалі насіць фуражкі з казырком або саламяныя, хатняй работы капялюшы, а замест світак



**Касцюм двараніна.** Гродна. 1863 г.

нешта накшталт сурдутаў. Калашыны штаноў яны не засоўвалі па-сялянску ў галяні́шчы ботаў, а спускалі паверх да самых пятаў, на шыю павязвалі шыйныя хусткі[12]'.

На мяжы 1860-ых гг. на Беларусі, у Полынчы і Літве пачаўся ўздым нацыянальна-вызваленчага руху, выкліканага крызісам феадальна-прыгонніцкай сістэмы і зараджэннем капіталістычных адносін. У 1862 г. у Вільні быў створаны цэнтр падрыхтоўкі паўстання, а ў лютым-красавіку 1863 г. паўстанскія атрады дзейнічалі ўжо на Віленшчыне і ў Гродзенскай губерні. Касцяком гэтых атрадаў былі дробныя гарадскія чыноўнікі, разначынная інтэлігенцыя, рамеснікі, навучэнцы віленскага універсітэта і гарадскіх вучылішчаў, беззямельная і малазямельная шляхта, якія складалі 75% актыўных удзельнікаў паўстання на Беларусі'[30].

Часткай праграмы паўстанцаў правага накірун-ку было аднаўленне нацыянальнай незалежнасці Польшчы ў межах 1772 г., а рэвалюцыйна-дэмакратычнага крыла кіраўніцтва паўстання — самавызначэнне беларускага, літоўскага і ўкраінскага народаў. Гэтая частка праграмы знайшла яскравае выражэнне ў касцюме паўстанцаў, якія стараліся апранацца ў разнастайныя віды адзення шляхты апошніх гадоў Рэчы Паспалітай.

У гэты час у Заходняй Еўропе шпарка распаўсюдзіліся швейныя машыны з механічным прыво-дам, што дало штуршок хуткаму развіццю ў Фран-цыі, Англіі і Польшчы фабрычнай вытворчасці адзення і яго збыту. Масавая капіталістычная выт-ворчасць прадметаў мужчынскага касцюма патра-бавала яго стандартызацыі і прыстасавання да ўмоў жыцця шырокіх слаёў насельніцтва. Менавіта тады мадэльерамі Заходняй Еўропы былі выпрацаваны асаблівасці крою і асноўныя рысы сілуэта мужчынскага касцюма, якія з невялікімі адхіленнямі ў дэ-



**Касцюм двараніна.** Гродна. 1863 г.



Касцюм дваран.
Гродна. 1864 г.

талях, што дыктуюцца модан, захоуваюцца да нашых дзён. Аднак гэты новы буржуазны тып касцюма быў «падкрэслена не прыстасаваны да фізічнай працы», так як у белай кашулі з крухмальным каўняром і такімі ж манжэтамі займацца ею было немагчыма[131].

На Беларусі, дзе ў эпоху феадалізму галоўным элементам спосабу вытворчасці было прыгоннае феадальнае памесце, не было шырокай базы для ўтварэння буйных гарадоў. У 1861 г. у Брэсце пражывалі 17 859 чалавек, Гомелі — 13 659, Пінску — 11 607 чалавек[132]. Адмена прыгоннай залежнасці і інтэнсіўнае будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі Лібава-Роменскай, Рыга-Арлоўскай, Маскоўска-Брэсцкай і Палескай чыгунакстымулявалі росттакіх гарадоў, як Мінск, Гомель, Віцебск, Магілёў, Пінск, Брэст, Гродна і інш. У іх пачалі стварацца тэхнічна аснашчаныя прамысловыя прадпрыемствы, фарміравацца асноўныя класы капіталістычнага грамадства.

У гэты час ішлі далейшая дэмакратызацыя і спрашчэнне гарадскога мужчынскага касцюма. Пачалі знікаць з ужытку ўпрыгожаныя карункамі і рушамі сарочкі, камізэлькі з бліскучых і парчовых тканін. Іх месца занялі прышпільваючыяся накрухмалены каўнер, манішка і манжэты, якія прышпіляліся да кашулі. Яны набылі шырокае распаўсюджванне ў асяроддзі дробных гарадскіх чыноўнікаў, у святочным касцюме гандляроў і фабрычных рабочых.

Развіццё капіталістычных адносін стварыла ўмовы, у якіх шляхта пачала страчваць характар адзінай у культурных адносінах агульнасці, якая выцякала з ідэалагічнай еднасці саслоўя.




**Касцюм прадстаўніка вярхоў гарадскога грамадства. Гродна. 1905 г.**



Касцюм э сурдутам
Мяшчане Гродна. Канец
XIX — пачатак XX ст.





**ГарадскІ вясельны касцюм э сурдутам.** Гродна.
Канец XIX — пачатак XX ст.

Дзіцячы **касцюм.** Дваране Мазыра. Пачатак XX ст.



**Касцюм гарадскіх служачыхІ ІнтэлігенцыІ.** Мінск.
Пачатак XX ст.



**Касцюм памешчыка, святара і паліцэйскага прыстава. Канец XIX — пачатак XX ст.**





**Касцюм гараджан. Гродна. Пачатак XX ст.**

**Гарадскі касцюм. Слуцк. 1907 г.**



**Касцюм маладога гарадскога рабочага. Мазыр. Пачатак ХХ ст.**

З сярэдзіны XIX ст. мужчынскі касцюм стра-ціў сваю былую маляўнічасць і шматколернасць. Адзенне пачалі шыць з цёмных тканін, толькі ўлетку апраналі пінжакі і нагавіцы белага і прыглушанага адцення шэрыя, крэмавыя, бежавыя.

У сярэдзіне стагоддзя мадэрнізаваўся крой сурдута. Яго сталі шыць з невялікімі лацканамі і закругленымі поламі. У 1860-ых гг. ён набыў вялікую папулярнасцьу асяроддзі маёмасных гарадскіхслаёў насельніцтва пад назвай «візіткі». Даволі распаўсюджаным галаўным уборам у святочным касцюме вышэйшых слаёў гараджан да канца XIX ст. заставаўся цыліндр.

УсярэдзінеXIXст. з'явіласяфатафафія, наякой зафіксаваны касцюм таго часу. Каб атрымаўся фотаадбітак, у тыя часы прыходзілася часамі нерухома пазіраваць перад фотаапаратам. Таму людзі на фатаграфіях 1850— 1860-ых гг. звычайна абапіраюцца на столікі, спінкі крэслаў, жардзіньеркі і г.д. Уражвае майстэрства тагачасных фатографаў, якія кам-



**Гарадскі касцюм.** Віцебск. Пачатак XX ст.



**Гарадскі касцюм.** Віцебск. Пачатак XX ст.

пазіцыйна «будавалі» фотакадр як мастацкую карціну.

Напрыклад, на адным з фотаздымкаў 1863 г. з г. Гродна мы бачым пажылога чалавека, які прыйшоў у дваранскі дом з афіцыйным візітам. У тыя часы абавязковым элементам касцюма для візітаў і вячэрніх мерапрыемстваў быў чорны шаўковы цыліндр. Па прынятых правілах візіцёр пакідаў у прыхожай дома кашнэ, паліто, парасон і тросць і ўваходзіў у гасціную з цыліндрам у руцэ. У час візіту здымалі пальчатку толькі з адной рукі. Вось чаму рука, якой мужчына абапіраецца на спінку крэсла, без пальчаткі, а другая, у якой ён трымае цыліндр, у пальчатцы. Калі візіт быў закончан, пальчатку надзявалі ў прыхожай, так як лічылася дрэнным тонам выйсці з дому без пальчатак.

Як бачна на фотаздымку, прадстаўнічы касцюм складаўся з чорнага сурдута і светлых нагавіц, якія аздоблены па знешніх швах чорнай тасьмой і свет-лай, у тон нагавіцам, двубортнай жылеткі з клятча-стай шарсцяной шатландкі з шырокімі лацканамі. Сурдут меў прамы, крыху прыталены сілуэт, быў ад-набортным, з невялікімі закругленымі лацканамі. У мужчыны на фотаздымку ён даўжынёй да каленяў і мае плаўна заніжаную спераду талію.

Кашулі гэтага часу мелі гладкі перад і моцна на-крухмаленыя каўняр і манжэты. Да параднага кас-цюма падыходзілі толькі кашулі з адзінарным стая-чым каўняром і двайнымі манжэтамі, якія зашпі-ляліся каштоўнымі запінкамі. Вакол шыі абгорт-валі чорны шаўковы гальштук-стужку, які завязы-валі спераду невялікім акуратным бантам. Модным дапаўненнем касцюма быў гадзіннік у жылетнай кішэні на залатым або сярэбраным ланцужку.

Абуткам матэрыяльна забяспечаных колаў га-радскога насельніцтва былі чорныя скураныя шціб-леты — бацінкі на тонкай падэшве з завужаным на-ском і без шнуроўкі спераду, якія ўвайшлі ў моду ў канцы 1850-ыхгг.

На званыя абеды, балы, у тэатр і на афіцыйныя ўрачыстасці, дзе жанчыны былі ў сукенках з дэкаль-тэ, мужчыны павінны былі прыходзіць у чорным фраку, белых лайкавых або шаўковых пальчатках, чорным гальштуку (які ў 1870-ых гг, для такіх ме-рапрыемстваў быў заменены на белы).

Штодзённы касцюм гарадскіх вярхоў і інтэлі-генцыі прадстаўлен на другім фотаздымку з Гродна 1863 г. Малады чалавек апрануты ў белую кашулю з адкладным каўняром, светлуюаднабортнуюжылет-ку з вузкімі лацканамі і такога ж колеру светлыя нагавіцы, абшытыя па знешніх швах чорнай тась-мой. У нагавіцах тады яшчэ не запрасоўвалі складкідаму калашыны маюць прамую трубчатую форму, злёгку пашыраную ля шчыкалаткі. Касцюм дапоўнены чорным шаўковым гальштукам і гадзін-нікам на ланцужку. Зверху асноўнага адзення апра-нуты аднабортны, злёгку прыталены сурдутдаўжы-нёй да паловы бядра, які зашпільваецца да таліі на тры гузікі. Берагі адкладнога каўняра, вузкіх закруг-леных лацканаў і пол абшыты шаўковай тасьмой. 3 такім касцюмам насілі картуз з лакавым казыркам, які ляжыць на крэсле, і чорныя, шчыльна ахоплі-ваючыя ступню нагі шціблеты.

Многія маладыя людзі замест сурдута пачалі насіць пінжак, які меў у 1860-ыя гг. кароткія закруг-леныя полы, высокую засцежку і праразную кішэню на левай пале. Краі каўняра, лацканы, полы і фаль-шывыя манжэты рукавоў акантоўвалі шаўковай тасьмой. Паступова пінжак разам са штанамі і камі-зэлькай утварылі знакамітую «тройку», якая захоў-ваецца да цяперашняга часу, змяняючыся толькі ў дэталях.



**Касцюм гараджан.** Гродна. 1914 г.

Крой касцюма пачалі вызначаць зручнасць і пры-стасаваннедаўмоўжыцця гарадскога жыхара. Кас-цюм перастаў скоўваць рухі, але набыў мешкава-тасць, нівеліраваў фігуру. Фрак ператварыўся кан-чаткова ў параднае адзенне, знак прыналежнасці да прывілеяванага слоя грамадства.

Насельніцтва гарадоў Беларусі ў канцы XIX ст. уяўляла сабой складаны кангламерат розных сацы-яльна-саслоўных груп, характэрных яшчэ для дака-піталістычнага горада, хаця ў асяроддзі гараджан ужо дакладна вызначыліся асноўныя класы капіталі-стычнага грамадства — буржуазія і пралетарыят. Паводле даных перапісу 1897 г., у гарадах Беларусі 6, 8% гарадскіх жыхароў складалі дваране, 0,6 — ду-хавенства, 1,4 — купцы, 68, 5 — мяшчане, 21,0 — ся-ляне, 0, 3 — іншаземныя падданыя, 1,4% — іншыя[133].

Да гарадской вярхушкі адносіліся памешчыцка-дваранскае саслоўе, буйныя чыноўнікі, банкіры, багатае купецтва. Праслойку інтэлігенцыі складалі



**Касцюм мяшчан.** Клімавічы Магілёўскай губерні. Пачатак XX ст.



**Касцюм мяшчан.** Магілёўская губерня. Пачатак XX ст.



**Гарадскі касцюм.** Віцебск. Пачатак XX ст.



**Форменнае адзенне чыноўніка.** Полацк. 1916 г.

мастакі, архітэктары, урачы, вучоныя, музыканты, настаўнікі, сярэдняе духавенства і чыноўніцтва.

Самай шматлікай групай гараджан былі мяшчане. Гэта саслоўе складалася ў асноўным з дробных домаўладальнікаў, гандляроў, рамеснікаў, утвараючы дробнабуржуазнае насельніцтва гарадоў.

Кожная сацыяльна-саслоўная група гараджан мела свае спецыфічныя асаблівасці ў касцюме. Касцюм дваранска-чыноўніцкай вярхушкі гарадскога насельніцтва вылучаўся адпаведнасцю еўрапейскай модзе, каштоўнасцю тканін, бездакорнасцю модных аксесуараў, якасцю палатна кашулі, капелюшом. Звычайна такія касцюмы і аксесуары да іх выпісвалі з Пецярбурга, Масквы, Варшавы, а то і Парыжа або куплялі ў стацыянарных буйных магазінах, часам заказвалі з каштоўных імпартных тканін вопытным краўцам-мадэльерам па ўзорах з часопісаў мод.

Касцюм сярэдніх слаёў гараджан (разначыннай інтэлігенцыі, сярэдняй рукі чыноўнікаў) таксама ў асноўным адпавядаў модзе, але шыўся з мясцовага вырабу тканін у мясцовых краўцоў-рамеснікаў.

У канцы XIX — пачатку XX ст. сярод гараджан прэстыжным прадметам стаў веласіпед, які набыў шырокае распаўсюджанне. У гарадах пачалі будавацца велатрэкі, праводзіцца спаборніцтвы па велаcпорту[134]. Паявіўся і спецыяльны касцюм для язды на веласіпедзе з кароткімі за калена або завужанымі калашынамі штаноў.

Касцюм гарадскіх рабочых і беднаты адрозніваўся ад касцюма маёмаснай часткі гараджан як якасцю тканін, так і адсутнасцю белых і светлых колераў. Паўсядзённы касцюм рабочых складаўся з цёмнай сарочкі-касавароткі са стаячым каўняром, штаноў з «чартакожу» або «парусіны» летам і таннага сукна і мульту зімой, запраўленых у юхтавыя боты з прышыўнымі перадамі, картуза ці шапкі-вушанкі зімой. Верхнім адзеннем служылі ўсялякага пакрою курткі на ваце ці паклі, а зімою кажухі, паўкажушкі, казачынкі.

Насельніцтва гарадскіх слабод складалі сяляне, якія займаліся земляробствам і агародніцтвам, і ў іх касцюме спалучаліся рысы гарадскога і традыцыйнага сялянскага касцюма акаляючага горад рэгіёна.

У XIX — пачатку XX ст. вялікая ўвага ў мужчынскім гарадскім касцюме пачынае надавацца аксесуарам — пальчаткам, тросці, гадзінніку на ланцужку. Пальчаткі надзявалі на прагулку ў грамадскі сад, на вулічнае гулянне, ідучы з візітам да вышэйстаячай асобы, на званы абед, у тэатр. Белыя пальчаткі былі неабходнай прыналежнасцю ў вясельным касцюме. Калі, напрыклад, прыходзілі на званы абед, то ў прыхожай здымалі капялюш, паліто, а пальчаткі не здымалі да тых пор, пакуль гаспадары не запрашалі гасцей за стол. Пальчаткі рабілі з бе-



**Касцюм гарадской інтэлігенцыі.** Мастак Ф. Рушчыц з жонкай. 1920-ыя гг.



**Касцюм гарадскога служачага.** Горад Чэрыкаў Магілёўскай вобласці. 1920-ыя гг.



**Касцюм гарадской моладзі.** Мінск. 1925 г.



**Гарадскі зімовы касцюм.** Горад Касцюковічы Магілёўскай вобласці. Канец 1920-ых **гг.**

лых баваўняных нітак, тонкай скуры лайкі, а вяс-ной і восенню насілі замшавыя пальчаткі.

Адзнакай галантнасці гарадскога еўрапейскага касцюма служылі таксама тросць і капялюш. На тросці выкарыстоўвалі каштоўных парод дрэва, упрыгожвалі іх разьбой, металічнымі накладкамі, залатымі манаграмамі. Набалдашнікі рабілі з паза-лочанага металу, серабра, бронзы, слановай косці.

З канца XIX ст. маёмасныя гарадскія жыхары пачалі насіць жорсткі, з закругленым верхам і невялікімі палямі фетравы капялюш-«кацялок», а ле-там панамы і плеценыя з саломкі капелюшы з плоскімі прамымі палямі і невысокай тулляй, якія ат-рымалі назву «канацье». Найбольш пашыранымі варыянтамі касцюма сталі касцюмы з пінжаком і візіткайуспалучэннізкапелюшом-«кацялком». Варыянты гарадскога касцюма розных слаёў гараджан канца XIX — пачатку XX ст. прадстаўлены ў ілюстрацыях.

Разам са спрашчэннем касцюма стала больш простай і прычоска. Гараджане пачалі коратка стрыгчы валасы і зачосваць іх на прамы або бакавы прабор, але вусы або вусы ў комплексе з невялікай кароткай бародкай заставаліся ў модзе да самай рэ-валюцыі 1917 г.

У пачатку XX ст. найбольш пашыраным верхнім адзеннем стала паліто, часам з патайной засцежкай. Зімовыя паліто шылі на цёплай ватнай або шарсця-ной падкладцы, з каўняром з футра бабра, норкі, марскога коціка, баранка. З такога ж футра рабілі і зімовыя шапкі тыпу папахі, «піражка» з удаўленым унутр верхам, featureрознага крою вушанкі.

Да канца першага дзесяцігоддзя XX ст. гараджа-не насілі абутак толькі чорнага колеру. Найбольш пашыраным тыпам абутку былі боты рознай якасці: лакавыя, хромавыя, юхтавыя.

Дробныя гарады, што апынуліся ў баку ад вод-ных і чыгуначных магістраляў, і ў перыяд капіталіз-му прадаўжалі заставацца невялікімі паселішчамі з напаўвясковым ладам жыцця, дробнымі саматуж-нарамесніцкімі майстэрнямі, якія забяспечвалі гаспадарчыя патрэбы жыхароў і навакольнага вяс-ковага насельніцтва. Але і ў касцюм жыхароў дроб-ных гарадоў і мястэчак з развіццём капіталізму і стацыянарнага гандлю пранікалі фабрычныя тканіны і ўзоры гарадскога касцюма. Напрыклад, жыхары мястэчка Дрыбін Чавускага павета Магілёўскай гу-берні ў канцы XIX ст. шылі адзенне з фабрычных тканін — каленкору, паркалю, сукна. Толькі на бя-лізну часам выкарыстоўвалі даматканае палатно, якое куплялі ў час кірмашоў у сялян з навакольных вёсак. Замест світак насілі сурдуты, а таксама манішкі, шалі[135].

Да рэвалюцыі механізаванай вытворчасці адзен-ня не існавала. На пачатак 1917 г. у Расійскай імперыі прамысловым спосабам выраблялася ўсяго 3%



**Гарадскі касцюм.** Мінск. 1927 г.

швейных вырабаў, пры гэтым усе швейныя прад-прыемствы размяшчаліся ў буйных гарадах: Пецярбургу, Маскве, Кіеве, Адэсе, Харкаве, Казані, Ніжнім Ноўгарадзе. Іх гаспадарамі былі вядомыя рускія або замежныя гандлёвыя фірмы — «Ман-дзель», «Браты Петуховы», «Розенцвэйг» і інш.[136] Частка прадукцыі гэтых прадпрыемстваў і фірм дзя-куючы развітым гандлёвым сувязям трапляла на Беларусь, забяспечваючы патрэбы маёмасных слаёў гарадскіх жыхароў, якія куплялі бялізну, хатняе і верхняе адзенне ў крамах і вялікіх магазінах.

Аднак асноўная маса гараджан карысталася пас-лугамі краўцоў з дробных майстэрняў кустарна-рамесніцкага тыпу ці майстроў-надомнікаў, якія мелі (у лепшым выпадку) аднаго-двух памочнікаў. Такія майстрыпрацавалінадпашывамякой-небудзьрэчы, ці то кашуля, штаны, або верхняя вопратка, ад раскрою тканіны да завяршэння пашыву. Пры шыцці яны карысталіся старажытным кравецкім інструментам: нажніцамі, іголкай, напарсткам і прасам, які награваўся драўляным вуглем, а з канца XIX ст. сталі карыстацца швейнымі машынкамі, якія пас-таўляла на тэрыторыю Беларусі нямецкая фірма «Zinger». Таму кожны элемент касцюма, кожны від верхняга адзення, нягледзячы нават на аднолькавы

**Гарадскі касцюм.** Горад Жлобін Гомельскай вобласці. Сярэдзіна 1930-ых гг.





**Гарадскі касцюм.** Мінск. 1928 г.



**Гарадскі касцюм.** Горад Кобрын Брэсцкай вобласці. 1930-ыя гг.

фасон, меў свае непаўторныя асаблівасці, якія былі выкліканы як індывідуальнымі асаблівасцямі крою майстра, так і рознай аздобай, густам заказчыка.

Вярхі гарадскога насельніцтва выпісвалі касцю-мы, верхняе адзенне і аксесуары з-за мяжы. У больш танным варыянце мода вышэйшых слаёў гараджан пераймалася сярэднімі і дробнымі чыноўнікамі, служачымі розных фірм, якія аздаблялі прадметы адзення па сваіх сродках і густах.

У пачатку XX ст. сярод гарадской інтэлігенцыі ўвайшлі ў моду вольнага крою шырокія палатня-ныя блузы («талстоўкі»), а сярод студэнцкай моладзі накідкі і шыракаполыя капелюшы.

Першая сусветная вайна нанесла вялікія стра-ты эканоміцы Расіі, часткова паралізаваўшы вы-творчасць многіх прадметаў першай неабходнасці, у тым ліку і адзення. У гэтых умовах мужчынскі кас-цюм пачаў адчуваць уплыў ваеннай формы. Так у гарадскім цывільным касцюме з'явіліся закрыты пінжак тыпу фрэнча, штаны галіфэ і крагі.

Кастрычніцкай рэвалюцыяй дваранства, як сас-лоўе, было скасавана дэкрэтам ЦВКіСНКад 11/24 лістапада 1917 г.: «Аб знішчэнні саслоўяў і грама-дзянскіх чыноў». Адзенне забяспечаных слаёў на-сельніцтва стала небяспечным для сваіх уладароў, асабліва адзенне форменнае, якое ўказвала на пры-належнасць чалавека для былых уладных структур. Зніклі з ужытку капелюшы, якія лічыліся прыкме-тай «быўшых», мужчыны насілі толькі картузы і кепкі, стараліся не выдзяляцца адзеннем у натоўпе, каб падкрэсліць лаяльнасць новай уладзе.

Рэвалюцыйная моладзь і супрацоўнікі савецкіх сілавых структур францілі ў скураных куртках, ску-раных галіфэ і скураных фуражках з маўзерамі на баку. Праблемы касцюма ў насельніцтва адышлі на задні план у час грамадзянскай вайны і пасляваен-най эканамічнай разрухі.

1920-ыя гг. характарызуюцца шырокім бытаван-нем у касцюме элементаў ваеннай формы — шы-нялёў, будзёнавак, гімнасцёрак, галіфэ, фрэнчаў, што прывяло да фарміравання своеасаблівага паў-ваеннага касцюма. У тым ці іншым варыянце такі касцюм стаў карыстацца вялікай папулярнасцю ў камуністаў і камсамольцаў, работнікаў савецкага апарату, сельскіх актывістаў. Нягледзячы на шыро-кае распаўсюджанне агульнаеўрапейскага адзення, касцюм паўваеннага абразца карыстаўся папуляр-насцю ў гэтых катэгорый насельніцтва да канца 1930-ыхгг.

Адзенне прамысловай вытворчасці атрымала ў 1930-ыя гг. паўсюднае распаўсюджанне. Шыць ад-зенне ў краўцоў стала даступным толькі маёмасным гараджанам. Узнікла новае паняцце — масавы кас-цюм для працоўных. Адрозненні ў характары гэтага касцюма звязваліся ўжо не з сацыяльным статусам чалавека, а з умовамі жыцця і працы. У першыя гады савецкай улады зарадзілася прафесійнае мадэліраванне, асноўнымі прынцыпамі якога сталі функцыянальнасць, эканамічнасць і канструктыўнасць.

Шырокая праграма стварэння новых форм касцюма была распрацавана ўжо ў пачатку 1919 г. Пры мастацка-вытворчым пададдзеле 130 (НЗО) Наркомасветы ствараюцца «Майстэрні сучаснага касцюма», якія ўзначаліла вядомая мастачка-мадэльер Н. П. Ламанава[137]. Аднак мадэліраванне гэтых гадоў засталося творчым эксперыментам Н. П.Ламанавай і працуючых пад яе началам мастакоў і не аказала колькі-небудзь значнага ўплыву на развіццё бытавога касцюма.

У перыяд нэпа аднавіліся сувязі з замежнай модай. З'явіліся ў продажы французскія часопісы мод, у Маскве пачаў выдавацца часопіс «Навіны мод. Мастацкі штомесячны часопіс апошніх парыжскіх мод»



**ГарадскІ касцюм.** Горад Мазыр Гомельскай вобласці. 1930-ыя гг.



**ГарадскІ касцюм.** Горад Бабруйск Магілёўскай вобласці. 1956 г.



**ГарадскІ дзіцячы касцюм.** Горад Бабруйск Магілёўскай вобласці. 1940-ыя гг.

і інш. Пры трэсце «Москашвей» у 1923 г. адкрылася «Атэлье мод», якое разглядалася як цэнтр мадэліравання бытавога касцюма, пачаў выходзіць часопіс мод «Атэлье», з якім супрацоўнічалі Б. Кустодзіеў, І. Грабар, В. Мухіна, К. Пятроў-Водкін, К. Юон, А. Ахматава, К. Федзін і інш[138].

У сярэдзіне 1920-х гг. у касцюме гараджан сталі праяўляцца рысы асобай савецкай рэспектабельнасці: служачыя гарадскіх устаноў пачалі насіць фрэнчы, двубортныя пінжакі, галіфэ, цюбецейкі, парусінавыя туфлі, хадзілі з парусінавымі партфелямі. Асноўная маса гараджан шыла адзенне з танных, гладкафарбаваных тканін. У касцюмных комплексах спалучаліся прадметы розных стыляў, многія касцюмныя элементы данашваліся з дарэвалюцыйных часоў. У моладзі шырокае распаўсюджанне атрымалі майкі, туфлі і тапкі на гумавай падэшве.

На касцюм гараджан гэтага часу вялікі ўплыў аказваў востры недахоп тканін. Да 1924 г. набіўны малюнак на тканінах вырабляўся ў вельмі нязначнай колькасці, асноўную масу складалі гладкафарбаваныя тканіны — палатно, салдацкае сукно, нізкія гатункі шэрсці, байка, бязь, паркаль[139]. Дэфіцыт тканін адчуваўся да канца 1930-ых гг.

Па пастанове СНКу пачатку 1930-ыхгг. у Мінску, Магілёве, Гомелі, Віцебску, Бабруйску і Барысаве быў арганізаваны індывідуальны пашыў адзення, якім па спецыяльных ордэрах магла карыстацца толькі невялікая колькасць гарадскіх жыхароў, што не аказала ўплыву на касцюм гарадскога насельніцтва ў цэлым.

Выпуск масавага адзення патрабаваў перабудовы швейнай прамысловасці, стварэння буйных прадпрыемстваў з сучасным тэхнічным абсталяваннем. У Віцебску была адкрыта фабрыка «Прафінтэрн», якая спецыялізавалася на пашыве мужчынскага верхняга адзення, і паступова прамысловы выпуск адзення становіцца для гараджан асноўным і выцясняе хатні і кустарны.

Паўсюднае пашырэнне сярод гарадскога насельніцтва масавага адзення зрабіла касцюм больш простым і практычным. Сурдут вышаў з моды, яго замяніў пінжак, які насілі ў будні і святы. Святочны касцюм стаў вызначацца толькі якасцю тканіны.

Камізэлька як у штодзённым касцюме, так і ў свя-точным стала неабавязковай.

Усё большае распаўсюджанне сярод усіх катэго-рый гараджан пачалі атрымоўваць каляровыя ка-шулі. Прадстаўнікі гарадской інтэлігенцыі пачалі насіць мяккія фетравыя капелюшы з умяцінай на туле, а замест ботаў — паўбацінкі.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайныдля гарадскога насельніцтва зноў становіцца характэр-ным шырокае ўключэнне ў касцюм элементаў ва-еннай формы — шынялёў, гімнасцёрак, галіфэ, ва-енных рамянёў, фуражак, танкісцкіх і лётчыцкіх шлемаў, ваенных ботаў.

З аднаўленнем разбуранай вайной народнай гас-падаркі ў рэспубліцы ўзрасла колькасць швейных і трыкатажных фабрык, пашырыўся асартымент іх вырабаў. Усё больш значны ўплыў на касцюм па-чалі аказваць прафесійнае мадэліраванне і тэндэн-цыі развіцця сусветнай моды.

З ростам дабрабыту насельніцтва, развіццём сродкаў масавай інфармацыі сярод гарадской мо-ладзі пашырылася захапленне замежнай музыкай і танцамі. Разамзрок-н-роламуканцы 1950 —пачат-ку 1960-ых гг. стала фарміравацца маладзёжная кас-цюмная мода з вельмі вузкімі калашынамі штаноў, пашыраным у плячах і шчыльна ахапляючым сцёг-ны аднабортным ці двубортным пінжаком, ву-зенькім галылтукам-шнурком і туфлямі на тоўстай гумавай падэшве. Афіцыйная прэса ахрысціла іх «стылягамі». З пачатку 1970-ых гг. моладзь пры-трымліваецца ў асноўным маладзёжнай сусветнай моды са спартыўным уклонам.

Значныя змены ў мужчынскім касцюме на Бе-ларусі адбыліся ў 1960-ыягг. Гэтамусадзейнічаўрост прамысловай вытворчасці, удасканаленне мадэлі-равання, масавае асваенне рэгенерыраваных (штуч-ны шоўк і цэлюлозная шэрсць) і сінтэтычных ва-локнаў, з'яўленне новых хімічных фарбавальнікаў.

Пашырэнне базы тэкстыльнай прамысловасці, унядрэнне прынцыпова новай тэхналогіі вырабу практычных і танных штучных тканін абумовіла стварэнне новых форм адзення і новых прынцыпаў яе аздаблення. Насельніцтва пачало разглядаць адзенне толькі зыходзячы з патрабаванняў практыч-насці, зручнасці, адпаведнасці сучаснай модзе і ўмо-вампрацы.

У 1970— 1980-ых гг. асноўныя патрэбы гарад-скога насельніцтва ў адзенні забяспечвалі такія буй-ныя прадпрыемствы, як швейныя вытворчыя аб'-яднанні імя Крупскай і «Камсамолка» ў Мінску, «Камінтэрн» у Гомелі, віцебская швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», швейныя фабрыкі ў Баб-руйску, Магілёве, Баранавічах, Навагрудку, Брэс-це, Кобрыне, Гродне і інш.



**Касцюм гарадской моладзі.** Горад Бабруйск Магілёўскай вобласці. 1950-ыя гг.

Вялікім попытам карысталіся верхні мужчынскі трыкатаж, трыкатажная бялізна, вырабы Пінскага камбіната верхняга трыкатажу, віцебскай панчош-на-трыкатажнай фабрыкі «КІМ», Баранавіцкай, Бабруйскай трыкатажных фабрык, Магілёўскай швейнай трыкатажнай фабрыкі, Мінскай фабрыкі



«Прагрэс», Брэсцкай фабрыкі верхняга трыкатажу, Салігорскай фабрыкі трыкатажнай бялізны.

Сярод людзей сярэдняга ўзросту ў 1980-ых гг. з бытавой моды паступова сталі знікаць паліто, якія замянілі разнастайныя курткі са скуры, аўчыны, штучных тканін і штучнага футра.

Негатыўныя зрухі ў эканоміцы Беларусі канца 1980 — пачатку 1990-ых гг., зніжэнне ўзроўню вытворчасці рэспубліканскіх швейных прадпрыемстваў прывялі да таго, што значная частка гараджан стала набываць прадметы адзення на рынках, куды «чаўнакі» дастаўлялі таннае, нізкага гатунку адзенне з Паўднёва-Усходняй Азіі і Бліжняга Усходу. У пераходны перыядда рыначнай эканомікі ўзмацнілася эканамічная дыферэнцыяцыя гарадскога насельніцтва. Частка найбольш забяспечаных гараджан у цяперашні час апранаецца згодна з усімі дасягненнямі элітнай сусветнай моды, меней маёмасныя слаі насельніцтва працягваюць карыстацца паслугамі рынка і адзеннем беларускіх прадпрыемстваўлёгкай прамысловасці.

**Касцюм студэнтаў.** Мінск. 1959 г.



**ГарадскI касцюм рабочых МIнскага шарыка-падшыпнікавага завода.** Канец 1960 — пачатак 1970-ых гг.

[1] Повесть временных лет. М., 1950. Т. I. С. 18, 20.
[2] Ласкавый Г. В., Дучиц Л. В. Новые данные о костюме раннесредневекового населения Беларуси // Пстарычна-археалагічны зборнік № 15. Мн., 2000. С. 63.
[3] Седов В. В. Восточные славяне в VI—XIII вв. М., 1982. С. 257.
[4] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі ў Х—XIII стст. (паводле археалагічных звестак). 3-е выд. Мн., 2005. С. 3—10; Ласкавый Г. В., Дучиц Л. В. Новые данные о костюме... С. 63—65.
[5] Седов В. В. Восточные славяне в VI—XIII вв. М., 1982. С. 257-258.
[6] Терещенко А. В. Быт русского народа. Ч. I. Репринт. М., 1997. С. 180-181.
[7] Памятники литературы Древней Руси. Начало русской литературы. XI — начало XII в. М., 1978. С. 42; Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры. Мн., 1959. С. 77, 79.
[8] Галубовіч В. I. Эканамічны стан, побыт і гандаль Ста ражытнай Беларусі (IX—XIII стст.). Дапаможнік. Мн., 1997. С. 121.
[9] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі Х—XIII стст. С. 9.
[10] Брайчевська О. А. Давньоруський чоловічйй костюм Х—XIII стст. (за археологічнймй писемними та образотворчимиджерелами): Автореф.дис... канд. іст. наук. Кйів. С. 12—13; Барвенава Г. А. Княскія строі Кунэгунды і Яраполка паводле мініяцюраў «Кодэксу Гертруды» // Спадчына. 1998. № 6. С. 75.
" Андреевская В. Д. История одежды. Б. м., б. г. С. 9. [12]Янин В. Л. Актовые печати древней Руси Х—XV вв. Т. 1. М., 1970. С. 23.
[13] Белямук М. Пячатка Усяслава Чарадзея // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 2. С. 69—70.
[14] Барвенава Г. А. Княскія строі... С. 76.
[15] Там жа. С. 78-79.
[16] Барвенава Г. А. Княскія строі Кунэгунды і Яраполка паводле мініяцюраў «Кодэксу Гертруды». С. 75.
[17] Барвенава Г. А. Парадна-цырыманіяльны строй на Беларусі ў Х—XIII стст. // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманіт. навук. 2000. № 2. С. 88—89.
[18] Арциховский А. В. Одежда // История культуры Древ ней Руси. Домонгольский период. М., — Л., 1948. Т. 1. Материальная культура. С. 248, 252—255.
" Руднев В. А. Слово о князе Владимире. М., 1989. С. 208.
[20] Рабинович М. Г. Древнерусская одежда IX—XIII вв. // Древняя одежда народов Восточной Европы (Материалы к историко-этнографическому атласу). М., 1986. С. 59.
[21] Там жа. С. 42.
[22] Радзивилловская или Кенигсбергская летопись, л. 97 об.
[23] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі Х—XIII стст. С. 11.
[24] Радзивилловская или Кенигсбергская летопись, л. 124.
[25] Мерцалова М.Н. История костюма. М., 1972. С. 31 — 32.
[26] Ястребицкая А. Л. Западная Европа XI—XIII веков. М., 1978. С. 81-82.
[27] Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі. Мн., 1993. С. 33.
[28] Грыцкевіч А. Беларуская шляхта//Спадчына. 1993. № 1. С. 11.
[29] Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва. С. 33—34.
[30] Там жа.
[31] Барвенава Г. А. Пстарычны касцюм Беларусі Х — пачатку XVI ст. Аўтарэф. дыс. на атрым. вуч. ст. к. мастацтвазнаўства. Мн., 2001. С. 13—14.
[32] Мерцалова М. Н. История костюма. С. 31.
[33] Барвенава Г. А. Пстарычны касцюм Беларусі Х — пачатку XVI ст. С. 13-14.
[34] Трусаў А. Матэрыяльная культура беларускага горада ў часы Вялікага княства Літоўскага // Беларускі пста рычны часопіс. 2000. № 3. С. 56.
[35] Gutkowska-Rychlewska, M. Historia ubiorow. Wroclaw—Warszawa—Krakow, 1968. С 386.
[36] Піскун Ю. А. Петорыя касцюма Беларусі XIV—XVIII стагоддзяў. Вучэбны дапаможнік для студэнтаў. Мн., 2004. С 42.
"АВАК. Т. XVII. С 415.
[38] Тананаева Л.И. Сарматский портрет. Из истории польского портрета эпохи барокко. М., 1979. С. 15.
[39] Грышкевіч А. Беларуская шляхта //Спадчына. 1993. № 1. СИ.
[40] Статут Вялікага княства Л ітоўскага 1529 г., разд. 3, арт. 10; Статут 1566 г., разд. 3, арт. 15; Статут 1588 г., разд.3, арт. 18.
[41] Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г., разд. 15, арт. 1,4, 8; Статут 1588 г., разд. 15, арт. 1, 2, 8.
[42] Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980. С. 174.
[43] Lepkowski Т. Polska — narodziny nowoczesnego narodu. 1764-1870. Warszawa, 1917. С. 138-139.
[44] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. Опыт по истории учреждений в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства. М., 1900. С. 204.
[45] Охотский Я. Д. Рассказы о польской старине. Записки XVIII века. СПб., 1874. Т. 1. С. 25-26.
"Тамжа. С. 198-199.
[47] Тананаева Л. И. Сарматский портрет. С. 16.
[48] Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею для разбора древних актов. Вильна, 1865—1912 (далей АВАК). Т. XXII. С. 153.
[49] Там жа. С. 163.
[50] Там жа. С. 195.
[51] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при уп равлении Виленского учебного округа (далей АСД). Т. 4. С. 228-229.
[52] АВАК. Т. III. С. 291-292.
"Тамжа. С. 290-291.
[54] АВАК. Т. XXXIX. С. 61.
[55] Gutkowska-Rychlewska. М. Historia ubiorow. С. 869.
[56] АВАК. Т. XXXVI. С. 388.
[57] Там жа. Т. XIV. С. 274.
[58] Там жа. Т. VIII. С. 465.
[59] АВАК. Т. XXXVI. С. 388.
[60] Там жа. Т. VIII. С. 484.
[61] АВАК. Т. XXXVI. С. 23. Цыт. па кн.: Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры белорусов XVI—XVIII вв. Мн., 1981. С. 67-68.
[62] Matejko J. Ubiory w Polsce 1200-1795. Krakow, 1967. С 70.
[63] АВАК. Т. XXXIX. С. 22.
[64] Тамжа. Т. XXI. С. 16-17.
[65] Там жа. Т. XXXIX. С. 543.
[66] Марзалюк I. Магілёў у XII—XVIII стст. Людзі і рэчы. Магілёў-Мінск. С. 136-137.

[67] В. Я. Вільня. Кароткі гістарычны нарыс // Спадчына. 1998. № 2. С 167.
[68] Matejko J. Ubiory w Polsce 1200-1795. С 122.
[69] Пэрэгрынацыі, альбо кароткае і сціплае апісанне вандраванняў Генрыха Вольфа з Цюрыху// Спадчына. 1998. № 3. С. 180, 182.
[70] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры бе лорусов XVI-XVIII вв. Мн., 1981. С. 86.
[71] АСД. Т. 3. С. 82.
[72] Gutkowska-Rychlewska. M. Historia ubiorow. Wroclaw—Warszawa-Krakow, 1968. С. 865.
[73] АСД. Т. 3. С. 63.
[74] АВАК. Т. IX. С. 483.
[я] АСД. Т. 3. С. 82.
[76] Там жа. С. 104.
[77] Лавыш К. Арыенталізм як частка мастацкай культуры і побыту беларускай шляхты эпохі сарматызму // Бела руси гістарычны часопіс. 2003. № 1. С. 48—59.
[78] Tazbir J. Synkretysm a kultura sarmacka // Teksty. 1974. № 4. С. 46. Цыт. па кн.: Тананаева Л. И. Сарматский портрет. Из истории польского портрета эпохи барокко. М., 1979. С. 25.
[79] Виньи Альфред де Сен-Мар, или Заговор во времена Людовика XIII. Мн., 1983. С. 257.
[80] Labourer Jean de. Relacja z podrozy krolowej polskiej // Czudzoziemcy o Polsce. Relacje i opinie. Т. I. Krakow. С. 245. Цыт. па кн.: Тананаева Л. И. Сарматский порт рет. С. 26.
[81] Таннер Б. Описание путешествия польского посоль ства в Москву в 1678 году. М., 1891. С. 10.
[82] Булгарин Ф. Воспоминания Фаддея Булгарина. От рывки из виденного, слышанного и испытанного в жиз ни. Ч. 1. СПб., 1846. С. 38-40.
[83] Грибовский А. М. Записки о императрице Екатерине Великой полковника, состоявшего при ее особе статс-секретарем Адриана Моисеевича Грибовского. Изд. 2-е, с дополнениями. М., 1864. С. 8.
[84] Тананаева Л. И. Сарматский портрет. С. 254.
[85] Марзалюк I. А. Магілёў у XII—XVIII стст. С. 140.
[86] Мерцалова М. Н. История костюма. С. 79.
[87] Псторыя беларускага мастацтва: У 6 т. Т. 2. Другая палова XVI - канец XVIII ст. Мн., 1988. С. 54.
[88] Gutkowska-Rychlewska, M. Historia ubiorow. С. 389.
[89] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг Витебской и Могилевской губерний. Ви тебск, 1871-1906. Вып. 1-32 (далее ИЮМ). Вып. 7. С. 76.
[90] Kitowicz Jedrzej. Opis obyczajow za panowania Augusta III. Wroclaw. 1970. С 487. Цыт. па кн.: Мальдзіс А. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. Мн., 2001. С. 326.
[91] АВАК. Т. IX. С. 484.
[92] Мальдзіс А. Як жылі нашы продкі. С. 326.
[93] ИЮМ. Вып. 13. С. 55.
[м] Там жа. Вып. 11. С. 53.
[95] Там жа. Вып. 8. С. 142.
[%] Тамжа. Вып. 1. С. 234.
[97] Бальцэўскі Э. Паштовы тракт ішоў праз Магілёў // Магілёўская праўда. 1982. 28 ліпеня.
[98] Там жа.
[99] Kraszewski Kajetan. Wybor pism. Krakow. 1892. Т. 1. S. 114—115. Цыт. па кн.: Мальдзіс А. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. С. 324.
[100] Мальдзіс А. Як жылі нашы продкі. С. 324.
[101] Gloger Z. Encyklopedia staropolska. Т. III. С 79.
[102] ИЮМ. Вып. 8. С. 62.
[103] Бибиков А. И. Записки о жизни и службе А. И. Биби кова // Русский быт XVIII века. Ч. II. М., 1919. С. 229.
[104] Вылогі — дэталі мундзіра, якія розніліся колерам ад агульнага колеру мундзіра: каўнер, лацканы, манжэты, акантоўкі.
[,os] Gloger Z. Encyklopedia staropolska. Т. II. С. 126.
[106] Охотский Я. Д. Рассказы о польской старине. Т. I. СПб., 1874. С. 9.
[107] Там жа. Т. I. С. 173-174.
[108] Патоцкі Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. Мн., 1997. С. 155—156.
[109] Шепелев Л. Синие воротнички // Родина. 1994. № 1. С. 83.
[110] Там жа. С. 84.
[I] Там жа. С. 89.
[112] Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. XII. Мн., 1975. С. 106.
[|13] Шпилевский П. М. Путешествие по Полесью и белорусскому краю. Мн., 1992. С. 150, 220. [114] Там жа. С. 174. [1,5] Там жа. С. 220.
[116] Там жа. С. 150.
[117] Там жа. С. 59.
[118] Бобровский П. Материалы для географии и статисти ки России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. СПб., 1863. Ч. I. С. 816—818.
[119] Шпилевский П. М. Путешествие по Полесью. С. 47.
[120] Там жа. С. 48.
[121] Улашик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1965. С. 92.
[122] Анимелле Н. Быт белорусских крестьян //Этнографи ческий сборник Императорского русского географичес кого общества. Вып. 2. СПб., 1854. С. 135.
[123] Никифоровский Н.Я. Очерки житья-бытья в Витеб ской Белоруссии. Витебск. 1895. С. XXII.
[124] Анимелле Н. Быт белорусских крестьян. С. 135.
[125] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі, ф. 6, воп. 11, спр. 104, л. 5.
[126] Село Ляховцы Брестского уезда // Гродненские гу бернские ведомости. 1891. № 73.
[127] Архіў ІМЭФ НАН Беларусі, ф. 6, воп. 11, спр. 104, л. 3.
[128] Россия: Полное географическое описание нашего Оте чества / Под ред. В. П. Семенова. СПб., 1905. Т. IX. С. 201.
[129] Там жа. С. 112.
[130] Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. VIII. Мн., 1975. С. 350-351.
[131] Мерцалова М. Н. История костюма. С. 151.
[132] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772—1903). Мн., 1940. Т. 2. С. 712, 733.
[133] Документы и материалы по истории Белоруссии (1900-1917). М., 1953. Т. 3. С. 27.
[134] Минский листок. 1899. № 47. 18 апр.
[135] Научный архив Института этнологии и антрополо гии им. Н. Н. Миклухо-Маклая РАН, г. Москва. Фонд ОЛЕАЭ. спр. 43, л. 6.
[136] Стриженова Т. К. Из истории советского костюма. М., 1972. С. 10.
[137] Там жа. С. 17.
[138] Там жа. С. 28-30.
[,5,] Тамжа. С. 15.

Глава 2 Сялянскі касцюм





Асноўнай крыніцай для вывучэння найбольш ранніх касцюмных комплексаў жыхароў Беларусі з'ўляюцца матэрыялы археалагічных раскопак курганаў. Згодна з рэканструкцыямі беларускіх археолагаў аснову касцюмнага комплексу X—XIII стст. складалі льняная кашуля навыпуск, падпяразаная поясам, і нешырокія льняныя або суконныя штаны. Пры неабходнасці гэта асноўнае адзенне дапаўнялася верхняй распашной вопраткай тыпу світы, наплечным пакрывалам, кажухом, шубай, шапкай і лыкавым або скураным абуткам[1].

Сыравінайдляягослужылілён, шэрсць, каноплі, крапіва[2]. Як матэрыял для адзення з найдаўнейшых часоў жыхары Беларусі выкарыстоўвалі таксама футра розных звяроў і скуры хатняй жывёлы, перш за ўсё авечак.

Сялянскі касцюм фарміраваўся на мясцовых народных традыцыях, сягаючых сваімі каранямі ў вельмі раннія гістарычныя перыяды, таму ў ім прасочваюцца агульнаславянскія рысы як у назвах асобных элементаў і частак касцюма, так і ў крої. Характэрнай рысай традыцыйнага касцюма беларусаў было доўгае захаванне такіх старажытных элементаў адзення, агульных для Усходняй Еўропы, як тунікападобны крой кашулі, лыкавы і скураны абутак.

Найболын старажытны элемент мужчынскага касцюма — кашулю сяляне насілі ў любым узросце, у будні і ў святы, пры любым матэрыяльным і сямейным становішчы. Іх кроілі з цэльнага палатна такім чынам, што ні адзін кавалак тканіны не прападаў. Галоўную частку кашулі складаў «стан» (перад і зад кашулі ад плячэй да нізу) з перагнутага папалам па ўтку аднаго кавалка палатна без швоў на плячах. На месцы перагібу рабілі выраз каўняра.

Так як шырыня даматканага палатна не перавышала 45—53 см і яго не хапала для аб'ёма кашулі, з бакоў да асноўнага палотнішча ніжэй рукавоў прышывалі прамыя кавалкі тканіны шырынёй у палову цэльнага палатна, складзенага ўздоўж на аснове (на больш худых надточку прышывалі звычайна толькі з левага боку асноўнага палотнішча). Зверху да «стана» з абоіх бакоў прышывалі доўгія прамыя рукавы, пад якія ўшывалі ромбавідныя або квадратныя ластавіцы («цвіклі», «ластаўкі»). Даўжыня кашулі даходзіла да кален, а часам і закрывала іх.

Другі старажытны тып мужчынскай кашулі, вядомы ўсім усходнім славянам, на Беларусі складала кашуля з прамымі плечавымі ўстаўкамі, якія называліся «палікамі», а ў некаторых мясцовасцях «вустаўкамі». Такі крой кашуль быў найбольш распаўсюджаны на тэрыторыі Палесся, дзе пераважаў да пачатку XX ст. Мужчынскія кашулі, у адрозненне ад жаночых, звычайна шылі з больш грубага палатна, тканага ў два ніты.



**Адзенне ўсходніх славян.** Ігрышчы і пляскі паўночных плямёнаў (радзімічаў, вяцічаў і севяран). Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

У Старажытнарускай дзяржаве мужчынскі комплекс асноўнага адзення складаўся з кашулі і вузкіх штаноў, якія запраўлялі ў боты або анучы, калі іх надзявалі з лыкавымі, лазовымі ці скуранымі лапцямі. Кашулю, якую насілі навыпуск, падпяразвалі поясам і зверху апраналі з грубага сукна (орніцы) світу, зіпун, «світу ватоляну» (з грубай тканіны з ільну і пасконі)[3], сярмягу, кажух або якую-небудзь шубу («пополнтая белнннная», «белнннная голая», «баранья», «лнсья») і інш.[4]

Важным элементам мужчынскага касцюма быў пояс. Акрамя сваёй практычнай функцыі (ён прымае на сябе значную частку вагі вопраткі, утрымлівае яе і як бы звязвае верхнюю і ніжнюю паловы адзення) пояс меў вялікае сімвалічнае значэнне. Хадзіць без пояса лічылася непрыстойным.

Высветліць крой мужчынскага паяснога адзення вясковага насельніцтва Беларусі ў раннім сярэдневякоўі паводле пахавальных помнікаў немагчыма, але некаторыя даследчыкі лічаць, што штаны былі нешырокімі. Калашыны іх кроілі з прамых палотнішчаў, у шагу ўшывалася ластавіца. У поясе іх рабілі шырокімі, без разрэзу, на тасемцы[5]. Штаны запраўлялі ў галянішчы ботаў або (калі насілі з лапцямі) калашыны абгортвалі да сярэдзіны галёнкі анучамі.

Матэрыялы з Вышадкоўскага пахавальнага комплексу Гарадокскага раёна Віцебскай вобласці далі магчымасць археолагам рэканструяваць два касцюмныя комплексы заможнага вясковага насельніцтва Паўночна-Усходняй Беларусі XII—XIII стст.

Першы тып касцюма належаў, відаць, заможнаму прадстаўніку мясцовай адміністрацыі, хутчэй за ўсё цівуну на адным з пагостаў Віцебскага ўдзела Полацкай зямлі. Ён складаўся з палатнянай кашулі, штаноў, суконнага на лямцавай падкладцы каптана даўжынёй да кален, скуранога абутку. Каптан быў абшыты плеценым металізаваным галуном па нізу, канцах рукавоў і, магчыма, па некаторых швах. Каўнер быў невялікі, стаячы або зусім адсутнічаў.

Зверху каптана нябожчык быў чатыры разы апяразаны поясам з нітак у выглядзе жгута, шырынёй каля 4 см і даўжынёй прыблізна 6—7 м. На канцах пояс разыходзіўся на тры плеценыя з нітак і танюсенькіх провалачак касіцы і завязваўся вузлом злева на жываце. Касцюм дапаўняўся залататканым галаўным уборам[6].

Другі тып касцюма з Вышадкоўскага пахавальнага комплексу таксама належаў заможнаму вясковаму жыхару. Ен складаўся з кароткай курткі-каптана даўжынёй да сярэдзіны бядра. Пад тканінай курткі знаходзілася добра захаванае футра светла-



**Касцюмы заможнага вясковага насельніцтва Паўночна-Усходняй Беларусі XII—XIII стст.** Рэканструкцыя Г. Ласкавага і Л. Дучыц

шэрага колеру, полы перакрывалі адна другую, ствараючы характэрнае «мужчынскае» запахванне злева направа. Куртка не мела каўняра, а па каўняру і нізу была абшыта галуном. З галуна былі зроблены чатыры пятліцы-засцежкі на грудзях. Касцюм дапаўняўся скуранымі ботамі[7].

На аснове перапрацоўкі і пераасэнсавання высокіх дасягненняў мастацтва Старажытнай Русі, Візантыі і заходнееўрапейскай культуры ў XIV—XVI стст. на Беларусі зацвярджаецца гуманістычны (рэнесансавы) светапогляд. Пад уздзеяннем і ў рэчышчы гэтага новага светаўспрымання касцюм паступова адыходзіць ад уплыву хрысціянскіх догмаў пра фахоўнасць чалавечага цела і неабходнасць яго поўнага хавання пад адзеннем. У гэты перыяд складваецца і хутка развіваецца тэхніка крою, удасканальваецца кравецкае рамяство, з'яўляюцца ўстойлівыя варыянты геаметрычных узораў у арнаментыцы, а ў каларыстыцы выпрацоўваецца характэрнае спалучэнне белага адзення з чырвоным аздабленнем.

Крой мужчынскай кашулі ўскладняецца адкладным каўняром, а верхняя вопратка — вытачкамі, падрэзнымі бачкамі і таліяй для прылягання адзення да фігуры, што было прынцыпова новым у параўнанні з ранейшымі простымі сілуэтамі касцюмных комплексаў.

У XVI ст. насельніцтва Вялікага княства Літоўскага хутка прызвычаілася да курэння тытуню (у той час як у Маскоўскай дзяржаве гэта было строга забаронена да Пятра I). Таму менавіта з гэтага часу скураная сумачка («каліта», «шабета»), якую прымацоўвалі да пояса або насілі на раменьчыку праз плячо, стала служыць для захавання табакі, люлькі і прылад для высякання агню. Аднак курэнне тытуню было прывілегіяй толькі сталых і пажылых мужчын. Нежанатым сынам, пакуль яны не заводзілі самастойнай гаспадаркі, бацькі курыць строга забаранялі.

Добра прыстасаваны да земляробчай працы касцюм беларускага сялянства быў у значнай ступені



**Сялянскі касцюм XVII ст.** Малюнкі з інвентара Бранчыцкага ключа Слуцкага княства. 1682 г.



Сялянскі касцюм XVIII ст. «Паляшук».
Малюнак невядомага мастака 2-ой палавіны XVIII ст.

аднародным на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Ва ўмовах, калі сын паўтараў жыццёвы шлях бацькі, займаючыся тымі ж гаспадарчымі заняткамі і карыстаючыся тымі ж прыладамі працы, сялянскае адзенне на працягу стагоддзяў змянялася мала. Яго гістарычнае развіццё аж да сярэдзіны XIX ст. ішло па шляху паступовай мадыфікацыі элементаў адзення, пашырэння каляровай гамы, фарміравання рэгіянальных касцюмных комплексаў, не закранаючы структуры касцюма.

Пры наездзе суседа на маёнтак Войцэха Чыжа ў Слонімскім павеце ў 1561 г. у яго сялян Анцыпера і Сідара Лойкаўлюдзі суседняга пана знялі «сермягн ... две, кожухндва, поесыдва, калнтьдве, вкалнтахь копагрошей»(1561 г.)[8].Яквідацьздакумента, сяляне былі апрануты ў кажухі, зверху якіх, мусіць, для абароны скуры кажухоў ад мокрага снегу, былі надзеты сярмягі, падпяразаныя поясам з калітою.

У пераліку маёмасці селяніна Пятра Чарневіча, забітага і абрабаванага ў 1630 г. людзямі пана, ад якога ён збіраўся перайсці, сярод жывёлы і іншых рэчаў было забрана «поесовь жычаныхь десять... сермягу убранье новое сермяжное хлопячое... кашуль мужскнхь полотняныхь по чотырн локтн десеть, такожь по петп грошей локоть...» (1630 г.)[9]. Такім чынам, сялянскі касцюм першай палавіны XVII ст. складаўся ўсё з той жа палатнянай кашулі з «жычаным» (плеценым) поясам, даматканыхсуконных «хлопскіх» штаноў («убранье новое сермяжное хлопячое») ды світы («сермягн»).

Надзейнай крыніцай па сярэдневяковаму народнаму касцюму служыць старажытнабеларускі іканапіс, які гарманічна спалучаў прафамнасць, нязменнасць іканаграфічнай схемы з непасрэднай зацікаўленасцю да рэальнага чалавека, яго пачуццяў і знешняга аблічча, у тым ліку і традыцыйнага касцюма. Увядзенне ў абраз рэалій звыклага адзення рабіла рэлігійны сюжэт зразумелым і блізкім народным масам. На іконе «Пакланенне вешчуноў», якая паходзіцьз Магілёўшчыны і напісанаўXVII ст. мясцовым беларускім майстрам, адзін з персанажаў апрануты ў даўгаполае тэракотава-карычневае адзенне накшталт беларускай катанкі і падпяразаны шырокім, глухім па тону зеленаватым поясам. Гэты сялянскі строй пастуха дапоўнены тыповым атрыбутам касцюма беларуса сярэдняга і пажылога ўзросту — скураной сумкай-шабетай[10].

Амаль усё XVII ст. Рэч Паспалітая знаходзілася ў становішчы пастаяннай вайны. Войны ішлі то з Масквой, то з туркамі, татарамі і казакамі, то з пратэстанцкімі краінамі, таму ў XVIII ст. сяляне апраналіся, па падліках спецыялістаў, нават горш, чым у папярэднія стагоддзі. Усё адзенне, улічваючы сярмягі, палатняную бялізну, лыкавыя лапці, шапкі з футра, рабілі ўласнымі рукамі. Поруч са штодзённай, рабочай, вопраткай у сялян было і святочнае, больш дарагое, адзенне".

Енджы Кітовіч у сваіх успамінах першай палавіны XVIII ст. пісаў, што рускі (украінскі і беларускі) мужык насіў «жупан, г. зн. сярмягу з простай белай воўны, у поясе шырокую, з шырокімі рукавамі, даўжынёй жа да палавіны галёнкі; пад сярмягай, г. зн. жупаном, — кашуля тоўстая, доўгая, чорная, у штаны запраўленая, у далёкай дарозе казліным лоем вымазаная, каб паразітаў адстрашыць. Палатняныя штаны, затлушчаныя салам і дзёгцем ад колаў, вялікія, шырокія, яктурэцкія шаравары, — быццам торбы, яны абвісалі паміж нагамі. Зімою ж — суконныя, тоўстыя. На нагах — скураныя хадакі або лапці з лыку, падвязаныя аборамі да ног, якія абкручваліся анучамі... На сярмязе або на кашулі пад сяр-



**Касцюм пастуха з сумкай-шабетай.** Абраз «Нараджэнне Хрыстова» з Баркалабаўскага манастыра Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці

мягай — шарсцяны пояс хатняй работы, часцей за ўсё з чырвонай воўны. На галаве — высокая шапка, аколеная вузкай палоскай з чорнага баранчыка, з чырвоным верхам французскага сукна... Як у даро-зе, так і дома адзяваліся аднолькава — з той толькі розніцай, што ў касцёл, на большае свята, ужывалі боты, апраналіся ў лепшае і чысцейшае адзенне. Летам — саламяны капялюх на галаве, у руках — тоненькі кіёчакдля падпоры»[12]. У дарожных натат-ках Фрыдрых Шульц, які праязджаў праз Беларусь у другой палавіне XVIII ст., таксама адзначаў, што на Гродзеншчыне сяляне насілі доўгія і шырокія жу-паны, абуваліся ў плеценыя з лыка лапці[13].

Вясковае адзенне XVIII ст. у розных рэгіёнах Беларусі ўжо мела шэраг асаблівасцей. На паўноч-на-ўсходняй Віцебшчыне і ў некаторых усходніх раёнах Магілёўшчыны сфарміраваўся летні кас-цюмны комплекс з палатнянай вопраткай, па крою тоеснай свіце (насоў, касталан, кізель, шарапан).

А. Меер у канцы XVIII ст. пісаў, што на Крычаў-шчыне «Адзенне мясцовых сялян складаецца летам з пяньковых касталанаў, або, па-руску, балахонаў, а на пераплеценых аборамі, як у латышоў, нагах но-сяць яны сплеценыя з аднаго толькі лыку плоскія, з петлямі кавярзні або з пяці лык пяцернікі; зверху сваіх касталанаў носяць яны зімой белыя даматка-нага сукна світы або афарбаваныя часам у сіні ко-лер кафтаны з авечай воўны, якая пастрыгаецца з авечак два разы ў год, гэта значыць вясной і ўвосень. Летам прыкрываюць яны свае галовы лямцавымі, з белай воўны каўпакамі, падобнымі да тулляў ад рускіх вялікіх капелюшоў, а зімою, хаця і не ўсе, — падвязанымі шапкамі»[14].

М. Анімеле, вольнаадпушчаны селянін Віцеб-скай губерні, так апісваў сялянскі касцюм гэтага рэ-гіёна Беларусі напярэдадні адмены прыгоннага пра-ва: «Звычайнае мужчынскае летняе адзенне, акра-мя... грубай палатнянай кашулі, нярэдка афарбава-най у чорную фарбу, і портаў з яшчэ грубейшага палатна, складаюць: палатняны халат, называемы ў Гарадзецкім павеце — насоў, а ў Дрысенскім — кізель; або старэнькі каптан, або верхнік — другая брудная кашуля. Пакрой суконных каптанаў і кас-таланаў, пашытых з тоўстага палатна, тоесны рускім армякам, з тою ў некаторых розніцай, што каля шыі на фудзях робіцца невялікая выемка, якой армякі не маюць»[15].

Сялянскі касцюм дапаўняўся лёгкай суконнай шапкай, фуражкай з казырком, лямцавым самароб-ным капелюшом. Па кашулі апяразваліся вузенькім плеценым з чырвоных ці сініх шарсцяных нітак па-яском, а па каптану ці кажуху нярэдка пяньковай або льняной вяровачкай. Штодзённым абуткам ся-лянам служылі лапці з пяньковымі ці раменнымі аборамі. Лапці абувалі на анучы, а зімою на суконкі. Некаторыя замест плеценых лапцей насілі скура-ныя лапці[16].



Традыцыйны штодзённы касцюм сялян вёскі Хатынічы Пінскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

Штодзённы касцюм. Вёска Мерачоушчызна Косаўскага павета. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка



Святочны касцюм сялян Віцебскай губерні, паводле апісання М. Анімеле, складаўся з тонкай белай палатнянай, або сіняй крашанінннай (пафарбаванай спецыяльнымі майстрамі-сінільшчыкамі), а часам чырвонай кашулі, палатняных порткаў і каптана.

Ворат белых палатняных кашуль абшываўся якімі-небудзь каляровымі баваўнянымі тасемкамі або быў вышыты ўзорамі. Замест лапцей некаторыя абувалі боты, часам нячэрненыя. Па святах у такое адзенне сяляне апраналіся зімою і летам. Толькі ў самую моцную спякоту некаторыя маладыя мужчыны замест суконнага каптана ці армяка надзявалі такой жа формы касталан з тонкага белага палатна з абшытымі чырвоным кумаком (баваўнянай тканінай) краямі каўняра і пярэдняга крыса да пояса[17].

У сярэдзіне XIX ст. асаблівасці традыцыйнага сялянскага касцюма розных мясцовасцей Беларусі заўважыў і апісаў П. М. Шпілеўскі. Так, у ваколіцах Сеняўкі, непадалёку ад Клецка, «мужчыны апрануты былі ў белыя світкі са стаячымі каўнярамі і з чырвонымі паясамі; на галовах іх былі шапкі-валенкі з авечай шэрсці, на нагах — лыкавыя лапці»[18].

Сялян Барысаўскага павета П. М. Шпілеўскі падзяляе на «лесян» і «палян», гэта значыць тых, хто жыве ў лясістых і бязлесых, палявых месцах[19].



**Штодзённы касцюм.** Вёска Мерачоўшчызна Косаўскага павета. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка



**Скураная каліта.** Вёска Рожджалавічы Ганцэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Пачатак XX ст.



**Зімовы касцюм.** Вёска Мерачоўшчызна Косаўскага павета. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка



**Рабочы касцюм лалешукоў.** Вёска Бучын. Заходняе Палессе. Пачатак XX ст.

Мужчыны-лесяне «носяць шэрую або цёмна-бурую з маленькім каўнерчыкам капоту (сярмягу) з моцнага хатняга сукна — сустракаюцца капоты і зусім белыя. Крой капоты і мужчынскай і жаночай амаль аднолькавы. Капота бывае большай часткаю ў абхват нешырокай: полы спераду ніколі не схо-дзяцца, ззаду без разрэза, — у мужчын да кален... Капоты ўжываюць і зімою і летам; у некаторых яны вядомы пад імем світы. Другі род адзення — насоў, гэта значыць нешта накшталт верхняга паліто з тоў-стага палатна; фасон яго такі ж, як і світы; яго апра-налі летам у час дажджу, а зімой — снегу і мяцеліцы. Акрамя таго, у вялікім пашырэнні кажух і тулуп аднаго з сярмягай крою: кажух нярэдка носяць і ле-там. Замест пояса мужчыны носяць дзягу, гэта зна-чыць шырокі, тоўсты рэмень з жалезнай засцежкай, на якім абавязкова вісіць раменная ж каліта (сум-ка) з нажом, крэсівам і трутам ці губкай. Панталоны — летам палатняныя, зімой суконныя абавяз-кова на учкурах, гэта значыць ля паясніцы сцягва-юцца вяровачкай і заўжды спушчаны ў боты або ў лапці... фуражкі, або, дакладней, шапкі робяцца з простага белага сукна з доўгімі вушкамі, якія, як і аколышкі, абшываюцца чорнымі альбо белымі аве-чымі футрамі; у горад, аднак, надзяваюць часам фуражкі з купленага сіняга сукна з казыркамі. Шыя летам і ўзімку аголена; ворат сарочкі зашпільваец-ца якой-небудзь металічнай запінкай з блёсткамі»[20].

**Рабочы касцюм сялян.** Веска Вялікія Азёркі Слонімскага павета Гродзенскай губерні. 1914 г. Фота І. Якубені





**Традыцыйны штодзённы касцюм.** Вёска Чалавец Лунінецкага павета. 1930-ыя гг. Фота Ю. Абрэмбскага

П. М. Шпілеўскі адзначаў, што «жыхары палёў, гэта значыць паўночна-ўсходняй часткі павета, значна адрозніваюцца ад лесян. Адзенне мужчын складаецца з суконнай бронзавага колеру світы, дасягаючай каленяў; белага палатнянага насова; дзягі незвычайна шырокай з меднымі ўпрыгожаннямі, без каліты — толькі з нажом. Замест учкурных панталонаў носяць вузкія нагавіцы з шэрага сукна. На шыі носяць каляровыя хусткі; заместлапцей больш носяць боты з высокімі галянішчамі, нярэдка ўпрыгожанымі нашыўнымі з дратвы ўзорамі. Фуражкі носяць з белых валёнак (гэта значыць лямцавыя) у выглядзе перакуленага гаршка для кветак: яны называюцца магеркамі»[21].

Неабходнай прыналежнасцютрадыцыйнага касцюма сталага беларуса ў XIX ст. на большай частцы тэрыторыі Беларусі заставалася скураная каліта, у якой насілі крэмень, крэсіва і губку (бярозавы грыб, правараны ў шчолаку — вадзе з попелам), а таксама люльку, тытунь, а калі ездзілі на кірмаш, то і грошы. Крэмень, крэсіва і губка былі патрэбны для здабывання агню высяканнем, бо да пачатку XX ст. запалкі сяляне амаль не ўжывалі.

Нават самы бедны мужык не ставіўся абыякава да свайго касцюма. У сялян існавала свая мода, якой прытрымлівалася большасць жыхароў той ці іншай мясцовасці. Прыхільніцай новаўвядзенняў у вёсцы часцей за ўсё была моладзь, а сталыя людзі аддавалі перавагу традыцыйным формам адзення.

Рэформа 1861 г., якая знішчыла юрыдычныя перашкоды для перамяшчэння насельніцтва і хуткае развіццё ў краіне капіталістычных адносін, выклікала шырокую хвалю адыходніцтва мужчынскага насельніцтва з вёсак у Пецярбург і іншыя буйныя гарады Расіі, на сплаў лесу, шахты Данбаса. Праз адыходнікаў, якія траплялі ў горад, а потым вярталіся дамоў, узмацняўся ўплыў горада на матэрыяльную культуру вёскі, і ў першую чаргу на адзенне — самую мабільную і ўспрымальную частку гэтай культуры.

Аднак менавіта пасля адмены прыгоннага права ў другой палавіне XIX ст., а ў раёнах з больш патрыярхальным укладам жыцця к канцу XIX — пачатку XX ст. сялянскае адзенне набыло найбольш выразную этнаграфічную адметнасць. Якраз касцюм гэтага перыяду лічыцца класічна традыцыйным і разглядаецца як адна з важнейшых частак нацыянальнай культуры беларусаў.

Як вынік уплыву гарадской культуры на вясковую на Беларусі з'явіліся кашулі на какетцы, што ў асноўным супадае з часам іх распаўсюджання ў суседніх народаў[22]. Пад уздзеяннем гарадской моды

мужчынскі касцюм значна хутчэй за жаночы пачаў страчваць свае традыцыйныя рысы. Значную ролю ў гэтым працэсе адыгрывалі такія фактары, як узрост мужчын, аддаленасць вёсак ад гарадоў і ступень развіцця ў іх традыцый адыходніцтва, маёмаснае расслаенне сялянства.

Я. Колас у сваёй першай літаратурна-этнаграфічнай працы «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле» так апісваў змены ў адзенні жыхароў сваёй роднай вёскі Мікалаеўшчыны, у якой у 1880— 1890-ыя гг. шырока практыкавалася адыходніцтва на заробкі ў вялікія прамысловыя цэнтры:

«У будны дзень, у рабочы час, яны (мікалаеўцы) носяць кужэльную кашулю і зрэбныя порткі. Ідуць на работу ўлетку ўсяляк: адны босыя, другія ў лапцях, а іншыя і ў ботах. А на святы дзень у ўсякага ёсць новая чыстая шапка, летам з брылем, а зімою аблавухая кучомка, камзэлька, чысты суконны або крамны пільчак, крамныя порткі, боты. А маладыя хлопцы ходзяць яшчэ чысцей; іншы так... убярэцца ў святы дзень, што ўсё роўна як паніч: порткі драпавыя навыпуск, пільчак харошы, шапка з шырокім верхам, а возьме ў рукі парасон ды яшчэ як начэпіць загарак (гадзіннік)!»[23].

Разам з тым неабходна адзначыць, што вёсак, дзе б шырока было развіта адыходніцтва, у канцы XIX — пачатку XX ст. існавала не так многа і выглядалі яны нібы астраўкі ў неабсяжным моры вясковага насельніцтва, якое амаль усе патрэбы ў адзенні задавальняла за кошт даматканіны.



**Традыцыйны касцюм старога.** Вёска Альшаны Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. 1960-ыя **гг.**



**Традыцыйны штодзённы касцюм.** Піншчына. Пачатак XX ст.

Да 1920-ых гг. асноўнай сыравінай для вырабу адзення па-ранейшаму служыў лён, які сеялі ў кожнайсялянскай гаспадарцы. Плошчапасевальнузвычайна залежала ад памераў зямельнага надзелу і колькаснага складу сям'і. Для атрымання якаснага валакна лён два разы за лета праполвалі ад пустазелля.

Звычайна ў густых пасевах лён мае адно сцябло з 1—3 насеннымі каробачкамі. Найбольшую каштоўнасць мае неразгалінаваная частка сцябла, з якой атрымліваюць доўгае валакно.

У канцы жніўня, калі лён дасягаў тэхнічнай спеласці, яго рвалі («бралі») з корнем рукамі і, звязаўшы ў невялікія снапкі, пакідалі на льнішчы для прасушкі. Сухія галоўкі адразалі і абмалочвалі на разасланай пасцілцы ці радне вальком («пранікам», «прачом», «пральнікам») для мыцця бялізны, а сцеб-

лы льну расцілалі радкамі на лузе, каб пад уздзеяннем дажджу і расы змякчылася льняная салома і кастрыца лёгка аддзялялася ад валакна.

Атрыманы паўфабрыкат ільну (трасту) мялі пры дапамозе «церніцы», або «мялкі». Беларусы карысталіся гарызантальнай мялкай на чатырох ножках або каранявой мялкай на дзвюх ножках. Затым лён трапалі мечападобнай або ножападобнай дошчачкай. Пасля трапання льняное валакно часалі на грэбні, а затым шчоткай са свіной шчаціны.

Пралі ніткі пры дапамозе верацяна і састаўной пралкі або грэбня. Звычайна воўну пралі на верацяно з пралкі, а льняную кудзелю — з грэбня. Доўгае, добра вычасанае валакно ішло на выраб нітак, з якіх ткалі тонкае кужэльнае палатно. З кароткага валакна атрымоўваліся болыхі грубыя ніткі, з якіх ткалі «зрэбную» тканіну.

За шэсць тыдняў Піліпаўскага посту беларускія жанчыны стараліся напрасці на адзенне ўсім членам сям'і. Калі ж у сям'і было некалькі сыноў, муж ды яшчэ свёкар, жанчына не магла адна напрасці



**Трэдыцыйны вясельны касцюм.** Палессе 1930-ыя гг. Фота Ю. Шыманчыка



**Летні касцюм вясковага хлопчыка.** Вёска Мерачоўшчызна Косаўскага павета. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка

дастаткова пражы. У такім выпадку яна звала суседак і радню на «попрадкі» («супрадкі») — своеасаблівую жаночую талаку. На яе ў вызначаны дзень жанчыны і дзяўчаты прыходзілі з самага ранку са сваімі верацёнамі, пралкамі і калаўротамі. Пасля снедання, якім частавала гасцей гаспадыня, жанчыны пралі цэлы дзень і ноч да наступнага рання. Ніякай платы за сваю работу яны не бралі.

Пасля Каляд у вёсках ладзілі кросны і з наступленнем Вялікага посту пачыналі ткаць. Для вырабу тканін на жаночыя андаракі і верхняе адзенне выкарыстоўвалася воўна, якую мылі, скублі, а затым часалі на шчотках ці насілі апрацоўваць на спецыяльныя ваўначоскі. Пры вырабе паўшарсцяных («шарачковых») тканін ваўняныя ніткі выкарыстоўвалі звычайна на ўток, а аснову рабілі з ільняных нітак.

У болыхіасці вясковага насельніцтва Беларусі да канца XIX ст. нават святочная вопратка ўся была даматканай. Пакупнымі былі (і то далёка не ва ўсіх) толькі боты ды некаторыя галаўныя ўборы (магеркі, брылі, картузы). Я. Колас у паэме «Новая зямля»



**Дзіцячы штодзённы касцюм.** Палессе 1930-ыя гг. Фота Г. Паддэмбскага

так апісвае святочны касцюм дзядзькі Антося, які збіраўся ехаць у Вільню:

Убраўся дзядзька, як у свята;
Сказаць — не вельмі зухавата;
Пільчак быў простага сукенца, I
той весь вырыжаў ад сонца.
Кашуля зрэбна, але бела. I
шапка козырам сядзела, Хоць і
зналася добра з горам; А боты
вымазаў ён здорам[24].

Да шасці-сямі гадоў адзіную вопратку хлапчукоў летам складала палатняная кашулька звычайна тунікападобнага крою даўжынёй за калена. 3 ранняй вясны да позняй восені дзеці хадзілі босымі. Толькі калі хлопчык пачынаў далучацца да працоўнага жыцця сям'і і выконваць нескладаныя работы, яму шылі першыя зрэбныя порткі, якія трымаліся на адной ці дзвюх перакінутых цераз плечы шлейках-помачах.

Зверху кашулькі і штаноў у халодную пару апраналі суконную світку, на ногі абувалі лапці з анучамі, а на галаву — старую бацькаву шапку. Аднак нават зімой па снезе дзеці часам босыя перабягалі да сяброў з адной хаты ў другую.

Маляўніча апісваў вопратку палескіх дзяцей Я. Колас у аповесці «Дрыгва»: «Адзеты яны былі ў старыя латаныя суконныя халацікі[25], падпяразаныя даматканымі каляровымі паясамі. На нагах смешна варушыліся радняныя нагавіцы. 3-пад расхлістаных халацікаў віднеліся голыя грудзіны. Шапкі на іх былі самыя разнастайныя, непамерна вялікія, зімовыя ці проста летнія»[26].

Па магчымасці найлепшае адзенне хлопцу спраўлялі, калі надыходзіла пара жаніцца і прыглядаць нявесту. Нягледзячы на тое, што ў канцы XIX — пачатку XX ст. штодзённае адзенне па-ранейшаму ў сялян усё было даматканым, у святочным касцюме ўжо даволі шырока выкарыстоўваліся пакупныя фабрычныя тканіны.

Так, карэспандэнт Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі ў 1890 г. пісаў, што ў сяле Галавінцы Гомельскага павета Магілёўскай губерні некаторыя сяляне ў святы і нядзельныя дні носяць кашулі з «парусіны» (баваўнянага палатна), мульты або паркалю і «чартакожавыя» (баваўняная тканіна чорнага або цёмнага колеру) штаны, а таксама камізэльку спераду чорнага колеру, а ззаду палатняную. Найбольш багатыя носяць яшчэ мультавыя на ваце курткі[27].

Другі карэспандэнт з Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні ў адказах на гэты ж апытальнік Та-



**Касцюм палешукоў.** Вёска Мерачоўшчызна Косаўскага павета. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка



**Касцюм сялян з ваколіц горада Хоцімска.**
Канец XIX ст. Фота А. Блажко



**Касцюм заможнага селяніна.** Вёска Рудня Міхайлкаўская Мазырскага павета Мінскай губерні. 1914 г.

варыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі адзначаў, што пад уздзеяннем горада некаторыя маладыя сяляне пачынаюць насіць акрамя камізэлек яшчэ сурдуты і пінжакі[28].

Такім чынам, гарадскі ўплыў на сялянскі касцюм ішоў у двух напрамках. Спачатку фабрычныя тканіны замянялі даматканыя, але састаўныя элементы народнага касцюма і іх крой заставаліся традыцыйнымі. Затым гарадскія формы адзення сталі парушаць структуру традыцыйнага касцюмнага комплексу, таму што мясцовыя краўцы сталі шыць па гарадскому ўзору тую ці іншую вопратку з даматканай тканіны.

Аўтар артыкула ў часопісе «Вестннк Могнлевского земства» так апісваў касцюм селяніна з Магілёўшчыны ў пачатку XX ст.: «На селяніне па-гарадскому пашыты пінжак з «суровага» палатна з чорнымі гузікамі, з такой жа тканіны нагавіцы, картуз, дрэнненькія боты. Вопратка не з новых: праглядваюць старанна наложаныя латкі, швы; локці злёгку працёртыя. Ад доўгага мыцця некалі шэрае палатно прыняло белы колер. Відаць, доўга пажыла на свеце парадная адзежка мужычка!»[29].

Няглездзячы на гарадскі ўплыў, сялянскі касцюм канца XIX — пачатку XX ст. захоўваў свой яркі нацыянальна-спецыфічны характар на ўсёй тэрыторыі Беларусі і ў сваёй аснове быў блізкім да ўкраінскага і паўднёварускага касцюмных комплексаў. Вызначальнымі яго рысамі было шырокае выкарыстанне льняной і суконнай даматканіны белага колеру для кашуль, нагавіц і верхняга адзення, валеных лямцавых шапак і ліпавых або лазовых лапцей прамога пляцення.

Геаграфічныя межы традыцыйных касцюмных комплексаў былі выражаны нярэзка, бо сялянскі касцюм па свайму матэрыялу, крою і аздабленню розніцца па ўзроставых групах і па асобных вёсках, у залежнасці ад блізкага знаходжання гарадоў і інтэнсіўнасці кантактаў з іншанацыянальным насельніцтвам.

Разам з тым этнаграфічныя крыніцы і матэрыялы палявых даследаванняў даюць магчымасць выявіць найбольш характэрныя рысы традыцыйнага адзення беларусаў розных рэгіёнаў Беларусі і вы-



**Селянін у святочным касцюма.** Вёска Масток Магілёўскага павета Магілёўскай губерні. Канец XIX — пачатак XX ст.

**Традыцыйны летні касцюм.** Вёска Хамінка Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Пачатак 1920-ых гг.



**Касцюм юнака.** Веска Хамінкэ Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні. 1916 г.



дзеліць 6 касцюмных комплексаў канца XIX — пачатку XX ст.:

1. Комплекс традыцыйнага касцюма Падняпроўя (Аршанскі раён Віцебскай вобласці, Шклоўскі, Бялыніцкі, Магілёўскі, Мсціслаўскі, Клімавіцкі, Касцюковіцкі, Чэрыкаўскі, Краснапольскі, Быхаўскі, Кіраўскі раёны Магілёўскай вобласці, Рагачоўскі, Буда-Кашалёўскі, Светлагорскі, Добрушскі раёны Гомельскай вобласці).

Адметнай яго асаблівасцю было пераважанне белага колеру ва ўсіх элементах касцюма: белыя



**Традыцыйны святочны касцюм.** Хутар Ліп'е Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Пачатак XX ст.

кашуля, нагавіцы, хустачкі-шырынкі на шыі, анучы, белыя і шэрыя армякі і світкі.

Белую палатняную кашулю тунікападобнага ці паліковага крою насілі навыпуск. Яна мела адкладны ці стаячы каўнер, прамыя (калошкамі) ці сабраныя ля манжэт у дробныя зборачкі рукавы. Святочныя кашулі звычайна шылі са стаячым каўняром, які зашпільвалі злева на два гузікі, што давала магчымасць багата аздабляць вышыўкай манішку. Акрамя манішкі вышыўкай аздаблялі манжэты рукавоў, каўнер і падол кашулі. У сярэдзіне XIX ст. вышывалі лічанай гладдзю, а ў канцы XIX — пачатку XX ст. паўсюднае распаўсюджванне набыла вышыўка простым крыжыкам чырвонымі баваўнянымі ніткамі з невялікім увядзеннем чорнага колеру. Такое аздабленне мужчынскіх і жаночых кашуль паступова склала адну з нацыянальных адметнасцей беларускага традыцыйнага касцюма.

Нешырокія льняныя штаны з ромбападобнай устаўкай, ушытай у штаніны вугламі, або з двума ўшытымі ззаду клінамі запраўлялі ў анучы ці боты. Святочныя летнія штаны такога ж крою ў гэты перыяд шылі ўжо часцей за ўсё з афарбаванага расліннымі фарбавальнікамі ў чорны колер ільнянога палатна, або паўсуконнага «шарака» (аснова з белых нітак, а ўток — з чорных). З правага боку ў іх рабілі праразную кішэнь. Зімовы варыянт шылі з даматканага сукна чорнага або карычневага колеру.

Зверху кашулі мужчыны падпяразваліся саматробным плеценым ці тканым поясам — вузкім чырвоным, сінім, зялёным з махрамі на канцах на ўсходняй Віцебшчыне і Магілёўшчыне і шырокімі шматколернымі на Гомельшчыне. Сталыя і старыя муж-



**Традыцыйны штодзённы касцюм.** Вёска Пескі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. 1938 г. Фота Абухоўскага



**Сяляне ў традыцыйным адзенні.** Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка

чыны прывешвалі да пояса скураную каліту, але найчасцей проста ў правай кішэні штаноў насілі кісет з люлькай, тытунём і крэсівам для высякання агню. Касцюм у некаторых мясцовасцях дапаўняўся камізэлькай, якая звычайна шылася з даматканага сукна або камбінавалася з палатном (перад з сукна, а спінка з палатна).

Даўгаполае верхняе плечавое адзенне складала расхісная з даматканага сукна світа (армяк, сярмяга) белага ці шэрага колеру з невялікім стаячым каўняром. На паясніцы яна зашпільвалася на гаплік або драўляны, абцягнуты сукном гузік. Часта світа не мела засцежкі, а толькі падпяразвалася поясам.

На поўначы Падняпроўя (Аршанскі, Горацкі, Мсціслаўскі, Чавускі, Быхаўскі, Кіраўскі раёны) пераважала світа прамога халатападобнага крою (спінка і пярэдняе крыссе прамыя). На тэрыторыі цэнтральнага Падняпроўя пераважалі світы з адразной па таліі спінкай (ніжняя частка ад таліі ў зборкі, крыссе прамое) і з падразнымі бачкамі (полкі суцэльныя, спінка па лініі таліі з бакоў падразалася, пакідаючы цэнтр спінкі неадразным. Падразныя бачкі крыху прызборваліся або закладваліся ў складкі). На поўдні рэгіёна (Буда-Кашалёўскі, Гомельскі раёны) пераважала світа з неадразной спінкай, завужанай каля таліі пры дапамозе глыбокіх вытачак па баках ад праймаў рукавоў, якія ніжэй таліі ўтваралі «фалды» або «фанды».

Узімку насілі кажухі з аўчын і кароткія «паўшубкі» прамога крою. Верхняе адзенне для засцярогі ад непагадзі складала бурка, надзетая на кажух, світа або насоў.

Кароткім верхнім адзеннем былі белая світка, пінжак, курцік, казачынка, якія часам абшывалі па краях чырвоным шнурком.

Галаўным уборам на Магілёўшчыне летам служыў картуз, а ў старых — валеная каўпаковая магерка. На Гомельшчыне самым пашыраным летнім галаўным уборам поруч з магеркай служыў саламяны брыль, а ў маладых — картуз. Картузы шылі часцей за ўсё з чорнага ці цёмна-сіняга фабрычнага сукна з шырокім і цвёрдым аколышам і лакіраваным казырком. Зімой насілі футравыя шапкі з падвязнымі вушамі, магеркі і шапкі з аўчыны накшталт папахі.

Найбольш пашыраным штодзённым абуткам на тэрыторыі Падняпроўя былі ліпавыя або лазовыя лапці прамога пляцення (у паўночных і цэнтраль-



**Традыцыйны летні касцюм палешука** з ваколіц Пінска. 1933 г. Фота Д. Георгіеўскага

ных раёнах рэгіёна «глухія», а ў паўднёвых — «з вокам», якія не мелі пярэдняга цэнтральнага вушка для прадзявання абор). Святочным абуткам з'яўляліся скураныя вышжныя ці з прышыўнымі перадамі боты, а ў Мсціслаўскім, Клімавіцкім, Касцюковіцкім, Хоцімскім раёнах поруч з ботамі на святы абувалі лапці касога пляцення («пахлапні», «пахрасні»), якія былі пашыраны ў суседніх рускіх паветах.

У межах вылучанага касцюмнага комплексу існаваў цэлы шэраг яго лакальных варыянтаў. Так, напрыклад, на прылягаючай да Расіі тэрыторыі паўднёва-ўсходняй Віцебшчыны быў пашыраны касцюм з камізэлькай з сініны — даматканага сукна, афарбаванага ў сіні колер. Камізэлькі і світкі з сініны насілі таксама і ў некаторых вёсках Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці.



**Традыцыйны касцюм.** Заходняе Палессе. Пачатак XX ст.

У Аршанскім, Шклоўскім, Чавускім раёнах летні касцюм дапаўняўся кароткаполай палатнянай вопраткай — насовам (балахонам, касталанам), пашытым па ўзору світкі, якая бытавала ў данай мясцовасці.

Адметнасць касцюма Буда-Кашалёўскага, Гомельскага і Рэчыцкага раёнаўскладалі ўзорыста-тканыя з вялікай гронкай рознакаляровых кутасоў па-



**Касцюм сялян** Дрысенскага павета Віцебскай губерні. Канец XIX — пачатак XX ст.

ясы і світы «з фалдамі», якія аздаблялі нашыўкамі і аблямоўкамі з фабрычнага сукна, саціну ці шнура.

Касцюмны комплекс Магілёўскага, Быхаўскага, Шклоўскага, Слаўгарадскага, Чэрыкаўскага і часткі Рагачоўскага раёнаў дапаўняўся суконнай ці палатнянай камізэлькай і шыйнай даматканай хустачкай. Верхнім адзеннем служылі белыя ці шэрыя світы з адразной спінкай ці з падразнымі бачкамі, часам па швах аздобленыя нашыўкай каляровай тасьмы ці шнура.

2. Комплекс традыцыйнага мужчынскага касцюма Падзвіння бытаваў на болыпай частцы тэрыторыі Віцебскай вобласці. Умоўная мяжа рэгіёна на паўднёвым усходзе праходзіць па дняпроўска-дзвінскім водараздзеле, дзе мяжуе з Падняпроўем; на поўдні па ўмоўнай лініі Барысаў—Лагойск мяжуе з Цэнтральнай Беларуссю; на захадзе па ўмоўнай лініі Лагойск—Паставы мяжуе з Панямоннем.

Па сведчанню этнографаў, у першай палавіне XIX ст. на Віцебшчыне касцюмны комплекс беларускага селяніна меў бела-сінюю каляровую гаму.



Белая кашуля навыпуск паверх белых нагавіц падпяразвалася вузкім сіне-белым поясам. Верхнім адзеннем летам служыў палатняны белы насоў, а зімой белая світа з даматканага сукна — сярмяга, якая абшывалася сінімі шнуркамі[30]. Касцюм дапаўняўся шыйнай палатнянай хустачкай («хустэлькай») і скураной, прывешанай да пояса калітой.

На тэрыторыі ўсходняга Падзвіння на ўсход ад умоўнай лініі Полацк—Лепель мужчынскі традыцыйны касцюм складаўся з белай палатнянай кашулі («кашулі», «кашульцы») даўжынёй да кален з адкладным каўняром і прарэзам пасярэдзіне грудзей. Часам каўнер кашулі сцягваўся кароткімі, прышытымі да канцоў каўняра шнуркамі, але часцей за ўсё меў з аднаго і другога боку абмётаныя петлі і зашпільваўся металічнай шпонкай (запінкай) ці завязваўся стужачкай, каляровым акройкам тканіны[31]. Такая кашуля была найбольш характэрна для ўсяго Падзвіння.

Другі тып бытаваўшай на гэтай тэрыторыі кашулі — кашуля з касым разрэзам вората і нізкім каўняром або без каўняра называлася «сароцкай». Калі «сароцка» не мела каўняра, то шыйны выраз абшывалі стракатай (сіне-бела-чырвонай) тасьмой,

**Традыцыйны касцюм.** Віцебшчына. Канец XIX — пачатак XX ст.



**Касцюм сялян.** Веска Калодна Брэсцкага павета Гродзенскай губерні. 1905 г.



**Традыцыйны касцюм сялян** Навагрудскага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.

а пад рукавы устаўлялі «палікі» — квадратныя кускі кумача альбо якой-небудзь каляровай даматканкі. «Сароцка» заўжды насілася навыпуск, і даўжыня яе даходзіла да кален[32].

Палатняныя штаны былі двух тыпаў крою: порткі, якія не мелі пояса, а трымаліся на шнурку («матузу»), які быў працягнуты ў паяснічную абшыўку і завязваўся пяцельным вузлом. Канцы матуза былі схаваны пад надзетай навыпуск кашуляй. Ззаду ў портках мяшочкам адвісала «гузенне»; другім тыпам былі «майткі», або «каўняровыя» штаны[3\] якія мелі нешырокі пояс, які зашпільваўся на гузік ці гаплікі з петлямі. Летнія майткі шылі з каляровай даматканіны (чаргаванне сініх і белых нітак, зрэдку жоўтых і нават чырвоных). Зімовыя штаны шылі з даматканага сукна. У штанах абодвух тыпаў крою з правага боку звычайна рабілі праразную кішэнь[34].

Кашулю з адкладным каўняром, калі яе насілі са «штанамі на поясе» («майткамі»), часта запраўлялі ў штаны, а з порткамі заўжды насілі навыпуск.

Кашулю падпяразвалі скураной дзягай альбо плеценым з каляровых суконных нітак поясам — «плісцянкай», «пліссянкай», канцы якога заканчваліся кутасамі (кісцю з нітак). Калі плеценым поясам апяразваліся па кашулі, то вузел і кутасы звычайна былі на левым баку, а калі па верхняй вопратцы, то вузел рабіўся спераду[35].

Мужчынскімі прыборамі лічыліся павязаная на шыі невялічкая чырвоная хустачка («хустка») і прывешаныя да пояса каліта, ножык і грабеньчык.

Святочны касцюм натэрыторыі ўсходняй Віцебшчыны (на мяжы Смаленскай і Магілёўскай губерняў) летам сяляне дапаўнялі асляпляльнай беласці палатняным насовам, які не меў каўняра, а шэйны выраз, край пярэдняй палы да пояса і проразі кішэняў абшывалі тоўстым (у мезенец) сінім шнурком.

**Касцюм селяніна** з вёскі Васілевічы Рэчыцкага павета Мінскай губерні. Канец XIX — пачатак XX ст.





**Рабочы касцюм сялян** вёскі Вялікія Азёркі Слонімскага павета Гродзенскай губерні. 1914 г. Фота І. Якубені

Такі насоў шылі ў талію і каля шыі і на паясніцы зашпільвалі на ніцяныя гузікі[36].

Аб бытаванні на ўсходняй частцы былой Віцебскай губерні другога варыянта палатнянага насова ўталіюдаўжынёйдакалензклінаміпабакахінізкім стаячым каўняром, які зашпільваўся на тры гузікі, а на пярэдніх крыссях меў накладныя карманы, пісаў М. Я. Нікіфароўскі[37]. Такой жа даўжыні і крою, як насоў, было і зімовае даўгаполае верхняе адзенне — сярмяга і кажух.

Кароткім хатнім верхнім адзеннем, значна вышэй каленяў, у якім не выходзілі ў людзі, быў «снізак», «сподак», «ісподак», «падысподак». Зімою зверху насова апраналі кажух, а на яго — сярмягу, якая падпяразвалася поясам.

Касцюмны комплекс адзення заходняга Падзвіння складаўся з кашулі з адкладным каўняром, штаноў (порткаў або майткаў) і безрукаўкі (камізэлькі) цёмна-сіняга або чорнага колеру. Святочны летні касцюмны комплекс дапаўняўся насовам з шырокім адкладным каўняром прамога халатападобнага крою, які не меў кішэняў. Насовы на тэрыторыі заходняга Падзвіння ў канцы XIX ст. часта шылі з сіняга палатна або з дамешкам іншых колераў[38].

Найбольш распаўсюджаным мужчынскім летнім галаўным уборам на тэрыторыі Падзвіння ў канцы XIX — пачатку XX ст. быў картуз, які выціснуў з ужытку брыль і магерку. Зімовай шапкай служылі футравыя з падвязанымі вушамі або аўчынныя шапкі з круглым суконным верхам, падобныя да папахі[39].

Штодзённым абуткам летам і зімою служылі ліпавыя і лазовыя лапці. Летнія лёгкія лапці з лыкавай або лазовай кары плялі на кожны дзень. Святочным абуткам на ўсходнім Падзвінні служылі сплеценыя на калодцы і падплеценыя пакляй «пахлапні». У заходнім Падзвінні разам з ліпавымі і лазовымі лапцямі шырока бытавалі скураныя «пасталы».

На Падзвінні значна раней, у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі, традыцыйны народны касцюм выйшаў з ужытку. Блізкасць расійскай сталіцы — асноўнага месца адыходніцтва актыўнага мужчынскага насельніцтва — вызвала ў другой палавіне XIX ст. шырокае пранікненне ў вёску фабрычных тканін і гарадскіх відаў адзення, хуткую змену традыцыйнага касцюма агульнаеўрапейскім.

Насоў і сярмягу на Падзвінні выціснуў «спіньжак», танны картуз — магерку, брыль, а шапка-вушанка — аблавуху, бутэлечныя са скрыпам боты — боты-асташы (рускія боты з-пад г. Асташкава, пашыраныя на Беларусі ў сярэдзіне XIX ст.) і лапці-

«пахлапні», яркі гарусны шалік — легкую даматканую «хустэльку». Разам з гэтым з касцюма знікалі каліты і іншыя мужчынскія «прїборы»[40].

3. Традыцыйны касцюмны комплекс Панямоння характэрны для Гродзенскай і паўднёва-заходняйчасткі Віцебскай вобласці. Высокіўзровеньразвіцця на тэрыторыі рэгіёна мануфактурнай і прамысловай вытворчасці (у 1859 г. прамысловасць Гродзенскай губерні давала прадукцыі больш, чым усе астатнія беларускія губерні, разам узятыя)[41] садзейнічаў росту кірмашовага гандлю, паляпшэнню шляхоў зносін, актывізацыі міжэтнічных кантактаў насельніцтва. У сувязі з гэтым традыцыйнае мужчынскае адзенне на Панямонні, як і на Падзвінні, раней чым у іншых рэгіёнах Беларусі пачало страчваць свае лакальныя асаблівасці.

Касцюмны комплекс адзення складаўся з белай кашулі з даматканага палатна кашулі са сціпла аздобленым вышыўкай адкладным каўняром, скураного ш рознакаляровага вузкага даматканага пояса, нагавіц («ганавіц») з суровага палатна, даматканага сукна ці вытканай у клеткі або паскі паўшарсцянкі.

Для Панямоння найбольш характэрны кашулі з гесткай і паліковыя. Найбольшае пашырэнне на тэрыторыі рэгіёна мела кашуля з гесткай, а паліковая пераважала на поўдні, у сумежных з Заходнім Палессем раёнах. На ўсходзе разам з паліковай кашуляй і кашуляй на гестцы бытавалі кашулі з плечавымі швамі. Старажытныя тунікападобныя кашулі на Панямонні раней, чым у іншых рэгіёнах Беларусі, сталі споднім адзеннем. Кашулі з гесткай і са швом на плячах шылі адносна кароткімі, да паловы бядра, і часта запраўлялі ў штаны.

Верхнім даўгаполым адзеннем служылі доўгія, амаль да пят пераважна прамога халатападобнага крою світкі, сярмягі, бурносы з даматканага сукна белага або шэрага колеру з адкладным ці нізкім стаячым каўняром. Зімой насілі халатападобныя, пра-



**ЛетнІ касцюм сялян** вёскі Вялікія Азёркі Слонімскага павета Гродзенскай губерні. 1914 г. Фота І. Якубені



мога крою кажухі. Шырокае распаўсюджанне і разнастайнасць мела кароткае верхняе адзенне з даматканага палатна і сукна без падкладкі і на падкладцы («спінжакі», «каптаны», «кулькі», «спанцэркі», «марынаркі», «курткі»).

Самымі пашыранымі летнімі галаўнымі ўборамі былі саламяныя капелюшы і картузы з лакіраваным казырком. Зімой, а часам і ўлетку насілі высокія з шэрых або чорных аўчын шапкі футрам звонку з круглым верхам чорнага ці сіняга сукна, якія ззаду сцягваліся кароткай сіняй стужачкай[42].

Штодзённым абуткам былі лапці трох відаў: скураныя лапці-хвілянкі накшталт грубых чаравікаў з прышытымі чатырма вушкамі для аборак; скураныя лапці (хадакі, пасталы) з аднаго кавалка скуры з праколатымі дзіркамі для прадзявання абор; ліпавыя або лазовыя лапці (лапці, пасталы) прамога пляцення. Святочным абуткам служылі выцяжныя або з прышыўнымі перадамі боты.

Адметнасць касцюму Панямоння надавалі кашулі на гестцы, якія насілі пераважна запраўленымі ў нагавіцы, а таксама доўгія да пят халатападобныя світы і сярмягі, шырокае бытаванне скураных лапцей, якія ў шэрагу мясцовасцей з'яўляліся асноў-

**Традыцыйны летні касцюм.** Вёска Мерачоўшчызна Косаўскага павета. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка

**Касцюм сялян** Мінскай губерні. Пачатак XX **ст.**





**Традыцыйны касцюм сялян.** Вёска Пескі Косаўскага павета. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка

ным відам сялянскага абутку, разнастайнасць кароткаполай палатнянай і суконнай вопраткі.

У межах Панямоння вылучаюцца наступныя лакальныя касцюмныя комплексы:

— касцюм, пашыраны на тэрыторыі Навагрудскага, Карэліцкага, Слонімскага і Лідскага раёнаў, які дапаўняўся камізэлькай з цёмна-сіняй ці чорнай шарсцянкі і касынкай-каляшыйкай (Навагрудскі строй)[43];

— касцюм, характэрны для тэрыторыі былога Лашынскага прыхода Гродзенскага павета, які складаўся з доўгай (да кален і даўжэй) кашулі з невялікім каўняром і прамым, глыбокім («да пупа») разрэзам на фудзях. Кашулю насілі навыпуск зверху белых палатняных ці суконных нагавіц і падпяразвалі рознакаляровым вузкім поясам[44]. Бытаванне на частцы тэрыторыі сучасных Гродзенскага і Слонімскага раёнаў у канцы XIX — пачатку XX ст. у якасці асноўнага адзення старажытнай тунікападобнай кашулі паказала і картафафаванне адзення[45].

4. Традьшыйны касцюмны комплекс Цэнфальнай Беларусі характэрны для асноўнай тэрыторыі Мінскай і заходняй часткі Магілёўскай абласцей. У гэты комплекс уваходзілі белая даматканая кашуля з палатна, камізэлька, трохвугольная шыйная касынка («каляшыйнік»), палатняныя або суконныя штаны («нагавіцы»), тканы або плецены пояс. Скураная каліта і прывешаныя да пояса ножык і грабенчык дапаўнялі касцюм.

Пашыраныя на тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі белыя з даматканага палатна кашулі былі тунікападобнага крою або з прамавугольнымі плечавымі ўстаўкамі («палікамі») з прамым разрэзам каўняра і невялікім адкладным каўняром. Шылі іхдаўжынёй да кален і насілі навыпуск, падпяразваючы рознакаляровымі ўзорыстымі паясамі. Святочныя кашулі аздаблялі вышыўкай гладдзю ці простым крыжыкам чырвонымі і чорнымі ніткамі. Ва ўзорах вышыўкі пераважаў геаметрычны арнамент. Паскамі вышытага арнаменту рознай шырыні ўпры-



гожвалі каўнер, манжэты, радзей падол кашулі. У наваколлі Мінска і Слуцка ў канцы XIX — пачатку XX ст. моладзь насіла ўжо кашулі па-гарадскому за-праўленымі ў штаны. Такія кашулі шылі значна ка-рацейшымі, да сярэдзіны бядра. Такой жа даўжыні шылі і кашулі з фабрычных тканін.

Вузкія белыя палатняныя, а таксама зімовыя нагавіцы звычайна шылі з ромбападобнай або квад-ратнай устаўкай, ушытай у штаніны вугламі. Мо-ладзь і нестарыя мужчыны святочныя нагавіцы насілі з чорна-белай, карычнева-белай, сіне-белай даматканкі або паўшарсцянога «шарака», а больш заможныя — з фабрычных тканін.

Надзетую навыпуск кашулю падпяразвалі чыр-воным ці ўзорыстым поясам. Зверху кашулі насілі чорную, цёмна-сінюю ці цёмна-карычневую камі-зэльку з сукна (на Случчыне — паўсуконную клят-частую карычнева-белую), а на шыю павязвалі ка-сынку-каляшыйку.

Даўгаполай верхняй вопраткай былі прамога крою ці адразныя па таліі світы са складкамі ззаду з белага, шэрага, карычневага даматканага сукна з адкладным каўняром («халат», «сярмяга», «курта», «капота», «світа»), а таксама «сурдуты» з фабрыч-най тканіны, якія шылі адразнымі па таліі з адклад-ным каўняром. Сурдуты падбівалі ватай, кудзеляй, прываленай воўнай, мелі падкладку з палатна ці тан-най фабрычнай тканіны і зашпільвалі на гузікі. Зімой апраналі карычнева-вохрыстыя кажухі і ка-роткія паўкажушкі прамога крою.

Кароткае суконнае верхняе адзенне складалася з аднабортнай кароткай «світкі», якая зашпілялася на поясе на адзін гаплік. Шылі світкі найбольш з шэрага даматканага сукна прамога крою з хлясці-кам ззаду. Швы, край верхняга крыса, кішэні часам аздаблялі чорным шаўковым шнурком, паскай чор-нага саціну ці іншай фабрычнай тканіны. Акрамя світкі кароткую верхнюю вопратку складалі сукон-ныя «каптанік», «кулёк», «пільчак», «апратка», «куртка» прамога крою з хлясцікам ззаду і адклад-ным каўняром.

У непагадзь (дождж, снег) выкарыстоўвалі сукон-ны бурнос прамога крою з башлыкам і хлясцікам ззаду або зверху кажуха апраналі світу.

Летняй кароткай вопраткай служыў палатняны «балахон» («каптанік», «насоў») з адкладным каў-няром прамога крою на гузіках або без засцежкі, які падпяразвалі поясам.

Летам галаўнымі ўборамі служыў саламяны або плецены з мятліцы брыль, пакупны або пашыты мясцовым краўцом картуз, а зімой лямцавая белая або шэрая магерка, футравая шапка-кучомка, аб-лавуха.

Штодзённы касцюм палешука Палессе 1937 г.
Фота Ю. Шыманчыка

Штодзённым абуткам былі плеценыя з ліпавай ці лазовай кары лапці. На поўначы яны былі з пярэдняй стракой для прадзявання абор («глухія лапці»), на памежжы з Палессем былі пашыраны «лапці-відукі» («лапці з вокам»), якія не мелі пярэдняй стракі (вушка) для прадзявання абор. Побач з плеценымі лапцямі ў некаторых раёнах на тэрыторыі рэгіёна былі распаўсюджаны скураныя лапці, якія ў розных мясцовасцях называлі «пасталамі», «хадакамі» або «маршчакамі». Святочным абуткам служылі боты з юхці, якія змазвалі дзёгцем.

Адметнасць традыцыйнаму касцюму Цэнтральнай Беларусі надавалі трохкутная касыначка-каляшыйка і чорная або карычневая з прываленага даматканага сукна камізэлька («камзэлька»), якая з'яўлялася часткай святочнага мужчынскага гарнітуру.

У межах комплексу вылучаўся сялянскі касцюм, які быў характэрны для Случчыны. Ён адрозніваўся клятчастай карычнева-белай камізэлькай і плеценым з мятліцы капелюшом з шырокімі палямі і расшыранай уверсе тулляй.

5. Традыцыйны касцюмны комплекс Усходняга Палесся быў распаўсюджаны на большай частцы Палескай нізіны ў Гомельскай, Мінскай і Брэсцкай абласцях. На ўсходзе па правабярэжжы Дняпра і ніжняй Бярэзіне рэгіён мяжуе з Падняпроўем, на поўначы — паўмоўнайлініі Парычы—Любань—Старобін—Чудзін — з Цэнтральнай Беларуссю, на захадзе па міжрэччы Ясельды і Бобрыка на Лахву, Лунінец і па Прыпяці, Гарыні — з Заходнім Палессем.

Традыцыйны касцюм Усходняга Палесся складаўся з тунікападобнай або з плячавымі ўстаўкамі-палікамі саматканай белай кашулі са стаячым або адкладным каўняром, шырокага тканага або плеценага рознакаляровага пояса з кутасамі, белых зрэбных ці шарачковых порткаў, а зімой — з суконных нагавіц. Касцюм дапаўняўся скураной калітой, якую




**Штодзбнны касцюм сялян** вёскі Лучнікі Слуцкага павета Мінскай губерні. Пачатак XX ст.



насілі на раменьчыку цераз плячо і прычэпленымі да пояса ножыкам і грабеньчыкам у скураных футаралах.

Доўгія тунікападобныя і паліковыя кашулі, якія па даўжыні часам былі ніжэй кален, мелі глыбокі прамы разрэз вората і невялікі адкладны каўнер. Такія кашулі насілі навыпуск зверху штаноў, падпяразваючы шырокім тканым поясам спосабам «з выпушчанымі канцамі» (так падпяразвалася шляхта ў XVII—XVIII стст. зверху кунтушоў). Каля Турава пояс завязвалі бантам з левага боку. Пры такім спосабе павязвання пояса выпускалі адзін канец з левага боку, а другі — з правага.

Святочныя кашулі багата аздаблялі вышыўкай крыжыкам і гладдзю, якая раней, чым у іншых рэгіёнах, пачала набываць паліхромнасць. К. Машынскі, які з экспедыцыйнымі мэтамі наведаў у 1914 г. Мазырскі павет, пісаў: «Мужчынскія кашулі бываюць вышытыя рознымі колерамі ўздоўж ніжняга краю, на грудзях і адкладным каўняры. Мужчыны носяць сарочку заўсёды выпушчанай на порткі і звычайна падпяразваюцца дзягай, акрайкай ці раменьчыкам»[46]. Адметнасць кас-

**Святочны касцюм старых.** Вёска Міхалкі Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. 1920-ыя гг.



**Штодзённы касцюм.** Вёска Мерачоўшчызна Косаўскага павета. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка



**Святочны касцюм моладзі.** Вёска Сідаравічы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. 1917 г.

цюмнаму комплексу надавала таксама дамінаванне раслінных форм арнаменту аздаблення кашуль. Звычайна святочныя кашулі шылі са стаячым каўняром з касым разрэзам вората, які зашпіляўся злева. Адметнсцю рэгіёна было і шырокае бытаванне народнага касцюма яшчэ ў 1930-ых гг.

Зрэбныя летнія нагавіцы («палатнянікі») і зімовыя з шэрага ці карычневага даматканага сукна («суконнікі») на Усходнім Палессі шылі з шырокім «крэслам» («гузеннем»), якое торбай абвісала ззаду[7].

Рознакаляровыя тканыя ці вязаныя паясы звычайна заканчваліся на канцах гронкамі дробных, таксама рознакаляровых кутасоў.

У ваколіцах Турава і Давыд-Гарадка комплекс асноўнага адзення дапаўняўся чорнай або цёмнасіняй, цёмна-карычневай камізэлькай, а чырвоныя тканыя паясы «крэпы» па шырыні дасягалі 35—40 см іпрыпадпяразванніскладвалісяўдвая. К. Машынскі адзначаў яшчэ бытаваўшыя ў вёсках каля Турава чырвоныя і стракатыя мужчынскія камізэлькі, якія зашпільваліся з левага боку на чатыры гузікі[48].

Даўгаполае верхняе адзенне складалі белыя, шэрыя ці цёмна-карычневыя світы разнастайнага крою, сярод якіх пераважалі світы з бакавымі клінамі-«вусамі» і з падразнымі бачкамі ў складку ці зборку з нізкім стаячым каўняром. На тэрыторыі былога Мазырскага павета былі пашыраны світы «з фалдамі». Зверху світу падпяразвалі шырокім чырвоным поясам[49]. Кароткае верхняе адзенне складалі «свічаны пінжак», «курцік», «спанцэрка». Як світы, так і кароткую верхнюю вопратку аздаблялі нашыўкамі і аблямоўкамі з фабрычнага сукна і саціну розных колераў.

Зімовай вопраткай служылі кажухі, якія шылі мясцовыя ўмельцы-краўцы. Але часцей за ўсё кажухі былі пакупныя, прывезеныя з Гомеля, Масквы і іншых гарадоў і купленыя сялянамі на кірмашы. Часам на плячах, поясе і спераду на кажух нашывалі ўпрыгожанні з афарбаваных у зялёны, чырвоны і інш. колер кавалачкаў скуры ў выглядзе квадрацікаў, трохкутнікаў і г. д.[50].

Самымі пашыранымі летнімі галаўнымі ўборамі былі саламяныя брылі і пашытыя мясцовымі краў-



**Штодзённы касцюм палешукоў.** 1937 г.
Фота Ю. Шыманчыка



**Касцюм старога селяніна.** Вёска Мерачоўшчызна Косаўскага павета. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка

цамі суконныя картузы, а таксама разнастайныя валеныя або шытыя з лямцу магеркі, якія аздаблялі рознакаляровымі шнурамі і ніткамі. Магеркі насілі як летам, так і зімой. Узімку насілі таксама шапкі з фабрычнага сукна «акруглыя, абшытыя чорнай аўчынай»[51], з аўчыны чорныя ці сівыя шапкі-кучмы[52] і вялікія шапкі, якія называлі «аблавухай»[53].

Штодзённым абуткам служылі лыкавыя або лазовыя «пасталы» (лапці-відукі, якія не мелі пярэдняй стракі для прадзявання абор), а святочным — юхтавыя выцяжныя боты, якія шылі ў Давыд-Гарадку і ў Петрыкаве.

Адметнасць касцюмнаму комплексу Усходняга Палесся надавала багацце прыёмаў мастацкага аздаблення святочнага касцюма, доўгае, да канца 1930-ых гг., бытаванне традыцыйнага комплексу адзення, паліхромны характар вышыўкі.

У межах традыцыйнага касцюмнага комплексу вылучаецца лакальны касцюм ваколіц Турава і Давыд-Гарадка, які ўключаў шырокія (40—45 см) паясы-«крэпы», аднатонныя і стракатыя безрукаўкі, якія зашпільвалі спераду на гузікі.

6. Традыцыйны касцюмны комплекс Заходняга Палесся ахопліваў тэрыторыю Брэсцкага, Пружанскага, Бярозаўскага, Кобрынскага, Драгічынскага, Маларыцкага, Івацэвіцкага, Пінскага раёнаў Брэсцкай вобласці. Ён складаўся з белай саматканай палатнянай кашулі, такіх жа нагавіц, рознакаляровага тканага ці плеценага пояса з махрамі ці дробнымі кутасікамі на канцах. У некаторых вёсках Кобрынскага раёна святочны мужчынскі касцюм часам дапаўняўся чорнай суконнай безрукаўкай. Мужчынскія кашулі кроілі з плечавымі ўстаўкамі, адкладным каўняром. Насілі іх навыпуск, падпяразваючы нізка пабёдрахтканым ці плеценым поясам. Кашулі, якія насілі ў будні дні, ніколі не ўпрыгожвалі.

Каўнер, манжэты, пазуха, а часам і падол святочных кашуль аздабляўся тканым геаметрычным ці вышытым (звычайна раслінным) арнаментам. Вышывалі простым крыжам і гладдзю баваўнянымі чырвонымі ніткамі ў спалучэнні з чорнымі. Падрыхтаваная на смерць сарочка заўсёды была чыста белай.

Летнія палатняныя («пачысныя») нагавіцы заўсёды былі белага колеру, а зімовыя з сукна («чынаватыя») ткаліся звычайна «ў елачку» і былі шэрага ці шэра-карычневага колеру. Калашыны нагавіц абгортвалі белымі палатнянымі анучкамі і запраўлялі ў плеценыя з лыка пасталы («пастулы»).

Зімой для цяпла пад палатняныя анучы закручвалі суконныя («суконкы»). Плеценыя з ліпавых ці лазовых лыкаў пасталы, якія насілі штодзень узімку і летам, не мелі пярэдняга вялікага вушка («стракі») для прадзявання валок. Кароткі з адкрытым верхам насок ствараў «вока» лапця, таму такі тып лапцей атрымаў у літаратуры назву «зрачых». Летам каля дома звычайна хадзілі босымі.

Найбольш заможныя на святы абувалі скураныя боты («чобоці»). Да 1930-ых гг. «чобоці» былі выключна святочным абуткам. Звычайна на ўсю вёску іх было адна ці дзве пары, у якіх вянчалася ўсё мужчынскае насельніцтва. Чобаты палескіх майстроў вылучаліся трываласцю і адметнай выразнасцю. Іх шылі з высокімі халявамі, цвёрдым заднікам і наборным з некалькіх слаёў скуры абцасам, на які мацавалася дугападобная жалезная падкоўка. Пры Польшчы ў высокія прамыя халявы ботаў, каб яны не асядалі, па польскаму ўзору рабілі цвёрдыя ўстаўкі

(«строты»). Традыцыйны касцюм палешука сярэдняга і пажылога ўзросту, калі ён ішоў у царкву, на кірмаш, у госці, абавязкова дапаўняўся калітой.

Асноўнай даўгаполай мужчынскай верхняй вопраткай была світа («сярніга», «латуха») з «вусамі» — устаўленымі ў бакавыя швы ад лініі таліі шырокімі трохвугольнымі клінамі. Шылі світы з сукна шэра-га, карычневага, значна радзей белага колеру з нізкім стаячым каўняром. Звычайна світу не зашпільвалі, а толькі падпяразвалі шырокім тканым поясам. Світы ўпрыгожвалі каляровымі шнуркамі, кутасамі, стужкамі, вышыўкай, аплікацыяй. Варыянтамсвіты для штодзённага нашэння на поўдні раёна была латуха. Назву гэту мясцовыя жыхары выводзілі ад слова «латаць» (таму дрэнна апранутага чалавека тут называлі «латухай»).

Зімовай мужчынскай даўгаполай вопраткай здаў-на служыў прыталены аўчынны кажух «з вусамы» з адкладным ці стаячым каўняром, упрыгожаны каляровым шнурам, аплікацыяй, кутасамі. Да пачат-ку XX ст. кажухі былі белага колеру. Потым пашырыліся карычневага і жоўтага колеру кажухі (фарбаваныя яечнымі жаўткамі), прамога крою з адкладным каўняром. Паверх кажуха ў дарогу надзявалі прамога крою суконную бурку («плашч»), а калі яе не было, то ў адлігу, калі ішоў мокры снег ці дождж, кажух проста выварачвалі поўсцю наружу, каб ён не задубеў ад вільгаці.

У пачатку XX ст. на вёсцы шырокае распаўсюджанне атрымаў «пінжак», «курцік» — кароткае адзенне з даматканага сукна прамога крою, падбітае кудзеляй (ці без падшэўкі) з праразнымі бакавымі кішэнямі і адкладным каўняром, якое зашпільвалі спераду на гузікі.

Летняй кароткаполай лёгкай вопраткай з палатна без падкладкі былі «летнікі», «пінжакі», «каптаны» з хлясцікам, прамога крою, адкладным каўняром. Найбольш заможныя выкарыстоўвалі на верхняе адзенне фабрычныя тканіны.

Галаўныя ўборы вясной, летам і ўвосень складалі плеценыя з саломы «ў зубкі» брылі («капалушы») і пашытыя з сукна шапкі з казыром («казыркі»). Зімой насілі невысокія шапкі з аўчыны з круглым суконным верхам, падбітыя кудзеляй. Пры Полынчы пачалі насіць шапкі-«рогаціўкы» з чатырохвугольным верхам і кутасам, а таксама круглыя неглыбокія шапкі з невялікім адваротам на вушы.

Першая сусветная вайна, рэвалюцыя, а затым грамадзянская вайна замарудзілі пераход вясковага насельніцтва Беларусі да агульнаеўрапейскага касцюма. Скарачэнне вытворчасці прамысловых тавараў, у тым ліку тканін, прымусіла сялянства вярнуцца да хатняга і саматужнага вырабу адзення.

У гэты перыяд у адзенне як гарадскога, так і вясковага насельніцтва пранікаюць і ўкараняюцца элементы ваеннай формы: фрэнчы, штаны — галіфэ і



**Сяляне-палешукі ў святочных касцюмах.** Косаўскі павет. Заходняе Палессе. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка

паўгаліфэ, гімнасцёркі, шынялі, шапкі-будзёнаўкі, скураныя курткі і г. д.

Рэзкае зніжэнне дабрабыту насельніцтва, эканамічны заняпад, адсутнасць прадметаў першай неабходнасці адмоўным чынам адбіліся на адзенні і знешнім выглядзе людзей у 1920-ыя гг. Апісанне тыповага для таго часу мужчынскага касцюма даў Я. Колас у апавяданні «Балаховец»: «З шапкі ён змахваў крыху на даўнейшага чыноўніка акцызнага ведамства. Па гімнасцёрцы яго можна было прыняць за салдата царскай арміі. Паўзверх гімнасцёркі на шырокіх плячах сядзела ўнакідку бравэрка мешчаніна сярэдняй рукі, а падпяразана была гімнасцёрка выцертаю афіцэрскаю папругаю»[54].

З адраджэннем прамысловасці пасля грамадзян-скай вайны прамысловы спосаб вырабу адзення па-ступова стаў выцясняць хатні і саматужны, узмац-ніўся ўплыў гарадскіх стандартаў на традыцыйны касцюм. Нават у глыбіні Палесся (вёска Рычоў каля Турава) кашулі «па паляшуцкай модзе» — значна ніжэй каленяў, падпяразаныя вузенькім раменьчы-кам, на якім вісела «калітка» з тытунём і люлькай,

насілі ў канцы 1920-ых гг. толькі старыя людзі. Часам на палатняную саматканую кашулю зверху апраналі яшчэ адну. Верхняя звычайна рабілася з крамкай тканіны — корту ці саціну. Яна была значна карацейшай за ніжнюю кашулю, якая выглядала з-пад верхняй сантыметраў на 20[55]. Такі спосаб нашэння, калі ніжняе плечавое адзенне выглядае з-пад верхняга, узыходзіць сваімі каранямі да старажытных візантыйскіх традыцый, якія захаваліся да 20—30-ых гг. XX ст. толькі на Палессі.

У 1930 г. вясковая моладзь на Палессі насіла ўжо адзенне з «крамя» — пакупной тканіны[56]. Шырокае ўкараненне ў вясковае адзенне фабрычных тканін і гатовых прадметаў гарадскога касцюма прывяло да таго, што даматканае хатняе адзенне стала выкарыстоўвацца галоўным чынам у якасці бялізны. Фабрычнага вырабу кашулі, спінжакі, штаны, паліто, ватныя сцёганкі спачатку дапаўнялі, а к канцу 1930-ыхгг.амальвыціснулітрадыцыйнуювопратку. Вялікі ўплыў на гэты працэс аказала ліквідацыя непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва, пераход да ўсеагульнага пачатковага, а затым усеагульнага сямігадовага навучання, прыток у вышэйшыя ісярэдніяспецыяльныя навучальныяўстановы вясковай моладзі, якая пасля завяршэння вучобы вярталася ў вёскі. Прадстаўнікі вясковай інтэлігенцыі сталінасіцьу 1930-ыя гады двубортныя фабрычныя касцюмы, фабрычныя бацінкі і туфлі, хаця гальштукаў і капелюшоў амаль не насілі.

Такім чынам, мужчынскі касцюм вясковага насельніцтва Беларусі ў даваенны перыяд уяўляў сабой своеасаблівае спалучэнне элементаў традыцыйнага адзення і новага, пранікшага з горада. Прычым суадносіны традыцыйных і гарадскіх элементаў у касцюме залежалі ад канкрэтнай мясцовасці, аддаленасці ад прамысловых цэнтраў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваеннага аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі адбылося частковае вяртанне да традыцыйнай вопраткі, звязанае з пагаршэннем забеспячэння насельніцтва прамысловымі таварамі.

Зноў у касцюме вясковага насельніцтва сталі шырока выкарыстоўвацца шынялі, гімнасцёркі, ваенныя і пашытыя па іх узору штаны-галіфэ і паўгаліфэ, ваенныя фуражкі, пілоткі і зімовыя шапкі-вушанкі. Міграцыя ў гарады вялікай колькасці насельніцтва ў сувязі з пасляваенным прамысловым і культурным будаўніцтвам паскорыла працэсы збліжэння культуры гарадскіх і вясковых жыхароў, садзейнічала нівіліроўцы асаблівасцей у адзенні.



**Святочны касцюм моладзі.** 1920—1930 гг. Вёска Дубай Пінскага павета

Касцюм стаў вызначаць не сацыяльны статус чала-века, а яго ўзрост і матэрыяльныя магчымасці.

У 1950-ыя гг. самым распаўсюджаным муж-чынскім адзеннем у сельскай мясцовасці з'яўлялі-ся аднабортныя і двубортныя касцюмы, кашулі раз-настайных афарбовак, світэры, джэмперы, лыжныя касцюмы, курткі. Разам з тым штодзённае адзенне сельскіх жыхароў вызначалася ў параўнанні з гара-джанамі шырокім распаўсюджаннем сцёганак («кухваяк»), рабочых ботаў, гумавага абутку.

З развіццём прамысловасці і ростам дабрабыту насельніцтва ў касцюм вясковага насельніцтва ўсё шырэй уваходзілі цёплыя і летнія паліто featuresрознага крою, курткі разнастайных фасонаў, модны абутак.

Значныя змены ўадзенні адбыліся ў 1960-ых гг., закрануўшы, перш за ўсё, гарадскі касцюм. Гэтаму садзейнічала ўдасканаленне мадэліравання адзен-ня і рост яго прамысловай вытворчасці, масавае ас-ваенне сінтэтычных тканін. Тэмпы змянення тэн-дэнцый і напрамкаў моды ў гэтыя гады значна ўзраслі. Атрымала пашырэнне так званае мараль-нае старэнне адзення: насельніцтва перастала ка

**Святочны касцюм селяніна.** Вёска Рудня Міхайлаўская Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. Канец 1940-ых гг.





рыстацца рэчамі, якія яшчэ не страцілі сваіх спа-жывецкіх якасцей"Развіццё сродкаў масавай інфармацыі, рост даб-рабыту вясковых жыхароў, развіццё сродкаў маса-вай інфармацыі, іх арыентаванасць на гарадскую культуру садзейнічалі таму, што ў цяперашні час усё вясковае насельніцтва набывае ў магазінах і на рынках гатовую бялізну, верхнюю вопратку, абутак і галаўныя ўборы. Самым распаўсюджаным адзен-нем мужчынскага насельніцтва як у гарадах, так і ў сельскай мясцовасці з'яўляюцца масавага пашыву двух- і аднабортныя касцюмы, разнастайныя курткі, паліто, дублёнкі і г. д.

**Касцюм сялян.** Вёска Міхалкі Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. 1950-ыя гг.



[1] Дучьш Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі Х—XIII стст. 2-ое выд. Мн., 2001. С. 10-11. [2]Там жа. С. 6.

[3] Ржмга В. Ф. Очеркн нз быта домонгольской Русн // Труды Государственного нсторнческого музея. Вып. 5. Отдел нсторнческнй обшнй. М., 1929. С. 80.

[4] Древнерусское наследне н нсторнческне судьбы восточного славянства. М., 1982. С. 88.

[5] Левашова В. П. 06 одежде сельского населення Древней Русм//Археологнческнйсборннк. Вып. 40. М., 1966. С. 117; Рабнновлч М. Г. Древнерусская одежда IX—XIII вв. // Древняя одежда народов Восточной Европы (Матерналы к ясторнко-этнографнческому атласу). М., 1986. С. 44; Дучыц Л.У. Касцюм жыхароў Беларусі Х—XIII стст. С. 11.

[6] Ласкавый Г. В., Дучнц Л. В. Новые данные о костюме раннесредневекового населенля Беларусн // Гістарычна-археалагічны зборнік. № 5. Мн., 2000. С. 65.

[7] Там жа.

[8] АВАК. Т. XXII. С. 128.

[9] Археографнческнй сборннк документов (далей АСД). Т. III. Внльна, 1867. С. 98.

[10] Фадзеева В. Я. Этнаграфічныя рэаліі ў беларускім іканапісе XVI—XVIII стст. // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння: 36. арт. Мн., 1994. С. 206.

**Штодзбнны касцюм.** Вёска Асташын Навагрудскага раёна Мінскай вобласці. 1958 г.

**Вясковы рабочы касцюм са штанамі-галіфэ.**
Вёска Хабовічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці.
1953 г. Фота І. Аксельрода



" Мальдзіс А. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. Мн., 2001. С 321.

[12] Kitowicz Jedrzej. Opisobyczajowza panowania Augusta III. Wroclaw. 1970. С. 593—594. Цыт. па кн.: Мальдзіс А. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. С. 322—323.

[13] Цытуеіша па кн.: Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980. С. 164.

[14] Описание Кричевского графства или бывшего староства 1786 года Андрея Мейера // Могилевская старина. Сб. ст. «Могилевских губернских ведомостей» . Под ред. Е. Р. Романова. Вып. II. 1900-1901 г. Могилев, 1901. С. 96.

[15] Анимелле Н. Быт белорусских крестьян // Этнографи ческий сборник Императорского русского географиче ского общества. СПб., 1854. Вып. 2. С. 130.

[16] Тамжа. С. 130-131.

[17] Тамжа. С. 131.

[18] Шпилевский П. М. Путешествие по Полесью и бело русскому краю. Мн., 1992. С. 52.

[19] Там жа. С. 209.

[20] Тамжа. С. 210.

[21] Тамжа. С. 210-211.

[22] Историко-этнографический атлас Прибалтики. Одеж да. Рига, 1986. С. 107.

[23] Якуб Колас. Збор твораў у 12 тамах (1961 — 1964). Т. 4. С. 302.

[24] Там жа. Т. 6. С. 244.

[25] Халатам Я. Колас называе світку. Так яе называлі на яго радзіме.

[26] Тамжа. Т. 7. С. 316.

[27] Навуковы архіў Інстытута этналогіі і антрапалогіі імя М. М. Міклуха-Маклая. РАН, ф. ОЛЕАЭ, спр. 43, л. 11.

[28] Там жа, л. 3 адв.

[29] РакушевФ. Н. Фантазер (Типы новой деревни)//Вест ник Могилевского земства. 1914. № 8—9. С. 37.

[30] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 3. СПб., 1902. С. 7.

[31] Тамжа. Т. 3. С. 41.

"Тамжа. С. 40-41.

[33] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного жи тья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предме тов обиходности (Этнографические данные). Витебск, 1895. С. 106.

[34] Шейн П. В. Материалы для изучения быта... Т. 3. С. 42.

[35] Там жа.

[36] Там жа. С. 42.

[37] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. ПО.

[38] Шейн П. В. Материалы для изучения быта... Т. 3. С. 42.

[39] Там жа.

[40] Там жа. С. 53.

[41] Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 386.

[42] Шейн П. В. Материалы для изучения быта... Т. 3. С. 73.

[43] Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. С. 335.

[44] Шейн П. В. Материалы для изучения быта... Т. 3. С. 73.



Штодзённы касцюм. 1950-ыя гг. Веска Морач Клецкага раёна Мінскай вобласці. 1958 г.



**Святочны касцюм.** Веска Акулінка Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. 1962 г.



**Штодзённы касцюм.** Веска Любавічы Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. 1962 г.

[45] Беларускае народнае адзенне. Мн., 1975. С. 47. Карта № 10.
[46] Moszynski K. Polesie Wschodnie. Warszawa, 1928. C. 100.
[47] Там жа. С. 102.
[48] Moszynski K. Polesie Wschodnie. Warszawa, 1928. C. 102.
[49] Там жа. С. 101.
[50] Там жа. С. 88.
[51] Kolberg O. Dziela wszystkie. T. 52. Bialorus — Polesie. Warszawa, 1968. C. 54.
[53] Moszynski K. Polesie Wschodnie. Warszawa, 1928. C. 102.
[53] Jelenska E. Wies Komarowicze w powiecie Mozyrskim. Warszawa, 1892. C 31. [4] Я куб Колас. Збор твораў у 12 т. Т. 5. С. 337-338.
[55] Улашчык М. М. Краязнаўства. Нататкі пра бадзянні ў 1924-1929 гг. Мн., 1999. С. 49, 63.
[56] Лебедева Н. И. Материальная культура Белорусской ССР в 1930 году. С. 168.
[57] Нельсон Д. Проблема дизайна. М., 1971. С. 87.

# Глава 3 Плечавое і паясное адзенне



Самай старажытнай часткай мужчынскага плечавога адзення беларусаў, як і ўсіх усходніх славян, з'яўляецца кашуля (сарочка, рубаха, лянка, срачыца)[1]. Гэтымі тэрмінамі агульнаславянскага паходжання называюцца мужчынскія і жаночыя кашулі ў украінцаў і рускіх. Падобныя назвы мае кашуля ў палякаў, чэхаў і сербаў.

Найбольш архаічным тыпам усходнеславянскай мужчынскай кашулі, паводлг меркаванняў рускіх даследчыкаў адзення і беларускіх этнолагаў, хутчэй за ўсё была тунікападобная льняная кашуля без швоў на плячах. Яна не мела каўняра (ворат проста абшываўся паскай тканіны) і, відаць, мела разрэз пасярэдзіне грудзіны. Пад горлам сарочка зашпільвалася на гузік або завязвалася стужкай, тасёмкай, паскай тканіны. Такі тып мужчынскай кашулі вядомы ўсім усходнім славянам[2]. У рускіх яна называлася «галашыйкай»[3]. У XII—XIII стст. лён і пянька ўваходзілі ў даніну, якую сяляне плацілі князям і баярам ў Старажытнарускай дзяржаве.



Тунікападобная кашуля з'ўлялася найбольш старажытным відам мужчынскай нацельнай вопраткі ў народаў Прыбалтыкі[4], Паволжа[5], Дагестана[6] і інш.

Аб месцы разрэза вората на фудзях старажытнаславянскай тунікападобнай мужчынскай кашулі даследчыкі прытрымліваюцца розных поглядаў. А. В. Арцыхоўскі лічыў, што ў XI—XII стст. найбольш пашыранай была кашуля з бакавым разрэзам вората (касаваротка)[7], іншыя даследчыкі — Г. С. Маслава[8], Г. Г. Громаў[9], Л. А. Малчанава[10] — наадварот, прытрымліваліся таго пункту гледжання, што ў старажытнасці бытавала льняная кашуля з разрэзам пасярэдзіне грудзіны, таму што ў XIX ст. такі тып кашулі ўяўляў сабой больш архаічную форму ў параўнанні з касавароткай.

Вывучэнне пазнейшыхтыпаўтрадыцыйнай мужчынскай кашулі, добра вядомых па матэрыялах XVIII—XIX стст., дае падставу меркаваць, што і ў раннім сярэднявеччы ва ўсходніх славян мужчынская кашуля была доўгай, часам за калена. Насілі кашулю ў комплексе са штанамі, навыпуск. Па бёдрах яна абавязкова падпяразвалася поясам. Здаралася, што ў сялян кашуля летам была адзіным адзеннем. Яшчэ ў канцы 60-ых гг. XX ст. старыя людзі на Віцебшчыне паведамлялі, што, па сямейных паданнях, іх дзяды ў XIX ст. пачыналі насіць штаны толькі перад жаніцьбай. Аб існаванні гэтай з'явы ў беларусаў пісала і Г. С. Маслава[11].

Паясным мужчынскім адзеннем старажытных жыхароў Беларусі былі ільняныя або суконныя штаны. Па адной з версій усходнія славяне запазычылі іх ад скіфаў, якія на конях качавалі па прычарнаморскіх стэпах за 500 гадоў да н. э. Аднак у кнізе «Створана чалавецтвам» Ю. В. Брамлей і Р. Г. Падольны расказалі аб раскопках пад горадам Уладзі-



**Старажытная тунікападобная кашуля-галашыйка.** Мініяцюра з «Жыція Сергія Раданежскага». XVI ст.

мірам, у час якіх былі знойдзены астанкі людзей у футравых штанах, якія жылі 20 тысяч гадоў таму назад, задоўга да прыручэння каня[12]. Гэта знаходка гаворыць аб тым, што штаны ў славян з'явіліся хут-чэй за ўсё пад уздзеяннем кліматычных умоў, а не верхавой язды на конях.

Напрыканцы XIX — пачатку XX ст. у розных рэ-гіёнах Беларусі мужчынскае паясное адзенне насіла назвы «штаны», «нагавіцы», «ганавіцы», «парты», «учкуры», «майткі» і г. д.[13] Дарэчы, у рускіх да XVIII ст. не толькі штаны, але і ўся мужчынская вопратка называлася «порты».

Л. У. Дучыц, паводле археалагічных даных, лічыць, што мужчынскія штаны жыхароў бела-рускіх зямель у раннім сярэднявеччы, як і ў рускіх, былі нешырокімі. Іх кроілі з прамых палотнішчаў, перагнутых па аснове. У шагу паміж палотнішчамі ўшывалі ўстаўку або кліны. Пояс рабіўся нешы-рокім і завязваўся вакол таліі[14].

Адзенне ўпрыгожвалі нашыўнымі металічнымі пранізкамі, спіралькамі і бляшкамі. Неабходным элементам мужчынскага касцюма з праславянскіх часоў на Беларусі быў скураны, тканы, плецены ці шаўковы пояс, да якога часта прымацоўвалі пад-вескі-амулеты[15].

Як і ў Заходняй Еўропе, у Вялікім княстве Лі-тоўскім з ростам і ўзмацненнем гарадоў множыўся слой багатых рамеснікаў і купецтва, якія вялі ак-тыўны ўнутраны і замежны гандаль. Дзякуючы куп-цам паміж гарадамі розных рэгіёнаў Беларусі на-ладжваліся і пашыраліся эканамічныя сувязі.

На мужчынскі касцюм у сярэднія вякі вялікі ўплыў аказвала ваеннае адзенне. Пад кальчугу апра-налі палатняную ці суконную кашулю з прашытага ў некалькі столак палатна або сукна даўжынёй да сярэдзіны сцёгнаў і суконныя або палатняныя шта-ны, якія запраўлялі ў скураныя боты.

Па меркаванню некаторых даследчыкаў адзен-ня, з цягам часу суровы ваенны быт як бы выцесніў кашулю з ужытку сярэдневяковага воіна. Замест яе стаў у XIII ст. ужывацца падлатнік — паўкаптан пе-раважна з бавоўнянай або суконнай тканіны, пад-біты ватай[16]. Пасля нашэсця татар жыхары ўсход-нерускіх зямель пачалі рабіць кашулі вышэй кале-няў і ворат разразаць не пасярэдзіне грудзіны, а на



**Кашуля-касаваротка.** Гомельшчына. 1930-ыя гг. Малюнак С. Гунько

левым баку[17], а на Беларусі старажвітнаруская кашуля з разрэзам вората пасярэдзіне грудзей захоўвалася да канца XIX ст.

У сялян і гараджан кашуля ніколі не ввіходзіла з ужытку ні ў штодзённай працві, ні ў святочнвія дні. Првістасаванві да працоўнвіх заняткаў і ўмоў жвшця сялянскі касцюм на працягу стагоддзяў не паддаваўся ўздзеянню модві і паступова набвіваў нацвіяналвнві характар. Па-ранейшаму сялянскі касцюм на Беларусі складаўся з кашулі даўжвінёй да каленяў і ніжэй, якая бвіла тунікападобнага крою з прамвімі доўгімі рукавамі, падпяразанай тканвім ці скуранвім поясам з металічнай спражкай і нешвірокіх доўгіх штаноў-нагавіц. Да пояса сяляне зввічайна првічэплівалі неабходнвія ў штодзённвім ужвітку рэчві: ножвік і скураную сумачку-каліту з крэсівам, сухім грвібам-трутавіком для запалввання агню ад іскрві і грабенвчвікам. Кашуля ў комплексе са штанамі служвіла сялянам адзінай вопраткай летам і хатняй адзежай зімой.

У канцві XV — пачатку XVI ст. на Беларусі падаткі з гарадоў і пошліннвія зборві з купцоў сталі



**Касцюм сялян XVIII ст.** Малюнак А. Даманскага. 1742 г.

**Летні касцюм селяніна.** Вёска Сямёнавічы Ігуменскага павета Мінскай губерні. Канец XIX — пачатак XX ст.



**Плітка з адлюстраваннем ганчара.** XVII—XVIII стст.





**Традыцыйны касцюм беларуса з нешырокімі палатнянымі нагавіцамі.** Вёска Чучавічы Мазырскага павет Пачатак XX ст.



**Летні сялянскі касцюм.** Вёска Радастаў Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Пачатак XX ст.

істотнай крыніцай папаўнення велікакняжацкай казны. Жаданне ператварыць эканамічную дзейнасць гарадскіх жыхароў у пастаянную крыніцу сваіх даходаў праявілася ў палітыцы даравання гарадам (ад імя вялікага князя літоўскага ці ўладара прыватна-ўласніцкага горада) прывілеяў на магдэбургскае права.

По гэтых прывілеях (граматах) гараджане вызваляліся ад феадальнай залежнасці і павіннасцей, ім гарантаваліся свабодныя заняткі рамяством, гандлем, земляробствам і дазвалялася выбіраць свой орган улады — магістрат, а таксама суд, ствараць рамесныя аб'яднанні — цэхі.

Паглыбленне падзелу працы, узнікненне і пашырэнне ў гарадах цэхавай вытворчасці садзейнічалі выдзяленню кравецтва ў асобнае рамяство і уніфікацыі адзення гараджан, абумовіўшы ўзрастаўшае яго адрозненне ад вясковага як у спосабах пашыву, матэрыяле, так і ў структуры ўсяго касцюмнага комплексу[18]. Так, напрыклад, у першай палаві-не XVII ст. пашывам адзення ў Магілёве займаўся кравецкі цэх, які ў 1634 г. атрымаў каралеўскі прывілей". Развіццё рамяства і гандлю стварыла слой багатых гараджан, грашовыя сродкі якіх далі ім магчымасць паставіцьу залежнасць ад сябе многіх збяднелых шляхціцаў.

Пашырэнне і ўмацаванне гандлёвых сувязей Вялікага княства Літоўскага як з Усходам, так і з Заходняй Еўропай, забяспечвалі ў гарадах на тэрыторыі Беларусі шырокі выбар імпартных тканін і



**Каралеўскі касцюм з жупаном І дэліяй сярэдзіны XV ст.** «Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Казімір IV Ягелончык з жонкай сярод бернардзінцаў». Невядомы мастак. XVII ст.

аздабленчых матэрыялаў для вопраткі (галуны, гузікі, гузы, гаплікі, карункі, стужкі, шнуры і г. д.), а таксама гатовага адзення. Шаўковыя і баваўняныя тканіны імпартаваліся ў асноўным з Усходу: Турцыі, Кітая, Сярэдняй Азіі, Закаўказзя, Індыі. Асноўную масу заходнееўрапейскага імпарту складалі шарсцяныя тканіны з Англіі, Германіі, Чэхіі, Францыі, Галандыі, Італіі.

У XVI — першай палавіне XVII ст. у асяроддзі магнатаў, шляхты і багатых гараджан Вялікага княства Літоўскага было прынята выстаўляць касцюм напаказ, як сімвал свайго месца ў сацыяльнай іерархіі грамадства. Мужчыны і жанчыны шылі адзенне з шаўковых, аксамітных, суконных і палатняных тканін яркіх колераў. Туалеты як магнатэрыі, так і шырокіх слаёў шляхты вылучаліся празмернай пышнасцю, складанасцю і мноствам упрыгажэнняў з золата і каштоўных камянёў.

Надэліі, феразі, газукі, жупаны і пакрыццё шуб выкарыстоўваліся пераважна шаўковыя тканіны і аксаміты. Згодна актавым матэрыялам, найбольш пашыранымі ўсходнімі шаўковымі тканінамі з узорамі аднаго колеру, якія ішлі на пашыў і пакрыццё розных прадметаў адзення, былі адамашак і кітайка. Верхнія кашулі шылі з талету (каштоўнай шаўковай тканіны, затканай золатам, але больш таннай за златаглава), блавату (тонкага шоўку блакітнага колеру), атласу, адна- і двухколернай парчы.

З больш шчыльных і тоўстых шаўковых тканін на шыццё касцюмаў ішлі канавац, кгрубрын, табін, тафта, цындардот, чынтакор і інш. Акрамя шаўковых тканін шырока выкарыстоўваліся розных колераў і сартоў аксаміты, гладкія і рытыя, сая. Рытым называўся ўзорысты аксаміт, узор на якім ствараўся рознай вышынёй ворсу. Найбольш каштоўнымі сартамі аксаміту былі златаглаў і срэбраглаў, у якіх аснова была з шоўку, а ўток з залатых або сярэбраных нітак.

Розныя віды і сарты сукнаў, якія імпартаваліся на тэрыторыю княства і ішлі на пашыў розных прадметаў мужчынскага адзення, называліся па назве краіны, дзе гэта сукно было выраблена («анкглейское»[20], «влоское»[21], «чешское»[22], «швебеднноское»[23]), па назве горада («лунское»[24]), відаць, па назве мясцовасці («лупанское»[25], «мышынское»[26], «брезннское»[27]), па сартах («каразея»[28], «утерфнн»[29], «файлюндыш»[30], «крумлнс»[31] і інш.).

Гараджане і шляхта, якія не мелі дастаткова грошай на вопратку з каштоўных тканін, выкарыстоўвалі іх толькі для яе аздаблення (на каўняры, манішкі, шлягі, вылогі, пятліцы і г. д.), што было пашырана ў больш-менш маёмасных слаях насельніцтва і ў іншых еўрапейскіх краінах[32].

У 1506 г. на польскі прастол быў абраны Жыгімонт I Стары, жанаты з міланскай герцагіняй Бонай Сфорца. Яны запрасілі ў Кракаў (тагачасную



**Палацавы** еўрапейскі касцюм. Партрэт Жыгімонта III. Мастак М. Кобер. 1591 г.



**Еўрапейскі палацавы касцюм сярэдзіны XVI ст.**
Партрэт Жыгімонта II Аўгуста.
Майстэрня Л. Кранаха Малодшага. Каля 1556 г.



**Дзіцячы партрэт Жыгімонта II Аўгуста ў саяне**
**Пачатак XVI ст.**

сталіцу Польскай Кароны) італьянскіх скульптараў, жывапісцаў, паэтаў, вучоных, дзякуючы чаму ўзрос уплыў рэнесансавай італьянскай культуры амаль на ўсе галіны культурнага жыцця Беларусі, у тым ліку і на адзенне. Гэтаму спрыяла і размяшчэнне яе ў цэнтры Еўропы, на стыку Захаду і Усходу.

Менавіта ў часы Жыгімонта I Старога, як паказваюць іканаграфічныя і актавыя матэрыялы ў Вялікім княстве Літоўскім і Польшчы, пашыраецца новы від кароткага мужчынскага і жаночага плечавога адзення італьянскага паходжання — саян. У мужчын гэта быў лёгкі каптан з сукна ці ўзорыстых парчовых тканін звычайна з трохкутным ці квадратным выразам вакол шыі і кароткімі, даўжынёй да локця шырокімі рукавамі. Складаўся саян з кшталта — нагрудніка, які шчыльна ахопліваў фігуру да таліі. Па лініі таліі да кшталта прышываліся шырокія кліны даўжынёй да палавіны сцёгнаў. У пачатку XVI ст. як від лёгкай плечавой вопраткі пануючых саслоўяў розныя варыянты саяна былі распаўсюджаны ў Італіі, Іспаніі, Германіі[33]. Глогер называе саян кароткай сукняй[34].

У матэрыялах Віленскай археаграфічнай камісіі на працягу XVI ст. саяны сустракаюцца даволі часта як адзенне шляхты і гараджан: «соянь чорный утерфнновый зьоксамнтнымь кшталтомь» (1582 г.)[35], «соянь фолендышу зеленого зь оксамнтомь чорнымь»[36] (1596 г.) і г. д. Разам з лёгкімі летнімі саянамі прадстаўнікі шляхецкага саслоўя ў Вялікім княстве Літоўскім насілі ў другой палавіне XVI ст. саяны, падбітыя футрам: «саянік аксамітны брушкамі лісімі падшыты» (1582 г.)[37].

На італьянскую культуру арыентаваўся і сын Жыгімонта I Старога Жыгімонт II Аўгуст — апошні кароль з роду Ягелонаў. Ён склікаў сейм у Любліне ў 1569 г., на якім Карона і Вялікае княства Літоўскае былі аб'яднаны ў адзіную дзяржаву — Рэч Паспалітую.

Узмацненне рознабаковых сувязяў княства з Польшчай ва ўмовах адзінай дзяржавы, а таксама з Германіяй і асабліва з Францыяй, садзейнічалі таму, што адзенне вышэйшага саслоўя і гараджан Вялікага княства Літоўскага стала развівацца ў агульным рэчышчы еўрапейскай моды, складаючы адну з разнавіднасцей еўрапейскага касцюма.

На Беларусь у XVI ст. завозілася палатно «коленскае»[38], «туробінскае»[39], «падгорскае»[40] і інш. З гэтых гатункаў палатна для прадстаўнікоў прывілеяванага саслоўя Вялікага княства Літоўскага шылі кашулі, якія аздаблялі карункамі, складачкамі, зашчыпамі на грудзях. Верхнія кашулі, якія насілі паверх ніжніх палатняных, шылі з шаўковых (ядвабных) тканін і багата ўпрыгожвалі вышыўкай, каштоўнымі камянямі. Так, у апісанні маёмасці Хадкевічаў у 1569 г. гаворыцца, што ў адной са скрынь знайшлі «кашульку днтячью зь золотомь, а трн кошулькн днтячнхь простыхь коленскнхь»[41], а ў другой скрыні была «...кошулька золотая сь перлы н зь шлягомь; колнерь перловый сь передннкамн старосветскнмн...»[42]. Мінская мяшчанка ў 1582 г. абакрала свайго кватаранта, забраўшы ў яго сярод іншых рэчаў «кошуль коленьскнхь шесть — одна зь золотомь, другая з серебромь, третея з шолкомь чырвонымь, четьвертая з шолкомь чорнымь, а две не вышываных»[43].

Верхнія, багата аздобленыя мужчынскія кашулі ў актавых матэрыялах XVI ст. часта называюцца шатамі споднімі: «шата нсподняя талетова зь рукавамн н заложка* талетова, на рукаве пунталевь 21; шата талету бурнатного сь перламн, рукава тоежь шаты сь перлы н заложка сь перлы» (1569 г.)[44]. Як адзначаюць мовазнаўцы, у старажытнабеларускай мове слова «шаты» пад уплывам польскай мовы атрымала сэнсавае адценне «пышнае адзенне»[45].

Паміж словамі «сарочка» і «кашуля» ў старабеларускай мове існавалі семантычныя адрозненні. «Сарочкай» звычайна называлася ніжняя нацельная рубаха, а верхняя, якую апраналі на ніжнюю, — «кашуляй»[46] («вь той скрынн... кошулькн две простые, сорочка мужнцкая») (1556—1557 гг.)[47].

Кашулі ў значэнні верхняй лёгкай плечавой вопраткі ўпаміналюцца ў мностве актавых матэрыялаў

* Заложка — нагруднік з каштоўнай тканіны, які завязваўся тасёмкамі пад каўняром і на таліі.

XVI ст. («кошуля н зь золотомь» (1511)[48], «кошулька полотна флямского н зь золотомь» (1565)[49].

Партрэты прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя Вялікага княства Літоўскага паказваюць, што ў XVII ст. шырока выкарыстоўваліся «дэкаратыўныя» якасці кашулі. Пашытая з тонкага льнянога палатна з вельмі шырокімі рукавамі кашуля праглядвала ля шыі, у разрэзах рукавоў каптана, на грудзях. Адкладныя белыя палатняныя каўняры і манжэты абшывалі карункамі.

Паясное мужчынскае адзенне ў помніках старажытнабеларускай пісьменнасці прадстаўлена назвамі «ногавнцы», «порты», «порткн», «гачн», «шаловары», «сподшн», «хусты», «убранье», «убноры», «штаны».

Назва штаноў «ногавнцы» («нагавнцы») мае старажытнарускае паходжанне[50] і сустракаецца ў актавых матэрыялах XV—XVI стст. («оть ногавнцн... по трн фошн») (1407 г.)[51].

Трэба адзначыць, што актавыя матэрыялы ўтрымліваюць апісанне паяснога адзення пераваж-на прадстаўнікоў найбольш маёмасных фуп насельніцтва: магнатэрыі, шляхты, багатых гараджан і рэдка сялян. Таму амаль усе названыя тыпы штаноў шыліся з дарагіх, звычайна прывазных тканін («нагавнць... однылунскне, адругне замшовые») (1556—1557 гг.)[52].

Назвы «порткн» («порты») даволі часта сустракаюцца ў актавых матэрыялах XVI—XVII стст. для абазначэння верхніх і ніжніх штаноў («порткі белые влоскне») (1556—1557 гг.)[53], «пань райца сторговаль сукна на лнберыю н портькн» (1697 г.)[54], «Пань бурмнстрь... узяль сукна на порткн» (1697 г.)[55].

Назвы штаноў «гачн» («кгачн», «кгатн»), «сподне» («сподшн»), «штаны» сустракаюцца ў невялікай колькасці актавых матэрыялаў XVI—XVII стст. («кошультры, кгатнодны» (1598 г.)[56], «сукна чнрвоного на кунтушь н на жупань н на сподне мнстру» (1682 г.)[57], «штоны сермяжные двон») (1579 г.)[58]. Тэрмін «кгачн», «кгатн» ў XVI ст. ужываўся часцей за ўсё ў адносінах да ніжніх мужчынскіх штаноў і штаноў з даматканага палатна. Так у вопісе адзення князя Горскага, які кватараваўу Мінску ў 1582 г., называюцца верхнія суконныя штаны «убранье чырвоное кармазыновое, ...убранье каразенбелое», атаксамападштанікі: «кгачей полотна ткацкого (даматканага. — *Аўт.)* четьверы»[59]. Ніжнія мужчынскія штаны і бялізна ў цэлым у крыніцах XVI ст. абазначаліся яшчэ тэрмінам «хусты», «хусты белыя».

У другой палове XVI — XVII ст. найбольш пашыранай назвай штаноў была лексема «ўбранье» і паланізм «убноры» («на сорочку н на убране далн золоть одынь» (1690 г.)[60], «за шыце куньтушовь двухь н жупановь двухь н убіорь двонхь, за всё далм золоть семь»(1697г.)[61].

У ваенных сутычках з татарамі шляхта сярод ваенных трафеяў здабывала шмат каштоўнага адзення, у тым ліку і штаны-шаравары (ад турэцкага «шелвар») з каштоўных усходніх тканін. Па іх узору мясцовыя краўцы шылі такія ж з сукна. Назва такога тыпу шырокіх штаноў у зборку, якія трымаліся на ўчкуры, сустракаюцца ў дакументах сярэдзіны XVI ст. («шаловары ческаго сукна») (1557 г.)[62], «ша-ловары зеленого простого сукна» (1556—1557 гг.)[63].

У XVI ст. у Еўропе ў асяроддзі прывілеяванага саслоўя атрымоўваюць распаўсюджанне кароткія штаны, часта падбітыя ватай або пухам на бёдрах і звужаныя да калена, якія насілі з доўгімі панчохамі, падвязанымі пад каленямі спецыяльнымі падвязкамі. З часоў праўлення Жыгімонта I, калі сярод знаці Вялікага княства Літоўскага і Кароны пашыраецца еўрапейская мода, кароткія да калень шта-ны прадстаўнікі вышэйшага саслоўя сталі насіць і ў Вялікім княстве Літоўскім. Кароткія штаны пад назвай «плюдры» («плюндры») фігуруюць у актавых дакументах канца XVI — першай палавіны XVII ст. («плюдрь двое» (1598 г.)[64], «плюдеркн детнннные» (1618 г.)[65]. Тэрмін «плюдры» паходзіць ад нямецкага «плюдэрхозен» (рііісіегпозеп) — назвы кароткіх да калень штаноў нямецкіх ландскнехтаў першай палавіны XVI ст. — і перайшоў на Беларусь з Германіі праз Польшчу. Гэта былі шырокія, прызбораныя ў поясе грушападобныя штаны-брыджы, якія звужаліся да калена. Шылі іх з шаўковых, аксамітных, суконных тканін, часта падбіваючы па бёдрах пухам, пер'ем або іншымі мяккімі матэрыяламі. Пазней «плюдры» выйшлі з моды, і іх змянілі больш вузкія, даўжынёй да кален французскага крою панталоны, але на Беларусі іх па-ранейшаму называлі «плюдрамі».

Еўрапейскі касцюм у Вялікім княстве Літоўскім называлі «нямецкім». Штаны да калень, крой якіх мяняўся згодна модзе ў XVI—XVIII стст., насілі прадстаўнікі знакаміцейшых фамілій і гараджане, салдаты і вышэйшыя афіцэрскія чыны. З першых дзён XVIII ст. іх увёў у комплекс новага адзення Пётр I. Вышэйшая знаць Вялікага княства Літоўскага выкарыстоўвала на паясное адзенне яркіх колераў сукно, аксаміт, шчыльныя шаўковыя ткані-ны, гараджане — больш танныя сукны «фалюн-дыш», «кглокговское», «цвшшховское», «полапкглейское».

У актавых матэрыялах XVI—XVII стст. сярод паяснога адзення еўрапейскага крою вышэйшага саслоўя Беларусі называюцца плюндры ласіныя[66], паламітавыя[67], цвіліховыя і інш[68].

Простая шляхта на тэрыторыі Беларусі трымалася ўсходняга «сармацкага» тыпу адзення амаль да пачатку XIX ст.

У другой палавіне XVI ст. у адзенні гараджан і шляхты разам з прывазнымі тканінамі ўжо даволі шырока, мяркуючы па пісьмовых крыніцах, увайшлі ў побыт прадметы еўрапейскага адзення: «полкопенье ческое тогожь сукна ческого» (1583 г.)[69],




**ШляхецкI касцюм з жупаном I дэліяй.**
Партрэт Яна Завішы, віцебскага ваяводы. Невядомы мастак. Другая чвэрць XVII ст.

**Шляхецкі касцюм з жупаном і дэліяй.** Партрэт Мікалая Завішы, віцебскага кашталяна. Невядомы мастак. Сярэдзіна XVII ст.



«плашнкь Влоскій кнтайкою чорною подшнтый» (1569 г.)[70], «сукня фалендышавая іспанская доўгая непадшытая... іспанская шата адамашкавая з пятліцамі»[71].

Усходнія тканіны каштавалі вельмі дорага. Імпартныя шаўковыя і аксамітныя тканіны магілёўскія мяшчане паднеслі ў падарунак рускаму цару Аляксею Міхайлавічу, калі ён у 1655 г. наведаў Магілёў. У падарунку быў «бархат череват, атлас гладкой огненной цвет, байберек таусінной шолковый, байберек черевчат шерстяной... бархату мера 10 аршнн без четн, атласу 13 аршнн с полуаршнном, байбереку шолковому 16 аршнн без штн вершков, другому байбереку 16 аршнн с четью»[72]. Байберак — тканіна з кручанага шоўку з залатымі ці сярэбранымі ўзорамі.

Адзенне было настолькі дарагім, што нават у асяроддзі магнатаў і багатай шляхты яно перадавалася ў спадчыну ад бацькі сыну, перашывалася. Гэта добра відаць на партрэтах Завішаў. На партрэце невядомага мастака Ян Завіша, віцебскі ваявода



**Шляхецкі касцюм з жупаном ! феразэю.**
Партрэт Анджэя Казіміра Заеішы, вялікага пісара ВКЛ, старасты мінскага, чачэрскага. Невядомы мастак. 1676 Г.

(1599— 1626), апрануты ў кармазінавую дэлію на гарнастаевым падбоі з такім жа вялікім каўняром. Пад горлам дэлія зашпілена засцежкай-брошкай з каштоўных камянёў. На правым крысе дэліі восем залатых гузоў з каштоўнымі камянямі.

На партрэце яго сына Мікалая Завішы віцебскага кашталяна (1626— 1647), мы бачым тую ж дэлію, якая зашпілена пад горлам той жа каштоўнай засцежкай, але ўжо перашытую, са значна меншым каўняром і замест васьмі каштоўных гузоў на ёй ужо толькі тры.

Такое адзенне ніколі не мылі, таму часта пакутавалі ад блох. Ратаваліся ад іх пры дапамозе спецыяльных блыхаловак (невялікай пасудзінкі, у якую ўстаўлялася палачка, змочаная ў свежай крыві труса, зайца або курыцы), якую насілі пад адзеннем. З гэтай жа мэтай адзенне перакладвалі пры захаванні духмянымі травамі (палыном, піжмай і інш.). Палатняныя кашулі часта мылі дзеля таго, каб захаваць надзвычай каштоўныя тканіны верхняга адзення ад забруджвання, а не толькі з гігіенічных патрэб. У прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя кашулі былі з найтанчэйшага галандскага або нямецкага («коленскага», г. зн. вырабленага ў Кёльне) палатна. Шылі іх свабоднымі з доўгімі, вельмі шырокімі рукавамі, а па гарлавіне ці вакол каўняра-стойкі дробна прызборвалі. Манішку і шырокія рукавы кашулі, якія былі відаць у выразе на грудзях і разрэзах рукавоў верхняга адзення, багата ўпрыгожвалі шаўковай (ядвабнай), залатой або сярэбранай вышыўкай.

Тонкае батыставае палатно пры мыцці хутка страчвала беласць, таму звычайна ў магнатаў быў вялікі запас кашуль. Больш шырокія слаі шляхты, поруч з «коленскімі», насілі кашулі з даматканага («ткацкага») палатна, вытканыя іх прыгоннымі сялянамі. Згодна з вопісам маёмасці, харужы Марцін Падбярэзскі з Віленскага ваяводства меў «кошуль мужскнхь ткацкого полотна н Коленского полотна семьдесять, в каждой по пятн локоть полотна» (1599 г.)[73].

Мяшчане, у залежнасці ад заможнасці, мелі кашулі «коленскія», часам расшытыя шоўкам, тонкія даматканыя («кужэльныя»), або з грубага палатна «нзгребныя»[74], штаны багатыя мяшчане насілі суконныя «люнскме (зліёнскагасукна. — *Аўт.),* блакнтные н чнрвоные»[75].

З кароткімі штанамі сталі насіць і кароткія віды плечавой дзённай вопраткі, што прыдавала больш стройнасці чалавечай постаці. У адзенні шляхты і гараджан вялікую папулярнасць набылі рознага роду кароткія каптанікі. Адны з іх толькі крыху прыкрывалі талію, другія даходзілі да сярэдзіны бядра. Шылі іх з сукна, шаўковых тканін, аксаміту, часам падбівалі розным футрам. Звычайна яны цесна аблягалі стан і шчыльна зашпільваліся спераду на гузікі. Рукавы рабілі пышна прызборанымі ля пля-

ча, а проймы аздаблялі дэкаратыўнымі паскамі тка-ніны або падбітымі ватай валікамі.

Жаданне зрабіць і паказаць свой касцюм як мага больш багатым і прыгожым вымушала шляхту і га-раджан выкарыстоўваць на часткі адзення, якія былі на вачах, каштоўныя тканіны і футры, а на нябач-ныя — больш танныя: «шубка панская адамашка-вая чорная, перад сабалямі падшыты, а зад — ку-намі» (1582 г.)[76], «плашнкь чорный, переды рысямн подбнтый, а зад лнсамн» (1598 г.)[77]. Гарадскія магі-страты выдавалі сваім работнікам грошы на пера-шыццё зношаных службовых кунтушоў на жупаны, бо з-пад кунтуша быў відаць толькі перад жупана: «На перашыте барвы старой... зь кунтушов на жу-паны, кождому по золотому н осм. пятнадцать» (1699 г.)[78].

З гэтай жа мэтай у XVI ст. у Еўропе выкарыстоў-валі з'ёмныя рукавы і манішкі з каштоўнай ткані-ны. Рукавы прышпільвалі або прывязвалі матузкамі да проймы верхняй безрукаўнай вопраткі або ніжняй кашулі, а ў выраз каўняра ўстаўлялі багата аздобленую вышыўкай манішку, што стварала ўра-жанне поўнага камплекта адзення. Відаць, такі пры-ём зрабіць свой касцюм больш багатым і разнастай-ным існаваў і ў Вялікім княстве Літоўскім, хаця ў пісьмовых крыніцах звесткі аб з'ёмных рукавах у мужчынскім адзенні адшукаць не ўдалося. Тым не менш сцвярджаць, што такой з'явы на тэрыторыі княства не было, нельга, паколькі яны, па-першае, шырока ўжываліся ў жаночым касцюме; па-другое, быў распаўсюджаны звычай шыць адзін і той жа від верхняй вопраткі з рукавамі і без рукавоў («каба-ты... два з рукавамі, а трэці без рукавоў») (1582 г.)[79]; па-трэцяе, у актавых матэрыялах упамінаюцца ма-нішкі да кашуль: «заложка талетава» (1569 г. )[80], «кол-нерь перловый сь передннкамн старосветскнмн» (1569г.)[81].

Дамы нават у багатай шляхты ў XVI—XVIII стст. звычайна былі пакрыты саломай, мелі невялікія вокны, зашклёныя цьмяным шклом, драўляную падлогу і скудную мэбліроўку. Печы, хоць і з дыма-ходам, зімой не маглі добра абагрэць усе пакоі: «домь ннзкій, велнкій, светлнць вь немь чотырн, коморь трн сь печамн» (1580 г.)[82]. Таму ў якасці начнога адзення шляхта выкарыстоўвала спецыяльную цёп-лую вопратку, часта падшытую футрам: «чемара до ложка мухаярова себеркамн подшнтая» (1598 г.)[83].

Развіццё культурных і эканамічных сувязей паміж дзяржавамі і пашырэнне магдэбургскага пра-ва ў гарадах садзейнічалі хуткаму росту папулярнасці еўрапейскага касцюма сярод магнатэрыі і гараджан Вялікага княства Літоўскага, што аказала ўплыў і на адзенне болын шырокіх слаёў шляхты, якія ста-раліся быць падобнымі ў адзенні на больш багатых і ўплывовых асоб. У вопісах адзення і інвентарах зямян і баяр з другой палавіны XVI ст. разам з доўгімі,



**ШляхецкІ касцюм 1-ай палавіны XVII ст. з жупаном І дэліяй.** Партрэт К. Збаражскага. Невядомы мастак. 1627 г.



**Шляхецкі касцюм э жупаном і феразэю.** Партрэт Германа Дэнгофа. Невядомы мастак. 1633 г.

традыцыйнага крою штанамі, якія называліся «ўбраннямі», «убіорамі», упамінаюцца і кароткія штаны еўрапейскагафасону («плюндры», «флундры»): «убранне сукна чорнага, аксамітам брамована; флундры сукна чорнага, аксамітам брамованы» (1582 г.)[84].

К канцу стагоддзя адзенне магнатаў і багатай шляхты паступова пачало набываць характар адзінагастылёвага комплексу, іначай кажучы, утое, што мы прывыклі называць касцюмам. Прадметы плечавога і паяснога адзення сталі рабіць аднаго колеру і з адной і той жа тканіны, аздабляючы аднолькавымі матэрыяламі, у процілегласць прынятаму раней звычаю шыць іх з розных тканін і рознага колеру: «кабат н флудры чындэртавыя, аксамітам брамованыя ... флудры і кабат цвіліховыя чорныя, аксамітам брамованыя» (1582 г.)[85].

Сяляне па-ранейшаму насілі кашулі палатняныя даматканыя «хлопячыя» (ад слова «хлоп») і з такога ж палатна ці даматканага («сярмяжнага») сукна штаны[86].

Сярод хатняга і вулічнага кароткага адзення гараджан і шляхты ў актавых матэрыялах XVI — XVII стст. часта ўпамінаюцца жупіцы, казыякі, кабаты, сукенкі, камізэлі. Жупіца — кароткі лёгкі каптан з рукавамі або без рукавоў. У матэрыялах Полацкага гродскага суда за 1535 г. ёсць справа полацкага мешчаніна Ваські Мітковіча, які, будучы зап-



**Кунтуш**

рошаны ўдом суседа на каляцыю (г. зн. на пачасту-нак) і падпіўшы там, за ноч прайграўся да кашулі. Але «на завътрея, въ овъторокъ, тотъ день весь былъ есми въ него и пилъ з нимъ» і адыграў «тое платы, свае, штомъ былъ проигралъ», «и надъ то еще его платья и ковшовъ серебныхъ выигралъ». Пасля паміж гульцамі пачалася бойка, і Васька выскачыў праз акно, прыхапіўшы выйфаную ў суседа аднарадку, а жупіцу вынес на сабе. Была ж тая жупіца «червленая люнская»[87]. У актавай кнізе Гродзенскага земскага суда за 1539—1540 гг. сярод розных прадметаў мужчынскай вопраткі жупіца ўпамінаец-ца з тлумачэннем, што гэта «адзенне безъ рукавоў»[88].

Казыяка таксама з'яўлялася разнавіднасцю ка-роткага лёгкага каптана, якая шылася як з рукавамі, так і без рукавоў: «... казыяка акъсамиту чорного ритого, другая казыяка акъсамитная безъ рукавовъ» (1598 г.)[89].

Кабат (кобать) — кароткі, да палавіны сцёгнаў каптан з рукавамі і без рукавоў: «нашли... лежачое въ кабате замшовомъ и в казыяце сермяжной... тело небощика»(1598г.)[90].

У тэкстах з другой палавіны XVI ст. сярод карот-кага верхняга адзення сустракаюцца «сукенкі»: «су-кенка кароткая непадшыта чорнага простага сукна... сукенка атласная чырвоная» (1582 г.)[91].

Хатнім і вулічным плечавым адзеннем мяшчан і шляхты, якое апраналі зверху кашулі, здаўна быў жупан — даўгаполая вопратка з сукна ці шаўковых тканін, пашыраная ўніз ад лініі таліі. Ад каўняра да таліі ён зашпільваўся на гузікі або гаплікі. Зімнія цёплыя жупаны рабілі на падкладцы з шарсцяных тканін, часам падбівалі ватай.

Жупаны падпяразваліся скуранымі, суконнымі, шаўковымі паясамі. Спінку ў іх рабілі прыталенай, полы суцэльнымі. З бакоў устаўлялі кліны. Ззаду па таліі жупаны моцна прызборвалі або закладалі ў складкі. З сярэдзіны XVII ст. жупан сталі насіць у комплексе з кунтушом. У сувязі з гэтым пояс з жупана перайшоў на кунтуш. Змяніўся і крой жупана. Яго сталі менш прызборваць ззаду. Пышныя шы-рокія рукавы жупаноў у сярэдзіне — канцы XVII ст. часта заканчваліся ля запясця шчыльнымі фігур-нымі манжэтамі даўжынёй амаль да пальцаў. Летам замест жупана часам насілі палатняны зіпун (лёгкі доўгі каптан): «зипун белый полотна коленского з боволною» (1557 г.)[92].

Кунтуш не з'яўляўся спрадвечным польскім адзеннем, а быў запазычаны з краін Усходу. Павод-ле легенды, турэцкія султаны адорвалі пунсовымі кунтушамі з залатымі гузамі крымскіх ханаў за ва-енную службу. З другой палавіны XV ст. пачасціліся набегі крымскіх татар на Вялікае княства Літоў-скае і Карону. Зімой, калі замярзалі рэкі, атрады татарскай конніцы рабавалі вёскі і мястэчкі, забі-ралі ў палон жанчын і дзяцей. У ваенных сутычках з



**Шляхецкі касцюм з жупаном і кунтушом.**
Сярэдзіна XVII—XVIII стст.



крымчакамі і туркамі шляхта здабывала кунтушы і, пахваляючыся гэтымі трафеямі, апранала іх на жупан. Лічыцца, што назва «кунтуш» запазычана ад венгерскага «kontos»[93].

Аднак, у адрозненне ад турэцкага, кунтуш у Польшчы набыў іншы крой і насілі яго толькі ў комплексе са старадаўнім славянскім адзеннем - жупаном. Кунтушы былі летнія і зімнія, суконныя, аксамітныя, з шаўковых тканін. Спераду на таліі яны зашпільваліся на гузікі, гаплікі. Доўгія адкідныя рукавы кунтушоў рабілі разразнымі да пляча. Прывілеяй асоб сталых і найбольш паважаных было нашэнне рукавоў закінутымі за плечы. Моладзь, дзеці і слугі не мелі права так насіць кунтушы. Часам кунтушы надзявалі толькі на адзін рукаў[94]. Шляхта кожнага ваяводства і павета з 1776 г. мела свой асобны колер кунтуша.

Зашпільвалі кунтушы спераду толькі наталіі, каб быў відаць перад жупана, і таму што так было зручна ездзіць вярхом, а шляхціц быў, можна сказаць, неразлучны з канём. Ездзіцьу вазку ці брычцы лічылася абразай для мужчын. Нават старыя людзі яшчэ ў канцы XVIII ст. адпраўляліся ў далёкую дарогу вярхом[95].

**Шляхецкі касцюм з жупаном І кунтушом.** Фрагмент касцёльнага вота. 2-ая пал. XVII ст.

**Шляхта ў павятовых мундзірах.** Малюнак XVIII ст.



Звычайна жупан шылі аднаго колеру, а кунтуш — другога. Кунтушы поруч са шляхтай насілі і мяш-чане, але для іх, як і для дробнай шляхты, гэта быў толькі святочны ўбор.

У XVII—XVIII стст. увайшло ў моду падпяраз-ваць кунтушы мяккімі ўсходнімі, часцей за ўсё персідскімі залататканымі або сярэбратканымі пая-самі.

Кунтушы і жупаны ў паўсядзённым жыцці менш заможныя слаі шляхты замянялі кароткімі відамі плечавога адзення:

Жупан або кунтуш — параднае адзенне —
Звычайна апранаецца на пасяджэнне
Суда, а не ў дарогу. Лепш за ўсё ў паходзе
Бравэрка або куртка адпаведна модзе,
Райтузы будныя. Пагоды ж не закажаш:
Дождж — крыссе падапнеш, калошы
ўверх падкашаш,
На галаву — вушанку[96].

Дробная засцянковая шляхта толькі і адрозні-валася ад сялян, што адзеннем:

Адно сваім уборам несярмяжным, І
розняцца — шарачкам, а па святах
Кунтушам, на працоўны горб напятным,
Ды нейкім ботам[97].

**Касцюм магната.** Партрэт невядомага. Невядомы мастак. XVIII ст.





**Еўрапейскі палацавы касцюм.** Партрэт Гераніма Фларыяна Радзівіла. Мастак Я. Весель. 1746 г.

З XVI ст. у Францыі ў палацавай мужчынскай модзе (прычым раней, чым у жаночай) сталі шыро-ка выкарыстоўвацца карункі. Вельмі хутка мода на карункі ахапіла ўсю Еўропу, у тым ліку і магнатэ-рыю Вялікага княства Літоўскага. Карункамі аздаб-лялі вялікія, з тонкага галандскага палатна ніспа-даючыя адкладныя каўняры кафтанаў і манжэты або рабілі іх з адных карункаў. Карункавымі былі



**Еўрапейскі касцюм.** Партрэт І.Л. Храптовіча. Мастак Дж.Б. Гросі. Канец XVIII ст.



**Жустакор з шаўковага адамашку.** 1760-ыя гг.

жабо на кашулях, гальштукі, падвязкі панчох, імі ж аздаблялі панчохі, верх якіх выкладалі на халявы ботаў.

Асноўным пастаўшчыком карункаў была Вене-цыя (якая імпартавала сетчатыя, выразныя і рэль-ефныя шаўковыя карункі), а лепшыя льняныя ка-рункі вырабляліся ў Галандыі. Асобай папулярнас-цю карысталіся брусельскія карункі, характэрнай асаблівасцю якіх былі выпуклыя ўзоры кветак на сетчатым фоне. Найбольшага росквіту іх выраб да-сягнуў у XVII—XVIII стст. Выраб карункаў набыў шырокі размах і ў Францыі, дзе найбольш праславі-ліся алансонскія льняныя карункі з багатым арна-ментам на дробнай сетцы фону, якія плялі з XVII ст. каруначніцы ў горадзе Алансон. Шырокай вядомас-цю карысталіся і шаўковыя французскія карункі — блонды. Плялі іх з шоўка-сырца, што надавала ім залаціста-жоўты колер. Шырокае распаўсюджанне блонды атрымалі ў XVIII ст. Вельмі каштоўнымі былі іспанскія стракатыя квяцістыя карункі з зала-тымі і сярэбранымі ніцямі. У канцы XVIII ст. мода на карункі ў мужчынскім еўрапейскім касцюме прайшла.

Сярод вышэйшага саслоўя Беларусі ў першай палавіне XVII ст. атрымаў пашырэнне французскі тып палацавага касцюма з панталонамі да калень, кароткім пурпуэнам і абавязковымі белымі палат-нянымі або карункавымі манжэтамі і каўнярам. Такія касцюмы шылі з каляровых шаўковых або аксамітных узорыстых тканін і часта расшывалі яшчэ залатымі і сярэбранымі ніткамі, аздаблялі каштоўнымі гузікамі, пазументам.

У 1660-ых гг. у Францыі пры двары Л юдовіка XIV уваходзіць у моду жустакор — новы від прыталенага адзення каптаннага тыпу даўжынёй да калень. Кап-тан-жустакор хутка атрымаў пашырэнне сярод пры-вілеяванага саслоўя і вярхушкі гараджан ва ўсёй За-ходняй Еўропе і панаваўу еўрапейскім мужчынскім касцюме амаль да канца XVIII ст. Паказальна, што ўжо ў 1673 г. «шустакор» узорыстага чорнага акса-міту, падшыты сабалінымі пупкамі, упамінаецца ў інвентары віленскага купца Афанасія Іванавіча[98], яшчэ раз пацвярджаючы, што Беларусь знаходзіла-ся ў рэчышчы тагачаснага культурна-гістарычнага



**Еўрапейскі касцюм з жустакорам.** Партрэт Аўгуста І Мастак Л. дэ Сільвестр. Каля 1728 г.



**Парадны «сармацкі» партрэт з ваенным даспехам.**
Партрэт караля Рэчы Паспалітай Аўгуста II з негрыцянём. Мастак Л. дэ Сільвестр. 1733 г.

еўрапейскага развіцця. Але пад моцным уплывам шляхецкага светапогляду ў Рэчы Паспалітай і ў XVIII ст. асноўная масашляхты насілажупанзкунтушом, а ў асяроддзі магнатаў яшчэ ствараліся парадныя партрэты, у якіх падкрэслівалася іх «сармацкае» паходжанне ўвядзеннем у шляхецкі касцюм рыцарскіхдаспехаў.

У першай палавіне XVIII ст. у Англіі з'явіўся фрак, які затым хутка пашырыўся па ўсёй Еўропе. Спачатку ён прызначаўся для верхавой язды, бо пры яздзе полы верхняга доўгага прыталенага адзення прыходзілася адгінаць назад. Падуздзеяннем гэтага і склалася форма фрака, які не меў спераду пол, а толькі фалды ззаду. На пачатак 1790-ых гг. існавала два віды фракаў: англійскі з кароткімі фалдамі і



**Хабіт з карычневага паласатага аксаміту.** 1780-ыя гг.



**Камізэлька.** 1780-ыя гг.

Да ўмення насіць фрак у асяроддзі вышэйшага саслоўя ставіліся вельмі прыдзірліва. Гэта тычыла-ся не толькі крою фрака, але перш за ўсё ўмення спалучаць яго з падыходзячымі да выпадку камізэль-камі, пальчаткамі, гальштукамі, уменнем садзіцца ў фраку і захоўваць асанку[101].

Пры Кацярыне II пецярбургскія моднікі насілі з фракам некалькі камізэлек. У часы Паўла I фракі былі забаронены як сімвал ідэй рэвалюцыйнай Францыі. Людзі нават у вышэйшых дваранскіх кругах Масквы негатыўна ставіліся да гэтага віду плечавой вопраткі яшчэ ў 1820-ых гг.:

Хвост сзадн, спередн какой-то чудный выем,
Рассудку вопрекн, наперекор стнхням; Двнженья
связаны, н не краса лнцу[102].

У пачатку XIX ст. у моду вышэйшага саслоўя Расіі і Беларусі з Францыі ўвайшлі доўгія, завужаныя ніжэй калень панталоны. Спачатку іх насілі уваб-ранымі ў боты. З 1820-ых гг. панталоны сталі насіць навыпуск. Шылі панталоны са штрыпкамі і адкід-ным клапанам спераду, які зашпільваўся на поясе на гузікі. Насілі панталоны з башмакамі або навы-пуск з ботамі. Штрыпкі рабілі з той жа тканіны, што



**Каміээлька з сярэбранай ламы.** Канец XVIII ст.

«французскі» з фалдамі ніжэй каленяў. Разам з фра-камі мужчыны пачалі насіць камізэлькі, круглыя капелюшы, кароткія, якія толькі закрывалі калені, штаны, башмакі або туфлі.

Спачатку гэты касцюм здаваўся дзіўным і смеш-ным, асабліва для вясковых жыхароў:

Нязваным госцем у павет Ашмянскі
Паніч-падчашыч з-за мяжы прыехаў —
Кабрыялет, французскі фрак —
пацеха! Як у сарок, дзве фалды на
агузку; Ён першы, хто ў павеце па-
французску Французу; і лётала за ім
гурмою Дзятва, як ластаўкі за
пустальгою".

Найперш прыхільніцамі новай моды як заўжды былі маладыя дзяўчаты і жанчыны. Мемуарысты таго часу пісалі, што нярэдка можна было бачыць пана, апранутага ў кунтуш, а побач з ім жанчыну ў модным парыжскім адзенні:

... Усе прыўсталі
З месц за сталамі: «Божухна, жаніх у
фраку Красуецца!» Кунтуш прывычны
небараку Нявеста не дазволіла: «Дагодзіш
модзе, А не дагодзіш — заўтра ж справа аб
разводзе!» Хоць фрак, здавалася, пашыты
быў па мерцы, Ды, як французы кажуць,
не ў сваёй талерцы У ім адчуваў сябе
паклоннік мовы жэстаў[100].



**Фрак.** Партрэт Адама Чартарыйскага. Мастак І. Аляшкевіч. 1810 г.

і панталоны, або з тасьмы. Мода на штрыпкі захоўвалася да канца XIX ст.

Разам з панталонамі ў касцюме прывілеяванага саслоўя былі пашыраны брыджы — англійскія штаны для верхавой язды на конях. Шылі іх вузкімі ў каленях і насілі запраўленымі ў боты.

На працягу першай паловы XIX ст. крой фракаў некалькі разоў мяняўся. Так, у I830-ых гг. ён меў шырокія пышныя ля пляча рукавы, што выключала карыстанне верхняй вопраткай з рукавамі. Таму ў гэты час мужчыны насілі паверх фрака шматлікія плашчы і накідкі"". Калі ў 1840-ых гг. рукавы фрака сталі вузкімі, што дазволіла насіць верхняе адзенне з рукавамі, сталі шыць шматлікага крою паліто.

У першай палове XIX ст. фракі шылі з розных каляровых сукнаў, паколькі чорны колер звязваўся з жалобай. Толькі к 1840-ым гг. фракі чорнага колеру атрымалі распаўсюджанне як святочная вопратка. Да 1830-ых гг. фрак насілі з панталонамі іншага колеру і іншай тканіны"[14].

Пад фрак апраналі спецыяльную фрачную кашулю з тонкага галандскага палатна. Зашпільвалася яна звычайна на перламутравыя гузікі. У канцы XIX ст. фрачная кашуля прышывалася з крухмальным каўняром з адагнёнымі вугламі. Каўнер такога кшталту называўся «альберт». Манжэты ў фрачнай кашулі зашпільваліся на залатыя або сярэбраныя запінкі, часам з брыльянтамі ці перлінамі. На званыя абеды, балі, у тэатр мужчыны павінны былі прыходзіць у другой палавіне XIX ст. ужо ў чорным фраку і белых пальчатках.

Да фрака належала апранаць яшчэ фрачную камізэльку з белага шаўковага піке і цыліндр. Камізэльку шылі аднабортнай або двубортнай, лацканы звычайна былі шалевыя. Гузікі прышывалі з косці, перламутру або фарфору. Мужчыны пажылогаўзросту насілі з фракам чорныя камізэлькі.

Сяляне з пагардай адносіліся да такога касцюма, у той час як да свайго адзення ставіліся з пачуццём уласнай годнасці, усведамляючы, што гэта прыкмета іх сацыяльнай прыналежнасці. Пачуцці селяніна вельмі трапна перадаў Францішак Багушэвіч у вершы «Не чурайся»:

> ... Не ўцякай ад маёй ты сярмягі —
> Мне не стыдна у ёй ані чуць, Вось
> твой храк я не меў бы адвагі, Чортаў
> храк на сябе апрануць. На кашулю
> глядзіш крывым вокам, Што у хаце
> мне бабы пашылі, Прапацела яна маім
> сокам, Цэлы тыдзень яе не памылі... А
> твая ж? як той снег, як папер, І пацеў
> хто, і ткаў, і бяліў, І хто шыў, і хто
> праў... а цяпер Ты той пот на сябе
> узваліў. І кашулі той мне было б
> стыдна, Што не сам на яе гараваў.
> Хоць бялейша яна — не завідна, — Не
> вазьму, каб ты мне й дараваў![105]

Такія ж адносіны да свайго традыцыйнага адзення захаваліся ў сялян Заходняй Беларусі яшчэ ў 1920-ыя гады. Рыбак у паэме Я. Коласа «Рыбакова хата», напрыклад, аддае перавагу свайму «брылю» перад панскім капелюшом:

> Няхай сабе ён стары,
> З аржаной саломы,
> Мы ж даўно ўжо з ім сябры
> І даўно знаёмы.
> Я на панскі капялюш
> Брыль свой не змяняю[106].

У першыя дзесяцігоддзі XIX ст. у гарадах Беларусі пашыраецца новы тып плечавога мужчынскага



**Гарадскі касцюм з сурдутам.** Гомель. Канец XIX — пачатак XX ст.

адзення — сурдут (сюртук). Назва яго мае французскае паходжанне і ўтварылася ад слова 5iiПoiП — зверху (паверх) усяго. Спачатку сурдут быў вулічнай вопраткай з доўгімі, амаль да каленяў поламі, у талію і з адкладным каўняром. Даўжыня сурдута і месца таліі (вышэй або ніжэй натуральнай лініі, а таксама форма рукава) залежалі ад моды[107].

Паступова фрак стаў лічыцца афіцыйнай і парадкай вопраткай, а сурдут ператварыўся ў святочнае і паўсядзённае адзенне гарадскіх чыноўнікаў, купцоў, інтэлігенцыі. Шылі сурдуты двубортнымі і аднабортнымі, прыталенымі, адразнымі па таліі. «Спадніца» сурдута рабілася звычайна расклёшанай, ззаду са шліцай і дзвюма складкамі ў цэнтры, унутры якіх хаваліся кішэні (па адной у кожнай фалдзе). Грудзі і спінка падбіваліся ватай або шарсцянымі ачосамі[108].

Як і ў фракаў, лацканы сурдутаў абшываліся шоўкам або шаўковай тасьмой, а часам такой жа тась-мой абшывалі яшчэ барты і разрэз ззаду. На працягу ўсяго XIX ст. спінка сурдутаў кроілася з чатырох дэталяў са швом па цэнтру, дзякуючы чаму дасяга-лася максімальнае абляганне фігуры. Як і фрак, сурдут зашпільваўся толькі да таліі на гузікі, абцяг-нутыя шаўковай тасьмой.

Сурдут уваходзіў у комплекс вясельнага касцю-ма прадстаўнікоў маёмасных слаёў гараджан Бела-русі ў канцы XIX — пачатку XX ст. Вясельныя сур-дуты шылі доўгімі, крыху ніжэй за калені. Апраналі іх абавязкова ў спалучэнні з тонкай белай крухмаль-най кашуляй, белым гальштукам і белымі лайка-вымі пальчаткамі.

Крой і даўжыня сурдутаў вагаліся адпаведна модзе. У Расійскім этнаграфічным музеі г. Санкт-Пецярбурга захоўваюцца два сурдуты мяшчан г. Магілёва канца XIX — пачатку XX ст. Першы пашыты з



**Касцюм з сурдутам.** Гомель. Канец XIX — пачатак XX ст.

шэрага фабрычнага сукна на ваце і клятчастай фланелевай падкладцы ў талію. Спінка суцэльная, бакі і полы адразныя, каўнер і лацканы адкладныя. Зашпільваецца спераду на любы бок на тры гузікі, рукавы прамыя з фальшывым абшлагам. Ззаду ніжэй пояса зроблена прарэха і на лініі таліі прышыты два гузікі. Даўжыня ніжэй калена[109]. Другі сурдут «падвяночны», пашыты такім жа фасонам з чорнага фабрычнага сукна на баваўнянай клятчастай падкладцы фабрычнага вырабу. Каўнер, лацканы, абшлагі і прарэха абшыты ў ім чорнай баваўнянай стужачкай[110].

Па меры таго як фрак ператвараўся ў прадстаўнічае і бальнае адзенне, сурдут станавіўся той вопраткай, у якой хадзілі ў госці, з візітамі і на званыя вечары. Такія сурдуты наогул не мелі спераду засцежак, а насіліся на камізэльку незашпіленымі. Камізэльку рабілі двубортнай або аднабортнай з сукна, шоўку, аксаміту. Пад камізэльку апраналі белую крухмальную кашулю альбо манішку. Каўнер кашулі павязвалі шаўковым мяккім гальштукам-касынкай або гальштукам-матыльком.

Паступова полы сурдута ўкарочваліся, і ён стаў правобразам сучаснага пінжака. На Беларусі сурдуты ў пачатку XX ст. былі яшчэ доўгімі, мелі заніжаную талію, аб чым сведчыць сурдут гэтага часу, які захоўваецца ў фондах Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея. Сурдут двубортны, прыталены, пашыты з фабрычнага чорнага сукна. Лінія таліі плаўна заніжана да цэнтра спераду і ззаду. Даўжыня полаў амаль да калена. Ніз сурдута («спадніца») расклёшаны. Ззаду па цэнтру знаходзіцца шліца, па абодвух баках якой заложана па адной глыбокай складцы. Унутры кожнай складкі схавана кішэня. Плечавы шоў скошаны на спінку. Раскрой спінкі тыповы, на лініі таліі прышыты два абцягнутыя шоўкам гузікі. Каўнер і лацканы прылягаючыя, рукавы прамыя, на ўзроўні манжэт невялічкія шлічкі з трыма абцягнутымі шоўкам гузікамі. Спераду да таліі сурдут зашпільваўся на 4 (у два рады) абцяжныя гузікі.

З другой палавіны XIX ст. плечавое хатняе і вулічнае мужчынскае адзенне пачалі шыць з каляровых тканін. Характэрнымі колерамі (пры панаванні чорных фракаў і сурдутаў) сталі шэрыя, залаціста-бежавыя і серабрыста-шэрыя адценкі, звычайна аднатонныя, пазней з'явіліся тканіны з дробным цёмным каляровым рубчыкам, ці паскай[111].

Сурдут быў выцеснены сучасным касцюмам з пінжаком у пачатку першай сусветнай вайны, а фрак стаў канцэртным адзеннем артыстаў і музыкантаў, афіцыянтаў дарагіх рэстаранаў.

У канцы XIX ст. у мужчынскай модзе вышэйшых саслоўяў Расійскай імперыі пашыраецца смокінг — выхадны касцюм з аднабортным або двубортным пінжаком і прамымі без адваротаў штанамі. Асаблівасцю пінжака смокінга з'яўляюцца вельмі адкры-



**Вясельны сурдут.** Мазыр. Канец XIX — пачатак XX **ст.**

**Крой сурдута.** Канец XIX — пачатак XX ст.






**Гарадскі касцюм.** Віцебск. Пачатак XX ст




**Гарадскі святочны касцюм з пінжаком.** Гомель. Пачатак XX ст.



**Дачныя касцюмы гараджан.** Пачатак XX ст.



**Кашуля э каўняром «альберт».** Гомель. Канец XIX — пачатак XX ст.

тыя грудзі, доўпя шалявыя лацканы, якія звычайна абшываюцца шоўкам, і шаўковая падкладка[112]. Як святочны касцюм для ўрачыстых свецкіх прыёмаў смокінг выкарыстоўваецца да цяперашняга часу.

Лёгкая кашуля, па крою падобная да сучаснай, пачала ўваходзіць у абіход вышэйшага саслоўя і гарадской вярхушкі на Беларусі ў пачатку XIX ст. Лічыцца, што яна з'явілася ў Англіі і яе паходжанне звязана з англійскім дэндзізмам, прэтэндаваўшым на арыстакратызм у побыце. Такія кашулі шылі з тонкага палатна або батысту белага колеру з гладкімі манжэтамі. Манішку аздаблялі гафрыраваным жабо, вышыўкай белымі шаўковымі ніткамі або застрочвалі драбнюсенькімі складачкамі ўздоўж засцежкі. Абавязковым дапаўненнем да такой кашулі служыў белы шаўковы або з накрухмаленага батысту гальштук з разрэзанага па дыяганалі кавалка тканіны, а ў асоба ўрачыстых выпадках — чорны атласны. Тыднёвы запас кашуль свецкага мужчыны ў сярэдзіне XIX ст. складаў 20 кашуль і 30 гальштукаў.

У канцы XIX ст. у гарадскую моду ўвайшлі кашуля, да якой прышпільваліся манішка, манжэты і каўняр. Такія кашулі сталі насіць чыноўнікі, духавенства, студэнты і гарадская інтэлігенцыя. На святы іх апраналі і гарадскія рабочыя. Адзенне біднейшых слаёў гараджан спалучала рысы народнага і гарадскога касцюмаў.

Традыцыйны народны касцюм, які этнографы назіралі ў канцы XIX — пачатку 50-ых гг. XX ст., склаўся толькі к сярэдзіне XIX ст. Захаваўшы шмат рысаў старога касцюма, ён уключыў і новыя рысы і формы, да таго яму не характэрныя. Гэтыя новыя рысы былі так перапрацаваны ў духу традыцыі, што зрабіліся арганічнай часткай нацыянальнага касцюма беларусаў у яго непаўторнай цэласнасці.

Н. І. Лебедзева, якая ў 1930 г. абследавала вёскі Лельчыцкага і былога Тураўскага раёнаў Мазырскай акругі па правым берагу ракі Прыпяці і яе прытоках, апісала і замалявала ў в. Бяседкі мужчынскую кашулю 60-ых гг. XIX ст. Кашуля гэта была тунікападобнага крою, пашытая «калошкай» з4 полак даматканага палатна, даўжынёй да каленяў і з доўгімі прамымі рукавамі без манжэтаў. Пад пахамі ўстаўлены квадратныя ўстаўкі «ластаўкі». Кашуля



**Гарадскі касцюм.** Віцебск. Канец XIX — пачатак XX ст.

**Касцюм сялян з-пад Пухавіч Мінскай губерні.** Канец XIX — пачатак XX ст.



мела прамы разрэз вората, без каўняра, па падоле затканая чырвонымі ніткамі і з «раствой» — невя-лічкай пляцёнкай у месцах сшыву палотнішчаў на падоле. Такія ж кашулі, як паведаміў Н. І. Лебедзе-вай 95-гадовы стары, насілі да адмены прыгону і ў вёсцы Грабава. Але ўжо перад вызваленнем сяляне сталі насіць другога тыпу кашулі, так званыя «са-рочкі з вустаўкамі» (палікамі)"[3].

Такім чынам, з другой паловы XIX ст. тунікапа-добная кашуля ў беларускіх сялян стала выцясняц-ца кашуляй з палікамі, якая была вядома таксама са старажытнасці. Асаблівасць крою гэтага тыпу муж-чынскай кашулі — наяўнасць прамых плечавых ус-тавак («палікаў», «вуставак»). Разрэз у такіх кашу-лях заўжды рабіўся пасярэдзіне грудзіны, глыбінёй прыблізна 30 см. Вакол вората тканіна збіралася ў дробныя зборачкі, да якіх прышывалі адкладны або невысокі стаячы каўнер з прарэзкамі на канцах, дзе воратсарочкі завязваўся прадзетай у гэтыя прарэзкі каляровай стужкай («акрайкаю») або зашпільваўся металічнай запінкай («шпонкаю»). Пад пахамі для зручнасці рухаў ушывалі квадратныя палатняныя ўстаўкі («цвіклі», «ластаўкі», «падручнікі»). Рукавы рабіліся простыя або з манжэтамі («каўнерцамі», «чухлікамі», «манкетамі»), ля якіх тканіна таксама прызборвалася ўдробныя зборачкі. Святочныя і вя-сельныя кашулі аздабляліся па каўняры, манішцы, канцах рукавоў, падоле, затканым або вышытым крыжыкам узорам баваўнянымі чырвонымі ніткамі, з невялікім увядзеннем нітак чорнага колеру.

Найбольш шырока кашулі з палікамі ў канцы XIX — пачатку XX ст. былі распаўсюджаны на Па-лессі"[4]. Памеркаванню Г. С. Маславай, пакрой муж-чынскай кашулі з прамавугольнымі ўстаўкамі мож-



**Кашуля з палікамі з адбеленага льнянога палатна.** Вёска Аніскавічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. 1920-ыя **гг.** Малюнак С. Гунько

на лічыць агульнаславянскім, таму што апрача беларусаў, рускіх і украінцаў яна вядома чэхам і палякам"[5]. На захадзе Беларусі ў беларуска-польскай этнакантактнай зоне палікі называліся «прырамкамі» — тэрмінам, запазычаным у палякаў.

На тэрыторыі былых Суражскага, Віцебскага, Полацкага, Дрысенскага, Лепельскага, Люцынскага і Гарадоцкага паветаў Віцебскай губерні ў канцы XIX ст. поруч з тунікападобнай кашуляй з адкладным каўняром бытавала рускага тыпу кашуля з нізкім стаячым каўняром і касым разрэзам вората або без каўняра з устаўленымі пад рукавамі квадратнымі ўстаўкамі («палікамі») з кумача або якой-небудзь каляровай даматканкі. Калі ў такой кашулі не было каўняра, то ворат і шыйны выраз абшывалі рознакаляровай тасьмой (спалучэнне сініх, белых, чырвоных нітак). Такога тыпу кашуля называлася «сароцкай» у адрозненне ад кашулі з адкладным каўняром і разрэзам пасярэдзіне грудзіны, якая зва-



**Касцюм сялян э ваколіц Віцебска.** Пачатак XX ст.

лася «кашуляй». «Сароцка» заўжды насілася навыпуск у адрозненне ад «кашулі», якая часам запраўлялася ў «майткі» — штаны з паясной абшыўкай[116]. Пад уплывам гарадской культуры ў сялянскую моду ў канцы XIX ст. уваходзіць кашуля на какетцы («гестцы»). Спачатку яе стала насіць моладзь, але з цягам часу такога тыпу кашуля набыла шырокае распаўсюджанне і ў сталых гаспадароў. Кашулі на гестцы шыліся з даматканага палатна, адразнымі па спіне на ўзроўні проймы рукавоў, пад якія ўстаўляліся ластавіцы («цвіклі») квадратнай формы. Ніжняя адразная частка кашулі за кошт бакавых кліноў была больш шырокай і таму пры прышыванні да гесткі збіралася ў дробныя зборачкі ці закладвалася па цэнтру ва ўнутраную складку. У кашулях з фабрычнай тканіны часам гестка рабілася і спераду.

**Кашуля на «гестцы».** Вёска Бабцы Бягомльскага раёна



Мінскай вобласці. 1930-ыя гг. Малюнак С. Гунько

На Віцебшчыне ў другой палавіне XIX ст. бытаваў яшчэ адзін тып мужчынскай кашулі з вузкімі нашыўкамі на плячах — кашуля з «наплечнікамі»[117]. Наплечнікі былі чырвонага ці іншага колеру і нашываліся зверху плечавога шва ад каўняра да проймы рукавоў. Радзей іх нашывалі і на тунікападобную кашулю, якая не мела плечавых швоў. Гэта дало падставу Г. І. Дулебе лічыць яе разнавіднасцю кашулі тунікападобнага крою[118]. Такія тунікападобныя кашулі з нашытымі наплечнікамі бытавалі ва ўкраінцаў[119], палякаў і народаў Прыбалтыкі[120].

Картаграфаванне сялянскіх кашуль па крою паказала, што ў канцы XIX — пачатку XX ст. у асяроддзі беларускага вясковага насельніцтва бытавала некалькі тыпаў мужчынскай кашулі. Тунікападобныя кашулі ў гэты час пераважалі толькі на ўсходзе Беларусі, асабліва ў Быхаўскім, Чэрыкаўскім, Гомельскім паветах Магілёўскай губерні і Бабруйскім павеце Мінскай губерні[121]. Існавала некалькі варыянтаў кашуль: без каўняра з доўгімі прамымі рукавамі («галаплечка»); з адкладным каўняром і рукавамі на манжэтах; са стаячым каўняром і касым разрэзам вората злева і рукавамі на манжэтах (касаваротка).

Кашулю з палікамі паўсюдна на Палессі насілі старыя людзі яшчэ ў 1930 годзе[122]. Кашулі з касым разрэзам вората ў гэтым рэгіёне Беларусі сталі насіць толькі пасля першай сусветнай вайны[123].




Тыпы **святочных** мужчынскіх **кашуль.** 1920-
а) Маэырскі павет Мінскай губерні;
б) Слуцкі павет Мінскай губерні;
в) Брэсцкі павет Гродзенскай губерні;
г) Магілёўская губерня. Малюнкі С. Гунько



**Кашуля.** Г.п. Тураў Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. 1930-ыя гг.

Ззаду мужчынскія кашулі звычайна падшываліся да паловы спіны падшэўкай з той жа тканіны, якая называлася «падаплека», «подбілка».

Калі кашуля была з адкладным каўняром ці без яго, на шыю павязвалі невялікую хустачку (шырынку) таксама з палатна або пакупной тканіны. Але ў канцы XIX ст. іх шырынкі («шырынкі», «хусты») насілі ўжо толькі старыя[124].

Рабочыя кашулі, якія сяляне насілі у будні дзень, звычайна шылі з больш грубага палатна, ніяк не ўпрыгожваючы, але абавязкова да сярэдзіны спіны падшывалі «падаплеку» — каб менш праношвалася. Чыста белай, без упрыгожанняў, была і кашуля, падрыхтаваная на смерць[125].

У адрозненне ад штодзённых святочныя і вясельныя кашулі (якія рыхтавалі да вяселля сваім каханым дзяўчаты) упрыгожваліся тканым ці вышытым арнаментам на каўняры, пазусе, манжэтах, а часам і падоле.

Тканае ўпрыгожанне кашулі («ператыканне») яўляла сабой розную па шырыні паску геаметрычнага арнаменту, вытканага чырвонымі баваўнянымі ніткамі («забалаццю»). Вышыўка была па віду значна багацейшай і давала простар для фантазіі вышывальшчыц. Узоры вышывалі гладдзю ці простым крыжыкам чырвонымі баваўнянымі ніткамі з невялікім увядзеннем нітак чорнага колеру. На Беларусі быў распаўсюджаны як геаметрычны, так і раслінны арнамент з ружаў, валошак у спалучэнні з лісцямі. Дзякуючы прыроднаму густу, любові да свайго выбранніка і жаданню выказаць яму свае пачуцці святочныя і асабліва вясельныя кашулі ператвараліся ў спрытных і ўмелых руках беларускіх дзяўчат і жанчын у сапраўдныя мастацкія творы. Асабліва багата ўпрыгожвалася мужчынская кашуля-касаваротка, паколькі разрэз збоку даваў магчымасць вышываць не толькі стаячы каўнер, але і даволі шырокую манішку, якая звычайна была 10—



**Адзенне жабракоў.** Горад Петрыкаў Брэсцкай вобласці. Пачатак XX ст.



**Адзенне мяшчан і жабракоў.** Лірнікі на кірмашы ў Слуцку. 1909 г.

15 см шырынёй і 30—35 даўжынёй. З 1920-ых гг. на Палессі кашулі сталі ўпрыгожваць вышыўкай рознакаляровымі ніткамі. У Тураве і ваколіцах святочныя кашулі часта шылі чырвонага колеру.

З XVIII ст. на тэрыторыі паўночна-ўсходняй Віцебшчыны і ў некаторых мясцовасцях на Магілёўшчыне летняе асноўнае адзенне сялян дапаўнялася лёгкай палатнянай плечавой вопраткай, па крою падобнай да світы. У розных рэгіёнах гэта палатняная світка называлася «насоў», «кізель», «касталан», «шарапан». Яна выконвала ролю сучаснага пінжака, і зверху яе зімой апраналі суконную світу, а часам у мокры снег або адлігу насоў апраналі на кажушок, каб захаваць яго ад вільгаці.

У 1890 г. Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі разаслала па Беларусі анкету па народнаму касцюму беларусаў. Паказальна, што ўсе карэспандэнты, даслаўшыя адказы на пытанніанкеты(уасноўнымнастаўніківвясковыхшкол і святары), адзначалі ўжо значны ўплыў гарадскога касцюма на адзенне вясковых і местачковых жыхароў. Хаця мужчынскае адзенне сялян і выраблялася пераважна хатнім спосабам з даматканага палатна, сукна і паўсукна, але на святочную вопратку некаторыя куплялі ўжо паркаль, «парусіну» (баваўнянае палатно), мульт, «чартакож» (баваўняную тоўстую тканіну чорнага або цёмнага колеру), шылі верхняе адзенне па ўзору гарадскога, насілі пашыраныя ў горадзе шапкі-фуражкі («казыры») і г. д.[126]

Настаўнік з вёскі Студзянец Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні, адказваючы на гэтую анке-




а) **Камізэлька.** Вёска Плеўцы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. 1930-ыя гг.;
б) **Камізэлька.** Вёска Самары Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. 1930-ыя гг.;
в) **Вязаная камізэлька.** Вёска Перабroддзе Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. 1920—1930-ыя гг. Малюнкі С. Гунько





**Традыцыйны касцюм селяніна.** З палатнянымі нагавіцамі. Вёска Барысаўшчына Глускага раёна Магілёўскай вобласці. Пачатак XX ст.

ту, пісаў, што палатно і хатняе сукно (белае, шэрае, чорнае) вырабляюцца хатнім спосабам, а паркаль, фабрычнае сукно і іншыя тканіны, «хусткі і кушакі» купляюцца сялянамі ў лаўках. Валеныя з воўны шапкі — «маргелкі», шыйныя хустачкі («шырынкі», «хусты») носяць толькі старыя людзі. Вясковая ж моладзь пачынае ўжо насіць сурдуты, камізэлькі, пінжакі[127].

Кашулі па традыцыі насілі навыпуск паверх шта-ноў, апяразваючы самаробным шарсцяным поясам. У Чачэрскай воласці Рагачоўскага павета Магілёў-скай губерні маладыя хлопцы зверху кашулі апра-налі безрукаўкі з «сініцы» (самаробнага сукна, афар-баванага ў сіні колер)[128]. Безрукаўкі ў сяле Галоўн-цах Гомельскага павета Магілёўскай губерні рабілі па гарадскому ўзору: перад чорнага колеру з самаробнага або фабрычнага сукна, а спінку з палатна, хаця шылі і поўнасцю чорныя[129].

Жыхары мястэчка Дрыбін Чавускага павета Магілёўскай губерні ў 1890 г. шылі адзенне з фабрычных тканін — каленкору, паркалю, сукна. Толькі нацельныя кашулі часам шылі здаматканага палатна, якое куплялі ў сялян з навакольных вёсак. Моцны ўплыў гарадскога касцюма на адзенне местачкоўцаў праяўляўся і ў нашэнні мужчынамі сурдутных пар, манішак, шаляў[130].

У канцы XIX — пачатку XX ст. быўдаволі пашыраным на Беларусі комплекс мужчынскага сялян-




**Тыпы мужчынскіх штаноў:**

а) з ромбавіднай устаўкай, Пружанскі павет, Гродзенская губерня. Канец XIX — пачатак XX ст.;

б, в) з дзвюма трохвугольнымі ўстаўкамі, адпаведна Мсціслаўскі і Быхаўскі паветы Магілёўскай губерні. Канец XIX — пачатак XX ст.;

г) з адной трохвугольнай устаўкай, Рэчыцкі павет Мінскай губерні. Канец XIX — пачатак XX ст.

скага адзення з безрукаўкай («жылеткай», «спанцэркай», «чулейкай»), асабліва на захадзе Гродзенскай губерні, паўднёвым усходзе Віленскай і захадзе Мінскай губерняў[131].

Картаграфаванне мужчынскіх сялянскіх безрукавак у залежнасці ад крою паказала, што ў канцы XIX — пачатку XX ст. яны былі двух тыпаў: прамыя і ў талію. Больш шырока на тэрыторыі Беларусі былі распаўсюджаны безрукаўкі прамога крою. Безрукаўкі абодвух тыпаў былі расхіснымі. Спераду яны мелі трохвугольны шыйны выраз, левая полка крыху заходзіла на правую і зашпільвалася на гузікі ці зрэдку на гаплікі. Спінка сшывалася з дзвюх полак, і іншы раз на ёй па лініі таліі прышываўся хлясцік. Спераду амаль усе безрукаўкі мелі невялічкія празныя кішэні. У паўночна-ўсходніх раёнах Беларусі сустракаліся вязаныя на спіцах з воўны нерасхісныя безрукаўкі, якія не мелі шырокага распаўсюджвання[132].

Паясным адзеннем беларускага вясковага насельніцтва ў сярэдзіне XIX — пачатку XX ст. засталіся штаны «летам з палатна, зімой з сукна, на ўчкуры. Гэта значыць, пастронкам сцягнутыя»[133], або на поясе («каўняры»). Шылі штаны звычайна з больш грубага, чым кашуля, даматканага палатна летам ці шэрага, чорнага, карычневага даматканага сукна зімой.

У традыцыйным паясным адзенні беларусаў на Палессі быў шырока распаўсюджаны тып штаноў, вядомы пад назвай «штаны з шырокім крокам», у мінулым вельмі пашыраны ва ўсіх славянскіх народаў. Такія штаны шылі без бакавых швоў і кішэняў. У верхняй частцы яны былі шырокімі, а калашыны да нізу звужаліся.

К. Машынскі так апісваў крой мужчынскіх сялянскіх нагавіц на Усходнім Палессі: «штаны пашыты з сукна ці тоўстага канаплянага палатна такім чынам, што калі сядзіш, яны моцна абвісаюць, утвараючы так званае «крэсло». Падпяразваюцца штаны тоўстай вяроўкай (учкур) альбо раменьчыкам, які прапускаецца праз утулку ў верхні заложаны край штаноў. Кашуля і палатняныя штаны ствараюць поўны летні строй палешука»[134].

Кроілі штаны, злажыўшы адрэзаны для кожнай калашыны («калошвы») кусок тканіны ўдвая па даўжыні. Затым ад ніжняй часткі калашын адразалі клінападобныя кавалкі, каб яны звужаліся да нізу. Па даўжыні штаны з-за эканоміі тканіны не даходзілі да шчыкалаткі, бо знізу ногі да паловы галенкі абкручвалі анучамі ці суконкамі, на якія абувалі лапці або (зрэдку) боты. «Мужчыны заўсёды носяцьсвае нагавіцы ніжэй поясу, набёдрах, — пісаў І. А. Сербаў у 1910 г., — таму яны па даўжыні даходзяцьусягода 1$^{1}/_{4}$арш. Гледзячы на гэтыя вузенькія і кароценькія нагавіцы, проста трудна аднесці іх да звычайных штаноў для дарослага чалавека»[135].

Уверсе між «калошваў» для зручнасці хадзьбы рабіліся ўстаўкі ці кліны, якія ўтваралі «крэс-ла» («агуззе», «усесла», «дно», «садно», «гузенне»). Н. І. Лебедзева ў экспедыцыі 1930 г. замалявала старадаўняга крою штаны, якія насілі вельмі старыя людзі на Палессі ў вёсках Грабава і Радзівілавічы, недалёка ад Турава (Гомельская вобласць). Сшытыя з белага даматканага палатна, яны мацаваліся на бёдрах з дапамогаю шнура (учкура), прадзетага ў верхні загнуты край штаноў, і не мелі спераду разрэза. Для зручнасці рухаў ад учкура да нізу калашын у іх былі ўстаўлены трохвугольныя кліны, зробленыя з аднаго перакошанага па дыяганалі палотнішча. Больш позні варыянт гэтых штаноў — «штаны на каўняры», такога ж крою, але з поясам-абшэўкай[136], які зашпільваўся на гузік або драўляную палачку («шпонку»), і разрэзам спераду. Штаны з поясам на Палессі і Віцебшчыне называліся «каўняровымі»[137].



**Сялянскі касцюм.**
Вёска Хамінка
Касцюковіцкага раёна
Магілёўскай вобласці.
1920-ыя гг.

Формы кліноў і ўставак, спосабы, якімі іх ушывалі між калашын, былі самымі разнастайнымі. Яны залежалі як ад традыцыі, прынятай у дадзенай мясцовасці, так і ад шырыні палатна, фантазіі майстрыхі. Так, калі ў Грабаве, Радзівілавічах, Тонежы крэсла ў штанах рабілі з двух трохвугольных кліноў, то ў вёсцы Пухавічы бралі прамавугольны кавалак тканіны, перагнуты ўпоперак, і ўшывалі між калашын[138].

Картаграфаванне беларускага народнага адзення канца XIX — пачатку XX ст. паказала, што на Беларусі ў той перыяд найбольш пашыранымі былі штаны з ромбападобнай (ці квадратнай) устаўкай, з двума трохвугольнымі клінамі, штаны з адной трохвугольнай устаўкай.

Штаны з ромбападобнай устаўкай між калашын былі вядомы амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Устаўка ўяўляла сабой квадратны кавалак палатна адпаведнай велічыні, які ўшываўся ў штаніны вуглами[139].

Штаны з двума трохвугольнымі клінамі таксама мелі паўсюднае пашырэнне, але часцей сустракаліся на Магілёўшчыне. Кліны ўшываліся двума спосабамі. Найбольш старажытны спосаб — калі кліны вострымі вугламі ўшываліся ўверх і ў некаторых выпадках даходзілі да пояса штаноў. У пачатку XX ст. шырокае распаўсюджанне атрымаў спосаб, калі трохвугольныя кліны сталі ўшываць вострымі вугламі ў штаніны[140].

Больш лакальным было распаўсюджанне штаноў з трохвугольнай устаўкай, да асновы якой прышываўся кавалак тканіны прамавугольнай формы. Штаны такога тыпу шылі пераважна ў Клімавіцкім, Рагачоўскім, Горацкім паветах Магілёўскай губерні, Пінскім, Мазырскім, Рэчыцкім паветах Мінскай губерні і Ваўкавыскім і Кобрынскім паветах Гродзенскай губерні[141].

У пачатку XX ст. у паўднёва-ўсходняй частцы Віцебскай губерні зрэдку (як архаічны тып) сустракаліся штаны з круглай устаўкай. Яны былі вельмі

**Касцюм з пінжаком тыпу фрэнча са штанамі-галіфэ.**
Мінск. 1920-ыя гг.



шырокімі ў кроку, таму, па меркаванню Г. М. Курыловіч, іх называлі «крокламі», «кроквамі»[142].

Штаны ўсіх тыпаў у канцы XIX — пачатку XX ст. у традыцыйным сялянскім касцюме шыліся на поясе (каўняры), мелі спераду разрэз («пазуху», «кятурку», «калітку»). Пояс штаноў шырынёй прыкладна 3—4 см зашпільваўся на касцяныя, металічныя або самаробныя гузікі ці драўляную палачку. Штаны на ўчкуры, які працягваўся ў паясні́чную абшыўку, былі характэрны для больш ранняга перыяду і ў канцы XIX — пачатку XX ст. сустракаліся ў асноўным на Палессі[143]. У гэты перыяд белыя палатняныя штаны насілі ўжо пераважна мужчыны пажылога ўзросту. Больш маладыя апраналі штаны з афарбаванага палатна, часам вытканага ў паскі або клеткі, дзе белыя ніткі перамяжоўваліся з шэрымі ці чорнымі. У такіх штанах сталі рабіць праразныя кішэні.

Зімой зверху палатняных штаноў апраналі з самаробнага сукна ці паўсукна штаны такога ж крою, што і палатняныя. Часам хатняга вырабу сукно для святочных штаноў фарбавалі ў чорны або карычневы колер.

Штаны сучаснага фігурнага крою без уставак між калашын у гарадах Беларусі сталі насіць у сярэдзіне XIX ст. Гарадскія вярхі насілі іх навыпуск зверху чаравікаў, паўчаравікаў, ботаў, а гарадскія рабочыя і купцы пераважна запраўленымі ў боты. Такія штаны былі ўверсе вузкімі, пояс і шырынка зашпільваліся на гузікі. Пад уплывам сувязей з горадам штаны фігурнага крою ў пачатку стагоддзя — 1920-ых гг. стала насіць моладзь з маёмасных сем'яў у прылягаючых да горада мясцовасцях.

У канцы XIX ст. у гарадской модзе стала папулярным рабіць на нізе калашын штаноў адвароты, а ў пачатку XX ст. на калашынах сталі запрасоўваць складкі.

Трэба адзначыць, што змены ў сялянскім мужчынскім адзенні ішлі больш шпарка, чым у жаночым. Гэта абумоўлівалася тым, што мужчыны, якія хадзілі на заробкі ў Пецярбург і іншыя вялікія гарады, шахты Данбаса, сплаў лесу, адрываліся ад традыцыйнага асяроддзя і далучаліся да гарадской і іншанацыянальнай культуры.

Пасля першай сусветнай вайны сярод гарадскога і вясковага насельніцтва ў якасці рабочага адзення сталі шырока выкарыстоўвацца ваенныя кашулі-гімнасцёркі. Узаконеная ў расійскай арміі ў 1882—1884 гг., гімнасцёрка да 1908 г. была белага колеру, затым стала травяніста-зялёнай, бо ў час руска-японскай вайны 1904—1905 гг. служыла добрай мішэнню для японцаў. Гімнасцёркі прынеслі ў гарады і вёскі прыйшоўшыя з франтоў грамадзянскай вайны салдаты, а эканамічная разруха ў паслярэвалюцыйныя гады садзейнічала захаванню яе ў 1920-ыя гг. і пасля Вялікай Айчыннай вайны.



**Адзенне вясковай моладзі.** Вёска Нежын Любанскага раёна Мінскай вобласці. 1949 г.



**Касцюм гарадской моладзі.**
Мінск. 1970-ыя гг.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі стаў хутка рас-паўсюджвацца новы від плечавой вопраткі, які ат-рымаў назву фрэнча. Фрэнч — суконная куртка ваеннага ўзору з чатырма вялікімі накладнымі кішэ-нямі, якую часта насілі падпяразваючы рэмнем. Назву яна атрымала ад генерала Фрэнча, які каман-даваў англійскімі экспедыцыйнымі войскамі ў Фран-цыіў 1914-1915 гг.

Разам са скуранымі курткамі, фрэнчамі і гімнас-цёркамі ў 1920— 1930-ыя гг. сярод работнікаў пар-тыйна-савецкага апарата, сельскіх актывістаў і кам-самольцаў увайшлі ў моду штаны-галіфэ. Шырокія ў бёдрах і вузкія ў каленках, яны шчыльна аблягалі ногі ад каленяў да шчыкалаткі. Гэты своеасаблівы паўваенны касцюм карыстаўся асобай папулярнас-цю сярод партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых работнікаўда канца 1950-ых гг.

3 сярэдзіны 1960-ых гг. у гарадскую моду ўвай-шлі джынсы — штаны з трывалай тканіны з узмоц-ненымі двайной строчкай швамі і металічнымі за-клёпкамі на бакавых і задніх кішэнях. Лічыцца, што іх правобразам былі штаны амерыканскіх стараце-ляў, фермераў і каўбояў. Упершыню выраб такіх штаноў з моцнай тканіны, якая выкарыстоўвалася на ветразі і называлася <^еап8» у сярэдзіне XIX ст. наладзіў эмігрант з Баварыі Леві Штраус (Ьеуі 5ігацз5). Дзякуючы трываласці і практычнасці яны хутка ўвайшлі ў маладзёжную моду, а затым атры-малі пашырэнне сярод усіх груп гарадскога і сель-скага насельніцтва.

Эвалюцыя сучаснага мужчынскага плечавога і паяснога адзення на Беларусі ў апошнія дзесяці-годдзі праходзіць ва ўмовах высокага ўзроўню раз-віцця сродкаў масавай інфармацыі і інтэнсіўных усебаковых міжэтнічных кантактаў і ўзаемаўплы-ваў, дзякуючы чаму ідзе ў агульным рэчышчы еўра-пейскай і сусветнай моды.

[1] Рабаданова Л. И. Названия одежды, головных уборов и материалов для их изготовления в памятниках старобе лорусской письменности. Автореф. дис. ... канд. филол. н. Мн., 1991. С. 17.

[2] Рыбаков Б. А. Древние русы // Советская археология. 1953. XVII. С. 76-79.

[3] Маслова Г. С. Народная одежда русских, украинцев и белорусов в XIX — начале XX в. // Восточнославянский этнографический сборник. Очерки народной материаль ной культуры русских, украинцев и белорусов в XIX — начале XX в. М., 1956. С. 580.

[4] Слава М. К. Культурно-исторические связи прибал тийских народов по данным одежды. М., 1964. С. 3.

[5] Белицер В. Н. Народная одежда удмуртов. М., 1951. С. 40; яе ж: Народная одежда мордвы. М., 1973. С. 25.

[6] Гаджиева С. Ш. Одежда народов Дагестана XIX — нача ла XX в. М., 1981. С. 36.

[7] Арциховский А. В. Одежда // История культуры Древ ней Руси. Домонгольский период. Т. I. Материальная культура. М. - Л., 1948. С. 235.

[8] Маслова Г. С. Народная одежда русских, украинцев и белоруссов. С. 578—580.

[9] Громов Г. Г. Одежда // Очерки русской культуры XVI в. М., 1977. Ч. I. С. 203.

[10] Малчанава Л. А. Жаночы касцюм // Беларускае народ нее аддзенне. Мн., 1975. С. 14.

[1] Маслова Г. С. Народная одежда в восточнославянских традиционных обычаях и обрядах XIX — начала XX в. М., 1984. С. 41.

[12] Бромлей Ю. В., Подольный Р. Г. Создано человече ством. М., 1984. С. 101.

[13] Курыловіч Г. М. Мужчынскі касцюм // Беларускае народнае адзенне. Мн., 1975. С. 51.

[14] ДучыцЛ. У. Касцюм жыхароў Беларусі Х—XIII стст. С. 11.

[15] ДучыцЛ. Касцюм на Магілёўшчыне ў Х—XIII стст. (па археалагічных дадзеных) // Прыдняпроўе (Паведамленні навуковай абласной краязнаўчай канферэнцыі. 28 кастрычніка 1992 г.). Магілёў. 1993. С. 30.

[16] История костюма, составленная Наталией Будур. М., 2002. С. 414.

[17] Там жа. С. 420.

[18] Рабинович М. Г. Очерки материальной культуры рус ского феодального города. М., 1988. С. 125.

" Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии. Кн. 2. Могилев на Днепре, 1884. С. 358. [20]АСД. Т. 3. С. 305, 312.

[21] Там жа. С. 313.

[22] Там жа. С. 311,321.

[23] Там жа. С. 298.

[24]Тамжа. С. 321.

"Тамжа. С. 313.

[26] Там жа. С. 311.

[27] Там жа. С. 299.

[28] Тамжа. С. 311, 316, 321.

"Тамжа. С. 313.

[30] Тамжа. С. 316.

[31] Там жа. С. 297.

[32] Мерцалова М. Н. Костюм разных времен и народов: В 4 т. М., 1996. Т. 2. С. 324-325.

[33] Gutkowska-Rychlewska. M. Historia ubiorow. Wroclaw — Warszawa - Krak6w, 1968. C. 314, 334, 345, 386.

[34] Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilusirowana. T. IV. Warszawa, 1978. C 195.

[35] Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею для разбора древних актов. Т. XXXVI. С. 23. (Далей АВАК).

[36] Там жа. Т. XXXI. С. 45.

[37] АВАК. Т. XIV С. 261.

[38] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при уп равлении Виленского учебного округа. Вильна. Т. 3. 1867. С. 312. (Далей АСД).

[39] Там жа. С. 299.

[40] Тамжа. С. 303, 312.

[41] Там жа. Т. 4. С. 226.

[42] Там жа. С. 229.

[43] Тамжа. Т. XXXVI. С. 152.

[44] АСД. Т. 4. 1867. С. 228.

[45] Рабаданова Л. И. Названия одежды, головных убо ров... Автореф. дис. С. 19.

[46] Там жа. Названия одежды, головных уборов и матери алов для их изготовления в памятниках старобелорус ской письменности. Дис. ... канд. филол. н. Рукопись. С. ПО.

[47] АВАК. Т. XXI. С. 194.

[48] Литовская метрика. Книга судных дел // Русская исто рическая библиотека. Т. XX. СПб., 1903. С. 741.

[49] АВАК. Т. XXII. С. 150.

[50] Козырев И. С. Очерки по сравнительно-исторической лексикологии русского и белорусского языков. Орел, 1970. С. 76.

[51] Акты, относящиеся к истории Западной России. СПб., 1846. Т. 1. С. 31.

[52] АВАК. Т. XXI. С. 232.

"Тамжа. С. 219.

[54] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хра нящихся в Центральном архиве в Витебске. Вып. XI. Витебск, 1876. С. 53. (Далей И ЮМ).

[55] Там жа. С. 37.

[56] АВАК. Т. XX. С. 141.

[57] ИЮМ. Вып. I. С. 234.

[58] АВАК. Т. XXXIX. С. 543.

[59] Тамжа. Т. XXXVI. С. 152.

[60] ИЮМ. Вып. VII. С. 81.

[61] Там жа. Вып. XI. С. 54.
[62] АВАК. Т. XVII. С. 415.
[63] Там жа. Т. XXI. С. 232.
[64] Там жа. Т. XX. С. 136.
[65] Там жа. Т. VIII. С. 504.
[66] Там жа. Т. XIII. С. 318.
[67] Там жа.
[68] Там жа. Т. 14. С. 261.
[69] Там жа. Т. XIV. С. 274.
[70] АСД. Т. 4. С. 228-229.
[71] АВАК. Т. XIV С. 261.
[72] Акты Юго-Западной России. Т. 14. М., 1886. С. 845—846. (Далей АЮЗР).
[73] АВАК. Т. VIII. С. 485.
[74]Тамжа. Т. XVII. С. 681.
[75] Там жа. Т. XIII. С. 318.
[76] Там жа. Т. XIV. С. 261.
[77] Там жа. Т. XX. С. 135.
[78] ИЮМ. Вып. 13. С. 55.
[79] АВАК. Т. XIV С. 261.
[80] АСД. Т. 4. С. 228.
[81] Там жа. С. 229.
[82] АВАК. Т. II. С. 220.
[83] Там жа. Т. XX. С. 136.
[84] Там жа. Т. XIV С. 261.
[85] Там жа.
[86] АСД. Т. 3. 1867. С. 98.
[87] Беларускі архіў. 1928. Т. 2. С. 260—261.
[88] АВАК. Т. XVII. С. 57.
[89] Там жа. Т. XX. С. 136.
[90] Там жа.
[91] Там жа. Т. XIV. С. 262.
[92] Там жа. Т. XVII. С. 415.
[93] Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. T. III. Warszawa, 1978. С. 79.
[94] Горбачевский Н. Н. Словарь древнего актового языка Северо-Западного края и Царства Польского. Вильна, 1874. С. 188.
[95] Воспоминания Фаддея Булгарина. Отрывки из виден ного, слышанного и испытанного в жизни. Ч. 1. Спб., 1846. С. 36.
[96] Міцкевіч А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве. Пераклад Я. Семяжона. М., 1985. С. 183.
[97] Там жа. С. 195.
[98] АВАК. Т. XIII. С. 327.
[99] Міцкевіч А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве. С. 23.
[100] Там жа. С. 362.
[101] Кирсанова Р. М. Сценический костюм и театральная публика в России XIX века. Калининград, 2001. С. 350.
[102] Грибоедов А. С. Горе от ума // Грибоедов А. С. Сочи
нения. М., 1985. С. 118.
[103] Там жа. С. 353.
[104] Там жа. С. 353-354.
[105] Францішак Багушэвіч. Выбраныя творы. Мн., 1952. С. 110-111.
[106] Якуб Колас. Т. 8. С. 232.
[107] Кирсанова Р. М. Сценический костюм. С. 318.
[108] Алешина Т. С. Городская одежда средних классов в России // Для памяти потомству своему... Народный бытовой портрет в России. М., 1993. С. 48.
[109] Российский Этнографический музей, г. Санкт-Петер
бург, инв. № 40-46-24
С-52
[110] Там жа, инв. 40-46-25
мех. ил. шк. 15 "' Кирсанова Р. М.
Сценический костюм. С. 322.
[112]Буровик К. А. Красная книга вещей. М., 1996. С. 51.
[113]Лебедева Н. И. Материальная культура Белорусской ССР в 1930 году (Туровский и Лельчицкий районы Мо-
зырского округа по правому берегу р. Припяти и ее при
токам). Рукопись // Государственный литературный музей (г. Москва). Инв. № 21. С. 39.
[114]Курыловіч Г. М. Мужчынскі касцюм. С. 47.
[115]Маслова Г. С. Народная одежда русских, украинцев и
белорусов в XIX — начале XX в. // Восточнославянский
этнографический сборник. С. 585.
[116]Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 3. СПб., 1902. С. 40-41.
[117]Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного жи тья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предме тов обиходности (этнографические данные). Витебск, 1895. С. 103.
[118]Дулебо Г. Одяг білоруськйх селян // Народна творчість
та етнографія. 1971. № 2. С. 88.
[119]Лебедева А. А. Одежда северо-западных, западных и
южных губерний // Крестьянская одежда населения Ев ропейской России (XIX — начало XX в.). М., 1971. С. 106.
[120]Слава М. К. Культурно-исторические связи прибал тийских народов по данным одежды. С. 3—4.
[121] Курыловіч Г. М. Мужчынскі касцюм. С. 46.
[122]Лебедева Н. И. Материальная культура Белорусской ССР в 1930 году. С. 41.
[123]Там жа. С. 42.
[124] Научный архив Института этнологии и антрополо гии им. Н. Н. Миклухо-Маклая РАН, г. Москва. Фонд Общества любителей естествознания, антропологии и этнографии (далей ОЛЕАЭ), спр. 43, л. 3.
[125] Грынблат М. Я. Беларусы. Мн., 1968. С. 225.

[126] Научный архив Института этнологии и антрополо гии им. Н. Н. Миклухо-Маклая РАН, г. Москва. Фонд ОЛЕАЭ, спр. 43, лл. 1 — 15 адв.

[127] Там жа, лл. 2—3 адв.

[128] Там жа, л. 9.

[129] Там жа, л. 11.

[130] Там жа, л. 6.

[131] Курыловіч Г. М. Мужчынскі касцюм. С. 53.

[132] Там жа.

[133] Tyszkiewicz E. Opisanie powiatu Borysowskiego. Wilno, 1847. С. 116.

[134] Moszynski K. Polesie Wshodnie. Warzawa, 1928. С 100.

[135] Сербаў I. А. Вічынскія паляне. — Зборнік артыкулаў. Этнаграфія, антрапалогія, псіхалогія, псыхотэхніка і навуковая арганізацыя працы. Пісторыя мастацтва. Інбелкульт. Мн., 1928. С 31.

[136] Лебедева Н. И. Материальная культура Белорусской ССР в 1930 году. С. 183.

[137] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного жи тья-бытья в Витебской Белоруссии. С. 106.

[138] Лебедева Н. И. Материальная культура Белорусской ССР в 1930 году. С. 182-183.

[139] Курыловіч Г. М. Мужчынскі касцюм. С. 49.

[140] Там жа. С. 50.

[141] Там жа.

[142] Там жа.

[143] Там жа. С. 51.

# Глава 4 Верхняе адзенне



Мужчынская верхняя вопратка, як і касцюм у цэлым, адпавядала пэўнаму ўзроўню саслоўнай і ўнутрысаслоўнай іерархічнай лесвіцы, на вяршыні якой быў князь. Касцюм беларускіх князёў і іх наближаных адлюстроўваў веліч і багацце дзяржавы. У ім спалучалася імкненне да раскошы, дэкаратыўнасці касцюма ў цэлым, ювелірных упрыгожанняў праз выкарыстанне дарагіх тканін (павалака, аксаміт, ядваб'е (шоўк). Вельмі важную ролю адыгрывала сістэма сімвалаў, паводле якой ствараўся касцюм князя — колер, малюнак тканіны, асобныя дэталі, галаўныя ўборы, упрыгожанні, футра.

Складаная сістэма сімвалаў павінна была выконваць аб'ядноўваючую ролю зямнога свету з нябачным Боскім. Колер меў хрысціянскую сімволіку. Напрыклад, залаты колер быў сімвалам Боскай энергіі, чысціні, Святога Духа, а таксама эмблемай багацця, сілы, адданасці[1]. Залаты разам з белым і пурпуровым, згодна візантыйскай эстэтыцы, лічыўся вяршыняй, бо белы колер разам з золатам асацыіраваўся з Боскім святлом; чырвоны — з агнём веры і Боскім полымем — сімвалам пакуты і ўлады, мужнасці, храбрасці, прэстыжу, дадзенай Богам; жоўты — колер сонца і яго сімвал. Зялёны колер — сімвал юнацтва, расліннасці, жыцця і надзеі. Сіні ці блакітны асацыіраваўся з нябеснай сферай, раем. Чорны колер быў адзнакай сціпласці, адукацыі, а таксама смутку, гора, небыцця. Найбольш папулярнай колеравай гамай сярэдневякоўя з'яўляецца спалучэнне чырвонага, сіняга, зялёнага[2].



Вылучаюцца два варыянты княжацкага касцюма: парадна-цырыманіяльны і штодзённы. Верхняй вопраткай князя ў парадна-цырыманіяльным варыянце касцюма была пурпурная мантыя на гарнастаевай падшэўцы з зашпількай на аграфы каля шыі або на правым плячы, каб правая рука была свабоднай і трымала меч — сімвал улады і моцы. Распаўсюджаным тыпам мантыі было карзно.

З XIII ст. увайшоў у моду атхабень (ахабень) з доўгімі рукавамі і зашпількай на фібулу ці завязкай. Атхабень быў шырокай вопраткай, падобнай на аднарадку, толькі з адкідным каўняром, які дасягаў паловы спіны. Доўгія рукавы закідваліся за плечы, а пад імі былі прарэзкі для рук. Святочныя атхабні шыліся з аксаміту, парчы, лепшых гатункаў шоўку; штодзённыя — з сукна, мухаяру, шэрсці. У летапісных крыніцах згадваецца, што вялікі князь Альгерд быў пахаваны разам з канём, у жупане рыцарскім, перлінамі і камянямі дарагімі высаджаным, і ў сукні пурпуровай, вышытай золатам, з поясам сярэбраным вызлачаным. У «Хроніцы літоўскай і жамойцкай», дзе распавядаецца аб узвядзенні «на княства Літоўскае» сына Міндоўга (кан. XIII ст.), ёсць успамін пра святочнае адзенне князя ў час цырымоніі, які «тревал набожне в законе чернцем, бо завше на княжескнх сукнях светлодорогнх»[3].



**Адзенне знвці сярэдзіны X ст.** «Прыём княгіняй Вольгай драўлянскіх паслоў пасля забойства Ігара». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу



**Адзенне энаці канца X ст.** «Пасольства Уладзіміра Святаслававіча Наўгародскага да Рагвалода». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

Жупан і сукня, вядомыя з праславянскага часу, бытавалі і ў раннефеадальны перыяд як у адзенні князёў, так і літоўска-беларускай шляхты. Вядома, што верхнюю сукню, падбітую футрам, насіў князь Вітаўт. Уважлівы разгляд мініяцюр Радзівілаўскага летапісу дазваляе выявіць такі від старажытнага княжацкага адзення, як мятль. Так, пад 1152 г. летапіс фіксуе князёў у «мятле н клобуце»[4].

У канцы XIV — пачатку XV ст. вялікі князь і знаць на беларускіх землях насілі вопратку па апошняй еўрапейскай модзе. Адрозненні ў касцюме былі толькі ў якасці матэрыялу, упрыгожанняў і г. д.

З верхняй вопраткі князя і яго прыдворных вядомы таксама кабат, плашч, плашч-мантыя, фут-ра, пакрытае дарагой тканінай з вялікім футравым каўняром, апухай па падоле і крыссю, зашпіленае на шматлікія гузікі. На грудзях адзення знатных асоб часта вышываўся геральдычны знак. Гэты ат-рыбут, разам са шматколерным гербавым адзеннем, як сведчыць партрэтны жывапіс, прысутнічае ў адзенні знаці і ў XVI—XVIII стст.

У X — пачатку XVI ст. можна казаць пра заснаванне на беларускіх землях своеасаблівага касцю-ма знаці, у якім спалучаліся як агульнаеўрапейскія элементы, так і свае нацыянальныя асаблівасці. У гэтым гатычным касцюме знайшлі адбітак як агульнапрынятыя еўрапейскія рысы адзення, так і элементы лакальна-рэгіянальныя[5]. Л. У. Дучыц такса-ма ўказвае, што, нягледзячы на падабенства з За-ходняй Еўропай, касцюм знаці і гараджан меў шмат традыцыйных балта-славянскіх элементаў[6].

У княжацка-баярскай частцы насельніцтва ў IX—XIII стст. былі пашыраны такія віды верхняй вопраткі, як карзно (плашч з фібулай), прывалока (кароткі парчовы плашч), ватола (безрукаўны плашч з капюшонам ці без яго і зашпількай каля шыі), луда



**Каралеўская мантыя пачатку XV ст.** Партрэт Вітаўта. Партрэт XVIII ст. з Берасцейскага кляштара аўгусцінцаў



Каралеўская мантыя XVII ст. Партрэт Жыгімонта III Вазы. Карціна фламандскага мастака. Пасля 1624 г.



Шуба на футры (паводле іспанскай моды).
2-ая палавіна XVI ст. Партрэт Жыгімонта Аўгуста

(плашч з парчы, расшыты золатам) кіса[7] і інш. Такія віды адзення былі вядомы і іншым славянскім народам — рускім, палякам, украінцам. М. Р. Рабіновіч адзначаў, што асобныя іх віды, напрыклад ватолу, мятль, насілі не толькі ў княжацкім асяродку, але і сяляне, слугі, гараджане*. А вось нашэнне карзна было выключна прывілеяй князёў і іх бліжэйшага атачэння. Бо такі дарагі плашч-мантыю з візантыйскіх тканін з каштоўнымі камянямі, з футравай апухай магла дазволіць сабе толькі знаць. Апраналі яго зверху світы.

Світа як верхняе мужчынскае і жаночае нераспашное адзенне розных слаёў насельніцтва згадваецца з XI ст. На падставе фрагмента мужчынскай світы XII—XIII стст., знойдзенай беларускімі археолагамі ў Віцебску, зроблена рэканструкцыя. Мужчынская світа была нераспашная, без каўняра, прамога крою з доўгімі прамымі рукавамі і зашпількай ад гарлавіны да лініі таліі на 6 гузікаў з гафткамі і падпяразана поясам з тканіны[9]. Каля в. Перавоз Глыбоцкага р-на Віцебскай вобласці археолагі знайшлі мініяцюрны рукапіс, паводле якога можна вызначыць крой світы. Яна служыла таксама лёгкім відам вопраткі, накшталт сучаснага пінжака[10].

Мужчынскія світы таго часу былі шарсцянымі і зашпільваліся на касцяныя, драўляныя, металічныя гузікі або фібулы. На поясе звычайна вісела невялікая сумачка-каліта са скуры ці тканіны, у якой захоўваліся грошы і дробныя рэчы, амулеты, якія павінны былі выконваць ролю абярэгаў, каб «адпужваць нячыстую сілу», атаксама ножык, які мог вісець асобна на поясе ці захоўвацца ў каліце. Нашэнне славянамі ножыкаў на поясе навукоўцы лічаць балцкім элементам.

У феадальны перыяд вядома вулічная верхняя вопратка сукман — распашное адзенне да каленяў ці ніжэй, якое шылася з сукна на падкладцы. М. Р. Рабіновіч і М. М. Улашчык ставяць знак роўнасці паміж сукняй і сукманом. Яго насілі прадстаўнікі шляхецкага саслоўя і гараджане. Яго мелі ў сваім



Вопратка магнатаў 2-ой папавіны XVI ст.

гардэробе зямяне, баяры, служачыя магістрата, га-раджане. Так, у баярына Івана Гуньковіча з г. Быхаў запарожскія казакі забралі «...сукмань люнскнй, за которыйданокопдвенгрошейтрндцать»[11]. Мінскія татары, якія абрабавалі двор пана ваяводы віцебс-кага ў Карсакавічах, забралі ў ліку іншых рэчаў «сук-манов люнскнх снннх 2»[12]. У магілёўскіх мяшчан згадваецца: «сукмань сукна люнского», «сукмань сукна ческого»[13], «чорны утерфнновы»; «утерфнну зеленогоскнафлямнсеребренымнвнтымн»;«...люн -скн бурнасты с тканкамн золотымн с серебромь, на которомь пугвнць осмь»; «...чорны фалюндышо-вы»[14].

У актавых дакументах XVI ст. капеняк (кабеняк) фігуруе як адзенне феадальнай беларуска-польскай шляхты, якое ўвайшло ў моду ў часы праўлення Ста-



Адзенне магнатаў.
Канец XVI — 1-ая палавіна XVII ст.



**Адзенне шляхты** 2-ой палавіны XVI ст.

фана Баторыя. Так, пан Дамброўскі з маёнтка Новы Двор Мінскага павета (1590) апранаўся ў «копенякъ фалюндышовый бурнатный», які каштаваў 8 коп фошай[15], а пан Нядзвецкі меў «кобеняк» фалюндошовый чырвоный, китайкою жолтою подшитый» коштам у 7 коп грошай. Насілі капенякі і простыя гараджане. Праўда, гэта быў ужо «кабеняк сермяжный»[16] за 3 залатыя, які належаў аднаму з магістрацкіх слуг г. Магілёва.

З пачатку XVI ст. на беларускіх землях атрымаў хаджэнне рускі акруглы ў крої плашч з сукна, які згадваецца ў актавых дакументах пад назвай епанча, апанча, японча. Епанчы ў сярэдневякоўі былі шырока распаўсюджанай плашчападобнай вопраткай гараджан і вайскоўцаў. Толькі за 1578 г. як вопратка мяшчан Вільні згадваецца шмат «опонеч московских» (дакументы№ 3,34, 124,144,480,554,568,578, 581)[17]. Назва, магчыма, паходзіць ад славянскага слова «опона», «опонка», што азначала «пакрывала ад дажджу» (яго прапітвалі лоем)[18], і адносіцца да з'яў старажытнарускай культуры. Успаміны пра яго ёсць у «Слове пра паход Ігаравы».

Спачатку епанча была шырокай і доўгай (часам — да шчыкалаткі) вопраткай без рукавоў. Пасля шылася і з доўгімі рукавамі, і па пакрої яна была блізкай да пазнейшай буркі. Апраналі яе зверху кажуха. Мела стаячы каўнер, ззаду — башлык, выкладзены блакітным ці зялёным сукном, і аблямоўвалася чырвонымі, сінімі ці зялёнымі гаруснымі ніткамі, а таксама сукном па абшлагах рукавоў, кішэняў, вылажках і швах. У канцы XVII ст. епанча стала ўрачыстым адзеннем рускіх нароўні з карзном" і шылася з дарагіх тканін. Пра запазычанне епанчы ў рускіх



**Капеняк.** 1-ая палавіна XVII ст.



**Капеняк.** Пачатак XVII ст. Партрэт Гераніма Хрызастома Хадкевіча. Невядомы мастак

сведчаць актавыя дакументы. Часта яна згадвалася ў якасці тавару. Так, у 1603 г. смаленскія купцы ў чалабітнай цару Барысу Фёдаравічу прасілі прапусціць іх з таварам у Літву, дзе акрамя футра (собалі, куніцы, бабры, рыжыя лісіцы, вавёркі), шуб, юфці і іншых упамінаецца 100 «епонеч»[20]. У 1605 г. «опончн» везлі з Тарапца ў Віцебск[21] і інш.

Актавыя матэрыялы ўтрымліваюць шматлікія звесткі пра дэлію (дылея, дылія, дэлюра), якая была выключна вопраткай магнатаў, гараджан і шляхты. Адсутнасць у актах звестак аб пакроі дэліі, прымусілазвярнуццадарозныхкрыніц. Услоўніку М. Гарбачэўскага яна значыцца як «делпя», «делнйка», «сіеііцга», епанча, плашч с шнрокнмн рукавамн н шнрокнм воротннком, носнмый сперва туркамн»[22]. Далей ён адзначае, што падбівалася яна дарагім футрам.

М. Улашчык, магчыма, услед за М. Гарбачэўскім ставіць знак роўнасці паміж дэліяй і епанчай, адзначаючы як яе асаблівасць шырокія рукавы і каўнер[23]. Л. А. Малчанава, спасылаючыся на пісьмовыя крыніцы XVI ст., піша, што «ў асяродку польска-беларускай шляхты шырока бытавала безрукаўная, падшытая футрам вопратка, якая называлася «дэліяй»[24].Далейянапрыводзіцьжарт, запісаныЗ. Глогерам, што дэлія мела вялікі футравы каўнер, накант якога жартавалі, што цяжка зразумець — ці гэта каўнер у дэліі, ці дэлія пры каўняры[25].

Адсутнасць дакладных звестак аб крої многіх відаў адзення, у тым ліку і дэліі, не дае магчымасці дакладна ўстанавіць яе крой. Вядома, што на Украіне дэлія таксама вылучалася вялікім чатырохкутным адкладным каўняром (часам футравым), адкіднымі рукавамі, зашпільвалася на гузікі[26]. Манера насіць доўгія рукавы на апашкі, не прасоўваючы ў іх рукі, была характэрна ў эпоху феадалізму і на беларускіх землях для магнатаў, шляхты і багатых гараджан, але дакументальнага пацвярджэння гэтаму няма.



**Вопратка шляхты.** 1633—1688 гг.




К. Матэйка піша, што дэлія ўкраінскай шляхты была двух варыянтаў. Першы — плечавая вопратка тыпу епанчы, падбітая футрам, з вялікім каўняром, якая якраз паўтарае апісаныя З. Глогерам дэліі польскіх магнатаў і шляхты. Другі варыянт — шуба мядзведжая або воўчая, доўгая, пакрытая зялёным сукном, якую насіла мяшчанства[27]. Магчыма, што ў беларускай шляхты былі гэтыя варыянты дэліі. Былі і дэліі без каўняра.

Аналіз пісьмовых крыніц дае падставу сцвяр-джаць, што дэлія была як халодным, так і цёплым плашчападобным адзеннем. Часцей за ўсё яе шылі з сукна, залататканых і сярэбратканых тканін (акса-міту, парчы), на падшэўцы з розных тканін (ада-машку, атласу, бакгазеі і інш.), ці з футра рысі, лісіцы, ваўка, мядзведзя — у залежнасці ад яе пры-значэння. У прывілеяванага саслоўя ў гардэробе ня-рэдка налічваліся дзве-тры дэліі. Верх дэліі, як пра-віла, быў чырвонага, зялёнага, блакітнага колеру, што было адзнакай шляхецкага паходжання. Так, у ротмістра Яроша Сянкевіча, які быў на службе ка-раля ў 1616 г., было ўкрадзена тры дэліі: «шкарлат-ная (пурпуровая) зь кузамі (вялікія гузікі) золоты-мп, подшнтая атласомь шкарлатное мастн...» за 250 залатых; «делнйка полшкарлатная, адамашкомь ша-рымь подшнтая, кгузовь злотнстыхь двадцать чо-тырм» за 100 залатых і «дылія чнрвоная, петлнцы чнрвоные, шлямамн подшнтая» за 40 залатых[28].

Дэлія была расхіснай вопраткай, якая зашпіль-валася на гузікі з пятліцамі. Пятліцы рабіліся таго ж колеру, што і дэлія, звычайна шаўковыя («ядваб-ныя»). Нярэдка з шоўку былі і гузікі. Як бачна, у ротмістра было дзве дэліі дэмісезонныя і адна зімо-вая футравая, «шлямамі» падшытая (г. зн. футрам рысі ці лісы). І гэта тыповы варыянт. У багатага па-мешчыка з Ашмян Пятра Ракіцкага ў яго маёнтку ў в. Гарбачы (1617) забрана «дылія бурнатная, фален-дышовая, кунп подшнтая», якая каштавала даволі дорага — 20 коп грошаў літоўскіх[29]. У «харунжыча» земскага Ераніма Міцуты з Гродна (1599) уліку «за-шкодного» былі: жупан і дэлія з аксаміту чорнага гладкага, абодва адамашкам «чорнымь велікімь взо-ромь подшнтые», на якія, без уліку кошту работы, было затрачана 142 талеры[30].

Дэлія служыла рэпрэзентацыйным адзеннем ка-раля і магнатэрыі, апраналася ў час парадных выез-даў, каралеўскіх і пасольскіх прыёмаў, на пася-джэнні сейма, у час вялікіх набажэнстваў і г. д.

У вопісе адзення Стафана Баторыя ўпамінаюц-ца дзве дэліі. Адна шэрая турэцкая, атласам падшы-тая, другая шарлатная (кармазінавая. — *Аўт.)* з доўгімі шырокімі рукавамі, падшытая чырвоным атласам[31]. Для язды на конях у зімнія марозы вы-карыстоўвалі дэліі, падшытыя цяжкім футрам: «знайшліўстайні... днлею медвежую» (1556)[32].

Дэлія.
Канец XVI ст.
Партрэт
Стафана Баторыя.
Невядомы мастак





**Дэлія з разразнымі рукавамі.** Партрэт Стафана Баторыя. Мастак Марцін Кобер. 1583 г.

Дэлія была не толькі вопраткай магнатаў, шляхты сярэдняга дастатку (зямян), але і гараджан, у тым ліку і служачых. У старажытных актах яна сустракаеішаякадзеннеслужачыхмагістратаг. Вільні: «делия люнская блекитная»[33]. Тры дэліі — «чырвоная полушарлатная зъ кгузиками едвабными, китайкою двуличною подшитая», «зеленая каразеевая съ кгузиками едвабными», «фалюндишовая бурнатная съ петлицами едвабными» — належалі зямяніну Верамею Барысаўскаму з Берасцейскага павета (1589)[34]. У зямяніна Церлікоўскага з в. Будзілава Трокскага павета было дзве дэліі: «блакитна фалюндошовая с петлицами шолковыми бакгазеяй подшита» і «утерфину зеленого с петлицами шолку зеленого»[35]. Дэлія з шырокімі рукавамі і футравым каўняром, падшытая футрам мядзведзя, упамінаецца як адзенне шляхціца Гродзенскага павета[3]".

У асяродку гараджан г. Вільні дакументы зафіксавалі вельмі цікавую «дилию лосей скуры», у якой былі «шнуры злотое з иглицами злотистыми срибными» коштам ЮОзалатых[37]. Гэтасведчыцьабтым, што дэлія, як і некаторыя іншыя віды вопраткі, не мела крою і аздаблення строга вызначанага канона і асобныя дэталі, як, напрыклад, шнуры, маглі быць аздобай розных відаў адзення. Тое ж адносіцца і да выкарыстання розных варыянтаўтканін верху і падшэўкі вопраткі.

Дэліі магнатаў, як бачна з партрэтнага жывапісу XVI—XVIII стст., зашпільваліся ўверсе шырокімі масіўнымі аграфамі, аздабляліся каштоўнымі камянямі і апраналіся зверху жупана. Спасылаючыся на партрэтны жывапіс XVII ст. Львоўскай карцін-



**Феразея.** Партрэт Паўла Сапегі. Невядомы мастак. 1624 г.



**Феразея, апранутая на жупан.** XVII ст. Партрэт Служкі. Невядомы мастак

най галерэі, Л. І. Тананаева піша, што на партрэтах магнаты Ян Жэвускі, Жыгімонт Тарло і іншыя апрануты былі ў чырвоныя дэліі з каўняром, якія мелі рад зашпілек на залатыя гузікі, а магнат Збараскі — у серабрыста-блакітную дэлію з тканым залатым узорам[38]. У канцы XVII ст. дэлія была выцеснена кунтушом.

У актавых матэрыялах сярод адзення беларуска-літоўскай шляхты сустракаецца верхняя вопратка пад назвай «феразія», «феразыя», «фаразія», «ферязь». Некаторыя лічаць феразь лёгкім жаночым і мужчынскім адзеннем[39].

Вядома, што ў рускіх «феразь» і «ферезея» азначалі розныя па крої вопраткі. «Ферезея» ў іх апраналася на «ферязь»[40]. У рускіх «ферезея» ўяўляла доўгую амаль да шчыкалаткі свабодную верхнюю вопратку з доўгімі звужанымі да запясця рукавамі, распашную, упрыгожаную доўгімі нашыўнымі петлямі і зашпіленую на 3—10 гузікаў ці завязак. Вылучаны 2 варыянты феразеі: халодная і на футры[41]. Л. Малчанавада гэтага апісання дадае, што «феразь» беларуска-літоўскай шляхты мела шырокія рука-вы, ззадудоўгі вісячы каўнер і зашпільвалася зверху да таліі на гузікі (у князей нярэдка на гузікі з рубінамі)[42].

Аналіз шматлікіх крыніц сведчыць, што гэта прасторнае, запазычанае з Усходу летняе адзенне з шырокімі рукавамі, якое насілі ў XVI—XVII стст. зверху асноўнага касцюма без пояса наапашкі расшпіленым, шылі з шаўковых тканін, аксаміту, парчы без перахвату ў таліі і без каўняра. Гузы і пятліцы служылі толькі ўпрыгожаннем. Хатнія і летнія феразі (халодныя) рабілі на падкладцы з тонкай шаўковай тканіны, зімнія (цёплыя) падшывалі футрам.

Магнаты і паны насілі чырвоныя феразі, сабалямі або рысямі падшытыя, шляхта — лісамі[43], пры гэтым найбольш пашыранымі колерамі феразей у шляхты былі чырвоны і блакітны[44]. Так Станіслаў




**Феразея.**
1-ая чвэрць XVII ст.
Партрэт Сапегі.

Феразея
2-ая чвэрць XVII ст.
Партрэт Л. Храптовіча.
Мастак Караль Рачынскі





Феразея
4-ая чвэрць XVII ст. Партрэт
Міхала Казіміра. Мастак
Караль Рачынскі

Ушаноўскі з «памочнікамі» ў 1631 г. падсцераглі ва ўрочышчы Бярэсцінца Слонімскага павета шляхціца Васіля Сароку і, збіўшы да смерці, «взялн н злупнлн зь него фарезыю фалендышовую блекнтную, вплчымь хутромь подшнтую»[45], а ў шляхціца Пятра Ракіцкага ў Ашмянскім павеце пры наездзе на яго памесце ў 1617 г. забралі «ферезыю чырвоную полшарлатную, рысьнмн шлямамн подшнтую... ферезыю зеленую, фалендышовую, лнсы подшнтую, которая коштовала шестнадцать копь фошей Лнтовскнх»[46]. Адзенне магнатаў і буйных паноў, феразь затым стала папулярнай вопраткай шырокіх слаёў шляхты і гараджан.

Я. Ахоцкі ўпамінае феразею як адзенне паюкоў у магнацкім двары. Ён піша, што на жупан, апяразаны поясам, зверху накідвалася феразея, якая не зашпільвалася[47]. З дакументаў вынікае, што феразеі шыліся з сукна яркага колеру, дзе пераважаў чырвоны, зялёны, блакітны. Так, у зямянкі Бірулі з Бялыніч была «ферезыя чырвоная кармазыновая, адамашком подшнтая»[48]. У тэстаменце зямяніна Рыгора Багамольца з Пагосціч Віцебскага ваяводства ўпамінаецца «ферезея лазурова, адамашком подшнта, петлнцы сребреные»[49].

У беларуска-польскай шляхты было вядома доўгае, адразное па таліі, у зборкі адзенне з рукавамі і зашпількай на гузікі пад назвай «чамара». Рускім такі від адзення не вядомы. Хутчэй за ўсё яна была перанята ад палякаў. Пры польскім каралі Станіславе Аўгусце Панятоўскім, паводле З. Глогера, насілі суконныя чамары з кароткімі рукавамі, якія абшываліся шнуркамі на грудзях і каля пояса[50]. Менавіта пра суконную чамару піша А. Міцкевіч: «Мне пашчасціла яшчэ ў маленстве Касцюшку бачыць. А ў чым хадзіў герой наш? У сукмане — чамарцы простай кракаўскай...»[51] Л. Жданаў удакладняе крой чамаркі, апісваючы выгляд гаспадара свецкага салона XVIII ст.: «Одет он был тоже не так как все — в подчеркнуто нацнональный польскнй наряд, отдаюшнй маскарадом: в старнннную чамарку со жгутамн н кутасамн, в шаровары н польскпе сапогн с кнсточкамн»[52]. Далей ён падкрэслівае, што рускія ўлады забаранялі насіць такі ўбор і канфедэратку, якія лічылі сімваламі «незалежнасці» старой Польшчы[53].

Як сведчаць старажытныя акты, чамара шылася не толькі з сукна «чамара фалюндышевая бурнатная»[54], але і з мухаяру: «чемара до ложка мухояровая, себеркамн подшптая»[55] і г. д.

У адрозненне ад чамары, якая была запазычана ад польскай шляхты, даўгаполая аднабортная вопратка з рукавамі без каўняра — аднарадка (однорядка, однорядок) хутчэй за ўсё трапіла на беларускія землі ад рускіх. Л. А. Малчанава піша, што на беларускіх землях яе насіла частка старажытнага баярства[56] (баяры-шляхта), якая доўга карысталася пра-

вамі дваранства і якая з цягам часу адрознівалася ад цяглых сялян толькі характарам павіннасцяў". Баяры павінны былі «конем служити, на толоку и в сторожу до скарбу ходите»[58].

Аднарадка ўяўляла сабой доўгае аднабортнае верхняе адзенне тыпу каптана без каўняра, звычайна з зашпількай на 12 гузікаў. Шылі аднарадку з сукна і шчыльных шаўковых тканін без каўняра з доўгімі вузкімі рукавамі. Надзявалі звычайна на жупан і на"сілі восеннюю і вясной. У актавых матэрыялах тэрмін «однорадка», «однорадокъ» у спалучэнні з іншым верхнім адзеннем часам азначае, што тое адзенне пашыта без падкладкі («у адзін рад»), напрыклад «сукманъ сукна люнского однорадокъ» (1578 г.)[59]. Сярод страт, прычынёных жыхарам г. Магілёва маскоўскім войскам у 1656 г., адзначалася, што ў «сотника Черномаза взято две пары платья однорядонного»[60], а ўдругога жыхара «взято две пары платья суконныхъ однорядочныхъ, штаны однорядочные...»[61].

Мы не можам пагадзіцца з Л. А. Малчанавай, што яе насіла выключна баярства. Яшчэ часцей у актах аднарадка ўпамінаецца як вопратка зямян: «однорядокъ блокитный лунский, в немъ было 12 кнафлей серебренныхъ, в нихъ важило 15 золотниковъ серебромъ»[62]; «однорядокъ каразеі лазуровое», «однорядокъ сукна влоского голубый з тканкамі чорнымі, а другий однорядокъ сукна ческого серый...»[63] (1562) і г. д.

Такім чынам, актавыя матэрыялы дазваляюць зрабіць выснову, што аднарадка была вопраткай усяго шляхецкага саслоўя. Насілі яе і гараджане. Так, у ваяводы віцебскага было дзве аднарадкі «люнскія



**Чамара.** Пачатак XIX ст. Віленская губерня. Невядомы мастак



**Суконная чамара** (выгляд спераду і ззаду). Сярэдзіна XIX ст.

Вопратка шляхты.
1697—1795 гг.





Казацкі кафтан-кунтуш. Пачатак XVIII ст.

сінія»[64]. Мелі аднарадкі ў сваім гардэробе служачыя магістрата. У намесніка Г. Валовіча была «однорядка лазуровая порпьянская с шнурами»[65], у Крычаўскага старасты — «аднорадка чорная»[66]. Не былі выключэннем і святары. У святара Кузніцкай царквы (1558) была ўкрадзена «однорядка пурпіянская серая»[67]. М. Р. Рабіновіч пісаў, што ў рускіх святары спачатку дома насілі тыя ж вопраткі, што і прыхаджане, а зверху — аднарадку[6]*. Відаць, што і ў беларусаў была тая ж традыцыя.

Якбачназдакументаў, нааднарадкі ішлорознакаляровае (блакітнае, шэрае, чорнае, сіняе) імпартнае сукно, у прывілеяванага саслоўя — імпартнае вышэйшага гатунку («кармазіны»), а гузікі да яе прышываліся не толькі срэбраныя, але і пазалочаныя. Часцей за ўсё аднарадка была вулічнай лёгкай вопраткай.

Сярод лёгкай вопраткі вядомы «цягіляй» («цеплей»), які шыўся з розных імпартных тканін з кароткімі рукавамі і стаячым каўняром: «тегілей дуплй бурнатное»[69], сустракаліся цягіляі, сшытыя з камкі[70] і інш. тканін.

У XVII ст. беларуская шляхта актыўна пераключылася на так званы польскі строй, аснову якога складалі старажытны жупан і кунтуш. Неабходна адзначыць, што гэты строй насілі ўсе: ад магната да дробнай шляхты. Вылучаліся саслоўныя адрозненні, як і ў іншых відах адзення, якасцю матэрыялу, багаццем аздобы і ўпрыгожанняў. Вось што пісаў аб гэтым строі В. Дунін-Марцінкевіч:

> Вось стары падкаморы ў багатым убранні (У цудоўным кунтушы, атласным жупане, Пояс — дзіва, шырокі, увесь золатам тканы, На нагах ззяюць жоўтыя боты з саф'яну, Похва шаблі, эфес — дар мастацтва багаты, Голаў зграбна падголена, вус сіваваты)[71].

У вершы вельмі ярка намаляваны партрэт багатага шляхціца, яго ўбор і нават прычоска. Шабля, пра якую піша В. Дунін-Марцінкевіч, была абавязковай прыналежнасцю святочнага шляхецкага касцюма.

У касцюме, які ў тагачаснай літаратуры называлі «народны строй», спалучаліся як агульнаеўрапейскія, так і мясцовыя традыцыі. Гэта адбілася і ў крoі, і ў выкарыстанні розных дэталяў, і ў аздабленні кунтуша, і нават у манеры яго насіць. З. Глогер адзначаў, што спачатку ён шыўся з «вылётамі» і ў жаночым, і ў мужчынскім варыянце[72].

У сярэдзіне XVIII ст. прывілеяванае саслоўе пачынае арыентавацца на заходнееўрапейскую, па



Кунтуш з адкіднымі рукавамі («адлётамі»), аздоблены залатым галуном. Фрагмент. XVII ст.







Кунтуш шляхціца. 2-ая палавіна XVII ст.



Кунтуш і жупан шляхціца. Рэканструкцыя Ю Піскуна

большай частцы французскую і англійскую моду. Гэтаму ў многім спрыяла магчымасць выпісаць з Парыжа ці Лондана модныя ўборы. У час вялікіх святаў, якія наладжвалі ў сваіх палацах Радзівілы, Сапегі і іншыя магнаты, радавітая шляхта, беларуская арыстакратыя блішчэлі не толькі ў традыцыйнай вопратцы, але і ў цудоўных кафтанах і камзолах, упрыгожаных вышыўкай залатым галуном, карункамі, якія самі па сабе ўяўлялі творы мастацтва.

Вопратка сярэдзіны XVIII ст. мела сілуэт да стану, каўнер-стойку, шырокія адвароты на рукавах і шчыльна аблягала верхнюю частку фігуры. Ад таліі кафтаны «рассыпаліся» складкамі, ззаду разрэзшліца з кітовым вусам". Гэтая вопратка была характэрнай для стылю ракако і была зручнай і для балю, і для верхавой язды.



**Кунтуш з адкіднымі рукавамі.** XVIII ст. Партрэт Аўгуста III. Мастак Л. дэ Сільвестр. 1737 г.

Леан Патоцкі пісаў, што «даўней кожны шляхціц, абы толькі радавіты, быў у кунтушы з саеты (дарагога тонкага фабрычнага сукна), у злацістым поясе, з шапкаю набакір, пры крывой шаблі, выглядаў як магнат. Сёння ж (1752) кожны магнат у куртатым адзенні, з абцятымі поламі, у цесным капялюшыку і ў вузкіх штоніках»[74].

Парадны варыянт «традыцыйнага строю» шыўся з дарагіх тканін: жупан са штофнай матэрыі ці ліёнскага аксаміту, кунтуш — з лепшых гатункаў імпартнага сукна. Падпяразваўся кунтуш магнагаў златалітымі паясамі спачатку ўсходнімі, а пасля — слуцкімі.

Кунтуш шляхта апранала на сеймы і сеймікі нароўні зеўрапейскай вопраткай і насілаажда 1831 г., калі ён быў забаронены пасля польскага паўстання, і разглядаўся царскай уладай як сімвал шляхецкай вольнасці. Магнаты і заможныя гараджане насілі як лёгкія шаўковыя кунтушы, так і суконныя. Упрыгожвалі іх срэбранымі, залатымі ці шаўковымі шнурамі таго ж колеру, што і кунтуш. Рукавы кунтуша мелі разрэз да локця або да пляча («вылёты», «адлеты») і крыж-накрыж закладваліся за пояс ззаду. У актах, якія тычыліся г. Вільня, упамінаецца кунтуш багатага двараніна «чарный, сукенный, рнсямн ножковымн подшнтый, з гузамі злотемн, з рубннамн», які каштаваў 600 злотых[75].

Шмат сведчанняў аб кунтушы, як адзенні служачыхмагістратаXVII ст.,утрымліваюцьмагістрацкія кнігі аб расходванні сродкаў на розныя патрэбы. Так, каменданту г. Магілёва (1695) магістрат выдаткаваў 4,5 локця (па 1 талеру за локаць) «сукна тузннку на кунтуш», на ўпрыгожанне яго «потребы сребрные шмыхлерскне», а таксама «футро котовое чорное»[76], якое насілі зверху кунтуша.

«Пара» (кунтуш і жупан), пэўнага колеру шапка, шабля, пояс, боты былі форменнай вопраткай «слуг мескіх» (пушкароў, павознікаў, пахолкаў, цэхавых майстроў, пляцовай варты («жаўнераў»),дворнікаў і г. д.). Аналіз дакументаў дае падставу сцвярджаць, што кунтуш магістрацкіх слуг шыўся звычайна з таннага простага («подлага») сукна (люндышу, валтеровского, шнптуху, карнавога, чынтакору). На аздобу кунтуша (кryссе, карвашы, каўнер) ішло сукно іншага колеру і гатунку (напрыклад, кір, кір кутнорованный). На падкладку кунтуша звычайна ішло лакцей дзесяць палатна, ім жа падшываліся кішэні[77]. Акрамя таго, патрабаваліся шаўковыя ці паўшаўковыя шнуркі: «Стефану цекнару до кунтуша і да жупана шнурка едвабного» 36 локцяў[78], а таксама гузікі з вензелямі контуша да тасьма і «мусолбесы» на ліштву[79], пятліцы шоўкавыя (6 пар)[80].

На пашыў кунтуша звычайна патрабавалася 5, 5—6 локцяў сукна аднаго колеру (звычайна зялёнага («травястага»), «баршевага», цёмна-зялёнага, чырвонага,радзей — сінягаі2локці — другогаколеру (чырвонага, жоўтага, белага) на аздабленне.

У 1679 г. са сродкаў Магілёўскага магістрата на верхняе адзенне было выдана па 6 локцяў сукна: «Сцёпку-пахолку на жупан блакітнага, а на кунтуш — зялёнага; пушкарам — сукна цёмна-зялёнага «вальтэровского» і кіру кутнорованного чырвоного»; майстру на кунтуш — «вальтеровского» сукна зялёнага і 2,5 локця — белага[81]. Кошт гэтага сукна не перавышаў 3—4 залатых за локаць. Зверху кунтуша магістрацкія слугі насілі паясы: «нмтяной вмшнновый»[82], «пояс чннкаторовый»[83], «гарусавы»[84], «чннтаровый»[85].

Магістрацкім слугам (дворніку, пляцовым, майстрам, вартавым і г. д.) да свята Вялікадня штогод выдавалі грошы на адзенне, абутак, галаўныя ўборы і аплату работы краўца: «Стенку (пахолку) мескому» далі на кунтуш 20 залатых[86]; Фёдору дворніку — на «кунтуш тузннковый»[87]; майстру — люндышу зялёнага, кіру белага на аздобу і гарусовы пояс зялёны. 3 цёмна-зялёнага люндышу заказалі кунтушы пушкарам, на якія пайшло па 5,5 локцяў сукна.



Кунтуш (від спераду і ззаду). XVIII ст.

Турэмным слугам на кунтуш выдавалі просты люн-дыш па 0,5 талера за локаць[88].

Кунтуш, як адзін з асноўных складаючых муж-чынскага гардэроба шляхты ў XVIII ст., змяніўся па пакроі. У пачатку стагоддзя ён быў даволі доўгі з вузкімі і доўгімі рукавамі і шыўся з розных тканін, у тым ліку з сукна. Суконныя кунтушы заможных зашпільваліся на 6 вялікіх сярэбраных гузоў велі-чынёй з арэх з маленькімі рубінамі, а бяднейшая шляхта выкарыстоўвала шкляныя падробкі з Чэхіі. З 1740— 1750-ых гг. кунтушы ўкараціліся і шыліся да каленяў[89]. Разнавіднасцю кунтуша лічыўся «чэк-мень», «чэхман», які бытаваў у шляхты ў XVIII ст., і багата ўпрыгожваўся золатам ці серабром. А. Мальдзіс адзначае, што чэхман — гэта кунтуш без выразаў («адлётаў»)[90].

А. Мальдзіс, абапіраючыся на мемуары XVIII ст., лічыць, што «шляхецкая мода» была адносна адзі-най, таму што бяднейшая шляхта старалася перай-маць «вялікапанскую» моду, аддаючы за ўборы апошні грош. Спрыяў гэтаму і звычай дарыць пано-шанае адзенне «са свайго пляча» «рэзідэнтам»[91].

У актавых матэрыялах часта ўпамінаецца верх-няя мужчынская вопратка «армяк» («гермак», «кгермак», «ермак») (татарск. — агтіак)[92]. Вядома, што «армяк» — старажытная даўгаполая вопратка рускіх халатападобнага крою[93]. Хутчэй за ўсё ён быў запазычаны менавіта ад рускіх, бо даволі часта да-кументы (напрыклад, мытныя кнігі) утрымліваюць звесткі аб прывозе гатовых армякоў на беларускія землі. Часта армякі згадваюцца як адзенне вяскова-га насельніцтва этнакантактнай зоны (Віцебшчы-ны і Магілёўшчыны).

3. Глогер адносіў тэрмін «армяк» да турэцкага «аппак» і лічыў, што ён прыйшоў да палякаў з Усхо-ду[94]. А ў Польшчу ён трапіў праз беларуска-літоўскіх

**Суконны гермак шляхціца.**
Канец XVI ст.







**Мяшчане ў гермаках.**
Пачатак XVI ст

феадалаў[95], аб чым сведчыць той факт, што на беларускіх землях гэтае адзенне з'явілася раней, чым у Польшчы.

Асобныя аўтары пішуць, што армяк — гэта «сшыты з армячыны сялянскі кафтан прамога крою, неадразны па таліі, без зборак. У XIX ст. — верхняе сялянскае адзенне прамога крою з сукна»[96]. Нельга пагадзіцца з тым, што армяк шыўся толькі з сярмяжнага сукна (армячыны) і насіўся выключна сялянамі. Шыўся ён і з імпартнага якаснага сукна (у **XVI—XVIII** стст.) і быў шырока распаўсюджанай вопраткай гараджан і ўсіх станаў шляхты, аб чым красамоўна сведчаць актавыя матэрыялы. Больш таго, армяк быў даволі дарагім адзеннем, на пашыў якога ішло італьянскае («влоскае»), французскае («ліонскае») і іншае імпартнае сукно добрай якасці, т. зв. кармазіны, а таксама шаўковыя («ядвабныя») шнуры, а на падшэўку і футра (вавёркі, лісы, куніцы).

Армякі падшываліся таксама баваўнянымі і шаўковымі тканінамі. Армяк (у дакументах часцей фігуруе назва «гермак», «кгермак») быў адзеннем багатых гараджан, памешчыкаў, зямян, баяр, служачых магістрата, слуг. Размежаванне ішло, па большай частцы, па якасці матэрыялаў і прыкладаў. Так, «кгермак», падшыты футрам, коштам 50 коп грошаў насіў кашталян мінскі і падскарбі земскі Ян Глябовіч[97]. Сярод адзення зямян значыцца: «ермяк черный фалюндошовый з шнурами и строкою едвабю чорного» коштам 6 коп; «кгерміакь белый сукна волоского, подшитый багазеяй з шнурами толковыми»[98] (8 коп); «кгермакъ канавасовый, кунами подшитый» (100 золотых польских); «кгермакъ бураковый сибирками подшитый» (10 коп грошаў)" і г. д.

Амаль не адрозніваюцца ад іх па якасці матэрыялу армякі баяр-шляхты XVI ст., якія таксама шыліся з імпартнага сукна з шаўковымі шнурамі: «ермякъ муравский шарый», «ермякъ люньский блакитный», «... синий зъ шнурами толковыми черными» слуг; «... шарый муравский» цівуна[100]. Шэрымі з мураўскага сукна і з шаўковымі шнурамі (1582) былі армякі баяр-слуг князя Стафана Збаражскага[101].

Насілі армякі служачыя магістрата і гараджане. У пана ваяводы Віцебскага быў «ермякъ фалюндышу бурнатного» з такога ж колеру шнурамі[102]. Успамінаецца «армякъ шарый муравский з шнурами толковыми чорными» мінскага мешчаніна[103]; «ермакъ сукна белого московского» — мешчаніна чавускага; «кгермак чорны фалюндишовы с петлицами» пана Салецкага з Оршы ў 50 коп і 40 грошай[104]. Армяк быўдэмісезоннай вопраткай. У зімовую пару зверху яго насілі кажухі, шубы, футра.

Пісьмовыя крыніцы як верхнюю вопратку магістрацкіх слуг згадваюць «ліберыю». Некаторыя даследчыкі (Л. Малчанава, М. Улашчык) лічаць, што «ліберыя» была жаночай накідкай[105]. У старажытных актах яна ўпамінаецца як адзенне магістрацкіх слуг. Прычым ліберыю насілі не ўсе, а пераважна пляцовая варта, жаўнеры, «агнянікі» (апальшчыкі), «добыты». Г эта наводзіць на думку аб тым, што ліберыяйназывалі форменную вопратку, якой могбыць кунтуш, курта ці катанка. Шылі яе з недарагога «сукна скарбового» («гданского люндышу», «сукна

валтеровского», «шнптуху»). Да свята Вялікадня ім таксама выдавалася новая вопратка. Пляцовыя, якія стаялі ў гарадскіх брамах г. Магілёва, апраналіся ў блакітныя сукняныя ліберыі, аздобленыя жоўтым кірам і падпяразаныя дзягай з цыновымі гербамі горада на спражцы; добышы — у зялёныя з жоўтай або чырвонай аздобай. Так, у 1697 г. добышу Солышу на «лнберню» выдалі «сукна валтеровского» 5 локцяў і 2,5 локця чырвонага. На падшэўку — палатна, на аздобу — кіру, а таксама — спецыяльных гузікаў[106].

Сярод верхняй вопраткі, якая ў XVIII ст. карысталася папулярнасцю шляхты і гараджан, была бякеша (накшталт паліто). Шылася яна і ў талію са складкамі ад пояса і разрэзам ззаду. Зашпільвалася на петлі, падбівалася і аздаблялася футрам. Бякеша атрымала пашырэнне ў сярэдзіне XVI ст. у часы праўлення Стафана Баторыя. Спярша бякешы былі жоўтага колеру і аздабляліся футрам шэрых баранкаў. Ужывалася бякеша да канца XVIII ст. Назву атрымала ад Каспара Бекеша, які знаходзіўся на службе ў Стафана Баторыя[107]. Яна была распаўсюджана ў нашых суседзяў: рускіх, украінцаў. Пра бякешу існуе вельмі мала інфармацыі. Вядома, што яна была даўгаполай (за калені) расхіннай вопраткай (хаця быў і кароткі варыянт). Асаблівасцю бякешы лічылася футравая аздоба па рукавах, нізе, кішэнях і невялікі адкладны ці стаячы каўнер. Гэтая вопратка вядома ў асяродку феадальнай шляхты XVI ст. Так, у жыхара Гродна (1599 г.) Міцуты (зямяніна) была «бекешка ездецка сукна чорного влоского, завыйкамі лнсемн новымн подшнтая», якая каштавала 14 коп грошаў[108].

Да венгерскага крою адзення адносіцца і даламан, вядомы з XVI ст., які ўяўляўсабой кароткі кафтан з рукавамі, упрыгожаны тасьмой. Гэта была выключна мужчынская вопратка прывілеяванага саслоўя, якая заставалася папулярнай яшчэ і ў XIX ст. Як вынікае са старажытных актаў, шыўся даламан з імпартнага сукна і шаўковых тканін.

У заможнага шляхціца з в. Гарбачы Ашмянскага павета значыўся даламан з фалендышу зялёнага колеру коштам у 6 коп грошаў[109]; у мешчаніна г. Віль-ні — даламан «адамашковый помаранчовый»[110], у глускага — «атласовый шкарлатное мастн (чырвонага колеру); адамашкам блекнтным подшнтый...»[111] коштам у 60 залатых. У завяшчанні зямянкі Бірулі з-пад Бялыніч фігураваў «доломань адамашковый попелятый»[112]. Трэба дадаць, што як адзенне зямян даламан сустракаецца даволі часта ў дакументах XVII ст.: «доломань адамашковый лазуровый, с потребамн, з кгузнкамн злотнстымн н чепрагн злотнстые»[113], «доломань лазуровый... фалендышовый с потребамн едвабнымн», «доломань шарый, потребы гарусовы»"[4].



Бякеша гараджаніна. Пачатак XIX ст.

Французскі вандроўнік дэ Лабур'ер, які быў у свіце польскай каралевы Марыі-Людвікі ў 1646 г., адзначаў, што атрад шляхты са знакамітых родаў быў з надзвычайнай раскошай апрануты ў вопратку з персідскіх залататканых з кветкамі ўзорных тканін ці аксамітаў розных колераў. Вопратка іх была пад-біта каштоўным футрам собаляў і пантэр. Зверху — прыгожыя плашчы-даламаны з такіх жа каштоўных тканін з багатай вышыўкай[115]. Гузікі на вопратцы былі залатыя, ювелірнай работы і таксама ўпрыго-жаныя дарагімі камянямі.

Доўгім верхнім мужчынскім адзеннем, разнавіднасцю світы быў «насовень», «насувень», «насовень». Насілі яго шляхта і гараджане. У 1630 г. людзі немца Кошкеля, напаўшы па дарозе на шляхціца Аляксандра Кіркілу, «вельмн немнлосерне князмн збнлн н змордовалн... насувень белый штаметовый на ннмь весь пошарпалн, который насувень кош-товаль копь десеть»"[6]; «пограбшш... насовень зе-лоный, полькгранатный, новый, адамашкомь вло-сянымь подшнтый» (1621)"[7].

У апісанні маёмасці Хадкевічаў у Бераставіцкім і Роскім маёнтках упамінаецца газука — доўгая халатападобная шырокая вопратка, часам падбітая каштоўным футрам: «газука оксамнту чорного ры-того, перлы сажона около рукава... газука оксамнту чорного собольмн подшнта...»"[8]

У мужчынскім гардэробе ў XVI—XVII стст. у залежнасці ад пары года была не толькі доўгая, але і кароткая вопратка: паўжупанчык, паўчамарак, паўшубак і інш. Шырока распаўсюджаны былі таксама



**Касцюм гайдука.**
2-ая палавіна XVII ст.



**Заможны гараджанін у кароткай шубе І капелюшы.** Канец XVI ст.




**Барон Герберштэйн у багатай шубе,**
падараванай Васілём III. Размаляваная гравюра. XVI ст.

кабат, юпка, саян, янкгер, казыяка, жупіца і інш. Кабаты насілі таксама палякі, венгры, рускія. Але ў рускіх кабат — доўгае цёплае адзенне з доўгімі рукавамі, якое было і хатняй, і вулічнай вопраткай[119]. На беларускіх землях кабаты шылі да таліі ці крыху ніжэй без рукавоў. Выкарыстоўвалі аксаміт, адамашак і іншыя тканіны. Насілі прадстаўнікі розных саслоўяў, і цёплы варыянт рабіўся з сукна на футры: «кабат куньн крыт оломашкою гвоздньковой»[120]; «кабаты два суконнын голубын»[121].

Казыяка ўяўяла сабой кароткі лёгкі каптан з рукавамі ці без рукавоў жупіцу (жупанік) — кароткі хатні каптан з рукавамі ці без рукавоў шылі з сукна, аксаміту, шаўковых тканін: «жупіца замшу чорного» (1556)[122], «жупіца парпьяну зеленого»[123]; «жупаннкн 2 зь кгузамн тогожь сукна»[124] і насілі ў шляхецкім асяродку.

Янкгер (кароткая лёгкая хатняя куртка ў ліку вопраткі сустракаецца не часта): «янкгерь атласу чорного, брамы вколо резаные чорного аксаміту» (1569)[125]. Упамінаюцца звычайна янкгеры аксамітныя і атласныя: «янкгерь оксамнту чорного, кнтайкою чорною подшнть, янкгерь атласу чорного, брамы вколо резаные чорного аксамнту»[126].

Даволі часта ў дакументах XVI—XVII стст. у ліку вопраткі сустракаецца «юпка». Сцвярджэнне Л. А. Малчанавай, што «юпка» была выключна жаночай вопраткай, не адпавядае рэчаіснасці. Пад 1616 г. у дакументах значыцца «юпка блакнтная, шлямамн подшнтая, петлнцы блекнтные» коштам у 30 залатых, пашытая з «фалендышу лазурового», а таксама «юпка блекнтная, футром подшнтая» за 15 залатыхякадзенне «пахолкаў» (салдат. — *Л. Р.)*[ІП]. «Юпку адамашковую зеленую, кнром подшытую, коштам 6 коп фошаў літоўскіх» насіў слуга дваранiна Пятра Ракіцкага[128] і інш.

Зімовым адзеннем мужчын розныхсаслоўяўбылі кажух, шуба, футра, чуга,ваўчура, тулуп.

Вядома, што яшчэ ў праславянскі час у зімовы перыяд насілі кажухі. Праславянскі «кажух» уяўляў аўчынны кажух (футрам уніз), як пакрыты тканінай, так і «нагольны» (у украінцаў — «некрнтн»). Паводле дадзеных беларускіх археолагаў, старажытныя кажухі па болыпай частцы былі нерасхіснай вопраткай[129]. У той час насілі таксама і шубы з фут-ра мядзведзя, ваўка, лісіцы, бабра, вавёркі і іншых звяроў[130]. У сярэдневякоўі магнаты мелі ў гардэро-бе кажухі з каштоўнага футра, пакрытага дарагі-мі візантыйскімі тканінамі, абшытыя карункамі, упрыгожаныя каштоўнымі камянямі, вышыўкай, металічнымі бляхамі[131].

Назва «кажух» у XVI ст. адносілася не толькі да аўчынных, але і да шуб з рознага футра, крытых тканінай, у пазнейшы час — выключна да вопраткі з аўчын. У 1559 г. у старасты Валовіча, як адзначана ў актах Слонімскага земскага суда, укралі адзін «ко-

жух лисьи, колнер горла лисьего сукном зеленым штаметовым крыт», другі — «кожух лисьи с колнером бобровым, сукном муравским шарем крытый» і кароткі «кожушок лентваровый (з маладых ягнят. — *Аўт.)* малый...»[132].

Кажух, згодна з актавымі дакументамі, быў зімовым адзеннем магістрацкіх слуг: майстроў, дворнікаў, чаляднікаў, пляцовай варты (пушкароў, вартаўнікоў, клікуноў і інш.). У XVII—XVIII стст. кажух часта фігуруе пад назвай «турэцкае футра»[133], або «турэцкая кожа»[134].

Маюцца ў крыніцах шматлікія ўпамінанні аб кажусе як вопратцы зямян-шляхты («кожух кроликовый, сукном порпьянским Гвоздиковым крытый»)[135]. Гараджане (бяднейшая частка) насілі ў асноўным аўчынныя кажухі: «бараний с колнером бобровым»[136] за дзве капы грошаў. Кажухі, разам з сярмягай, капотай насіла шляхта на сейміkі[137].

Розніца паміж кажухамі, у якія апраналіся розныя саслоўі, праяўлялася перш за ўсё ў якасці футра, тканіны верху, аздобе, колькасці ўпрыгожанняў. Калі пляцоваму на пашыў простага кажуха хапала 2 залатых і 15 асмакаў[138], то на «кожух турецкий» ротмістра трэба было ўжо 12 залатых[139]; на «кожух турецкий» зямяніна і мешчаніна — дзве капы[140]. Кажух! нярэдка мелі бабровы каўнер[141], шыліся з футра розных звяроў: «кожухъ медвежий один, купленный за осмьдесять грошей литовскихъ»[142].

У пачатку XVIII ст. кажух («кожа турецкая») можна было купіць у Магілёве за 15 злотых[143]. Па цэнах 1679 г. набор авечых шкур на кажух можна было набыць за 20 злотых[144]. Калі ўлічыць, што пляцовы вартаўнік у месяц атрымліваў 4 злотых, каваль — 2 злотых 22 асмакаў; клікун — 2 злотых 15 асмакаў[145], то зразумела, што для простага чалавека гэта вопратка была дарагой і разлічанай на працяглы час нашэння.

Шубы былі верхняй зімовай вопраткай прывілеяванага саслоўя. Спод рабіўся з футра вавёрак, рысей, куніц, лісіц, выдраў, собаляў, бяброў, гарнастаяў і інш. Крыліся шубы зверху атласам, аксамітам, камкай, тафтой, сукном. У адрозненне ад прыталеных жаночых мужчынскія шубы былі доўгімі, прамога крою. Шубы магнатаў упрыгожваліся карункамі, залатымі і сярэбранымі гузікамі, часам шнурамі з кісцямі і з'яўляліся сапраўдным багаццем. Цяжка ўявіць, колькі каштавала шуба з гарнастаяў, пакрытая зялёнай «амарханкай»[146] (род тканіны), «съ пугвицами и одного золота»[147]. Такія шубы былі парадным, святочным адзеннем.

Больш сціплыя шубы шыліся для паўсядзённага нашэння, а таксама для паездак і вандровак. Вядома, што шубы ў вярхушкі беларуска-польскай шляхты замест гузікаў часта зашпільваліся каля шыі на аграфы. Такія шубы называліся «польскімі». Шубы былі рознымі па крої: шырокімі і не вельмі, часта



**Шуба вучонага.**
Канец XVI ст.



**Шуба, падбітая рысіным футрам.**
1-ая палавіна XVII ст.

мелі футравы абшлаг, вялікі каўнер, шырокія рукавы.

Прыгожыя шубы з дарагога футра, а таксама футравыя накідкі («футра») часта ў дакументах згадваюцца ў якасці падарунка каралю, цару, крымскаму хану ці важным гасцям. Так, у 1541 г. князем Сямёнам Бялецкім крымскаму хану Саін-Прэю быў падараваны «кожюх соболнй, што з Москвы прнслан, за 90 золотых», царэвічу — «кожюхь куней, за него дано по 20 золотыхь, а кожюхь белнчьн в 10 золотыхь», ваяводзе — «шуба кунья за 16 золотых, да шуба завыйковая(шыйнайчасткілісы)за22золотыхь»[148]. Ад польскага караля ў якасці падарунка князю Міхаілу Цвярскому была «шуба соболья, волочоная аксамнтомь або адамашкою, а другая шуба кунья»[149]. На падарункі ў Варшаву да караля і яго прыдворных-канцылярыстаў ад гарадскіх магістратаў прынята было вазіць «канцэнтацыю». У якасці яе акрамя грошаў, футра, сукна нярэдка траплялі шубы. Так, у 1713 г. пісару Каліноўскамудалі шубу «брюшную», слузе падскарбія Дудніцкага «шубу нз крестовок» (лісіц).

Шубы і «футра» былі верхнім зімовым адзеннем усіх слаёў феадальнага грамадства, за выключэннем сялянства. У мужчынскім гардэробе заможнай часткі насельніцтва было па некалькі шуб. Адрозненні гэтай вопраткі больш значныя паміж саслоўямі, якія знаходзяцца на дыяметральна супрацьлеглых пазіцыях (паміж магнатамі і дробнай шляхтай, а таксама багатымі гараджанамі і простым гарадскім людам).

Шубы магнатаў шыліся з самага дарагога футра (собаль, куніца, гарнастай, рысь). У крыніцах згадваецца, што «шубаадамашковая, кунамн подшнтая» кашталяна Мінскага Яна Глябовіча ацэньвалася ў 40 коп літоўскіх фошай, а другая «кнтайкн черной, горламн куньнмн подшнтая» ў 30 талераў[150].

На шубы памешчыкаў таксама нярэдка ішло дарагое футра (собалі, куніцы, лісы, выдры, рысі, бабры, ваўкі, мядзведзі), якія пакрывалі дарагімі імпартнымі тканінамі (італьянскімі, французскімі, англійскімі і інш.): «шубка влоска внлчая (воўчая), барха765 крыта»[151]; у пана Чурылы з Віцебска — «кажухь мядзьвежн, крнты сукномь муравскнмь», які каштаваў 50 талераў[152] (1578); у памешчыка Станскага — «шубка сукна лунского голубого, лнсамн подшнта кнафлей серебренных чотырнадцать»[153] (1555). Пад 1635 г. сустракаеццашубазвыдры: «взялн вьшру, лнсомь подшытую»[154]. Шубы прывілеяванага саслоўя шыліся як з аднаго футра, так і камбінаваліся двума футрамі: з іншага футра рабіўся каўнер або шуба падшывалася другім футрам па падоле, крыссі, манжэтам.

Дорага каштавалі і шубы зямян (хаця з крыху таннейшага футра), на якія ішло таксама імпартнае (італьянскае, французскае, турэцкае, чэшскае) сукно, сярэбраныя і пазалочаныя гузікі. Іх часцей падбівалі футрам лісы («завыйкамі» — загрыўкамі) або труса, вавёркі, тхара. Так, шубка зямяніна Чарнаруцкага (1582), якая была сшыта з «завыйкаў» ліс і пакрыта італьянскім сукном чорнага колеру з зашпількай на сярэбраныя гузікі, каштавала 16 коп грошаў[155].

Шубы служачых магістрата ні ў чым не саступалі шубам зямян. Служачыя ў Вільні, напрыклад, насілі шубы з футра лісы, вавёркі, труса, тхара, якія былі пакрыты імпартным сукном: «порпьяну гвозднкового, лнсы подбнта, на которой было кнафлей серебряныхь осмь позлотнстыхь»[156]. Такія ж шубы насілі святары, толькі верх рабілі з тканіны чорнага колеру[157].

Баяры-шляхта ў сярэдзіне XVI ст. яшчэ насілі прыкладна такія ж шубы, як і зямяне. Пазней, з пераходам іх у падначаленае становішча, іх адзенне, у тым ліку і футравае, становіцца больш сціплым і танным. У асяроддзі гараджан (у залежнасці ад дастатку) у актах упамінаюцца: «шубка лнсня, муравскнмь сукномь крыта»[158], «шубка белая»[159], «шубка тхоровая»[160], «шубка медвежья, сукномь муравскнмь крытая»[161].

У XVI—XVII стст. даволі часта сустракаецца адзенне пад назвай «футра», «футро», «футэрка» як вопратка розных сацыяльных слаёў. «Футрам» у той час называлі звычайную шубку ці паўшубак з аўчын, лісы або з іншых звяроў поўнасцю наверх з вялікім адкладным каўняром, на падкладцы. Шуба такая шылася розным кроем, а швы аблямоўваліся тасьмой. Спераду яна зашпільвалася на гузікі і петлі. Зверху яе апраналі дэлію. Шубы-футра (разам з іншымі відамі вопраткі, грашыма, тканінамі) выдзяляліся магістратам для сваіх служачых, што дазваляе зрабіць параўнанне з шубамі іншых гарадскіх слаёў. У 1686 г. у актах Магілёўскага магістрата ўпамінаецца «футро московское чорное» за 11 залатых[162] для пана Чарнаруцкага. У 1687 г. на «презенс» на сейм у Гродна павезлі «футро шлямное крыжовое» і «футры шлямнне две лннейные, также крыжовые» (з рыжых лісіц)[163]. Сустракалася і «футро вовче» за 5 талераў бітых[164]: «лнсее завыйковое, которое дей коштовало копь осмь грошей»[165].

У 1679 г. Магілёўскі магістрат купіў «Стенку, пахолку мескому... футро чорное баране»; такое ж чорнае барановае футра было куплена і камендanту, якое апраналася пад кунтуш[166]. Напэўна, яно было без рукавоў ці з кароткімі рукавамі, бо інакш цяжка было б надзець на яго зверху іншую вопратку. «Футра» было таксама і адзеннем воінаў, бо якраз і шылася безрукаўным для зручнасці ў баі. Футра «пахолкаў» (салдат) шылася з больш простага і таннага футра (дзікіх катоў, вавёрак, лісіц). У 1616 г. ёсць запіс пра: «футро попелнчое» (з вавёрак) кош-

там у 8 залатых; «... котовое» (8 залатых), «футро ллсее»[167] за 18 залатых. Зверху футра, каб было цяплей зімой, насілі не толькі кунтуш, але і плашч: «взяль... футро лнсе новое с подь кобеняка»[168].

Шубы і футра вывозіліся з розных беларускіх га-радоў, галоўным чынам, праз Брэст у польскія гара-ды. Яны былі пашытыя з вавёрак, куніц, гарнастаяў, баброў, трусоў, рысей і інш.[169]

Свае асаблівасці на беларускіх землях мела муж-чынская вопратка — «чуга». Руская «чуга» была па-добна на кафтан, але з перахватам у таліі[170]. Чуга, што бытавала ў беларускай шляхты, была доўгай вопраткай на футры (часцей з ваўка)[171]. Аналіз акта-вых дакументаў сведчыць аб даволі шырокім рас-паўсюджанні чугі ў розных слаях шляхты і гара-джан. У сапраўднасці, гэта была тая ж шуба, сшы-тая з рознага футра, а зверху, як і шуба, пакрытая тканінай, якасць якой залежала ад дастатку і пры-належнасці да пэўнага саслоўя.

Невядома дакладна, чым адрознівалася яна ад шубы, магчыма, кроем (прыталеная). Чугу насіла ўся шляхта, у тым ліку і гараджане. Як і іншыя воп-раткі, яна шылася з імпартнага сукна яркага коле-ру, радзей — шэрага, падшывалася не толькі фут-рам ваўка, але і лісы, куніцы. Так, у пана Нядзвец-кага (1590) была «чуга фалюндышовая бурнатная, лнсы подшнтая»[172], у зямяніна Сасноўскага (1577) — «чуга файлюндышовая бурнатная, кнтайкою дуп-лею подшнта сь кгузікамі срэбренымі адлнванымн позлотнстымм»[173], у шляхціца з маёнтка Вепраты значылася «чуга фалюндышовая чырвоная», пад-шытая сукном немецкім цёмна-зялёным[174]. У мяш-чан чугі былі таксама з імпартных тканін на футра-вай падшэўцы і без яе, гэта значыць, сустракалася чуга і халодная.

У XVIII ст. бытавала «ваўчура» — зімовая воп-ратка шляхты, якая шылася з воўчых ці мядзве-джых шкур, зрэдку — з аўчын. Яна накідвалася на кунтуш, была крыта пунсовым атласам і завязвала-ся пад шыяй тоўстымі сярэбранымі ці залатымі шну-рамі[175]. Відаць, гэта была футравая накідка для ван-дровак.

Даследчыкі пішуць пра «кірэю» — плашчападоб-нае адзенне прамога крою з тоўстага сукна кіра, ад якога, відаць, яна атрымала сваю назву[176]. Кірэя мела аналагі ў украінцаў, рускіх і некаторых іншых на-родаў. Зімовыя кірэі нярэдка падшываліся мядзве-дзямі[177].

Верхняй вопраткай гараджан і шляхты ў міжсе-зонне і зімой была капота. Яна была двубортнай з адкладным каўняром і абшлагамі па рукавах, ззаду і з бакоў — з вялікімі складкамі ці зборкамі, зашпіль-валася на шаўковыя або плеценыя гузікі. Зімовыя капоты падбіваліся футрам і падпяразваліся літым поясам. Насілі і жанчыны, і мужчыны.

У кожнага, хто служыў на магнацкім двары, на рэспектавай ці ганаровай службе, якая складалася з сыноў памешчыкаў, дваран, і платнай (з чыноўні-каў-афіцыялістаў і прыслужнікаў «пакаёўцаў»), было адзенне свайго колеру. Ніхто не меў права прысвойваць «чужыя колеры».

Уваходзіцьу залы дваране павінны былі пры шаб-лях з ладункамі ў прыгожым уборы. Ніводны два-ранін не меў права паказвацца без шаблі нідзе. Аба-вязкам іх лічылася таксама трымаць добрых коней з усім багатым прыборам і суправаджаць магната, калі ён едзе ў сталіцу, госці і г. д.

Кучар і фарэйтар апраналіся ў жупаны і ферэзеі і высокія шапкі. За карэтай пана стаялі гайдукі, якія, па словах Булгарына, былі «апрануты па-венгерскі, з высокімі шапкамі»[178].

Паюкі, гайдукі і сакольнічыя, якіх у магнатаў было некалькі дзесяткаў, таксама насілі ліўрэю ко-лераў герба дома. Не толькі колер, але нават і па-крой вопраткі пэўнага роду перадаваліся ад дзедаў і прадзедаў з пакалення ў пакаленне. На рэдуце[179] ў вядомага беларускага магната Караля Радзівіла, па сцвярджэнні Ахоцкага, уся пакаёвая прыслуга была апранута ў жоўтыя атласныя жупаны і блакітныя кунтушы з тоўстымі шнуркамі, гузікамі і кісцямі, апяразана залаталітымі паясамі, з шаблямі на баку, з шапкай і ласінымі пальчаткамі за поясам[180]. Звер-ху жупана паюка накідвалася і феразея[181].

У свіце магната былі пажы, якіх выбіралі з са-мых прыгожых дваранскіх дзяцей. Яны традыцый-на апраналіся ў багаты іспанскі касцюм. У такі ж іспанскі касцюм былі апрануты і скараходы, якія крочылі спераду карэты магната ў час выездаў. На галаве скараходаў была шапка з гербам і страуса-вымі пер'ямі, якую яны не здымалі нідзе, нават у царкве ці прыслужваючы ў пакоях[182].

У ліку простых прыслужнікаў былі пакаёўцы, лакеі, пахолкі, стральцы, фурманы і інш. Пакаёў-цы, выхадцы са шляхты, па словах Ахоцкага, апра-наліся заўсёды аднолькава і былі заўсёды пры шаб-лях. У час абеду з талеркамі ў руках яны стаялі за крэсламі гаспадыні, гаспадара ці гасцей[183]. У царкве гайдукі трымалі шаблю гаспадара, паюкі — малі-тоўнік гаспадыні. Мець гайдукоўлічылася прэстыж-на, таму крыху бяднейшая шляхта старалася прыд-баць хоць аднаго.

Магнаты мелі багаты гардэроб, якім заведваў шатны[184]. У яго распараджэнні знаходзіліся жупа-ны пана з залатой ці сярэбранай парчы, кунтушы, упрыгожаныя цэлымі шнуркамі «перлаў» (жэмчу-га) ці дыяментавых брыльянтавых нітак, з гузікамі з каштоўных камянёў і такімі ж запінкамі, паясы за-латыя і сярэбраныя з усходніх тканін[185] і інш. рэчы.

У XIX ст. застаецца моцным уплыў заходнееўра-пейскай моды на вопратку беларускай шляхты. Вя-дома, што не апошняе месца на манеру апранацца

аказвае асабісты густ, месца ў грамадстве, узрост, урэшце — месца пражывання, што актуальна і сёння. Жыхары невялікіх гарадоў, у параўнанні са сталіцай, напрыклад, апранаюцца з адставаннем ад моды, а старэйшае пакаленне дзесяцігоддзямі трымаецца папярэдняй моды. Новую моду хутчэй успрымае моладзь.

На беларускіх землях гарадскі касцюм, прыняты ў Еўропе, умацаваўся раней, чым у Расіі, дзе ён быў уведзены ўказам Пятра I у 1700 г., і яшчэ спатрэбілася некалькі дзесяцігоддзяў пакуль ён прыжыўся.

Распаўсюджанне модных узораў адзення на Беларусі ішло праз гатовае адзенне, якое прывозілася з-за мяжы, а таксама шылася на заказ майстрамі, часам і прыгоннымі, якое базіравалася якраз на тых жа гатовых узорах і модных часопісах. Сярэдняя і дробная шляхта веды аб модзе атрымлівала ад магнатаў, прыдворных, багатых гараджан, ад якіх яна старалася пераймаць новыя ўзоры вопраткі. На беларускіх землях насілі не толькі заходнееурапенскі касцюм, але і нацыянальна адметны, і змешаны, дзе аснова была мясцовай, з нязначнымі запазычаннямі заходняга ці ўсходняга касцюма. Гэта бачна па многіх прыкладах вопраткі «венгерскага крою», усходніх адзеннях і інш.



**Зімовае адзенне памешчыка з-пад Гродна.** 1891 г.



**Касцюм арыстакратаў.** Канец XIX ст.
Уладзіслаў Браніцкі з жонкай Марыяй з роду Сапег

У XIX ст. верхняя мужчынская вопратка мяняецца па форме, асартыменту вопраткі, па крої і сілуэту. Мяняецца і колер вопраткі. Так, колеры становяцца больш стрыманымі, укарочваюцца асобныя віды вопраткі. У залежнасці ад моды янато прытальваецца, то пашыраецца да нізу, звужаюцца ці пашыраюцца рукавы, у мужчынскім касцюме знікаюць стужкі, карункі і г. д.

Па-ранейшаму у модзе былі кароткія паліто «бекешы», якія ў гэты час шыліся ў талію з вузкімі рукавамі і шчыльна аблягалі фігуру, а ад пояса пашы-



**Зімовы комплекс гараджаніна.**
Канец XIX — пачатак XX ст. Віцебск

раліся ўніз спадніцай у складку. Мелі футравую абшэўку па крыссі, падоле і абшлагам, футравы каўнер, а на грудзях ад каўняра да таліі — 4 рады шнуркоў[186]. Насілі таксама «венгерку» са шнурамі.

У пачатку XIX ст. быў у модзе доўгі рэдынгот (вядомы з XVIII ст.) з двума радамі гузікаў з паўкруглым каўняром. Ён шыўся з шэрага, пясочнага, бледна-жоўтага або бледна-зялёнага сукна ці драпу, які насілі гараджане і шляхта. Былі рэдынготы з брадэнбурамі (шнурамі) у колер тканіны ці чорныя. Цікава, што светлыя рэдынготы прызначаліся для раніцы і дня, цё'мныя — для вечара. Зашпільваліся яны толькі да таліі, а пасля крыссе разыходзілася. Так званы рэдынгот-карык шыўся з некалькімі палярынамі з цёмнага сукна і светлай шаўковай падшэўцы. Спераду ён зашпільваўся да таліі на вялікія гузікі[187].

Двубортныя рэдынготы выкарыстоўваліся як паліто. Шыліся яны з сіняга, зялёнага, карычнева-га сукна з чорным аксамітным каўняром і такімі ж гузікамі (3 пары звычайна), якія ў зімовым варыянце былі з футравым каўняром (з каракуля). Леў Жданаў, апісваючы вопратку дыпламата і журналіста таго часу, заўважае, што гэта быў «лысый блошшн в реднноте...»[188]. Да таго ж рэдынгот меў звычайна прыгожую чырвоную шаўковую падшэўку.

У дваранскім быце ў гэты час быў «культ мундзіра».

Усе саслоўі насілі шынялі з доўгай палярынай і круглы плашч іспанскага крою з каўняром, які ў дождж закрываў вушы, а таксама бурнус (з капюшонам), аздоблены шнурамі. У модзе было паліто-сак, запазычанае ў англічан, якое шылася і доўгім, і кароткім. Плашчы сярэдзіны XIX ст. мелі форму рэдынготаў і карыкаў, пазней — сака з палярынай і планкай на спіне[189]. Яны мала чым адрозніваліся ад паліто. У модзе цывільных замацаваўся чорны колер. Шубы другой паловы XIX ст. мелі таксама форму сака з футравым каўняром, вылогамі і абшлагамі, часам абшываліся шнуркамі. У залежнасці ад прызначэння яны былі рознай даўжыні: ніжэй ка-лен — для паўсядзённасці і доўгія — для вандровак.



**Касцюм гараджан.** Канец XIX — пачатак **XX ст.** Гомель



**ЗІмовы касцюм сялян.** Канец XVIII ст. «Літоўскія (беларускія) сяляне». Мастак Ф. Смуглевіч

У першай палавіне XIX ст. у мяшчанскім асяродку знікае такое традыцыйнае адзенне чыноўніцтва і багатых гараджан, як кунтуш з бліскучым поясам. Разам з тым святочным адзеннем рамеснікаў у пачатку XIX ст. па-ранейшаму заставаўся кунтуш.

Сялянская верхняя вопратка шылася па большай частцы з тоўстага і грубага даматканага сукна ці паўсукна. Пры гэтым пастаянна захоўвала свае асноўныя рысы: была зручнай для работы і жыцця, шылася з танных тканін і футра, са стагоддзя ў стагоддзе перадаваўся яе крой, упрыгожанні, спалучэнне асноўных колераў і г. д. Верхняя вопратка шылася, па большай частцы, з сярмяжнага сукна хатняй вытворчасці і была як натуральных колераў (белага, шэрага, чорнага), так і фарбаваная ў карычневы, руды, жоўты з дапамогай карэнняў, кары, траў.

Вядома, што адзенне простага народа рэдка трапляла ў актавыя дакументы, дзе зафіксаваны, у асноўным, дарагія вопраткі і футры прывеліяванага саслоўя. Тым не меней у розныя часы сялянская вопратка ўспамінаецца ў якасці ўкрадзеных або страчаных рэчаў.

У XVI—XVII стст. у актах часцей сустракаюцца сярмяга (світа), кажух, паўшубак як верхняя вопратка простых гараджан: «Макарава шуба», «Пруднікова сярмяга»[190]. Гэтыя вопраткі фігуруюць і ў адзенні магістрацкіх слуг. Так, у 1699 г. да Вялікадня Магілёўскім магістратам было выдана: світа Сямёну-пушкару[191], у 1698 г. — «світу белую» далі пушкару Мялешку[192], у 1690 г. Фёдару-дворніку «купнлн полушубокь короткнй в дорогу» за 5 залатых, а апальшчыку — «сярмягу» за 6 залатых[193], у 1695 г. пляцовым вартавым былі выдаткаваны грошы на кажухі, а пушкару — гатовая сярмяга[194].

Як вынікае з дакументаў, сярмяга, кажух, паўшубак, сшытыя з самаробнага сукна і аўчын, былі вопраткай магістрацкіх слуг (пушкароў, дворнікаў, майстроў, клікуноў, пахолкаў, ратушных і г. д.) у асенне-зімовы перыяд. Каштавалі гэтыя віды вопраткі танна: «мнстру (кату) Аснпу кожухь рочный купнлн, далн золоть десеть» (1670), «кожухь для Тншка челяднннка... заплатшш шубнику Омеляну 9 золотыхь»(1681)[195].

У сялян звычайна рабавалі ў час разбою шапкі, кажухі, сярмягі, паясы. У 1582 г. у манастырскіх сялян, якія былі на рубцы лесу, «порубшш сярмягу, кожухь»[196]. Сярмягі як вопратка магілёўскіх мяшчан згадваюцца ў дакументах №11, 15, 16, 53, 205, 276, 497, 543, 562, 619)[197]; гродзенскіх мяшчан (1555 г.) — «сярмяга серая мужская» (№ 583, 961, 978), «кожухь мужской» (№ 961), «сукмань» (№ 256), «деруга» (№ 212)[198], простая вопратка (кажух) за 30 грошаў магілёўскага каваля[199]. Для селяніна з яго маленькім заробкам верхняя вопратка лічылася вялікай каштоўнасцю, страта якой патрабавала вялікіх выдаткаў і цяжкай працы. Нездарма ўбеларусаў існавала прыслоўе: «Калі б не ежа, ды не адзежа, дык апрогся б чалавек лежа». Вельмі часта яна служыла не аднаму пакаленню: ёю карысталіся і дзяды, і бацькі, і ўнукі.

Л. А. Малчанава, зыходзячы з факту адсутнасці ў палякаў вопраткі пад назвай «сярмяга» і разам з тым шырокага бытавання яе ў асяродку рускага сялянства, лічыць сярмягу распаўсюджанай вопраткай беларускіх і рускіх сялян[200]. Сярмяга была і вопрат-кай гарадской беднаты. У халоднае надвор'е «блаз-нота» накідвала на плечы старую бацькоўскую сяр-мягу, у больш заможных яна шылася краўцом спе-цыяльна на заказ. У 1578 г. магілёўскі мешчанін скар-дзіўся на нейкага Гаўрылу, які ўзяў і не аддае дзве дзіцячыя сярмягі: адну белую новую, якая каш-тавала 42 грошы, і старэнькую — за 22 грошы, якую яны знялі з сябе ў час гульні[201].

У XVIII ст. самаробныя тканіны, з якіх шылася верхняя вопратка шырокіх слаёў гараджан, актыў-на выцясняюцца крамнымі, як замежнай вытвор-часці, так і вырабленымі на шарсцяных і палатня-ных мануфактурах у Гродне, Ружанах, Слоніме, Нясвіжы. Сяляне ж па-ранейшаму карысталіся са-маробнымі. Толькі ў XIX ст. фабрычныя тканіны пачынаюць пранікаць у вёску праз заможных сялян, галоўным чынам моладзь.

Раней за ўсё капіталістычныя адносіны і разам з імі знікненне старых форм сялянскага адзення (дакладней, замяшчэнне яго пераходнымі строямі, арыентаванымі на гарадскую культуру) адбываліся паблізу гарадоў і мястэчак. Вось што пісаў У. Сыракомля аб адзенні сялян, жыўшых уздоўж Нёмана, якія зімой зараблялі ў мястэчку сякерай, а летам — хадзілі на плытах ці віцінах: «замест старасвецкай сярмягі, барановаі высокай шапкі і ліпавых лап-цей... убачыш у мужчын і жанчын якуюсь эмансі-піраваную капоту...»[202] А на арэндатарах вялікіх і малых фальваркаў, як заўважае аўтар, можна ўба-чыць «панскі фрак»[203].

Уплыў гарадскога касцюма праяўляўся і ў тым, што ў мястэчках і нават у вёсках маладыя сяляне ў канцы XIX ст. пачыналі насіць «сюртукн», «жнлеты», «пнджакн», «казакнны». Верхняя вопратка (світа) тут мела назву «жупан»[204]. Так, у жыхароў мястэчка Дрыбін і блізкіх да яго вёсак, як заўважа-юць сучаснікі, адзенне рэзка адрознівалася ад ся-лянскага і кроем, і тканінай, было з танных фаб-рычных тканін: каленкору, паркалю, шэрсці, сук-на. Пашыраўся асартымент складаючых элементаў касцюма, ва ўжытак уваходзілі шалікі, манішкі, па-расоны, пальчаткі[205] і г. д. Сыракомля заўважыў, што мода не даходзіць да глухіх мясцін, а таму залежыць тут ад фантазіі местачковага краўца Лэйбуся[206].

Па сведчанні Брэна Келясціна, святара з Бельскага павета (што каля Белавежскай пушчы), «пад-



**Вопратка жыхароў г. Хоцімска.** Канец XIX ст. Фота Блажко

гародныя жыхары і мазуры» насілі асобую верхнюю вопратку — капоту, якая ўяўляла даўгаполы сюртук з шэрага, чорнага ці сіняга сукна, абшыты белай ці іншага колеру тасьмой. Яна мела гузікі, да якіх прышывалася тасьма, дзякуючы чаму капота мела выгляд гусарскага сюртука. Каля Бельска насілі капоты з невялікім каптуром[207], а ў жыхароў Ашмянска-га павета Віленскай губерні капота шылася з простага сукна з адкладным каўняром, са зборкамі ці фалдамі каля паясніцы, ззаду мела 4 гузікі і зашпільвалася спераду на гузікі толькі да пояса[208].

Уплыў гарадскога касцюма праяўляўся і ў запазычаных сялянамі пэўных відах мяшчанскага адзення, як, напрыклад, прыталенага «казакіна» ці «казачыны», які з'явіўся ў заможных сялян і шляхты і шыўся з сукна. Яго насілі замест сярмягі[209].

Верхняя вопратка вясковых беларусаў XIX — пачатку XX ст. была расхіннай, аднабортнай ці двубортнай (у залежнасці ад шырыні самаробнага сукна, якое звычайна складала 70—80 см), часцей шылася без падкладкі, мела нізкі стаячы ці адкладны каўнер і зашпільвалася на гаплікі або гузікі. Існавалі два яе варыянты: доўгі і кароткі. Селянін, па словах М. Нікіфароўскага, у лепшым выпадку меў дзве змены верхняй вопраткі. Звычайна вопратка насілася да тае пары, калі, на думку народа, толькі заставалася «з плеч ды ў печ»[210].

Беларускія этнографы на тэрыторыі Беларусі XIX — пачатку XX ст. выдзяляюць некалькі тыпаў верхняга суконнага адзення. Самым пашыраным было адзенне тыпу «світа» прамога халатападобнага крою, да якога яны лагічна адносяць сярмягу, армяк, бурнос, бурку, халат. Яно шылася прамым, нідзе не звужалася, па баках для шырыні ўстаўляліся кліны. Рукавы прамыя. Каўнерадкладны. Такі крой адзення, нягледзячы на яго бытаванне па ўсёй тэрыторыі Беларусі, быў больш характэрны для паўночнай яе часткі (Віленскай, Віцебскай і поўначы Мінскай губерняў)[2]". На паўднёвым усходзе і захадзе Беларусі, дзе таксама бытавала халатападобная вопратка, часта сустракалася світа з «вусам», калі па баках ад лініі таліі ўстаўляліся трохвугольныя кліны («вусы»). Такі тып не вядомы ў паўночнай і паўночна-заходняй частцы Беларусі. Світа з «вусам» бытавала ў Магілёўскай, паўднёвых раёнах Мінскай губерняў і на Палессі. Хаця і для гэтых рэгіёнаў гэты тып вопраткі не быў адзіным, а меў лакальныя адрозненні. Так, у Магілёўскай і Мінскай губернях світа з «вусам» шылася ў стан, а шырокія бакавыя кліны збіраліся ў зборкі. Яна

мела нізкі стаячы каўнер і зашпільвалася толькі на гаплікі[2,2].

П. В. Шэйн пісаў, што даўгаполыя мужчынскія світкі палешукоў мелі ззаду ніжэй «стана 2 адтапыраныя фалды («вусы», па тутэйшаму), кожная ў выглядзе, так, што ніжнія часткі бываюць адтапыраны на 4—5 вяршкоў», і зашпільвалася гэтая світка, якая называлася «латуха», на гаплікі[213]. Але часам і світка была адзінай вопраткай у доме, аб чым сведчыць народная прымаўка: «Жытка: на двух адна світка».

Часта мужчынскія світы не зашпільваліся ўвогуле, а падпяразваліся поясам, які два або некалькі разоў абвіваў стан і дзвума канцамі спускаўся ўніз. У Моталі, напрыклад, мужчынская світа часта падпяразвалася чырвоным або сінім поясам[214]. Чырвоным паскам падпаясваліся грубыя сярмягі сялян каля Свержаня і Нясвіжа[215].

Мужчыны любілі падпяразвацца паясамі, якія не толькі ўпрыгожвалі вопратку, але і рабілі яе зруч-най. Нярэдка паясы ўпрыгожваліся невялікімі ку-тасамі (3—5 см) ці заканчваліся махрамі. Падпя-разваліся і вузкімі паясамі («крайкамі») шырынёй 2—Зсм.

Верхняя вопратка сялян заўсёды шылася краўцамі. Часам іх запрашалі дамоў. Яны тут жа рабілі прымеркі, шылі ўручную і жылі ў сям'і да тае пары, пакуль не будзе скончана работа і атрымана ўзнагарода. За пашыў мужчынскай шубы краўцу плацілі 30—40 капеек, а за світку ці іншы від суконнай вопраткі да 15 капеек[216]. Праца аседлых краўцоў цаніла-ся крыхударажэй.

Вядомы гісторык Мікалай Улашчык зазначаў, што кравец, які жыў у доме заказчыка ў вёсцы Віцькаўшчына, харчаваўся тут і адпраўляўся дамоў толькі насвята. Плацілі ямузбожжам ці грашыма[217].

І. А. Сербаў адзначаў, што у палян, якія жылі па левым беразе ракі Прыпяці, побач са звычайнай беларускай світкай без усялякіх аздоб, са стаячым каўняром, якая «шчыльна ахоплівае паясніцу, а на клубах разыходзіцца 2 клінамі, альбо «кідзёрамі», у якіх ушываюцца невялічкія кішэні», было пашырана доўгае цяжкае світно з «вусам». У такой світцы кожны клін на месцы сваёй устаўкі на рубцах утвараў падабенства «вусоў», што апускаліся ўніз ад паясніцы»[21]*. Пры гэтым ён падкрэсліваў адсутнасць якой-небудзь абшыўкі світна, адзіным упрыгажэннем у святочным варыянце служыў пояс.

Прымаючы пад увагу шматлікія даследаванні, трэба падкрэсліць, што крой світак быў вельмі разнастайным і не абмяжоўваўся толькі адзначанымі вышэй тыпамі. Шыліся світы таксама і з адразной спінкай па лініі таліі, ззаду — зборкі, пярэдняе крыс-се прамое. Паводле дадзеных этнаграфічных даследаванняў, часцей такі тып сустракаўся ў Магілёўскай губерні і паўднёвых паветах Мінскай (Мазырскі,



Селянін у **сярмязе.** Вёска Вялікія Азёркі Гродземскай губерні. 1914 г. Фота І. Якубені



**Касцюм заможнага селяніна** са світкай, баранкавай шапкай, ботамі. Вёска Мерачоўшчызна Косаўскага павета. 1937 г. Фота Ю. Шыманчыка



**СялянскІ комплекс са світкай.** Вёска Гошча Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. 1940-ыя гг.

Рэчыцкі і інш.), спарадычна — у Гродзенскай губернях[219].

У паўднёвых паветах Мінскай губерні былі пашыраны світы з фалдамі. Яны выглядалі так: світа шылася да стану за кошт глыбокіх вытачак ад проймы рукавоў да таліі, якія ніжэй таліі ўтваралі фалды («хвалды», «фанды»)[220]. У адрозненне ад жаночай мужчынская світа па большай частцы не ўпрыгожвалася.

На поўдні Беларусі, а таксама на ўсходзе шэрага паветаў Магілёўскай губерні сустракаліся світы з падразнымі бачкамі. Пярэдняе крыссе світы пры гэтым было прамым, а спінка з бакоў падразалася настолькі, што ў цэнтры толькі на 10—12 см заставалася неадразной. Падразныя бачкі прызборваліся («моршчыліся») і прышываліся да верхняй часткі, дзякуючы чаму світа шчыльна аблягала фігуру. Такі крой падабаўся і моладзі.

У XIX ст. світы, па традыцыі, шыліся з белага або шэрага сукна ці паўсукна розных адценняў (карычневага, жоўтага, сіняга («сіняціны») і інш., якія, аднак, не даходзілі да чыста-чорнага[221]. Звычайна на кірмашы або іншыя святочныя зборышчы, у царкву селянін апранаўся ва ўсё белае. Пра прыхільнасць беларусаў да белага колеру адзення вельмі яскрава сведчаць словы М. Я. Нікіфароўскага, які сцвярджаў, што гэта стварала гармонію белізны, «одно светлое море одежды, обувн н головной покрышкн, н эта белнзна как-то отрадно сочеталась с белнзною душн н сердца всегда прямодушного, бесхнтростного простолюднна»[222].

У канцы XIX — пачатку XX ст. каляровая гама сялянскай вопраткі мяняецца за кошт пашырэння



**Селянін з ваколіц Пінска.** Фота Георгіеўскага. 1933 г.



**Світка** (выгляд спераду і ззаду). Вёска Пагост Старобінскага раёна Мінскай вобласці. Пачатак XX ст. Малюнак С. Гунько

цёмных колераў (больш зручных для працоўнай дзейнасці), у тым ліку і ўкаранення ва ўжытак чорнага колеру. П. В. Шэйн з адценнем смутку заўважыў, што «зараз ужо нельга ўбачыць белай сцяны, якая ўтваралася насовамі, белымі хусткамі, наміткамі, белымі шубамі, белымі сярмягамі. Цяпер гэта сцяна робіцца стракатаю, пялёсаю, і ў ёй толькі мільгае, а не пераважае белае адзенне»[223]. Гэтая тэндэнцыя будзеўстойлівай і надалей. Пададзеныхдаследаванняў беларускіх этнографаў 1950—1970 гг., праведзеных ва ўсіх рэгіёнах Беларусі па вывучэнні традыцыйнай вопраткі, адзначаны межы скарачэння белай вопраткі і распаўсюджанне шэрай, чорнай, карычневай, сіняй. Белы колер адзення пераважаўтолькі ў Быхаўскім раёне Магілёўскай і Рагачоўскім Гомельскай вобласці, сіні — на памежжы з Расіяй, дзе традыцыйна была пашырана вопратка з сіняга сукна[224].

Вопратка з простага хатняга сукна тыпу «світа», якую дарэвалюцыйныя даследчыкі часта называлі «сярмяжнай», мела лакальныя назвы: «сярмяга», «армяк», «бурка», «бурнос», «латуха». Хутчэй за ўсё, у шляхты былі запазычаны назвы «жупан», «кун-



**Халат** (выгляд спераду і ззаду). Пачатак XX ст. Вёска Карані Смаргонскага раёна Мінскай вобласці. Малюнак С. Гунько



**Тыпы крою світак**



**Селянін у світцы і магерцы.** Вёска Гліннае Столінскага павета Гродзенскай губерні



**Селяне ў світках.** Вёска Велюнь. 1939 г. Фота Георгіеўскага

туш», «сукман», якія, як і «казачына», «чуйка», «чух-мень», «капота», сустракаліся радзей.

Назвы суконнай верхняй вопраткі, як, напрык-лад, «казачына», указвае на крой (адразная па таліі са зборкамі). «Чуйка» («чухмень», «чакмень»), якая вызначалася шырокім адкладным каўняром, а, ня-рэдка, і башлыкам, сустракалася пераважна ў па-межных з Расіяй раёнах.

Многія назвы не звязаны з кроем вопраткі і з'яў-ляліся запазычаннямі ў суседзяў (рускіх, палякаў). Нягледзячы на аднолькавую назву вопраткі ў роз-ных раёнах, яна істотна адрознівалася і па крої.

М. Я. Нікіфароўскі дае такую класіфікацыю «сяр-мяжных адзенняў», дзе выдзелены балахонны, каф-танны пакрой, каўняровы і «знізкі і сподкі»[225]. У ёй, аднак, няма адзінага тыпалагічнага прынцыпу, бо «знізкі і сподкі» азначаюць вулічную і хатнюю воп-ратку, а балахонны і кафтанны крой — прамое і прыталенае адзенне. Агульнай адзнакай усіх разна-віднасцей гэтай вопраткі, на яго погляд, было тое, што шылася яна без падкладкі і «пакрышкі», толькі каўнер быў двайным. Аднак і гэта акалічнасць не мела строгага канона.

На падставе шырокага кола крыніц існуюць асаб-лівасці суконнага верхняга адзення. Так, суконная сярмяга, якую насілі і мужчыны, і жанчыны з ся-рэдневякоўя, у канцы XIX — пачатку XX ст. была часцей прамога крою, двубортнай, кароткай або доў-гай да пят, адразной і неадразной па таліі, з башлы-ком ці без яго, часцей з адкладным каўняром, з заш-пількай на кручкі («гаплікі»), радзей на драўляныя гузікі («бірулькі»), з кішэнямі. Пашырана яна была ўпаўночныхраёнах Віцебскай, Магілёўскай, Вілен-скай і часткова — у Гродзенскай губернях. Прамыя, з устаўнымі клінамі па баках, на гузіках, з адклад-ным каўняром сярмягі, якія былі ніжэй калена, насілі сяляне і на працу, і на свята. У народзе гава-рылі: «Жупан — не вялікі пан, а сярмяга — не вялі-кая знявага».

У Віцебскай вобласці сустракаліся і адразныя па таліі са зборкамі сярмягі (в. Нізы Лёзненскага раё-на)[226]. На Гродзеншчыне (в. Дранаўцы Зэльвенска-га раёна) прамога крою сярмягі з шэрага даматка-нага сукна ў пачатку XX ст. нярэдка называлі «капо-тай», а з густымі зборкамі-«фандамі» па баках (пад-разныя па таліі), абшытыя «аксамітавай тасьмой» і вышытыя «горынню», — «сярмягай»[227].

Армяк, шырокае бытаванне якога ў паўночнай і паўночна-ўсходняй частцы Беларусі этнографы звяз-ваюць з распаўсюджаннем старавераў у гэтым рэ-гіёне[228], быў большай частцы прамога крою. Распаўсюджанне яго звязана не толькі са стараве-



БуркI (а — без башлыка, *б* — з башлыком). Вілейскі раён Мінскай вобласці. Малюнак Л. Маленкі

рамі, а ў першую чаргу з тым, што армякі шырока завозіліся на тэрыторыю Беларусі з Расіі і вядомы яшчэ ў сярэдневякоўі як вопратка прывілеяванага, так і няздатнага слаёў рускага насельніцтва. Мытныя кнігі часта ўпамінаюць армяк у якасці тавара, які завозіўся ў тэты час з Расійскай дзяржавы на беларускія землі: напрыклад, Сяргей Семяновіч, які быў родам з Белага (Расія), прывёз у Віцебск, як сведчыць мытная кніга ад 12 студзеня 1605 г., акрамя аўчын шмат армякоў барановых[229]. А жыхар г. Тарапца Міхаіл Кузьмін паставіў у Віцебск шмат тулупаў і шуб барановых, епанчаў, сярмяг гатовых, а таксама футра лісіц, норак, куніц, гарнастаяў, выдраў[230].

Як і сярмяга, армяк часам служыў плашчападобнай вопраткай, меў адкладны каўнер, шырокія свабодныя рукавы, з бакоў — кліны, праразныя кішэні з боку, часам — 1 карман на грудзях. Шыўся армяк доўгім да пят ці ніжэй каленяў з простага чорнага ці шэрага сукна без шва ў таліі («без стана і фалд»)[231], зашпільваўся на гузікі і падпяразваўся поясам ці раменнай дзягаю са спражкай. Часта армяк меў башлык, што было абумоўлена яго функцыянальным прызначэннем — ахоўваць ад дажджу і



Бурное э башлыком (а — выгляд спераду, *б* — выгляд ззаду). Ашмянскі раён Гродзенскай губерні

сцюжы. Зрэдку армяк называлі «шараком» (в. Азярцы Талачынскага раёна Віцебскай вобласці)[232].

Уладзіслаў Сыракомля вельмі яскрава адзначыў прыхільнасць беларуса да пэўных відаў вопраткі:

Ды найболей даспадобы
Капялюшык і каптаны. Што казаць
аб світцы нашай! -Крой дзівоцкі,
неўжываны, І відно, што
гарапашны. Кройма світкі на
каптаны![233]

Доўгая мужчынская верхняя вопратка з башлыком, шытая з даматканага валенага сукна, часцей без падкладкі, мела назву «бурка», або «бурнос», і была мадыфікацыяй армяка. Лічыцца, што яна прыйшла ў Еўропу з Усходу. Бурка атрымала шыро-кае распаўсюджанне ў Беларусі, бо доўгая, амаль да пят вопратка з шырокімі рукавамі, з башлыком была да густу селяніну, якога ўратоўвала ў халоднае ці дажджлівае надвор'е. На грудзях і па баках рабі-ліся праразныя кішэні, на спіне — хлясцік. Селянін апранаў бурку на іншыя адзенні (світку, кажух, паўкажух), каб яны не прамакалі і каб было цяплей. З-за прамога крою бурку часта называлі «халатам». У Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці мужчын-скія суконныя халаты мелі назву «ёсенкі», а крыху ніжэйшыя за калена буркі ў асобных вёсках Слуцкага раёна называліся «палітонамі»[234].

Бурка часам шылася на падшэўцы да пояса з простага ці «андарачнага» палатна (в. Канатоп Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці, в. Карані Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці і інш.)[235]. Асаблівасцю пакрою буркі, акрамя іншага, быў разрэз ззаду («распорка») і хлясцік з гузікамі («пута»). У в. Пераброддзе Міёрскага раёна Віцебскай вобласці, па словах інфарматараў, бурка з'явілася «пры Польшчы» і ад армяка адрознівалася накладнымі манжэтамі на рукавах, а таксама хлясцікам і башлыком. Была на палатнянай падшэўцы да паловы буркі[236]. Буркабылаякрабочай, так і святочнай вопраткай.

У пачатку XX ст. шмат хто з мужчын, як пісаў М. Улашчык, меў параднае зімовае паліто, у якім хадзілі ў царкву ці ў госці[237]. Гэта, аднак, не было характэрнай з'явай для сялянскай беднаты, а больш для сераднякоў і заможных сялян і гараджан. Сам аўтар піша далей, што такое паліто купялі раз у некалькі дзесяцігоддзяў[238]. Да таго ж яго часта насілі па святах усе дарослыя члены вялікай сям'і.

Адзенне ваколічнай шляхты ў гэты перыяд мела свае асаблівасці. Яна не насіла лапцей, паясоў. Шлях-та (в. Шапілавічы Любанскага раёна Мінскай вобласці), паўспамінах Багдановіч Марыі Іванаўны, на кажухі насіла суконныя халаты, а таксама доўгія буркі з башлыком (сяляне ж — «світкі з таўкачамі»).



**Бурка.** Вёска Колбы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Сярэдзіна XX ст.



**Бурка без башлыка** (выгляд спераду і ззаду). Пачатак XX ст. Вёска Дамашы Маладэчанскага раёна Мінскай вобласці. Малюнак Л. Маленкі

У адрозенне ад сялян, якія шылі кажухі з заборамі («таўкачамі»), шляхта любіла апранацца ў «казачыны»[239].

У XIX ст. стыль жыцця і культурныя патрэбы сярэдняй і дробнай шляхты збліжаліся з сялянствам і гарадскімі рамеснымі кругамі. Гэта тэндэнцыя прасочваецца і ў адзенні. А. Міцкевіч, характарызуючы адрозненні шляхты ад сялян, якая вылучалася «сваім уборам несярмяжным, для мужыка пакуль што недасяжным», між тым піша, што яна носіць шарачкі, а па святах кунтушы, «на працоўны горб напятыя»[240]. З гэтага вынікае, што адрозненняў значнаменш.чымдазваляладваранскаяпыхашлях-
ты. Той жа шарачок і кунтушык часцяком шыліся з даматканага сукна.

Нягледзячы на акрэсленую сацыяльную дыстанцыю, як заўважыў Б. Бараноўскі, аўтар кнігі «Народная культура XVII—XVIII вв. на землях центральной Польшм», сяляне ахвотна падхоплівалі моды і звычаі шляхты[241].



**Паліто з хатняга сукна** (выгляд спераду і ззаду). Вёска Лоўча Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Малюнак С. Гунько

У Ашмянскім павеце Віцебскай губерні ў42 вярстах ад Ашмян у якасці святочнай вопраткі шарачковай шляхты другой палавіны XIX ст. згадваецца «капота» з простага сукна з адкладным каўняром, са зборкамі ці фалдамі каля пояса. Ззаду каля пояса прышываліся 4 гузікі, спераду зашпільвалася на гузікі ў адзін рад толькі да таліі[242].

Зімой шляхта насіла суконныя сурдуты даўжынёй да пят, фарбаваныя ў чорны колер. Калі вопратку шылі з шэрага сукна, то на швы нашывалі чорную або белую стужку. Сурдуты насілі ў Гродзенскай і Віленскай губернях[243], таксама як і капо-ту — верхнюю суконную вопратку з жоўтымі гузікамі. З верхняй вопраткай шляхціц завязваў на шыі хустачку.

Максіміліян Маркс як сучаснік адзначаў, што ў пачатку XIX ст. «чыншавікі», якія ў гэты час нічым не адрозніваліся ад прыгонных сялян, у будзённыя дні апраналіся ў тыя ж зіпуны і ў лапці, што і сяляне. Толькі па святах, пры наведванні горада, мужчыны дазвалялі сабе апрануцца ў шэрыя чамаркі і боты[244]. Паводле дадзеных палявых этнаграфічных даследаванняў 1958 г., вынікае, што ў канцы XIX—пачатку XX ст. чамара шылася не толькі з шэрага і чорнага сукна, але і з белага. Яна захоўвала пры гэтым у асноўным свой крой з сярэдневякоўя, калі была верхняй вопраткай шляхты і мяшчан. Класічная чамара шылася двубортнай, мела падрэз у таліі і стаячы каўнер. Мужчынская чамара з белага сукна хатняй работы з в. Нарцэвічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці ўвасобіла ў сабе гэтыя рысы[245].

Побач з доўгай вопраткай у сялян шырока бытавала кароткая, якая, на думку этнографаў, была больш позняга паходжання і з'явілася толькі ў XIX ст.[246] Аднак, як вынікае з актавых матэрыялаў, кароткае верхняе адзенне шырока бытавала ў сярэдневякоўі і нават раней, аб чым яскрава сведчаць гістарычныя дакументы і, думаецца, узнікла разам здоўгім.

Кароткая вопратка з сукна, палатна ці корту ў беларусаўбыла450 разнастайнай: «каптан», «каптанік», «світка», «сярмяжка», «армячок», «казачынка», «курцік», «кабат», «юпка», «кулёк», «паддзёўка», «марынарка», «сардачок», «шварка», «пінжак», «насоў», «шарапан», «бурка», «касталон», «фрэнч», «каратайка», «палусвітка», «паўпальтка», «паўпальто», «пальціна», «жакетка», «сюртук», «куфайка», «кітлік», «серак», «бравэрка», «кацавейка» і інш.

Адны назвы адносяцца як да жаночага, так і да мужчынскага адзення, другія — выключна да мужчынскага. Да мужчынскага можна аднесці бравэрку, марынарку, сюртук, фрэнч. Трэція мелі вузкалакальнае пашырэнне на тэрыторыях, памежных з іншымі народамі: рускімі, палякамі, украінцамі, літоўцамі і часта былі запазычаны ад іх (сардак, паддзёўка, армячок, кацавейка і інш.).

Вызначальнай рысай кароткага адзення было тое, што яно было кароткім і зашпільвалася на гузікі. Выключэннем была аднабортная світка, якая зашпільвалася на адзін гаплік на таліі[247]. Адзенне прамога крою (двубортнае і аднабортнае) з адкладным каўняром мела найбольшае пашырэнне. З бакоў часта ўстаўляліся кліны, часам ззаду прышываўся хлясцік, рукавы прамыя.

На Віцебшчыне і Міншчыне кароткі мужчынскі пінжак з даматканага сукна цёмнага колеру без падкладкі меў назву «кулёк» і быў падобны на фрэнч. Святочныя кулькі шыліся на падкладцы. Насілі іх і зімой, і летам. Толькі ўзімку кулькі насілі на спецыяльнай падзёвачцы, якая была звычайнай падшэўкай на ваце ці кудзелі[248]. З дапамогай падобнага роду падзёвак вырашалася праблема ўцяплення і іншых



**«Каптан» э самаробнага сукна** (выгляд спераду і ззаду). Пачатак XX ст. Вёска Бродніца Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці. Малюнак С. Гунько



**Паўпальто** (выгляд спераду і ззаду). Пачатак XX ст. Вёска Парэчча Пінскага павета. Малюнак Л. Ракавай

відаў суконнай вопраткі (напрыклад, «шварка», «бурка», «каптан», «пінжак» і г. д.).

Сярод кароткай мужчынскай вопраткі заходніх раёнаў Беларусі часта сустракаецца кафтан (кап-тан), які шыўся звычайна з даматканага або танна-га фабрычнага сукна (зрэдку — з ільнянога палат-на) на падкладцы (у тым ліку на ваце). У народзе казалі: «Чаму ж бы не пан, калі новы кафтан».

Вызначаўся каптан кроем да стану і быў вопрат-кай магнатаў, багатых гараджан і шляхты ў XVI ст. Шыўся ён з дарагіх тканін (аксаміту, тонкага сук-на) і быў адразным па таліі, ніжняя частка якога збіралася ў зборкі. Сялянскі каптан адрозніваўся перш за ўсё тканінай, часцей быў прыталены, дву-бортны, хаця сустракаліся і прамога крою. Так, у пачатку XX ст. на тэрыторыі Лунінецкага і Петры-каўскага раёнаў Брэсцкай вобласці былі вядомы кап-таны як мужчынскае і жаночае адзенне да стану з той розніцай, што мужчынскія шыліся з чатырма клінамі «фандамі», а жаночыя — з 8[249]. У Зэль-венскім, Мастоўскім, Дзятлаўскім раёнах Гродзен-скай вобласці, Пружанскім раёне Брэсцкай зафік-саваны каптаны прамога крою, у тым ліку і на ваце, якія пры гэтым мелі назву «ватовік»[250].

Бравэрка як кароткая мужчынская вопратка, была вядома сялянам-беларусам яшчэ з феадаль-нага часу. Дастаткова ўспомніць словы М. Гусоў-скага, які жыў у той час:

> Толькі ў жніво ды ў касьбу і на ніве і ў лузе
> Бела ад хустак, намітак, кашуль і бравэрак![251]

«Бравэркай» («браваркай») у канцы XIX — па-чатку XX ст. называлі кароткую мужчынскую воп-ратку з аўчын, пацягнутых зверху самаробным сук-ном ці суконны пінжак без падкладкі з накладнымі кішэнямі на грудзях і праразнымі збоку, якую на-сіла шарачковая шляхта. Бравэрка часта мела баш-лык і хлясцік на спіне (Нясвіжскі раён)[252].



**Палатняная целагрэйка на ваце.** 1940—1950-ыя гг. Веска Янавічы Клецкага раёна Мінскай вобласці. Малюнак С. Гунько



Жакетка э хатняга сукна (выгляд
спераду і эзаду). 1944 г. Вёска Дзяніскавічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Малюнак Л. Ракавай

Кулёк. 1950-ыя гг. Вёска Заазерцы Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці. Малюнак С. Гунько

Марынарка з самаробнага сукна. Сярэдзіна XX ст. Вёска



Бялевічы Лідскага раёна Гродзенскай вобласці. Малюнак С. Гунько



Для заходніх раёнаў характэрны такі тып мужчынскага суконнага пінжака, як марынарка. Шылася яна з сукна ці паўсукна (зрэдку з палатна) прамога крою, двубортнай, з вялікімі накладнымі кішэнямі (часам з праразнымі), а таксама расшыраная (з клінамі), праразнымі кішэнямі, адкладным каўняром (Астравецкі раён Гродзенскай вобл.). У Ваўкавыскім і Мастоўскім раёнах марынаркі рабілі на падкладцы, а зімовыя — на ваце[253]. Марынаркі насілі не толькі на Гродзеншчыне, але і на Брэстчыне.

Шырока ўжываліся назвы кароткай вопраткі: «куртка» («курцік»), «паўсвітка» ці «світка», «сярмяжка», «армячок» і інш. Яны ўяўлялі сабой укарочаны варыянт пэўных відаў вопраткі, якія насіліся паўсюдна. Так, на Палессі курткі шыліся з «вусамі» і ўпрыгожваліся шнуркамі, кутасамі, іншага колеру сукном і г. д. Яны то шыліся прамымі, то да стану, то з прамымі, то звужанымі рукавамі і г. д. Варта адзначыць, што функцыянальна кароткая суконная вопратка, якідоўгая,прызначаласявыконвацьролю плашча ў вясенне-асенні час, а ў зімовы — цёплай вопраткі (калі была на спецыяльнай падбіўцы) ці ролю плашча (апранутая зверху кажуха ці світкі), утвараючы разам з ім «знізык».

Насоў, балахон, кізель, касталон, якія шыліся з льнянога палатна, пераважна белага колеру, на Віцебшчыне былі па болыпасці прамога крою і падпяразваліся сіне-белымі паскамі. Для Віцебскага краю даследчыкі адзначаюць як характэрную дэталь прыхільнасць да сіняга колеру адзення[254].

Сярод мужчынскай палатнянай вопраткі вылучаецца насоў — характэрная вопратка поўначы Беларусі, якая спарадычна сустракалася і ў іншых месцах і мела лакальныя назвы: «балахон», «шарапан», «летнік», «касталан», «белячок». Гэта была расхінная, з прамой спінкай (рэдка — у талію), са стаячым ці адкладным каўняром святочная мужчынская вопратка, пашытая з адбеленага ці зрэбнага палатна[255]. Палатняная верхняя вопратка была вядома таксама рускім, палякам і некаторым іншым народам. Насілі яе і летам, і ўзімку (апраналі на кажух).

М. Я. Нікіфароўскі на Віцебшчыне адзначаўбытаванне 2 тыпаў насова: каўняровы (з высокім адкладным каўняром) і нізкакаўняровы, якія адрозніваліся па крої. Каўняровы насоў (ён называе яго «балахонам») быў падобны на лёгкі халат з шырокімі поламі (у тры палотнішчы) і меў даволі шырокія кліны з бакоў. У яго не было ні кішэняў, ні шнурковых абшывак, і зашпільваўся ён на 1 гузік зверху, з левага боку[256].

Нізкакаўняровы насоў быў даўжынёй да каленяў, па сведчанні М. Нікіфароўскага, шыўся ў талію, з суцэльнай спінкай і клінамі з бакоў, звычай-

на з белага ці сіняга колеру палатна. Вузкі каўнер, крыссе, рукавы, лацканы, кішэні (часам і на грудзях) абкладваліся даволі тоўстым сінім шнурком і зашпільваліся на самаробныя шарападобныя гузікі. Быў пашыраны ў Віцебскім і Полацкім паветах на памежжы Пскоўскай і Смаленскай губерняў[257]. Ён дадае, што «каўнярoвы насоў» быў не толькі «сіняцінны», але і жоўтага, карычневага, ружовага колеру, дзе аснова была белай, а ўток — каляровым і шыліся абодва тыпы насова з палатнянай тканіны роўнай, гладкай ці мудрагеліста ўзорыстай («у ромбы», «ёлкі», «узгоркі», палосы і г. д.)[258].

Што тычыцца назваў палатнянай вопраткі, то балахон сустракаецца не толькі на Віцебшчыне, але і Гродзеншчыне (в. Навумовічы Гродзенскага раёна) і ўказвае на крой (прамы). Толькі ў гэтай мясцовасці ён быў з хлясцікам, двубортны, з адкладным каўняром і зашпільваўся на 2 гузікі[259]. У Карэліцкім раёне сустракалася назва «летнік», а ў Гродзенскім раёне — «шушман»[260].

Паўсюдна зімовай вопраткай селяніна і простага гараджаніна з футра быў кажух, шуба, тулуп, казачына ці паўкажух, на якія ў дарогу ці ў час працы ў лесе, полі селянін апранаў суконную вопратку: світку, сярмягу, армяк, насоў, бурку, бурнос і г. д. Гэты «дуэт» насіў назву «знізык», ці «сунізак», і служыў селяніну ў яго нялёгкім, працоўным жыцці. Кажухі, як правіла, шыліся з аўчын (7—8 штук) і былі «нагольнымі».

У XIX ст. іх фарбавалі ў прыгожы карычневы, бардова-карычневы, чырвона-вохрысты, чорны колер ці пакідалі белымі. Умелі і дубіць скуры, каб яны не прапускалі вільгаць і былі больш трывалымі. Тым не менш старажытны звычай пакрываць кажухі тканінай дзе-нідзе яшчэ захоўваўся. Так, у Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці насілі расклешаны кнізу кажух, пакрыты сукном ці паўсукном, які сяляне называлі «шэрачком»[261]. Зафіксаваны пакрытыя сукном ці кортам кажухі ў Жыткавіцкім, Нараўлянскім, Мазырскім раёнах Гомельскай, Стаўбцоўскім, Нясвіжскім Мінскай абласцей.

Кажухі звычайна шылі доўгімі, з шырокімі прамымі ці крыху звужанымі рукавамі, вялікім адкладным каўняром, двубортнымі. Былі прамога крою і адразныя па таліі, «з заборамі». Часам кажух шыўся з невялікім стаячым каўняром і зашпільваўся на гузікі са скуры. У народзе жыло перакананне, што: «На плячах просты баран, ды сам сабе пан». Кажух быў цяплейшай вопраткай, чым ватняя: «У ваце трасецца, а ў кажусе смяецца».

Сярод назваў зімняй вопраткі з футра, на думку беларускіх этнографаў, найбольш пашыранай была праславянская назва «кажух». На ўсходзе Магілёўскай і Віцебскай губерняў часцей ужывалася «шуба», а ў Магілёўскай губерні побач з ёй і «тулуп», характэрная асаблівасць якога — даўжыня да пят. На поўдні Магілёўскай і Мінскай губерняў, а таксама ў Мінскім павеце лакалізавалася назва «казачына»[262]. Назва «тулуп», па дадзеных экспедыцыйных даследаванняў 1960—1970-ых гг., сустракаецца і ў іншых абласцях. Але выявілася цікавая дэталь: назва «тулуп» у розных месцах звязана то з даўжынёй вопраткі, то з яе кроем, то з прыналежнасцю да асобы і інш. Так, у Калінкавічскім раёне Гомельскай вобласці «тулупам» называюць кажух, пацягнуты сукном; у Жыткавіцкім — кажух без бораў; у Петрыкаўскім і Лельчыцкім — кароткі кажух, а ў Баранавіцкім, Жабінкаўскім і Маларыцкім раёнах Брэсцкай вобласці такую назву носяць толькі мужчынскія кажухі ў адрозненне ад жаночых.

Існавала такая асаблівасць, што пакрой зімняй вопраткі ў розных рэгіёнах нярэдка супадаў з пакроем суконнай.



**СялянскI комплекс э кажухом.** 1-ая палавіна XX ст. Вёска Плёсы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. Малюнак С. Гунько

У Аршанскім, Дубровенскім, Лепельскім паветах Віцебскай губерні ў канцы XIX ст. зафіксаваны шубы адразныя па лініі таліі, «ззаборамі», здоўгімі, крыху звужанымі рукавамі і стаячым каўняром. «Тулупам» тут называлі доўгую двубортную прамога крою вопратку з вялікім каўняром, клінамі з бакоў і надточкамі ўнізе.

Упрыгожвалі шубы «выстречкой», «голеной» стужкай, ірхай («нрнхой») — скуранымі нашыўкамі,

а таксама апухай па рукавах, крыссі, падоле, кішэнях, каўняру і зашпільваліся на гузікі са скуры[263]. Акрамя скураных гузікаў ужываліся драўляныя, а таксама абшытыя тканінай.

Кажухі ў многіх месцах аблямоўваліся абшыўкай воўнай наверх па краях кажуха на 5 см (крыссі, падоле). Каўнер рабілі з самай лепшай аўчыны з доўгай, густой поўсцю. Існавала прымаўка: «Апуха дарожы кажуха». Зверху кажух апяразвалі вяровач-











**Крой** белага кажуха э чорным каўняром (выгляд спераду і ззаду). 1950-ыя гг. Вёска Пагост Старобінскага раёна Мінскай вобласці. Малюнак С. Гунько

**Кажух.** 1950-ыя гг. Вёска Гірэйшы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці. Малюнак С. Гунько

**Кажух.** 1940—1950-ыя гг. Вёска Навасёлкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Малюнак С. Гунько

**Кажух, пакрыты самаробным сукном.** Вёска Брынёва Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. Малюнак С. Гунько

**Паўкажух, крыты сукном.** 1950-ыя гг. Вёска Пронькі Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. Малюнак С. Гунько

кай[264] ці поясам. Мужчынскія кажухі часта мелі хлясцік. У асобных вёсках Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці спінка кажуха была не прамой, а фігурнай, а на рукаве вышэй манжэта вышываўся ўзор, які меў назву «цацка»[265]. Падобныя ўзоры мелі і кажухі ў Брэсцкай вобласці, напрыклад у Моталі. Акрамя ўзора, выкананага на рукаве, вышыўкай шаўковымі ніткамі, выстрачкай і г. д. аздабляліся краі крысся, прыпол, спінка кажуха.

Доўгія кажухі «з заборамі» былі характэрны для Гомельскай вобласці. Мужчынскі кажух «з заборамі» меў тут назву «казачына»[266]. У Навагрудскім раёне Гродзенскай вобласці кажухі з адразной спінкай («стомом») збіраліся ў зборкі і прыгожа аблягалі стан[267].

Хаця існавалі лакальна-рэгіянальныя асаблі-васці верхняй сялянскай вопраткі, у цэлым крой су-коннага і футравага адзення ў асноўным супадае на тэрыторыі Беларусі. Так, М. Нікіфароўскі адзначае, што шубы на Віцебшчыне нічым не адрозніваліся ад балахонаў і сярмяг у пакроі, даўжыні, упрыго-жаннях[268].

Найбольш пашыраным у асяроддзі сялян у канцы XIX — пачатку XX ст. было верхняе адзенне прамога крою. Аб узаемасувязях славянскіх і неславянскіх народаў сведчаць падабенства назваў, крою вопраткі, выкарыстання тых жа тканін у іншых народаў: рускіх, украінцаў, палякаў, балгараў, літоўцаў і г. д. Сялянскі комплекс адзення, які сфарміраваўся ў сярэдняевеччы, захоўваўся амаль нязмен-на да канца XIX ст. У канцы XIX ст. пранікненне гарадской культуры ў сялянскі быт садзейнічала змяненням у вопратцы, калі з'яўляюцца новыя уніфікаваныя формы адзення агульнаеўрапейскага паходжання (бурка, сюртук, паліто, капота і інш.), якія шыліся на гарадскі манер ці траплялі ў вёску ў выглядзе гатовых узораў. Працэс змяненняў у вопратцы быў звязаны таксама з выкарыстаннем фабрычных тканін і распаўсюджаннем новых тэхналогій (машыннае ткацтва, выкарыстанне анілінавых фарбавальнікаў і г. д.), хаця ішоў павольна, беларусы яшчэ працяглы час трымаліся традыцыйнай вопраткі. Але ў мужчынскім адзенні, у тым ліку і верхнім, працэс змяненняў і паварот да інтэрэтнічнага ішоў хутчэй, чым у жаночым. Гэтаму спрыяла большая мабільнасць мужчын, сярод якіх частка займалася адыходніцтвам, адрывалася адтрадыцыйнага асяроддзя і апраналася ў фабрычную вопратку. Згодна з гарадской модай апраналася і пэўная частка вясковай моладзі. Трэба сказаць некалькі слоў і аб вопратцы рабочых, гісторыя якой на Беларусі пачалася з другой палавіны XIX ст., калі пачаў развівацца прамысловы пралетарыят. Рабочае адзенне шылася выключна з фабрычных тканін. Комплекс адзення, які склаўся к канцу XIX ст., складаўся з суконнага касцюма, з грубашэрснага паліто ў зборкі з таннай цёмнага колеру тканіны, якое насіла назву «бекеша», ці кароткай курткі на ваце з каўняром ці без яго ў рабочым варыянце. Па святах прадстаўнікі вярхушкі рабочага класа апраналіся ў драпавыя паліто з плісавым каўняром. Некаторыя мелі зімовыя паліто з футравым каўняром[269]. Некваліфікаваныя рабочыя не ведалі размежавання вопраткі на рабочую і святочную.

Пасля першай сусветнай вайны ў мужчынскай верхняй вопратцы з'явіліся шынялі, фрэнчы, гімнасцёркі і іншыя атрыбуты ваеннага адзення, якія ляглі ў аснову так званага паўваеннага касцюма, які



быў пашыраны як сярод гараджан, так і сялян. У асяродку камсамольскіх і партыйных работнікаў распаўсюдзіліся скураныя курткі, паліто, якія ў 1920— 1930-ыя гг. выконвалі знакавую функцыю, як нязменныя атрыбуты новых уладных структур. У інтэлігенцыі папулярнымі былі розныя паліто, курткі, футравыя шубы, якія шыліся як футрам унутр, так і футрам наверх.

Пашырэнне асартыменту і колькасці вырабаў швейныхфабрыку 1930—1940-ыя гг. паступова выцясняла з быту сялянства традыцыйную вопратку.

У сялянскім асяроддзі традыцыйная вопратка шырока бытавала да 1940-ых гг., а ў асобных месцах і ў 1950-ыя гг., калі разбурэнні Вялікай Айчыннай вайны прымусілі іх часткова вярнуцца да натуральнай гаспадаркі і даношвання старой і вырабу самаробнай вопраткі ў хатніх умовах.

У другой палавіне XX ст. адзенне паступова страціла сваю сацыяльную дыферэнцыяцыю. Агульным стаў фасон, крой, колер. Важнейшай адзнакай сацыяльнай дыферэнцыяцыі вопраткі ў гэты час стала яе колькасць і хуткасць набыцця новых фасонаў моднага адзення.

Тэндэнцыя да пераходу да гарадской моды ў вёсцы актыўна працягвалася ў 1960-ыя гг., калі былі зняты абмежаванні на выезд на вучобу ці работу вясковай моладзі. Вяртаючыся дадому ў час канікулаў, чарговага адпачынку, моладзь прывозіла вопратку, пашытую ў адпаведнасці з модай. Пашырэнне гарадской вопраткі ішло і праз гандаль. Так на вёсцы з'явіліся модныя паліто, розныя курткі, плашчы, якія выкарыстоўваліся сялянамі, галоўным чынам, як святочнае.





**Казачына** (выгляд спераду, выгляд ззаду). 1950-ыя гг. Вёска Чудзенічы Лагойскага раёна Мінскай вобласці



**Зімовая вопратка палешукоў.** 1937 г. Вёска Мерачоўшчызна Косаўскага павета. Фота Ю. Шыманчыка



**Сялянскі касцюм** 1930-ых гг.

Спецыфіка сялянскага жыцця патрабавала асобнай цёплай і зручнай вопраткі, разлічанай на сялянскую працу. У пасляваенны час шырока распаўсюдзілася фуфайка («куфайка», «кухвайка»), якую набывалі ў крамах і якую паўсюдна выкарыстоўва-ла не толькі сялянскае насельніцтва, але і рабочыя (рамонтнікі, будаўнікі і інш.), не толькі мужчыны, але і жанчыны. Гэта вопратка трымалася ўбыце вяскоўцаў да канца XX ст. У цяперашні час яе выцесніла куртка.

Кажух і паўшубак амаль без змен перайшлі у XXI ст. У другой палавіне XX ст. кажухі і іх укарочаны варыянт — паўшубкі — у асобных раёнах шылі-ся,патрадыцы,зтыміжлакальныміадрозненнямі, як і ўбольш ранні час. Белы, недублёны кажух пачаў знікаць у асобных раёнах ужо ў пачатку XX ст. Яго месца, на думку І. А. Сербава, займаў «дублёны цёмна-жоўты палушубак з касматым адкладным каўняром»[270]. На Беларусі былі цэнтры, якія выраб-лялі іх на заказ, як, напрыклад, шырокавядомыя дублёныя мотальскія кажухі і шубы.

На Беларусі адсутнічалі дзяржпрадпрыемствы па вытворчасці кажухоў для насельніцтва. І ў другой палавіне XX ст., нягледзячы на значную колькасць авечак у многіх калгасных і асабістых гаспадарках, скуры выпрабляліся і шыліся прадпрымальнікамі паўкустарным спосабам невялікімі партыямі і не задавальнялі патрэбы насельніцтва.

З 1970-ых гг. у гандаль паступалі паўшубкі замежнай вытворчасці добрай выпрацоўкі, розных фасонаў і гатункаў скуры, якія насілі назву «дублёнкі». Але яны не мелі шырокага распаўсюджання з-за іх дарагавізны, паставак у невялікай колькасці.

У канцы 1960-ых — пачатку 1970-ых гг. XX ст. істотна змянілася аснова прамысловай вытворчасці вопраткі. Ва ўжытак увайшлі сінтэтычныя тканіны і штучнае футра, якія добра былі сустрэты насельніцтвам. Хутка распаўсюдзіліся розныя мужчын-скія курткі, паліто, плашчы («болонья» і інш.), паў-шубкі са штучнага футра прамога крою. З цягам часу пашырылася выкарыстанне сінтэтычных тканін у вырабе верхняй вопраткі, якое характэрна і для пачатку XXI стагоддзя.

Тым не менш вопратка з натуральных тканін і футра заўсёды запатрабавана як у гараджан, так і ў вяскоўцаў. Аднак поўнасцю задаволіць патрэбы насельніцтва ў гэтых відах вопраткі ўдалося толькі ў апошняй чвэрці XX ст., калі гандаль прапаноўваў мужчынам розныя паліто, курткі (пуховыя, скураныя, на падкладцы з некалькіх слаёў сінтыпону, цалкам сінтэтычных або з натуральных тканін), а таксама кароткія паўшубкі (дублёнкі) замежнай вытворчасці самых розных мадыфікацый. Павышэнне дабрабыту насельніцтва і шырокі асартымент верхняй вопраткі, які маецца ў продажы, канчатко-ва выцеснілі з ужытку традыцыйную вопратку вясковага насельніцтва.



**Вопратка гараджан.** Пачатак XX ст.



**Гараджанін у паліто і фуражцы.** Пачатак XX ст.

Верхняя вопратка гараджан страціла нацыянальную адметнасць і адлюстроўвае агульнаеўрапейскія модныя формы, характэрныя для пэўнага адрэзку часу. Яна страціла і сацыяльныя адрозненні ў выніку працэсаўдэмакратызацыі, стандартызацыі, якія адбыліся ў грамадстве. Агульнай рысай сучаснай вопраткі гараджан з'яўляецца яе спартыўны стыль. Перавага аддаецца практычным і зручным для працы і адпачынку курткам у параўнанні з паліто. У святочным адзенні вясковых мужчын сёння пануе гарадская мода (тыя ж курткі, паліто, кажухі ці дублёнкі), у будзённым захоўваецца больш кароткае адзенне: ватоўкі, курткі, паўпальто, безрукаўкі (аўчынныя і на падкладцы), зручныя для працы.

Працэс змяненняў у мужчынскім адзенні непарарыўны. У апошнія дзесяцігоддзі XX ст. ў вопратцы насельніцтва Беларусі пануючай стала еўрапейская мода. У выніку этнакультурных кантактаў з рознымі народамі, развіцця сродкаў масавай інфармацыі верхняя вопратка перастала быць маркерам, які вылучае адзін народ ад другога.



**Гараджанін у паліто і брылі.** Канец XIX — пачатак XX ст. Віцебск.



Зімовая вопратка жыхароў Гродна. 1915 г.

[1] История костюма, составленная Наталией Будур. Мос ква, 2002. С. 5.
[2] Миронова Л. Н. Учение о цвете. Минск, 1992. С. 125.
[3] ПСРЛ. Т. 32. Летописи белорусско-литовские. Моск ва, 1975. С. 29.
[4] Радзивиловская летопись. Текст. Исследование, опи сание миниатюр. СПб. М., 1994. С. 294.
[5] Барвенава Г. А. Пстарычны касцюм... Аўтарэф. С. 19.
[6] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. Мн., 1995. (Паводле археалагічных звестак). С. 43.
[7] Там жа. С. 12.
[8] Рабинович М. Г. Древнерусская одежда... С. 45.
' Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі... С. 11 — 12.
[10] Дучыц Л. У. Касцюм крывічоў у X—XII стст. (па архе-
алагічных дадзеных) // Навукова-практычная канферэн-
цыя «Пстарычнае і народнае адзенне Віцебшчыны». Мат-
лы канфер. крас. 1991. г. Віцебск, 1992. С. 16—17.
1 АСД. Т. I. Вильна, 1867. С. 177.
[12] АВАК. Вильна, 1912. Т. XXXVI. С. 59.
[13] Там жа. Т. XXXIX. Вильна, 1915. С. 16, 75, 76, 118, 199, 200, 255, 292, 403, 413, 515.
[14] Там жа. С. 83.
[15] Там жа. Т. XXXVI. С. 367.
[16] ИЮМ. Вып. II. Витебск, 1871. С. 66.
[17] АВАК. Т. XXXIX. Вільна, 1915.
[18] Кирсанова Р. М. Розовая ксандрейка и драдедамовый
платок. Костюм-вешь и образ в русской литературе XIX века. М., 1989. С. 85.
" Кирсанова Р. М. Розовая ксандрейка... С. 111.

[20] Русско-белорусские связи во второй половине XVII в. Минск, 1963. Сб. док. (1570-1667 гг.). С. 57.
[21] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. I. Мн., 1959. С. 326.
[22] Словарь древнерусского актового языка... С. 90.
[23] Улашик Н. Одежда белорусов XVI—XVIII вв. // Древ няя одежда народов Восточной Европы... С. 136.
[24] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры бе лорусов XVI-XVIII вв. С. 77.
"Тамжа.
[26] Калашникова Н. М. Одежда украинцев XVI—XVIII вв. // Древняя одежда народов Восточной Европы. С. 131.
[27] Матейко Катерина. Українськйй народний одяг. Етнографічнйй словник. Кйів. Наукова думка, 1996. С. 81.
[28] АСД. Т. I. Вильна, 1867. С. 251-252.
[29] Там жа. Т. III. С. 82.
[30] Там жа. С. 50.
[31] Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. T. I. C. 312.
[32] Акты Виленской археографической комиссии. Т. XVII. С. 59.
[33] АВАК. Т. XXXVI. Вильна, 1912. С. 42.
[34] Там жа. Т. XVIII. Вильна, 1891. С. 69.
[35] Там жа. Т. VIII. С. 465.
[36] Там жа. Т. XVII. С. 442.
[37] АВАК. Т. XX. Акты, касающиеся г. Вильны. Вільна, 1893. С. 568.
[38] Тананаева Л. И. Сарматский портрет. Из истории польского портрета эпохи барокко. Москва, 1979. С. 192, 196, 197.



**Зімовая вопратка інтэлігенцыі. 1950-ыя гг.**

[39] Словарь древнерусского актового языка Северо-Запад ного края и Царства Польского, состав. Н. Горбачев ским. Вильна, 1874. С. 130.
[40] Рабинович М. Г. Одежда русских XIII—XVII вв. С. 74.
[41] Там жа.
[42] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры... С. 78.
[43] Gloger Z. Encyklopedia staropolska. T. II. С. 150.
[44] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры бе лорусов XVI—XVIII вв. С. 78.
[45] Археографический сборник документов. Т. 3. 1867. С. 104.
[46] Там жа. С. 82.
[47] Рассказы о польской старине. Записки XVIII века Яна Дуклана Охотского... Т. I. СПб., 1874. С. 44.
[48] ИЮМ. Вып. 26. Витебск, 1895. С. 108.
[49] Тамжа. С. 125.
[50] Gloger Z. Encyklopedia staropolska. Warszawa, 1900. T. I. С. 260.
[51] Міцкевіч А. Пан Тадэуш. С. 39.
"ЖдановЛ. Осажденная Варшава (1830—1831 гг.). Собр. соч. Т. 6. М., 1995. С. 14. "Тамжа.
[54] АСД. Т. III. 1617. С. 82.
"АВАК. Т. XX. 1598. С. 136.
[56] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры... С. 83.
" Похилевич Д. Л. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII века. Вильнюс, 1966. С. 103. [58] АВАК. Т. XIV. Инвентари имений XVI-го столетия. Вильна, 1887. С. 358. [м] АВАК. Т. XXXIX. С. 16.
[60] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные археографической комиссіею (далей АЮЗР). Т. 3. 1638-1657. СПб., 1862. С. 533.
[61] Там жа. С. 535.
[62] АВАК. Т. XVII. Вильна, 1890. С. 442.
[63] Там жа. Т. XVIII. Вильна, 1891. С. 11.
[м]Там жа. Т. XXXVI. Вильна, 1912. С. 59.
[65] Там жа. Т. XXII. Вильна, 1895. С. 9.
[66] Там жа. Т. XIV. Вильна, 1887. С. 357.
[67] Там жа. Т. XVII. С. 416.
[68] Рабинович М. Г. Одежда русских XIII—XVII вв. С. 105.
[69] АВАК. Т. XVIII. 1582. С. 44.
[70] КСД. 1516. С. 874.
[71] Дунін-Марцінкевіч. Творы. Мн., 1981. С. 317.
"GlogerZ. Encyklopedia staropolska. Warszawa, 1978.T. III. С. 79.
[73] Кулагин А. Н. Архитектура и искусство рококо в Белоруссии. Мн., 1989. С. 90.
[74] Леан Патоцкі. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. Мн., 1997. С. 156.
[75] АВАК. Т. XX. Вильна, 1893. С. 661.
[76] ИЮМ. Вып. IX. Витебск, 1878. С. 35.
[77] Там жа. Вып. III. Витебск, 1872. С. 74.
[78] Там жа. Вып. IX. Витебск, 1878. С. 41.
[79] Там жа. Вып. X. Витебск, 1879. С. 56.
[80] Там жа. С. 58.
[81] Там жа. Вып. VI. Витебск, 1874. С. 51, 56, 767.
[82] Там жа. Вып. I. Витебск, 1871. С. 38.
"Тамжа. Вып. X. С. 75, 77.
[84] Тамжа. Вып. XIII. С. 56;
[85]Тамжа. Вып. IX. С. 41,42.
[86] Там жа. Вып. VI. Витебск, 1874. С. 132.
[87] Там жа. Вып. XIII. Витебск, 1882. С. 137.
[88] ИЮМ. Вып. XIII. Витебск, 1882. С. 54-56.
[89] Мальдзіс Адам. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя. Мн., 1982. С. 225.
[90] Там жа.
[91] Там жа. С. 224-225.

[92] Gloger Z. Encyklopedia staropolska. T. II. C. 185.
[93] Рабинович М. Г. Одежда русских XIII—XVII вв. С. 76.
[94] Gloger Z. Encyklopedia staropolska. T. II. C. 284.
[95] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры бе лорусов XVI—XVIII вв. С. 80.
[96] Маленка Л. І. Беларускі народны касцюм. Мн., 2001. С. 151.
[97] АВАК. Т. XXXVI. Вильна, 1912. С. 75.
[98] Тамжа. Т. VIII. С. 465.
[99] Там жа. С. 484.
[100] Там жа. Т. XXXVI. Вильна, 1912. С. 44, 75, 145.
[101] Там жа. С. 153.
[102] Там жа. Т. XXXVI. С. 57.
[103] Там жа. С. 145.
[104] Там жа. Т. XXXIX. С. 14-15, 61.
[105] Улащик Н. Н. Одежда белорусов XVI-XVIII вв. // Древняя одежда... С. 140.
[106] ИЮМ. Вып. XII. Витебск, 1881. С. 45.
[107] Киш Л. Происхождение слов бекеша, кучма, шалаш и шишак // Этимологические исследования по русскому языку. М., 1963. Вып. IV. С. 50; Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. T. I. Warszawa, 1978. С. 139.
™ АСД. Т. III. Вильна, 1867. С. 50.
[109] Там жа. С. 82.
"" АВАК. Т. XX. Акты, касающиеся города Вильны. Вільна, 1893. С. 658.
[1] АСД. Т. I. Вильна, 1867. С. 251.
[112] ИЮМ. Вып. XXVI. Витебск, 1895. С. 108.
[113] Там жа. С. 125.
[114] Там жа.
[115] Тананаева Л. И. Сарматский портрет. С. 26.
[1,6] АСД. Т. III. С. 96.
[117] АВАК. Т. XX. С. 269.
[118] АСД. Т. IV Вильна, 1867. С. 228.
[119] Рабинович М. Г. Одежда русских XIII—XVII вв. С. 74.
[120] АВАК. Т. XVII. С. 416.
[121] КСД. 1516. С. 263.
[122] АВАК. Т. XXI. С. 253.
[123] Там жа. Т. XVII. С. 393.
[124] Археографический сборник документов, относящих ся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. Т. IV. Виль на, 1867. С. 229.
[125] АСД. Т. IV. С. 228.
[126] Там жа.
[127] Там жа. Т. I. Вильна, 1867. С. 254.
[128] Там жа. Т. III. Вильна, 1867. С. 84.
[129] Дучыц Л. І. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. С. 12.
[130] Там жа.
[131] Рабинович М. Г. Одежда русских XIII—XVII вв. С. 78.
[132] АВАК. Т. XXII. Акты Слонимского земского суда. Вильна, 1895. С. 73.
[133] ИЮМ. Вып. XXIII. Витебск, 1892. С. 17, 21, 28.
[134] Там жа. Вып. XXVI. Витебск, 1895. С. 33.
[135] АВАК. Т. XXXIX. С. 14.
[136] Там жа. Т. XXII. Вильно, 1895. С. 73.
[137] Рассказы о польской старине. Т. I. С. 199.
[138] ИЮМ. Вып. III. Витебск, 1872, 1685. С. 120.
[139] АСД. Т. I.С. 251.
[1411] АВАК. Т. VIII. С. 465.
[141] АСД. Т. I. С. 183.
[142] Там жа. С. 184.
[143] ИЮМ. Вып. XXVII. Витебск. 1898. С. XI.
[144] Дембовецкий... Кн. I. 1882. С. 173.
[145] Там жа. С. 175.
[146] Амарханка — гатунак тканіны.
[147] КСД. 871. 1516 г.
[148] АЗР. Т. II. СПб., 1848. С. 381. Пад тэрмінам «кажух» тут маецца на ўвазе шуба — заўвага аўтара.
[149] Там жа. Т. I. 1340-1506. СПб., 1846. С. 109.
[150] АВАК. Т. XXXVI. С. 75.
[151] АСД. Т. III. Вильна, 1867. С. 230.
[152] АВАК. Т. XXXIX. С. 83.
[Я] АСД. Т. V. Вильна, 1871. С. 418.
[154] Там жа. Т. XX. №314.
[155] АВАК. Т. XXXVI. С. 72.
[156] Там жа. Т. XXI. С. 418.
[157] Там жа. Т. XVII. С. 416.
[158] ИЮМ. Вып. XXXII. С. 214.
[159] Там жа. С. 215.
[160] АВАК. Т. XXXIX. С. 49.
[161] ИЮМ. Т. XXXII. С. 214.
[162] Там жа. Вып. IV. Витебск, 1873. С. 179.
[163] Тамжа. С. 253.
[164] Там жа. Вып. X. Витебск, 1879. С. 127.
[165] АВАК. Т. XXXVI. С. 42.
[166] ИЮМ. Вып. VI. Витебск, 1874. С. 132.
[167] АСД. Т. I. Вильна, 1867. С. 253, 254.
[168] АВАК. Т. XXXVI. 1582. С. 66.
[169] АСД. Т. III. Вильна. 1867. С. 298; Копысский 3. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии (XVI-XVIII вв.). Мн., 1966. С. 210, 218.
[170] Рабинович М. Г. Одежда русских XIII—XVII вв. С. 74.
[171] Улащик Н. Н. Одежда белорусов XVI—XVIII вв. // Древняя одежда... С. 137.
[172] АВАК. Т. XXXVI. С. 387.
[173] Там жа. Т. XVIII. С. 60.
[174] Там жа. Т. XXXVI. С. 23.
[175] Мальдзіс Адам. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры. С. 226.
[176] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры бе лорусов XVI-XVIII вв. С. 79.
[177] Мальдзіс Адам. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры. С. 227.
[178] Воспоминания Фаддея Булгарина. Отрывки из ви денного, слышанного и испытанного в жизни. Ч. I. СПб., 1846. С. 38.
[179] Рэдута — баль.
[180] Рассказы о польской старине. Записки XVIII века Яна Дуклана Охотского. Преп. и издан. И. Крашевским. Т. I. СПб., 1874. С. 126.
[181] Там жа. С. 44.
[182] Рассказы о польской старине. С. 43.
[183] Там жа. С. 42.
[184] Шатны ад слова «шаты», якое ў тэты час абазначала адзенне ўвогуле («шаты сталасці», «яго шаты» і г. д.).
[185] Рассказы о польской старине. С. 43.
[186] Энциклопедия сценического самообразования. Кос тюм. Под ред. Ф. Ф. Комиссаржевского. СПб., С. 361.
[187] Русский костюм 1750—1830 гг. Вып. 1. Под ред. В. Рындина. М., 1960. С. 124.
[188] Жданов Л. Сгибла Польша. Роман-хроника. Собр. соч. Т. 6. Мн., 1995. С. 588.
[189] Энциклопедия сценического самообразования. С. 375—377.
[190] ИЮМ. Вып. II. Витебск, 1871. С. 68.
[191] Там жа. Вып. 13. Витебск, 1882. С. 57.

[1.2] Там жа. Вып. 12. С. 47.
[1.3] Там жа. Вып. 7. Витебск, 1876. С. 147.
[1.4] Там жа. Вып. 10. Витебск, 1879. С. 58, 116.
[1.5] Там жа. Вып. I. Витебск, 1871. С. НО, 132.
[1.6] АВАК. Т. XXXVI. Вильна, 1912. С. 43.
[197] Там жа. Т. XXXIX. Вильна, 1915.
[1,8] Там жа. Т. XVII. Вильна, 1890.
[199] Там жа. Т. XXXIX. С. 3.
[200] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры бе лорусов XVI-XVIII вв. С. 80.
[201] ИЮМ. Вып. 32. Витебск, 1906. С. 197.
[202] Сыракомля Ул. Добрыя весці. Мн., 1993. С. 279.
[203] Там жа.
[204] Научный архив Института этнографии им. Н. Н. Мик лухо-Маклая АН СССР, ф. ОЛЕАЭ, адз. зах. 43, л. 3 (адв.), л. 5.
[205] Там жа, адз. зах. 43, л. 5 (адв.).
[206] Сыракомля Ул. Добрыя весці. С. 473.
[21,7] Бренн Келестин Иван. Местное этнографическое описание Вельского у. Рукопись 1857//Д. К. Зеленин. Описание рукописей ученого архива Императорского Русского Географического общества. Вып. I. Петроград. 1914. С. 437.
[208] Там жа. С. 111.
[209] Фонд ОЛЕАЭ, л. 5 (адв.).
[210] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного жи тья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предме тов обиходности. Витебск, 1895. С. 186.
[211] Беларускае народнае адзенне. С. 61.
[212] Там жа.
[213] Материалы для изучения быта и языка русского насе ления Северо-Западного края. Собр. П. В. Шейном. Т. 3. СПб., 1902. С. 366.
[214] АІМЭФ, ф. 6, спр. 13, адз. зах. 128, л. 21.
[215] Сыракомля Ул. Добрыя весці. С. 427.
[216] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного жи тья-бытья ... С. 191.
[217] Улашчык Мікола. Была такая веска. Псторыка-этнаграфічны нарыс. Мн., 1989. С. 111.
[218] Сербаў І. А. Вічынскія паляне — Зборнік артыкулаў. Этнаграфія, антрапалогія, псіхалогія, псыхотэхніка і навуковая арганізацыя працы. Псторыя мастацтва. Інбелкульт. Мн., 1928. С 32.
[219] Беларускае народнае адзенне. С. 61.
[220] Раманюк М. Ф. Этнаграфія Беларусь Мн., 1989. С. 453.
[221] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного жи тья-бытья ... С. 111.
[222] Там жа. С. 195.
[22)] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. С. 53.
[224] Беларускае народнае адзенне. С. 64.
[225] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного жи тья-бытья ... С. 111.
[226] АІМЭФ, ф. 6, воп. 11, спр. 1063, л. 3.
[227] Там жа, спр. 675, л. 2.
[228] Беларускае народнае адзенне. С. 64.
[229] Белоруссия в эпоху феодализма. Т. I. Мн., 1959. С. 323.
[230] Там жа. С. 326.
[251] Бренн Келестин Иван. Местное этнографическое описание Вельского у... С. ПО.
[232] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 273, сш. 13, л. 8.
[233] Сыракомля Ул. Добрыя весці. С. 146.
[234] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 102, л. 9.
[233] Там жа, спр. 411, л. 8.
[236] Там жа, спр. 247, л. 8.
[237] Улашчык Мікола. Была такая веска. С. 111.
[238] Там жа. С. 113.
[239] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 104, л. 2, 5.
[240] Міцкевіч Адам. Пан Тадэвуш. Мінск. С. 195.
[241] Baranowski B. Kultura ludowa XVII i XVIII w na ziemiach Polski srodkowej. Lodz, 1971. S. 16—17.
[242] Бренн Келестин Иван. Местное этнографическое опи сание Вельского у... С. 111.
[243] Материалы для изучения быта и языка русского насе ления... С. 76.
[244] Максимилиан Маркс. Записки старика. Ч. II. — Віцебскі сшытак. 1996. № 2. С. 97.
[245] АІМЭФ НАНБ, ф. 7, воп. 2, спр. 8, л. 35.
[246] Беларускае народнае адзенне. С. 64.
[247] А1МЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 1122, л. 4.
[248] Там жа, спр. 1069, л. 3.
[249] Там жа, спр. 675, л. 4.
[250] Там жа, спр. 675, л. 4; спр. 662, л. 3; спр. 1124, л. 4; ф. 7, воп. 2, спр. 8, л. 23.
[251] Гусоўскі Мікола. Песня пра зубра. Мн., 1980. С. 69.
[252] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 100, л. 9.
[253] Там жа, спр. 674, л. 4; спр. 672, л. 3.
[254] Фадзеева В. Я. Дэкаратыўна-арнаментальнае аздабленне народнага касцюма Паазер'я // Навукова-практычная канферэнцыя «Пстарычнае і народнае адзенне Віцебшчыны». Матэрыялы канферэнцыі. Крас. 1991 г. Віцебск, 1992. С. 44.
[255] Беларускае народнае адзенне. С. 66—67.
"[6] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья ... С. 109.
[257] Там жа. С. 109-110.
[258] Там жа. С. 110.
[259] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 405, л. 7.
[260] Там жа, спр. 402, л. 6; спр. 398, л. 10.
[261] Там жа, спр. 255, л. 8.
[262] Беларускае народнае адзенне. С. 66.
[263] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 257, сш. 15, л. 11; спр. 243, сш. 11, л. 9; спр. 253, л. 13.
[264] Там жа, воп. 11, спр. 111, л. 7.
[265] Там жа, спр. 112, л. 12. [266] Там жа, спр. 120, л. И.
[267] Там жа, спр. 413, л. 12.
[268] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья ... С. 112.
[269] Иванов В. М. Очерк быта промышленных рабочих дореволюционной Белоруссии. Мн., 1971. С. 71—72.
[270] Сербаў І. А. Вічынскія паляне — Зборнік артыкулаў. Этнаграфія, антрапалогія, псіхалогія, псыхотэхніка і навуковая арганізацыя працы. Псторыя мастацтва. С. 32.

# Глава 5   Галаўныя ўборы



Галаўныя ўборы займаюць важнае месца ў мужчынскім комплексе адзення. На працягу многіх стагоддзяў яны завяршалі строй і былі адзнакай сацыяльнага стану, прафесійнай, этнічнай, полаўзроставай прыналежнасці чалавека, г. зн. выконвалі адну з важнейшых функцый — сігнатыўную.

Яны выконвалі таксама і іншыя функцыі: утылітарную, абрадавую, эстэтычную. Чалавек без шапкі на вуліцы ўспрымаўся навакольнымі звычайна як бедны, хворы, пагарэлец і г. д.

Існавалі правілы, згодна з якімі шапку трэба было знімаць у храме, а таксама перад больш знатнымі людзьмі, духоўнымі асобамі, уваходзячы ў хату. Нельга было ў шапцы ўваходзіць і ў залу суда. Збіўшага шапку з галавы другога чалавека чакала асуджэнне з боку прысутных, а ў шляхецкім асяродку такі ўчынак завяршаўся «сатысфакцыяй» на карысць пакрыўджанага. На беларускіх землях у сялян існаваў цікавы звычай «ставіць шапку» на копным судзе, калі ісцец і адказчык кідалі шапку ў сярэдзіну копнага круга як доказ невінаватасці, а самі «копнікі» — у знак згоды ці нязгоды з пэўным рашэннем капы[1].



Вядома, што прыродна-кліматычныя ўмовы Беларусі, якія характарызаваліся даволі суровым кліматам — працяглай зімой, дажджлівай, халоднай восенню і вясной, неспякотным летам — патрабавалі не толькі цёплага адзення, але і галаўных убораў для аховы ад холаду. Лясная паласа была шчодра забяспечана шматлікімі дзікімі звярамі — ваўкамі, мядзведзямі, куніцамі, вавёркамі, лісіцамі, бабрамі, выдрамі і інш. Менавіта скуры гэтых звяроў ішлі на пашыў верхняга адзення і галаўных убораў. І калі заможныя людзі выкарыстоўвалі дарагое і дыхтоўнае футра звяроў — собаля, выдры, бабра, рысі, гарнастая, то сяляне — авечкі, лісы, зайца, труса, шашка.

Здаўна на Беларусі бытавалі розныя па пакроі футравыя шапкі, якія шыліся са скуры, лямцу, шэрсці, сукна, футра. У старажытнасці, згодна з даследаваннямі археолагаў, былі вядомы ўпрыгожанні шапак бронзавымі спіральнымі пранізкамі, бляшачкамі альбо фібуламі. Былі яны, на думку Л. І. Дучыц, паўсферычнымі па форме, з плоскім верхам і невялікімі брылямі ў форме барэта, а таксама «з навушнікамі»[2].

Паводле археалагічных раскопак у Навагрудку, у доме, які належаў баярыну, была знойдзена фрэска з выявай галавы мужчыны ў блакітнай шапцы з футравай апушкай[3].

Святочным і прадстаўнічым сімвалам княжацкай улады, адной з важнейшых рэгалій, побач з вопраткай, абуткам, зброяй, была карона і карона-стафанас. Апошняя мела нізкую туллю і была ўпрыгожана па цэнтры крыжам, а таксама дзвюма падвескамі-перпендуламі (ніці з перлін ці каштоўнага

металу, што мацаваліся да галаўнога ўбору), якія заканчваліся крыжамі вежападобнай кароны[4].

Адной з дакладных крыніц, дзе праўдзіва адлю-страваны рознага роду галаўныя ўборы, побач з іншымі прадметамі і відамі вопраткі з'яўляецца Радзівілаўскі летапіс. Ён дазваляе меркаваць пра га-лаўныя ўборы князёў, двара і іншых саслоўяў X— XII стст., бо менавіта да гэтага часу, на думку А. В. Арцыхоўскага, адносяцца мініяцюры летапі-су[5]. У прыватнасці, у ім адлюстраваны цюрбаны-туфы, якія ўяўлялі сабой разнавіднасць візантый-скай чалмы. Яны былі і вясельным галаўным убо-рам, сімвалам шлюбнай спеласці[6]. У такім галаў-ным уборы князь Ізяслаў (1068 г.) (ліст 101 летапі-су), які прымае паслоў ад братоў, а таксама ў 1075 г., калі святкуе пабудову храма (ліст 115).

Акрамя кароны, адзнакай княжацкай улады ў старажытнасці быў клабук. У «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай» (кан. XIII ст.) пры апісанні цырымоніі прыняцця княжацкага тытулу (уступлення ў правы «дзедзічныя») сына князя Міндоўга Войшалка, упа-мінаецца клабук: «тревал набожне в законе черн-цем, бо завше на княжескнх сукнях светлодорогнх, на голове сверху клобук чорный носнл»[7]. Літоўскі князьЯгайлаўчас вянчання ў 1400 г. з княгіняй быў апрануты ў святочны касцюм: «в шапку княжую і шаты тому надлежачне, там же ему меч голый і по-сох маршалок лнтовскнй велнкмй н печать княжую отдавал в ведлуг звычаю...»[8].

Згодна з дадзенымі археалагічных даследаванняў, на тэрыторыі Беларусі ў X—XIII стст. форма кня-жацкіх шапак была паўсферычнай ці конусападоб-най. Верх іх шылі з дарагой тканіны яркага (чырво-нага, жоўтага, сіняга) колеру ці двух колераў. Аб-шывалі шапкі па нізу футравай апухай'. Менавіта яны з высокім верхам і футравым адваротам ці зала-татканым абводкам былі адлюстраваны на пячат-ках князёў. Нярэдка клабукі аздаблялі падвескамі-перпендуламі, абвод упрыгожвалі каштоўнымі ка-мянямі, па цэнтры — пласцінкамі-ківотцамі з выя-вамі святых. Ва ўрачыстых выпадках княжацкую шапку аздаблялі дыядэмамі[10], часам і пер'ямі.

Спецыяльныя галаўныя ўборы былі і ў царкоў-ных асоб, у тым ліку і клабук. У пасланні Іаана з Вішні (кан. XVI ст.) да князя Васіля Астрожскага ўпамінаецца шапка-клабук, у якой ззаду вісеўхвост. Апошняя дэталь, на яго думку, адпужвала д'ябла. Аўтар паслання лічыў, што ў адрозненне ад «шапак н магерок чнрвоных н чорных, кутнорованных н голых», клабук павернуты да адзінага бога".

Клабукі былі вядомы і рускім. Вышыня галаў-нога ўбора падкрэслівала знатнасць роду, прына-лежнасць да вяршыні ўлады. Высокія шапкі не мелі права насіць прадстаўнікі непрывілеяваных саслоў-яў. М. Забылін пісаў, што «і нават у саміх каўпаках,



**Карона Уладэіслава ЛакеткI**

**Уладзіслаў Ягайла ў кароне** (з грабніцы Вавеля)





**Шышак э плюмажам э пер'яў паўліна.** Партрэт Альгерда. Гравюра XIX ст. (копія з гравюры XVI ст.)



**Галаўныя ўборы.** 2-ая палавіна XVI ст.

звычайнай народнай шапцы, вышыня сувымяралася з годнасцю рода»[12].

Пры несумненным падабенстве паміж галаўнымі ўборамі рускіх і беларускіх князёў, вызначаюцца адметныя рысы, да якіх адносяцца упрыгожанне іх пер'ямі. У беларусаў гэта традыцыя запазычана ад народаў Заходняй Еўропы[13]. Беларуская знайь вялікае значэнне надавала не столькі вышыні галаўнога ўбору, як колеру верха, дыхтоўнасці футра і каштоўнасці ўпрыгожанняў[14]. Сферычныя і конусападобныя шапкі насілі і іншыя прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя — багатыя дружыннікі і баяры. Сацыяльныя адрозненні праяўляліся ў якасці тканін, гатунках футра і ўпрыгожаннях. Яны дапаўнялі парадны касцюм знаці, які складаўся з жупана, плашча-карзна, паўсферычнай шапкі, ботаў і дарагой зброі. На пашыў адзення, галаўных убораў, абутку і іх упрыгажэнне беларускія магнаты часта трацілі трэцюю частку сваёй маёмасці. Часта убор магната адпавядаў вартасці 2—3 вёсак ці нават цэлай вотчыны[15].

Форма мужчынскіх галаўных убораў XVI—XVIII стст. вельмі разнастайная. Аналіз актавых матэрыялаў дае падставу меркаваць, што ў сярэдневякоўі ў асяроддзі розных катэгорый феадальнай шляхты, гараджан былі вядомы галаўныя ўборы пад назвай «каўпак», «каптур», «магерка», «шлык», «Кучма», «капялюш», «барэт», «канфедэратка», «кучка», «ялом», «брыль» і інш.

Прывілеяванае саслоўе насіла шапкі з дарагіх імпартных тканін: сукна, аксаміту, атласу розных колераў (часцей чырвонага і чорнага), упрыгожвала іх пер'ем экзатычных птушак, перламі, залатымі і сярэбранымі ўпрыгожаннямі, а зімой — футрам сабалёў, гарнастаяў, рысяў, куніц, выдраў, чарнабурак.

Найбольш пашыранай формай шапак у гэты час быў высокі каўпак конусападобнай ці паўсферычнай формы, зверху завужаны. Яны былі з адваротам і без яго, высокія і нізкія, упрыгожаныя пер'ем (кітай) ці без іх. Былі высокія са звісаючым ззаду канцом. Унізе каўпакі мелі нешырокія адвароты з 1—2, а то і больш, прарэхамі, да якіх мацаваліся гузікі, запінкі. Каўпак, як сведчанне міжэтнічных кантактаў і ўзаемаўплыву культур, быў вядомы як усходнеславянскім народам (украінцам, рускім), так і заходнім (палякам). Цікава, што каўпакі рускіх сярэдзіны XVII ст. мелі толькі дзве адтуліны — ззаду і спераду[16]. У беларуска-польскай шляхты было да 4 (спераду, ззаду, з бакоў). Разнавіднасцю каўпака быў і клабук.

У крыніцах згадваюцца шапкі, аздобленыя футрам куніцы, собаля з плюмажам («кітай»), з пер'яў чорнай чаплі, каршуна, схопленыя аграфамі з брыльянтаў. Усходняга стылю трымаліся і многія беларускія магнаты. У такіх галаўных уборах красу-



**Уборы шляхты.** 1507—1548 гг.

юцца магнаты і на партрэтахXVI—XVIII стст. Шапка П. А. Тарло з партрэта 1640 г. чырвонага колеру, высокая, з брыяльянтавай спражкай-скофіяй, якая змацоўвае шырокі веер чорных пер'яў чаплі[17]. Чорная шапачка з кітай, упрыгожаная аграфам з дарагіх камянёў, была галаўным уборам караля Стафана Баторыя.

Аналіз пісьмовых крыніц, жывапісу, фрэсак сведчыць, што яны пераважна былі чырвонага колеру. Гэта не выключала, аднак, і іншыя колеры: шэры, чорны, зялёны, блакітны, жоўты. Так, у пана Сасноўскага быў каўпак «черный утерфнновый лнсамн подшнтый»[18], такі ж чорны з аксаміту, падшыты собалем — у шляхціца з маёнтка Гарбачы Ашмянскага павета"; каўпак чорный з лісімі вылогамі салдат (1616)[20], «сукна жолтого, кунамн подшнтый баярына»[21] і г. д.

З XV ст. вядомы галаўны ўбор вучоных, біскупаў, радзей заможных гараджан — барэт, барэцік, у такім барэціку з аксаміту адлюстраваны Ф. Скарына на гравюры 1517 г.

Беларуска-польская магнатэрыя XVI—XVII стст. насіла таксама каптуры розных мадыфікацый: ад нізкай круглай шапкі з пляскатым верхам і футравым адваротам нізу, якая ўпрыгожвалася запонай, да шырокага ці высокага з запонай спераду чапцачалмы. Калі на іншыя шапкі ішло ад 1 да 2 локцяў тканіны, то на каптур звычайна болей: «Крашенны на капьтурь до соболей, от Кузевкнна сына локоть тры» (1690)[22]. Каптуры былі і манаскім галаўным уборам: «коптурь чернецкнй» (1508)[23].



**Галаўныя ўборы.** 1-ая палавіна XVI ст.



**Уладзіслаў IV у шляпе.** З партрэта П.П. Рубенса

Баяры і мяшчане са старажытнасці да сярэдневякоўя насілі конусападобнай формы шапку — «шлык», якая была пашырана побач з «каўпаком» і «каптуром». Часта яна была цалкам футравай: «шлыкъ росамачий»[24], альбо суконнай, падбітай футрам: «порпьяновый, белками подбитый»[25], «шлыкъ мармурковый»[26]. Шлык лісі за 6 залатых у 1541 г. быў падараваны князем Бялецкім сыну крымскага хана Саін-Прэя[27].

З Баркулабаўскай хронікі вынікае, што шлык быў і галаўным уборам простых гараджан. Так, пры апісанні асобы Дзмітрыя са Шклова (1607) адзначалася, што ён «быў апрануты вельмі кепска: кажух стары, шлык барані. І летам у тым хадзіў»[28].

Кучма, кучомка, якая фігуруе ў старажытных беларускіх актах, як галаўны ўбор шляхты, уяўляла сабой высокую футравую шапку пераважна з сінім верхам: «кучма, подшитая куницами»[29]. Мікола Гусоўскі апісвае практыкаванні шляхты, якая на канях насілася цугам па кругу: «часам хтосьці падкіне свой зношаны брыль ці кучомку — некалькі стрэл упіваецца ў шапку на ўзлёце»[30]. Адзнакай рыцарскай годнасці было злавіць яе на піку ці падняць з зямлі.

У беларускай знаці вядома маленькая шапачка пад назвай «ялмонка», «ермынка», «елмынка», «ялмынка», якую насілі пад іншага роду шапкай: «згинула мне шапка белая пол стенка а ермынка» (1555)[31]. Яна лічылася тыповай шапкай духавенства, як у рускіх — баярская скуф'я. Гэта былі маленькія шапкі, якія толькі прыкрывалі макушку. Так Жыгімонт Аўгуст, напрыклад, насіў «ялмонку» з футра собаля пад гусарскай шапкай. Паводле звестак старабеларускіх актаў, яе насілі і іншыя прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя: Сямён Бялецкі дарыў аднаму з прыдворных (канюшаму) крымскага хана Саін-Прэя дарагую «ермынку з перлы»[32] коштам у 40 залатых[33].

Найбольш яскравай адзнакай сацыяльнай дыферэнцыяцыі была колькасць галаўных убораў, як ча-



**Мужчынскія галаўныя ўборы.** 2-ая палавіна XVI ст.



**Шапка з кітай.**
Венгерска-польскі строй



**Каптур.** Партрэт Генрыка Валезы, герцага анжуйскага, караля польскага і вялікага князя літоўскага. **1574** г.



**Каптур.** 1-ая палавіна XVI ст. Партрэт Жыгімонта І Старога. Мастак Ганс з Кульмбаху

ста іх змянялі, а таксама выкарыстоўвалі каштоунае футра і тканіны. Так, у ротмістра Яраша Сянкевіча было некалькі шапак: «шлык мармурковый» коштам у 150 залатых, «шапка фелендышу червоного лнсурка, в ней внлогн снпскне...» за 6 залатых, «магерка Преспурская» за 3 залатыя[34].

Шлык, кучма, каўпак падшываліся розным футрам: собаля, куніцы, расамахі, белкі, лісіцы, бабра, а таксама футрам ягнят. Багатыя галаўныя ўборы нярэдка былі здабычай зладзеяў, як каштоўнасць перадаваліся нашчадкам, а таму траплялі ў актавыя дакументы. У 1652 г. Самуіла Лакачэўскага — шляхціца з фальварка Лакачэўшчына — рабаўнікі збілі, забралі вопратку і «отнялм зеленую бархатную шапку з соболем, заплаченную двадцать пять злотыхь»[35].

Існавалі дзяржаўныя забароны на нашэнне не толькі пэўнай вопраткі, але і галаўных убораў з сабалінага футра для простых гараджан, у тым ліку падмайстраў, прыказчыкаў, вучняў і г.д. Так, у статуце купецкага брацтва г. Магілёў ад 20 чэрвеня 1636 г. наёмным вучням, прыказчыкам, гандлярам забаранялася насіць шапкі з собаляў і чарнабурак пад пагрозай штрафу[36].

Галаўныя ўборы як шылі мясцовыя майстры, так і завозілі з-за межаўдзяржавы. У 1583 г. з Любліна ў Пінск прывезлі шапкі «посполнтые», «фолдровые», «метлевые», простыя капелюшы, падшытыя кітайкай, капелюшы «полстяные»[37]. Такія ж шапкі везлі



**Кучма** (венгерскі каўпак)з запонай і кітай з пер'яў чаплі



**Шапка з футра рысі э адваротам э разрээамі**

Галаўныя **ўборы шляхты.** XVI—XVII стст.



з Польшчы ў Магілёў, Кобрын, Бабруйск і іншыя гарады[38].

Граматай С. Баторыя ад 1 мая 1582 г. быў зацверджаны статут і парадак цэха і брацтва шапачнікаў Прачысценскай царквы ў Росе. Ён прадугледжваў парадак, згодна з якім шыць і перашываць шапкі маглі толькі тыя, хто прыпісаны да цэха, астатнім забаранялася «под строгимъ караньемъ и подъ виною врадовою»[39]. Майстры цэха маглі «до пошитья шапок музских и женских футра вшелакіе и бобри куповать вольно»[40] як у купцоў, так і ў мяшчан, але толькі на патрэбы цэха. Забараняўся іх перапродаж.

Цёплыя, падбітыя футрам шапкі, ці цалкам з футра шляхта насіла круглы год. Паводле ўспамінаў Кітовіча, калі было горача, шапку трымалі ў руках ці ссоўвалі на бок («вешалі на вуха»), Святочныя каўпакі, сшытыя з сабалінага футра, упрыгожаныя каштоўнымі камянямі, плюмажам з чаплі-ных пер'яў, не здымалі нават за стадом, а таксама на рэдуце[41]. Звычай не здымаць шапак у памяшканні, асабліва пажылымі мужчынамі, вядомы і некаторым прыбалтыйскім народам, якія здымалі іх тольid, калі садзіліся есці[42].

Служачым магістрата: ваяводам, бурмістрам, райцам — выдаваліся гатовыя шапкі ці сукно, з якога іх шылі шапачнікі. Звычайна на шапку хапала локця сукна, а на шырокую ці высокую — крыху болей. Пад 1679 г. у дакуменце напісана, што пану бурмістру на каптур далі «...сукна голендерского влосового локоть. Для подшитья — 2 хребры лисие и чамра и спод готовый так же лисий»[43]. Усяго шапка абышлася магістрату ў 9 залатых і за работу шапачніку далі капу фошай. У 1582 г. ваяводзе віцебскаму сшылі два капелюшы: адзін з чорнага аксаміту, другі — з чырвонага шоўку[44].

Звычайна для паездкі на сейм магістрацкім слугам (дворнікам, павознікам, пахолкам) шылі новыя шапкі, штогод вышавалі іх і для чаляднікаў, майстроў, ключнікаў і г. д. Шылі іх з больш таннага імпартнага сукна і падбівалі футрам з загрыўкаў рыжых лісіц, авечак («баранкавыя»), зайцоў, тхароў і інш. больш танных зверкоў, якія каштавалі ад адной да чатырох коп грошай. Так, «баранкавая» шапка чалядніка Цімошкі каштавала 2 залатыя 15 асмакаў[45], столькі ж — «завыйкавая» (з загрыўкаў лісы) шапка ката[46], па 4 залатыя — «баранкавыя», «ярковыя» (з маладых ягнят) і «кгарловыя» (з загрыўкаў лісы ці іншага звера) шапкі павознікаў і «майстроў»[47] і г. д.

Згодна са старажытнабеларускімі актамі XVI—XVII стст., у гараджан сустракаліся тыя ж шапкі: шлык, каўпак, каптур, магерка, кучма, капялюш, брыль і іншыя. Вызначаліся яны ў розных саслоўных трупах дыхтоўнасцю футра, якасцю тканіны, аздобы, упрыгожанняў і вышынёй верха. Так, пад 1576 г. у магілёўскага мяшчанства значыліся: «колпакъ чирвоный леонский оксамитомъ подшитый»,





**Галаўныя ўборы шляхты.** XVI—XVII отст



**Брыль.** Тэракотавая кафля з выявай мужчыны. Сярэдзіна XVI ст. Заслаўскі замак

«аксамітны сабальцомь падшыты»[48], «душкамн лн-снмн подшнтый»[49], «шапка черная куннцамн под-шнта»[50], «шапка собольцомь подшнтая»[51], «кучма, подшытая куніцамі»[52], «магерка чорная з двума пер'ямі жорава»[53], «берець Турецкмй червоный но-вый»[54] і інш.

Шырока пашыраным галаўным уборам сярэд-невякоўя была магерка. Пра гэта сведчаць актавыя матэрыялы: «чапка мокгерка чорная кутнеровая, каштовала осьмь грошей»[55], «шапку магерку, дано грошн шесть...» (1578)[56] і г. д.

У мытнай кнізе г. Курска за 1642 г. зафіксаваны тавары магілёўскіх купцоў, якія абкладваліся по-шлінай. Сярод іх часта ўзгадваюцца шапкі магеркі, якія пастаўляліся на расійскі рынак. Так, Фёдар Іваноў разам з кампаньёнам вёз 8 дзесяткаў маге-рак; Маісей Маісеяў — 26 магерак, Ілля Цімафееў — паўтара дзесятка, Павел Дзмітраў — чатыры дзе-сяткі[57]; у 1647 г. Радзівон Ільін вёз на продаж 130 магерак, дзесятак шапак з куніц, Павел Анісімаў — «23 магеркі добрых і 20 — касматых», Філіп Яхрэ-маў — 200 чорных магерак[58].

Даследчыкі лічаць, што магерка з'явілася на тэ-рыторыі Рэчы Паспалітай у часы Стафана Баторыя і мае венгерскае паходжанне. Шляхта, якая насіла лямцавую, суконную, аксамітную магерку, нярэд-ка называла яе батораўкай. Кароль, яго прыбліжа-ныя, знаць шылі магеркі з аксаміту або сукна і бага-та аздаблялі пер'ямі. У сярэдневякоўі, паводле свед-чанняў 3. Глогера, у ВКЛ магеркі ці тканіны для іх вырабу прывозілі з Польшчы[59], што пацвярджаюць і старажытныя акты. У XIX ст. на Беларусі мясцо-выя шапавалы наладзілі вытворчасць магерак у мя-стэчку Дрыбін Магілёўскай губерні.

Гэты галаўны ўбор спачатку быў шляхецкім, га-радскім, пасля (у XIX ст.) стаў выключна сялянскім.

У XVIII ст. шляхецкая мода часта мянялася, што закранула і форму шапак. Побач з каўпакамі ў мо-дзе былі старажытныя канфедэраткі з высокай тул-ляй і чатырохвугольным дном, з-за якога яны назы-













**Галаўныя ўборы** XVI—XVII стст.



**Саламяны капялюш.** Партрэт хлопчыка. Мастак Хруцкі. Канец 1830 — пачатак 1840-ых гг.



**Мужчынская прычоска XVII ст.** Партрэт Януша Радзівіла (фрагмент). Невядомы мастак



**Мужчынскія прычоскі э выкарыстаннем парыкоў.** 2-ая палавіна XVIII ст.

валіся «рагатівкі», «рагатувкі». Канфедэратка атры-мала назву ад канфедэратаў барскіх (1768—1771 гг.). Вядома, што нясвіжскі магнат К. Радзівіл любіў насіць малінавую канфедэратку ў колер адваротаў кунтуша[60]. Пасля выкарыстання яе паўстанцамі войска Т. Касцюшкі, нашэнне канфедэраткі было забаронена і ўспрымалася царскім урадам як сімвал шляхецкай вольнасці. Аднак шляхта насіла іх да пачатку XIX ст.

«Рагатувкі» з чырвонага сукна і каракулевым ад-варотам былі галаўным уборам афіцэраў і салдат Кавалерыі Нарадовай у другой палавіне XVIII ст. Надаколышамафіцэразнаходзіласяпалоскасярэб-ранага ці залатога галуна. Шапку дзеля цеплыні на-бівалі бавоўнай, «пікавалі» (прасцёгвалі), мацавалі туллю на вертыкальна ўшытых пласцінках кітовага вуса. «Рагатувкі» багата аздаблялі бантамі-кукардамі з каралеўскім шыфрам пасярэдзіне, шнурамі, кута-самі, пер'ем каплуна, пазней (з 1791 г.) заместбанта прымацоўваўся мальтыйскі крыжык і белае стры-жанае пяро[61]. Шылі іх з кармазінавага сукна (чыр-вонага колеру) і абшывалі вузкім «баранчыкам» (шэрай ці карычневай аўчынкай). Мадыфікацыяй канфедэраткі пасля сталі «кучкі» ці «крымкі» з вы-сокім пляскатым верхам[6]-. Моладзь апранала шапкі «набекрэнь» («набакір») са спушчаным да правага вуха 3-колерным пяром ці султанам".

Л. А. Малчанава выдзяляе галаўны ўбор, які насілі казакі ў ВКЛ, пад назвай «ялом». Яна піша, што ялом — барановая шапка, звычайна чорнага колеру, з абвіслым верхам[64]. М. Гарбачэўскі апісвае яе падробна, называючы казацкай шапкай, з чырво-ным верхам[65]. У старажытных актах назва «ялом» нам не сустрэлася, хаця казацкія шапкі ўспамі-наюцца як галаўны ўбор слуг пана Завішы[66]. Вядо-ма, што запарожскія казакі насілі высокія шапкі з шэрым смушковым адваротам і чырвоным шаўко-вым верхам, які заканчваўся залатым кутасам[67]. А паштовыя войскі ВКЛ насілі такую ж высокую шап-ку з баранкавым адваротам і чырвоным вострым вер-хам з тканіны, які звісаў на бок[68]. Магчыма, гэта і быў «ялом».

Саламяныя капелюшы (брылі) у XVII ст. былі летнім галаўным уборам гараджан і шляхты, якія насілі побач з лёгкімі шапкамі з блакітнай шоўка-вай тканіны. Іх плялі з жытняй ці пшанічнай сало-мы, радзей — з чароту. Шляхта з цягам часу частко-ва адмаўляецца ад капелюша, які пашыраецца ся-род сялянства, і крадком носіць яго на сваёй сядзі-бе[69].

У пачатку XIX ст. шляхта працягвала насіць кан-федэратку. У моду ўвайшлі капелюшы цыліндрыч-най формы. Вось як апісвае адну з іх Л. Жданаў: «плюшевый цнлнндр с расшпренным по моде вер-хом, напомннаюшнй дуло раструбом у старнннного мушкетона»[70].

Цыліндры былі з шырокімі закручанымі ці вуз-кімі плоскімі палямі. Фасоны іх часта мяняліся. Так, у 80-ых гг. XIX ст. у модзе быў цыліндр з нізкай тул-ляй і выпуклымі, але не закручанымі палямі. Акра-мя яго, гараджане насілі мяккія круглыя фетравыя капелюшы цёмных колераў, у 50-ыя гг. XIX ст. з'яві-ліся летнія брылі са сцёганай тканіны, пазней — плюшавыя. У 1850—1860-ыя гг. модным лічыўся



Мужчынская прычоска XVIII ст. Партрэт невядомага. Невядомы мастак

шыракаполы капялюш-панама, а таксама саламяны, з плоскай тулляй і прамымі палямі[71]. Галаўным уборам бяднейшай часткі мяшчанскага саслоўя ў гэты час была фуражка, чорны картуз ці брыль, зімой — баранкавая шапка.

На працягу стагоддзяў шмат разоў мяняліся мужчынскія прычоскі. Вядома, што ў X—XIII стст. тыповай прычоскай усходнеславянскіх народаў былі доўгія валасы, якія закрывалі вушы і злучаліся з барадой. А. Цярэшчанка называў мінулае — старажытны «барадата-вусаты свет»[72], бо бароды і вусы насілі славяне здаўна, што адлюстравана на выявах язычніцкіх багоў. Згодна з выявай, у Васіля Вялікага ў Спаскай царкве г. Полацка была доўгая прычоска, якая злучалася з барадой. Доўгія валасы ў XIV—XVI стст. запляталі ў касу. Насілі іх і ў Заходняй Еўропе, дзе доўгія валасы лічыліся адзнакай знатнасці. Затое вусы ў спалучэнні з барадой у гэты час насілі рэдка.

З сярэдзіны XII ст. у модзе былі доўгія валасы і барада, якія гарманіравалі з доўгай вопраткай. Да сярэдзіны XIII ст. мужчыны галілі падбародак і шчокі, зрэдку пакідалі вусы, а валасы стрыглі коратка[73].

У сярэдневякоўі прычоска ўяўляла нешта сярэдняе паміж кароткімі і доўгімі валасамі. У эпоху рыцарства доўгія валасы і барада сталі нязручнымі, перашкаджалі апранаць шлем, таму спераду стрыглі грыўку, а ззаду валасы завівалі[74]. У гэты час мужчыны і жанчыны перавязвалі валасы галаўной павязкай.

У XVI—XVIII стст. у ВКЛ мужчыны прывілеяванага саслоўя валасы поўнасцю збрывалі альбо пакі-

далі невялікі кружок валасоў (чуб), як гэта рабілі на Усходзе і дзе гэта дыктавалася неабходнасцю, бо ва ўмовах гарачага клімату такая прычоска не патрабавала шмат дагляду. Існаваў і другі варыянт шляхецкай прычоскі: доўгія да плеч валасы, толькі над ілбом коратка састрыжаная грыўка. Уяўленне пра гэта даюць партрэты знакамітых асоб XVI—XVIII стст., якія захаваліся ў музеях, а таксама выя-вы на прадметах дробнай пластыкі і інш.

Спецыфічныя прычоскі мела прыслуга. У XVIII ст. гайдукі на магнацкіх дварах насілі доўгія валасы, якія запляталі ў касу, а спераду «віселі доў-гімі коскамі, як яўрэйскія пейсы», зверху яны апра-налі круглыя шапкі з шырокімі палямі. Паюкі, наадварот, высока галілі галаву, насілі востраканцовыя шапкі і абодва павінны былі мець доўгія вязлізныя вусы[75].

Сярод рускіх мужчын у XV—XVII стст. вядома прычоска «ў кружок», «у скобку»[76]. Гэта прычоска была характэрна таксама і для ўкраінцаў (стрыжка «пад макітру»)[77]. У беларусаў яна мела назву «пад гаршочак» ці «пад макітру». Такая прычоска праіснавала на ўсходнеславянскіх землях да пачатку XX ст. Насілі і доўгія распушчаныя валасы, якія раздзялялі праборам. Вельмі часта тыя, хто насіў доў-гія валасы, меў і доўгую бараду. Такая прычоска была характэрна для сялян сталага ўзросту, старцаў, збіраючых міласціну, святароў, мастакоў.

Народ па-рознаму ставіўся да даўжыні валасоў, вусоў, барады. Аб гэтым сведчыць фальклор: «Вусы — чэсць, а барада і ў казла есць».

Прычоску «ў кружок», «пад гаршочак» больш паважалі маладыя. Валасы стрыглі наўскос: чым бліжэй да патыліцы, тым яны падаўжаліся. Часам іх стрыглі роўна па палавіне галавы ў форме гаршка. Адсюль і назва. У сталых мужчын была вядома прычоска «ў скобкі». Валасы над брывамі падразаліся гарызантальна, на скронях і патыліцы яны былі даўжэйшымі.

Шляхта рэдка адпускала бараду, затое насіла свае сусветнавядомыя вусы, якія нярэдка падкручвала ўверх. Ян Баршчэўскі пісаў пра прычоскі шляхты:

> Ах! Што за паны бывалі! Хоць
> на лбе валос і нет, Да ўжо ж
> усы на ўвесь свет![78]

Таму пана можна было пазнаць не толькі «па халявах», але і па вусах. Адны літоўскія шляхціцы галілі бараду і вусы і насілі толькі «бачкі-фаварыткі», як у еўрапейскіх дыпламатаў, другія адпускалі і бараду[79]. Моладзь насіла «іспанскую бародку»[80]. Доўгія шляхецкія вусы ў XVII ст. спалучаліся з паголенай галавой, на якой заставаўся невялікі чуб («оселедец»), але ж ён быў значна меншы, чым у запарожскіх казакаў.

У XVIII ст. у модзе былі доўгія валасы ці парык, падбрыты лоб, вусы ж лічыліся «дрэнным тонам».

У пачатку XIX ст. мужчыны прывілеяванага сасло-ўя насілі кароткія завітыя валасы. Пазней стала мод-най прычоска на два праборы з бакоў. У 1830-ыя гг. на лбе рабілі хахол. Насілі невялікія бакенбарды, маленькія вусікі. 3 сярэдзіны XIX ст. ізноў у моду ўвайшлі барада і доўгія валасы. Доўгая барада асаб-ліва моднай лічылася ў часы праўлення Аляксанд-ра III.




**Прычоска XVIII ст.** Партрэт Уладзіслава IV Вазы. Невядомы мастак

У канцы XIX ст. у модзе была кароткая стрыжка. У канцы XIX — пачатку XX ст. мужчыны прывілея-ванага саслоўя зачэсвалі ўверх валасы, карацей стрыглі ззаду, вуха пакідалі адкрытым; кароткія вусы ад вуглоў губ пераходзілі ў нядоўгую густую бараду. Маладыя мужчыны стрygліся больш коратка, мелі невялікія вусы, прычэсваліся на прамы прабор. Асобныя адпускалі доўгія вусы і невялікую бараду, насілі коратка стрыжаныя, зачэсаныя ўверх валасы і невялікія «бакі». Хлопчыкі, як і моладзь, коратка стрygліся, спераду рабілі бакавы прабор злева-на-права, або насілі спераду грыўку. У гараджан у модзе былі тыя ж прычоскі з зачосам назад ці на прамы прабор. Сустракаліся прыхільнікі і доўгай барады, а таксама падкручаных даверху вусоў.



**Галаўныя ўборы.** 1-ая палавіна XIX ст. «Гандляр шапкамі». Мастак К. Куневіч

**Лямцавая магерка.** XIX **ст.**



Уборы прывілеяванага саслоўя **XVI—XVIII** стст. мелі заходнееўрапейскія і ўсходнія рысы, дапасаваныя да мясцовых умоў. Уплывы замежнай моды найбольш праявіліся ў галаўных уборах знаці, у якіх прасочваліся польскі, венгерскі, расійскі, турэцкі і інш. стылі. У часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай развіццё міжэтнічных кантактаў і ўзаемаўплыў культур ішло больш цесна з палякамі, якія складалі большасць кіруючай вярхушкі ў Рэчы Паспалітай. У канцы **XVIII** ст. на далейшае развіццё галаўных убораў уплывал! кантакты з рускімі, калі беларускія землі сталі часткай Расійскай імперыі.

У сялянства доўга трымаліся патрыярхальныя традыцыі, у якіх захоўваліся рысы папярэдніх эпох, трансфармаваны вопыт многіх пакаленняў беларусаў і іх суседзяў.

Пранікненне з другой палавіны **XIX** ст. у сялянскі побыт гарадской культуры садзейнічала распаўсюджанню новых мужчынскіх убораў у вёсцы, што найбольш праявілася ў XX ст., калі галаўны ўбор, раней чым вопратка і абутак, страціў нацыянальную адметнасць.

Сярод галаўных убораў сялян **XVI—XVIII** стст. пераважалі высокія шапкі-каўпакі, якія шыліся з вузкім аўчынным адваротам. На жаль, назвы многіх шапак нам невядомы, бо сялянскія галаўныя ўборы рэдка траплялі ў старажытныя акты. Рэдка яны перадаваліся ў спадчыну, бо зношваліся самімі гаспадарамі. У актах час ад часу (у сувязі з рабаваннямі сялян ударозе ці ўчас працы ўлесе) згадваецца «шапка «нурбарка»[81], «шапка мыцка»[82]. Па большай частцы ў дакументах называецца проста шапка. Вядома, што ў сялян бытаваў «шлык» з таннага футра, а таксама саламяныя і войлачныя капелюшы, цёплыя шапкі «капузы», «малахаі», «аблавухі» і інш.

Галаўныя ўборы самі сяляне шылі ці плялі з саломы, чароту. Пераважалі чорны, шэры, белы кодеры, бо «кармазінавы» быў не толькі забаронены, але і недасягальны прыгоннаму селяніну, які да таго ж пакутаваў ад шматлікіх апусташальных войнаў, якія дзесяцігоддзямі вяліся на тэрыторыі ВКЛ, даводзячы яго да галечы.

Сялянства было прыхільнікам патрыярхальных традыцый ва ўсім, што тычылася яго жыцця. Кансерватызм сялянства, яго адданасць традыцыям вельмі яскрава малюе У. Сыракомля:

Ні ўплывы чужыя, ні звычай найновы
Не змяніў іх адзення, іх даўняе мовы.

У канцы **XIX** — пачатку **XX** ст. сяляне насілі доўгія валасы на прамы прабор, роўна кругом падстрыжаныя, а таксама бараду і вусы[83]. Такую прычоску насілі старыя і ў пачатку **XX** ст., асабліва на Палесс![84]. У час працы ў полі ці на лузе старыя доўгія да плеч валасы падвязвалі, каб не заміналі[85].

У модзе заставалася прычоска «ў кружок» (да сярэдзіны вуха)[86], якую насілі больш сталыя мужчы-


Магерка з сукна. Канец XIX ст.

ны, маладыя стрыгліся карацей. Старыя мужчыны аддавалі перавагу не толькі доўгім валасам і бара-дзе, але і прамому прабору, маладыя зачэсвалі вала-сы на бок[87]. Прычоска «пад гаршчок» захоўвалася даўжэй у палесскім рэгіёне. Нярэдка сталыя муж-чыны стрыгліся нагала.

Іканаграфічныя і пісьмовыя крыніцы пацвяр-джаюць, што асноўныя тыпы шапак XIX — пачатку XX ст. ужо існавалі раней. Беларусам былі вядомы розныя галаўныя ўборы: шапкі з тканіны, футра-вые, лямцавыя, саламяныя, вязаныя. Іх апраналі ў залежнасці ад пары года. Так, футравыя насілі зімой, за выключэннем старых мужчын, якія насілі іх і летам, а саламяныя — толькі летам.

З другой палавіны XIX ст. з распаўсюджваннем новых тэхналогій, увядзеннем у строй прадпрыем-стваў па вырабу тканін і гатовых галаўных убораў з'явіліся новыя галаўныя ўборы, якія пранікалі ў вёску.

Адной са старажытных шапак была запазычаная ў венграў лямцавая магерка. У XIX ст. яна стала нязменным галаўным уборам сялянства. Як і іншыя лямцавыя галаўныя ўборы, яе выраблялі звычайна з першай шэрсці ягнят у выглядзе каўпа-ка, усечанага конуса, цыліндра з увагнутым ці вы-пуклым верхам і называлі «магерка», «валёнка», «маргелка», «каўпак», «брыль». Магерку лічылі не-ад'емнай прыналежнасцю беларуса дзякуючы сва-ёй надзвычайнай зручнасці, выкарыстоўвалі ў лю-бую пару года. Выраблялі іх, па большай частцы, мясцовыя шапавалы. Адным з цэнтраў вырабу ма-герак у XIX ст. было мястэчка Дрыбін у Магілёў-скай губерні, вядомае не толькі на Беларусі, але і за яе межамі.

Селянін у капелюшы. Пачатак XX ст. Пінскі

павет



**Капялюш э мятліцы.** Пачатак XX ст. Віцебшчына



**Капялюш.** 1-ая палавіна XX ст. Віцебшчына

Шапку-магерку («маргелку») можна было набыць у дрыбінскіх шапавалаў ад 15 да 30 капеек, іншыя шапкі і брылі каштавалі да 70 капеек. Калі яе рабілі з матэрыялу заказчыка, цана на шапку была ад 15 капеек, а на брыль — да 30 капеек[88]. Цана залежала і ад якасці матэрыялу, трываласці і прыгажосці вырабу.

Назва магеркі залежала ад вышыні палёў. Часцей яе рабілі з палямі, шчыльна прылеглымі да туллі. Калі палі амаль дасягалі дна магеркі, яе называлі «двайной», калі ж яны даходзілі толькі да паловы — «паўдвайной»[89]. Двайныя і паўдвайныя магеркі больш характэрны для Магілёўскай і Мінскай губерняў.

Сялян у гэтым галаўным уборы можна было сустрэць на кірмашах і ў розных гарадах Расіі. У Арлоўскім Палессі, дзе нямала жыло і беларусаў, мясцовыя жыхары (рускія) стараліся «наблізіць форму галаўнога ўбора да формы велікарускага брыля»[90]. У 90 вярстах на захад ад Бранска, дзе жыў «белорусскнй народ», насілі выключна белыя магеркі". Арэал іх бытавання Калужскае Палессе, Дарагабуж, Смаленск[92].

Беларусы насілі магерку і зімой, і летам, і, як пісаў С. Максімаў, яны здымалі яе толькі ў царкве і перад панам[93]. Каб надаць ёй больш прыдатны выгляд, гаспадар шапкі ўдаўліваў верх магеркі. Звычайна магерка служыла селяніну гадоў 6—7[94]. Колер яе залежаў ад воўны, вар'іраваў ад белага да чорнага. Маргелкі розных колераў (белыя, шэрыя, табачнага колеру) згадваюцца П. Шэйнам. Адны былі простыя лямцавыя, канічнай формы без палёў; другія — нізкія, пласкадонныя, з кароткімі, загнутымі ўверх палямі[95]. Маргелку без палёў, з роўна абрэзанымі краямі, якая нагадвала рускую скуф'ю, з белай лямцавай у выглядзе ўсечанага конуса і невялікімі падкручанымі ўверх палямі, адзначаў таксама і М. Нікіфароўскі на Віцебшчыне[96].

Магеркі вядомы і іншым народам. У прыбалтыйскіх народаў пераважалі з цёмнай шэрсці (чорнай, карычневай, зрэдку — шэрай)[97]. Насілі іх рускія[98] і ўкраінцы[99]. У апошніх акрамя лямцавай была сшытая і з сукна, чатырох кутная з «прыкрасамі»[100]. Гэты галаўны ўбор праіснаваўда пачатку XXст. Е. Раманаў пісаў, што войлачныя магеркі сустракаюцца рэдка, цяпер іх носяць галоўным чынам старыя з глухіх вёсак[101]. 3 рэштак сукна сяляне шылі канічнай формы або ўсечанага конуса шапкі розных колераў на падкладцы. У асобных месцах да іх прышывалі «навушнікі» і адварот ад шыі, што дазваляла насіць іх і зімой[102].

Пэўнае месца ў сялянскім быце беларусаў займаў лямцавы брыль, ці капялюш, цёмна-шэрага, карычневага ці чорнага колераў з загнутымі палямі, які таксама насілі і зімой, і летам. Звычайна брыль аздаблялі тасьмой з конскіх валасоў, якая заканчвалася кутасікам ззаду, у які ўпляталіся і кавалачкі чырвонага ці сіняга сукна[103]. Часта ён меў вузкія палі. Летні варыянт брыля меў цвёрдую туллю, а зімовы — мяккую, каб у халоднае надвор'е насунуць на вушы[104]. М. Я. Нікіфароўскі адзначаў такі ж выгляд брыля на Віцебшчыне, які рабілі з больш светлага лямцу і які меў аздобу не толькі з конскіх валасоў, але і з яркай тасьмы'[05].

Традыцыйна летам мужчыны-беларусы насілі саламяныя капелюшы, якія ў асобных раёнах мелі назву «брылі». У. Сыракомля падкрэсліваў, што «саламяны капялюшык — ад прыгону ўбор для хлопа»[106]. Сыравінайдляплеценыхкапелюшоўслужылі салома (сырыя жытнія сцяблы), чарот, мятлік, сітнік, а таксама распластаная лаза'[07], з якіх выплята́лася доўгая паска і сшывалася па спіралі конскім воласам ці суровай ніткай. Па туллі іх абвязвалі каляровай стужкай, тасьмой, каб выглядалі прыгожа. Яны мелі даволі шырокія (да 15 см) загнутыя палі. Падчас свят іх упрыгожвалі кветкамі. У паўночна-



**Капелюшы з саломы** Віцебскай фабрыкі мастацкіх вырабаў. 1999 г.

заходніх раёнах Беларусі ў XIX ст., па сведчанні П. В. Шэйна, саламяныя і лазовыя капелюшы насілі часцей пастухі і бедната. Пастухі, якія мелі шмат вольнага часу, выраблялі іх на продаж. У Гродзенскай губерні саламяныя капелюшы сваёй вытворчасці рабілі вельмі прыгожымі, яны былі папулярнымі ў мужчын. Іх плялі з лепшай іржаной саломы «ў зубкі», дзякуючы чаму яны атрымалі назву «плеценкі-зубаткі»[108]. Аднак саламяныя капелюшы служылі нядоўга, не больш сезона. Шарачковая шляхта на сваёй уласнай сядзібе таксама часта насіла саламяныя капелюшы, якія добра аберагалі ад спёкі. Падцвярджаюць гэта дадзеныя этнаграфічнай экспедыцыі 1966 г. у Мінскую вобласць, калі рэспандэнты сведчылі, што ў канцы XIX ст. саламяны капялюш насіла і шляхта[109] (Любанскі раён, в. Шапілавічы). Больш заможныя грэбавалі гэтым галаўным уборам[110]. У сялян многіх вёсак цэнтральнай і іншых рэгіёнаў Беларусі капялюш быў незаменным галаўным уборам аж да сярэдзіны XX ст.[1]"

Зімовым галаўным уборам служылі футравыя шапкі ці суконныя з футравым адваротам пераважна 3 відаў: круглыя, з вушкамі і цыліндрычнай формы.

Вядома, што ў пачатку XX ст. сярод сялян былі, хоць і нешматлікія, прыхільнікі старажытнай шапкі, вядомай і іншым славянскім народам пад назвай «кучма», «кучомка», «кучонка». Яе шылі з аўчынкі ягняці футрам звонку ў форме цыліндра ці конуса. Дзе-нідзе зрэдку сустракаліся даўнія футравыя шапкі паўсферычнай формы з лісы, зайца, ваверкі, тхара.

У сялян Гродзенскай губерні П. В. Шэйн адзначаў цёплую барашкавую шапку, якую яны насілі і зімой, і летам з суконным верхам (чорным ці сінім), якая ззаду сцягвалася кароткай сіняй стужкай"[2]. На Палессі аўчынныя шапкі падшывалі аўчынкай і зверху, і знутры"[3]. Чорныя баранкавыя шапкі з су-



**Селянін у баранкавай шапцы** з ваколіц Пінска. **1934 г.**



**Зімовая шапка**
з баранкавым абводкам



**Зімовая шапка селяніна.** XIX ст.



**Аблавуха. XIX ст.**

конным чатырохкутным верхам насілі на Мотальшчыне[114].

Традыцыйным зімовым мужчынскім галаўным уборам селяніна была шапка-вушанка («вушанка», «зімка», «аблавуха», «аблавушка»). Яе шылі з аўчыны ці футра лісіцы, зайца, вавёркі, ваўка. Да паўсферычнай асновы прышывалі 4 крылы («вухі»). Пярэднія і заднія крылы паднімалі і завязвалі зверху на макушцы, а бакавыя — пад падбародкам. Аблавуха была вельмі цяжкай і цёплай. Як адзначаў П. В. Шэйн, бывала, што такая шапка важыла больш чатырох фунтаў[115]. Зверху яе пакрывалі звы-чайна сукном хатняй вытворчасці. А асобныя сяля-не для большай цеплыні падбівалі яе пакляй ці лям-цам[116]. І тады шапка нагадвала старажытную трох-вуголку з адрэзаным ці загнутым пярэднім вуглом. На вушы і шыю спускаліся адвароты, якія задзіралі ўверх, і звязвалі шнуркамі, калі не трэба[117].

М. Я. Нікіфароўскі адзначае шырокае бытаванне ў XIX ст. аблавухі на Віцебшчыне. Яна мела тут выгляд конуса з выемкай спераду, з «навушнікамі» і прышыўным футравым «каўняром», якія падымалі ўверх. Але сапраўдную аблавуху, адзначае ён, шылі з футра барана, падбівалі пакляй, пакрывалі тоўстым сукном, і важыла яна звыш 5 фунтаў[118]. Па сведчанні М. Я. Нікіфароўскага, ў Віпебскай Беларусі майстры-шапашнікі рабілі з футра і ваты і пласкадонныя аблавухі з «навушнікамі» і прышыўным «каўняром»[119]. Пра распаўсюджванне ў XIX ст. аблавух сярод сялян сведчаць і матэрыялы этнафафічных экспедыцый 1966,1967 гг. у Гомельскую, Мінскую і Гродзенскую вобласці[120].

У канцы XIX ст. сустракалася яшчэ старадаўняя шапка пад назвай «капуза». Яна была вельмі высокай (да 6 вяршкоў і болей)[121], значных памераў. Шылі яе са скуры маладога ягняці, «вушы» ў сцюжу завязвалі пад падбародкам, у больш цёплае надвор'е — паднімалі і завязвалі зверху. Называлі яе сяляне шапкай у «паўтара барана»[122]. Як і іншыя шапкі, капуза мела лакальныя асаблівасці. У палешукоў, жыхароў Бельскага павета каля Белавежскай пушчы, як і ў украінцаў[123], верх яе шылі з сукна ці аксаміту[124]. Падбівалі яе пакляй для большай цеплыні. Канструкцыя палескай капузы вельмі цікавая. Паводле апісанняў П. Шэйна, верхнія краі яе на два вяршкі вышэй дна і ззаду разрэзаны да самага дна і звязаны ў самым верее чырвонай стужкай («жычкай», «жышкай»)[125].

Насілі мужчыны і «стаўбуноўку» («стаўбунок») старадаўнюю шапку з футра ці аўчын футрам звонку з суконным верхам у форме цыліндра. На Палесс! часта яе рабілі «на завесах», калі яе ззаду разразалі вертыкальна і завязвалі некалькімі шаўковымі тасёмкамі («завесамі»). Бытавала да пачатку XX ст. на Палессі, Заходняй Гродзеншчыне і заходніх раёнах Міншчыны[126]. Украінская высокая



**Аблавуха. 1880 г.**



**Малахай.** Канец XIX ст.

баранавая шапка «стовбата» мела закругленае дно і была выключна футравай[127].

У беларусаў былі зімовыя шапкі, верх якіх рабілі з сукна, як, напрыклад, малахай — трохлопасцевая шапка сферычнай ці конусападобнай формы. Шап-ка гэта хутчэй за ўсё была запазычана ў рускіх, якія, у сваю чаргу, пераняли яе ад башкіраў і калмыкаў у сярэдзіне XVIII ст.[128] Футравымі (з аўчынкі, лісы, бабра, ваўка, барсука) у ёй былі «вушы» і казырок, знізу быў прышыты даволі шырокі пасак сукна[129]. Рускі малахай меў 4 лопасці, «вушы» завязвалі ззаду[130]. Вядомы малахай і украінцам.

Зімовыя шапкі былі розных форм, у тым ліку і ў форме ўсечанага конуса з плоскім верхам. Такой шапкай была пакупная папаха з аўчынкі (каракуля) без вушак, модная на пачатку XX стагоддзя[131] і пазней. Папаха ў савецкі час уваходзіла ў склад ваеннай формы.

У сярэдзіне XIX ст. пад уплывам гарадской моды ўвайшла ў быт кубанка цыліндрычнай формы, з плоскім дном, сшытая з адной аўчыны[132].

З другой палавіны XIX ст. у Беларусі пашыраецца ў гарадскім асяроддзі такі летні мужчынскі галаўны ўбор фабрычнай вытворчасці, як картуз (фуражка). Шылі яго, як правіла, з фарбаваных суконных тканін, а таксама з плісу, аксаміту, вельвету, на падкладцы з цвёрдым казырком. Яго можна было набыць за 20—60 капеек у бліжэйшай краме ў мяс-





**Зімовыя шапкі.** XIX ст.



тэчку[133]. Паступова ён выцясніў магерку, брыль, аблавуху. На Міншчыне і Гродзеншчыне бывалі саламяныя картузы, сшытыя з дапамогай конскага воласу са сплеценай з пшанічных сцяблоў паскі. Картуз з аколышкам шырынёй у 4 см і раменьчыкам спераду, бліскучым казырком, прамым верхам зафіксаваны этнографамі ў 1966 г. у в. Міхайлаўка Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці[134]. Стаячыя аколышы былі 5—8 см вышыні і з цвёрдым казырком рознай формы: паўкруглыя, доўгія, прамыя, нахіленыя. Казыркі былі не толькі лакіраванымі, а і абцягваліся скурай ці тканінай, як і ўвесь картуз. Святочныя картузы ўпрыгожвалі над казырком стужкамі, шнуркамі, кветкамі. У канцы XIX ст. у рабочым асяроддзі быў модны картуз з лакавым казырком[135]. Чорны картуз ці брыль былі галаўным уборам веткаўскіх стараабрадцаў[136]. Другой назвай картуза была фуражка. На Гродзеншчыне (у Дзятлаўскім, Лідскім, Астравецкім, Навагрудскім і інш. раёнах) бытавалі тканевыя круглыя фуражкі з бліскучым (брылем) казырком[137], якія нярэдка мясцовыя жыхары называлі «картуз з брылем» (в. Міхалішкі Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці)[138]. У асобных вёсках фуражка з'явілася пасля вайны 1905 г. з Японіяй, як успаміналі вельмі старыя людзі ў 1960-ых гг. (в. Грыцэвічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці)[139]. Звычайна яе набывалі на базарах у «картузнікаў». У пачатку XX ст. увайшлі ў моду ў сялян чорнага колеру фуражкі («ваенныя»), якія былі ўжо распаўсюджанымі ў гарадах. Картуз, ці фуражка, сталі самым распаўсюджаным мужчынскім галаўным уборам у гэты час.

Фуражкі-картузы хутка распаўсюдзіліся сярод сялян і сталі асноўным уборам мужчын у пачатку XX ст. Іх насілі і дарослыя, і дзеці. Прыгожы каляровы аток, каляны казырок надавалі гаспадару сур'ёзны выгляд. У другой палавіне XX ст. фуражка паступова страціла сваё былое значэнне і засталася ў ваеннай форме.

Побач з ёй у канцы XIX — пачатку XX ст. паўсюдна насілі зручныя і лёгкія магеркі, саламяныя брылі і капелюшы, а зімой — шапкі-вушанкі, у заходніх раёнах і канфедэраткі. У пачатку XX ст. шапку-вушанку, якая была галаўным уборам і гараджан, шылі майстры з пакупной тканіны. З'явіўся новы галаўны ўбор — «кепка», шытая з сукна ці палатна (у залежнасці ад прызначэння да пары года), які заставаўся шырока пашыраным ўборам на працягу XX ст. І сёння ёсць нямала прыхільнікаў гэтага галаўнога ўбору. Пад уплывам ваеннай формы ў канцы XIX — пачатку XX ст. з'явіліся «башлыкі» як самастойны галаўны ўбор, які больш выкарыстоўвалі зімой у дарозе.

У Гродзенскай губерні ў канцы XIX ст. сяляне насілі «канфедэраткі» з сіняга сукна і апухай з сівых аўчынак без «вушак». На чатырохкутным дне —



**Вясковы** настаўнік у капелюшы і хлопчык у картузе.
Фота І. Якубені

белы кутасік на снурку, які на зіму ўшывалі ўнутр, а вясной — даставалі[140]. Такія ж канфедэраткі насілі і мазуры ці мазаўшане Плоцкай губерні. Зімовы варыянт яе меў адварот з аўчынкі, а летні — упрыгожваўся пер'ямі і лентамі[141].

На Мінскім Палессі ў канцы XIX ст. былі зафіксаваны чатырохкутныя шапкі з шэрага хатняга сукна, якія зверху і ўнізе абшывалі чырвоным сукном, а па баках вуглоў у іх звісалі невялічкія чырвоныя кутасікі[142]. Паводле апісання, яны вельмі нагадваюць «рагатувку». На жаль, назву аўтар не прыводзіць.

У канцы XIX — пачатку XX ст. шырока распаўсюдзіліся ў гараджан розныя капелюшы з шырокімі і з вузкімі палямі: цыліндрычныя зверху, з высокай перацiснутай пасярэдзіне тулляй, з высокім верхам, якая пашыралася даверху («кучарскі»), круглы з нешырокімі палямі («кацялок») і інш. Капелюшы фабрычнай вытворчасці насіла таксама невялікая



Селянін **у картузе.** 1930-ыя гг. Слаўгарадскі раён Магілёўскай вобласці

сёння, змяніўшы сваё прызначэнне: яна стала незаменным спартыўным галаўным уборам розных форм, якія выпускав прамысловасць.

Матэрыялы даследавання сведчаць, што суконныя «шлыкі» з футравай аблогай, лямцавыя «матери», аўчынныя «кучмы», саламяныя «капелюшы», войлачныя і фетравыя «брылі», «капелюхі» з палямі і інш., мелі шмат лакальных варыянтаў. Вызначальнай іх рысай была захаванасць архаічных форм галаўных убораў, іх назваў аж да канца XIX ст., асабліва на тэрыторыі Палесся. На працягу многіх стагоддзяў яны ўтрымлівалі элементы суседніх народаў, што сведчыць аб працэсах іх культурнага ўзаемадзеяння.

У часы пасляваеннага разбурэння пасля першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, калі моцна скарацілася прамысловая вытворчасць, значная частка насельніцтва (асабліва на вёсцы) вярнулася да галаўных убораў хатняй і паўкустарнай вытворчасці



Тыпы кепак. 2-ая папавіна XX ст. Малюнкі С. Гунько

частка сялян і жыхароў мястэчак (вясковая інтэлігенцыя, кухары, цырульнікі, заможныя сяляне і г. д.). Яны былі прызначаны для вясны, восені, лета, і шылі іх пераважна з шэрсці чорнага ці ка-рычневага колеру. Сяляне традыцыйна насілі сала-мяныя капелюшы і капелюшы з лямцу.

Вязаныя галаўныя уборы з ільняной ці шарсця-ной пражы часцей у форме каўпака, радзей — паў-шар'я насілі з XIX ст. на вёсцы і ў горадзе. Вязаць іх было зручна, як доўгую панчоху (як адзінарную, так і двайную), краі якой адгіналіся некалькі разоў. У другой палавіне XX ст. яны значна распаўсюдзіліся. У канцы 1960 — пачатку 1970-ых гт. шапкі вязалі галоўным чынам уручную паводле формы кепкі, капелюша і г. д., у якія ўстаўлялі цвёрды каркас і казы-рок. Не страціла свайго значэння вязаная шапка і



**Шапка-вушанка.** 1-ая палавіна XX ст. Веска Міхалішкі Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці

з традыцыйных матэрыялаў. Уяўленне аб галаўных уборах першай палавіны XX ст. даюць фотаздымкі гараджан і вяскоўцаў таго часу, якія з'яўляюцца да-кладнай гістарычнай крыніцай. Так, на вясковых мужчынах ў 1920—1930-ыя гг. можна было ўбачыць добра вядомую магерку з лямцу, саламяны брыль,



**Галаўныя ўборы калгаснікаў.** 1947 г. Вёска Крывічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці



**Шапкі гараджан э Оршы.** 1920—1930-ыя **гг.**

аўчынныя кучмы, шапку-вушанку з самаробнага сукна і аўчынкі ці малахай. Гэта сведчанне таго, што на вёсцы моцнымі былі яшчэ этнічныя традыцыі, зберагаліся асноўныя рысы галаўных убораў папярэдніх эпох, якія трансфармавалі вопыт многіх пакаленняў беларусаў і суседніх народаў. Шырокае распаўсюджванне ў пачатку XX ст. тут атрымалі картузы, фуражкі, кепкі, значна меншае — папахі,



**Селянін у кепцы э драпу.** 1970 г.
Вёска Слабодка Чавускага раёна Магілёўскай вобласці

шапкі-будзёнаўкі з чырвонай зоркай на лобнай частцы, якія насілі гарадскія і вясковыя актывісты. Вушкі яе зашпільваліся ўверсе ці пад падбародкам. Мала хто ведае, што будзёнаўка з'яўляецца адлюстраваннем старажытнага галаўнога ўбора XI—XII стст. пад назвай «шелом», які, згодна з ілюстрацый Радзівілаўскага летапісу, насілі ваяры з беларускіх земляў. У будзёнаўкі было нядоўгае жыццё, якое завяршылася да 1940 г. У 70-ыя гг. XX ст. будзёнаўка зноў была любімым галаўным уборам хлопчыкаў.

У 1920-ыя гг. узнікненне так званага паўваеннага касцюма, калі даношвалі ваенную вопратку (шынялі, бушлаты, боты, будзёнаўкі, папахі, фуражкі і інш.), было звязана з вельмі яскравым адлюстраваннем яго знакавых функцый у перадваенны час. Ён характэрны перш за ўсё для камсамольскіх і партыйных работнікаў, прафсаюзных актывістаў, якіх можна было адрозніць па гэтых адзнаках.

Гараджане зімой насілі папахі з каракуля (звычайна светла- ці цёмна-шэрага колеру і чорнага). Форма іх была неаднолькавай. На фотаздымках першай чвэрці XX ст. бачны папахі з паўкруглым, часам скураным, верхам ці пласкадонныя. Многія віды зімовых шапак мелі скураны ці тканевы верх. Другім пашыраным відам зімовых шапак былі вушанкі. У адрозненне ад сучаснага крою шапак-вушанак, якія таксама бытавалі, сустракаліся вушанкі іншай формы: са сферычным скураным верхам, пасярэдзіне якога прышываўся такі ж гузік, высокім каракулевым налобнікам і ўкарочанымі футравымі клапанамі, якія закрывалі вушы.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны 1941 — 1945 гг., паводле сведчанняў гарадскіх жыхароў, мужчынская частка насельніцтва, якая вярнулася з вайны, доўгі час насіла ваенныя пілоткі, «лётчыцкія» і «тан-

кісцкія» шапкі, фуражкі, шапкі-вушанкі[143]. На вёс-цы акрамя адзначаных галаўных убораў насілі і традыцыйныя, зробленыя сваімі рукамі[144]. Сацыяльныя адрозненні ў нашэнні тых або іншых шапак былі звязаны з узроўнем дабрабыту, прафесіяй, узростам. Мужчыны з больш высокім узроўнем дабрабыту насілі футравыя шапкі з лісы, бабра, янота, выдры. У модзе 1950—1960-ых гг. былі высокія каракулевыя шапкі з круглым тканевым дном (кубанкі). Гараджане з нізкімі заробкамі мелі, як правіла, зімовыя вушанкі з зайца, труса ці аўчынкі. У вясеннелетнічаснасілібрылі, кепкі,аў 1950-ыягг. — цюбецейкі.

З ростам вытворчасці галаўных убораў, паляпшэннем дабрабыту насельніцтва попыт на іх практычна задавальняўся грамадскай вытворчасцю, хаця шапак з футра ўсё ж нставала. Таму заказвалі іх пашыў у атэлье і надомных майстроў. З канца 70-ых да пачатку 90-ых гг. XX ст. у мужчынскай мо-дзе цвёрда трымаліся шапкі-вушанкі з адкіднымі

чыны рознага ўзросту і сацыяльнага статуса тым або іншым ўборам, а таксама з асабістым густам. Сёння рынак прапануе вялікую колькасць галаўных убораў розных гатункаў і мадыфікацый, здольных задаволіць любы густ. Асноўнай тэндэнцыяй у маладзёжнай модзе застаецца спартыўны стыль як у адзенні, так і ў галаўных уборах. Пэўная частка моладзі ўвогуле не носіць іх. Мужчыны сярэдняга і сталага ўзросту традыцыйна аддаюць перавагу больш цёплым зімнім галаўным уборам і такім жа традыцыйным брылям, кепкам вясной, летам і восенню. Сёння галаўныя ўборы селяніна і гараджаніна амаль не адрозніваюцца, бо іх набываюць у магазінах. Толькі селянін у паўсядзённым жыцці, зыходзячы з умоў працы на адкрытым паветры, больш прыхільны да зручных шапак-вушанак, суконных кепак. Замест саламяных капелюшоў, раней такіх дасягальных селяніну, улетку ён носіць кепку або лёгкую круглую ці з доўгім казырком шапку тыпу «жакейка» розных колераў, якія прапануе гандаль.



**Форменная фуражка інспектара рыбаховы.** 1985 г. Мінск



**Прычоска на прамы прабор.** Пачатак XX ст.

«вушкамі» і так званыя «падманкі», у якіх вушы імітаваліся і не адкладваліся. Асартымент футра, з якога яны шыліся, быў вялікі: ліса, андатра, нутрыя, воўк, сабака, заяц, трус, янот і інш. Шыліся яны і з завазнога футра: собаля, пясца, чарнабуркі, нерпы і г. д.). Побач з вушанкамі ў зімовы час паўсямесна насілі вязаныя спартыўнага стылю шапкі з рознымі надпісамі, арнаментам і г. д. У вясеннелетні час насілі розныя кепкі, брылі, моладзь — жакейкі, кепкі.

У канцы XX ст. змены ў галаўных уборах мужчын звязаны ў меншай ступені з якасцю тканін, скуры і футра і больш з перавагай, якую аддаюць муж-

Моды на тыя ці іншыя галаўныя ўборы больш трымаецца моладзь і сярэдняе пакаленне. Некалькі дзесяцігоддзяў устойліва трымаецца ў быце шапкавушанка з рознага футра (норкі, выдры, андатры, труса, куніцы і інш.). Моладзь выбірае па большай частцы шапкі спартыўных фасонаў, часцей замежнай вытворчасці, форма якіх мяняецца даволі часта. Галаўныя ўборы не толькі страцілі нацыянальную спецыфіку, але і не маюць адрозненняў у розных сацыяльных групах. Выключэннем з'яўляецца творчая інтэлігенцыя (мастакі, артысты і г. д.), якую часцей можна ўбачыць у суконным ці аксамітным барэціку, часам — у саламяным капелюшы ці іншага роду шапцы.



**Прычоска «пад Катоўскага».** 1929 г. Магілёў



**Мужчынская прычоска.** Канец 1960-ых гг.

Мяняліся ў часе і прычоскі. Калі на вёсцы гэтыя змены адбываліся павольна, і ў першай чвэрці XX ст. і нават пазней можна было сустрэць старадаўнія прычоскі «ў кружок», «пад гаршчок», «у скобкі», а таксама доўгія валасы і такую ж бараду ў сталых мужчын, то ў горадзе прычоскі значна ўкарочваюцца. Моднымі з пачатку XX ст. становяцца кароткія стрыжкі з адкрытымі вушамі і каротка стрыжанай патыліцай. Вызначальнай адзнакай такой прычоскі былі гладка зачасаныя валасы з праборам пасярэдзіне ці з левага боку. Побач з ёй існавала прычоска з зачасанымі назад валасамі.

Каротка стрыжаныя валасы, як правіла, спалучаліся з невялікімі вусамі і барадой ці без іх. Аналізуючы фотаматэрыял, мы прыйшлі да высновы, што ў гарадской мужчынскай модзе пачынаючы з канца XIX ст. пераважала кароткая стрыжка з падкрэсленымі віскамі. Побач з ёй існавала стрыжка «пад нуль», ці «пад Катоўскага», характэрная для 20—30-ых гг. XX ст. З 40-ых гг. XX ст. была вядома стрыжка «бокс» і «паўбокс», якія адрозніваліся большай ці меншай састрыжанасцю валос.

У 1950—1960-ыя гг. моднай была «полька» (каротка і высока стрыжаная патыліца і доўгія валасы спераду і на макушцы, якія зачэсваліся пераважна ўверх ці на бок).

Для 1960— 1970-ых гг. характэрна «канатка» — кароткая стрыжка са сфарміраванай ззаду прамой на патыліцы; «вожык», калі валасы астаўлялі на 1—2 см даўжыні; «кок» з падоўжанымі валасамі, якія ўзбіваліся ўверх і хваляй спускаліся на бок; маладзёжная стрыжка «гаўрош», пры якой валасы спераду былі кароткімі, а ад сярэдзіны патыліцы спускаліся доўгія пасмы, і інш.

Мужчынскія прычоскі пастаянна мяняюцца. Моладзь 1970 — канца 1980-ых гг. адрошчвала доўгія, звісаючыя на плечы валасы, падражаючы хіпі. У канцы XX — пачатку XXI ст. у маладзёжнай модзе пераважае стрыжка «пад нуль». Хаця па-ранейшаму частка моладзі трымаецца кароткіх стрыжак папярэдняга часу, асобныя носяць доўгія валасы да сярэдзіны лапатак, рэдкія — стрыжку «іракез». Сярэдняе пакаленне прытрымліваецца звычайных кароткіх стрыжак з невялікімі бакамі ці без іх. Асобныя носяць невялікую ці каротка падрэзаную бараду і вусы. Такім чынам, прычоска, як і касцюм у цэлым, часта мела не толькі сацыяльную, але і ўзроставую адзнаку. Працэс яе эвалюцыі характарызуе пераход то к доўгім валасам, то к кароткім і пэўныя змены ў стылі самой прычоскі, асабліва бачныя ў маладзёжнай модзе.

' Акты, издаваемые комиссиею Высочайше учрежденною для разбора древних актов в Вильне. Т. XVIII. Акты о копных судах. Вильна, 1891. С. XII.
2 Дучыц Л. І. Касцюм жыхароў Беларусі X-XIII стст. Мн., 1995 (паводле археалагічных звестак). С. 17.
3 Там жа. С. 41.
4 Барвенава Г. А. Пстарычны касцюм Беларусі X — пачатку XVI стагоддзя // Аутарэф. дыс. на атрым. нав. ступені канд. мастацтвазнаўства. Мн., 2001. С. 10-11.
5 Радзивиловская летопись. Текст. Исследование. Описание миниатюр. СПб., 1994. С. 281.
6 Там жа. С. 290.
7 Полное собрание русских летописей. Т. 32. Летописи белорусско-литовские. М., 1975. С. 29.
8 Там жа. С. 69.
9 Дучыш Л. І. Касцюм жыхароў Беларусі... С. 16, 40.
10 Барвенава Г. А. Пстарычны касцюм Беларусь.. С. 12.
" Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. СПб., 1865. Т. II. С. 211.
12 Забылин М. Русский народ. М., 1980. С. 509.
13 Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры бело русов XVI-XVIII вв. Мн., 1981. С. 98.
14 Там жа.
15 Рассказы о польской старине. Записки XVIII века Яна Дуклана Охотского. Переп. и изд. У. Крашевским. Т. I. СПб., 1874. С. 47.
16 Терешенко А. Быт русского народа. С. 199.
17 Тананаева Л. И. Сарматский портрет. Из истории польского портрета эпохи барокко. М., 1979. С. 132.
18 АВАК. Т. XXXVI. Вільна, 1912. С. 41.
19 Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Уп равлении Виленского учебного округа. Т. III. Вільна, 1867. С. 82.
20 Там жа. С. 252.
21 АВАК. Т. XX. Вільна. 1893. С. 136.
22 Историко-юридические материалы. Т. VII. С. 148.
23 Акты, относящиеся к истории Западной России, со бранные и изданные Археографическою комиссиею. Т. II. С. 58.
24 АВАК. Т. XVII. С. 607.
25 Там жа. С. 583.
26 АСД. Т. I. Вильна, 1867. С. 251.
27 АЗР. Т. II. С. 382.
28 Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997. Укладанне Ул. Арлова. С. 254.
29 АВАК. Т. XXXVI. Вильна, 1912. С. 387.
30 Гусоўскі Мікола. Песня пра зубра. Мн., 1980. С. 96.
31 АВАК. Т. XXI. С. 62.
32 Перлы — жэмчуг.
33 АЗР. Т. И. Спб,, 1848. С. 381.
34 АСД. Т. I. Вільна, 1867. С. 251-252.
35 ИЮМ. Вып. V. Витебск, 1874. С. 278.
36 Белоруссия в эпоху феодализма. Т. I. Мн., 1959. С. 348.
37 АСД. Т. III. Вильна, 1867. С. 298, 308.
38 Там жа. С. 299, 305, 307.
39 АСД. Т. I. Вильна, 1867. С. 162.
40 Там жа.
41 Мальдзіс Адам. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя. Мн., 1982. С. 227.
42 Историко-этнографический атлас Прибалтики. Одеж да. Рига, 1986. С. 116.
43 ИЮМ. Вып. VI. Витебск, 1874. С. 80.



Мужчынская прычоска. Сярэдзіна 1970-ых гг.

44 АВАК. Т. XXXVI. Вильна, 1912. С. 58.
45 ИЮМ. Вып. I. Витебск, 1871. С. 302.
«Там жа. Вып. III. Витебск, 1872. С. 74.
47 Там жа. Т. XXXVI. Вып. VI. Витебск, 1874. С. 73; Вып. IX. Витебск, 1878. С. 42.
48 Там жа. Т. XXXII. С. 84.
49 Там жа. Т. XXI. Вильна, 1894. С. 38.
50 Там жа. С. 92.
51 АСД. Т. I. Вильна, 1867. С. 253.
м АВАК. Т. XXXVI. С. 387.
53 Там жа. С. 369.
54 АСД. Т. III. Вильна, 1867. С. 50.
и АВАК. Т. XXVI. С. 152, 357.
56 ИЮМ. Вып. VII. С. 290.
57 Русско-белорусские связи. Сб. документов (1570—1667 гг.). Мн., 1963. С. 179, 180.
58 Там жа. С. 204, 205, 206.
59 Gloger Z. Encyklopedia Staropolska. Т. 3. С. 176.
60 Рассказы о польской старине... Т. I. С. 127.
61 Грыгор'еўМ. Войска ВКЛ. Ад Сасаўда КасцюшкЦ 1765—1794). Мн., 1994. С. 22.
62 Мальдзіс Адам. Беларусь у люстэрку... С. 227.
63 Рассказы о польской старине. Т. I. С. 9.
64 Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры... С. 98.
65 Словарь древнерусского актового языка Северо-Запад ного края и Царства Польского. Сост. Н. Горбачевским. Вильна, 1874. С. 167.
66 АВАК. Т. XX. Вільна. 1893. С. 174.
67 Украинцы. М,, Наука. 2000. С. 204.

[68] Грыгор'еў М. Войска ВКЛ... С. 19.
[64] Мальдзіс Адам. Беларусь у люстэрку... С. 227.
[70] Жданов Л. Осажденная Варшава. Т. 6. С. 15.
" Энциклопедия сценического самообразования. Костюм. Под. ред. Ф. Ф. Комиссаржевского. СПб., С. 384—387.
[72] Терещенко Л. Быт русского народа. М., 1997. Ч. I. С. 208.
[73] Ястребицкая А. П. Западная Европа XI—XI11 вв. М., 1978. С. 83.
[74] Там жа. С. 84.
[75] Рассказы о польской старине. Т. I. С. 44.
[76] Рабинович М. Г. Одежда русских XIII—XVII вв. //Древ няя одежда народов Восточной Европы (Материалы к историко-этнографическому атласу). М., 1986. С. 83.
[77] Матейко Катерина. Украïнськйй народний одяг. Етнографічнйй словник. К., 1996. С. 112.
[78] Баршчэўскі Ян. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях. Мн., 1990. С. 350.
[79] Жданов Л. Осажденная Варшава (1830—1831). Т. 6. С. 12, 31.
[80] Рассказы о польской старине... Т. I. С. 44.
[81] АВАК. Т. XXII. Вильна, 1895. С. 252.
[82]Тамжа. 1599 г. С. 484.
[83] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка рус ского населения Северо-Западного края. СПб., 1902. Т. 3. С 8
[84] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 124, л. 8.
[85] Там жа, спр. 99', л. 11.
[86] Там жа. спр. 12", л. 9.
[87] Там жа. спр. 124, л. 8.
[88] Сборник статей «Могилевских губернских ведомостей 1900—1901 гг.» под ред. Е. Р. Романова // Могилевская старина. Могилев, 1901. С. 5.
[89] Беларускае народнае адзенне. Мн., 1973. С. 57.
[90] Белорусско-литовское Полесье. Составитель Я. И. Руд нев. Изд. 2-е. СПб., 1899. С. 136.
[91] Там жа.
[92] Там жа. С. 137.
[93] Максимов С. Обитель и житель (из очерков Белорус сии) // Древняя и новая Россия. М., 1876. Т. 2. С. 300—301.
[94] Там жа. С. 301.
[95] Зеленин Д. К. Описание рукописей ученого архива Императорского русского географического общества. Вып. I. Петроград, 1914. С. 44.
[96] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности. Витебск, 1895. С. ИЗ.
[97] Историко-этнографический атлас Прибалтики. С. 117.
[98] Русские. Историко-этнографический атлас. С. 238.
[99] Матейко К. I. Головні убори украïнськіх сялян до по чатку XX ст. // Народна творчість та етнографія. К., 1973. № 3. С. 53.
юо Матейко Катерина. Украïнськйй народний одяг... С. 134.
[101] Романов Е. Р. Внешний быт быховского белоруса // Записки Северо-Западного отдела Императорского Рус ского географического общества. Кн. 2. СПб., 1911. С. 100.
[102] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного жи тья-бытья... С. 113.
[103] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... Т. 3. С. 44.
[104] Там жа. С. 8.
[105] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья ... С. 113.
[1116]Сыракомля Ул. Добрыя весці. Мн., 1993. С. 146.
[1117] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка ... С. 44.
[m] Там жа С. 73.
[109] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 104, л. 5.
[110] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... С. 73.
[I] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. И, спр. 99[а], л. 7; спр. 103, л. 7; спр. 104, л. 5; спр. 106, л. 10; спр. 111, л. 7 і інш.
[112] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... С. 73.
[1,3] Там жа С. 367.
[114] Зеленин Д.К. Описание рукописей ученого архива... С. 455.
"[5] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... С. 43.
[116] Там жа.
[1,7] Там жа.
[118] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 114.
[119] Там жа.
[12]"А1МЭФНАНБ, ф. 6, воп. 1,спр. 98, л. 7; спр. 100, л. 5; спр. 103, л. 7; спр. 118, л. 7; спр. 120, л. 9; спр. 124, л. 8; спр. 410, л. 7; спр. 413, л. 9 і інш.
[121] Шейн П. В.Материалы для изучения быта и языка... С. 367.
[122] Беларускае народнае адзенне... С. 55.
[123] Матейко Катерина. Украïнськйй народний одяг... С. 133.
[124] Шейн П. В.Материалы для изучения быта и языка... С. 367.
[125] Там жа.
[126] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 103, л. 7.
[127] Матейко Катерина. Украïнськйй народний одяг... С. 137.
[128] Русский традиционный костюм: Иллюстрированная энциклопедия / Авт.-сост.: Н. Соснина, И. Шангина. СПб., 1999. С. 168.
[129] Беларускае народнае адзенне... С. 55.
[1,0] Русский традиционный костюм... С. 168.
[131] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 403, л. 7; спр. 404, л. 7; спр. 411, л. 7; спр. 413, л. 9.
[132] Там жа, спр. 124, л. 8; спр. 130, л. 7; спр. 404, л. 8; спр. 411, л. 7.
[133] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... С. 73.
[134] АІМЭФ НАНБ, ф. 6, воп. 11, спр. 128, л. 8.
[135] Иванов В. М. Очерк быта промышленных рабочих до революционной Белоруссии. Мн., 1971. С. 71.
[136] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской гу бернии. Могилев-на-Днепре, 1882. Кн. I. С. 667.
[137] АІМЭФ НАНРБ, ф. 6, воп. 11, спр. 99[а], л. 11; спр. 102, л. 7; спр. 103, л. 7; спр. 106, л. 5; спр. 124, л. 8; спр. 398, л. 8; спр. 399, л. 8; спр. 402, л. 5; спр. 404, л. 7; спр. 405, л. 5; спр. 412, л. 7; спр, 413, л. 9.
[138] Там жа, спр. 410, л. 7.
[139] Там жа. спр. 99", л. 11.
[140] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка... С. 76.
[141] Народы России. Белорусы и поляки. СПб., 1880. С. 61.
[142] Зеленин Д. К. Описание рукописей ... Вып. II. С. 698.
[143] АІМЭФ НАНРБ. ф. 6, воп. 17, спр. 96, л. 14.
[144] Там жа.

# Глава 6 Абутак



Абутак (вобуй, абуццё) складае важную частку касцюма. Ён засцерагае ногі ад уздзеяння холаду, гразі, вільгаці і механічных пашкоджанняў вострымі камянямі, калючкамі, каранямі дрэў, якія выступаюць над паверхняй глебы, і г. д.

Вонкавы выгляд, якасць і матэрыялы, з якіх вырабляліся розныя тыпы традыцыйнага абутку, у значнай ступені былі абумоўлены кліматычнымі ўмовамі Беларусі, эканамічным і культурным развіццём беларускага этнасу ў адпаведныя гістарычныя перыяды, тэхнічнымі прыёмамі вырабу і мясцовымі звычаямі. Якасць і матэрыялы абутку залежалі і ад яго канкрэтнага прызначэння (паўсядзённы, святочны, хатні, для спецыяльных работ і г. д.).

Найстаражытнейшым відам абутку на тэрыторыі Беларусі з'яўляліся плеценыя з лыка, лазовай і вязавай кары лапці. З даўніх часоў яны былі вядомы ўсходнім і заходнім славянам, народам Прыбалтыкі, Паволжа, фінам і інш. У «Аповесці мінулых гадоў» (985 г.) пра насельніцтва паўночна-заходніх зямель Старажытнарускай дзяржавы гаворыцца як аб лапатніках[1]. Плецены з лыка лапаць знойдзены пры раскопках Люцынскага магільніка (Віцебская вобласць, I тысячагоддзе н. э.[2]).



У археалагічным матэрыяле курганоў з тэрыторыі Беларусі скураны абутак сустракаецца надзвычай рэдка. Археолагі тлумачаць гэта старадаўнім славянскім звычаем надзяваць нябожчыку ў труну лапці нават тады, калі ён не насіў іх пры жыцці, або хаваць у абмотках ці шкарпэтках[3].

У некаторых сельскіх мясцовасцях Беларусі гэты звычай захоўваўся да 1930-ых гг. У в. Мінойты Лідскага раёна Гродзенскай вобласці, паводле слоў інфарматара, гэты звычай быў звязаны з тым, што сяляне лічылі, калі памерлага пахаваць у скураным абутку, то жывёла, са скуры якой зроблены абутак, на тым свеце будзе турбаваць нябожчыка, патрабуючы назад сваю скуру[4].

Лапці як від абутку вясковага насельніцтва сустракаюцца ў актавых матэрыялах XVI—XVII стст.: «обецал мн дат был лаптн» (1579 г.)[5]; «у сермягу убравшы н лапьтн на себе вложывшы, бывало ходнть» (1607 г. )[6]; «след... одного вь ботехь, а другого вь лапьтяхь оть дорогн ку тому рову прншоль» (1608 г.)[7].

Праіснаваўшы многія стагоддзі ў амаль нязменным выглядзе, плеценыя лапці заставаліся асноўным відам як летняга, так і зімовага абутку вясковага насельніцтва Беларусі да 20-ых гг. XX ст.

У адрозненне ад вясковага насельніцтва ў шырокім ужытку гараджан здаўна былі розныя віды скуранога абутку. Нават у самых старажытных культурных слаях беларускіх гарадоў археолагамі не выяўлена ніводнага фрагмента плеценых лыкавых лапцей, у той час як рэшткі скуранога абутку і сыравіны для яго вырабу складаюць найбольш масавыя знаходкі[8]. Майстэрні шаўцоў са шматлікімі



Арнаментаваны абутак XII ст. з горада Попацка Віцебскай вобласці

прыладамі працы і вялікай колькасцю адходаў шавецкага рамяства раскопаны археолагамі ў Полацку, Мінску, Бярэсці. Было знойдзена мноства фрагментаў і амаль цалкам захаваных экземпляраў мужчынскага, жаночага і дзіцячага абутку, а таксама шавецкі інструмент: калодкі-правідлы, шылы, нажы, іголкі. Шаўцы старажытнага Полацка XI—XIII стст., згодна з археалагічнымі дадзенымі, выраблялі шэраг відаў абутку: поршні, чаравікі і боты. У адной з пісьмовых крыніц XI ст. ёсць паведамленні, што пры раскроі абутку рамеснікі карысталіся ўжо выкрайкамі[9].

Сыравінай для вырабу абутку служылі скуры буйной і дробнай рагатай жывёлы: кароў, цялят, авечак і коз. На падэшвы часцей за ўсё ішла скура быкоў і найбольш фубая спінная частка каровіных скур.

Сучасны хімічны і фізіка-механічны аналізы скураных матэрыялаў з Полацка XI—XIII стст., у комплексе з летапіснымі паведамленнямі, далі магчымасць археолагам узнавіць старажытны працэс вырабу скур, якія ішлі на пашыў абутку. Ён уключаў шэраг паслядоўных аперацый, першай з якіх было мачэнне скур у рацэ або чанах у растворы вапны або попелу. Пасля пры дапамозе нажоў-тупікаў з вонкавай паверхні скуры выдалялі шэрсць, а з ніжняга боку здымалі мяздру. Аб існаванні гэтых аперацый сведчыць знаходка на тэрыторыі Верхняга замка ў Полацку рэшткаў шавецкай майстэрні з кучай поўсці, перамешанай з вапнай, і вялікай колькасці скураных абрэзкаў каля яе. Зольнікам старажытнаму рамесніку служыла размешчанае побач з май-



Скураныя поршні XII—XIII стст. Гродна



Скураныя чаравікі XII- **XIII стст**
а) Полацк,
б) Мінск

стэрняй драўлянае збудаванне (1хі м), у якім захаваліся рэшткі вапны і шэрсці'". Наступнай аперацыяй было абяззольванне. Для гэтага скуры спачатку старанна прамывалі і для набыцця імі эластычнасці і мяккасці квасілі ў растворы аўсянай, жытняй або пшанічнай мукі і солі. Атрыманы паўфабрыкат зноў мылі і дубілі ў растворы з дрэвавай карой.

Полацкія гарбары XII—XIII стст. зналі ўжо рацыянальныя нормы дубіцеляў (вярбовай кары і інш.), якія забяспечвалі добры прадуб скуры і пратраўнае фарбаванне з прымяненнем жалезных соляў". Пасля дублення і фарбавання скуры жыравалі дзёгцем, глянцавалі, мякчылі.

Рамеснікі беларускіх гарадоў выраблялі розныя віды і гатункі скуранога тавару: ялавіцу, юхт, казліну, саф'ян. Выкарыстоўваліся тэрміны «усмне» (усма, усмне), «хьз», «кожа», «чревне» (черевне), «язьно»[12]. Паўсюднае пашырэнне меў абутак з юхці, выраблены з ялавічых і невялікіх валовых скур".

Найбольш старажытны і просты тып скуранога абутку гараджан — поршні[14]. Іх не шылі, а рабілі з аднаго кавалка скуры, краі якога загіналіся вакол ступні, ствараючы галоўку, бакі і заднік. Па ўсяму перыметру загатоўкі былі скразныя прорэзі для працягвання раменных абор, з дапамогай якіх поршні мацавалі да нагі. Больш складаны варыянт уяўлялі сабой поршні з двух кавалкаў скуры. З мэтай мастацкага аздаблення на насках поршняў часам рабілі прорэзі, у якія ўплыталі скураныя раменьчыкі або, сцягваючы прорэзі шнуркамі, утваралі з іх ажурныя ўзоры. У гутарковай мове гараджане звычайна называлі поршні лапцямі: «лаптн двон чнрвоные юхтевые побратн казал» (1577 г.)[15].

Паводле меркавання Г. В. Штыхава, самым распаўсюджаным абуткам у Полацку XI—XIII стст. былі чаравікі, меўшыя борцікі (берцы), якія закрывалі шчыкалатку нагі[16]. Паводле крою яны падзяляліся на два віды: з трохкутным выразам на задніку і з закругленым наском і пятой. Ніжэй шчыкалаткі праз прорэзі чаравікі сцягвалі раменьчыкам, які завязваўся ззаду. Верх чаравікаў звычайна выкройвалі з аднаго куска скуры. Да падэшвы з такога ж матэрыялу яго прышывалі льнянымі наваскаванымі ніткамі. Увесь абутак быў юхтавы, мяккі, вываратны.

Туфлі, якія выраблялі старажытныя шаўцы ў гарадах Беларусі, нагадвалі сучасныя чаравікі, толькі з нізкімі борцікамі. Сярод туфель часта сустракаліся ўпрыгожаныя ажурным перапляценнем раменьчыкаў. Кароткія чаравікі і паўчаравікі мелі вышыню халяў не больш за 20 см[17].

У гарадах розных рэгіёнаў Беларусі скураны абутак меў спецыфічныя асаблівасці. Мяккія туфлі, чаравікі ў Мінску і Полацку багата арнаментаваліся вышыўкай геаметрычнага, стылізаванага расліннага або спалучэннем геаметрычнага ўзора з раслінным[18]. Звычайна вышыўкай упрыгожвалі насок абутку, хаця часам вышывалі кожны сантыметр усяго вырабу. Большасць туфель, знойдзеных археалагамі ў Бярэсці, былі таксама багата арнаментаваны вышыўкай".

Узоры вышыўкі спалучалі розныя элементы: пляцёнкі, завіткі, кругі, прошвы, трохкутнікі, ромбы. Акрамя вышыўкі абутак упрыгожвалі цісненнем, нашыўкамі, спражкамі, бразготкамі, спіральнымі пранізкамі і г. д.[20]

Абутак жыхароў Гародні, у параўнанні з абуткам насельніцтва Полацка, Мінска і Бярэсця, вельмі просты і амаль не мае аздаблення[21].

Боты — від абутку з халявамі. Лічыцца, што боты прыйшлі з Візантыі ў X ст. і спачатку складалі абутак толькі князёў і старэйшын. Вядома, што кіеўскі князь Уладзімір, які княжыў з 980 па 1015 г., насіў лёгкія казловыя боты[22]. На адной з мініяцюр «Кодэксу Гертруды» (XI ст.) князь Яраполк паказаны абутым у чырвоныя саф'янавыя боты з вышытымі халявамі[23], на другой — у чорныя[24].

Боты гарадскіхжыхароўXII—XIII стст. з'ўляліся мяккім абуткам без абцасаў. Выраблялія яны мясцовымі рамеснікамі вываратным спосабам і

былі двух тыпаў: выцяжныя без передоў і з прышыўнымі перадамі. У першым выпадку боты сшывалі з дзвюх загатовак, адна з якіх у пад'ёме нагі плаўна пераходзіла ў галоўку бота, складаючы з ёю адзінае цэлае. Другі тып складалі боты з прышыўнымі перадамі. Да халяў у такіх ботах прышывалі перады і трапецападобныя заднікі. Падэшвы былі, як правіла, сіметрычныя, часта амаль авальныя. Яны прымацоўваліся да верху абутку вываратным швом[25]. Толькі ў рэдкіх выпадках падэшва злучалася з загатоўкай «потайным швом с прнпуском на строчку», характэрным для наўгародскіх рамеснікаў[26]. У такіх ботах пасля выварочвання атрымоўваўся па перыметру падэшвы бардзюр накшталт ранта, які засцерагаў верх абутку ад сутыкнення з глебай[27]. Абцасаў у ботах не было, яны ўвайшлі ва ўжытак гараджан толькі з XIV ст.

У XV ст. у Рускай дзяржаве пачалася дыферэнцыяцыя і спецыялізацыя гарадскіх рамёстваў, і менавіта да гэтага часу адносіцца вылучэнне шавецкай справы ў самастойнае рамяство[28].

На тэрыторыі Беларусі ў канцы XV ст. шавецкае рамяство таксама выдзелілася ў самастойную спецыяльнасць. Сярод гарбароў з'явіліся новыя спецыяльнасці: кажамякі, сырамятнікі, замшанікі і дубільшчыкі, якія апрацоўвалі скуру буйной рагатай жывёлы, каня і свінні. Большасць рамеснікаў-гарбароў выраблялі юхт — добра прадубленую ялавічную скуру. На патрэбы магнатаў і багатай шляхты з барановай і казінай скуры выраблялі саф'ян, які фарбавалі ў чырвоны, жоўты, зялёны колеры[2'].

У XVIII ст. назіраецца ўжо поўны падзел шавецкага і кравецкага рамёстваў, пра што сведчаць упамінанні ў пісьмовых крыніцах прафесій аўчыннікаў і кажамяк, ніяк не звязаных з шавецкім рамяством. Археалагічныяраскопкітаксамапаказваюць, што ў месцах збору адходаў шавецкага рамяства не выяўлены вапна і воўна, як у старажытны перыяд[30].

У эпоху развітога і позняга феадалізму (як паказаў аналіз абутку жыхароў Віцебска XIV—XVIII стст., праведзены В. М. Ляўко)[31] поршні амаль поўнасцю зніклі з ужытку гараджан. Самым распаўсюджаным відам абутку сталі боты чатырох тыпаў.

Першы тып — падобны на старажытнарускую форму. Перад у іх без язычка, верхні край пярэдняй халявы зрэзаны крыху назад пад вуглом. Халявы сточваліся бакавымі швамі, што характэрна для ботаў XIII—XVII стст. Трохвугольны цвёрды заднік рабілі зберасцянай пракладкай. Падэшва мела крыху завужаны насок і пашырэнне ў пучковай частцы. Калі на боты ішлі апойка і юхт, то на падэшвы бралі больш цвёрдую скуру («паўвол»).

Для другога тыпу характэрны кароткія, шырокія з круглявым наском прышвы з П-падобным верхнім краем. Пры такім кроі пярэдняя частка ха-




**Скураны абутак XI—XIII стст. з Гродна:**
а) дзіцячы скураны абутак XI—XIII стст.;
б) скураны абутак XI—XIII стст. Малюнкі С. Гунько

**Скураны абутак дарослых XI—XIII** стст **з Гродна.**



Малюнак С. Гунько



**Драўляныя калодкі-правілы.** XII—XIII стст. Мінск



**Дэіцячы скураны бот.** XII—XIII стст. Полацк

лявы ўнізе павінна быць дастаткова шырокай. Падэшвы гэтага тыпу ботаў мелі круглявую форму, абцасы падбівалі падкоўкамі з шыпамі. Былі яны пашыраны ў XVI—XVIII стст.

Трэці тып ботаў, па меркаванню В. М. Ляўко, быў распаўсюджаны ў XVII—XVIII стст. Яны мелі тупы насок з неглыбокім разрэзам зверху. Відаць, пярэдняя частка халявы ў такіх ботах мела невялікі язычок, які ўкліньваўся ў разрэз прышваў. Заднік бота даўжэйшы, чым у папярэдняга тыпу, таму што верхні край прышваў усечаны.

Боты чацвёртага тыпу бытавалі ў XVIII ст. Прышвы ў іх завужаныя і моцна выцягнутыя з крыху ўсечаным наском. Верхні край прышваў авальнай формы. Пакарочаны заднік з берасцяной пракладкай ледзь даходзіў да шчыкалаткі[32].

Рэчавы матэрыял з археалагічных раскопак сярэдневяковага Віцебска паказаў, што боты XIV—XVIII стст. маюць абцас, хаця ў Заходняй Еўропе ён з'явіўся толькі ў XVI—XVII стст.[33]



**Рэканструкцыя В. Ляўко бота і туфля.** XIV—XV стст.

**Тыпы падэшваў.**
XIV—XVIII стст.



Абцасы XIV—XV стст. былі нізкія, займалі толькі 1/3 пяты і звычайна рабіліся наборнымі, з некалькіх слаёў скуры, да падэшвы мацаваліся металічнымі падкоўкамі, у якіх былі шыпы і адтуліны для цвікоў. На працягу XVI—XVII стст. абцасы паступова сталі больш шырокімі, ахопліваючы спачатку палавіну, а потым усю пяту. У XVIII ст. яны набылі завужаную да нізу форму. Звычайным стаў і драўляны, абцягнуты скурай і завужаны ўніз абцас вышынёй да 5 см. Да такіх абцасаў цвікамі прыбіваліся плоскія дугападобныя падкоўкі[34].

На працягу XIV—XVIII стст. значную эвалюцыю прайшлі і туфлі. У XIV—XV стст. яны часцей за ўсё нагадвалі мяккія сучасныя тапкі з суцэльнакроеным верхам, упрыгожаным вышыўкай і цісненнем і адным швом ззаду. У гістарычных дакументах XV—XVI стст. для азначэння высокіх туфляў-чаравікаў з'яўляецца назва «бачмагь», «бачмакгь» ад турэцкага «Ьазтак»[35]. Для XVII—XVIII стст. характэрны цвёрдыя туфлі, у якіх з'яўляюцца новыя канструктыўныя асаблівасці і дэталі (цвёрды заднік, абцас, вусцілка, шнуроўка і г. д.), што сведчыць аб ускладненні тэхналогіі шавецкай вытворчасці. Дэталі абутку змацоўвалі вонкавымі, вываратнымі, патайнымі швамі, якія выкарыстоўваліся і ў XIX ст.[36]

Як ва ўсіх прадметах адзення, у абутку эпохі феадалізму яскрава адлюстроўвалася сацыяльная дыферэнцыяцыя. Звычайны абутак гарадскога насельніцтва для мужчын складалі ялавічыя, юхтавыя боты, а ў паноў і гарадской вярхушкі — саф'янавыя. Для трываласці абцасы ботаў падбіваліся падкоўкамі: «межн лопатькамн кованымі дей ботьмн збпль н здопьталь, нжь на немь тело снпее» (1582 г.)[37].

У беларускіх актавых матэрыялах XVI— XVIII стст. ёсць дадзеныя аб абутку самых розных колераў і якасці: «боты черныя, у которыхь ходшга, а чырвоные новые двон, купленые по семн грошей», «боты чырвоные, золотыхь чотыры» і г. д.[38] Згодна з дакументамі, асаблівай папулярнасцю карысталіся боты і чаравікі жоўтага колеру: «сторговаль ботовь парь 2 турецкнхь, а пару желтыхь»[39], «боты сафьяновые желтые новые двон»[40], «бачмагн сафьяновые, жолтые, новые коштоваля полкопы грошей лнтовскмхь»[41].

У другой палавіне XVI — першай палавіне XVII ст. сярод магнатэрыі, багатай шляхты і верхушкі гараджан становіцца папулярным яшчэ адзін



**Тыпы падковак**
да абцасаў ботаў.
XIV—XVIII стст.



**Рэканструкцыя В. Ляўко туфля XVIII ст.** з Віцебска

від скуранога абутку — паўботкі. Шылі іх найчасцей з саф'яну жоўтага колеру з вылажэннем зверху на халяўцы: «палботкн сафіану жолтого» (1593 г.)[42], «полбочкн сь капьтямн сафьяновые, купленные за полкопы фошей» (1589 г.)[43].

У вопісу маёмасці зямяніна Багдана Чэшэйковіча (1557 г.) разам з рознымі прадметамі адзення называюцца «боты сафьяновые жолтые, полуботкн сафьяну черленого»[44].



**Боты магната ВКЛ.** 1-ая палавіна XVI ст. Фрагмент партрэта Крыштафа Весялоўскага. Невядомы мастак. 1636 г.

Акрамя ботаў і паўботак шаўцы ў беларускіх гарадах выраблялі яшчэ шмат відаў мужчынскага скуранога абутку. Матэрыялы XVI—XVIII стст. сярод мяшчанскага абутку называюць «бачкуркп» (чаравікі), «тревнкн» (туфлі), «каптн» (мяккія туфлі), «чнжмы» (паўботы), «папутн» (тапкі). Рабаўнікі, якія напалі ноччу 1602 г. на хаты віленскіх рамеснікаў, забралі ў іх «речей не мало... а меновнте обувю, што нашлн на продажь зробленого, то есть ботовьтрц пары, бачкурокьдве пары»[45], атаксама «тревнкн новые кордбановые (пашытыя з казінай скуры. — *Аўт.),* за грошей двадцать купленые»[46].

Найбольш часта сярод абутку без халяў у помніках называюцца мяккія скураныя туфлі («каптн», «капцн») рознай якасці: «кабтн чорные козловые» (1593 г.)[47]. У магілёўскага купца ў 1578 г. зяго каморы на рынку ўкралі: «напервей ботов жоноцкнхь



**Боты магната ВКЛ.** Фрагмент партрэта Уладзіслава Дамініка Астрожскага. Невядомы мастак. 1635 г.

цнмьцу чнрвоного семь парь, козацькп одны боты, жонскне боты чорные одны, черевнков две пары, капцп двон софняномь (саф'янавыя. — *Аўт.* )[48]».

Часта капці ў помніках XVI ст. упамінаюцца ў камплекце з іншага тыпу саф'янавым абуткам. Гэта дае падставу меркаваць, што капці выкарыстоўваліся яшчэ ў якасці скураных галош для засцярогі далікатнага і каштоўнага саф'янавага абутку ў дрэннае надвор'е: «бачьмакгн с каптямн сафьяновымн, за которые мь даль полькопы грошей, черевнков пардве... каптей две паре...» (1582 г.)[49]; «полботкн сь капьтямн сафьяновые, купленные за полкопы грошей» (1589 г.)[50]. У 1579 г. мяшчане збілі шляхціца, які прыехаў у Магілёў, і знялі з яго шапку, армяк, жупан, кафтанік і «боты сафяновые н капьцн»[51].

«Чнжмы» («тнжмы», «цнзмы») — паўботы, якія шнураваліся зунутранагабокухалявы[52], «папута» — мяккі абутак накшталт тапак. У 1616 г. мяшчане





**Боты магната ВКЛ.** Фрагмент партрэта Альбрэхта Радзівіла. Невядомы мастак. 1640-ыя гг.

**Боты магната ВКЛ.** Фрагмент партрэта Міхала Казіміра Агінскага. Невядомы мастак. Пасля 1754 г.

г. Глуска напалі на абоз ротмістра Яраша Сянкевіча, якіішоўда Масквы, ісяродіншыхрэчаўзахапілі «ботовь сафьяновыхь парь трн зь острогамн (шпорамі. — *Аўт.),* тнжмы, бачмакгп, папуте»[53].

Розныя віды скуранога абутку беларускія купцы вывозілі за межы Беларусі. Так, мешчанін г. Брэста Эска Стаціўка ў 1583 г. вёз з Брэста ў Люблін «ременье роботы шовецкое, боты, черевнкн, чнжмы н капцн»[54].

Буйная шляхта і гарадскія вярхі насілі саф'янавыя боты самых розных колераў, падбіраючы іх да колеру сваіх жупаноў і кунтушоў, шаравар. Ян Дуклан Ахоцкі, сын мазырскага чэсніка, на балі ў мінскага падкаморыя быў надзеты ў «шаравары чырвоныя атласныя, такога ж колеру боты з сярэбранымі падкоўкамі»[55].

Асноўная маса шляхты, перш чым надзець боты, ногі абгортвала анучамі — кускамі палатна або сукна памерам прыблізна 60 см х 1 м. Унутры боты зімой часам высцілалі для цяпла саломай або пянькой («вехцем»). Толькі ў XVIII ст. паны замянілі анучы на шкарпэткі... а вехці на лямцовыя вусцілкі[56].

Аднак, яксведчацьпісьмовыя крыніцы, удругой палавіне XVI — першай палавіне XVII ст., у гарадах на тэрыторыі Беларусі купцы ўжо шырока гандлявалі панчохамі і шкарпэткамі. Так, Павел Рыгоравіч Случанін«мельзьЛюблмнатоварьсвой: ...панчохь, ножовь всякнхь разныхь» (1583 г.)[57]; другі купец «... быль взяль... товару, то ест пар двадцат шкорпеток Московскнх» (1579 г.)[58]. Панчохі куплялі гарадскія магістраты для сваіх служачых: «пончохь кгадскнхьлузскнхьпарыдве»(1625 г.)[59], панчохі чырвонага сукна ў 1580 г. былі ў гардэробе гарадской служанкі[60]. Ды і ў шляхты ў другой палавіне XVI ст. шкарпэткі былі ўжо звыклай звычайнай рэччу. Так, у вопісу маёмасці шляхціца Андрэя Баброўніцкага ў 1582 г. упісаны «шкарпэткі трое бараннія...»[61].

Прадстаўнікі беларускай магнатэрыі, якія прытрымліваліся ў XVII ст. парыжскай палацавай моды, разам з французскім прыдворным касцюмам насілі мяккія ўкарочаныя боты на высокіх абцасах з усечаным наском і моцна расшыранымі ўверсе галянішчамі, якія адгіналі на сярэдзіне галёнкі, утвараючы шырокія раструбы (сапох сіе Ьоіiез). У боты надзявалі каляровыя шаўковыя панчохі, а зверху іх нацягвалі яшчэ спецыяльныя белыя палатняныя панчохі для ботаў (Ьак сіе Ьопез), з прышытым увер-



**Боты караля Рэчы Паспалітай.** Фрагмент партрэта Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Мастак Ю.К. Гескі. 1783 г.

се мноствам карункаў, якія запаўнялі раструбы ботаў. На працягу ўсяго XVII ст. боты абавязкова насілі з вялікімі шпорамі, якія мацаваліся пры дапамозе раменьчыка, прадзетага ў адтуліны фігурнай скуранай пласцінкі (зоцiеіiе) на пад'ёме нагі. Боты такога тыпу прыдавалі мужчыне мужны і адначасова экстравагантны выгляд.




**Мужчынскія туфлі да еўрапейскага палацавага касцюма** сярэдзіны XVII ст.
а) са стужкамі і залатымі карункамі. 1666 г.;
б) трэвік мужчынскі, аздоблены залатой вышыўкай па срэбнатканай тканіне, абцас цёмна-чырвоны;
в) мужчынскі абутак другой палавіны XVII ст., на пад'ёме зашпілены на спражку. Абцас завышаны

У 1660-ыя гг. у Францыі ўваходзіць у моду новы тып прыдворнага касцюма з жустакорам, у якім боты саступаюць месца туфлям на высокім абцасе з усечаным наском і засцежкай на пад'ёме нагі ў выглядзе вострага банта або вялікай сярэбранай ці залатой спражкі, нярэдка з каштоўнымі камянямі. Башмакі і туфлі панавалі ў касцюме сацыяльнай вярхушкі беларускага грамадства да канца XVIII ст.

На рубяжы XVIII і XIX стст., відаць, пад уплывам напалеонаўскіх заваёў, боты зноў уваходзяць у касцюм знаці і прывілеяванага саслоўя Беларусі. Заканадаўцамі моды на ваенныя боты ў гэты час былі Сувораў, Напалеон і Велінгтон.



**Туфлі магната ВКЛ.** Фрагмент партрэта Аляксандра Астрожскага. Невядомы мастак. 1660—1670 гг.

Поршні і боты насіла і частка беларускага сялянства, хаця пануючым відам штодзённага абутку заставаліся плеценыя злыкалапці. Іх звычайна плялі са свежых, а зімой з размочаных у гарачай вадзе лыкаў — пасак кары ліпы, лазы, вяза, пяньковых вяровак. Натэрыторыі былой Віцебскай губерні сустракаліся лапці з бяросты. Наразалі («дралі») лыкі з тонкіх маладых парасткаў ліпы 1,5—2 м вышынёй. Зрэзаныя маладыя ліпкі («луццё») разразалі нажом уздоўж і здымалі кару. Знятую кару зараз жа скручвалі ў круглыя матушкі і накшталт абаранкаў нанізвалі на повязь. У такім выглядзе лыкі вешалі для прасушкі ў клеці ці на гарышчы хаты. Спрадвеку кожная сялянская сям'я мела даволі значны запас лыкаў або гатовых да ўжытку лапцей[62].

Шматлікія падарожнікі, якія ў розныя часы праязджалі праз тэрыторыю Беларусі, у сваіх дарожных запісах і мемуарах упамінаюць лапці як адзіны абутак беларусаў. Так, напрыклад, Башняк, які наведаў Беларусь у пачатку XIX ст., пісаў, што беларускія сяляне «ходзяць у белых сярмяжнага сукна жупанах, у палатняных або суконных штанах, у лямцавых каўпаках і ў лапцях»[63].

Некалькі дзесяцігоддзяў раней за Башняка адзенне Крычаўшчыны апісаў Андрэй Меер, дзе звярнуў увагу на абутак мясцовых сялян, занатаваўшы, што «на пераплеценых аборамі, як у латышоў, нагах носяць яны сплеценыя з аднаго толькі лыка плоскія, з петлямі кавярзні або з пяці лык пяцернікі»[64].

Па тэхніцы вырабу лапці прынята падзяляць на два асноўныя тыпы: прамога і касога пляцення[65]. Розныя тыпы лапцей прамога пляцення бытавалі на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Лапці касога пляцення, як зазначалі многія даследчыкі, былі запазычаны ў рускіх і былі распаўсюджаны на беларуска-рускім сумежжы і месцах рассялення рускіх старабрадцаў[66].

Этнаграфічнае абследаванне тэрыторыі Беларусі, якое праводзілася на працягу пяці (1967— 1971) гадоў пры падрыхтоўцы гісторыка-этнаграфічнага атласу Украіны, Беларусі і Малдавіі, дало магчымасць выявіць і картаграфаваць раёны распаўсюджання розных відаў і тыпаў традыцыйнага сялянскага абутку. Па гэтых дадзеных, арэал бытавання лапцей касога пляцення ахопліваў усходнія паветы былой Віцебскай (Віцебскі, Суражскі, Полацкі) і Аршанскі, Горацкі, Мсціслаўскі, Клімавіцкі, Чэрыкаўскі, Быхаўскі, Магілёўскі паветы Магілёўскай губерняў[67], а таксама поўнач Гродзенскай губерні і захад Міншчыны, дзе жылі нашчадкі рускіх старавераў, якія перасяліліся сюды ў XVII—XVIII стст.[68]

Тым не менш уздоўж паштова-гандлёвых шляхоў, якія праходзілі праз Беларусь і дзе насельніцтва было больш-менш уцягнута ў грашова-таварныя адносіны, лапці пачалі знікаць з ужытку ўжо ў па-



**Пляценне лапцей.** вёска Мерачоўшчына Касаўскага павета. Брэстчына. Фота Ю. Шыманчыка. 1937 г.

чатку XIX ст. У гэтых месцах яны засталіся ў асноўным рабочым абуткам, у якім было спадручна касіць, араць, нарыхтоўваць сена на балотах. Так, В. Севяргін праехаў усю Гродзеншчыну і заходнюю Міншчыну і толькі каля Барысаваўпершыню прыкмеціў сялян у лапцях[69].

Як асноўны від абутку плеценыя лапці выйшлі з ужытку ў канцы XIX ст. і ў тых месцах Гродзенскай і Віленскай губерняў, дзе прайшлі масавыя вырубкі лясоў, якія знішчылі сыравінную базу для іх вырабу. '

Лапці, як і іншыя кампаненты адзення, бывалі ў розных рэгіёнах пад самымі рознымі назвамі. Калі тэрмін «лапаць» («лапці») быў вядомы на ўсёй тэрыторыі Беларусі і абазначаў лапці любога пляцення і віду (у тым ліку і скураныя), то «пасталы», «пахлапні», «кавярзні» — на значнай яе частцы, а некаторыя мелі вузкалакальнае распаўсюджанне («куратнікі», «крыставікі», «бяспятнікі», «ракі»). Нярэдка назва лапцей была абумоўлена матэрыя-



**«Глухія» лапці прамога пляцення з ліпавых лыкаў,** вёска Замошша Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці. 1-ая палавіна XX ст.

лам («лыкі», «лычакі», «лазовікі», «вязнікі»), спосабам вырабу («крыставікі»), знешняй формай («бяспятнікі»), колькасцю пасак лык («пяцерыкі», «сямерыкі») і г. д.

Часам адным тэрмінам у розных месцах называлі розныя віды лапцей. Так, напрыклад, «кавярзнямі» на Крычаўшчыне называлі лапці «сплеценыя з аднаго толькі лыка, плоскія, з петлямі»[70], а ў іншых паветах Віцебскай і Магілёўскай губерняў гэты тэрмін азначаў «глухія» лапці з пярэдняй стракой для абор. У многіх выпадках розныя назвы азначалі адзін і той жа тып лапцей (напрыклад, «шчарбачні», «бяспятнікі», «кавярзні»).

У паўночнай і цэнтральнай Беларусі найбольшае пашырэнне мелі лапці з пярэдняй стракой для прадзявання абор — «глухія» лапці, «слепакі», «ка-



«Зрачыя» лапці («пасталы», «відукі», лапці «з вокам»).
Пачатак 1950-ых гг.

вярзні», «куратнікі», «пяцерыкі». На поўдні мяжа распаўсюджвання такіх лапцей даходзіла да Слуцка.

На Палессі і ў прылягаючых да гэтага рэгіёна паветах Гродзенскай і Мінскай губерняў бытавалі ліпавыя аболазовыя «зрачыя» лапці. Адметнай асаблівасцю «зрачых» лапцей быў кароткі, з адкрытым верхам насок, у якім адсутнічала цэнтральная, вялікая страка для прадзявання абор, што і стварала «вока» лапця. «Зрачыя» лапці звычайна бытавалі пад назвай «пасталы»[71].

Прасцейшыя лапці прамога пляцення — «шчарбакі» («шчарбачні», «кавярзні», «бяспятнікі»). Гэта неглыбокія, лёгкія (амаль адна падэшва) лапці без галовак і запятак. Замест «вушак» у іх спераду рабілі дзве лыкавыя пятлі, а па баках, для прымацавання абор — сплеценыя касіцай з танюсенькіх палосак лыка «заборнікі». Яны лічыліся летнімі і прызначаліся для палявых работ і нашэння ў хаце і на агародзе. Разам з «глухімі» лапцямі шчарбакі бытавалі на тэрыторыі Віцебскай губерні і ў Сенненскім і Горацкім паветах Магілёўскай губерні. У адрозненне ад усіх іншых відаў лапцей прамога пляцення шчарбакі пачыналі плесці з пяты.



Лапці-«кавярэні» («шчарбакі»)
Віцебшчына. 1-ая палавіна XX ст.

Сходнымі па прызначэнню са шчарбакамі былі лазовыя лапці («лазовікі»). З-за іх недаўгавечнасці лазовыя лапці стараліся не надзяваць у дарогу, а выкарыстоўвалі на хатніх работах, пасьбе жывёлы, апрацоўцы нівы, на сенажаці і г. д.

Акрамя шчарбакоў лапці прамога пляцення ўсіх відаў плялі з наска, накідваючы бакавыя «вушкі» лапця — «курцы», «куракі» — на дзве завостраныя з аднаго канца палачкі — «сугакі». Выраб лапцей быў пераважна мужчынскім заняткам. Кожны селянін, пачынаючы з падростка, мог іх сплесці. Іх плялі ў вольны ад работы час, зімовымі вечарамі, пасучы жывёлу. Звычайна на гэту работу ішло 2—3 гадзіны. Для моцнасці падэшва лапцей амаль заўсёды падпляталася пры дапамозе плоскага з закругленым краем жалезнага або касцянога кручка-спіцы («спічака», «спіцы», «качадыка», «падплеткі»). Матэрыялам для падплятання служылі лазовая кара, лыкі, вітушкі пянькі або вітыя вяроўкі. Зрэдку ніз лапцей падшывалі сырамятнай скурай.

Якая дзначаласявышэй, пакольк асціпалослыка,
якія ішлі на пляценне лапцей, іх называлі пяцерыкамі, шасцерыкамі, сямерыкамі. Лепшымі лічыліся сямерыкі, бо іх плялі з больш вузкіх палосак лыка і яны мелі больш акуратны выгляд.

Лапці касога пляцення — «пахлапні» («пахрасні») плялі з глыбокімі круглымі насамі, высокімі запяткамі і бакамі. На іх выраб ішлі вузкія (не шырэй 1 см) паскі лыка, з якога папярэдне знялі кару. Пры пляценні пахлапняў паскі лыкаў шчыльна пад-

ганяліся адна да другой, таму на пахлапні патрабавалася амаль у тры разы больш лыкаў, чым на звычайныя лапці прамога пляцення. Плялі іх на драўлянай калодцы, зробленай па памеру нагі. Той жа спіцай, што выкарыстоўвалася пры падплятанні лапцей прамога пляцення, падэшву пахлапняў падплятаЛІ вітушкамі пянькі ці тонкімі вяровачкамі.



**Лаэовыя лапці з «петлямі» для прадзявання абор** 1-ая палавіна XX ст. Віцебшчына



**«Пахлапні»** — лапці касога пляцення з ачышчаных ад кары ліпавых лыкаў. Клімавіцкі пэвет Магілёўскай губерні. 1-ая палавіна XX ст.

Паколькі выраб пахлапняў патрабаваўспецыяльных ведаў і навыкаў, іх выраблялі звычайна сялянерамеснікі і збывалі на кірмашах. Каштавалі яны ў 5—10 разоў даражэй за звычайныя лапці", таму іх набывалі сяляне толькі для святаў і ўрачыстых выпадкаў (хрысціны, наведванне царквы, госці, выезд на кірмаш і г. д.) і часта насілі па некалькі гадоў[73]:

Дзед купіў пахлапні,
Баба — пахлапенькі.
Дзед насіў тры гады,
Баба — тры нядзелькі[74].

Лапці надзявалі на анучы. Летам на анучы («парцянкі») звычайна выкарыстоўвалася старое белае палатно. На зімовыя анучы («суконкі») ішлі часцей за ўсё кавалкі са старога андарака. Часта паверх суконак абгортвалі ногі белымі палатнянымі анучамі. У вялікія маразы закручаную суконкай ступню нагі яшчэ абкладвалі сенам або мяккай саломай, а затым зверху абгортвалі палатнянай анучай.

Да нагі лапці мацавалі пры дапамозе пяньковых, лыкавых або раменных абор («аборак», «валок»), якія працягвалі («заворсывалі», «забарсывалі») праз усе «вушкі» («курцы») лапця. Затым іх перакрыжоўвалі на пяце і працягвалі праз сярэднія «вушкі» з бакоў лапця, што ўтварала па абодвух баках пяты петлі. Абкручаную анучай ступню нагі зацягвалі гэтымі петлямі накрыж у пад'ёме. Пасля гэтага голень нагі спіральна абгортвалася анучай і замацоўвалася пяньковымі, лыкавымі, шарсцянымі або раменнымі аборамі («аборкамі», «валокамі»). Ва ўсходняй Беларусі мужчыны і жанчыны завівалі аборы накрыж да калена. На Палессі і на захадзе Беларусі мужчыны закручвалі аборы зусім нізка, каля самай ступні, а жанчыны — да кален. «Гэткае абуццё, — пісаў у 1910 г. А. І. Сербаў, — вельмі практычнае: яно таннае, лёгкае і зручнае ва ўсіх адносінах. Магчыма, па гэтай прычыне яно і захавала сваю першабытную форму... пастол застаецца і на наш час такім, якім быў ён у даўно мінулыя часы»[75].

На Гомельшчыне мужчыны часта насілі поруч з раменнымі (скуранымі) аборамі шарсцяныя, тканыя на ніту і дошчачках (вёскі Баянічы, Ляскавічы, Валасовічы) і толькі на дошчачках (Даманавічы). Аборы на ніту і дошчачках ткалі тым жа спосабам, што і паясы[76].



Спосаб мацавання лапцей да ног.
Малюнак С. Гунько

Вяровачныя аборы палешукі часта фарбавалі ў чорны колер, каб яны кантрастна выдзяляліся на белых анучах. У некаторых вёсках на Тураўшчыне жанчыны так шчыльна закручвалі іх віткамі вакол нагі да калена, што не было відаць ануч[77].

Засцянковая і ваколічная шляхта замест ануч часам карысталася самаробнымі вязанымі з авечай воўны панчохамі да кален, зверху якіх завівалі аборы[78]. Аднак шляхта з апошніх сіл старалася набыць боты, каб адрознівацца ад сялян.

Пяньковыя вяровачныя лапці — чуні — плялі так жа, як і ліпавыя або лазовыя, але толькі на калодцы («капыле»), зробленай з бярозы або альхі з набітымі ў яе невялікімі цвікамі і больш шчыльна[79].

Плеценыя лапці былі танным і практычным абуткам пераважнай большасці вясковага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі цэлае тысячагоддзе (з X па XX ст.). Яны былі лёгкімі для хадзьбы па лесе і незаменнымі пры касьбе і іншых работах на балоце, улетку не парылі і не пяклі ног, а зімою добра засцерагалі ад марозу. Лапці насілі штодня і ў святы, у іх вянчаліся і ў іх жа хаванілі нябожчыкаў. Менавіта прыстасаванасць да мясцовых кліматычных і бытавых умоў і забяспечыла гэтаму віду абутку такое доўгае і шырокае існаванне ў сваёй першабытнай форме.

Скураны абутак беларускага селяніна падзяляецца на дзве асноўныя групы: боты і лапці. Самы старажытны від абутку — скураныя лапці — не атрымалі на Беларусі шырокага распаўсюджання. Яны з'яўляліся асноўным відам сялянскага абутку ў XIX — пачатку XX ст. толькі ў Гродзенскай і Віленскай губернях, дзе было мала лясоў або рэдка сустракалася ліпа, лыкі з якой з'яўляліся матэрыялам для вырабу плеценых лапцей. Звычайна сырамятную скуру сяляне лічылі больш мэтазгодным выкарыстоўваць на конскую збрую і іншыя гаспадарчыя патрэбы. Хаця поруч з плеценымі скураныя лапці ў той ці іншай ступені бытавалі амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Адначасова з агульнапашыранай назвай «лапці» скураныя лапці ў Віцебскай губерні называліся «паршні» («баршні»), «пасталы»; у Віленскай і Гродзенскай — «пасталы», «хадакі»; у Магілёўскай — «пасталы», «маршчакі»; у Мінскай — «пасталы», «хадакі», «маршчакі».

На скураныя лапці часцей за ўсё ішла сырамятная скура ялаўкі або цяляці. Скуру спачатку мачылі ў рацэ, драўлянай бочцы, чанах, потым апрацоўвалі водным растворам попелу і вапны. На Палессі замест залення практыкавалі паценне, закапваючы



Скураны лапаць. Вёска Міёры Дзісненскага павета Віленскай губерні. 1-ая палавіна XX ст.

скуруўгной. Пасля звычайнай касой, нажамі, скобляй ачышчалі шэрсць і мяздру. Затым абяззольвалі («квасілі») у водным растворы мукі і солі, каб скура не была цвёрдай і ломкай. Часта квашанне адсутнічала. Пасля ачысткі скуры ад шэрсці яе разразалі на паскі, якія замацоўвалі на слупах, змазвалі дзёгцем і доўгі час выкручвалі пры дапамозе кола. Пасля гэтага скуру скручвалі ў рулон, клалі на калоду і білі па ёй драўляным молатам («чапухай»)[80]. Часам сырую скуру толькі крыху змякчалі, намазваючы кіслым цестам з соллю, пасля чаго адціралі рукамі. У такіх выпадках лапці шылі шэрсцю ўсярэдзіну да нагі.

Напрыканцы XVIII ст. сялянства Беларусі было даведзена прыгонам да крайняй галечы. Яго становішча не палепшылася і ў складзе Расійскай імперыі. А. Башняк у пачатку 20-ых гг. XIX ст. пісаў, што «сяляне складаюць самы бедны ў Беларусі клас людзей. Жабрацтва, да якога яны даведзены, перавышае ўсялякае апісанне. Мала таго, што жывуць

яны ў бедных хацінах, пакрытых саломай, без падлогі і комінаў, мала таго, што ледзь маюць рыззё для прыкрыцця голага цела, але часта пакутаюць ад голаду, не маючы хлеба!»[81].

З-за цяжкага матэрыяльнага стану другі від скуранога абутку — боты — былі недаступны асноўнай масе вясковага насельніцтва Беларусі аж да канца XIX ст. У гэты час яшчэ звычайным было становішча, калі на ўсю вёску было некалькі пар ботаў, якія насілі толькі па святах. На вяселле, хрэсьбіны або ў іншых асабліва ўрачыстых выпадках боты пазычалі ў суседзяў.

Аднак пасля адмены прыгону ўзрос попыт на боты і ў сялянскім асяроддзі. Так, адзін з карэспандэнтаў Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пісаў, што ў Дрыбінскай воласці Чавускага павета Магілёўскай губерні звычайны сялянскі абутак складаюць лапці, а святочны — боты[82]. Другі карэспандэнт гэтага ж таварыства пісаў, што ў в. Студзянец Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні скуру для ботаў вырабляюць мясцовыя гарбары". Паступова шавецтва атрымала пашырэнне і ў вёсцы. У сярэдзіне XIX ст. мужчынскія боты нярэдка былі яшчэ вываратныя, і шылі іх на прамую калодку, г.зн. без адрознення на якую —



Боты заможных сялян «з казырком» на каленях.
Стаўбцоўскі павет Мінскай губерні.
Пачатак XX ст.



Мужчынскі бот («з гармонікай»),
Вёска Аздамічы
Столінскага раёна
Брэсцкай вобласці
1930-ыя гг.

правую або левую нагу[84]. Зімой у такія боты ногі абгортвалі суконнымі анучамі, на падэшву ўнутр насцілалі салому.

Традыцыйнымі цэнтрамі шавецкага рамяства сталі многія гарады і мястэчкі Беларусі. Сваёй дыхтоўнасцю і адметнай аздобай сталі вылучацца боты шаўцоў Петрыкава, наваколляў Турава і Давыд-Гарадка. Іх шылі выцяжнымі. Высокія халявы ў месцы пераходудаступні прыгожаперахопліваліся гафрыраваным накшталт гармоніка паскам, часам верх халяў упрыгожваўся дэкаратыўнымі адваротамі.

У канцы XIX — пачатку XX ст. боты на вёсцы значна распаўсюдзіліся. Яны звычайна былі чорнага або рыжага колеру, пераважна з рантам і шырокімі круглымі насамі. Насілі боты звычайна з асадкай халяў у зборкі, на абцасы набівалі металічныя

падкоўкі. Паводле тэхнікі вырабу яны падзяляліся на «прышвыя» і «выцяжныя». Выцяжныя боты («выцяжкі») атрымалі такую назву таму, што шыліся без перадоў («прышваў»). Халява ў выцяжках плаўна пераходзілаўперадісшываласяззаду. Шылівыцяжкі наступным чынам. Скураную загатоўку халявы мачылі, а затым нацягвалі і замацоўвалі на «правідле» — тоўстай дошцы, якая мела форму загнутага полаза. Калі загатоўка высыхала, яе здымалі, сшывалі халяву і прышывалі да яе заднік. Халяву з прышытым заднікам нацягвалі на калодку («капыл») і прышывалі дратвай вусцілку. На вусцілку накладвалі падэшву і абцас, прыбіваючы іх драўлянымі цвічкамі ў два рады. Такі фасон лічыўся ў сялян лепшым за прышыўныя, бо абутак менш прапускаў вільгаць. Боты з прышыўнымі перадамі былі падобныя да сучасных.

Звычайна боты куплялі ў лаўках бліжэйшага мястэчка або на кірмашах. Часта там набывалі толькі скураныя загатоўкі і заказвалі боты вясковым шаўцам. Селянін вельмі беражліва адносіўся да абутку, і часта боты служылі яму ўсё жыццё і яшчэ не зусім зношанымі пераходзілі яго нашчадкам[85].

Боты мелі некалькі назваў. Тэрмін «боты» быў найбольш распаўсюджаны ў паўночнай і цэнтральнай Беларусі, «чобаты» — на Магілёўшчыне, Гродзеншчыне і ў паўднёвых паветах Мінскай губерні. На беларуска-рускім сумежжы разам з тэрмінамі «боты» і «чобаты» суіснаваў тэрмін «сапагі».

Высокай якасці боты на Палессі павінны былі быць «з гармонікай» («з маршчынамі») — ад пяці да дзевяці маршчын унізе халявы, або тыпу батфортаў — з высокімі халявамі і «казырком», які закрываў калена, і з падкаленным выразам, сшытыя на «касой» калодцы, калі левы бот адрозніваўся ад правага. Боты звычайна падбівалі бярозавымі цвікамі ў два рады шахматападобным парадкам. Абцасы рабілі слоенымі з кавалкаў скуры, і на іх набівалі жалезныя падкоўкі.

Мужчынскае насельніцтва мястэчак у XIX—XX стст. насіла боты і туфлі. Жыхары м. Дрыбін Чавускага павета Магілёўскай губерні зімою насілі валёнкі хатняга вырабу[86].

На вёсцы валяны абутак з воўны чорнага, карычневага, шэрага і белага колераў у канцы XIX — пачатку XX ст. быў прыналежнасцю толькі заможных сялян і не меў значнага пашырэння. Гэта было звязана з тым, што для вырабу валёнак была патрэбна добрай якасці авечая воўна, з якой селянін звычайна вырабляў верхняе адзенне. Найбольшае пашырэнне валёнкі («валенцы») атрымалі ва ўсходняй Беларусі, дзе было пашырана адыходніцтва ў рускія губерні і Пецярбург. Па вёсках валёнкі «валілі» вандроўныя шапавалы, якія зімой хадзілі па




**Тыпы скуранога** і **драўлянага абутку** беларускіх сялян **1-ай** палавіны XX ст.:
а) скураныя лапці («хадакі»), вёска Турэц Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці;
б) скураныя лапці («хадакі»), вёска Турэц Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці;
в) скураныя лапці з сырамятнай скуры, вёска Цудзенішкі Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці;
г) скураныя лапці («бахілы»), вёска Кракотка Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці.



**Тыпы скуранога і драўлянага абутку** 1-ай палавіны XX ст.:
а) скураныя лапці, вёска Юндзілавічы Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці;
б) драўляны абутак («хадакі»), вёска Крэва Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці

вёсках і працавалі на даму ў заказчыкаў. «Збітыя» шапаваламі валёнкі абавязкова для моцнасці падшывалі яшчэ лямцам або скурай.

Драўляны абутак на Беларусі не меў шырокага распаўсюджання. Ён бытаваў толькі ў некаторых паўночна-заходніх паветах Гродзенскай і заходніх паветах Віцебскай губерні як сезонны абутак, пад назвамі «чуні», «клумпы», «кандалы», «дзеравянікі», «дзеравяшкі».

Дзеравянікі альбо поўнасцю выдзёўбвалі з аднаго куска дрэва альбо да драўлянай падэшвы прыбівалі цвікамі скураны верх. Такі абутак насілі толькі каля хаты вясной і восенню, калі на вуліцы была вялікая гразь.

Абутак прывілеяванага гарадскога насельніцтва выдзяляўся сваёй высокай якасцю і формай. У самым пачатку стагоддзя, калі насілі панталоны, запраўленыя ў боты, боты часта ўпрыгожвалі каляро-




**Тыпы скуранога і драўлянага абутку** беларускіх сялян 1-ай палавіны XX ст.:
д) скураныя лапці. Пачатак XX ст„ вёска Міёры Дзісненскага павета Віленскай губерні;
е) лапаць з аўтамабільнай шыны, вёска Кракотка Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці;
ж) саламяныя лапці («шаркуны»), вёска Турэц Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці;
з) драўляны абутак «дзеравянікі», вёска Шчорсы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці



ЧаравікІ. Гродна. 1920-ыя гг.

Табліца № 1

Колькасць розных катэгорый шаўцоў і башмачнікаў у некаторых гарадах Беларусі, 1896 г.[87]

| Горад | Шаўцы | | | Башмачнікі | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | май-стры | рабо-чыя | вуч-ні | май-стры | рабо-чыя | вуч-ні |
| Брэст | 79 | 7 | 14 | 52 | 9 | 24 |
| Кобрын | 30 | 25 | 24 | 15 | 14 | 10 |
| Пружаны | 37 | 30 | 8 | 5 | 5 | — |
| Слонім | 32 | 38 | 19 | 7 | 2 | 3 |
| Ваўкавыск | 30 | 15 | 7 | 1 | — | — |

вымі адваротамі альбо кутасікамі, накшталт гусарскіх. Калі ў 1820-ых гг. пашырылася мода насіць панталоны зверху ботаў, мода мяняла толькі фор-му наска ботаў: то вузкі, то ўсечана-прамавуголь-ны.

З канца 1850-ых гг. боты сталі выцясняцца чаравікамі, якія, як і боты, былі чорнага колеру. Насілі мужчыны і шчіблеты са скуры і з прунэлі — шчыльнай тканіны з шоўку, шэрсці і бавоўны саржавага перапляцення чорнага колеру, бо да канца XIX ст. мужчыны не насілі каляровага абутку.

Галошы (ад франц. §а1оспе) — абутак, які надзявалі зверху ботаў, чаравікаў, валёнак для засцярогі ад гразі і вільгаці. Да сярэдзіны XIX ст. іх рабілі са скуры, а ў 1850-ых гг. з'явіліся гумавыя галёшы, якія атрымалі хуткае распаўсюджванне сярод гараджан, а ў пачатку XX ст. пачалі выкарыстоўвацца і вяско-вым насельніцтвам.

У гарадах Беларусі з другой палавіны XIX ст. існавалі майстэрні ў якіх абутак для гараджан і сялян навакольных вёсак шылі рамеснікі-шаўцы і башмачнікі, колькасцьякіхпрадстаўленаўтабліцы№ 1.

З ростам прамысловасці павялічваўся асарты-мент абутку і матэрыялаў для яго вырабу. У гарадах у пачатку XX ст. атрымаў пашырэнне абутак са ску-ры, тэкстыльных, гумавых і камбінаваных матэры-ялаў. Значная колькасць гарадскіх жыхароў карыс-талася парыжскімі часопісамі мод, кожны выпуск якіх утрымліваў манахромныя і каляровыя ма-люнкі, фатаграфіі мадэляў і асобных дэталяў мод-ных касцюмаў. Абутак, галаўныя ўборы, пальчаткі, парасоны вялікімі серыямі выраблялiся заходнееўрапейскімі фірмамі і фабрыкамі. Частка гэтай прадукцыі прывозілася на Беларусь і рэалізавалася ў гарадскіх магазінах і крамах.

Як паказваюць дакументальныя матэрыялы, у пачатку XX ст. у беларускіх гарадах былі папуляр-нымі чорныя чаравікі з вузкім носам і верхам з сук-на, якія цесна аблягалі нагу. Аднак ужо перад пер-шай сусветнай вайной змяненне крою мужчынска-га касцюма адпаведна змяніла і форму абутку. У моду ўвайшлі чаравікі і туфлі з тупым круглым «курносым» носам, які атрымаў бытавую назву «бульдог».

У час вайны ў гарадскім асяроддзі распаўсюдзіў-ся своеасаблівы паўваенны касцюм, які складаўся з фрэнча, штаноў-галіфэ, фуражкі ваеннага ўзору і высокіх хромавых ботаў. Дзякуючы практычнасці і прыстасаванасці да тагачасных умоў жыцця гэты касцюм шырока бытаваў на Беларусі да канца 1930-ыхгг.

Вячэрні гарадскі касцюм у перыяд першай сусветнай вайны заставаўся нязменным. Ва ўрачыстых выпадках гарадская вярхушка і інтэлігенцыя па-ранейшаму апранала фрак або смокінг з белай кашу-ляй і вузкім гальштукам (або гальштукам-матыль-ком), вузкія штаны з шаўковымі лампасамі і чаравікі

або туфлі на тонкай скураной падэшве з вузкім носам.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адносіны да моднага еўрапейскага адзення і абутку, якія свед-чылі аб прыналежнасці іх уладальніка да матэры-яльна забяспечанага кола гараджан, рэзка змяні-ліся. Каб пазбегнуць рэпрэсій «былыя» стараліся не выдзяляцца вопраткай і абуткам у вакзальным ці базарным натоўпе, чэргах за хлебам і іншых мнага-людных месцах.

Рэзкае збядненне асноўнай масы гарадскіх жыхароў у перыяд грамадзянскай вайны негатыўна адбівалася на іх абутку і адзенні. Многія даношвалі боты і туфлі даваенных гадоў або салдацкія бацінкі з абмоткамі (доўгімі палосамі тканіны, якімі аб-мотвалі галёнку нагі ад бацінка да калена), шмат хто майстраваў самаробны абутак з падручных матэрыялаў.

Толькі пасля ліквідацыі эканамічнай разрухі і ўвядзеннем нэпа частка гараджан стала насіцьдвухколерныя і замшавыя бацінкі, туфлі з завужаным носам і шнуроўкай сперадзі, якія былі моднымі ў гэты час у Заходняй Еўропе.

У 1925—1930-ых гг. у гарадах Беларусі, як і ў цэлым у СССР, фарміраваўся новы эстэтычны ідэал касцюма, які не адпавядаў ні шматвяковай народ-най традыцыі, ні тагачаснай еўрапейскай модзе. Гараджане, якія служылі ў дзяржаўных сілавых структурах, апраналіся ў скураныя курткі, штаны-галіфэ і высокія хромавыя боты. Служачыя савецкіх уста-ноў насілі летам лёгкія парусінавыя туфлі на гума-вай падэшве, скураныя сандалі. Вясной і восенню



**Боты гарадскога жыхара.** Мазыр. 1930-ыя гг.



**Продаж ботаў на кірмашы ў Пінску.** 1934 г.





**Самаробныя буркі э сукна з ватнай пракладкай.**
Вёска Цімашэвічы Парыцкага раёна Гомельскай вобпасці. 1961 г.
Малюнак С. Гунько

**Рабочыя чаравікі.** Вёска Плёсы Бабруйскага раёна
Магілёўскай вобласці. 1962 г. Малюнак С. Гунько

абувалі боты або чаравікі, зверху якіх у гразь надзявалі галёшы. Зімовым абуткам служылі валёнкі з галёшамі, часам самаробныя буркі, пашытыя з праштабнаванага сукна з ватнай пракладкай. Іх насілі з галёшамі або самаробнымі бахіламі з аўтамабільных камер.

На вёсцы да канца 30-ых гг. вялікім попытам карысталіся вырабы мясцовых шаўцоў, якія не заставаліся ў баку ад павеваў гарадской моды. Так, на Міншчынеўканцы 1920 —пачатку 1930-ыхгг. значнай папулярнасцю ў моладзі карысталіся боты-«факстроты» з высокай халявай і вузкім усечаным наском. У гэтыя гады ў беларускай вёсцы, як і ў горадзе, сталі насіцьсамаробныя гумавыя бахілы, якія надзявалі на самаробныя буркі.

Пасля другой сусветнай вайны ў вясковага насельніцтва выйшлі з ужытку лапці, скураныя пасталы і іншыя віды самаробнага абутку. Знікла розніца ў святочным абутку гарадскіх і вясковых жыхароў. Патрэбы насельніцтва пачала задавальняць абутковая прамысловасць.

Жыхары беларускіх гарадоў пасля вайны насілі скураныя і парусінавыя туфлі, чаравікі са шнуроўкай спераду на скураной і гумавай падэшве з шы-



**Святочны абутак сялян.**
Вёска Варанілавічы Пружанскага
раёна Брэсцкай вобласці.
Пачатак 1950-ых гг.

рокім носам, сандалі, тапкі. Зімовым абуткам служылі белыя фетравыя буркі, камбінаваныя з карычневай скурай, валёнкі, саморобныя буркі з галёшамі, скураныя і керзавыя боты.

Распаўсюджаныя ў заходнееўрапейскіх краінах туфлі з шырокім круглым носам на тоўстай гумавай падэшве ў сярэдзіне 1950— 1960-ых гг. складалі дэталь касцюма «стыляг» — маладых людзей, пераймаўшых крыклівую маладзёжную культуру гарадоў Заходняй Еўропы. Такія туфлі стылягі насілі ў камплекце з доўгім аднабортным пінжаком з шырокімі плячамі, штанамі-дудачкамі і гальштукам-шнурком.

У 1960— 1970-ых гг. усталявалася мода на касцюм са штанамі з расклёшанымі штанінамі, і згодна з ёй змяніўся фасон абутку. Туфлі сталі рабіць на высокіх абцасах з амаль квадратным тупым носам. 3 сярэдзіны 1960-ых гг. сяродчасткі гарадской моладзі пашырыліся вастраносыя чаравікі «бітл» на высокіх абцасах. Адначасоваатрымаліпапулярнасцьуякасці штодзённага абутку ва ўсіх узроставых трупах гараджан туфлі тыпу макасінаў і туфлі на высокай рабрыстай «трактарнай» падэшве з шырокім носам.

Пачынаючы з 1980-ых гг. сярод гарадской і вясковай моладзі ў свабодным паўсядзённым касцюме са світарамі, пуловерамі і штанамі-джынсамі сталі насіць спартыўныя туфлі («красоўкі»). Дзякуючы практычнасці і зручнасці яны з кожным годам атрымоўвалі ўсё больш шырокае распаўсюджванне і ў сталых узроставых трупах насельніцтва. Хутка красоўкі сталі рабіць двухколернымі з розным аздабленнем і рознай вышыні, выкарыстоўваючы на іх выраб натуральную скуру і штучныя матэрыялы.

Дапасаваннем да вячэрняга касцюма ў гарадах і сельскай мясцовасці Беларусі ў цяперашні час служаць класічныя чорныя скураныя туфлі імпартнага або мясцовага вырабу на тонкай падэшве са шнуроўкай з падоўжаным завужаным носам. Элегантна выглядаюць святочныя туфлі такога ж тыпу з некалькі ўсечаным завужаным носам.

Для паўсядзённай носкі ў цяперашні час выкарыстоўваюцца туфлі са шнуроўкай, на пражцы, або без шнуроўкі з больш шырокім носам на больш тоўстай падэшве з поліўрэтану, гумы абоскуры, краевую. У якасці сезоннага абутку носяць туфлі на платформе або высокай рабрыстай падэшве з круглым або квадратным носам. Зімою абуваюць пераважна чаравікі і боты з халявамі рознай вышыні на падкладцы з натуральнага або штучнага футра. Летнім абуткам служаць разнастайныя сандалеты і басаножкі.

[1] ПСРЛ. Т. 1-2. М., 1962. С. 106.
[2] Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов. Мн., 1968. С. 176.
[3] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. (паводле археалагічных звестак). Мн., 1995. С. 25; Маслова Г. С. Народная одежда в восточнославянских традиционных обычаях и обрядах XIX — начала XX в. М., 1984. С. 85-101.
[4] АІМЭФ НАН Беларусі, ф. 6, воп. 13, адз. зах. 115, л. 24. Запісана ў 1996 г. ад Рагойшы Станіславы Станіславаўны 1920 г. нараджэння.
[5] Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею для разбора древних актов (далей АВАК). Т. XXXIX. С. 540.
"Тамжа. Т. XVIII. С. 211. [7] Там жа. С. 221.
* Штыхов Г. В. Древний Полоцк. IX—XIII вв. Мн., 1975. С. 72—80; Загорульский Э. М. Возникновение Минска. Мн., 1982. С. 142—151; Лысенко П. Ф. Берестье. Мн., 1985. С. 287-300; Марзалюк І. А. Магілёў у XII — XVIII стст. Людзі і рэчы. Мн., 1998. С. 139-141; Воронин Н. Н. Древнее Гродно // Материалы и исследования по археологии СССР. М., 1954. № 41. С. 62-68; Ляўко В. М. Абутак з культурнага слоя Віцебска // Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыяадкрыцці. Мн., 1984. С. 168-174 і інш.
' Срезневский И. И. Материалы для словаря древнерусского языка по письменным источникам. Т. III. СПб., 1912. С. 1268.
[1] Штыхов Г. В. Древний Полоцк. С. 74, 75. [1]' Штыхаў Г. В. Гарбарнае рамяство старажытнага Полац-ка // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. 1961. № 3. С. 63-73.
[12] Рыбаков Б. А. Ремесло Древней Руси. М.-Л., 1948. С. 400. " Вахрос И. С. Наименование обуви в русском языке. Хельсинки, 1959. С. 34.
[14] Вейс Г. Внешний быт народов с древнейших до наших времен. М., 1876. Т. 2. С. 8.
[15] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в Центральном Витебском архиве (далей ИЮМ). Вып. 32. С. 252.
[16] Такі абутак археолагі называюць «мяккімі туфлямі».
[17] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. С. 26.
'* Тарасов С. В. Технология и инструментарий сапожного ремесла Полоцка и Минска (XI—XVIII вв.) // Памятники науки и техники. 1987—1988. С. 164—175; Штыхаў Г. В. Шавецкае рамяство старажытнага Полацка // Весці АН БССР. Серыя грам. навук. 1962. № 3. С. 81-90.
[19] Лысенко П. Ф. Берестье. С. 287—300.
[20] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. С. 27.
[21] Воронин Н. Н. Древнее Гродно// Материалы и исследования по археологии СССР. М., 1954. С. 62—63.
[22] Руднев В. А. Слово о князе Владимире. М., 1989. С. 208.
[23] Барвенава Г. Княскія строі Кунэгунды і Яраполка па водле мініяцюраў «Кодэксу Гертруды» // Спадчына. 1998. № 6. С. 64.
[24] Там жа. С. 65.
" Штыхов Г. В. Древний Полоцк. С. 79—80. [26] Изюмова С. А. К истории кожевенного и сапожного ремесла Новгорода Великого // Материалы и исследования по археологии СССР. 1959. № 65. С. 199-200; Шты-

хаў Г. В. Шавецкае рамяство старажытнага Полацка // Becці АН БССР. Серыя грам. навук. 1962. № 3. С. 81—90.
[27] Штыхов Г. В. Древний Полоцк. С. 80.
[28] Рыбаков Б. А. Ремесло Древней Руси. С. 562.
[29] Трусаў А. Матэрыяльная культура беларускага горада ў часы Вялікага княства Літоўскага // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 3. С. 58.
[30] Ляўко В. М. Абутак з культурнага слоя Віцебска XIV—XVIII стст. // Помнікі старажытнабеларускай культуры. Мн., 1984. С 174.
[31] Там жа. С. 169-171.
[32] Там жа С. 169-171.
[33] Вахрос И. С. Наименование обуви в русском языке. С. 46, 47.
[34] Ляўко В. М. Абутак з культурнага слоя Віцебска XIV—XVIII стст. С. 171-173.
[35] Молчанова Л. А. Очерки материальной культуры бело русов XVI—XVIII вв. Мн., 1981. С. 107.
[36] Ляўко В. М. Абутак з культурнага слоя Віцебска XIV—XVIII стст. С. 173.
[37] АВАК. Т. XVIII. С. 53.
[38] Историко-юридические материалы. Вып. 7. С. 59, 76, 89, 290, 338.
[39] Там жа. С. 209.
[4,1] АВАК. Т. XXXVI. С. 42, 388. [41]
Там жа. С. 152, 369, 388. [42]Тамжа.
Т. VIII. С. 465. [43] Там жа. Т. XVIII.
С. 69. "Тамжа. Т. XVII. С. 415.
[45] Там жа. Т. XX. С. 190.
[46] Тамжа. С. 189.
[47] Тамжа. Т. XVIII. С. 119.
[48] Тамжа. Т. XXXIX. С. 150.
[49] Там жа. Т. XXXVI. С. 152.
[50] Там жа. Т. XVIII. С. 69.
[51] Тамжа. Т. XXXIX. С. 61.
[52] Там жа. Т. XIX. С. 246.
[53] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа, (далей АСД). Т. 1. С. 251.
[54] АСД. Т. 3. С. 292.
[55] Охотский Ян. Рассказы о польской старине. Записки XVIII века Яна Дуклана Охотского. Т. I. СПб., 1874. С. 173.
[56] Gloger Z. Encyklopedia staropolska. Т. 1. С. 218—219; Мальдзіс А. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі. Мн., 2001. С. 330.
[57] АСД. Т . С. 306.
[58] АВАК. Т. XXXIX. С. 236.
[59] ИЮМ. Вып. 21. С. 423.
[60] АВАК. Т. XIX. С. 246.
[61] Там жа. Т. XIV. С. 261.
[62] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии. Витебск, 1895. С. 122.
[63] Башняк А. Дневные записки путешествия в разные об ласти Западной и Полуденной России. Ч. 1—2. М., 1820—1821. С. 74.
[64] Мейер. А. Описание Кричевского графства или бывше го староства 1786 г. Цыт па кн.: Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. Мн., 1980. С. 165.
[65] Зеленин Д. К. Перспективный план по изучению гене тики культуры // Краеведение. 1928. № 5. С. 262—263.
[66] Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8. Вильно, 1912. С. 25; Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. Могилев, 1884. С. 374 і інш.
[67] Беларускае народнае адзенне. Мн., 1975. С. 69—70.
[68] МолчановаЛ. А. Материальная культура белорусов. Мн., 1968. С. 177.
[69] Севергин В. М. Записки путешествия по западным про винциям Российского государства. СПб., 1803. С. 131.
[7(] Мейер. А. Описание Кричевского графства или бывше го староства 1786 г. Цыт па кн.: Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. С. 165.
[71] Сербаў І. А. Вічынскія паляне. Менск, 1928. С. 29—30.
[72] Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской гу бернии... Кн. 2. С. 374.
[73] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 123.
[74] А. А. Запісана ў 1967 г. у в. Брацькавічы Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобласці ад Барысавай Еўфрасінні Осіпаўны 1878 г. н.
[75] Сербаў І. А. Вічынскія паляне. С. 30.
[76] Лебедева Н. И. Материальная культура Белорусской ССР в 1930 году (Туровский и Лельчицкий районы Мозырского округа по правому берегу р. Припяти и ее при токам) // Государственный литературный музей (г. Мос ква). Инв. № 21. С. 214.
[77] Молчанова Л. А. Материальная культура белорусов. С. 178.
[78] Там жа. С. 179.
[79] Лебедева Н. И. Материальная культура Белорусской ССР. С. 216.
[80] Грынблат М. Я. Сялянскія промыслы і рамёствы ў XIX—XX стст. // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1957. № 2. С. 57.
[81] Башняк А. Дневные записки путешествия в разные об ласти Западной и Полуденной России. С. 21.
[82] Научный архив Института этнологии им. Н. Н. Мик лухо-Маклая РАН. Фонд Общества любителей естество знания, антропологии и этнографии (далей ОЛЕАЭ), ед. хр. 43, л. 5 об.
[83] Там жа, ед. хр. 43, л. 1.
[84] Маслова Г. С. Народная одежда русских, украинцев и белорусов в XIX — начале XX в. // Восточнославянский этнографический сборник. М., 1956. С. 722.
[85] Никифоровский Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья... С. 126.
[86] Научный архив Института этнологии РАН. Фонд ОЛЕАЭ, ед. хр. 43, л. 6.
[87] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. Ф. 14, воп. 3, спр. 58, л. 124.

# Глава 7 Аксесуары



Аксесуары — дапаўненні і ўпрыгажэнні касцюма (пальчаткі, сумкі, фурнітура, паясы, ювелірныя вырабы), якія ствараюць з галаўнымі яго элементамі адзіны стылёвы комплекс.

На працягу стагоддзяў аксесуары выступалі сімвалам матэрыяльнага стану і саслоўнай прыналежнасці чалавека, паглыблялі характарыстыку яго касцюма ў адпаведнасці з эстэтычным і маральным ідэалам пэўнай эпохі.

З глыбокай старажытнасці мужчыны, як і жанчыны стараліся аздобіць свой касцюм пры дапамозе розных дапасаванняў. Важным дэкаратыўным элементам мужчынскага касцюма з найдаўнейшых часоў быў пояс. У славянскіх помніках VI—IX стст. неаднаразова сустракаюцца металічныя паясныя спражкі і разнастайнай формы бляшкі ад паясных набораў: круглыя, праразныя, упрыгожаныя арнаментам і г. д.[1]

Курганныя раскопкі на тэрыторыі Беларусі паказваюць, што ў кожным мужчынскім пахаванні знаходзяцца астанкі паясоў. Так, напрыклад, у пахаванні № 7 Вышадкоўскага пахавальнага комплексу ў Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці (XI—XII стст.) былі знойдзены рэшткі пояса ў выглядзе жгута з ніцяў. Пахаваны там чалавек быў чатыры разы абмотаны ім па таліі паверх каптана. Даўжынёй 6—7 м і шырынёй каля 4 см, гэты пояс быў завязаны злева на жываце вузлом, з якога разыходзіліся сплеценыя з яго ніцяў 6 касічак, з вузельчыкамі на канцах[2].



У курганных мужчынскіх пахаваннях X—XIII стст. захаваліся астанкі скураных паясоў з масіўнымі літымі бронзавымі спражкамі. Такія паясы часам упрыгожвалі наборамі металічных пласцінак, бляшкамі. Да паясоўжыхары старажытнай Беларусі прывешвалі нажы ў скураных футаралах, скураныя сумачкі-каліты[3], падвескі-амулеты[4].

Археолагамі знойдзена вялікая колькасць спражак і астанкаў паясоў з розных матэрыялаў: скураных, скураных з металічнымі накладкамі разнастайнай формы, састаўленых цалкам з металічных звенняў, з каштоўных імпартных тканін, тканых, вязаных і плеценых з шарсцяных нітак.

Для сашчэплівання дэталяў верхняга і хатняга адзення жыхары Беларусі ў раннім сярэднявеччы карысталіся фібуламі, булаўкамі, спражкамі. Фібулы — асобага роду булаўкі, па меркаванню даследчыкаў, мелі балцкае паходжанне. Іх выраблялі з бронзы, білону, серабра, зрэдку жалеза[5]. На тэрыторыі Беларусі былі пашыраны фібулы са спіральна закручанымі канцамі, падковападобныя, падковападобныя з зааморфнымі канцамі, кольцападобныя, круглыя з выпукла-ўвагнутым сячэннем і інш. У Бярэсці археолагамі знойдзена фібула з двух бронзавыхдыскаўдыяметрам64мм, злучаныхскураным раменьчыкам даўжынёй 12 см. Дыскі такіх фібул

прадзяваліся ў прорэзі або петлі верхняга плечавога адзення[6].

Для замацавання дэталяў адзення і прымацаван-ня да яго розных прадметаў служылі булаўкі-стрыжні з кольцападобнымі рухомымі галоўкамі. Такія булаўкі былі знойдзены ў раскопках многіх гарадоў. Адна з выявай птушынай галоўкі і рухомым кальцом — каля в. Навінкі Талачынскага р-на Віцеб-скай вобл.[7]

Мужчыны насілі кольцы і пярсцёнкі з медзі, бронзы, серабра, волава, золата. Рабілі іх пераваж-на з круглага дроту, часам у два ці тры абароты ва-кол пальца. Даволі часта сустракаліся пласцінча-тыя кольцы з ціснёным арнаментам і шырока-ся-рэдзінныя[8]. Для ўпрыгожвання касцюма выкарыс-тоўвалі ў XI—XII стст. таксама ланцужкі, плеценыя з тонкага бронзавага дроту або тонкіх вузкіх палос[9].

Уякасці ювелірныхупрыгажэнняўзXII ст. сталі шырока выкарыстоўвацца гузікі. Сярод іх звычайна вылучаюць тры тыпы: кастыльковыя, пляската-вы-пуклыя і шарападобныя. Рабілі іх з самых разнас-тайных матэрыялаў: дрэва, косці, плялі з нітак, аб-цягвалі каштоўнымі тканінамі, адлівалі ці штампа-валі з розных металаў і металічных сплаваў. Брон-завы гузік быў знойдзены археолагамі ў пахаванні XII—XIVстст. у г. Мсціславе Магілёўскай вобласці[10].

Знойдзеныя археолагамі ў гарадах ліцейныя фор-мачкі сведчаць аб тым, што асноўная маса ўпрыга-жэнняў выраблялася мясцовымі рамеснікамі. Юве-лірныя майстэрні існавалі ў Полацку, Навагрудку, Мінску і іншых беларускіх гарадах".

Развіццё на тэрыторыі Беларусі таварна-грашо-вых адносін, узнікненне і шпаркі рост гарадоў, ума-цаванне гандлёвых і культурных зносін з Візантыяй і Усходам садзейнічалі пераймання княжацкай элі-тай візантыйскіх парадных комплексаў адзення і пашырэнню ювелірных вырабаў для іх аздаблення. Разам з каштоўнымі візантыйскімі і ўсходнімі тка-нінамі, візантыйскага тыпу галаўнымі ўборамі ся-род знаці былі распаўсюджаны запазычаныя з візан-тыйскага касцюма накладныя каўняры (ажарэлкі), расшытыя перлінамі і каштоўнымі камянямі[12].

Пасля заключэння Крэўскай уніі (1385 г.) павя-лічыўся прыток у гарады Беларусі заходнееўра-пейскіх сукнаў, шаўковых матэрый, галандскага і нямецкага палатна, галантарэі, ювелірных вырабаў. 3 пачатку XVI ст. у часы праўлення Жыгімонта I Старога ў Вялікім княстве Літоўскім пачынаецца шырокае распаўсюджванне сярод магнатаў, багатай шляхты і вярхушкі гараджан розных формаў заход-нееўрапейскага касцюма. Касцюм дапаўняўся шматлікімі ўпрыгажэннямі: залатымі ланцугамі, пярсцёнкамі, залатымі і сярэбранымі паясамі, каш-тоўнымі засцежкамі, сярэбранымі, залатымі, паза-лочанымі гузікамі з устаўкамі каштоўных камянёў.



**Партрэт Януша Радзівіла,** гетмана ВКЛ, ваяводы віленскага. Невядомы мастак. Каля 1654 г.



**Фібулы** (засцежкі). XII ст.

**Бронзавыя булаўкі.** XII—XIII стст.

**Спражкі.** XII—XIII стст.

**Залаты плецены пярсцёнак.**
Пачатак XIV ст.

Магнаты і шляхта стараліся надаць як мага багаейшы выгляд свайму касцюму, каб прадэманстраваць сваю мои і багаице. Таму ўсе элементы адзення ўпрыгожвалі самымі разнастайнымі спосабамі. Кашулі па каўняру, манішцы, манжэтах вышывалі гладдзю (гафтавалі) залатымі і сярэбранымі ніткамі, аздаблялі каштоўнымі камянямі. У вопісе маёмасці Васіля і Яраша Хадкевічаў у 1569 г. адзначаецца «кошулька золотая съ перлы и зъ шлягомъ; колнеръ перловый съ передниками (манішкамі. — *Аўт.)* старосветскими»[13], «шата талету бурнатного съ перлами, рукава тоежъ шаты съ перлы и заложка съ перлы»[14], кашулька дзіцячая «зъ золотомъ»[15].

У сярэднія вякі не было вызначанага падзелу на хатняе і вулічнае адзенне. У шубах, пакрытых каштоўнымі ўсходнімі тканінамі, феразях, газуках прымалі гаспей і ездзілі ў госці, таму і верхняе адзенне багата аздаблялі гузамі і гузікамі з золата і срэбра з устаўкамі каштоўных камянёў, масіўнымі залатымі ланцугамі, галсбантамі (ювелірнымі нагруднымі ўпрыгажэннямі з залатых ажурных звенняў, злучаных у форме ланцуга, часам з устаўкамі каштоўных камянёў). «Газука оксамиту чорного рытого, перлы сажона около рукава...» (1569)[16], «ланцугъ перловый на едвабю зъ кнафликами золотыми и зъ шмальцомъ чорнымъ; камень модрый съ перлою; альзбанъ злотый зъ рознымъ шмалыхомъ, а въ немъ шаферовъ великихъ есть 6, перелъ 14, штук 7. Альзбанъ злотый зъ разнымъ шмальцомъ, а в немъ есть штукъ (звенняў. — *Аўт.)* 4 зъ дыяменты, а зъ рубинами 4, а осьмъ штукъ съ перлы, у тыхъ штукахъ осьми перелъ 16» (1569 г.)[17].

Абавязковым упрыгажэннем адзення магнатаў, шляхты і багатых гараджан заставаліся залатыя і сярэбраныя, ювелірнай работы гузы і гузікі. Яны былі вельмі разнастайнымі па форме, памеру, тэхніцы вырабу, упрыгожванню. Сярод іх ёсць яйкападобныя, фушападобныя, у форме шара, сасновай або яловай шышкі, гранёныя, упрыгожаныя разьбой, эмаллю, каштоўнымі камянямі, жэмчугам і г. д., а памер вагаецца ад гарошыны да курынага яйка. У помніках XVI ст. гузік звычайна называецца «кнафель» («книфель»): «кнафелевъ кришталовыхъ десеть зо серебромъ» (1565 г.)[18], «далъ до схованья жупицу... с кнаплями цыновыми» (1579 г.)[19], «сукня порпьянская съ кнафлями, то сыну моему Федосью» (1556 г.)[20], «сукни две влоскихъ... с кнафлями серебреными» (1565—1566 гг.)[21]. Значнарадзейсустракаецца тэрмін «пуговица» («пугавица»): «пуговицъ серебреных дватцат чотыры... у тогож ермака» (1579 г.)[22].

Аднак у канцы другой палавіны XVI ст. тэрміны «кнафель» і «пуговица» паступова замяніліся паланізмам «кгузикъ», «гузикъ»: «чуга... зъ кгузиками сребъръными одливаными позлотистыми» (1589 г.)[23], «жупан... з кгузиками едвабу зеленого»



**Гузік.**
Серабро, эмаль,
2-ая палавіна XVII ст.



**Гуз ікі XVII—XVIII стст.** Серабро, серабрэнне, залачэнне, выкалатка, высечка, гравіроўка

**ГузікІ XVII—XVIII стст.** Серабро, серабрэнне, залачэнне, ліццё, выкалатка. высечка, гравіроўка





**ГузікІ XVII—XVIII стст.** Серабро, серабрэнне, запачэнне, ліццё, выкалатка, высечка, гравіроўка



**Гуэ.** Серабро. XVII ст.

(1582 г.)[24], «гузнчкн зь вензлямн до кунтуша» (1695 г.)[25]. Вялікага памеру гузікі называліся «гузамі» («кгузамн»): «жупаннкн... зь кгузамн тогожь сукна» (1602 г.)[26], «две фаразын... с чатырма кгузамн серебранымн позлотнстымн» (1611 г.)[27], «делія шкарлатная зь кузамн золотымн» (1616 г.)[28].

Прадаўгаватыя гузікі-кляпікі ў помніках XVI ст. называюцца «кнеблнкамн»: «жупанг с кнеблнкамн позлотнстымн» (1579 г.)[29], «кгеблнков золотых дванадцать»(1582г.)[30].

Ёсць дакументальныя сведчанні, што пэўнага памеру і формы гузікі былі ў рускіх звязаны з тым ці іншым відам адзення, так як сустракаюцца выразы «пуговнцы кафтанные», «однорядочные», «опашневые»[11].

Цяга да раскошы ў шляхты асабліва ўзрасла пасля знаёмства яе з культурай Усхода, калі ў сутычках з татарамі і туркамі ў якасці ваенных трафеяў яна здабывала ўсходняе багатае адзенне, зброю, ювелірныя вырабы.

Французскі падарожнік дэ Лабурэр, апісваючы выезд каралевы Рэчы Паспалітай Марыі-Людвікі ў 1646 г. у Гданьск, адзначаў, што ў кожнага шляхціца, што суправаджалі каралеву, кіты (плюмажы) па галаўных уборах былі ўпрыгожаны аграфамі з брыльянтамі. Ва ўсіх былі залатыя гузікі ювелірнай работы, усаджаныя каштоўнымі камянямі[32].

У еўрапейскай знаці ў XVI—XVII стст. панавала захапленне ўпрыгожваць свой касцюм каўнярамі, манжэтамі, карункамі, пазументам і шаўковымі стужкамі. З 1570-ых гг. у моду ўвайшоў іспанскі каўнер-фрэза, які складаў самастойны прадмет адзення. Каўнер-фрэза атрымаў у Еўропе надзвычайную папулярнасць. Яго насілі ўсе станы грамадства, пачынаючы ад каралёў і заканчваючы іспанскімі сялянамі. На тэрыторыі Рэчы Паспалітай такі каўнер уваходзіў у гэты час у касцюм каралеўскага атачэння, магнатаў, багатай шляхты і вярхушкі гараджан, якія прытрымліваліся еўрапейскай моды. Фрэзу рабілі з моцна накрухмаленай паскі тонкага палатна, карункаў або батысту, якую ўкладвалі правільнымі трубчатымі складкамі і прымацоўвалі да невысокай лямкі-стойкі па памеру шыі. Дзякуючы гэтаму фрэзу можна было ўстаўляць унутр каўняра пурпуэна або кафтана. Каўнер шчыльна аблягаў шыю і завязваўся пры дапамозе тасёмак. У пачатку XVII ст. фрэза дасягнула вялікіх памераў, і для яе падтрымкі карысталіся спецыяльнай рамай з дроту. Часта фрэзу надзявалі зверху з'ёмнага палатнянага каўняра, аточанага па краю карункамі. Напрыканцы першай трэці XVII ст. фрэза выйшла з моды. Замест яе вялікую папулярнасць набылі карункавыя жабо да кашуль, карункавыя гальштукі-хусткі, карункавыя манжэты.

Багата і разнастайна шляхта ўпрыгожвала верхняе адзенне каштоўнымі гузікамі і кнеблікамі (гузі-



**Гузы да жупана.** Пазалочанае серабро з устаўкамі рубінаў і брыльянтаў. 3-яя чвэрць XVIII ст. (Польшча?



**Засцежка дэліі з гузамі.**
2-ая чвэрць XVII ст.
Фрагмент партрэта Яна Завішы

камі-палачкамі), шаўковымі (ядвабнымі) шнурамі, пятліцамі, пазументам (пасаманам), стракой (фігурнай строчкай), тасьмой, тасьмой чырвонага колеру (жычкай), сярэбранымі кольцамі і г. д. Сярод адзення, разграбленага ў 1593 г. у зямян Церлякоўскіх, былі: «жупанъшарый каразеи накрапяной... у того жупана кебликовъ серебраныхъ двадцать у рукавовъ, колецъ серебраныхъ осмьдесятъ; курта фалюндышу бурнатного... зъ кгузиками золотыми... ермякъ черный фалюндышовый зъ шнурами и зъ строкою едвабю чорного... жупанъ маковый каразыевый подшитый волками, у того жупана колецъ серебраныхъ семьдесятъ чотыри; дылея блекитна фалюндышовая съ петлицами шолковыми... дылея утерфину зеленого зъ петлицами шолку зеленого...» (1593 г.)[33].

Ва ўжытак вышэйшага саслоўя краін Заходняй Еўропы ў другой палавіне XVI ст. увайшоў гадзіннік, які лічыўся вельмі каштоўнай рэччу і элегантным аксесуарам палацавага касцюма. Насілі гадзіннікі і ў Вялікім княстве Літоўскім. Пад польскамоўнай назвай «зекгарыкь» ён упамінаецца ў 1598 г. у вопісе маёмасці забітага ў Віленскім павеце каралеўскага буфетчыка Паўла Ферары: «у третей скрини также с хустами белыми (бялллём. — *Аўт.)...* зекгарыкъ з вагами малый...» (1598 г.)[34].

Мужчыны ўсіх станаў грамадства, багатыя і бедныя, у XVI—XVII стст. звычайна прывешвалі да пояса кашэль (каліту), нож у футляры, часам іншыя дробныя рэчы (ключы і г. д.): «пасъ серебреный зъ ножомъ позолотистымъ... старосветское оправы» (1599 г.)[35].

Магнаты і багатая шляхта ў Вялікім княстве Літоўскім, як і прадстаўнікі вышэйшага саслоўя ўсіх краін Заходняй Еўропы таго часу, насілі пры сабе флаконы ювелірнай работы самых розных формаў з духамі або пахучымі зёлкамі, якія лічыліся аховай ад інфекцый, дрэннага паху і блох: «пушка серебрена, въ которой перфумы ховалъ, которую при собе завжды ношивалъ, в которой было серебра полъ гривны» (1599 г.)[36].

Цудоўны ўзор ювелірнага мастацтва ўяўлялі сабой дзяржанні мячоў, шабель і шпаг з устаўкамі каштоўных камянёў. З гэтымі відамі халоднай зброі шляхта амаль не разлучалася, і яны служылі дапасаваннем касцюма і прадметам гонару.

Адным са стражытных упрыгажэнняў, дапаўняўшых касцюм, але не звязаных задзеннем, былі кольцы і пярсцёнкі. У сярэдняя вякі іх надзявалі амаль на кожны палец.

Шляхта, маёмасныя слаі гараджан насілі рознага роду і кошту пярсцёнкі і «сыгнеты» (пярсцёнкі-пячаткі). Так, у гаспадарскага падданага Стася Янцэвіча ў 1541 г. Янка Станевіч «калиту урезалъ... съ полторы копы грошей и зъ секгнетомъ серебрянымъ»[37], у Мойшы Мархаевіча з Гродна ў каліце акрамя грошай было «чотыри перстени золотыхъ съ каменемъ»[38].

Пярсцёнкаў у шляхты, не гаворачы ўжо аб магнатах, было надзвычай многа, і былі яны з самымі




а) **Гадзіннік-падвеска.** Польшча (?). 3-яя чвэрць XVII ст.

б) **Гадзіннік Баутэ I Муанье.** Жэнева. 1820—1830 гг.

в) **Карманны гадзіннік Джон Бушман.** Лондан. XVII—XVIII стст.

г) **Гадзіннік-падвеска.** 1-ая чвэрць XVII ст.

living рознымі каштоунымі камянямі, далікатнан ювелірнай работы. Пры наездзе суседа на маёнтак шляхцянкі Апалоніі Копцевай у Берасцейскім павеце ў 1577 г. былізабраны: «персценьзолотый,деяментовый (брыльянтавы. — *Аўт.),* вь которомь дей было камней острыхь деяментовыхь дванадцать... перстень золотый, зь шаферомь (сапфірам. — *Аўт.)...* перстеньзолотый, зьбляшкоюдеяментовою... перстень золотый, вь которомь дей камней рубнновь было семь, а туркусовыхь (біруза. — *Аўт.)* камней шесть... перстень золотый, зь шмаракгомь... перстень золотый, зь туркусомь немалымь... два перстенькн золотыхь зь лосьнмь рогомь... перстёнокь золотый, обручнкь кренцоный (кручаны, віты. — *Аўт.)»*[39]...

Пярсцёнкі служылі не толькі ювелірным упрыгажэннем. Іх насілі і з цалкам утылітарнай мэтай, так як многія каштоўныя камяні лічыліся праціяддзем або сродкам ад тых ці іншых хвароб.

Магнатэрыя і шляхта Вялікага княства Літоўскага ў XVI—XVII стст. любілі ўпрыгожваць свой касцюм залатымі нагруднымі ланцугамі самага рознагапамеруіпляцення. Уактавыхдакументах, асабліва ў вопісах маёмасці шляхты, сустракаюцца самыя разнастайныя залатыя і «позлотнстые» ланцугі: «вьсвнрнескарбномь... взялнланцугьвелнкій, панцыроватый, золатый... ланцугь кольчатый, золотый... ланцугь золотый, пнлованый... золотый, зь шмальцомь (фініфцю) чорнымь... колчастый, зь розмантымь шмальцемь» (1577)[40]. Сапегі ў 1556 г. забралі ў шляхціца Мацея Быстрыцкага «ланцухь золотый»[41].

Важным дапасаваннем да мужчынскага касцюма вышэйшага саслоўя і гараджан з XVII ст. стаў гальштук. Лічыцца, што ўпершыню гальштук пачалі насіць у Францыі пры двары Л юдовіка XIV. Да канца 1860-ых гг. па свайму выгляду гальштукі былі бліжэй да шыйных хустак. Гэта быў разрэзаны па дыяганалі кавалак тканіны, які скручвалі, абгортваючы ім шыю, завязваючы спераду на вузел. Па свайму прызначэнню гальштукі падзяляліся на святочныя (парадныя), штодзённыя, дарожныя.

У зімовых умовах насілі рукавіцы, якія служылі для аховы рук ад холаду. Імі карысталіся магнаты, шляхта, усе слаі гараджан і вясковае насельніцтва. У старажытных славян яны былі вядомы пад назвамі «рукавкн», «шубннцы» «мохнаткн», «деленкн» і г. д. Рукавіцы былі двух відаў: простыя (з аддзеленым адным вялікім пальцам) і пальчаткі (з чэхлікамі для кожнага пальца рукі). На Беларусі акрамя ўласна тэрмінаў «рукавіцы», «пальчаткі» бытавалі назвы «вязёнкі», «сподкі», «ісподкі».

«Рукавіцамі», «сподкамі» , «ісподкамі» часцей за ўсё сяляне называлі рукавіцы, пашытыя з аўчыны або іншага футра ці сукна. Вязаныя рукавіцы называлі звычайна «вязёнкамі», вельмі рэдка — «скарпэткамі»[42]. У сярэдзіне XIX ст. у святочныя дні ў некаторых мясцовасцях Беларусі сяляне насілі рукавіцы з афарбаванай у чырвоны колер скуры ці шарсцяныя вязаныя пальчаткі з каляровым узорам,



Каралеўскі касцюм пачатку XVII ст. Партрэт Жыгімонта III Вазы. Мастак Ш.Багушэвіч. Каля 1611 г.

якія куплялі ўлатышоў ці палякаў[41]. Невялікага дастатку гараджане і жыхары мястэчак часцей за ўсё насілі вязаныя з шарсцяных нітак рукавіцы і пальчаткі.

Мужчыны вышэйшага саслоўя Вялікага княства Літоўскага ў XVI—XVII стст. насілі пальчаткі, багата ўпрыгожаныя вышыўкай залатымі, сярэбранымі або шаўковымі ніткамі з нашытымі каштоўнымі камянямі. Шляхта і маёмасныя гараджане насілі зімою рукавіцы з аддзелам аднаго пальца з аксаміту і іншых каштоўных тканін, якія падбіваліся і аздабляліся апухай з футра собаля, бабра і іншых звяроў, а восенню і вясной надзявалі рукавіцы і пальчаткі з аксаміту, атласу, сукна, вязаныя з шоўку, пашытыя з аленевай ці ласінай скуры. У актавых матэрыялах XVI—XVII стст. сустракаюцца «нсподкн соболн» (1578)[44], «рукавнцы вовчые» былі куплены ў 1695 г. магілёўскаму каменданту[45], «лосіе» рукавіцы «пахолков» (салдат) (1616)[46], рукавіцы «сукняные» (1667)[47]і г. д. Пальчаткі («руковнцы пальчатые») шляхта часта насіла па модзе таго часу засунутымі за пояс.

У сярэднія вякі ў Заходняй Еўропе пальчаткі набылі шырокую сацыяльную сімволіку. З пальчаткай сюзерэна рыцар атрымліваў павышэнне свайго сацыяльнага статуса і маёмасць; епіскап — сан; гараджанам зёюдаравалі прывілеі. Пальчатка з'яўлялася важнейшым элементам рыцарскага этыкету. Яе кідалі да ног як выклік на паядынак, білі крыўдзіцеля па твару, і такую абразу можна было змыць толькі крывёю на дуэлі[48].

Звычаі не дазвалялі быць у пальчатках у прысутнасці караля, у царкве, на пахаванні. Лічылася нявыхаванасцю пры прывітанні падаваць руку ў пальчатцы пры рукапацісканні, здымаць яе зубамі і г. д. З другой палавіны XVII ст. пальчаткі паступова выйшлі з мужчынскай моды.

Паясы, як неад'емнае дапаўненне касцюма, насілі ўсе прадстаўнікі феадальнага грамадства: сяляне, мяшчане, дробная шляхта, магнаты.

З часоў Старажытнарускай дзяржавы паясы служылі паказчыкам багацця, знатнасці. У князёў і княжацкай знаці былі яны шаўковымі, плеценымі з залатых і сярэбраных ніцяў, у выглядзе пазалочаных,



**Пояс магната.**
Фрагмент партрэта віцебскага ваяводы Яна Завішы. Невядомы мастак. 2-ая чвэрць XVII ст.

сярэбраных брошак тонкай далікатнай ювелірнай работы, злучаных між сабою. Аксамітныя і скураныя паясы аздаблялі золатам і серабром, унізвалі каштоўнымі камянямі.

Тыпова княжацкім упрыгажэннем служыў залаты пояс. Назва «поес» (звычайна з прыметнікам «злать») сустракаецца ў духоўных граматах і іншых помніках старажытнарускай пісьменнасці[49]. З-за надзвычай каштоўнага пояса суздальскага князя Дзмітрыя Канстанцінавіча ў 1443 г. у Маскоўскай дзяржаве пачалася міжусобная вайна паміж князямі[50].

У Вялікім княстве Літоўскім, згодна з актавым матэрыялам другой палавіны XVI ст., «срэбраназлацістымі» і «залатымі» называлі аксамітныя і скураныя паясы, аздобленыя сярэбранымі з пазалотай альбо залатымі накладкамі: «поесь серебряный, позлотнстый на оксамнте чорномь»[51].

Уражвае разнастайнасць выкарыстоўваемых на паясы матэрыялаў і ўпрыгажэнняў. У помніках XVI—XVII стст. сустракаюцца паясы шаўковыя: «пас едвабный за злотых петнадьцат» (1663 г.)[52], «поясь чннтакоровый» (з тоўстай шчыльнай шаўковай тканіны. — *Аўт.)* (1646 г.)[53], аксамітныя: «поесов оксамнтных, з занкгнлн серебреньмн» (1582 г.)[54], з вышэйшага сорту шэрсці: «купнлн поясь гарусовый» (1699 г.)[55]. Былі паясы з каштоўныхтканін з прымацаванымі з вонкавага боку сярэбранымі, залатымі або пазалочанымі накладкамі, з залатой ці сярэбранай вышыўкай. У такіх паясах канец, які зацягваўся ў спражку, часам рабілі з металу: «поесь на тафте зеленой золотомь шнть, наконче серебраное» (1539 г.)[56].

У скарзе шляхцянкі Берасцейскага староства Апалоніі Копцевай аб разрабаванні яе маёмасці, якую яна падала ў 1557 г. у Брэсцкі гродскі суд, пералічваліся наступныя паясы: «Поясь долгій, золотый, за который дей дано осьмьдесять пять чпрвоныхь золотыхь; другій поясь долгій везеный, серебраный... третій поясь-обручь серебраный, позлотнстый, зь шмальцомь... четвертый поясь — обручь серебраный, позлотнстый, безь шмальцу... пятый поясь серебраный, позлотнстый, на зеленомь оксамнне... шостый поясь венецкій, зь золота тягненого, зь закгелемь н зь пражкою серебраною, позлотнстою... семый пасекь (паясок. — *Аўт.)* тягненого серебра, сь пражкою і закгелемь серебранымь...»[57].

Сярод гарадскіх жыхароў таксама былі надзвычай папулярнымі сярэбраныя паясы. Насілі іх здаўна, так як у першай палавіне XVI ст. у адным з дакументаў такі пояс называецца старасвецкім: «Поесь серебраный позлотнстый старосвецкнй» (1540 г.)[58]. У судовых справах, тастаментах, вопісах маёмасці мяшчан сярэбраныя паясы ў XVI—XVII стст. суст-



**Мужчынская пальчатка** з грубай пасінай скуры XVII ст.

**Фрагменты металічных паясоў прывілеяванага** саслоўя. XVI—XVII стст.





**Фрагменты металічных паясоў.** Канец XVI — 1-ая палавіна XVII ст.

ракаюцца пастаянна: «поесь серебреный... пуколь (выпуклых накладных бляшак. — *Аўт.)* на немь петнадцать» (1583 г.)". У 1637 г. брэсцкая мяшчанка адпісала царкве Св. Сімяона «пас срэбны пазлацісты»[60] свайго мужа Багдана. «Пась срэбны» завяшчаў сваім дзецям у гэтым жа годзе мешчанін з Брэста Афанасій Васільевіч Кароўка[61].





**РыцарскI пояс.** Фрагменты.
**2-ая** палавіна XVII ст. — 1730-ыя гг.

Элементам ваеннага даспеха XV — сярэдзіны XVI ст. быў зубчасты металічны пояс, пры дапамозе якога да кірасы мацаваўся набедранік[62]. Аксесуарам да ахоўнага баявога касцюма гусар у XVI — першай палавіне XVII ст. служылі шкуры леапардаў і ваўкоў. Калі ў 1582 г. у зямяніна Берасцейскага павета суседзі спалілі дом, то сярод яго баявога рыштунку ў агні згарэла «лемьпартовь (скура леапарда. — *Лўт.)* трн, зброй (даспехаў. — *Аўт.)* складаных шэсць, шншаковь шесть, волковь (воўчых скур. — *Аўт.)* чотырн»[63].

У сярэднія вякі ўсе слаі гараджан і сяляне насілі на поясе каліту — скураную сумачку, дзе захоўвалі грошы і іншыя дробязі. У скарзе ў Гродзенскі земскі суду 1540 г. баярын Герасім Іванавіч Самастрэльнікавіч пісаў, што ў час наезду на яго гасподу сусед загадаў «... мя слугамь свонмь бнтн... у которомь же бою згнннуль мн поясь сь калнтою...»[64]. У рамесніка віленскагаСеліванаЯкуціча Міхайла Богушаў«полкопы фошей сь калнтою оторваль» (1539)[65]; гаспадарскага падданага Янкі Станкевіча на дарозе пераняў Мікалай Важдзевіч «...н обобраль н взяль врезано... калнту сь полторы копамн фошей» (1541)[66]; у Гродне ў карчме ў 1542 г. збілі яўрэя «м прм томь дей бою згннула... калнта, вь которой было петдесять копь фошей»[67].

З мытнай кнігі г. Брэста за 1583 г. відаць, што з Беларусі ў Польшчу і далей, разам з іншымі таварамі, вывозілі скураныя паясы і каліты. Так, случанін Нестар Дзмітровіч разам з футрамі выдраў, баброў, ваўкоў, гарнастаяў і ласак вёз да Любліна «поесовь мешнннных 140... каліть слуцкіхь IO»[68]. «Мешына» — назва пэўным спосабам вырабленай скуры[69]. Другі слуцкі купец разам з вырабленымі скурамі розных гатункаў і футрамі вёз у Люблін 50 каліть[70], брэсцкі мешчанін Ждан Самойлавіч —

«поесовь козничковь IЗО»[71], другі брэсцкі мешчанін Эска Стацiўка — «ременье работы шовецкое»[72].

У гэтым жа 1583 г. з Л юбліна праз брэсцкую мыт-ню на Беларусь увозілі «поеса простые»[73], «поеса оксамнтные»[74], «поесацетноватые»[75], «хусткн турец-кне»[76], якія таксама выкарыстоўваліся ў якасці пая-соў, «поеса едвабные до шабель»[77]. Шабельны пояс быў вузкім і лёгкім. Пры яго дапамозе шабля маца-валася на левым баку такім чынам, каб крыж дзяр-жання знаходзіўся на ўзроўні таліі. Поруч з ядваб-нымі (шаўковымі) паясамі для гэтай мэты выкары-стоўваліся раменныя паясы-паскі, залатыя і сярэб-раныя тасьмы[78].

Гараджане часта прычаплялі да пояса розныя прывескі («цаты», «цаткі»). Гродзенскі яўрэй Лазар Ліхман даў у залог пану Сямёну Раманавічу ў 1541 г. «цаты сребренын поясовыш, вь которыхь дей важнть две грнвне безь десятн золотннковь»[79], а ў зямяніна Гродзенскага павета Балтрамея Станіслававіча ў 1565 г. укралі «поесь сь цаткамн, за трн грошн куп-леный»[80]. Цаткі са старажытных часоў з'яўляліся ад-ным з найбольш пашыраных відаў упрыгожвання паясоў і адначасова служылі амулетам-абярэгам ад злых духаў, таму часта мелі на сабе выявы сімвалаў хрысціянскага культу[81].

З сярэдзіны XVII ст., калі пачаў складвацца «польскі» («сармацкі») комплекс мужчынскага кас-цюма з кунтушом, моднымі становяцца шырокія мяккія паясы з узорыстых шаўковых тканін, якія імпартаваліся ў Рэч Паспалітую з Персіі, Турцыі і іншых усходніх краін.

На партрэтах і мініяцюрах XVII—XVIII стст. прадстаўнікі магнатэрыі і багатай шляхты Вялікага княства Літоўскага звычайна пісаліся мастакамі ў святочнай вопратцы, падпяразаныя багатымі ску-ранымі паясамі з залатымі ці сярэбранымі наклад-камі або шырокімі ўсходняга тыпу ўзорыстымі пая-самі. Па актавых матэрыялах, якія ўтрымліваюць апісанні адзення, бачна, што былі яны з шоўку ці дарагіх кашаміравых тканін, ператыканыя залатымі і сярэбранымі ніткамі рознага колеру: белыя, бла-кітныя, чырвоныя, чорныя. Часам у якасці пояса выкарыстоўвалі ўсходнія хусткі-шалі. Паясы былі прадметам імпарту з краін Усходу, аб чым гавораць паметкі ў рэестрах магнацкага адзення: «пояс ту-рэцкі», «пояс хінскі», «пояс перскі». Кошт іх па тым часе дасягаў велізарных памераў — 500 дукатаў (1 дукат ацэньваўся ў 3 залатыя рублі)[82]. Больш бед-ныя карысталіся паясамі мясцовага вырабу.

Найдаражэйшымі лічыліся шаўковыя персід-скія паясы, ператыканыя залатымі і сярэбранымі ніткамі, кожны з якіх быў сапраўдным мастацкім творам. У першай палавіне XVIII ст. князь Геранім Фларыян Радзівіл вырашыў арганізаваць выраб такіх паясоў у Слуцку. З гэтай мэтай ён выпісаў у 1740-ых гг. у Слуцк некалькі ткачоў з Персіі і Тур-



**Пояс.** Сярэдзіна XVIII ст. Шоўк, ткацтва. Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Фота В. Ждановіча



**Фрагмент пояса.** 2-ая палавіна XVIII ст. Шоўк, запотныя ніты, ткацтва. Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Фота А. Булвы

цыі. На радзівілаўскай мануфактуры, «персіярні», як яе называлі сучаснікі, спачатку ткалі толькі шаўковыя паясы, якія капіравалі ўзоры паясоў з Бліжняга Усходу. З цягам часу беларускія майстры перанялі і творча перапрацавалі ўсходняе рамяство, надалі яму своеасаблівы стыль і каларыт, стварыўшы арнаменты з выявамі кветак мясцовай флоры: рамонкаў, незабудак, валошак, чырвоных гваздзікоў, ператыканых залатымі і сярэбранымі ніткамі.

Паводле ніцянога складу слуцкія паясы падзяляюцца на «простыя», «паўлітыя» і «літыя». Простыя выраблялiся толькі з шаўковых нітак, «паўлітыя» акрамя шоўку мелі дадатак каштоўных металічных (залатых і сярэбраных) нітак да арнаментаў, «літыя» змяшчалі металічныя ніткі ў арнаменце і ў фоне[83].

Канструктыўна слуцкі пояс складаўся з дзвюх «галоў», сярэдніка, аблямаванняў (бардзюраў) і махроў, дзе велічыня сярэдніка прыблізна суадносілася да памераў «галавы» як 1 х 16, а шырыня «галавы» да шырыні аблямаванняў як 1*8[84].

Слуцкая «персіярня» мела 24 паставы, на якіх толькі залаталітых паясоў вытыкалі ў год па 200 штук, правы бок іх быў цалкам затканы залатой ніткай, якая закрывала шаўковуюаснову. Найбольш дарагія з такіх паясоў утрымлівалі да 2 фунтаў золата[85]. Даўжыня слуцкіх паясоў вагалася ад 2 да 4,5 м, шырыня прыблізна ад 30 да 45 см. Колеры паясоў былі самыя розныя: цёмна-чырвоны, малінавы, блакітны, зялёны, белы, чорны ў спалучэнні з золатам і серабром. Адзін бок пояса звычайна быў светлы, а адваротны — цёмны. Часам паясы рабілі чатырохбаковымі (па ўсёй даўжыні яны былі падзелены на дзве палавіны з утком рознага колеру). Іх падпяразвалі на той ці іншы бок у залежнасці ад жыццёвых акалічнасцей (у час жалобы — на цёмны бок). А. Міцкевіч так апісваў слуцкі пояс:

> ... той слуцкі знакаміты Залататканы пояс, дзе як зліты Дзве дэсані: бок добры ўвесь у кветкі, А адваротны — чорны, нібы ў клеткі Сабраны ўзор той самы ў іншым скутку: «Насі здароў і ў радасці і ў смутку! — Я твой, — ён кажа, — у шчасці і ў жалобе, Пас двухаблічны ў адной асобе»[86].

Слуцкія паясы вызначаліся надзвычай прыгожым бляскам, які атрымоўваўся дзякуючы масяжовай валкоўніцы[87]. На іх канцах па-стараславянску ці на лацінскай мове натыкалі надпісы «Слуцк», «У горадзе Слуцку», «Зробленаў Слуцку»[88]. Насілі слуцкія паясы складзенымі па аснове ў 2—4 разы і завязвалі некалькімі спосабамі: канцы пояса завязваліся бантам злева на таліі, з выстаўленымі з двух бакоў канцамі, са схаванымі канцамі.



**Пояс.** Каля 1770 г. Шоўк, залотныя ніты, ткацтва. Гродзенская ткацкая мануфактура (?). Фота Г. Ліхтаровіча



Пояс. 1760—1780 гг.
Ліён або Гродна. Мануфактура.
Залотны шоўк

Выконваючы сваю утылітарную функцыю — апя-разванне жупана ці кунтуша, слуцкія паясы дэкла-равалі сацыяльную прыналежнасць і багацце таго, хто іх насіў, характар таго ці іншага моманту жыц-ця (вяселле, жалобу), павінны былі гарманіраваць з іншымі дэталямі касцюма.

Даходнасць слуцкай «персіярні» пабудзіла і іншых беларускіх магнатаў адкрыць майстэрні па вырабу паясоў тыпу слуцкіх у Гродне, Ружанах, Ла-сосне. Магнаты і багатая шляхта збіралі калекцыі паясоў для сваіх галерэй, стваралі цэлыя «пакоі па-ясоў» у палацах[89].

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай на слуцкай ма-нуфактуры пачаўся выраб паясоў з забароненай дзяр-жаўнай сімволікай у «галовах» паясоў — вершнікам на кані (сімвал Вялікага княства Літоўскага), верш-нікам і арлом (сімвал Кароны Польскай), а такса-ма сярэбрана-зялёных паясоў, дзе зелень была зна-кам надзеі і месяца мая — часу прыняцця дэмакра-тычнай Канстытуцыі 3 мая 1791 г. У такіх паясах хадзіла свядомая частка шляхты і інтэлігенцыі. Уздзеянне гэтых паясоў на грамадскасць было на-столькі значным, што царскі ўрад забараніў іх на-шэнне[90], а пасля паўстання 1830—1831 гг. забарона была распаўсюджана на ўвесь кунтушовы касцюм-ны комплекс[91], які расійскім урадам быў чамусьці прыняты за нацыянальнае польскае адзенне. Апош-ні слуцкі пояс быў вытканы ў 1846 г.[92] У сувязі з гэ-тым слуцкія паясы выйшлі з ужытку ў асяроддзі вы-шэйшага саслоўя, але шляхта прадаўжала насіць мяккія шырокія паясы з шэрсціда сярэдзіны **XIX** ст., апяразваючы імі кашулі і верхняе адзенне.

**У XVIII** ст. мужчынскі касцюм пачынае спраш-чацца. З 1770-ых гг. распаўсюджваецца новы від пле-чавога адзення — фрак. Пад яго апраналі белую ка-шулю з гальштукам-касынкай і адной або некалькімі камізэлькамі. Галаўным уборам да такога касцюма стаў цыліндр, а абавязковым дапаўненнем лёгкая тростачка з залатым, сярэбраным, бронзавым або касцяным набалдашнікам.

Нашэнне залатых нагрудных ланцугоў адрадзі-лася ў канцы **XVIII** ст. з распаўсюджваннем кішэн-ных гадзіннікаў. Аднак ланцугі, прыстасаваныя для нашэння гадзінніка, сталі танчэйшымі і звычайна былі простага («якарнага») пляцення.

Колькасць пярсцёнкаў-пячатак (сыгнетаў, **сег-**нетаў) значна паменшылася ў **XVIII** ст., такяксталі ўжывацца настольныя пячаці для апячатвання пісьмаў. Але ў **XIX** ст. нашэнне іх зноў увайшло ў моду шляхты і гараджан.

У пачатку **XIX** ст. вярнуліся ў еўрапейскую муж-чынскую моду пальчаткі, але іх сталі шыць без уся-лякіх упрыгажэнняў і былі яны толькі белага коле-ру з тонкай скуры. Таму іх берaглі, захоўвалі ў спе-цыяльных шкатулках. Гарадскі інтэлігент, чыноўнік і тым больш прадстаўнік дваранскага саслоўя не мог



**Пояс.** Каля 1778—1807 гг. Шоўк, залотныя ніты, ткацтва. Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Фота Г. Ліхтаровіча



**Спосаб павяэвання** слуцкага пояса. Партрэт А. Агінскага. 1-ая палавіна XVIII ст.



**Пояс.** Каля 1778—1807 гг. Шоўк, залотныя ніты, ткацтва. Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Фота Г. Ліхтаровіча

лічыцца добра апранутым, калі ў яго не было белых або вельмі светлых лайкавых або шаўковых пальчатак да вячэрняга касцюма і замшавых або з гладкай скуры днём.

Кавалеры не здымалі белых пальчатак на балі і ніколі без іх не танцавалі. Без пальчатак прадстаўнікі вышэйшага саслоўя не наведвалі ўрачыстыя прыёмы, тэатры і канцэрты. Яны служылі дапасаваннем і да вясельнага касцюма. Пачатак XX ст. прынёс моду на спартыўны стыль у мужчынскім касцюме. У рэчышчы гэтага стылю сталі моднымі чорныя і карычневыя скураныя пальчаткі аўтамабілістаў, якія пачалі насіць і тыя гараджане, хто ніколі спортам не захапляўся.

Рэвалюцыя аднесла белыя пальчаткі да буржуазных атрыбутаў адзення, і яны хутка выйшлі з ужытку. У цяперашні час белыя пальчаткі выкарыстоўваюцца толькі афіцыянтамі дарагіх рэстаранаў ды дырыжорамі аркестраў. Шырокія слаі гарадскога і вясковага насельніцтва карыстаюцца ў халодную пару года разнастайнымі па фасону, крою і якасці пальчаткамі пераважна чорнага колеру з натуральных і штучных матэрыялаў.

Абавязковым дапаўненнем дзённага і вячэрняга касцюма прадстаўнікоў дваранства, гарадской вярхушкі і інтэлігенцыі ў XIX — пачатку XX ст. заставалася лёгкая тросць. Маладыя людзі хадзілі з тонкімі і лёгкімі з паліраванага дрэва тростачкамі, а сталыя людзі карысталіся больш масіўнымі палкамі з мастацкай работы набалдашнікамі. Пасля Кастрычніка яны зніклі з ужытку. Простымі тросцямі сталі карыстацца толькі па неабходнасці старыя людзі і інваліды.

Са спрашчэннем касцюма ўсё большая ўвага стала надавацца гальштуку.

Гальштук стужкавага тыпу (падобны да цяперашняга) сталі насіць з 1870-ых гг. Л юбімым тыпам гальштука ў чыноўнікаў, купцоў, прыказчыкаў у канцы XIX ст. стаў гальштук-рэгата. Гэта разнавіднасць гальштука-самавяза, у якога вузел завязаны назаўсёды пры фабрычным вырабе. Такі гальштук разрэзаны ззаду, да аднаго са стварыўшыхся канцоў прышыта рызынка з гаплікам, да другога прымацавана пяцелька, каб яго можна было здымаць не развязваючы і каб ён падыходзіў на шыю любога памеру. Такія галынтукі ў святочныя дні насілі і гарадскія рабочыя. Аднак прадстаўнікі гарадской вярхушкі і чыноўнікі вышэйшых рангаў ставіліся да галыптука-рэгаты пагардліва і ніколі яго не насілі.

У апошняй чвэрці XIX — пачатку XX ст. увайшоў у моду гальштук-матылёк у форме банціка, які насілі з фракам, віцмундзірам, форменным і цывільным сюртуком, смокінгам, святочным касцюмам.

Вельмі хутка распаўсюдзіліся кішэнныя гадзіннікі. Дваране-шляхта, чыноўнікі, купцы, а ў канцы

стагоддзя і шмат хто з рабочых насілі гадзіннікі ў кішэні камізэлькі.

Важнейшым дапасаваннем народнага касцюма ў XIX — пачатку XX ст. заставаўся пояс. Традыцыя разглядала яго як прадмет з надзвычай высокім семіятычным статусам. Пояс лічыўся адным з галоўных абярэгаў чалавека, суправаджаючы яго нязменна ва ўсіх жыццёвых праявах ад нараджэння да смерці. Спавіванне нованароджанага сімвалізавала сабою факт уваходжання дзіцяці ў соцыум. Чырвоны колер абяцаў новаму члену роду найлепшыя пажаданні лёсу і долі, шчасця і здароўя. Добразычлівая, заклінальная, апатрапейная сімволіка пояса была надзвычай устойлівай у традыцыйнай абрадавай культуры беларусаў[93].

Скураныя, плеценыя, тканыя, вязаныя і вітыя паясы вясковага насельніцтва мелі на Беларусі розныя назвы. Найбольш пашыраныя з іх — «пас», «крайка», «акрайка», «кушак», «учкур», «апаяска» і г. д. Скураныя паясы бытавалі пад назвамі «рэмень», «дзяга», «папруга». Сялянкі прыкладалі шмат старання, каб пояс быў прыгожа аздоблены, дзякуючы чаму да нас дайшлі ўзоры старажытных арнаментаў. Лічыцца, што найбольш старажытнымі з'яўляюцца плеценыя і вітыя паясы, якія вядомы на ўсёй тэрыторыі Беларусі[94]. Існавалі дзве разнавіднасці плеценых паясоў: плоскія і круглыя. Плоскія паясы плялі рознымі спосабамі: «на пальцах», «на вілачцы», «на сцяне» (на спецыяльнай раме або любых паралельных перакладзінках). Такім спосабам выплятаці паясы шырынёй ад 2,5 да 5,5 см. Круглыя паясы плялі пры дапамозе драўлянай калодачкі цыліндрычнай або прамавугольнай формы з адтулінай пасярэдзіне, вакол якой былі забіты цвічкі без галовак. Плеценыя на калодачцы круглыя паясы часам называлі кручанымі. У канцы XIX — пачатку XX ст. яны бытавалі на ўсходзе Віцебскай і Магілёўскай губерняў[95].

Вельмі старажытным спосабам вырабу мужчынскіх паясоў было віццё. Звычайна іх вілі з белых і афарбаваных у чырвоны колер пасмаў воўны аднолькавай таўшчыні пальцамі або з дапамогай двух драўляных кручкоў. Пасмы звівалі ў круглы пярэсты шнур, абодва канцы якога заканчваліся пышнымі кутасамі[96].

Найбольшае пашырэнне на ўсёй тэрыторыі Беларусі атрымалі тканыя паясы. Былі яны шырынёй ад 3 да 20 см, і выраблялі іх з выкарыстаннем розных тэхнік: на дошчачках, на бёрдзечку, на ніту, на кроснах.

Арнаментыка беларускіх народных паясоў вызначаецца разнастайнасцю геаметрычных узораў: папярочныя, падоўжаныя і касыя палоскі, зорачкі, ромбы, крыжыкі, грабеньчыкі. Паясы аздабляліся кутасамі, махрамі. Пераважала спалучэнне чырвонага колеру з белым фонам, хаця ў невялікай коль-



Рэканструяваны пояс. 1770-ыя гг. Шоўк, залотныя ніты, ткацтва. Ліёнская ткацкая мануфактура. Францыя. Фота В. Ждановіча



**Пояс.** Каля 1780 г. Шоўк, залотныя ніты, ткацтва. Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Фота Г. Ліхтаровіча



**Пояс.** Каля 1780 г.
Шоўк, залотныя ніты, ткацтва.
Слуцкая мануфактура
шаўковых паясоў.
Фота Г. Ліхтаровіча



**Спосаб павязвання слуцкага пояса.** Партрэт Міхала Радзівіла (1749—1831), віленскага ваяводы. Невядомы мастак. 2-ая палавіна XVIII ст.

касш ўводзіўся жоўты, сіні, зялены, чорны колеры. Яркія шматколерныя ўзоры на народных паясах характэрны для Заходняга Палесся[97]. Лепшыя тканыя паясы вызначаліся прыгажосцю і надзвычайнай шчыльнасцю. Некаторыя з іх былі цвёрдыя, як луб[98].

Вязаныя паясы ў XIX — пачатку XX ст. мелі лакальнае распаўсюджванне ў некаторых вёсках Мазырскага, Пінскага, Рэчыцкага паветаў Мінскай губерні, а таксама ў Клімавіцкім і Сенненскім паветах Магілёўскай губерні. Вязалі іх звычайна з аднакаляровых нітак пераважна чырвонага колеру. Шырыня іх дасягала 26 см, а даўжыня вагалася ад 2 да 3 і больш метраў. Пояс абкручвалі вакол таліі 2—4 разы і завязвалі збоку ці наперадзе бантам, радзей вузлом, а канцы звісалі ўніз і даходзілі да каленяў[99].

Як святочнае дапасаванне да касцюма вельмі шырокія паясы («крэпы») насілі беларускія сяляне ў XIX — пачатку XX ст. у ваколіцах Турава на Гомельшчыне. Ткалі іх з тонкіх даматканых ваўняных нітак у паскі, «у каціныя лапкі» шырынёй 35—40 см, часам канцы яшчэ вышывалі. Насілі паясы-крэпы па святах да 1920-ых гг. Пры апяразванні такі пояс складвалі ў 2—3 разы па аснове і 1 —2 разы абмотвалі



па бёдрах. Спераду, з левага боку пояс завязваўся бантам і яго канцы звешваліся ніжэй краю сарочкі. У штодзённым побыце сяляне апаясваліся вузкімі тканымі паясамі («крайкамі») шырынёй прыблізна 4 см і даўжынёй пасля 3 м, якія абвівалі вакол таліі 2—3 разы. Крайкі былі чырвонага, карычневага, сіняга колеру, а таксама паліхромныя: у паскі, ром-бы, крыжыкі, зорачкі і іншыя геаметрычныя ўзо-ры[100]. Бывала, што на селяніне адначасова было 3 паясы. Адзін, раменны, падтрымліваў нагавіцы, другім была падпяразана сарочка, а трэцім — світа. У сялян, нягледзячы на цяжкі матэрыяльны стан, паясы былі штодзённыя і святочныя, для сарочкі і світы, на гулянне і г. д. Нярэдка святочны пояс слу-жыў некалькім пакаленням[101]. Часам беднасць пры-мушала сялян падпяразваць світы ў буднія дні не рознакаляровымі паясамі, а вяроўкай, аборкай ад лапцей, абрыўкам вожак і г. д.[102]

Важным аксесуарам вясковага святочнага кас-цюма ў XIX — пачатку XX ст. служыў разрэзаны па дыяганалі кавалак крамнай тканіны ў якасці шый-най хусткі. Шыйную хустку («шырынку») звычайна насілі ў комплексе з сарочкай з адкладным каўня-ром у святы або едучы ў госці, на кірмаш, ідучы ў царкву ці касцёл.

Касцюм вясковых мужчын часам дапаўняла ў левым вуху сярэбраная завушніца, якую насілі «ад

**Спосаб павязвання слуцкага пояса.** Партрэт Казіміра Нестара Сапегі. Мастак Ю. Пешка. 2-ая палавіна XVIII ст



**Пояс.** Каля 1778—1807 гг. Шоўк, залотныя ніты, ткацтва. Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Фота Г. Ліхтаровіча



**Пояс.**
Каля 1793—1807 гг.
Шоўк, залотныя ніты, ткацтва. Слуцкая мануфактура шаўковых паясоў. Фота Г. Ліхтаровіча



**Пояс слуцкага тыпу.** 2-ая палавіна XVIII ст.
Шоўк, сярэбраныя ніты, ткацтва. Ліёнская ткацкая мануфактура. Францыя. Дар Анджэя Цеханавецкага (Лондан).
Фота М. Мельнікава

урокаў»[103], або «каб не балела галава»[104], а таксама абручальныя кольцы[105].

У пачатку XX ст. у якасці дапаўнення ў касцюме гараджан выкарыстоўвалі гадзіннікі ў кішэні жылеткі на залатым або сярэбраным ланцужку, булаўкі для гальштука, рознага роду запінкі, якія паступова замяняліся гузікамі на манжэтах кашулі. Пашырэнне курэння папірос і цыгарэт прывяло да з'яўлення і распаўсюджвання партсігараў — залатых, пазалочаных, сярэбраных, з простых металаў.

З першых дзесяцігоддзяў XX ст. у мужчынскую моду ўвайшлі наручныя гадзіннікі, якія і ў цяперашні час з'яўляюцца дапаўненнем касцюма ўсіх катэгорый гарадскога і вясковага насельніцтва.

Кастрычніцкая рэвалюцыя і грамадзянская вайна зрабілі праблемы касцюма і аксесуараў неактуальнымі. Да канца 1930-ых гг. новая ідэалогія адмоўна ставілася да ўсялякага аздаблення касцюма. Выключэнне складалі наручныя гадзіннікі, якія разам з кішэннымі набывалі ўсё большую папулярнасць.

У1920— 1930-ыя гг. разам зтрадыцыйным касцюмам у вясковых жыхароў з масавага ўжытку зніклі плеценыя, тканыя і вязаныя паясы, саступіўшы месца скураным і брэзентавым рэменям з металічнымі спражкамі.

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны востры недахоп тканін вызначыў выкарыстанне рознага тыпу адзення, перашыццё паліто на курткі, пераліцоўку іх і г. д.

У касцюме гарадскога і вясковага насельніцтва шырокае бытаванне атрымалі ваенныя рамяні.У паўваенным касцюме дзяржаўных і партыйных функцыянераў яны заставаліся абавязковым атрыбутам дасярэдзіны 1950-ых — пачатку 1960-ыхгг.

З ростам дабрабыту насельніцтва, развіццём тэлебачання і пашырэннем рознабаковых сувязей з замежнымі краінамі разам з еўрапейскай і сусветнай модай у касцюме гарадскіх і вясковых жыхароў да цяперашняга часу выкарыстоўваюцца рознай шырыні скураныя рамяні і рамяні з розных скуразамяняльнікаў, якія выконваюць у асноўным толькі утылітарную функцыю.

Гарадская моладзь, якая з сярэдзіны 1960-ых гг. пачала інтэнсіўна ўспрымаць амерыканскую моду, разам з джынсамі стала насіць шырокія скураныя («каўбойскія») рамяні з металічнымі заклёпкамі і масіўнымі спражкамі. У 1980-ыя гг. у маладзёжную моду ўвайшлі паясы з эластычнай тканіны з амерыканскай сімволікай, якія насілі звычайна з джынсамі да пачатку 1990-ых гг.

З пачатку 1990-ых гг. гарадская і вясковая моладзь аддае перавагу даволі шырокім рамяням з тоўстай скуры і масіўнымі металічнымі спражкамі, якія носяць з джынсамі. Некаторыя маладзёжныя групоўкі «рокеры», «металісты», а таксама прыхільнікі



**Спосаб павяэвання гальштука.**
Партрэт мужчыны з расшытым каўняром.
Невядомы мастак. 1820-ыя гг.

маладзёжнай амерыканскай моды карыстаюцца шырокімі скуранымі рамянямі з экстравагантнымі металічнымі спражкамі і ўпрыгажэннем.

З 1970-ых гг. набыла папулярнасць мода на доўгія валасы. Некаторыя сталі рабіць з іх хвост у стылі XVIII ст., але без банта, хаця частка моладзі і больш сталыя ўзроставыя катэгорыі стрыглі валасы даволі коратка. У канцы XX ст. некаторыя маладыя людзі ў горадзе і сельскай мясцовасці сталі галіць або стрыгчы нагала валасы, насіць на шыі ланцугі, часам з крыжыкам або знакам задыяка, пацеркі з дрэва, керамікі, бісеру, а ў левым вуху завушніцу. Замест наручных гадзіннікаў у маладзёжную моду шырока ўвайшлі мабільныя тэлефоны.

Гальштук-самавяз і гальштук-рэгата ў цяперашні час застаюцца неабходнай прыналежнасцю святочнага касцюма, касцюма работнікаў розных афіцыйных устаноў у горадзе і на вёсцы, ваенных.

Гальштук-матылёк лічыцца падыходзячым да святочнага касцюма на ўрачыстых прыёмах, канцэртнага касцюма эстрадных артыстаў, афіцыянтаў дарагіх рэстаранаў.



**Спосаб павязвання гальштука.**
Партрэт Сільвестра Янішэўскага. Мастак К. Івашкевіч. 1827 г.

Людзі больш сталага ўзросту носяць абручальныя кольцы, масіўныя пярсцёнкі — пячаткі, наручныя гадзіннікі.

Такім чынам, аксесуары, надаючы касцюму лагічную і стылявую завершанасць, адлюстроўвалі тую ці іншую гістарычную эпоху, той ці іншы перыяд у развіцці матэрыяльнай і духоўнай культуры народа.



Тыпы сялянскіх паясоў. Канец XIX — пачатак XX ст.
а) тканы. Слуцкі павет Мінскай губерні;
б) тканы. Мазырскі павет Мінскай губерні;
в) тканы. Кобрынскі павет Гродзенскай губерні;
г) вязаны. Мазырскі павет Мінскай губерні;
д) плецены. Дзісенскі павет Віленскай губерні;
е) тканы. Брэсцкі павет Гродзенскай губерні;
ж) тканы. Пінскі павет Мінскай губерні;
з, і) тканыя. Быхаўскі павет Магілёўскай губерні. Малюнкі С. Гунько

[1] Седов В. В. Одежда восточных славян VI—IX вв. н. э. // Древняя одежда народов Восточной Европы. Материалы к историко-этнографическому атласу. М., 1986. С. 35.
[2] Ласкавый Г. В., Дучиц Л. В. Новые данные о костюме раннесредневекового населения Белоруссии. С. 63.
[3] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст.

Касцюм на Магілёўшчыне ў X—XIII стст.

С. 31, 61.
[4] Дучыц Л.
С. 30.
[5] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. (паводле археалагічных звестак). 3-яе выд. Мн., 2005. С. 19, 23.
[6] Лысенко П. Ф. Берестье. Мн., 1985.
[7] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. С. 23.
[8] Там жа. С. 24.
[9] Лысенко П. Ф. Берестье. С. 241.
[10] Дучыц Л. У. Гарадскія пахаванні X—XIII стст. на тэрыторыі Беларусі // Пстoрыя Беларусі: жалезны век і сярэднявечча. Мн., 1997. С. 19.
[1] Дучыц Л. У. Касцюм жыхароў Беларусі X—XIII стст. С. 18.
[12] Там жа. С. 11.
[13] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа (Далей АСД). Т. 4. Вильна, 1867. С. 229.
[14] Там жа. С.228.
[15] Там жа. С. 226.
[16] Там жа. С. 228.
[17] Там жа. С. 229.
[18] Акты, издаваемые Виленской археографическою комис сией) для разбора древних актов. (Далей АВАК). Т. XXII. С. 155.
[19] Тамжа. Т. XXXIX. С. 214.
[20] Там жа. Т. XVII. С. 407.
[21] Там жа. Т. XXII. С. 206.
[22] Там жа. Т. XXXIX. С. 178.
[23] Там жа. Т. XVIII. С. 60.
[24] Там жа. Т. XXXVI. С. 149.
[м] ИЮМ. Вып. 10. С. 56.
[26] АСД. Т .4. С. 228.
[27] АВАК. Т. XX. С. 225.
[28] АСД. Т. 1.С. 251.
[29] АВАК. Т. XXXIX. С. 61.
[30] Тамжа. Т. XXXVI. С. 57.
[31] Забелин И. Е. Домашний быт русских царей. М., 1915. Ч. II. С. 453.
[32] Labourer Gean de. Relacja z podrozy krolowej polskiej // Cudzoziemcy o Polsce. Pelacje i opinie. T. I. C. 245. Цыт. па кн.: Тананаева Л. И. Сарматский портрет. Из истории польского портрета эпохи барокко. М., 1979. С. 26.
[33] АВАК. Т. VIII. С. 465.
[34] Там жа. Т. XX. С. 136.
[35] Там жа. Т. VIII. С. 484.
[36] Там жа.
[37] АВАК. Т. XVII. С. 323.
[38] Там жа. С. 360.
[39] Там жа. Т. III. С. 279.
[40] Там жа. Т. III. С. 278.
[41] Тамжа. Т. XVII. С. 411.
[42] Шейн П. В. Материалы для изучения быта и языка рус ского населения Северо-Западного края. Т. 3. СПб., 1902. С. 43.
[43] Быт белорусских крестьян//Вестник ИРГО. 1853. Ч. IX. Кн. 5. С. 1.
[44] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хра нящихся в Центральном архиве в Витебске (Далей ИЮМ). Вып. 32. Витебск, С. 105.
[45] Там жа. Вып. 10. 1879. С. 34.
[46] АСД. Т. 1. Вильна, 1867. С. 259.
[47] ИЮМ. Вып. 1. С. 23.
[48] Буровик К. А. Красная книга вещей. М., 1996. С. 130.
[49] Лукина Г. Н. Предметно-бытовая лексика древнерус ского языка. Мн., 1990. С. 152.
[50] Терещенко А. В. Быт русского народа. Ч. I. Репринт. М., 1997. С. 182.
[51] АВАК. Т. XVII. С. 402.
[32] Там жа. Т. XXXIV. С. 286.
[53] Там жа. Т. XXVIII. С. 324.
[54] Там жа. Т. XXXVI. С. 375.

**Фрагмент пояса** («крэпа»).
Г. п. Тураў Жыткавіцкага раёна
Гомельскай вобласці.
1930-ыя гг.



55 НЮМ. Вып. 13. С. 56.
56 АВАК. Т. XVII. С. 2.
" Там жа. Т. III. Внльна, 1870. С. 280.
58 Там жа. Т. XVII. С. 103.
59 Там жа. Т. XIV. С. 273.
60 Там жа. Т. VI. С. 275.
61 Там жа. С. 286.
62 Ткачэнка М. І. Амбразская калекцыя даспехаў і гравіраваныя партрэты Радзівілаў // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння: 36. арт. Мн., 1994. С. 59.
63 АВАК. Т. XVIII. С. 44.
64 Там жа. Т. XVII. С. 85.
61 Там жа. С. 47.
66 Там жа. С. 346.
67 Там жа. С. 360.
68 Там жа. С. 295.
6' Рабаданова Л. И. Названия одежды, головных уборов... С. 16.
70 АСД. Т. 3. С. 293.
71 Там жа. С. 294.
72 Там жа. С. 292.
73 Тамжа. С. 314.
74 Там жа. С. 298.
75 Там жа. С. 299.
76 Тамжа. С. 310.
"Тамжа. С. 305, 310.
78 Вуглік I. Р. Шляхецкая шабля XVII—XVIII стст. як ар-тэфакт тагачаснага жыцця // Традьшыйная фізічная куль-



**Фрагмент пояса** («крэпа»). Г. п. Тураў Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. 1930-ыя **гг.**

тура беларусаў: гісторыя, тэорыя, практыка: Матэрыялы II Рэспубліканскай канферэнцыі па праблемах фізічнай культуры беларусаў. Мн., 1999. С. 77.
[79] Там жа. С. 283-284.
"° Там жа. С. 442.
" Лысенко П. Ф. Берестье. С. 261.
[82] Власт. Слуцкія паясы // Спадчына. 1997. № 3. С. 136.
[83] Каранеўская І. М. Аналіз кунтушовых паясоў слуцкай мануфактуры // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2000. № 1. С. 89—90.
[84] Там жа. С. 90.
[85] Власт. Слуцкія паясы. С. 140—142.
[86] Міцкевіч А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве. С. 38.
[87] Власт. Слуцкія паясы. С. 138.
[88] Трызна Дз. Слуцкія паясы. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 469.
"' Каранеўская І. М. Аналіз кунтушовых паясоў слуцкай мануфактуры. С. 91.
[90] Там жа.
[91] Хадыка А. Старабеларуская шляхецкая мода // Спадчына. 1992. № 3. С. 56.
[92] Грышкевіч А. Найдасканаласць тутэйшая і еўрапейская. З гісторыі вытворчасці слуцкіх паясоў // Мастацтва Беларусі. 1991. № 8. С 39, 65.
[93] Фадзеева В. Я. Этнаграфічныя рэаліі ў беларускім іканапісе XVI—XVIII стст. // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння: 36. арт. Мн., 1994. С. 206—207.
[94] Лебедева Н. И. Прядение и ткачество восточных сла вян // Восточнославянский этнографический сборник. Очерки народной материальной культуры русских, укра инцев и белорусов в XIX — начале XX в. М., 1956. С. 501.
[95] Курыловіч Г. М. Мужчынскі касцюм // Беларускае народнае адзенне. Мн., 1975. С. 52.
[96] Раманюк М. Ф. Віццё мастацкае // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1989. С. 115.
[97] Сілівончык В. І. Пояс // Этнаграфія Беларусі. Энцык лапедыя. С. 410.
[98] Сербаў І. А. Вічынскія паляне. Менск, 1928. С. 30.
[99] Курыловіч Г. М. Мужчынскі касцюм. С. 53.
"'"АІМЭФ НАН Беларусі. Матэрыялы Магілёўска-Гомель скай экспедыцыі 2001 г.
"" Курыловіч Г. М. Мужчынскі касцюм. С. 53. [1112]
Анимелле Н. Быт белорусских крестьян // Этнографический сборник Императорского Русского географического общества. Вып. 2. СПб., 1854. С. 39.
[103] АІМЭФ НАН Беларусі, ф. 6, воп. 11, спр. 112-в, л. 13; спр. ПО, л. 12; спр. 131, л. 9.
[104] Там жа. Спр. 103, л. 13.
[105] Там жа.

# Глава 8    Баявы касцюм



Рознага характару і маштабу ўзброеныя канфлікты суправаджаюць гістарычнае развіццё народаў з найдаўнейшых часоў. З бронзавага веку вядомы такія віды зброі, як меч, чакан, баявая сякера і яе разнавіднасці, з VIII—IX стст. — шабля. На тэрыторыі Беларусі археолагамі сабрана вялікая колькасць узораў старажытнай зброі і вайсковай экіпіроўкі. Гэта мячы, шаблі, сякеры, часткі лукаў, кальчуг, панцыраў. Значная частка гэтай зброі была прывезена з замежных краін, Кіева і іншых гарадскіх цэнтраў Старажытнай Русі, частка выраблена мясцовымі майстрамі[1].

У 1987 г. у цэнтры сучаснага Гомеля археолагамі была раскапана збройная майстэрня, якая была разбурана ў пачатку XIII ст. манголамі. На падлозе майстэрні знойдзена вялікая колькасць рэштkaў зброі і абарончага ваеннага адзення, распаўсюджаных у XII—XIII стст.: перакрыжаванні і навершшы мячоў і шабляў з бронзы і чорнага металу, наканечнікі ножнаў, фрагменты кальчужных палотнаў, складзеныя з сотняў кольцаў, пласціны ад баявых даспехаў[2].



Асноўнай зброяй у гэты час быў меч, таму ваеннае адзенне максімальна прыстасоўвалася да абароны цела ў бліжнім баі. Ваенны ўбор прадстаўніка княжацкай знаці ў Старажытнарускай дзяржаве складаўся са шлема, кальчугі, шчыта. Зброяй служылі меч, кап'ё або яго кароткі кідальны варыянт (суліца), лук, шабля.

Меч — від зброі блізкага бою ў X—XVстст. Мячы і іх дэталі знойдзены археолагамі ў курганах і пры раскопках у Мінску, Полацку, Навагрудку, Ваўкавыску, Друцку. Меч складаўся звычайна з двухлязовага клінка і дзяржання з навершшам, якое адасаблялася ад клінка крыжавінай. Аб тым, што мячы былі галоўнай зброяй рукапашнага бою, згадваецца ў «Слове пра паход Ігаравы»:

> Ярь туре Всеволоде! Стонши на боронн, прышешн на вон стреламн, гремлешн о шеломы мечн харалужнымн (булатнымі. — *Аўт.у?*

Там жа гаворыцца і аб іншых відах тагачаснай зброі: луках і калчанахса стрэламі, шаблях, кароткіх кідальных коп'ях (суліцах). Брат Ігара Усевалад так характарызуе гатоўнасць воінаў сваёй дружыны да бою з полаўцамі:

> ... лукн у ннхь напряженн,
> тулн (калчаны. — *Аўт.)* отворенн,
> саблн нзьостренн[4].

Выява воіна ў поўны рост са шчытом і кап'ём у руцэ маецца на адной з пячатак кіеўскага князя Ізяслава Яраславіча, які княжыў з двума перарывамі ў 1054-1078 гг.[5]



**Ваенны касцюм і зброя XI ст.** «Паход Ізяслава Яраславіча Кіеўскага, Святаслава Яраславіча Чарнігаўскага, Усевалада Яраславіча Пераяслаўскага і Усяслава Брачыславіча Полацкага на торкаў. 1060 г.». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу

З найдаўнейшых часоў ва ўсходніх славян зброя была прадметам куплі і абмену. Яе дабывалі і ў час войнаў і паходаў. Аўтар «Слова пра паход Ігаравы» ўзгадвае «суліцы ляцкын»[6], «шеломы латнньскыя»[7].

Знаходка археалагамі рэштак збройнай май-стэрні ў Гомелі і матэрыялы раскопак Г. В. Штыха-ва ў Полацку не толькі канчаткова пацвердзілі тэзіс аб мясцовай вытворчасці зброі ў перыяд перад нашэсцем манголаў, але і ўдакладнілі ўяўленні аб уз-роўні спецыялізацыі старажытнага збройнага рамя-ства на Беларусі. Да знаходкі майстэрні ў Гомелі лічылася, што зброя ад каваля адразу трапляла да воіна-дружынніка. Новыя матэрыялы дазволілі ўвесці ў ланцуг «каваль — спажывец» яшчэ пасрэд-ніка-майстра, які выконваў апрацоўку зброі і яе ра-монт[8]. Зброя, вырабленая ўсходнеславянскімі майстрамі, карысталася вялікім попытам у народаў Усходняй Прыбалтыкі, Скандынавіі, Польшчы, а таксама ў полаўцаў[9].

Галоўным ахоўным элементам у ваенным убо-ры князя і яго дружыны была кальчуга з дробных металічных кольцаў даўжынёй да каленяў і рукавамі да локцяў ці запясця. Яе надзявалі на баявую кашулю з сукна або грубага палатна і падпяразвалі металічным поясам з блях.

Для абароны галавы служыў металічны шлем (стар.-рус. «шеломя» — пагорак, узвышша), які часта меў сплецены з металічных кольцаў затыльнік («барміцу»). Адметнай рысай шаломаў была выцягнутая шпілем уверх форма звона, часам з шарыкам («яблыкам») або сцяжком («ялаўцом») наверсе. Пад шлем абавязкова паддзявалі шчыльна аблягаючы галаву падшлемнік, пашыты са скуры або зложанай у некалькі столак тканіны. Шлемы князёў і набліжаных да іх асоб арнаментаваліся markup рознымі ўзорамі, залаціліся:

Камо, турь, поскочяше,
свонмь златымь шеломомь посвечнвая,
тамо лежать поганыя галовы половецкыя[10].

Для адбівання ўдараў варожай зброі выкарыстоўвалі круглыя, міндалепадобныя або авальнай формы шчыты, знешні бок якіх фарбаваўся чэрлянню — яркай ружова-чырвонай фарбай, якую рабілі з насякомага — чэрвяца".



**Зброя конных воінаў XI ст.** «Спальванне Усяславам Брачыславічам Полацкім Ноўгарада ў 1063 г.». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу



**Касцюм гараджан і ўзбраенне воінаў XI ст.** «Узяцце Мінска войскам Ізяслава, Святаслава і Усевалада Яраславічамі і ўзяцце ў палон жыхароў Мінска ў 1066 г.». Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу



**Полацкі воін XII—XIII ст.**
**Рэканструкцыя Г. Ласкавага**

Вайсковыя фарміраванні Старажытнарускай дзяржавы складаліся з «дзесяткаў», «сотняў» і «ты-сячаў», якія ўзначальвалі дзесятнікі, сотнікі, ты-сяцкія.

У XI—XIII стст. у Еўропе дасягае росквіту ры-царства. Менавіта ў гэты перыяд складваюцца вялі-кія рыцарскія арганізацыі — ордэны, выпрацоўва-юцца асноўныя прынцыпы рыцарскіх паводзін і рытуал пасвячэння ў рыцары, якія вызначалі ўнут-рысаслоўныя ўзаемаадносіны, фарміруецца ры-царскі кодэкс гонару (сукупнасць абавязковых для рыцара этычных норм і правілаў). Гэта быў час, калі ідэі рыцарства захаплялі прадстаўнікоў дваранскіх сем'яў з розных зямель Іспаніі, Партугаліі, Італіі, Францыі і г. д., і яны адпраўляліся шукаць баявых подзвігаў.

Узброенае еўрапейскае рыцарства ў сваіх пахо-дах выкарыстоўвала вялікіх марудных коней. Верш-нікі ў цяжкіх даспехах ездзілі на гэтых непаваротлі-вых конях пераважна крокам і толькі ў момант атакі пасылалі іх галопам насустрач праціўніку[12].

З пачатку XIII ст. ордэн мечаносцаў (з 1237 г. — лівонскі) і тэўтонскі крыжацкі ордэн пачалі напа-даць на літоўскія і заходнерускія княствы, захапілі Прусію і частку заходніх зямель Літвы. Амаль два стагоддзі не спыняліся войны княства з нямецкімі духоўна-рыцарскімі ордэнамі. Бесперапынныя вой-ны з крыжакамі і мангола-татарамі патрабавалі ўтрымання шматлікіх войскавых фарміраванняў.

Войска Вялікага княства Літоўскага да пачатку XV ст. складалася з ваенных дружын, якія выстаў-лялі літоўскія і славянскія землі дзяржавы, памер якіх вызначаўся ўстаўнымі земскімі прывілеямі вялікіх князёў літоўскіх.

Па старажытнай павіннасці гарады і воласці ў мірны час фарміравалі для аховы дзяржаўных межаў



**Кальчужная кашуля XVI ст. і шышак XVI—XVII стст.**



**«Прарочы» шчыт Яна III Сабескага. 2-ая палавіна XVI ст. Мілан (?)**

невялікія мабільныя групы коннікаў, так званую «стражу польную», якіх праз пэўны тэрмін рэгуляр-на мянялі. Пры неабходнасці гэтыя атрады прымалі ўдзел у ваенных паходах. Пры ўступленні ваенных сіл непрыяцеля на тэрыторыю княства аб'яўляла-ся ўсеагульнае народнае апалчэнне — «пагоня», у якім павінна было прымаць удзел усё мужчынскае насельніцтва, здольнае насіць зброю[13].

Калі беларускія землі ў XIII — першай палавіне XIV ст. увайшлі ў склад Вялікага княства Літоўска-га, дзесяткова-соценная вайсковая сістэма, якая здаўна існавала ў Старажытнарускай дзяржаве, ар-ганічна злілася з ваеннай структурай арганізацыі абароны краю ў Літве[14].

Пераважная большасць феадалаў княства ўва-ходзіла ў склад вайскова-служылага саслоўя, быт якога быў цесна звязаны з войнамі і ваеннымі пахо-дамі. Так як армія ў сярэднія вякі з'яўлялася самым важным інструментам дзяржавы і на яе абапіраліся вялікія князі літоўскія ў сваёй знешняй і ўнутранай палітыцы, за службу прадстаўнікі ваеннага саслоўя шчодра ўзнагароджваліся зямельнымі надзеламі ў асабістае ці спадчыннае карыстанне, шляхецкімі гербамі і іншымі прывілеямі.

Асновай узбраення армій са старажытных часоў да вынаходніцтва пораху і агнястрэльнай зброі была зброя рукапашнага бою. Яна падзялялася на ўдар-ную (меч, корд, шабля, кісцень (цэп), баявая сяке-ра, абух, надзяк, кап'ё, нож і інш.) і кідальную (лук, арбалет, суліца (дроцік).

Вынаходніцтва пораху дало пачатак агнястрэль-най зброі, якая зрабіла пераварот у ваеннай справе: змянілася арганізацыя войск, ваеннае майстэрства, зніклі ўстарэлыя віды зброі.

У канцы XIV ст. з'явіўся новы тып зброі — гар-маты. Сярод іншых археалагічных знаходак гэтага перыяду ў культурным слоі раскопаў беларускіх зам-каў і гарадоў сустракаюцца каменныя гарматныя ядры розных памераў. Ручная зброя ў гэты час да-паўняецца арбалетам, бранябойныя стрэлы якога маглі прабіць металічныя даспехі ворага[15].

Пастаянная пагроза з боку крыжацкіх ордэнаў вымагала вялікіх князёў літоўскіх прыкладаць мак-сімальныя намаганні для арганізацыі абароны дзяр-жавы і паходаў углыб рыцарскіх земляў у адказ на іх напады.

Узброеныя кантакты з крыжакамі садзейнічалі пашырэнню рыцарскай культуры ў Вялікім княстве Л ітоўскім. Уплыў традыцый еўрапейскага рыцарства на ваенную арганізацыю Вялікага княства Літоў-скага ўпершыню афіцыйна занатаваны ў грамаце Уладзіслава Ягайлы ад 20 лютага 1387 г., дзе гаво-рыцца пра «рыцараў і баяр»[16]. Прычысленым да слу-жыла-рыцарскага саслоўя мог быць толькі той, хто за свае сродкі ці з дапамогаю гаспадара мог забяспе-чыць сябе зброяй, даспехамі і добрым канём[17].



**Меч вялікага князя літоўскага Жыгімонта І Старога. Каля 1526 г.**



**Двухручны («пламянеючы») меч 2-ая палавіна XVI ст.**



**Меч каралевіча Уладзіслава Жыгімонта. Каля сярэдзіны XVI ст.**



**Тыпы дзяржанняў мячоў**

Вялікі князь літоўскі Вітаўт пастанавіў, што кожны баярын быў абавязаны з'яўляцца на службу толькі конна[18].

Згодна з нямецкімі дакументамі XIV—XV стст., беларуска-літоўскае войска складалася з баяр (нобіляў), людзей асабіста вольных, слуг (кнехтаў), сялян-смердаў і адпушчанікаў (адпушчаных на волю рабоў). Абавязкі па абароне гарадскіх умацаванняў ускладалісянамяшчан.Сотнікі,дзесятнікі,якпрадстаўнікі гарадской улады і ваеннай арганізацыі мяшчан, упамінаюцца ў гістарычных крыніцах XIV—XVI стст. у Віцебску, Магілёве, Гродне, Барысаве, Оршы і іншых гарадах Беларусі".

У інвентары горада Магілёва за 1604 г. пералічваецца пятнаццаць «соцень», выступаючых падатковай і адначасова вайсковай сістэмай падзелу мяшчан[20].

Гістарычнае развіццё баявога ахоўнага касцюма ішло ад кальчужнага і дробнапласцінчатага даспеха да пласцінавага і цэльнакаванага, калі з аднаго кавалка метала выкоўваліся вялікія асобныя часткі даспеха.

Найбольш старажытным баявым даспехам была кальчуга з шаломам, якія ў XII—XIII стст. адпавядалі ўсім патрабаванням вайны. Затым атрымаў пашырэнне «бехцер» (бехцярэц) — даспех са стальных, жалезных або медных гарызантальных пласцінак, злучаных кольцамі ў доўгія вертыкальныя рады спераду і ззаду, часта з разрэзамі па баках і на плячах. Перад і зад бехцера злучаліся пры дапамозе раменьчыкаў і спражак. Акрамя «бехцера» да пласцінчатых даспехаў адносіліся «лямелярныя», якія складаліся з вертыкальна размешчаных пласцінак, набраных у шырокія палосы, а таксама «зярцала». Аснову «зярцал» складалі дзве буйныя пласціны, адна з якіх прыкрывала грудзі, а другая спіну. Да гэтых пласцін на баках і плячах кальчужнымі перамычкамі або раменьчыкамі мацаваліся пласцінкі меншага памеру[21].

З цягам часу пласціны даспехаў станавіліся ўсё больш буйнымі, пакуль не былі заменены цэльнакаваным нагрудным даспехам — кірасай[22].

Першапачаткова буйныя металічныя пласціны нагрудніка і наспінніка кірасы прышываліся з унутранага боку да скуры або моцнай тканіны, і такі даспех называўся «крытай кірасай», але паступова скуранoе і тканіннае пакрыццё выйшла з ужытку і саступіла месца паліраванаму «беламу» металічнаму даспеху[23].

Разам з тым кальчуга, якая была эластычнай і дастаткова трывалай супраць тагачаснай зброі, заставалася адным зсамых папулярныхтыпаўдаспеха да сярэдзіны XVII ст. На тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага кальчуга называлася «панцырам» і выкарыстоўвалася поруч з пласцінкавым даспехам з кірасай («зброяй бляхавай», «зброяй дошатой») і пласцінчатымі даспехамі («бехцерамі», «зярцаламі»).

У камплекце баявога касцюма панцыры, зброі бляхавыя, бехцеры і зярцала дапаўняліся сродкамі аховы галавы і канечнасцей. Для абароны галавы ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV — сярэдзіне XVII ст. ужываліся розныя формы і канструкцыі ваенныя нагалоўі. На змену самым старажытным відам шлемаў — шаломам, у XIV—XV стст. на землях княства шырока распаўсюдзіўся заходнееўрапейскі шлем-прылбіца з рухомай заслонай твару, якая магла адхіляцца і адшчапляцца[24]. Існавала некалькі тыпаў прылбіц: з выцягнутай уперад тваравай заслонай (прылбіца «псіная пыса»); «армэ» («армэт») з паўкруглымі тваравымі пласцінамі («шчокамі»); з су-



**Арбалвт.** XIV ст.
Рэканструкцыя М. А. Фамічова


Баявыя сякеры


Бехцер.
Рэч Паспалітая.
1580 г.


Зярцала маскоўскія.
1616 г.

цэльнай тваравай заслонам на лобнай завесе, забяспечанай шчылінай для абзору («візурай») і адтулінамі для дыхания і інш.

Вялікай папулярнасцю карысталіся і ўсходняга паходжання шлемы-місюркі, якія шляхта дабывала ў ваенных сутычках з татарамі, а часткова купляла ў мясцовых майстроў, вырабляўшых іх па ўсходняму ўзору. Місюрка складалася з выпуклай круглай пласціны, якая нагадвала перавёрнутую дагары дном міску, да яе ззаду і бакоў мацавалася кальчужная барміца, аберагаючая шчокі і патыліцу.

У вопісах ваеннага рыштунку шляхты ў XVI ст. згадваюцца і заходнееўрапейскія шлемы-капаліны, якія былі падобнымі да металічнага капелюша: «зброя дощатая зъ наручы и зъ капалиномъ, сагайдаки три зъ луки...» (1540 г.)[25].

На землях княства ў гэты перыяд быў вядомы, але не атрымаў шырокага распаўсюджання яшчэ адзін від заходнееўрапейскіх шлемаў таго часу — штурмгаб. Штурмгаб меў нагалоўнік, паходзячы на глыбокі круглы каптур з выцягнутай на патыліцы ніжняй часткай для абароны шыі, рухомыя на завесах «шчокі» і брылёк спераду, часам з рухомым наноснікам.

У другой палавіне XVI — пачатку XVII ст. вялікую папулярнасць у княстве набывае шышак — шлем, вельмі падобны да штурмгаба, але не закрываўшы твар воіна. Шышак складаўся са звона, да якога спераду наглуха мацаваўся брылёк з рухомым наноснікам, з бакоў пласціны («шчокі»), а ззаду напатылачнік. Шышакі і прылбіцы складалі найбольш пашыраныя на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага тыпы шлемаў. Яны найбольш часта і пастаянна ўзгадваюцца ў актавых матэрыялах на працягу XVI — пачатку XVII ст.

У карціне невядомага мастака «Бітва пад Оршаю» (1520-ыя гг.) упершыню ў беларускім мастацтве на дэталёва выпісанай мастаком панараме бітвы перад гледачом «у бляску варанёных латаў, што ад макаўкі да пятаў пакрывалі постаці воінаў, а таксама іх верных коней... з'явіўся вобраз рыцара ў найбольш звыклым уяўленні пра яго знешні выгляд як прадстаўніка пэўнай сацыяльнай групы»[26].

Якасць абарончага адзення і зброі рыцара-шляхціца сведчыла пра яго маёмасны і сацыяльны статус, гарантавала поспех у баі з крыжакамі, арміямі іншых еўрапейскіх дзяржаў, татарамі і туркамі. У шляхецкіх сядзібах назапашвалася і захоўвалася вялікая колькасць засцерагальнага баявога адзення і зброі, якія былі куплены або здабыты ў баях як ваенныя трафеі.

У вопісе маёмасці зямянкі Слонімскага павета Зофеі Янаўны Віктарынавай у 1565 г. упамінаюцца «зброи бляховой не зуполне (не ў поўным камплекце. — *Аўт.)* осмъ, а девятая зуполная, панцеровъ семъ, а бехтеръ осмый, шишакъ одинъ, прилбица

одна, рукавнць панцеровыхь (кальчужных. — *Аўт.)* зь замшемь парь чотырнасте, кгротковь до древець дветнасте, тарчей (шчытоў. — *Аўт.)* семьнасте, ошеповьосмь...»[27].

Часткі даспеха, прызначаныя для аховы ног, у актавых матэрыялах XVI ст. фіксуюцца пад тэрмінам «накаленкі». Для аховы рук выкарыстоўваліся наручы, зарукаўі, рукавіцы. Тэрмін «зарукаўі» часцей за ўсё абазначаў кальчужныя рукавы, а наручы рабіліся ў выглядзе вялікай пласціны, прызначанай для абароны прадплечча і локця[28].

Пасля смерці ў 1599 г. харужага Марціна Падпябэзскага з Віленскага ваяводства застаўся яго ваенны «спрат» (рыштунак): «Бехцерь однпь, который коштоваль (сь) шпшакомь копь трпдцать, панцеровь семь (сь) шпшакамп... збрй трп белые бляховые (сь) шпшакамп п зь наколенкамп п зь рукавпцамп, зарукавьемь панцеровымь, коштовало по копь десеть...»[29]

Усе элементы даспехаў багата ўпрыгожваліся. Так, адзін шлем-шышак шляхціца Копцева з Берасцейскага ваяводства быў «серабромь оправленый, увесь позлотнстый (сь) шкофіею (султанам з пер'яў. — *Аўт.)*... другій дей шпшакь, также серебромь оправлень, позлотнстый, (сь) шкофіею...» (1577 г.)[30].



Кальчужны панцыр. Маскоуская дзяржава. Сярэдзіна XVI ст.



Рыцарскі шлем-«армэ». Заходняя Еўропа. Пачатак XVI ст.



Кірасірскі шлем з зачыненай тваравай заслонай. Германія. 1620—1630 гг.

Асаблівым багаццем і адмысловым упрыгажэннем вылучаліся даспехі магнатаў. Так, на гравюры Д. Кусто ў «Кнізе знакамітых воінаў», выдадзенай па заказу аўстрыйскага эрцгерцага Фердынанда ў 1601 г., Мікалай Крыштаф Радзівіл (Сіротка) паказаны ў паўдаспеху, на чыстым металічным фоне якога пратраўлены ўзоры, фарбаваныя ў белы і чырвоны колеры, месцамі пазалочаныя. Дзякуючы гэтаму латы набылі багаты стракаты выгляд, як быццам яны былі не жалезныя, а з нейкага мяккага матэрыялу[31].

Спалучэнне начышчанага бліскучага металу даспеха з залачэннем, чарненнем, рознакаляровай афарбоўкай, нанесенага на латы ўзору ў комплексе з яркімі плашчамі, пышнымі султанамі са страусавых пер'яў, было разлічана на тое, каб уразіць праціўніка багаццем і спужаць яго[32].

Поўны даспех закрываў усё цела воіна з галавы да пальцаў ног. У такім даспеху адлюстраваны на пасмертным партрэце тыпу «пото тііііапз» невядомага мастака другой палавіны XVI ст. Юры Радзівіл «Геркулес літоўскі» (1480—1541), бацька каралевы Барбары Радзівіл, другой жонкі Жыгімонта Аўгуста. На палях бітваў супраць татар, крыжакоў і рускіх ваявод ён атрымаў больш за 30 перамог і быў папулярным сярод нашчадкаў.

Даспех Юрыя Радзівіла выкананы з бліскучага чорнага металу з аздобленымі арнаментаванымі залачонымі паскамі, наплечнікамі, налакотнікамі і накаленнікамі. Краі набедраніка і латных рукавіц з пальцамі таксама ўпрыгожаны залачонай, арнаментаванай паскай. Пазалочаная паласа пасярэдзіне фудзіны як бы ўтварае засцежку кірасы з выцягнутай нэнтральнай часткай у своеасаблівае завостранне — «тапуль» (ад італ. іарро — бугор), якое спрыяла рэкашэтаванню ўдараў зброі праціўніка. Левай рукой Радзівіл трымае меч з залатым дзяржаннем і крыжавінай, а правай абапіраецца на стол, пакрыты чырвоным аксамітным абрусам. На стале ляжыць шлем-прылбіца «армэ» з залачоным адкрытым забралам і пратраўленым на чорным метале залатым узорам. Да прылбіцы прымацаваны пышны султан са страусавых пер'яў. Побач са шлемам ляжыць гетманская булава — сімвал вышэйшай ваеннай улады. Цераз правае плячо перавешаны масіўны залаты ланцуг. Верагодна, гэты даспех быў выраблены для Юрыя Радзівіла яго славутым аўгсбургскім даспешнікам Кольманам Гельмшмітам каля 1530 г. Ён прадугледжваў максімальна поўную абарону ўсяго цела і прызначаўся для пешага паядынку.

У другой палавіне XVI ст. тапуль у даспехах апускаецца ўніз і ў 1570-ыя гг. набывае форму абвіслай гусінай гузкі[33]. Такога тыпу нагруднік паўдаспеха мы бачым на «Партрэце невядомага ў латах» невядомага мастака канца XVI ст. Парадны паўдаспех прадстаўніка ваенна-рыцарскага саслоўя на гэтым парт-



Шлем-місюрка з кальчужнай барміцай

рэце ўпрыгожаны палосамі пазалочанага арнамен-ту. Пад шыяй на чорную паддаспехавую кашулю вылажаны каўнерык сподняй белай кашулі, а кан-цы яе рукавоў заложаны на запясці на наручы паў-даспеха.

Асноўную ролю ў арміі Вялікага княства Літоў-скага і Польшчы ў XV—XVII стст. адыгрывала кава-лерыя, якая, у залежнасці ад характару наступаль-нага ўзбраення дзялілася на цяжкаўзброеную, за-бяспечаную моцнымі коньмі і дрэўкавай зброяй — коп'ямі, і лёгкую, стрэльчую. Задачай цяжкай кава-лерыі было праломванне коп'ямі непрыяцельскіх шарэнгаў, таму вершнікі выступалі ў максімальна поўным засцерагальным адзенні: пласцінавым бая-вым даспеху («зброі бляхавай»), у складзе якога ахо-ва тулава выступала ў комплексе з аховай галавы і канечнасцяў. Аснову гэтага даспеха складала жорст-кая кіраса — цэльнакаваны або нерухома злучаны з некалькіх частак нагруднік з наспіннікам. Знізуда кірасы мацавалася металічная спаднічка, набра-ная з абручападобных пласцін, якая прыкрывала ніжнюю частку жывата і часткова сцёгны. Ахова ног складалася з набедранікаў, накаленкаў, нагалёнач-нікаў і металічных чаравікаў. Поўную ахову рук за-бяспечвалі наплечнікі, верхнія трубы, налакотнікі і ніжнія трубы, якія прыкрывалі рукі ад локцяў да кісцяў, а таксама металічныя рукавіцы, як правіла, з раздзельнымі пальцамі[34].



**Даспех Мікалая Радзівіла Чорнага** ў камплекце з адкрытым штурмгабам. Германія. Каля 1550 г.

Ззаду размяшчалася лёгкая кавалерыя, асноўны баявы рыштунак якой складала стралковая зброя — лук альбо арбалет. З левага боку вершніка мацава-лася яшчэ крывая шабля, а з правага — рагаціна даўжынёй у чатыры локці (локаць — 0,649 м) і арба-лет або лук з калчанам («сагайдак»).

У актавых дакументах XVI — першай палавіны XVII ст. тэрмін «сагайдак» звычайна азначае кал-чан, лук і ўвесь прыбор да яго: «сагайдаковь зо вснмь трн...» (1593 г.)[35]. Шляхціц Герман Свіндрынскі з Бе-расцейскага староства ў 1577 г. меў «сагайдакь зь лу-комь, зьстреламн, сьтетнвьемьмешнновымь» (ску-раным)...[36].

Каморнік Іванка Валынец у 1533 г. у сваёй заяве ў Полацкі фодскі суд скардзіўся, што людзі з вёскі Учанаўка знялі з яго сукню, сагайдак, шаблю і ўзялі два сядлы і епанчу[37].

Слуга гараднічага Слонімскага замка ў 1559 г. звёз шмат рэчаў гаспадара, сярод якіх былі «сагайдакь



**Шышак**



**Шышак венгерскага тыпу Мікалая Радзівіла Чорнага.**
Паўднёвая Германія. 1561 г.



**Паўдаспех Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі.**
Гравюра Д. Кусто з кнігі «Кнігі знакамітых воінаў». 1601 г.

новый з лукомь н зь стреламл... лукь новый роботы нмстнславское»[38]. Таму і лучніка ў Вялікім княстве Літоўскім называлі «сагайдачнікам»[39]. Калчан рабілі са скуры і ўпрыгожвалі вышыўкай, цісненнем або арнаментаванымі сярэбранымі ці пазалочанымі бляшкамі. Лёгкая конніца распачынала бітву, ведучы стральбу паверх галоў цяжкай кавалерыі, якая пад прыкрыццём лучнікаў коп'ямі і пікамі ламала непрыяцельскі строй. Пасля гэтага бітва распадалася на асобныя паядынкі з прымяненнем зброі блізкага бою[40].

У XV ст. з'яўляецца куша — прыстасаванне для арбалета для нацягвання і спускання цецівы. Пяхота Польшчы і Вялікага княства Літоўскага карысталася кушамі яшчэ ў другой палавіне XVI ст. Страла з кушы ляцела далей, біла мацней і болын цэльна, чым з лука, але патрабавала больш часу для падрыхтоўкі стрэлу. Калі кушнікі ставіліся перад непрыяцельскімі лучнікамі, то разбівалі іх[41]. Куша, як адзін з відаў узбраення, называецца ў Статуце Вялікага княства Літоўскага 1566 г. (Раздзел 4, арт. 38).

У адрозненне ад Заходняй Еўропы, дзе лук са стрэламі выйшаў з ужытку ў канцы XV ст., у Вялікім княстве Літоўскім гэта зброя выкарыстоўвалася яшчэ ў XVI — першай палавіне XVII ст.

Паўдаспех вершніка лёгкай кавалерыі складаўся з металічнага пласцінчатага панцыра або кальчугі, а галаву засцерагаў жалезны шышак, прылбіца або арыенталізаваны, запазычаны ў татар шлем-місюрка. Адметнасцю баявога касцюма лёгкай кавалерыі была адсутнасць абарончага пакрыцця ног, а часам і рук[42].

Пяхоце адводзілася другарадная роля. У залежнасці ад узбраення яна падзялялася на дзве катэгорыі: павезнікаў (узброеных вялікімі шчытамі-павезамі) і стральцоў з арбалетамі, замененымі ў 1520-ых гг. ручніцамі (кароткімі ружжамі. — *Аўт.)*[43].

Асноўнай формай арганізацыі ўзброеных сіл Вялікага княства Літоўскага з XV ст. становіцца шляхецка-рыцарскае апалчэнне — паспалітае рушэнне, якое збіралася вялікім князем у час вайны і ў якое землеўладальнікі выстаўлялі ўзброеных воінаў. Каралеўская Устава ад 1 мая 1528 г. аб абароне земскай абавязвала шляхту Вялікага княства Літоўскага «кь службе земской завжды поготову бытн» і «сь кождыхь осмн службомь людей ставнтн пахолка, надобромьконн, возброн, зьдревомьсьпрапоромь, на которомь бы быль панцерь, прылбнца, мечь або кордь, сукня цветная, павеза н острогн две»[44]. Такі ж камплект узбраення шляхецкіх апалчэнняў прадпісваў і Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г.

Атрады кавалерыі называліся харугвамі, бо кожная конная харугва мела свой асабісты сцяг (харугву). Харугвы былі каралеўскія, павятовыя і надворныя магнацкія, так як магнаты павінны былі сваім



**Поўны баявы даспех.**
Партрэт Юрыя Радзівіла.
Невядомы мастак.
2-ая палавіна XVI ст.



Поўны баявы даспех. Заходняя Еўропа. XVI ст.

коштам утрымліваць вайсковыя атрады, з каторымі ў час вайны павінны былі ісці на абарону краіны.

Статут 1566 г. і ўстава Гродзенскага сейма 1567 г. вызначалі парадак фарміравання атрадаў паспалі-тага рушэння паводле тэрытарыяльнага прынцыпу. Шляхта збіралася ў паход у цэнтры свайго павета, дзе праводзіўся яе попіс (рэгістрацыя і падлік) і кам-плектаванне ў харугву. Харугву ўзначальвалі павя-товы маршалак, харунжы і войскі. Паспалітае ру-шэнне цэнтральных паветаў ваяводстваў выступала на чале з ваяводам, кашталянам і харунжым. Зем-леўладальнікам, якія мелі маёнткі ў розных паве-тах, дастаткова было «папісацца» са сваімі «пахол-камі» (салдатамі) у адным.

Трэці Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. у раздзеле II (арт. I) «Аб земскай абароне» абавязваў усіх шляхціцаў, якія дасягнулі паўналецця, несці ваенную службу і прымаць удзел у паспалітым ру-шэнні ў час вайны або выстаўляць за сябе ці ад ма-ёнткаў узброеных ратнікаў. У тых, хто ўхіляўся ад воінскага абавязку ці пакідаў без дазволу месца збо-ру паспалітага рушэння, адбіралі ўсю маёмасць на карысць дзяржавы і вялікага князя. А збегшых з поля бітвы абвяшчалі страціўшымі гонар і канфіскавалі маёмасць.

Драбнейшай арганізацыйна-тактычнай адзінкай арміі Вялікага княства Літоўскага і Польшчы з'яў-ляўся «почт» («почат»). Конны почат складаўся з рыцара-шляхціца («таварыша»), які прыводзіў з са-бой у час паспалітага рушэння (у залежнасці ад свай-го матэрыяльнага стану) аднаго ці некалькіх слуг («пахолкаў») і забяспечваў іх канямі і ўзбраеннем. Апроч пахолкаў-салдат у склад початаў маглі ўва-ходзіць так званыя «пахаляты». Пахалят зброяй не забяспечвалі. Яны павінны былі трымаць запаснога каня для «таварыша» і аказваць іншыя гаспадарчыя паслугі[45].

Таварышы са сваімі початамі ўваходзілі ў якасці малодшых афіцэраў у склад рот, якія ўзначальвалі ротмістры. Структура польскіх і літоўскіх рот сфар-міравалася ў канцы XV — пачатку XVI ст. і праісна-вала да канца існавання Рэчы Паспалітай[46].

Развіццё стратэгіі і тактыкі вядзення ваенных дзеянняў патрабавала пераходу ад арміі, дзе кожны коннік прадстаўляў сабою самастойную баявую адзінку, да зладжаных дзеянняў вялікіх вайсковых падраздзяленняў, якія б характарызаваліся высокай дысцыплінай і адзінствам дзеянняў. З гэтай мэтай кароль Стафан Баторый, які раней быў князем Трансільваніі, распачаў у канцы XVI ст. ваенныя рэформы па рэгламентацыі асобных родаў войск і іх узбраення на аснове вопыта ваеннай арганізацыі ў Венгрыі. Гэтыя рэформы былі завершаны ў пер-шай палавіне XVII ст. Уладзіславам IV. Былі ство-раны харугвы цяжкай, сярэдняй і лёгкай кавалерыі. Цяжкая кавалерыя (гусары, рэйтары, аркебузеры)



КІраса ад гусарскага даспеха. Рэч Паспалітая. XVII ст.



**Воін гусарскай харугвы.** Паводле старажытнай гравюры

мела засцерагальнае адзенне, якое складалася з паў-даспеха або кірасы і шлема.

У паўдаспех, падобны да тых, што былі ва ўжыт-ку рэйтараў (ад ням. Кеііег — коннік), апрануты Мікалай Радзівіл Руды на гравюры Д. Кусто з «Кнігі знакамітых воінаў». Чорная кіраса Мікалая Рудага з вялікімі наплечнікамі не мае арнаментыкі. Дас-пех заканчваецца поясам для прымацавання набед-раніка. Злева ля ног адлюстраваны шышак з вы-сокім навершшам і латныя рукавіцы[47]. Асноўнай наступальнай зброяй рэйтараў і аркебузераў былі пісталеты ці аркебуза.

Харугвы гусар былі ўзброены доўгімі коп'ямі з двухколернымі шаўковымі сцяжкамі (прапарцамі) на канцы, якія не дазвалялі кап'ю засесці ў целе ворага. З левага боку мацавалася крывая шабля і з таго ж боку пад каленам да сядла падвешваўся кон-чар (кароткі меч), каб дабіваць упаўшага на зямлю ворага, а таксама клявец, абух або чакан для раз-бівання непрыяцельскай брані[48].

Гусары насілі жалезны паўдаспех, які меў рысы як еўрапейскага, так і ўсходняга ахоўнага адзення. У яго ўваходзілі кіраса і шлемы розных тыпаў, зару-каўе ўсходнягатыпу. Часам паўдаспех гусар меўсво-еасаблівае дэкаратыўнае аздабленне ў выглядзе ла-тунных накладак і разетак фігурнай формы («пад Усход») з простым чаканным арнаментам. Паверх паўдаспеха гусары насілі звярыную шкуру[49].

Экіпіроўка гусар у канцы XVI ст. дапоўнілася «крыламі», адным або двума пісталетамі, а злева пад нагой замест кончара стала мацавацца рапіра. Шлем гусара і галаву яго каня ўпрыгожвалі кіты з пер'я. Коннікі некаторых гусарскіх харугваў мелі крылы з пер'яў, апраўленыя ў серабро ці дрэва, якія мацава-ліся ззаду на плячах, да панцыра, у другіх харугвах крылы мацаваліся ззадудасядла. Цяжка вызначыць, наколькі крылы дапамагалі ў бітве. Хутчэй за ўсё яны былі разлічаны на знешні эфект. Калі лавіна крылатых гусар імчала ў бой, відовішча павінна было моцна ўражваць: магутныя коні ўбагатай збруі, бліскучыя даспехі і шлемы, узнятыя за плячамі, апраўленыя ў серабро белыя крылы, якія разам з доўгімі каляровымі прапарцамі на коп'ях пры ата-

**Воіны гусарскай харугвы.** Паводле старажытнай





**Баявы даспех** караля Рэчы Паспалітай і вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Стафана Баторыя.
**Гусарскі даспех** — Прага або Нюрнберг, каля 1560 г.; **шлем-шышак** — Турцыя, каля 1550 г.

цы рабілі вялікі шэлест, пужаючы непрыяцеля і яго коней.

На кані гусар павінен быў мець багаты «рад» (збрую) і пакрыцце з рысінай ці воўчай шкуры або з дарагой тканіны, якое багатыя ўпрыгожвалі каштоўнымі камянямі. «Рад» уключаў аброць з цуглямі, раменны нагаловак і павады, а таксама сядло з падкладзеным пад яго чапраком альбо потнікам, страмёнамі, папругай, груднымі і пахвіннымі рамянямі[50]. На галаве каня мацавалася кіта са страусавых або чапліных пер'яў, а пад шыяй — чорны валасяны бунчук у аправе, аздобленай залатой або сярэбранай сеткай[51].

Нямецкі падарожнік Самуэль Кіхель, які назіраў у 1586 г. у Гродне выезд караля Стафана Баторыя з замка ў храм, адзначаў, што ў гусар і гайдукоў Баторыя «шмат прыгожых, далікатных і элегантных коней з дарагім рыштункам і ўпрыгожаннямі. Палякі трацяць на гэта вялікія кошты»[52].

Багацце адзення, конскай збруі і зброі шляхты, якая суправаджала выезд польскай каралевы ў Гданьск у 1646 г., уразіла і французскага падарожніка дэ Лабурэра: «... коні былі пакрыты рознакаляровымі аксамітнымі папонамі, расшытымі золатам і серабром, амаль ва ўсіх цуглі былі з чыстага золата, а іншыя з пазалочанага серабра і скрозь упрыгожаны ўсялякімі каштоўнасцямі. Да сядзельнай лукі быў прытарочан вялікі меч, у золаце або пазалочаным серабрэ, упрыгожаны ўсяляка перламі, або брыльянтамі, рубінамі, бірузой, ізумрудамі або іншымі каштоўнымі камянямі. Таксама і шаблі, якія носяць на баку. Калчаны ў тых, хто карыстаўся стрэламі, былі абцягнуты шчыгрынам, вуглы і сярэдзіна ўпрыгожаны залатой і сярэбранай вышыўкай. Амаль ва ўсіх былі гузікі ювелірнай работы, залатыя, усаджаныя каштоўнымі камянямі...»[53]

Сярэдняя кавалерыя («панцырная») у якасці баявога касцюма мела кальчужныя панцыры ў камплекце з шлемамі-місюркамі. Узбраенне гэтага віду конніцы складалася з круглай тарчы (шчыта), шаблі, пісталетаў або ручніцы, часам рагаціны і лука.

Лёгкая кавалерыя складалася з татарскіх харугваў і лісаўчукоў, якія не мелі засцерагальнага баявога касцюма. Татарская конніца шырока выкарыстоўвалася ў войску Вялікага княства Літоўскага з канца XIV — пачатку XV ст. Асноўнае ўзбраенне татар складалася з лука, крывой шаблі, абухова-ўдарнай зброі, аркана, часам рагаціны ці ошчапа.

Заснавальнікам кавалерыйскага корпуса «лісаўчукоў» у пачатку XVII ст. быў А. Лісоўскі. Яго конніца выступала на лёгкіх і лоўкіх конях, на кароткіх сёдлах. Узброены яны былі крывою шабляй, лукам альбо ручніцай за плячыма, рагацінай[54]. Па сведчанню аднаго з мемуарыстаў XVII ст., Лісоўскі апранаўся ў высокую шапку, плашч з шырокім каўня-



Каралеўскі харунжы. Мастак Е. Брант. 1890 г.



**Баявы даспех і рыштунак «таварыша»** (маладога афіцэра) панцырнай харугвы. «Таварыш панцырны» Мастак Е. Брант. Каля 1890 г.



**Гусар Рэчы Паспалітай.** «Гусар». Мастак Е. Брант. 1890 г.



**Кончар**

ром, вузкі align="left"рознакаляровы касцюм, жоўтыя, добра падкаваныя боты[55].

У войску Вялікага княства Літоўскага служылі наёмныя атрады ўкраінскіх казакоў, якія выкарыстоўваліся ў якасці лёгкай кавалерыі. Паступова казакамі сталі называць і атрады з мясцовай шляхты, узброеныя па ўзору казацкіх. Казакі мелі панцыры, прылбіцы ці шышакі, сагайдакі, рагаціны і шаблі, а ў некаторых былі яшчэ і сякеркі[56].

Казакоў вербавалі на ўсёй тэрыторыі княства пераважна з дробнай шляхты. З 1667 г. у вайсковых рэгістрах Рэчы Паспалітай сваіх казакоў сталі называць «панцырнымі». Гусары і панцырныя набіраліся шляхам вярбоўкі шляхты-добраахвотнікаў, якія з'яўляліся на службу з паштовым-нешляхціцам, разам з канём, узбраеннем і адзеннем. Тарарышы-шляхціцы падзяляліся на «прытомных» — хто служыў у войску, і «савітых», якія заставаліся ў сваіх фальварках, а замест сябе выстаўлялі ў войска двух паштовых (шэраговых), узброеных і апранутых за ўласны кошт[57].

Пры Стафане Баторыі былі створаны і атрады венгерскай пяхоты, якія складаліся не толькі з венграў. У іх вербаваліся і мясцовыя жыхары. На ўзбраенні гэтых атрадаў былі ручніцы, сякеркі і шаблі, у адрозненне ад еўрапейскай пяхоты, якая была ўзброена ў асноўным толькі пікамі[58].

Са з'яўленнем агнястрэльнай зброі ў арміі змяніліся патрабаванні да каня, вершніка і іх рыштунку. Конніца ў XVI—XVII стст. зрабілася больш лёгкай, хуткай і манеўранай. Пачалі цаніцца коні з усходніх краін — турэцкія, арабскія, персідскія, мадзьярскія.

У XVI ст. у Рэчы Паспалітай сфарміраваўся тып каня, які дамінаваў у Вялікім княстве Літоўскім на працягу некалькіх стагоддзяў і называўся «Ецщц$ Роіопісцх». Яму была ўласціва стракатасць, плямістасць, калі на фоне асноўнай (вараной, гнядой і г. д.) масці нераўнамерна ляжалі буйныя белыя плямы няправільнай формы. Гэта была невысокая жывёліна з шырокай спінай, высокім выгібам шыі, доўгай патыліцай, невялікай галавой, дужымі, добраакрэсленымі нагамі. Буйныя цэнтры вырошчвання такіх баявых коней знаходзіліся ў Малапольшчы, Вялікапольшчы, на Падляшшы і Украіне. Статкі з выдатнымі арабскімі вытворнікамі мелі Радзівілы[59].

Шляхціцы ганарыліся айчыннымі верхавымі коньмі, якія былі для іх надзейнымі, кемлівымі і паслухмянымі таварышамі, смелымі саўдзельнікамі



**Паўдаспех Мікалая Рудага Радзівіла.**
Гравюра Д. Кусто з «Кнігі знакамітых воінаў». 1601 г.

ў баявых сутычках і войнах, самаахвярнымі выратавальнікамі ў крытычных сітуацыях[60].

Шляхціц карыстаўся павагай толькі тады, калі меў добрага, у багатай збруі каня. Таму вершнікі і коні Рэчы Паспалітай сваім выглядам і пышным убраннем рэзка вылучаліся сярод конніц еўрапейскіх дзяржаў. Конскае ўбранне было настолькі дарагім, што згадвалася ў спісах маёмасці магнатаў і шляхты поруч з пералікам найбольш каштоўных рэчаў.

У актавых матэрыялах XVI—XVII стст. маецца шмат апісанняў шляхецкай зброі гэтага перыяду, а таксама конскай збруі і ўпрыгожанняў. Сярод рэчаў, якія былі ўкрадзены ў гараднічага Слонімскага замка ў 1559 г., упамінаецца «седло ерчакъ работы татарское зо всимъ рядомъ... узды две ременю лосиного съ кольцы... узденица одна, шабля одна...»[61].

У судовай справе 1617 г. Ашмянскага гродскага суда аб наездзе на памесце Вавёркі Ашмянскага павета, якое належала шляхціцу Ракіцкаму, указвалася, што разам з вопраткай і іншымі каштоўнымі



Баявы касцюм І рыштунак гусара Рэчы Паспалітай «Гусарыя польская». Мастак А. Арлоўскі



Даспех гусара э крыламі і шкурай леапарда Рэч Паспалітая, 2-ая палавіна XVII ст.

рэчамі ў яго забралі «рядъ серебряный гусарский зъ галзбантемъ[62] злотистимъ шматльцованымъ[61], вод-зы до него ланцушные серебреные злотистые... стрымена серебреные также злотистые и седло само, аксамитомъ чырвонымъ крытое; што всё коштовало шести соть золотыхъ польскихъ; шаблю оправную злотистую, чекань также оправный злотистый, коштовали злотыхъ сто польскихъ... седелъ гусарскихъ шесть... наметь военный, который коштовалъ



**Баявы** даспех **і** ўзбраенне вершніка **панцырнай харугвы: кальчуга, шлем-місюрка, пояс, надзяк. шабля.**
Рэч Паспалітая. 2-ая палавіна XVII ст.



**Лісаўчук.** Малюнак Рэмбранта. 1636 г.

копъ осми грошей; шоръ одинъ увесь на пошосные кони, который коштовалъ десеть копъ грошей; другий шоръ на почворные кони...»[64].

Каралеўская і велікакняжацкая ўлада прадпісвала толькі, з якіх відаў зброі павінен быў складацца комплекс узбраення тых ці іншых харугваў. Кожны коннік набываў прадпісаную яму зброю ў майстроў у адпаведнасці са сваімі матэрыяльнымі магчымасцямі, або гэта была зброя, здабытая ім у якасці трафеяў у час ваенных дзеянняў. Таму ўзбраенне кожнага воіна было індывідуальным і яўляла сабой спалучэнне прадметаў рознага паходжання, што надавала надзвычайную стракатасць вайсковаму ўзбраенню.

У сваіх маёнтках шляхціцы захоўвалі звычайна вялікія наборы зброі на аграмадныя сумы грошай. Ракіцкі, напрыклад, меў «пулгаковъ[65] шесть, которые коштовали золотыхъ польскихъ трыдцать шесть; короткихъ ручницъ пару, коштовали десеть золотыхъ польскихъ, пташую ручницу коштовала золотыхъ польскихъ петнадцати; а мушкеть коштовалъ польскихъ десети, зброй (даспехаў) шесть шмальцованыхъ, а семую полерованую и шышаковъ вся семь полерованыхъ; которые зброй со всимъ коштовали зъ зарукавьемъ до всихъ зброй золотыхъ польскихъ сто, палашовъ шесть...»

У шляхцянкі з Берасцейскага староства ў 1577 г., калі на яе маёнтак напаў узброены сусед са слугамі «зъ гаковницами (доўгае ружжо. — *Аўт.),* зъ ручницами, зъ ощепы (коп'і)...», было паграблена: «Тар-чей две, серебромъ оправленыхъ, позлотистыхъ, на чирвономъ полю... Шабля булатная, серебромъ оправлена, позлотистая, зъ шмалыюмъ (фініфцю. — *Аўт.)* рознымъ... шабля гусарская на ременю, серебромъ оправлена, позлотистая... шабля козацкая, серебромъ оправлена, позлотистая, зъ спасками на чорномъ оксамите... шабель барвяныхъ (узорчатых. — *Аўт.)* серебромъ оправленыхъ на похолки зъ спасками... Кончеръ серебряный позлотистый... остроги гусарские (шпоры. — *Аут.)*[67].

У вопісу маёмасці земяніна Багдана Чэшэйкові-чабыўзафіксаваны «панцеръодинъ, прилбицаодна, рогатинъ защитныхъ две»[68].

Зброю коннікі вазілі ў спецыяльным футарале («ольстры»), які прывязвалі да сядла: «згинула ми была ручница кротка з ольстрэмъ з воза моего»[69]. У памешчыка Рыгора Дохі ў Гродзенскім павеце ў 1617 г. пры аграбленні забралі «пулгакъ зъ ольстрома купленый за золотыхъ осмъ»[70].

Узбраенне пешых воінаў (драбаў) складалася ў XVI—XVII стст. са стрэльбы (ручніцы), рагаціны, бардыша (бардишъ, бердышъ, барда, барта). Бардыш — баявая шырокая сякера з закругленым у форме паўмесяца лязом, насаджаным на доўгае дрэўка: «мелъ две раны, адну, стреляную зъ мушкету, а другую, бардышомъ тятую (1638 г.)[71]», «виделъ есми на Войтеху Свирщовском рану на голове тятую, менилъ, ижъ мне бартою тято (1582 г.)»[72].

На адміністрацыю гарадоў у XVII і XVIII стст. ускладвалася адказнасць за вайсковую вывучку гараджан. З гэтай мэтай у гарадах праз пэўны тэрмін праводзіліся «попісы» жыхароў, здольных прымаць удзел у абароне горада, ваенныя вучэнні («монстры»), стрэльбішчы.

Ваенны рыштунак павінны былі мець і члены гарадскіх рамесных цэхаў на выпадак ваенных дзе-



**Конь польскай пароды.** «Конь польскі». Мастак Я.Э. Рыдынгер. XVIII ст.



**Сядло, дабытае ў баі Мікалаем Іеранімам Сяняўскім пад Венай.** Стамбул, 2-ая палавіна XVII ст.



**Сядло з чапраком і ольстрамі (сумкамі).** Турцыя. XVII ст.



**Баявыя цапы (кісцяні).** XIV—XV стст.

янняў ці аблогі горада непрыяцелем. Са зброяй яны павінны былі сустракаць караля, замежных паслоў, знакамітых рэлігійных дзеячаў пры іх наведванні горада. У статуце цэха саф'яннікаў г. Вільні (1666 г.) абгаворвалася, што цэхавы штандар, бубны, барды, пікі, мушкеты, парахаўніцы, волава, порах і г. д. павінны набывацца з цэхавых прыбыткаў і захоўвацца, за ведамам бурмістраў, «у парадку і бяспецы адь агню ў надзейнымь месцы»[73]. Кожны член цэха павінен быў мець у сябе дома яшчэ асабісты мушкет і шаблю: «кабь у час вайсковага попісу з'яўляўся не зь пазычанымь, але ўласнымь узбраеннемь»[74], а хто не прыходзіў — плаціў штраф у цэхавую казну і, акрамя таго, атрымліваў спагнанне з боку магістрата[75].

У статуце Віленскага аб'яднання шаўцоў (1689 г.) таксама гаварылася, што падмайстры шавецкага рамяства «для пакрашэння места Віленскага з'яўляліся на штогоднюю божацельскую працэсію, на спатканне караля, біскупа і віленскага ваяводы, а таксама на вайсковыя попісы і монстры са стрэльбай і зброяй, якая выдана ад свайго майстра або са сваёй, калі ён яе мае»[76].

Статут купецкага брацтва 1634 г. Магілёва патрабаваў, каб у выпадку сустрэчы пры ўездзе ў горад караля або знакамітага сенатара «усе купцы па ўказанню магістрата павінны выступіць у конным страю, па-гусарскі, са сцягам і барабанам, усе без выключэння, падпагрозайштрафуў Юкоплітоўскіх грошаў...»[77].

Калі ў снежні 1699 г. перад Калядамі Магілёў наведаў епіскап мсціслаўскі, аршанскі і магілеўскі, архімандрыт слуцкі, намеснік кіеўскай мітраполіі і канстанцінопальскага прастола Серапіён Палхоўскі, яго сустракала духавенства з харугвамі, усе чле-



**Дрэўкавая эброя XVI—XIX стст.**



**Колюча-сякучая I сякучая дрэўкавая зброя XVI—XVIII стст.**

ны гарадскога мапстрата, купецкае і мяшчанскае юнацтва верхам у некалькі соцень коней, са сцягамі ў выдатным парадку і убранстве, а таксама ўсе рамесныя цэхі са зброяй і сваімі харугвамі[78].

Міхал Казімір Радзівіл (Рыбанька) у сярэдзіне XVIII ст. пісаў у сваім дыярыюшы (дзённіку), што «месца (горад) з цэхамі прыйшло да замку, запрашаючы мяне на стрэльбішча, і туды паехалі мы; найлепш адстраляў мешчанін Рэутовіч...»[79].

З XVI ст. у арміі Вялікага княства Л ітоўскага з'яўляюцца першыя элементы форменнай армейскай вопраткі. Адна вайсковая адзінка адрознівалася ад іншых колерам адзення, тыпам коней і ўзбраення: «будеть вамъ ознаймено... якіе кони и зброи (даспехі), а барвы (адзенне азначанага колеру. — *Аўт.)* мають бытй...» (1544 г.)[80], «... при тыхъ ездныхъ ставилъ его милость пешихъ драбей[81] 150 въ барве зъ ручницами, зъ рогатинами...» (1567 г.)[82].

Шэраговыя арміі Вялікага княства Літоўскага з пачатку XVII ст. насілі дэліі, курты, даламаны: «даламанъ блакитный фалендышовый» (1616 г.)[83], «делюра зеленая, козками подшитая», «делюра чирвоная, сукномъ подшитая», «курта белая фалендышовая», «курта лазуровая, подшитая въ пасъ атласомъ жолтымъ, кгузиковъ злотистыхъ осмнадцать»[84].

Адзенне вайскоўцаў Вялікага княства Літоўскага ў XVII ст. па сваім крої не адрознівалася ад цывільнага, насіла рысы «сармацкага» касцюма і складалася з прадметаў, характэрных для касцюмнага комплексу ўсяго насельніцтва княства.

Сярод страт, якія панеслі розныя чыны войска Вялікага княства Літоўскага пры абароне Магілёва ад маскоўскіх войск у 1656 г., упамінаецца адзенне сотніка: зіпун кармазінавы з сярэбранымі гузікамі, сукман чорнага колеру з «люндышу» з сярэбранымі пазалочанымі гузікамі, «душегрея» з сярэбранымі гузікамі, шапка кармазінавая[85].

Кунтушы есаулаў падшываліся белкамі, лісамі, сабалямі, куніцамі. Згодна са старажытнымі актамі, у казака ў якасці верхняга адзення ўпамінаюцца епанча і шапка з лісіцы (коштам у 5 залатых)[86].

Казакі насілі кунтушы, душагрэі з «лазоревого» сукна. Іх шапкі падбіваліся розным футрам. Так шапка аднаго казака была з лісіцы, другога — абшытая собалем[87].

У1563 г. праваслаўная шляхта была ўраўнавана ў правах з каталіцкай. Правы гэтыя былі вельмі шырокімі. Шляхта карысталася недатыкальнасцю асобы, іх нельга было арыштаваць, караць, пазбаўляць маёмасці без суда, яны карысталіся льготамі на судах. У1566 г. з адкрыццём выбарных шляхецкіх судоў у рукі шляхты перайшоў суд над панамі і князямі. Шляхціцы не плацілі дзяржаўных падаткаў; ім была дадзена ўлада над сялянамі, выключна яны займалі

**Рыцарот ва. 1576—1586 гг**





**Парадны паўдаспех з тапулем.** Партрэт невядомага ў латах. Невядомы мастак. 2-ая чвэрць XVII ст.

цэнтральныя і мясцовыя дзяржаўныя ўлады. Дзякуючы павятовым, ваяводскім і вольным сеймам шляхта кіравала ўсёй дзяржавай.

У XVI ст. уваходзіць ва ўжытак аб'яднанне паўсядзённага і абарончага касвдсжаў, кал\ $' Жітайнае адзенне пад падкладку ўшывалі жалезныя пласціны[88]. Штодзённая пагроза татарскіх набегаў і наездаў на памесце болын магутных суседзяў, грабяжы і разбой на дарогах, звычка без суда самастойна абараняць свой гонар прывучылі шляхціцаў заўжды мець пры сабе зброю бліжняга бою (шаблю, меч, корд, абух, надзяк), а, адпраўляючыся куды-небудзь па справах, узбройвацца яшчэ больш грунтоўна. Так у Статуце Вялікага княства Літоўскага 1566 г. гаварылася, што «ннхто сь подданыхь нашнхь княжать пановь радь, почоншы оть вышшаго ажь до нніжшаго стану, яко самн панове такь н слугн нхь прн панахь свонхь н безь пановь прнятель за прмятелемь, не смель вь зброяхь кафтанахь[89] н сь такнмн бронямн, то есть сь древомь[90], зо шепомь[91], зь ручннцою, зь лукомь н сь кушою[92] н зь ннымн всякн-мн, до суду земского прнходнтн н прн собе метн; а ведже кордь н мечь то прн собе метн можеть н носнтн»[93].

Асобныя групы даспехаў («зброй бляхавых») складалі турнірныя даспехі, прызначаныя для рыцарскіх паядынкаў, так як турніры былі вельмі папулярнымі пры каралеўскіх дварах і рэзідэнцыях буйных феадалаў ва ўсёй ЕўропеўXII—ХУІстст. Парадныя даспехі ўжо не выкарыстоўваліся ў якасці абарончага баявога касцюма, а толькі дэманстра-

валі прыналежнасць да рыцарскага («сармацкага») саслоўя.

У сярэдзіне XVII ст. у Вялікім княстве Літоўскім і Польшчы атрымалі пашырэнне даспехі, пласціны якіх, нашытыя на скуру, нагадвалі луску рыб. Ні ў Заходняй Еўропе, ні на Усходзе ў гэты час ужо нічо-га падобнага не ўжывалі. Гэтыя даспехі называліся «карацен» і хутчэй за ўсё былі дэкаратыўным аздаб-леннем пышнага каралеўскага ці магнацкага кас-цюма, надаючы яму антычныя рысы[94].

У караценi, надзетай зверху кармазінавага жупана з пышнымі рукавамі і фігурнымі манжэтамі, паказаны на партрэце невядомага мастака Ян III Сабескі — кароль польскі і вялікі князь літоўскі. Гэта так званы «сармацкі» тып параднага партрэта, характэрнагатолькідля польскай, беларускай, украінскай і літоўскай магнатэрыі і шляхты. Партрэты гэтыя добра адлюстроўваюць асаблівасці шляхецкага светапогляду ў Рэчы Паспалітай. У выявах асоб на такіх партрэтах заўжды падкрэслівалася пачуццё' ўласнай годнасці партрэтаванага, яго вайсковыя і дзяржаўныя заслугі, выяўленыя праз прадметы рыцарскага ўзбраення і знакі дзяржаўных пасад, аддансць традыцыям сваёй айчыны, пра што сведчыць шляхецкі касцюм. Каб падкрэсліць выключнае становішча «рыцарскага саслоўя», партрэтаваныя часам маляваліся ў рымскіх даспехах, так як многія прадстаўнікі магнатэрыі ўзводзілі сваю генеалогію да легендарных рымскіх воінаў, прыбыўшых у старажытнасці на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага і Польшчы.

У парадным паўдаспеху з чорнага бліскучага металу з пазалочанымі берагамі наплечнікаў і цёмназялёнымі шаўковымі кантамі прадстаўлены на партрэце мастака Луі дэ Сільвестра ў другім дзесяцігоддзі XVIII ст. канюшны Вялікага княства Літоўскага, генерал каронны артылерыі Якаб Генрык Флемінг. Аб тым, што паўдаспех парадны, гаворыць вылажанае пад шыяй белае карункавае жабо і карункавыя манжэты сарочкі. На плечы накінуты ружовы плашч, прышпілены да даспеха на левым плячы.

**Булава гетмана**
Мікалая Іераніма





**Лускаваты даспех** Мікалая Іераніма Сяняўскага.
Рэч Паспалітая. Каля 1680 г.

Правая рука абапіраецца на дзяржанне мяча, які ляжыць на стале каля шлема-шышака.

На партрэце невядомага мастака сярэдзіны XVIII ст. вялікі гетман літоўскі і ваявода віленскі Міхал Сервацый Вішнявецкі напісаны ў чырвоным жупане, паверх якога надзета кароткая кальчуга, а зверху яе парадны паўдаспех з пазалочанымі берагамі, залацістымі кантамі і турэцка-татарскімі наручамі («карвашамі»). У час ваенных дзеянняў такога ахоўнага адзення ўжо не насілі. Гэта тыпова «сармацкі» парадны партрэт, дэманструючы дзяржаўныя заслугі і значнасць асобы партрэтаванага. Аб гэтым сведчыць перакінутая цераз левае плячо Вішнявецкага цёмна-сіняя муаравая стужка з ордэнам Белага Арла, чырвоны плашч на гарнастаевым падбоі, сашчэплены на грудзях брошкай з каштоўнымі камянямі, як сведчанне, што хтосьці з продкаў быў каралём. На левым баку прышпілена шабля-карабэла з сярэбраным з пазалотаю дзяржаннем, на нозі абуты жоўтыя саф'янавыя боты або паўботкі з сярэбранымі абцасамі.

Самым папулярным відам халоднай зброі ў шляхты з сярэдзіны XVI ст. становіцца шабля, якая прыйшла ў еўрапейскія краіны з Усходу. На тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага і Польшчы нашэнне шаблі разам з правам мець асабісты герб, згодна Статутам Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566 і 1588 гг., з'яўлялася выключнай прывілеяй шляхты (па спецыяльнаму каралеўскаму ўказу яе дазвалялася насіць па святах і ў час урачыстасцяў членам рамесных цэхаў некаторых гарадоў). Прымацаваная пры дапамозе спецыяльнага пояса злева на бядрэ, шабля стала сімвалам свабоды, ваеннай славы, асабістай недатыкальнасці і прыналежнасці да шляхецкага («рыцарскага») саслоўя.

Шаблю з гонарам насілі ўсе слаі шляхецкага саслоўя, пачынаючы з магнатаў і да апошняга немаёмнага засцянковага шляхціца. Сын мазырскага чэсніка Ян Дуклан Ахоцкі так апісвае павятовых шляхціцаў, якія з'ехаліся на сеймік: «апрануты былі гэтыя выбаршчыкі ў капоты, кажухі, сярмягі, змазаныя боты і нават у лапці, але кожны абавязкова з шабляй»[95].

Звычайна ў мірны час шабля («сцізорык», як яе ласкава называлі шляхціцы) вісела над ложкам гаспадара, а ў выпадку яго смерці яна ў шэрагу найбольш каштоўных сямейных рэліквій пераходзіла ў спадчыну па мужчынскай лініі. На шаблях выгравіроўваліся надпісы рэлігійнага зместу, імёны ўласнікаў, розныя выслоўі.

У творы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве» стары шляхціц так характарызуе сваю баявую шаблю («сцізорык»):

> Ён у жыцці мне быў усім — і славай звонкай За справы ратныя, а ў доме — сынам, жонкай, Бо іх не меў, і ён ні пры якой нагодзе Нідзе з маіх абдымкаў цёплых не выходзіў. З ім быў я дзень пры дні, і з ім упобач клаўся Адпачываць, ніколі з ім не расставаўся. З гадамі пастарэў, а ён заўжды пры ложку Спакойна на сцяне вісіць і ўсё старожка Гаспадара ахоўвае...[96].

У дзеда Ю. Нямцэвіча над ложкам, засцеленым пунсовай коўдрай з атласу, віселі шабля, панцыр і шлем, што сведчыла аб яго былой прыналежнасці да панцырнай харугвы[97].

Шабля была і бытавой зброяй шляхты. Пры яе дапамозе вырашаліся шматлікія шляхецкія спрэчкі, яна ж бараніла гонар і пачуццё ўласнай годнасці шляхціца. Рубіліся шаблямі па любой зачэпцы. Вынікам вышэйшага тэхнічнага майстэрства быта-



**Парадны «сармацкі» касцюм з даспехам-караценай.**
Партрэт караля польскага і вялікага князя Вялікага княства Літоўскага Яна III Сабескага. Невядомы мастак. 1683 **г.**



**Партрэт караля польскага І вялікага князя літоўскага Яна III Сабескага** ў рымскім даспеху.
Мастак Е.Э. Шымановіч-Сямігіноўскі. Каля 1683 г.

вога шабельнага бою было ўменне абсекчы праціўніку вуха ці нос — што служыла прадметам гонару, пахвальбы, аўтарытэту сярод знаёмых[98].

Бывала, на шляхецкіх сейміках па дзвесце праціўнікаў з кожнага боку біліся на шаблях. ГГяныя, яны рубілі адзін аднаму насы і вушы, рукі і ногі. Заўжды некалькі трупаў заставалася на месцы бойкі. Некалькі асоб у кожным павеце славіліся як рубакі". Аднак па маральнаму кодэксу шляхты ў асабістых паядынках з'яўленне крыві ў аднаго з праціўнікаў астанаўлівала другога, і да смерці звычайна не даходзіла:

> Мапанку, пісарчук які ці лёкай Так пёрка ножычкам не падрыхтуе, Як мой сцізорык зголіць падчыстую Галоўку з плеч! Ссякаў, бо хто іх клікаў? А тых насоў, вушэй — лічы і ліку Не дабярэш да першай палавіны. На ім няма ніводненькай шчарбіны, За несумленны ўдар — ніводнай плямы На ім няма, бо я заўсёды прама Прымаў або навязваў бой адкрыты, Рубаўся чэсна. Мы з сумленнем — квіты[100].

З надзетай шабляй шляхціц наведваў касцёл. Існаваў нават такі шляхецкі звычай, як выманне шаблі да паловы з ножнаў перад Евангеллем у час набажэнства ці праслухоўванне імшы ў поўным узбраенні з узнятай шабляй[101].

Абавязкова пры шаблі шляхціцы ездзілі адзін да другога ў госці і толькі па просьбе гаспадара госць здымаў яе. Калі шляхціц сватаў дзяўчыну, то прыязджаў у дом яе бацькоў з якім-небудзь паважным сябрам, абодва пры шаблях, парадна апранутыя, са світай. Уваходзячы ў хату дзяўчыны, сват здымаў шаблю, а жаніх, нягледзячы на ўгаворы, не здымаў зброі і не дазваляў выпрагаць коней да самай вячэры, якая вырашала лёс прэтэндэнта[102].

У Рэчы Паспалітай мясцовыя майстры выраблялі розныя тыпы шабляў, якія мелі свае назвы, аднак асноўны тып старашляхецкай шаблі склада-ла простая (чорная) баявая шабля сярэдне- і маламаможнага шляхціца[101]. Шаблі дабывалі ў час баёў або куплялі ў замежных купцоў. У XVII ст. вельмі папулярным у зброі быў усходні стыль. Калчаны, кальчугі, кінжалы і іншыя дэталі ваеннага касцюма ішлі ў Рэч Паспалітую з Усходу. Нават мясцовая зброя аддавалася збройнікам для спецыяльнай апрацоўкі, якая надавала зброі «ўсходні каларыт». Самай багата ўпрыгожанай і прэстыжнай шабляй была карабэла. Характэрнай яе асаблівасцю было дзяржанне, выкананае ў форме стылізаванай галавы арла[104].



Парадны паўдаспех. Партрэт Якаба Генрыха Флемінга. Мастак Л. дэ Сільвестр Малодшы. 1720 г.

Таму ахоўныя, жалезныя пласціны часам падшывалі з унутранага боку хатняй альбо верхняй вопраткі, каб абараніць сябе ў выпадку неспадзяванай небяспекі.

У XVIII ст. шаблю з бытавой сферы пачаў інтэнсіўна вышясняць пісталет, які стаў шырока выкарыстоўвацца ў паядын-ках і дуэлях, што ўспрымалася старэйшым пакаленнем як фізічна-валявы заняпад моладзі[1"7]. Сур'ёзных рэформаў патраба-вала войска. Магутная і славутая ва ўсёй Еўропе ў XVII ст. кавалерыя Рэчы Паспа-літай (гусары і панцырныя) тратвары-лася ў першай палавіне XVIII ст. у недысцыплінаваныя і слаба абвучаныя атрады коннай шляхты, так як вынікі бітваў вырашала ўжо рэгулярная, добра ўзброеная пяхота і артылерыя.

У пачатку XVIII ст. у Рэчы Паспалітай пачалася вайсковая рэформа, па якой замест войск часовага набору, якія ствара-ліся ў часы войнаў, арганізоўвалася пас-таяннае войска[1"*]. Цяга да тэатралізацыі ўсіх сфер жыцця, якаяназіралася ў вы-пісйшых слаях тагачаснага грамадства ў Еўропе, адлюстравалася і на гэтай рэфор-ме. У войску Вялікага княства Літоўскага былі створаны тры янычарскія харугвы, на чале якіх стаялі ротмістры. Харугвы былі арганізаваны і экіпіраваны па ўзору турэцкіх янычар.

По вайсковай рэформе 1773—1775 гг. былі пакінуты дзве янычарскія харугвы (булавы гетмана Вялікага княства Літоўскага і булавы гетмана польнага), якія мелі не столькі характар баявых адзінак, колькі падраздзяленняў ганаровай варты пры кожным гетмане[0]«.

У кавалерыі Вялікага княства Літоўскага ротмістрамі ў XVIII ст. служылі ваяводы, кашталяны і іншыя высокія чыны дзяржаўнай адміністрацыі, а іх сыны былі паручнікамі і харунжымі[11"]. Простая шляхта служыла малодшымі афіцэрамі («таварышамі»). Пяхота набіралася па большай частцы з чужаземцаў, а лёгкая кавалерыя — з татар і казакоў'". Вайскоўцы, яксалдаты, так і афіцэры, у XVIII ст. насілі аднолькавыя па крої мундзіры. Адрозніваліся яны якасцю сукна, аздобай, зброяй і асобнымі дэталямі. Палкі вылучаліся колерам «вылогаў» (манжэтаў, лацканаў, каўняроў), наяўнасцю пампонаў на капелюшах, гузікаў, спражак, эпалетаў.

Верхнім адзеннем шэраговага першай палавіны XVIII ст. быў мундзір («сурдут», або «райтрок») ніжэй за калені. Ён меў невялікі адкладны каўнер, манжэты з двума гузікамі, трыма кішэнямі з клапанамі, якія зашпільваліся на гузікі. У час парадаў

Другім відам шляхецкай зброі быў баявы абух (надзяк, чакан), які шляхціцы насілі на поясе і ў мірны час. Ён, як і шабля, быў адначасова як баявой, так і бытавой зброяй. Кітовіч так апісвае баявы абух: «Тоўстаедзяржальнадаўжынёйадзямлідапояса; на тым канцы, які трымае рука, — авальная булдавешка з серабра або толькі пасярэбраная ці латунная; на другім канцы — моцна насаджаны на ручку жалезны, латунны або сярэбраны малаток, падобныпляскатымканцомдашавецкага. Калідругі бок быў закляпаны сякерай, то зброю называлі чаканам, калі завостраны наўскасяк, то надзякам, калі ж быў закручаны ў колца, нібы абаранак, то звалі абухом»[105]. У руках шляхціца гэта была страшэнная зброя. Пры бойцы на шаблях кроў аднаго з праціўнікаў спыняла азарт другога, а калі абухом хто наносіў рану, то не бачачы крыві і не прабіваючы скуры ламаў рэбры і трушчыў косці, забіваючы чалавека насмерць[106].



**Вайсковы касцюм э кунтушом і эпалетам.**
Партрэт Станіслава Кубліцкага,
капітана Войска Вялікага княства Літоўскага.
Мастак Ю. Пешка. Апошняя чвэрць XVIII ст.



**Парадны магнацкі партрэт.**
Партрэт Міхала Сервацыя Вішнявецкага. Невядомы мастак.
1750-ыя гг.

крысо мундзіра загортвалася па баках і зашпільва-лася на асобны ніжні гузік"[12]. Афіцэрскі мундзір быў такога ж крою, меў пояс, затканы па серабру цём-на-чырвонай ніткай, такія ж эпалеты і цемляк на шаблю, афіцэрскі шалік.

Асаблівасцю адзення войска XVIII ст. было вы-карыстанне мундзіра «народнага крою» — кунтуша і жупана. У першай палавіне XVIII ст. у кунтушы і жупаны была апранута кавалерыя і артылерыя. У 1746 г. для гусарскіх харугваў быў уведзены цёмна-сіні жупан і цёмна-чырвоны кунтуш. Лёгкая татар-ская конніца вылучалася сіняга колеру жупанамі са светла-жоўтымі вылогамі і такімі ж жоўтымі кун-тушамі"[3].

У другой палавіне XVIII ст. у кавалерыі Рэчы Паспалітай кунтушы былі заменены на курткі, якія спачатку насілі на значна даўжэйшых за іх жупанах, а ў 1790 г. куртка была ўведзена ў якасці агульнага ваеннага адзення для кавалерыі, пяхоты і артыле-рыі[114].

Форма афіцэраў янычарскіх харугваў у канцы XVI11 ст. складалася з белага суконнага жупана даў-жынёй за калена і рукавамі да кісці. Пярэдняе крыс-се яго абшывалася чырвонай паскай. Зверху апра-налася чырвоная куртка з кароткімі да локця рука-вамі, упрыгожаная эпалетамі і пятліцамі з кутасі-камі. На галаву надзявалася высокая чырвоная ак-самітная шапка з прымацаванай спераду белай кітай.



**Шабля.** Венгрыя або Польшча XVI—XVII стст.

**Гусарская шабля.** Польшча. XVII—XVIII стст.

**Шабля** (карабэла). Турцыя. XVII ст.

Вакол шапкі намотваліся белая чалма або багаты персідскі пояс, на якім замацоўваўся персцень з каштоўным каменем. Злева на раменным поясе прымацоўвалася шабля[115].

Янычарскія харугвы мелі аркестры (капэлы), якія сваім складам і экзатычным выглядам адрозніваліся ад іншых вайсковых аркестраў. У іх уваходзілі духавыя і мноства ўдарных інструментаў: барабанаў, тулумбасаў (від літаўраў), металічных талерак, званочкаў. Барабан быў у два разы большы за звычайны, абцягваўся сукном пад колер мундзіра барабаншчыка (добаша). Таму барабаншчыкі былі высокага росту, бо іначай іх не было бачна з-за інструмента"[6].

Колерам мундзіраў пяхотных палкоў быў блакітны, артылерыстаў — зялёны з чорнымі вылогамі, гвардзейскіх — чырвоны з блакітнымі. Ахоцкі піша аб мундзірах войска Вялікага княства Літоўскага канца XVIII ст., адзначаючы, што яны былі гранатавага колеру і аднолькавыя ў розных палкоў. Толькі па колеру абшлагоў («выпушак») ды нумароў на гузіках можна было іх адрозніваць[117].

Здалучэннем Беларусі да Расійскай імперыі войска Вялікага княства Літоўскага перастала існаваць.



**Шабля**
Тадэвуша Касцюшкі.
Францыя.
2-ая палавіна XVIII ст.

**Палаш**
князя Юзафа Панятоўскага.
Польшча XVIII ст.

**Шабля**
генерала Караля Князевіча.
Версальская мануфактура.
Канец XVIII ст.

[1] Макушнікаў А. Зброя нашчадкаў радзімічаў // Спадчына. 1991. № 2. С. 49.
[2] Там жа. С. 51.
[3] Слово о полку Игореве. М., 1987. С. 33.
[4] Там жа. С. 29.
[5] Янин В. Л. Актовые печати древней Руси X—XV вв. Т. 1. М., 1970. С. 34-35. Табл. 1.
[6] Слово о полку Игореве. С. 43.
[7] Там жа. С. 42.
[8] Макушнікаў А. Зброя нашчадкаў радзімічаў. С. 51.
[9] Там жа. С. 49.
[10] Слово о полку Игореве. С. 33.
[11] Там жа. Каментарыі. С. 199.
[12] Ішчанка С, Марухіна Д. Дрыкганты Уладзіміра Карат - кевіча і верхавыя коні Рэчы Паспалітай // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 2. С. 63.
[13] Бохан Ю. Войска // Энцыклапедыя Вялікага княства Літоўскага. Мн., 2006. С. 107.
[14] Ткачоў М. За няпоўных сто гадоў — сто сорак крыжацкіх паходаў... // Спадчына. 1991. № 3. С. 9.
[15] Трусаў А. Матэрыяльная культура беларускага горада ў часы Вялікага княства Літоўскага // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 3. С. 58.
[16] Хадыка А. Рыцарства, XVI стагоддзе // Спадчына. 1991. № 6. С. 58.
[17] Там жа.
[18] Ткачоў М. За няпоўных сто гадоў — сто сорак крыжацкіх паходаў... // Спадчына. 1991. № 3. С. 10.
[19] Копысский 3. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в. Мн., 1976. С. 77.
[20] Мезенка Г. Гарадское ўпарадкаванне Беларусі ў люстэрку ўрбаніміі // Спадчына. 1991. № 1. С. 56.
[21] Бохан Ю. М. Пласцінкавыя даспехі ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XV—XVI ст. // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 1996. № 4. С 44-48.
[22] Кирпичников А. Н. Военное дело на Руси в XIII—XV вв. Л., 1976. С. 38.
[23] Бохан Ю. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385—1576. Мн., 2003. С. 14.
[24] **Там** жа. С. 7.
[25] Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею для разбора древних актов (далей АВАК). Т. XVII. С. 243.
[26] Хадыка А. Рыцарства, XVI стагоддзе//Спадчына. 1991. № 6. С. 58.
[27] АВАК. Т. XXII. С. 156.
[28] Бохан Ю. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385—1576. С. 20.
[29] АВАК. Т. VIII. С. 484.
[30] Там жа. Т. III. С. 282.



**Добыш** (барабаншчык) каралеўскіх янычараў.
Малюнак Бакара



**Касцюм ротмістра янчарскай харугвы Булавы Вялікай ЛІтоўскай**

[31] Ткачэнка М. І. Амбразская калекцыя даспехаў і гравіра-
вальныя партрэты Радзівілаў // Помнікі мастацкай куль туры Беларусі эпохі Адраджэння. Мн., 1994. С. 60—61.
[32] Кирпичников А. Н. Военное дело на Руси в XIII—XV вв. С. 34.
[33] Бохан Ю. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385—1576. С. 19.
[34] Там жа. С. 14-15.
[35] АВАК. Т. VIII. С. 465-466.
[36] Там жа. Т. III. С. 291.
[37] Беларускі архіў. Т. 2. Мн., 1930. С. 167-168.
[38] АВАК. Т. XXII. С. 73-74.
[39] Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. T. 2. С. 289.
[40] Бохан Ю. Арганізацыя найманых аддзелаў у Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVI стст. // Спадчына. 2002. №4. С. 78.
[41] Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. T. 3. С. 126-127.
[42] Бохан Ю. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385—1576. С. 17.
[43] Бохан Ю. Арганізацыя найманых аддзелаў у Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVI стст. // Спадчына. 2002. №4. С. 79.
[44] Акты, относящиеся к истории Западной России. СПб.,
1846. Т. 2. С. 188.
[45] Бохан Ю. Арганізацыя найманых аддзелаў// Спадчы на. 2002. № 4. С. 74.
[46] Там жа. С. 77.
[47] Ткачэнка М. І. Амбразская калекцыя даспехаў і граві-равальныя партрэты Радзівілаў. С. 59.
[48] Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. T. 2. С. 294; Бохан Ю. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385-1576. С. 36.
[49] Лавыш К. Арыенталізм як частка мастацкай культуры і
побыту беларускай шляхты эпохі сарматызму // Бела руси гістарычны часопіс. 2003. № 1. С. 56.
[so] Бохан Ю. Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385—1576. С. 47.
[51] Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. T. 2. С. 294.
[52] Сагановіч Г. Нямецкі падарожнік Самуэль Кіхель пра
Гародню часоў Стэфана Баторыя // Спадчына.
2002. № 2-3. С. 69.
[53] Тананаева Л. И. Сарматский портрет. Из истории польского портрета эпохи барокко. М., 1979. С. 26.
[54] Gloger Z. Encyklopedia staropolska ilustrowana. T. 2. С. 291.
[55] Там жа.
[56] Бохан Ю. Арганізацыя найманых аддзелаў... // Спад чына. 2002. № 4. С. 76.
[57] Грыгор'еў М. Войска ВКЛ. Ад Сасаў да Касьцюшкі. 1765-1794. Мн., 1994. С. 7.
[58] Грыцкевіч А. Янычары ў Беларусі // Беларуси гіста-рычны часопіс. 2005. № 6. С. 37.
[59] Ішчанка С, Марухіна Д. Дрыкганты Уладзіміра Карат-
кевіча... С. 63—66.
[60] Там жа. С. 66.
[61] АВАК. Т. XXII. С. 73-74.
[62] Галзбант — шыйнае ўпрыгожанне, каштоўны ашыйнік.
[63] Шмальцованым — аздобленым фініфцю.
[64] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управ лении Виленского учебного округа (далей АСД). Виль-на, 1867. Т. III. С. 83.
[65] Пулгак — разнавіднасць мушкета.
[66] АСД. Т. III. Вильна, 1867. С. 83.
[67] АВАК. Т. III. Вильна, 1870. С. 282.
[68] Там жа. Т. XVII. С. 415.
[69] Еўлашэўскі Ф. Успаміны // Помнікі мемарыяльнай літаратуры Беларусі XVII ст. Мн., 1983. С. 34.
[70] АВАК. Т. І. С. 283.
[71] Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хра нящиеся в Центральном Витебском архиве (далей ИЮМ). Витебск, 1876. Вып. 9. С. 337.
"АВАК. Т. XXXVI. С. 81.
[73] Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. IX—XVII стст. Т. І. Мн., 1936. С. 386.
[74] Там жа.
"Тамжа. С. 391.
[76] Там жа.
[77] ИЮМ. Витебск, 1878. Вып. IX. С. 253.
[78] Хроника белорусского города Могилева, собранная и писанная Александром Трубницким, регентом Моги левской магдебурии во второй половине XVIII века...// Чтения в Императорском обществе истории и древнос тей Российских при Московском университете. М., 1887. Кн. III. С. 35.
[79] Дыярыюш князя Міхала Казіміра Радзівіла // Спадчы на. 1995. № 4. С. 44.
[80] Литовская метрика. Книга публичных дел // Русская историческая библиотека. Т. 30. Юрьев, 1914. С. 111.
[81] Пешы воін.
[82] Литовская метрика. Переписи войска литовского // Русская историческая библиотека. Т. 33. Пг., 1915. С. 433.
[83] АСД. Т. І. Вильна, 1867. С. 253.
[84] Там жа. С. 252-253.
[85] Акты, относящиеся к истории Южной и Западной Рос сии, собранные и изданные Археографическою комис сией. Т. III. 1638-1657. СПб., 1862. С. 534.
[86] Там жа. Т. III. С. 535.
[87] Там жа. С. 534.
[88] Бохан Ю. М. Пласцінкавыя даспехі ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XV—XVI ст. С. 46.
[89] Зброі кафтанныя — панцыры, кірасы.
[90] Кап'ё.
[91] Кап'ё, піка.
[92] Прыстасаванне для нацягвання цяцівы самастрэла (ар балета).
[93] Статут Вялікага княства Л ітоўскага 1566. Разд. 4, арт. 38.
[94] Лавыш К. Арыенталізм як частка мастацкай культуры і побыту. С. 58.

Пры напісанні работы аўтарамі выкарыстаны матэрыялы Архіва Інстытута мастацтва-знаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Нацыянальнага гістарычнага архіва ў г. Грод-на, матэрыялы фондаў Музея старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі, На-цыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, філіяла мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Гродзенскага дзяржаўнага гісто-рыка-археалагічнага музея, Дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Гомельскі палаца-паркавы ансамбль», Магілёўскага этнаграфічнага музея, Музея Беларускага Палесся (г. Пінск), Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Брэсцкага, Віцебскага, Магі-лёўскага абласных краязнаўчых музеяў, Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея, Тураў-скага краязнаўчага музея, Валынскага краязнаўчага музея (г. Луцк, Украіна), Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея, Варшаўскага нацыянальнага музея, Нацыянальнага музея г. Кра-кава (Польшча), Дзяржаўнага збору твораў мастацтва на Вавелі (Кракаў, Польшча), Музея каралеўскага замка на Вавелі (г. Кракаў), Замкавага музея ў Мальбарку, Кунстгістарычны музей г. Вены (Аўстрыя), філіяла Нацыянальнага музея ў Варшаве (Вілянаў), Дзяржаўнага Рускага гістарычнага музея, Літоўскага нацыянальнага музея (г. Вільнюс), Літоўскага мас-тацкага музея (г. Вільнюс), філіяла Львоўскай карціннай галерэі (г. Аляско, Украіна), Дзяр-жаўнага мастацкага музея імя М. К. Чурлёніса (Літва), а таксама з прыватных калекцый В. Васілевіча, С. Дзешука, А. Лось, Т. Клакоцкай, І. Чанвіна, А. Сакалоўскага, А. Краўчанка, А. Гурко, Л. Ракавай, В. Бялявінай, М. Мельнікава, А. Атраховіч і інш.

**Бялявіна** Валянціна Мікалаеўна **Ракава** Любоў Васільеўна

**МУЖЧЫНСКІ КАСЦЮМ НА БЕЛАРУСІ**

Рэдактар *С.У. Пешын*
Мастак *У. П. Свентахоўскі*
Мастацкі рэдактар *В. Г. Паўлавец*
Камп'ютэрная апрацоўка ілюстрацый *В.Г. Загародняга, С.У. Пешына, У.П. Свентахоўскага*
Тэхнічнае рэдагаванне
і камп'ютэрная вёрстка *С.Л. Печанёвай*
Карэктары *Л. А. Адамовіч, Л. Р. Кузьміна, Л. К. Сямёнава*

Падпісана да друку 29.05.2007. Фармат 84x100 $^{1}/_{16}$. Папера мелаваная. Гарнітура «Newton». Афсетны друк. Ум. друк. арк. 29,64. Ул.-выд. арк. 33,77. Тыраж 2000 экз. Зак. 287.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ №02330/0056828 ад 02.03.2004.
220004, Мінск, праспект Пераможцаў, 11.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Чырвоная зорка». 220073, Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

ISBN 978-985-01-0719-0

9789850107190

**ПАДРЫХТАВАЎ** prus@mail.by